
ЯНКА
МАЎР
ТОМ
ЧАЦВЁРТЫ



МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1976



ЯНКА МАЎР



ЗБОР ТВОРАЎ У ЧАТЫРОХ ТАМАХ



ТОМ ЧАЦВЁРТЫ

Бел 2
М 35

Рэдакцыйная калегія:
В. Вітка, І. Мележ, А. Міронаў,
Ф. Фёдараў, А. Якімовіч

М $\frac{70803-057}{М\ 302(05)-76}$ 149-76

© Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1976 г.

ПАЛЕСКІЯ РАБІНЗОНЫ

Аповесць

I

Адважныя падарожнікі.— У моры.— Крушэнне карабля.— Падарожжа ў вадзе.— Невядомы бераг.— Падлік маёмасці.

— Кіруй туды, вунь у той лясок! Цікава паездзіць у чоўне па лесе.

Доўгі Мірон сядзеў на кукішках на дне выдзеўбанага чоўна — «душагубкі». Калені яго датыркаліся да самага носа, рукамі ён трымаўся за бакі чоўна. Раптам ён падняў рукі, паказаў на лес і нават крыху прыўстаў. Човен захістаўся.

— Ды не хістай! Бачыш, што...

Віктар, які стаяў і кіраваў чоўнам, не паспеў скончыць і паваліўся на дно. Душагубка яшчэ больш захісталася, зачарпнула вады. Абодва хлопцы прыцісналіся да дна і не толькі рухацца, але і дыхаць перасталі. Нарэшце човен супакоіўся; на дне яго плюхалася вада.

— Ну вось, бачыш, што ты зрабіў! — з дакорам сказаў Віктар.— Навошта было ўставаць ды варушыцца? Вычэрпвай цяпер ваду!

— Ды ты ж сам вінаваты,— агрызнуўся Мірон.— Перад кім было фанабэрыцца, што спрытна спраўляешся з гэтай праклятай душагубкай?

— Ну і справіўся б, каб ты сядзеў ціха.

— Я ж і сядзеў, а вось ты забыўся, у якім чэрапе едзеш. Навошта стаяў на ўвесь рост?

Пры гэтым Мірон прыпадняўся. Зноў захістаўся човен.

— Зноў устаеш?! — грозна крыкнуў Віктар.— Калі хочаш тапіцца, дык лезь у ваду сам адзін, а я яшчэ пачакаю.

Мірон крыху засаромеўся.

— Ну-ну,— адказаў ён лагодна.— Давай лепш вычарпаем ваду.

— А чым будзеш вычэрпваць? Чарпак узяў?

— А ты ўзяў?

— Ды хто ж ведаў, што гэтая калода будзе цячы.

— Цячы не пацякла, а зверху, бачыш, налілося.

Хлопцы нерухома сядзелі адзін супраць аднаго, нібы буслы ў гняздзе, і пазіралі то на дно лодкі, дзе было пальцы на чатыры вады, то адзін аднаму ў вочы.

Човен, які і без таго мала высоўваўся з вады, цяпер яшчэ больш апусціўся. І яшчэ больш небяспечным быў кожны рух.

А навакол разляглося неабсяжнае каламутнае мора. Далёка ззаду ледзь віднеўся бераг, ад якога яны ехалі, а наперадзе, яшчэ далей, паўставаў той лес, на які хацеў паглядзець Мірон. Да лесу гэтага было яшчэ далёка, але затое ехаць туды было цікавей. Улетку тут канчалася возера і пачыналася непраходнае балота, якое цяпер было заліта вадой. Гэтай вадзе не відаць было канца-краю, апрача той палоскі лесу на даляглядзе. І на ўсёй гэтай прасторы то там, то там вытыркаліся з вады верхавіны дрэў і кустоў — то паасобку, то групамі.

Надвор'е было ціхае, цёплае. Веснавое сонца грэла ўжо як след. Дрэвы зелянеліся. То была ўжо другая паводка на Палессі ў гэтым годзе. Першы раз адбылася яна з месяц назад, з крыгамі, замаразкамі. Пасля таго тыдні са два трымалася сапраўдная, цёплая вясна. Вада амаль сышла, але потым зноў пачаліся дажджы і снег. Ужо тыдзень, як скончылася і гэтая непагадзь. У іншых месцах прыступілі ўжо да ворыва, сяўбы, а ў гэтай нізіне ўсё яшчэ збіралася вада з далёкіх аколіц, асабліва з поўначы.

У такі час і трапілі сюды гэтыя два хлопцы. Яны былі аднагодкі і мелі абодва разам гадоў трыццаць пяць. Але выгляд, а таксама і характары іх былі зусім адменныя. Мірон быў худы, цыбаты дзяцюк, з блакітнымі вачыма, доўгім птушыным носам і доўгімі светлымі валасамі. Віктар, наадварот,— прысадзісты, карчасты, чарнявы, з круглым пляскатым тварам.

Мірон быў больш разважлівы, спакойны хлопец, а Віктар — жвавы, імклівы. Яны заўжды спрачаліся паміж сабою, але былі найлепшымі сябрамі і жыць не маглі адзін без аднаго.

Абодва вучыліся ў тэхнікуме ў адным з акруговых гарадоў Беларусі і былі самымі стараннымі ўдзельнікамі краязнаўчага

гуртка. Можа, таму яны так і цікавіліся краязнаўствам, што нарадзіліся ў горадзе і ўвесь свой век пражылі ў ім.

З маленства яны былі суседзямі і таварышамі, таксама як і іхнія бацькі. Бацька Мірона працаваў у млыне, а Віктара — на шкляной гуце.

Прыроду, лес, вёску хлопцы ведалі толькі з тых экскурсій, якія рабілі, калі вучыліся ў сямігодцы. Далей як за дзесяць кіламетраў ад горада ім ніколі не даводзілася быць.

Вучыліся абодва добра, чыталі шмат кніжак, асабліва прыгодніцкіх — Жуля Верна, Майна Рыда, Купера і г. д. Цікавілі іх розныя далёкія краіны, дзікуны, індзейцы, якіх цяпер бадай ужо зусім няма. Захапляліся рознымі прыгодамі з іх жыцця, што адбываліся гадоў шэсцьдзесят — восемдзесят назад. Марылі пра пальмы, джунглі, а не бачылі добрай пушчы, якая была за некалькі дзесяткаў кіламетраў ад іх. Уяўлялі сабе розныя паляванні на тыграў, сланоў, ільвоў, а вавёркі на волі не бачылі. Марылі пра мора, караблі, а не бачылі вялікага возера, якое ляжала за кіламетраў дваццаць ад іх.

У краязнаўчым гуртку яны даведаліся, што на Беларусі наогул, а ў іх раёне асабліва, ёсць шмат куткоў, не горшых ад заморскіх. Ёсць пушчы, не менш цікавыя, чымся далёкія трапічныя лясы. Ёсць азёры і балоты, якія ўвесну робяцца марамі. Ёсць звяры, якія радзей сустракаюцца на свеце, чым сланы і тыгры.

Паступова выявілася, што Мірон цікавіўся больш батанікай, а Віктар — заалогіяй. Чытаючы кнігі, кожны з іх галоўную ўвагу звяртаў на сваю галіну навукі. У жывым кутку Віктар важдаўся з трусамі, мышамі, жабамі, а Мірон — з рознымі раслінамі. Паступова кожны з іх досыць сур'ёзна азнаёміўся са сваім любімым прадметам.

Калі прыйшла вясна і дзесяцідзённыя канікулы, хлопцам вельмі захацелася зрабіць вылазку за горад, куды-небудзь падалей, на некалькі дзён, пабачыць славутае палескае раздзе. Такая вылазка ім здавалася цікавейшай, чым арганізаваная экскурсія ўлетку.

— Там усё ідзе па раскладу, як заняткі ў класе,— казалі яны.— Загадзя ведаеш, дзе калі будзеш і што цябе там чакае.

Не можаш пайсці, куды захочаш, спыніцца, дзе сам хочаш, рабіць, што табе падабаецца. Такія падарожнікі ў дарозе адчуваюць сябе, як дома, не ведаюць незвычайных прыгодаў і небяспек. Якое ж гэта падарожжа?!

Калі яны сказалі аб сваім плане некаторым з таварышаў, дык тыя паднялі іх на смех:

— Ну і выдумалі! Якая карысць ад такога падарожжа, які сэнс?

— Нічога вы не разумееце! — пакрыўдзіліся сябры і больш ужо ні з кім не распачыналі гаворкі на гэтую тэму. Але цвёрда пастанавілі выканаць свой намер, чаго б гэта ні каштавала, каб даказаць усім, што незвычайнае падарожжа цікавей, чым звычайнае.

І вось нашы падарожнікі апынуліся ў чоўне сярод бязмежнага мора. І пакуль што былі задаволены.

— Давай вычарпаем ваду шапкамі,— прапанаваў Мірон.

— Ды нічога іншага не застаецца,— згадзіўся Віктар.— Толькі баюся, што ты пачнеш варочацца, як мядзведзь, і перакуліш лодку.

— А я баюся, каб яна не перакулілася ад руху твайго языка,— спакойна сказаў Мірон і, зняўшы шапку, пачаў вычэрпваць ваду.

Зараз жа далучыўся Віктар, і вада хутка была вычарпана. Можна было ехаць далей.

— А да таго лесу, мусіць, далёка,— прамовіў Мірон.

— А што, можа, спалохаўся? Можа, назад хочаш ехаць? — упікнуў Віктар.

— Каб толькі ты не спалохаўся,— насмешліва адказаў Мірон.

— Ну, гэтага, брат, не дачакаешся! — свіснуў Віктар.— Першы раз па моры еду.

— Карабель наш псуе падарожжа,— уздыхнуў Мірон.

— А ты сядзі спакойна, і ўсё будзе добра,— сказаў Віктар і ўзяўся за вясло.

— Ды навошта ты зноў становішся? — крыкнуў Мірон.— Дай лепш буду я, а ты адпачні.

— Паглядзім,— усміхнуўся Віктар і аддаў вясло.

Мірон асцярожна, але цвёрда прыладзіўся на каленях і пачаў веславаць.

— Ну, і якая ж розніца? — засмяяўся Віктар.— Ты на каленях стаіш нават вышэй, як я на нагах.

— Розніца ёсць,— сур'ёзна адказаў Мірон.— Цэнтр цяжару ніжэй, калі памятаеш фізіку.

— Наўрад ці сам ты ведаеш, дзе ў цябе цэнтр цяжару,— нездаволена буркнуў Віктар.

Асцярожна, мерна і моцна гроб Мірон, і човен пасоўваўся досыць шпарка. Вось наблізіліся першыя кусты, часам сухі чаротнік вытыркаўся з-пад вады: значыцца, скончылася возера і пачаўся бераг. Але праз некаторы час зноў выехалі ў другое, меншае возера.

— Бач, як яно тут — па некалькі азёраў ідзе,— заўважыў Віктар.

— Гэта яшчэ невядома. А можа, гэта толькі балота? Хто яго цяпер разбярэ? — сказаў Мірон.

Нейкі белаваты струмень, нібы рака, перасек ім дарогу і пачаў адносіць човен убок. Мірон упарта стаў з ім змагацца.

— Сцеражыся! — раптам крыкнуў Віктар.

На іх нёсся вялізны, рагаты корч. Сутычка была немінучая: праскочыць з такім нязграбным чоўнам было ўжо нельга.

— Кладзіся! — крыкнуў Мірон і сам прыціснуўся да дна. Потым працягнуў наперад вясло, упёрся ў корч і паступова пачаў паслабляць руку, каб зменшыць штуршок. Корч не стукнуўся аб човен, але затое яны сашчапіліся і далей паплылі ўжо абодва разам.

— Вось прынесла яго ліха на нашу галаву! — злаваў Віктар.— Як жа цяпер ад яго адчапіцца?

— Пачакай, не гарачыся толькі, адчэпімся,— спакойна сказаў Мірон і паступова, павольна вызваліў човен.

Мінулі азярцо, зноў пайшлі кусты. Часам яны здаваліся астравамі, а калі човен пад'язджаў бліжэй, то мог праехаць праз іх проста па вадзе. Трапляліся і больш вялікія дрэвы: бярэзінкі, алешыны, нават елкі.

Наперадзе, ужо недалёка, вызначаўся густы, сіні бор.

— А ён, здаецца, стаіць высока, на сухім месцы,— сказаў Віктар і ціхенька ўстаў, каб паглядзець.— Хочацца ногі выпрастаць, здранцвелі зусім.

— Ды пачакай ты, не ўставай, зараз прыедзем,— сказаў Мірон, але і сам не ўтрымаўся, прыпыніўся і пачаў прыглядацца.

— Здаецца, там нібы пясчаны ўзгорак відаць,— прамовіў ён, гледзячы з-пад рукі.

А човен тым часам наехаў на вір. Не паспелі хлопцы звярнуць на яго ўвагі, як ён панёс іх убок і стукнуўся аб альховае дрэва. Штуршок быў невялікі, і нічога б не здарылася, каб абодва хлопцы сядзелі на дне. А цяпер — Віктар адразу паляцеў у ваду, пад алешыну.

— У-ух! — крыкнуў ён не то ад жаху, не то ад неспадзеўкі, не то ад холаду. Мусіць, ад усяго разам.

А човен ад яго руху так захістаўся ды закруціўся, што Мірон ледзь уседзеў, ухапіўшыся рукамі за бакі яго. Але пры гэтым ён выпусціў з рук вясло. Струмень падхапіў бездапаможны човен і панёс яго далей, да другой алешыны. Падплываючы да яе, Мірон перахіліўся цераз борт і ўчапіўся рукамі за галіну. Тут ён адчуў, што човен нібы выслізгвае з-пад яго. Трымаючыся за галіну бадай-што над вадой, Мірон стараўся падцягнуць да сябе човен нагамі, але скончылася гэтая справа тым, што галіна абламалася, хлопец паляцеў у ваду дагары нагамі, а човен, атрымаўшы апошні штуршок і паварочваючыся ў розныя бакі, жвава панёсся наперад. Пакуль Мірон зноў учапіўся за дрэва ды агледзеўся, човен быў ужо так далёка, што дагнаць яго не было ніякай магчымасці, тым больш чалавеку адзетаму і абутаму.

Усё гэта адбылося так хутка, што Віктар, які таксама выбіраўся з вады і ўзлазіў на дрэва, нават не заўважыў, што робіцца за яго спіной, тым больш што Мірон за ўвесь гэты час не падаў аніводнага гуку.

Азірнуўся Віктар — ні чоўна, ні Мірона няма! Што за дзіва такое?

— Міро-о-он! — гукнуў ён.

— Ну! — адгукнулася зусім блізка.

— Дзе ты?
— Тут!
Глянуў Віктар — і вачам сваім не верыць.
— А дзе ж човен?
— Не ведаю.
— Як жа так?
— Ды так. Паплыў.
— Што ж гэта такое? — у роспачы крыкнуў Віктар.
— Прыгода,— спакойна азваўся Мірон з свайго дрэва.
— Што ж ты нарабіў?
— А можа, гэта ты нарабіў?
— Ты ж у чоўне застаўся!
— Хацеў бы я паглядзець, як ты застаўся б, каб цябе так штурханулі,— адказаў Мірон.

Спрачаліся яны, пакуль не прайшло першае ўражанне ад няшчасця. Ніхто нікога сур'ёзна не вінаваціў, ды і карысці ніякай ад гэтага не было б, але ж трэба было па прывычцы аднаму аднаго папікнуць. І толькі пасля таго сталі яны абмяркоўваць, як выйсці з становішча.

А становішча было такое, што ім нікуды нельга было падацца, апрача таго лесу, што віднеўся наперадзе за кіламетр ці трохі болей. Невядома, ці здолелі б хлопцы праплысці такую адлегласць у адзежы, у сцюдзёнай вадзе, каб гэта была рака ці возера. А на залітым вадою балоце яны мелі шмат «станцый» для адпачынку — дрэвы, кусты і проста неглыбокія мясціны.

Было каля поўдня. Неаглядная водная прастора іскрылася на сонцы. З захаду ледзь дыхаў цёплы ветрык. Вада ціхенька плюхалася каля дрэў. Уверсе са свістам праляцелі дзве качкі. Сонца прыемна саграваала мокрае адзенне хлопцаў. Настрой у іх палепшыўся, асабліва ў Віктара. Ён нават пачаў жартаваць:

— Калі-небудзь, можа, будзем дзякаваць, што так здарылася. Тут табе і мора, і аварыя карабля, і таемны востраў, а там сустрэнуцца дзікуны, бегемоты, кракадзілы, тыгры...

— Невялікае шчасце сустрэць тыгра з голымі рукамі,— сказаў Мірон.

— А ты хочаш, каб табе ўсё гатовае было? Тады лепш было сядзець дома.

— Я і згадзіўся б цяпер лепш сядзець дома. Можа, каб апісаць усё гэта ў кніжцы, дык які-небудзь дурны хлопец і захацеў бы быць на нашым месцы. А я наперадзе не чакаю нічога добрага.

— Эх, ты! — з пагардай сказаў Віктар.— Што будзе з цябе далей, калі ты ўжо цяпер раскіс?

Мірон усміхнуўся.

— Прадбачыць — гэта не значыць раскіснуць. Паглядзім яшчэ, хто будзе больш трывалы. Але час ужо ў дарогу. Эх, не хочацца зноў лезці ў сцюдзёную ваду!

— Пачакай, можа, варта яшчэ пашукаць нашага чоўна? Можа, ён зачапіўся дзе? — сказаў Віктар.— Маё дрэва вышэйшае, я з яго пагляджу.

— Дзе там! — безнадзейна махнуў рукой Мірон.— Гэтая гладкая калода нават не мае чым зачапіцца. Ды і вір круціць тут на ўсе бакі.

— Так яно і ёсць! — сказаў Віктар, калі зірнуў зверху.— Вунь ён ужо выходзіць у возера. Прыйдзецца плысці.

І хлопцы пусціліся ў далейшую дарогу.

Вельмі хутка яны пераканаліся, што плысці ў адзенні — гэта вялікая пакута. Мокрае адзенне і рухацца перашкаджала, і ўніз цягнула. Спачатку хлопцы маглі праплысці без адпачынку якую сотню метраў, а потым усё менш і менш. Справа ўскладнялася яшчэ тым, што «станцыі» размяшчаліся зусім не так, як хацелася б. Дрэвы траплялiся вельмі рэдка, і не заўсёды былі яны па дарозе. Часта прыходзілася адпачываць проста ў вадзе, трымаючыся за верхавіны кустоў. А тады цела яшчэ больш дубянела ад холаду. Таму, калі сустракалася дрэва, на якое можна было ўзлезці, то хлопцы больш радаваліся магчымасці пагрэцца на сонцы, чым адпачынку. А кракадзілы і тыгры больш ужо не прыходзілі ў галаву — не да таго было.

Метраў за трыста ад берага хлопцы адчулі пад нагамі зямлю. Калі сталі, то вада даходзіла ім да грудзей. Радасць была надзвычайная. Але зноў бяда: дно аказалася такое дрыгвяное, што ісці па ім не было ніякай магчымасці.

— Ведаеш што? — сказаў тады Віктар.— Давай скарыстаем закон Архімеда.

— Якім чынам? — здзівіўся Мірон ад нечаканасці.

— Калі мы апусцімся ў ваду па шыю, то зробімся лягчэйшымі на столькі, колькі важыць выціснутая намі вада.

— Так.

— Значыцца, мы не будзем загразаць у балоце і пойдзем сабе ўпрысядку, як па шасэ. Вось паспрабуй.

Апусціліся ў ваду — сапраўды ногі не загразаюць. Але як толькі пасунуліся наперад,— пачалі загразаць нават горш, чым раней.

— Вось табе і Архімед! — з прыкрасцю сказаў Віктар.

— Не Архімед вінаваты, а мы самі,— разважліва прамовіў Мірон.— Мы не ўлічылі, што, рухаючыся, павінны пераадольваць супраціўленне вады, а для гэтага вымушаны моцна ўпірацца ў дно.

Такім чынам, хлопцам прыйшлося плысці нават на неглыбокім месцы. Толькі што можна было часцей адпачываць, стоячы на купінках, ды грэцца на сонцы.

Нарэшце яны наблізіліся да берага на такую адлегласць, што рукі пачалі даставаць зямлю. Але стаць усё роўна было немагчыма — зараз жа ногі правальваліся ў багну.

— Што ж цяпер рабіць? — разважаў Віктар, калі прыпыніўся апошні раз на кусце.— Ні плысці, ні ісці нельга.

— Значыцца, трэба паўзці на руках,— сказаў Мірон, выпрастаўся нерухома на вадзе і лёгка паплыў, перабіраючы рукамі па зямлі. За ім пусціўся Віктар.

— Ну як? Цяпер Архімед дапамагае? — спытаў Мірон.

Каб выправіць сваю папярэднюю памылку і паказаць, што ён не горш за Мірона разумее гэтае пытанне, Віктар паспяшаўся даць тлумачэнне:

— Цяпер у нас супраціўленне вады зусім невялікае, і нам не трэба моцна ўпірацца рукамі.

Усё ішло добра, пакуль цела трымалася ў вадзе. А калі яны падплылі да берага метраў на пяцьдзесят ды «селі на мель», тады ўжо ніякім спосабам нельга было рухацца далей. Немагчыма было ні абаперціся рукамі, ні стаць на ногі — ад кожна-

га руху хлопцы яшчэ больш загразалі ў балоце. Хоць ты назад вяртайся!

Яны чапляліся за кожную ламачыну, за леташні чаротнік, каб толькі знайсці сабе апору. Паступова яны набралі ў рукі па цэлай вязанцы сухога чаротніку і галля, а затым Віктар выступіў з канкрэтнай прапановай:

— Калі мы не можам паўзці, абапіраючыся на рукі, то паспрабуем паўзці, абапіраючыся на вязанкі, вось так...

Моцна трымаючы дзвюма рукамі вязанку, ён закінуў яе наперад, а потым падцягнуўся да яе ўсім целам. Першы крок быў зроблены. А за ім пайшлі далейшыя крокі, цяжкія, марудныя, але кожны з іх крыху набліжаў жаданую сушу.

Выбраліся на бераг ледзь жывыя, аблепленыя тванню, дрыжачыя ад холаду. На шчасце, бераг выдаўся вельмі ўтульны. Досыць высокі, сухі, ён глядзеў на поўдзень і добра награваўся праменнямі сонца. Пад аховай векавых хвой тут не адчувалася ні малейшага ветрыку; ад нагрэтай зямлі патыхала цеплынёй, як у добры летні дзень. Асабліва вабілі да сябе пляміны чыстага белага пяску. На яго і паваліліся нашы падарожнікі.

— А тут было б зусім нядрэнна, калі б...— пачаў Віктар млявым голасам.

— Калі б не гэтае «калі б», было б сапраўды добра,— згадзіўся Мірон.— Але калі мы засохнем у такім стане, то будзе яшчэ горш,— мы зробімся муміямі.

— Для цябе гэта асабліва небяспечна, бо ты тады зломішся,— засмяяўся Віктар.

— Ды і табе не лепш будзе,— адказаў Мірон.— Трэба змыць гэтую гразь.

Але так не хацелася ўставаць, распранацца. Цішыня, стома, цеплыня хілілі да сну. Праз некалькі хвілін Мірон зноў сказаў:

— Трэба памыць і высушыць адзенне, пакуль сонца грэе.

— Трэба,— пацвердзіў Віктар.

І абодва засталіся ляжаць нерухома. Праз некаторы час Віктар сказаў:

— Нічога не зробіш, трэба ўставаць.

— Трэба,— пацвердзіў Мірон.

І зноў абодва засталіся ляжаць.

Зноў прайшло некалькі часу. Тады Мірон рашуча сказаў:

— Так нічога не выйдзе. Давай па камандзе: р-раз!

— Два! — падхапіў Віктар.

А «тры» не сказаў ні той, ні другі — так хацелася яшчэ хвіліначку паляжаць.

Многа яшчэ прайшло такіх хвіліначак, пакуль, нарэшце, бадай абодва разам крыкнулі «тры», усхапіліся на ногі і пачалі распранацца.

Адзежы ўсёй разам было: дзве пары бялізны, двое штаноў, дзве верхнія кашулі, пара ботаў (Міронавы), пара чаравікаў (Віктаравы), скураная куртка (Віктарава), суконная світка (Міронава), пара рваных шкарпэтак (Віктаравы), параануч (Міронавы) і дзве шапкі.

Ператрэслі кішэні і падлічылі ўсю сваю маёмасць наогул.

Віктар перш за ўсё ўхапіўся за свой табак. Зверху махорка зрабілася на кашу, а ад паперы нічога не засталося.

— Эх, шкада дабра! — уздыхнуў ён і асцярожна пачаў выцягваць сваё багацце і раскладаць яго на зямлі.— Дзе яго цяпер возьмеш?

— І добра! — сказаў Мірон.— Прынамсі, курыць адвыкнеш.

— Ну не, брат! Я лепш есці адвыкну.

— Цяпер для мяне гэта было б вельмі дарэчы,— спакойна прамовіў Мірон і выцягнуў з кішэні мокрую скарынку хлеба.

— Хлеб?! — падскочыў Віктар.

— Ціха, ціха! Ты ж толькі што казаў, што можаш не есці, абы махорка была. Выбірай — або хлеб, або махорка.

— Тады ліха з табой, не трэба,— пакрыўдзіўся Віктар.

Мірон таксама старанна палажыў сушыцца свой хлеб і нават сабраў усе крошкі.

Калі вытраслі ўсе свае кішэні, то ў абодвух насы апусціліся яшчэ ніжэй. Агульная маёмасць была: махорка, скарынка хлеба, аловак, адна насавая хустачка, восем рублёў семдзесят чатыры капейкі грошай і чатыры мокрыя запалкі ў расплясканым мокрым карабку.

— Нават запалак не маеш! — упікнуў Мірон.— Адзіны выпадак трапіўся ў гісторыі чалавецтва, калі курэц мог быць карысным для грамадства, ды і то...

— Запалак я меў досыць, але яны з усімі іншымі рэчамі былі ў торбе, якую ты пусціў па вадзе,— агрызнуўся Віктар.— А вось у цябе нават ножыка няма.

— Дык і ён жа застаўся ў маёй торбе,— панура адказаў Мірон.

Але спрачацца не было часу. Яны знайшлі клін чыстай вады, выпаласкалі ўсё сваё адзенне і ў чатыры рукі выкруцілі так, што ў ім, здаецца, не толькі вады, але і жывой мясціны не павінна было застацца. Развесілі на сонцы, а самі селі ў пяску пад карэннямі вялікай хвоі. Скардзіцца на холад яшчэ нельга было, але сонца няўхільна апускалася, а адзежа сохла марудна. Беражна расклалі на сонцы і ўсю іншую маёмасць, асабліва запалкі.

— А табе не даводзілася ўжываць высушаныя запалкі? — пытаўся Мірон.— Ці гараць яны?

— Не даводзілася.

— Вось бачыш: такая простая рэч, а ты не ведаеш.

— А ты?

— Дык я ж не куру.

— Гэта ж не толькі для курэння патрэбна. Эх, ты! — паківаў галавой Віктар.— Разважаць толькі любіш.

Віктар увесь час скоса пазіраў на хлеб. Не цярпелася і Мірону. Узяў ён вільготны кавалак, разламаў напалам, працягнуў Віктару. З'елі гэты кавалак і яшчэ больш захацелі есці.

— Каб ведаў, лепш бы зусім не еў,— бурчаў Віктар.

— Прывыкай, браток, не тое яшчэ будзе,— суцешыў Мірон.

— Хоць бы закурыць,— прамовіў Віктар, гледзячы на сваю махорку.

— Добра і так,— сказаў Мірон.

Дагэтуль яны неяк не мелі часу падумаць пра свой далейшы лёс: кожную хвіліну перад імі стаяла бліжэйшая, непасрэдная справа. Цяпер жа, калі сядзелі галышом пад дрэвам і чакалі, пакуль высахне адзежа, яны маглі больш падумаць пра заўтрашні дзень.

— А што, калі нам некалькі дзён давядзецца валэндацца тут, пакуль выберамся? — разважаў Віктар.

— О, гэта было б вялікім шчасцем! — прамовіў Мірон.

— Дзякую за гэткае шчасце! — чмыхнуў Віктар.— А есці што будзеш? Можа, яшчэ з голаду зойдзешся.

— Вось таму я і лічу за шчасце пабадзяцца некалькі дзён, а не тыдняў ці месяцаў,— панура сказаў Мірон.

— Можа, скажаш яшчэ — стагоддзяў,— усміхнуўся Віктар.

— І гэта можа быць,— сур'ёзна адказаў Мірон.— Нашы косці могуць знайсці і праз некалькі стагоддзяў!

— Эх ты, нуда хадзячая! — скрывіўся Віктар.— Табе на печы б сядзець, а не пускацца ў падарожжа. Чуў я шмат разоў, як людзі блудзілі па лясах, але не чуў аніводнага разу, каб у нашых лясах гэтак хто-небудзь загінуў. Гэта табе не бразільскія лясы, не афрыканскія пушчы.

— Чаго ты пнешся? Магу цябе запэўніць, што я таксама не вельмі прагну тут загінуць,— апраўдваўся Мірон.

— Ну, дык няма чаго рыхтавацца да смерці! — адрэзаў Віктар.

Хоць сонца яшчэ свяціла, але ўжо не грэла. Доўгія цені паступова пакрывалі светлыя мясціны. Хлопцы адчулі холад.

— Нічога не зробіш, прыйдзецца надзяваць сырую адзежу,— уздыхнуў Мірон.

— Дармо! Дасохне на целе,— бадзёрыўся Віктар.

Калі яны адзеліся, Віктар неяк нерашуча сказаў:

— Можа, пойдзем далей?

— Куды ты цяпер пойдзеш? — адказаў Мірон.— Нават па знаёмай дарозе рызыкоўна пускацца ў такі час. А гэтак мы напэўна праблытаемся ўсю ноч дарэмна. Наўрад ці блізка ў гэтых месцах ёсць паселішча. Якім бы ні было чынам, а прыйдзецца тут пераначаваць.

За ўвесь сённяшні дзень гэта было адзінае пытанне, па якім не адбылося спрэчак паміж таварышамі. Пачалі рыхтавацца да начлегу. Зрабілі сабе логава ў сухім пяску між карэнняў, падгарнулі сухога лісця і шыльніку.

Нарэшце надышоў самы вялікі, урачысты і адказны момант — здабыванне агню. Сэрцы ў хлопцаў застукалі мацней,

рукі дрыжалі. Мусіць, з такім самым пачуццём тысячагоддзі назад у якім-небудзь першабытным храме людзі прыступалі да здабывання свяшчэннага агню.

— Ці высахлі яны?

Памацалі з усіх бакоў — здаецца, высахлі.

Чыркнуў Віктар раз, другі — нічога... Толькі белы след застаўся на карабку.

— Мусіць, не досыць высахлі,— сумна сказаў Мірон.— Болей псаваць не варта.

— Мая кашуля ўжо высахла, я палажу іх пад паху,— сказаў Віктар.

А пакуль што прытуліліся ў сваім логаве без агню.

II

Першая ноч.— Начная дужанка.— Заяц, які дзюбаецца.— Апошнія запалкі.— Дадому.

Сонца ўжо зайшло, але яшчэ цэлую гадзіну трымаўся шэры змрок. Над возерам са свістам праляталі качкі, спяшаліся на начлег. Уверсе пачуўся жураўліны крык. Вось ён мацнее, робіцца больш выразным: відаць, жураўлі спускаюцца на адпачынак.

— Вось добра было б, каб які-небудзь журавель ці гусь сеў нам на галаву! — прамовіў Віктар.

— Што б ты ▪ ім рабіў без агню? — уздыхнуў Мірон.

— З'еў бы сырога.

Мірон перавярнуўся на спіну, зірнуў на зоркі. Яны так прыгожа зіхацелі! Ласкава шапталіся верхавіны дрэў. Мусіць, дома цешацца цяпер добрым веснавым надвор'ем, а яны...

— Вось да чаго даводзіць свавольства! — нібы сам да сябе прамовіў Мірон.— Каб мы папрасілі човен у гаспадара, дык цяпер людзі ведалі б, дзе мы, і прыехалі б па нас. А так, нават калі і знойдуць дзе човен, то не будуць ведаць, якім чынам ён там апынуўся. Паслухаўся цябе...

— Ну-ну, няма чаго наракаць,— нездаволена забурчаў Віктар.— Ніхто цябе не прымушаў. Калі ты такая цаца, дык

не трэ было згаджацца. А ісці за паўкіламетра шукаць гаспадара і ў цябе самога не было ахвоты. З'есці збіраліся мы гэтую душагубку, ці што? Каб не такі выпадак, вярнулі б на месца — і ўсё.

Мірон змоўк. Усё роўна справы не паправіш. А спадзявацца на дапамогу няма чаго. Ніхто іх тут не ведае. Калі і бачыў хто, што паплылі недзе нейкія два хлопцы, то нікому не прыйдзе ў галаву пацікавіцца, дзе яны дзеліся. Прыйдзецца самім шукаць дарогі.

Паветра рабілася ўсё больш сырым і халодным. Добра яшчэ, што ветру не было. Крыху дапамагала таксама тое, што, шчыльна прытуліўшыся, яны маглі грэць адзін аднаго.

Час цягнуўся марудна. Голад і холад не давалі заснуць. Хлопцы вымушаны былі варочацца з боку на бок. Задрамалі, але хутка так змерзлі, што пачалі ляскаць зубамі. Было, мусіць, пасля поўначы. Віктар не вытрымаў і ўскочыў.

— Гэй, уставай! — штурхануў ён Мірона.

— А? Чаго?..

— Выклікаю цябе на спаборніцтва!

— А? Што?..

— Уставай дужацца!

— Што? Чаго? — мармытаў Мірон.— Не лезь!

Але Віктар ухапіў Мірона за ногі і павалок па зямлі. Мірон не толькі ачухаўся, але раззлаваўся.

— Ты чаго лезеш? — закрычаў ён.— Чаго спаць не даеш? Я цябе зараз...

— Ціха, ціха! — сказаў Віктар.— Я цябе не біцца выклікаю, а дужацца. Дужацца, каб сагрэцца. Разумееш?

— А!..

І сярод начной цішы пачалася дужанка... Віктару хутка ўдалося паваліць Мірона. Той пакрыўдзіўся:

— Пачакай! Пачакай! Ты ж не даў мне добра ўзяцца, адразу накінуўся. Давай яшчэ раз, вось так. Паглядзімо, як цяпер...

І дужанка зноў пачалася, ды яшчэ як заўзята!..

Змарыліся, паляглі. Паспалі крыху і зноў пачалі варушыц-

ца. Раптам недзе побач пачуўся дзікі, прарэзлівы крык. Крык жудасны і разам з тым нейкі жаласны, нібы хто душыць малое дзіцяня...

Жах ахапіў хлопцаў. Мімаволі яны шчыльней зашыліся між каранёў.

Крык не спыняўся, і нават непадалёк, у кустах, чулася нейкая тузаніна.

Тут ускочыў Віктар і кінуўся ў кусты.

— Мірон! Сюды хутчэй! — зараз жа пачуўся яго крык.

Спачатку Мірон зазлаваў на Віктара, чаму гэта ён адзін кінуўся ў бяду, але ў той жа момант сам апынуўся каля Віктара. Той нешта трымаў, і гэтае нешта білася і вырывалася.

— Трымай! Хутчэй! — зноў крыкнуў Віктар.

Мірон учапіўся рукою за поўсць нейкага звера.

— Што гэта за звер такі? — здзівіўся ён.

— Трымай, трымай мацней! Заяц! — засопшыся, казаў Віктар.

Мірон учапіўся абедзвюма рукамі за зайца, але зараз жа адну руку адхапіў, бо нехта моцна ў яе дзюбануў.

— Ай, ай, заяц дзюбаецца! — крыкнуў ён з жахам.

— Трымай мацней! А то ўцячэ! — тузаўся тым часам Віктар.

Мірон зноў ухапіўся дзвюма рукамі.

— Што ж гэта робіцца? — крыкнуў ён.— Ніколі не чуў, каб заяц дзюбаўся!

— Я ж пугача трымаю! Гэта ён. Трымай зайца, а я гэтаму лупатаму зараз галаву раструшчу.

І ён стукнуў птушку галавой аб дрэва. Потым гэтак жа забілі і зайца.

— Адкуль ты ведаў, што там дзеецца? — запытаўся Мірон, калі яны са здабычай вярнуліся на сваё месца.

— Жаласны піск паказваў, што гэта нейкі невялікі звярок трапіў у бяду. Тузаніна ў кустах сведчыла, што і вораг яго не надта моцны, калі яны так доўга тузаюцца. Потым пачулася нібы пляскание крылаў, і тады мне прыйшла ў галаву думка, што гэта, мусіць, якая сава напала на зайца, як гэта часта пішацца ў кнігах. Але ж і запусціла кіпцюры ў спіну!

Сама хацела вырвацца, ды не магла, таму і ўдалося схапіць. А цяпер паспрабуем запалкі, можа, ужо будуць гарэць.

Тыцнуўся Віктар туды-сюды, а запалак няма.

— Згубіў у час тузаніны,— прамовіў ён у роспачы.

Хацеў быў накінуцца на яго Мірон, але раздумаў.

— Знойдзеш заўтра,— сказаў ён лагодна.— Ды, мусіць, і страта невялікая, бо, відаць, усё роўна з іх толку не было б.

— А есці хочацца...— неяк жаласна сказаў Віктар.

— Ты ж казаў, што мог бы есці сырое. Вось і еш.

— Ну, ну! Лёгка казаць. Але ўсё ж такі, што мы будзем рабіць заўтра?

— Заўтра і будзем меркаваць,— сказаў Мірон і лёг у сваё логава.— А цяпер будзем спаць. Вось палажы сабе з другога боку зайца — хай грэе, а я палажу пугача.

Нарэшце дзённыя і начныя турботы змарылі хлопцаў, і яны заснулі так моцна, што, мусіць, цяпер іх не разбудзіў бы ні гром, ні мароз. А калі яшчэ паднялося сонца ды прыгрэла іх, то яны праспалі аж да палудня. Прачнуліся, селі, азіраюцца.

— Учора гэтай парой як пад'еў...— пачаў быў Віктар.

— Давай лепш пашукаем запалкі,— перапыніў яго Мірон.— Тады і пад'ясі.

Расплюснуты карабок з дзвюма запалкамі знайшлі хутка. З хваляваннем чыркнулі — запалка засіпела і больш нічога. А другая нават і не засіпела...

— Ну і ліха з імі! — раззлаваўся Віктар і ўскінуў на спіну зайца.— Хадзем лепш дахаты.

— А што рабіць з гэтай дурной савой?

— Вядома, браць. Гэта ж добры ўлоў. Зробім чучала і паставім у нашым прыродазнаўчым музеі з надпісам: «Злоўлены ў Палескай пушчы героямі-падарожнікамі і даследчыкамі Міронам Бажком і Віктарам Калягай уласнымі рукамі, без ніякай зброі». Нават і зайца я згодзен ахвяраваць для навукі і славы.

І яны пайшлі ўздоўж возера ў той бок, дзе павінен быў знаходзіцца іх дом.

III

«Па-а марам!» — Усё направа ды направа.— Зайцаў абед.— Зноў на тым самым месцы.

Шпарка ішлі яны наперад па сухім бары. Злева час ад часу выблісквала возера. Бярозы, алешыны, вербалоз з маленькімі светла-жоўценькімі лісточкамі атачалі яго, нібы мярэжкі. Елкі і сосны на гэтым фоне здаваліся зусім чорнымі. Вясёлае веснавое сонейка шнырыла паміж дрэў і цешыла і расліну, і птушку, і ваду, і нашых хлопцаў.

Прырода, вясна і маладосць напоўнілі іх жыццярадаснасцю. Нават на голад забыліся.

— Па-а марам, марам, марам, мара-ам! — зацягнуў Віктар.

— Сёння тут, а заўтра там! — падхапіў Мірон.

А ў адказ ім загуло ў лесе: «А-а-ам!»

— Ведаеш што? — звярнуўся Віктар да Мірона.— Я ўжо шкадую, што мы накіраваліся дадому. Я ахвотна б згадзіўся пажыць тут некалькі дзён. Тут табе і мора, і першабытны лес, і звяроў можна рукамі лавіць.

— Ды і я нічога супраць не меў бы,— усміхнуўся Мірон,— але есці няма чаго.

— А гэта што? — пакруціў Віктар зайца над галавой.

— А якім чынам яго засмажыш?

— Здабудзем агонь, як гэта робяць дзікуны,— і ўся табе музыка.

— А хлеба, солі дзе ўзяць?

— Булкі, чаю, каўбасы! — перадражніў Віктар.— Эх, ты! А як жа эскімосы ды папуасы жывуць увесь век без гэтага. А ты і некалькі дзён баішся пражыць.

— Пачакай, яшчэ, можа, давядзецца і супраць нашай волі пажыць тут,— прамовіў Мірон, калі глянуў наперад.

Там мясцовасць паніжалася, пераходзіла ў балота, а за ім далёка зноў блішчала вада.

— Бачыш, і там вада. Значыцца, трэба зварочваць.

Павярнулі направа. Цяпер пайшла ўжо нізіна; пад нагамі





чвякала і пырскала вада. Густы ельнік яшчэ болей перашкаджаў ісці. Яны стараліся скарыстаць кожную магчымасць, каб пасунуцца ў свой бок, налева, але кожны раз павінны былі адступацца назад.

Знайшлі былі больш-менш сухую невысокую граду, якая цягнулася на поўдзень, але хутка выявілася, што гэта быў толькі клін, які ўпіраўся ў возера ці балота,— хто яго цяпер разбярэ! Прыйшлося вяртацца назад.

Гэтак ішлі яны гадзіны са тры. Настрой у абодвух даўно ўжо сапсаваўся. Не толькі ў Віктара ў чаравіках, але і ў Мірона ў ботах хлюпала вада. Змарыліся хлопцы страшэнна, а голад пачаў так дапякаць, што і вясна і ўвесь свет зрабіліся нямілымі.

— Гэтак, чаго добрага, і другую ноч давядзецца начаваць тут! — у роспачы сказаў Віктар.

— Ты ж толькі што казаў, што хацеў бы пажыць некалькі дзён,— упікнуў Мірон.

— А ну цябе! — махнуў рукой Віктар.

Потым ён схіліўся і пачаў скубсці ды есці нейкую траву. Прыгледзеўся Мірон і ўбачыў светленькія далікатныя круглыя лісточкі так званай «заечай капусты».

— Значыцца, будзем абедаць? — сказаў ён.

Палажылі сваю здабычу і пачалі «пасвіцца».

Доўга яны жывіліся, змарыліся яшчэ болей. Нарэшце Мірон спыніўся і сказаў:

— Годзе ўжо, а то яшчэ захварэць можна.

Пасля «абеду» захацелася піць. Вада ў возеры была мутная. Трэба было шукаць лужыны, дзе яна адстаялася. Гэтая вада фактычна і была іх адзінай ежай за апошнія суткі.

Было гадзіны тры-чатыры пасля паўдня.

— Ідзём цяпер на захад, можа, там выберамся,— сказаў Мірон.

Пайшлі на захад. Мясцовасць была некаторы час даволі высокая. Пайшоў прыгожы сухі бор. Але хутка зноў уткнуліся ў балота. Прыйшлося зноў паварочваць направа.

Віктар раззлаваўся:

— Гэтак мы абыдзем навокал і зноў прыйдзем на старое месца. Скідай штаны! Трэба чаго б ні каштавала вырвацца адсюль. Тым болей што з гэтага боку возера няма, а толькі балота.

Яны адважна рынуліся ў багавінне. Трэба аддаць справядлівасць нашым хлопцам: паказалі яны сябе тут сапраўднымі героямі. Працiскаліся, караскаліся, скакалі з купіны на купіну, загразалі, выцягвалі адзін аднаго, пакуль... зноў не ўбачылі возера!

— Значыцца... мы на востраве?! — амаль шэптам сказаў Віктар.

— Невядома яшчэ,— запярэчыў Мірон.— Па-першае, мы не ведаем чацвёртага боку, а па-другое, бачыш, з вады вытыркаюцца кусты і нават дрэвы. Значыцца, гэта толькі паводка. Пойдзем хутчэй назад, каб паспець да вечара агледзець апошні бок.

Непрыемная была справа наогул, але цяпер больш за ўсё было крыўдна, што дарэмнымі аказаліся ўсе іх гераічныя намаганні. Хлопцы прасунуліся досыць далёка, і цяпер столькі ж трэба было ісці назад.

Выбраўшыся на сухое месца, яны зараз жа, нават не памыўшыся, накіраваліся на поўнач. Тут менш было клопату: адразу пераканаліся, што выйсці нельга. З гэтага боку яшчэ загіналася і возера, а між ім і берагам залягала на два-тры кіламетры балота.

Калі надышоў вечар, хлопцы стаялі каля таго самага дрэва, якое дало ім першы прытулак...

— Ну, што скажаш на ўсё гэта? — звярнуўся Віктар да Мірона.

— Скажу, што наша становішча ў тысячу разоў лепшае, чым у тых, хто трапіў на пустэльны і бязлюдны востраў сярод акіяна. А мы не раз зайздросцілі ім, калі чыталі пра гэта ў кнігах.

— Дзякую табе за такую дабрату.

— Хіба няпраўда? Нам прыйдзецца толькі пасядзець тут тыдзень ці два, пакуль спадзе вада. А ў тых людзей такой надзеі не было.

— Добра казаць — тыдзень ці два. А як пражыць іх без нічога?

— А гэта ўжо будзе залежаць ад нас саміх.

— Хіба хто выпадкова заедзе сюды?

— Лепш на гэта не спадзявацца, бо з кожным днём возера будзе адсоўвацца ад нас і застанецца балота, праз якое ніхто не палезе.

— Але ж з голаду дайсці можна за гэты час! Я ўжо не магу больш цярпець.

— Ну, калі прыйдзецца паміраць з голаду, то можна не толькі сырога зайца, але і пугача з'есці. Ад мяса, хоць і сырога, людзі не паміраюць.

Спакойныя разважанні Мірона трохі супакоілі і Віктара. Прынамсі, цяпер яны ведаюць, што́ іх чакае і што́ ім трэба рабіць.

— Вось тваё жаданне і збылося,— усміхнуўся Мірон.— Можаш цяпер і агонь здабываць, і жыць тут, як дзікун.

— Яно так,— паскроб патыліцу Віктар,— але на справе гэта зусім не так добра, як здавалася раней.

Сонца спускалася за лес. Апошнія праменні яго слізганулі па воднай прасторы, а затым накіраваліся ўгору. Загарэліся верхавіны дрэў, нібы сонца цяпер асвятляла іх больш, як удзень. Зайгралі на небе markнакаляровыя воблачкі, якіх, здаецца, да гэтага часу і не было. Ад вады дыхнуў халадок. Цішыня была поўная.

Пачуццё адзіноты ахапіла хлопцаў. Чаго яны сюды забраліся, далёка ад людзей, ад сваіх блізкіх? Што ім тут рабіць? А калі і як выберуцца — яшчэ невядома. Нездарма з іх смяяліся таварышы, калі пачулі аб іх намеры. Такія думкі ўпарта лезлі ў галаву і Віктару і Мірону, але гонар не дазваляў прызнацца ў гэтым не толькі перад таварышам, але і перад самім сабою. Голад, які яны сцішалі толькі вадой, з кожнай хвілінай мучыў іх усё больш і больш. Па меры таго як садзілася сонца, узмацняўся і холад.

— Давай рабіць бярлогу! — крыкнуў Віктар, страсянуўшы плячыма, нібы адганяючы ад сябе і холад, і голад, і сумныя думкі.

У пясчаную ямку, дзе начавалі мінулую ноч, яны звалаклі ўсё сухое, што маглі знайсці вакол сябе, і ў дадатак яшчэ наламалі кучу яловых лапак. Атрымалася бярлога, ад якой не адмовіўся б і сам мядзведзь.

Хлопцы залезлі ў яе, некаторы час прыладжваліся і круціліся, як квактуха ў гняздзе, затым сцішыліся. Але, нягледзячы на стомленасць, адразу заснуць не маглі. Становішча, у якім яны так нечакана апынуліся, было вельмі непрыемнае. Ці паспеюць яны вярнуцца да пачатку заняткаў у тэхнікуме? Колькі дзён трэба на тое, каб вада сышла? Як пражыць гэтыя дні? Колькі трывогі будзе дома, калі яны спозняцца!.. Адным словам, было над чым задумацца.

IV

Вось табе і няхітрая навука! — Прыйшлося пакаштаваць сырога зайца.— Дынама-машына.— Агонь! — Крыўда Віктара.— Навуковая дыскусія.

— Толькі пачатак цяжкі,— казаў раніцою Мірон, устаючы,— а вось другая ноч была зусім нядрэнная. Можа, і да голаду прывыкнуць можна будзе. Прынамсі, цяпер я не адчуваю яго.

Не адчуваў голаду пакуль што і Віктар, толькі ў роце было неяк нядобра.

Паўстала пытанне, што спачатку рабіць: ці «хату» будаваць, ці агонь здабываць? Спрачацца не прыйшлося — аднагалосна прызналі, што агонь важней. Але як прыступіцца да гэтай справы?

— Неяк церці ды круціць трэба сухія трэскі,— прамовіў Віктар.— А як яно робіцца — ты ведаеш?

— Ну, гэта навука няхітрая,— адказаў Мірон.

Узялі два сухія кавалкі і пачалі церці адзін аб адзін. Церлі доўга, цярпліва, некалькі разоў мяняліся. Але агню не было. Праўда, кавалкі так нагрэліся, што дакрануцца да іх нельга было. Але да агню было яшчэ далёка.

— Пачакай! — крыкнуў Віктар.— Трэба ж падрыхтаваць сухой губы і іншай трухі. Само дрэва полымем не загарыцца.

— Ведаю я гэта,— адказаў Мірон,— але пакуль што няма ад чаго губу запальваць. Гэтыя трэскі толькі награюцца — і ўсё. Як жа яны запальваюцца? Няўжо не памятаеш? Ты, мусіць, не раз чытаў.

— А ты не чытаў? Чаму ж ты не ведаеш?

— Ды неяк не звяртаў увагі на падрабязнасці. Пішуць, што труць і круцяць, а як — не цікавіўся.

— Каб ведаць, што яно спатрэбіцца...— уздыхнуў Віктар.

— Не ўмеем мы ўважліва чытаць кнігі,— з роздумам сказаў Мірон,— столькі разоў чытаў, а як — не заўважыў.

— Лепш тады выбіць агонь крэменем,— прапанаваў Віктар.

— Вядома, лепш, каб яго знайсці,— згадзіўся Мірон.

Але дзе там было знайсці крэмень сярод балота!

Думка аб тым, што агню здабыць не ўдасца, зусім збянтэжыла хлопцаў. На момант яны адчулі, што ім нічога не хочацца рабіць, што іх нішто не цікавіць і што сонца ўжо не грэе. Але праз хвіліну Віктар крыкнуў:

— Падрыхтуй ты чаго-небудзь сухога на распал, а я буду церці хоць цэлы дзень. Галоўнае — не спыняцца.

Сцяўшы зубы, ён зноў пачаў церці — моцна, упарта, доўга. Кроплі поту падалі на дрэва і бадай-што сіпелі ад гарачыні, а дыму не было. Нарэшце абодва кавалкі пакрышыліся ў руках. Віктар злосна кінуў іх і пачаў выціраць лоб.

— А можа, і загарэлася б, каб дрэва было цвярдзейшае,— нерашуча прамовіў Мірон.

Віктар толькі рукой махнуў:

— Дзе там! Каб туды ішло, то была б хоць якая-небудзь іскра ці дымок. А тут толькі гарачыня — і больш нічога.

— Але ў кнігах пішуць...

— Хай бы той сам паспрабаваў, хто піша,— сказаў Віктар, цяжка дыхаючы.

Ён стаяў, апусціўшы рукі, нібы толькі што вылез з вады. Мірон ніколі не бачыў у свайго прыяцеля такога выразу твару, як цяпер: гэта быў не жыццярадасны юнак, а сталы муж-

чына з суровым тварам і складкамі на лбе. Віктар нешта абдумваў. Затым цвёрдымі крокамі падышоў да зайца, падняў яго і пачаў разглядаць, адхіляючы пальцамі ў некаторых месцах поўсць.

— Што ты хочаш рабіць? — з жахам спытаў Мірон, здагадваючыся, у чым справа.

— Тое, што зрабіў бы на нашым месцы кожны разумны чалавек,— спакойна адказаў Віктар і, набраўшыся духу, нібы збіраўся кінуцца галавой у палонку, запусціў зубы ў спіну зайца...

Трэба адзначыць, што ў дадзеным выпадку «геройства» Віктара было не ў тым, што ён з голаду адважыўся пакаштаваць сырога мяса, а ў тым, што ён аднымі толькі зубамі, праз поўсць і скуру, дабраўся да гэтага мяса. Гэта была вельмі цяжкая, складаная і непрыемная аперацыя...

— Ну, як? — затоіўшы дыханне, запытаўся Мірон, калі Віктар нарэшце адкусіў і праглынуў кавалак.

— Пакаштуй,— адказаў Віктар і працягнуў яму зайца.

Мірон нерашуча ўзяў, пакруціў яго, нацэліўся быў укусіць, але адклаў.

— Не,— прашаптаў ён,— не магу. Пакуль яшчэ не паміраю — пачакаю.

Віктар усміхнуўся.

— Не скажу і я, каб смачна было. І кусаць другі раз таксама пачакаю. Думаю, пакуль што і гэты кавалак што-небудзь дасць для арганізма. Але ўсё ж такі лічу за лепшае з'есці сырога мяса, чымся паміраць. Ну, смялей!

— Пачакай крыху, паспею,— прамовіў Мірон і зноў палажыў зайца на зямлю.

— Не надта паспееш,— сур'ёзна сказаў Віктар.— Калі доўга будзеш чакаць, то мяса і сапсавацца можа.

— Хоць трошкі пачакаем,— адмаўляўся Мірон,— а пакуль паспрабуем яшчэ іншым спосабам. Я там бачыў добрую палку.

Ён прынёс сухую гладкую альховую палку і падаў Віктару.

— Пастарайся завастрыць яе, а я пайду пашукаю яшчэ што-небудзь.

Віктар, не доўга думаючы, пусціў у ход свае зубы.

— Што ты робіш?! — крыкнуў Мірон і выхапіў палку.— Ты ж замочыш яе! Ты як-небудзь інакш.

Тады Віктар пачаў вастрыць яе аб дрэва, потым уціснуў канец у шчыліну ў дрэве і пачаў круціць. А Мірон пайшоў у лес.

Праз некаторы час ён закрычаў:

— Віктар! Сюды! Хутчэй!

Віктар пабег. Мірон стаяў каля зрэзанага пня і трымаў у руках некалькі шырокіх трэсак.

— Хіба ты не мог без мяне прынесці гэтыя трэскі? — сказаў Віктар.

— Не тое. Зірні, вунь некалькі зрэзаных пнёў.

— Ну дык што ж?

— Значыцца, тут людзі бываюць. Значыцца, мы не на бязлюдным востраве. Значыцца, і выхад павінен быць.

— Гэта, браце, невялікая радасць. Напэўна, гэта магло быць толькі ўзімку, праз возера. А сядзець тут да зімы...

— І то праўда, я забыўся,— збянтэжана адказаў Мірон.

Пачалі наладжваць новую прыладу.

— У дошчачцы трэба выкалупаць ямку,— тлумачыў Мірон.— Уставім туды востры канец палкі, вось так. Я каменем буду паступова прыціскаць зверху, а ты круці палку то ў адзін, то ў другі бок.

Лёгка было сказаць,— «выкалупаць ямку». А калі дайшло да справы, то гэтае «калупанне» без прылады аказалася вельмі нялёгкай і маруднай справай. Колькі трэсачак пераламалі! Ды яшчэ трэба было сачыць, каб яны былі зусім сухія, бо інакш ямка зрабілася б вільготнай.

Нарэшце падрыхтоўчыя работы былі скончаны.

Віктар узяў палку між далонямі і пачаў круціць. Але машына спынялася кожную хвіліну: то рукі саслізнуць, то камень, то Мірон занадта прыцісне. Нарэшце Віктару далоні пачалі балець.

— Ды яно нават і не награецца,— з прыкрасцю сказаў ён.— І якім гэта чынам дзікуны робяць? Мы прызвычаіліся з пагардай зваць іх дзікунамі, а самі — дурнейшыя ад іх. Тут патрэбна спецыяльная машына, каб круціць.

Мірон стаяў, апусціўшы галаву, і напружана думаў. Нарэшце ён крыкнуў:

— Успомніў! Успомніў! Трэба зрабіць лук, абкруціць адзін раз палку напятай струной і піліць, як на скрыпцы. Яна тады і будзе круціцца як след. Калісьці я нават і малюнак такі бачыў у адной кніжцы.

— Пачакай яшчэ скакаць,— недаверліва сказаў Віктар.— Мы ўжо рабілі па кніжцы.

— Тое, ды не тое,— упэўнена адказаў Мірон.

Знайсці і зламаць патрэбную галіну было няцяжка. Але што на яе напяць? Азірнуліся навакол, зірнулі на сябе.

— Давай шнурок ад сваіх чаравікаў! — крыкнуў Мірон.

Прыладзіліся. Падрыхтавалі губу, драбнюсенькія трэсачкі. Пачалі шмаргаць лукам. Справа пайшла іначай. Нават Віктар пачаў спадзявацца.

— Дынама-машына, дый годзе! — засмяяўся ён.

Сучок круціўся, ямка паглыблялася.

— Поўны ход! Без перапынкаў! — камандаваў Мірон.

Віктар і без гэтага стараўся ваўсю. Але праз некалькі мінут лук як тарганецца ды як скокне ўбок!.. Ледзь Віктару вока не выбіў: гэта шнурок перапіліўся і парваўся.

— Вось няшчасце! — усклікнуў Віктар.— Чаму ж ты два шнуркі разам не скруціў?

— А чаму ж ты сам не сцяміў?

— Усё сам ды сам, а твая галава навошта?

— Няўжо ты забыўся, што гэты спосаб і шнуркі я прыдумаў, а не ты?

Тут Віктар убачыў, што даў маху. Але ж не ўступаць жа з-за гэтага! І ён, рыхтуючы шнуркі, усё ж такі бурчаў, абы толькі не маўчаць, абы толькі мець апошняе слова:

— Рана хваліцца новым спосабам — невядома яшчэ, што з яго выйдзе. А шнуркі знайсці на чужых нагах кожны здолее. Я і сам здагадаўся б, каб падумаў...

— ...месяцы са два,— у тон яму прадоўжыў Мірон. Віктар паглядзеў на яго і... шчыра зарагатаў.

Разарваны шнурок звязалі і скруцілі з цэлым. Але зноў бяда: вузельчык перашкаджаў прыладзе рухацца!

Тады хлопцы накруцілі вакол шнуркоў тонкіх карэньчыкаў. Пасля таго ўся вяроўка зрабілася таўсцейшай, вузельчык схаваўся, і ў дадатак яшчэ наогул магутнасць машыны павялічылася ў шмат разоў.

Зноў пачалі шморгаць лукам. Цяпер ужо цягаў Мірон, а Віктар прыціскаў палку каменем. І калі ўжо здавалася, што вось-вось пакажацца дымок, камень саслізнуўся, і машына павалілася набок.

На гэты раз ужо Мірон не вытрымаў:

— Выходзіць, на які ўчастак цябе ні паставіць, заўсёды там будзе аварыя.

— Ды хіба ж я хацеў? — пакорна апраўдваўся Віктар.

Мірон і сам ведаў, што Віктар не вінаваты, таму нічога болей не сказаў.

Зноў пусцілі машыну. І вось, нарэшце, паказаўся дымок!..

— Ура! Давай, давай яшчэ! — закрычалі хлопцы.

Дымок павялічваўся, пілавінне зачарнелася і... бліснула іскра!

— Падгарні падпал! Дзьмухай! Дзьмухай!..

Праз хвіліну хлопцы сядзелі ля агню. На тварах іх свяцілася такое шчасце, якога яны ніколі не адчувалі яшчэ ў сваім жыцці. Надыходзіў вячэрні змрок, і ад гэтага яшчэ ўтульней было каля агню.

— Нездарма першабытныя людзі пакланяліся агню,— разважаў Мірон,— нездарма і рэлігіі вядуць пачатак адсюль. Мне самому хочацца маліцца на яго. Усе мы так прызвычаіліся да агню, нам так лёгка здабываць яго, што нам здаецца, нібы гэтак заўсёды было і інакш быць не можа. Толькі ў такім становішчы, як мы, можна добра адчуць, што такое агонь, можна ўявіць, як жылі тыя людзі, што не ведалі яго.

Ён пяшчотна падкладаў трэскі і сачыў, як языкі полымя лізалі іх. Змрок згушчаўся. А разам з гэтым ярчэла святло ад агню.

І Віктар сядзеў нерухома, не зводзячы вачэй з агню. Яны нават на некаторы час забыліся на ежу.

Нарэшце Віктар ускочыў і крыкнуў:

— Навошта ж я тады сырое мяса еў? Ты выкруціўся ад гэ-

тага, а я дарэмна пакутаваў. Не, брат, так нядобра. Ты таксама павінен пакаштаваць.

Ён ухапіў зайца і пачаў соваць яго Мірону ў рот. Пачалася вясёлая тузаніна.

— Пачакай! — крыкнуў Мірон, засопшыся.— Ты ж цяпер маеш перавагу. Табе гэта нічога не пашкодзіла, а між тым ты можаш цяпер хваліцца, што ўсё пражыў на сваім вяку, нават сырое мяса еў.

— А што ты думаеш? Яно і сапраўды так,— згадзіўся Віктар.— Ну, давай гатаваць вячэру.

Але зараз жа выявілася, што справа зусім не такая простая: не было нажа! А без яго аніяк нельга было дступіцца да зайца.

— Вось дык задача! — засмуціўся Віктар.— Хоць ты яго цалкам кідай у агонь.

Ён круціў зайца і так і гэтак, пераламаў яму ногі, але больш нічога, вядома, зрабіць не мог.

— Выходзіць, што зноў трэба зубы ў ход пускаць,— сказаў ён.— Але на гэты раз прыйдзецца ўжо табе.

— Пачакай,— адмахнуўся Мірон,— трэба што-небудзь прыдумаць. Можа, які востры камень знойдзецца? Я пашукаю.

Але было цёмна і можна было шукаць толькі каля сябе.

— Цяпер і я табе магу лекцыю прачытаць,— важна сказаў Віктар.— Вострага каменя ты тут не знойдзеш, бо ўсе камені нанесены сюды ледавікамі і талай вадой з далёкай поўначы. Па дарозе яны або перацерліся ў пясок, або адшліфаваліся ў круглыя галачкі. Нават больш-менш вялікіх каменняў тут не знойдзеш: яны засталіся далей на поўнач, напрыклад, у Полаччыне.

— Ведаю я гэта,— адказаў Мірон, але ўсё ж поўзаў на каленях і капаўся ў пяску.— Не можа быць, каб аніводнага, нават невялікага каменьчыка не было. А калі ён будзе круглы, дык яго можна разбіць на кавалкі.

Віктар аж засаромеўся: яму ў гэты момант зусім не прыйшла на думку такая простая рэч, што камень можна пабіць. Віктар тады і сам узяўся шукаць.

Доўга прыйшлося ім папоўзаць, пакуль знайшлі невялікі гладкі, крыху сплюшчаны камень. А калі захацелі пакрышыць,— дык не было чым і аб што!

— Вось табе і на! — сказаў збянтэжаны Мірон.— Трэба, значыцца, шукаць другі.

Але знайсці другі камень цяпер не было надзеі. Віктар усміхнуўся:

— Не выкруцішся, брат,— грызі зайца!

— А вось паглядзім! — упарта сказаў Мірон, адшпіліў рэмень і ўзяўся за жалезную спражку.— Гэтая штука выратуе. Асабліва калі яе яшчэ павастрыць аб камень.

— Вось хітры, чорт! — прамовіў Віктар.

Мірон пачаў вастрыць сваю прыладу аб камень, але ён быў зусім гладкі, і жалеза коўзалася без жаданых вынікаў. Тады Віктар падбег да балота, зачарпнуў у жменю вады, змяшаў з пяском і прынёс Мірону.

— Вось табе рацыяналізацыя,— сказаў ён.

«Рацыяналізацыя» трошкі дапамагла. Хоць навастрыць спражку, як нож, і нельга было, але канты зняць удалося. Тады выявілася новая бяда: гладкі, закруглены край спражкі так ёмка слізгаў па скуры, што не пакідаў знаку.

— Зноў не тое! — з прыкрасцю вымавіў Віктар.

— Тады зробім, каб было тое,— спакойна адказаў Мірон.

— Якім чынам?

— Пастукаем аб камень, зробім насечкі, каб не слізгала. Так сказаць, па прынцыпу пілы.

— Па прынцыпу пілы-ы! — з жартаўлівай павагай паўтарыў Віктар.— Гэта я разумею.

Спражка пачала драпаць скуру і пакідаць сякі-такі след. Але тут выявіўся новы недахоп: «лязо» было надта кароткім і больш прыходзілася пароць рогам, чым рэзаць ці пілiць рабром. А рог акурат быў зусім тупы, прыйшлося цяпер завастраць яго.

Адным словам, кожны раз выяўлялася, што трэба і можна яшчэ і яшчэ палепшыць прыладу. Нарэшце Віктар сказаў:

— Чаму было нам адразу так не зрабіць? А то цэлую гадзіну ўсё патрошкі выдумваем.

— Відаць, адразу з галавы, без практыкі, не надта выдумаеш,— адказаў Мірон.— Я думаю, мы за гэтую гадзіну прайшлі шлях, які першабытны чалавек праходзіў гады, стагоддзі...

— ...тысячагоддзі! — жартаўліва падказаў Віктар.

— І тысячагоддзі! — сур'ёзна сказаў Мірон.— Першабытны чалавек еў сырога зайца гэтак жа, як і ты. А колькі часу прайшло, пакуль ён здабыў агонь? Першабытны чалавек не меў ніякай прылады, як і мы. А колькі часу прайшло, пакуль ён надумаўся скарыстаць камень? А колькі часу прайшло ад каменя да жалеза?..

— Пачакай, пачакай,— перапыніў Віктар.— Тут ужо ты няправільна разважаеш: жалеза ты не выдумаў, а гатовае ўзяў.

— Ну добра,— згадзіўся Мірон.— Але апрацоўку і прыстасаванне яго першабытны чалавек прыдумаў, напэўна, не за гадзіну. Вось разам і набяруцца не толькі тысячы год, а нават мільёны. А ў нас з табою і дня не прайшло.

— Няма чаго задавацца,— зняважліва адказаў Віктар.— Тваё вынаходствы не твая заслуга, а ўсіх папярэдніх пакаленняў, у тым ліку і першабытных людзей. Твайго тут і макавінкі не знойдзецца. А каб не было нікога да нас, то мы з табою таксама выдумлялі б мільёны гадоў.

Гэтыя размовы мелі тую карысць, што на некаторы час адцягнулі думкі хлопцаў ад голаду. Затым прылада была пушчана ў ход. Які гэта быў «ход», лепш ужо не гаварыць... У кожным разе, роля прылады зусім не адпавядала той навуковай дыскусіі, якая вялася вакол яе. Аднак з дапамогай трэсак, сучкоў, пальцаў абодвух хлопцаў яна выканала сваю задачу: атрымалася некалькі бясформенных кавалкаў мяса, якія Мірон і закапаў у жар.

— А можа, лепш над агнём? — сказаў Віктар.— Я чытаў, што гэтак робяць.

— А я чытаў, што ў попел кладуць,— адказаў Мірон.— Другі раз паспрабуем над агнём. Паспеем яшчэ вывучыць розныя спосабы.

Калі мяса пачало скварыцца і сіпець, пакуты хлопцаў яшчэ больш павялічыліся.

— Цягні, досыць будзе! — крычаў Віктар кожную хвіліну.

Нарэшце выцягнулі.

Што за смажаніна выйшла, які смак мела,— невядома, бо з'едзена яна была ў адзін міг. І толькі пасля гэтага пайшлі розныя заўвагі:

— А здаецца, мы яго не датрымалі.

— Шкада, што солі няма. Была б зусім іншая рэч.

— Эх, каб хоць малюсенькую лустачку хлеба!

Затое тыя кавалкі мяса, што засталіся на заўтра, былі дасмажаны добра. Палажылі іх на трэсках пад дрэвам і пачалі рыхтавацца да сну. Настрой хлопцаў быў ужо зусім іншым.

— Закурыць бы цяпер,— сказаў Віктар і пайшоў шукаць сваю махорку. Але ў цемры не знайшоў. Узяў тады галіну з агнём — і ўбачыў, што ўся махорка параскіданая і патаптаная.

— Гэта ты зрабіў?! — крыкнуў ён на Мірона.

— Навошта яна мне здалася? — пацiснуў плячыма Мірон.— Мусіць, і твая праца тут ёсць. Памятаеш, як мы тады дужаліся...

Пачаў быў Віктар збіраць драбінкі, потым раззлаваўся і плюнуў.

— Вось і добра,— заўважыў Мірон.— Калі-небудзь падзякуеш, што так здарылася.

Назапасілі нанач галля.

— Каб нам не звесці агню,— трывожыўся Мірон.— Можа, па чарзе пільнаваць.

— Ну, не. Ад добрага вогнішча заўсёды застаецца пад попелам жар да раніцы.

Спаць класціся не спяшаліся. Абодва адчувалі сябе так спакойна і ўтульна, нібы яны былі ў самым звычайным становішчы.

— Толькі два дні мінула,— разважаў Мірон,— а мне здаецца, нібы некалькі тыдняў мы тут жывём. Але што мы будзем есці, калі прыйдзецца тут чакаць тыдзень ці два?

— Звяроў будзем лавіць, рыбу, птушак,— весела адказаў Віктар.— Цяпер, калі ёсць агонь, я ўжо нічога не баюся.

— Яно так, але як будзеш лавіць? — задуменна пытаўся Мірон.

— А як жа розныя дзікуны жывуць? — храбрыўся Віктар.

Праз гадзіну хлопцы смачна спалі, адчуваючы пяшчотную цеплыню ад свайго ў поце здабытага агню.

V

Таемны звер.— Навальніца.— Змаганне за агонь.

Ноч выдалася цёплая, ціхая. Але лес, відаць, не спаў. То пісне нейкая птушка, то прарэзліва крыкне сава, то храсне сухая галіна, то пачуецца ледзь значны шолах.

Агонь дагараў. Куча галля ўсё змяншалася, канцы ламачча тлелі навакол. У сярэдзіне было досыць вугалляў і жару, але святло ўсё слабела. Вуголле шарэла больш і больш, а разам з гэтым з лесу пачала насоўвацца цемра. Вось ужо агеньчык ледзь-ледзь блішчыць.

Тады ў лесе мільгануў цень нейкага невялікага звера. Рухаўся ён так ціха, што яго нельга было б пачуць, нават калі б хлопцы не спалі. Звер круціўся навакол то з аднаго, то з другога боку, усё бліжэй, бліжэй...

Ужо можна пазнаць, што гэта ліс. Але, на шчасце, ад гэтага звера хлопцам ніякай небяспекі не пагражала. Пакруціўся ліс крыху і знік.

Было ўжо за поўнач, але паветра не толькі не халаднела, а, здавалася, нават цяплела. Яно было нейкае густое, парнае. З захаду даносіўся прыдушаны грукат, мільгалі маланкі. Набліжалася навальніца...

Хлопцы спалі сабе і нічога не чулі. Мусіць, таму, што грукат быў глухі, безупынны і ўзмацняўся пастулова. Ён змешваўся з шолахам дрэў, а да такога шуму вушы хлопцаў ужо прызвычаіліся. Не прачнуліся яны і тады, калі ўпалі першыя кроплі цёплага дажджу.

Толькі зусім блізкі страшэнны ўдар грому прымусіў Мірона ўскочыць на ногі. Ён адразу ж разбудзіў Віктара. Прайшло некалькі хвілін, пакуль хлопцы разабраліся, у чым справа.

— Агонь! Агонь! — крыкнуў Віктар, ачухаўшыся, і кінуўся да вогнішча. Абодва разам пачалі дзьмухаць, падкладаць галлё.

А дождж пайшоў ужо як мае быць. Галлё сіпела, не хацела гарэць. Хлопцы ўткнуліся галовамі ў вуголле, распласталіся па зямлі і дзьмухалі з усёй сілы. А на спіны іх ліўся ўжо дождж, як з лубу.

Высокая хвоя, пад якой яны размясціліся, мела галіны надта высока, а дождж ішоў наўскасяк і без перашкод заліваў іх стаянку.

Вось ужо гром грукоча над самай галавой, маланка зіхаціць безупынна, вецер хістае дрэвы. Побач нават нешта ўжо храснула. Але небаракі нічога гэтага не чулі і не бачылі. Яны бачылі толькі сваё няшчаснае вогнішча, якое гінула на іх вачах. Тое галлё, якога яны панакідалі, не толькі не загаралася, але, наадварот, здаецца, канчаткова прыдушвала агонь. Спачатку яшчэ ішоў густы дым, а потым і ён пачаў змяншацца. Гэта было вернай адзнакай таго, што агонь памірае.

— К чорту гэта мокрае ламачча! — крыкнуў Віктар і пачаў раскідваць яго нагой.

— Што ты робіш? — з жахам крыкнуў Мірон. Але Віктар ужо зняў сваю скураную куртку і працягваў яму яе крысо.

— На, трымай! А ўсё лішняе — прэч!

Яны развесілі над агнём куртку, а Віктар падлез пад яе, сабраў вугольчыкі, якія не пагаслі яшчэ, падклаў маленькіх сухіх трэсачак і раздзьмухаў маленькі агеньчык.

Гэты агеньчык яны і пачалі абараняць. Таму што ён быў маленечкі, куртку можна было трымаць зусім нізка над ім, стоячы на каленях. Цяпер ужо і касы дождж быў нястрашны.

Можа, з гадзіну цягнулася навальніца і ішоў такі праліўны дождж, што, здавалася, мог заліць які хочаш пажар. Хлопцы даўно ўжо прамоклі да апошняй ніткі, здубянелі ад холаду, але нічога гэтага не адчувалі. Толькі напружана сачылі за ветрам і дажджом і па ветры нахілялі сваю заслону.

Маленькі агеньчык бесклапотна гуляў пад вопраткай, нібы малое дзіцяня, і зусім не думаў пра небяспеку, ад якой яго бароняць.

— Ура! Перамога! — закрычаў Віктар, калі дождж скончыўся.

«Малое дзіцяня» хутка вырасла ў вялікае вогнішча, і абаронцы поўнасцю былі ўзнагароджаны за свае турботы.

— Паддавай! Яшчэ, яшчэ! — насіліся яны па лесе, сцягвалі галлё, якое цяпер нават мокрае гарэла, бо вогнішча распалілі страшэннае.

Дым ад яго, здавалася, запоўніў увесь лес. А калі галлё згарэла, дык жару ад яго хапіла, каб высушыць адзежу: хлопцы ледзь паспявалі падстаўляць то адзін, то другі бок.

Спаць у гэтую ноч болей ужо не давялося — так і дачакаліся сонца.

VI

Мяса знікла.— На паляванне з голымі рукамі.— Здзекі ад зайцоў.— Вавёрка выратавала.— Дарэмны перапуд.— Абед з трох страў без другой.— Будаўніцтва з дапамогай дваццаці пальцаў.

На гэты раз з бяды выкруціліся. Трэба было брацца за будаўніцтва, каб забяспечыць сябе не толькі хатай, але і агнём.

— Прыйдзецца пабудаваць вялікую юрту,— казаў Віктар,— каб усярэдзіне і спаць можна было і каб для агню хапала месца.

— Не забывайся, што, апрача дваццаці пальцаў, у нас ніякага інструмента няма,— заўважыў Мірон.

— А пра нож забыўся?

— Які там нож! — махнуў рукой Мірон.— Спачатку зробім павець, пад якой можна было б хаваць агонь у час дажджу. Нават не для вогнішча наогул, а для маленькага запаснога агеньчыку. Вунь там, напрыклад, між карэннямі, можна.

— А калі так, то маленькі агонь можна і ў будане трымаць.

— Дым будзе, ды і месца для яго лішняе трэба.

Пачалі спрачацца.

— Калі так, то будзем галасаваць! — крыкнуў Віктар па прывычцы.

— Давай! — засмяяўся Мірон.

Віктар схамянуўся і таксама пакаціўся ад смеху. Гэты смех спыніў спрэчкі.

Яны ўбачылі, што і спрачацца не было чаго. Ніхто не перашкаджае падтрымліваць агонь і там і тут. Абы толькі сачыць і пільнаваць. Нарэшце згадзіліся перш будаваць хату.

— Толькі трэба спачатку падмацавацца,— сказаў Віктар і павярнуўся да ўчарашняга мяса. Шась сюды, шась туды — няма мяса!

— Што ж гэта такое? — развёў рукамі Віктар.— Можа, ты з'еў?

— Ну-ну! — абурыўся Мірон і таксама пачаў шукаць. За некалькі крокаў знайшлі невялікі абгрызены кавалак.

— Значыцца, нейкі звер сцягнуў. Ах, каб яго разадрала! — вылаяўся Віктар.— Відаць, тут шмат звяр'я шныряць, а мы пра гэта і не падумалі. Яшчэ на нас хто-небудзь нападзе.

— Такіх драпежнікаў у нас няма, каб самі нападалі на людзей. Хіба ваўкі ўзімку, ды і то зграяй. А што нашу апошнюю спажыву ўкралі — справа зусім дрэнная,— сумна прамовіў Мірон.

Становішча адразу павярнулася да іх другім бокам.

Не толькі шкада было гэтага мяса, але паўстала пытанне: як быць далей? Не кожны раз будзеш лавіць рукамі зайцоў, а што яшчэ можна зрабіць без зброі?

Віктар зусім апусціў рукі. Наколькі хутка і моцна выбухала ў ім энергія, настолькі хутка яна і знікала.

— Гэтак зусім прыйдзецца тут загінуць,— пахмура прамовіў ён.— Пойдзем лепш зноў шукаць броду. Калі яшчэ вада спадзе — невядома.

— Не, браток, гэтак нельга,— разважліва сказаў Мірон.— З роспачы кідацца ва ўсе бакі — апошняя справа. Трэба што-небудзь прыдумаць, каб спажывы дастаць, а тады ўжо шукаць броду.

— Што тут зробіш з голымі рукамі? — безнадзейна махнуў Віктар.

— Пойдзем пакуль на паляванне, а там пабачым. Відаць, і будаўніцтва прыйдзецца адкласці.

— Бадай, прыйдзецца і за пугача ўзяцца,— уздыхнуў Віктар.— Усё ж такі смажаны пугач павінен быць не горшым за сырога зайца.

Мірон узяў і па-гаспадарску агледзеў пугача. Пукатыя вочы, крывая дзюба нават цяпер пужаюць. Панюхаў яго Мірон і скрывіўся.

— Можа, яшчэ і нічога, але неяк верне ад яго. Пагледзімо, што будзе далей,— сказаў Мірон і палажыў пугача пад дрэвам.

Падклалі ў вогнішча таўсцейшых дроў і пайшлі «на паляванне». Накіраваліся ў сярэдзіну лесу, дзе яны яшчэ дагэтуль не былі. Па іх меркаваннях, яны тады прайшлі навакол кіламетраў дваццаць, значыцца, можна было лічыць, што невядомая ім мясцовасць мае кіламетраў шэсць упоперак. Прастора немалая.

— Ліха яго ведае, што там хаваецца,— казаў Віктар.— Можа, нават і небяспечнае што-небудзь для нас, бяззбройных. Разводдзе зрабіла гэты лес вострававам, на якім павінны ратавацца ўсе жывёлы, што жывуць у гэтых месцах.

І сапраўды, праз некаторы час спудзілі зайца, потым другога. Яны шмыганулі пад самым носам, але нашы «паляўнічыя» нічога не маглі ім зрабіць.

— Якая прыкрасць! — гарачыўся Віктар.— Гэтак яны хутка пачнуць здзекавацца з нас. Хоць бы лук які зрабіць.

— Мусіць, яно так і прыйдзецца,— адказаў Мірон,— а пакуль што хоць бы якую спажыву знайсці, каб можна было ўзяцца за будаўніцтва. Зірні, вунь каля таго дупла круціцца ваверка. Кажуць, што часам у іх можна пажывіцца.

— Пэўна, можна! — павесялеў Віктар і мігам пачаў карабкацца на дрэва. Ваверка спалохана крыкнула, пераскочыла на верхавіну і пачала там трывожна мітусіцца.

Дупло было не надта высока, каля яго ад ствала адыходзіла вялікая сухая галіна. Віктар хутка ўзлез, ёмка прыладзіўся на галіне і запусціў у дупло руку. Мірон выцягнуў сваю доўгую шыю і затоіў дыханне.

— Ну, што? — нецярпліва запытаўся ён.

— Нічога нельга дастаць, рукі не хапае,— азваўся Віктар.

— Давай тады я палезу: мае рукі даўжэйшыя.

— Нічога не будзе. Ніякіх адзнак, можа, і зусім нічога няма,— адказаў Віктар і збянтэжана ўсеўся на галіне.

Памаўчалі крыху.

— Вось што! — крыкнуў раптам Віктар.— Гэты бок дрэва тонкі і спарахнелы. Падай мне які-небудзь кол, я ім здолею развярнуць дзірку так, што нават і сам улезу.

Мірон зламаў тонкае дрэўца і падаў Віктару. Засунуў Віктар палку, націснуў — і зараз жа пасыпаліся трэскі і труха. Праз некалькі хвілін замест дзіры была доўгая шчыліна, і нарэшце Віктар мог дастаць гняздо.

— Ёсць нешта! — крыкнуў ён.

— Што? Што? — захваляваўся Мірон.

Віктар яшчэ папоркаўся, а потым як гаркне на ўсё горла:

— Арэхі! Шмат арэхаў!

Напхаў поўныя кішэні, потым пачаў сыпаць за пазуху, а там усё яшчэ было.

— Сып на зямлю, я ўсё падбяру! — крычаў Мірон.

Пасыпаліся арэхі, буйныя, поўныя, усе як на падбор. Нарэшце запасы скончыліся, і Віктар нават выцягнуў і пусціў па ветру гняздо.

— Навошта ты гняздо разбурыў? — закрычаў Мірон.— Хай бы ў падзяку хоць гнязда не чапаў!

— Усё роўна яна больш не будзе тут жыць,— сказаў Віктар і злез з дрэва.

Калі сабралі ўсе арэхі, то іх набралася кілаграмы са тры.

— За здароўе гэтага мілага стварэння! — сказаў Віктар, лузгаючы арэхі.

Панапхалі сабе арэхаў дзе толькі можна было і весела накіраваліся «дадому».

Праз некалькі крокаў Віктар спыніўся.

— Глянь! — крыкнуў ён.— Нібы грыбы нейкія. Можа, і іх можна скарыстаць? Але, здаецца, яны воўчыя.

Мірон нахіліўся. Ён убачыў бурыя грыбы,— нібы сушаныя грушы, панатыканыя вострымі канцамі ў зямлю. Безліч тонкіх, далікатных зморшчак надавала ім нейкі асаблівы выгляд.

— Гэта смаржы,— сказаў Мірон, калі ўважліва разгледзеў іх.

— А іх можна есці?

— Можна, і нават яны вельмі смачныя, але гэтыя занадта старыя. Смаржы — першыя нашы грыбы. Яны з'яўляюцца зараз жа пасля таго, як растане снег.

— Калі можна есці, дык няма чаго перабіраць, старыя ці маладыя.

— Ну, не. Старыя небяспечныя, атрутныя. Ды ў гэтых дробных зморшчках столькі пяску і featured рознага бруду, што іх і вымыць нельга.

— Пашукаем тады маладзейшых.

— Пашукаем.

Пачалі шукаць, але справа была вельмі марудная, бо амаль для кожнага грыба даводзілася складаць «камісію», каб вызначыць, стары ён ці малады. Пад пагрозай атруты выкінулі нямала і добрых грыбоў, але ўсё ж такі знаходзіліся і надзейныя. Вось ужо зараз будзе поўная шапка...

Але тут на шыю Мірону капнула некалькі кропляў дажджу.

— Дождж! — закрычаў ён не сваім голасам, нібы гэта капнула гарачая смала, кінуў шапку і паляцеў на сваіх цыбатых нагах так, што Віктар адразу згубіў яго з вачэй.

Адчуў некалькі кропляў і Віктар, але, зірнуўшы ўгору, убачыў, што вялікай небяспекі няма: лёгкія хмаркі хоць і пакрапалі крыху, але вялікім дажджом, здаецца, не пагражалі. Ён ухапіў Міронаву шапку і пабег за ім. Праз некалькі крокаў ён заўважыў на зямлі арэхі, спачатку невялікую палоску, а потым і спорную кучу. А кроплі болей не капалі.

— Стой! Назад! Арэхі рассыпаў! — закрычаў Віктар і пачаў збіраць арэхі. Праз некалькі хвілін вярнуўся і Мірон.

— Чаго ты паляцеў, нібы звар'яцелы? — накінуўся на яго Віктар.— Бачыш, дабро параструсаў! Дажджу ж няма.

— А ты забыўся, як мы баранілі агонь? — адказаў той.— Хочаш яшчэ раз рызыкнуць? Добра, што так абышлося. А бегчы тады, калі вялікі дождж пайшоў бы, было б позна.

Шукаць да апошняга арэха было марудна, знаходзіліся ж яны блізка ад сваёй стаянкі,— таму вырашылі рэшту арэхаў падабраць другі раз.

Да стаянкі было не болей, як паўкіламетра. Агонь захаваўся добра. Памылі смаржы, кінулі ў агонь. Грыбы зморшчыліся так, што нават не было чаго есці. Ды яшчэ попелу набралася ў зморшчкі столькі, колькі было дабра ў самім грыбе. Але ўсё ж такі страва выйшла досыць смачная.

— А ведаеш што? — сказаў Мірон.— Я лічу, што гэты попел з поспехам заменіць нам соль. Я недзе чытаў, што ёсць на зямлі куткі, дзе людзі наогул ужываюць попел замест солі.

— Ну і еш на здароўе, гэтага дабра хопіць,— адказаў Віктар.— Вось толькі шкада, што другой стравы няма, а прыходзіцца адразу прымацца за трэцюю, за арэхі.

— Затое наогул сёння наш абед — панскі. Далікатны і смачны.

Пасля абеду зараз жа ўзяліся будаваць сабе «хату». Доўга меркавалі, як гэта без сякеры і нажа ўзяцца за працу, і, нарэшце, знайшлі добры выхад. У тых кустах, дзе злавілі зайца, яны выбралі мясцінку, а над ёй звязалі дрэўцы, што раслі побач. «Зруб» выйшаў дасканалы, моцны. А пераплесці яго, зрабіць страху было зусім няцяжка.

Хата выйшла на славу. Каб чысцей было, падлогу засыпалі пяском, і ложкі зрабілі з леташняга чаротніку. Радасць хлопцаў была бязмерная. З якім заміламаннем яны аглядалі сваю пабудову, затыкалі кожную шчыліну, абламвалі кожную лішнюю галінку, цешыліся і знадворку і з сярэдзіны! Гэты зроблены іх уласнымі рукамі будан здаваўся ім найлепшым памяшканнем у свеце.

— Цяпер я згодзен жыць тут хоць усё лета! — цешыўся Віктар.

— Вось тут арэхі паложым, а ў гэтым куце — сухія дровы, каб падтрымліваць агонь у час дажджу,— гаспадарыў Мірон.

Калі будан (або «юрта», як казаў Віктар) быў гатовы, прыступілі да ўпарадкавання агню. Галоўную базу для яго выбралі ў той ямцы пад коранем дрэва, дзе было іх логава.

— Трэба выкапаць ямку глыбей, каб жар у ёй доўга захоўваўся,— меркаваў Віктар,— ды пусціць яе пад корань, каб вада не дабралася.

— Гэта было б добра,— сказаў Мірон.— Але ж мы гэткім чынам сапсуем вялікае каштоўнае дрэва.

Зірнуў Віктар на дрэва — высокае, магутнае, вельмі прыгожае. Лепш было б пад пнём ссечанага дрэва, але такога не відаць.

— Шкада дрэва,— уздыхнуў ён,— але справа ідзе аб жыцці двух савецкіх грамадзян. Мы адпрацуем дзяржаве за гэтае дрэва і пасадзім замест яго некалькі новых.

— Каб былі каменні, дык можна было б сякую-такую печку скласці,— сказаў Мірон.— У далейшым будзем гэта мець на ўвазе і не мінаць аніводнага каменя, які дзе ўбачым.

Узялі пад увагу і тую акалічнасць, што дажджы ў нас часцей за ўсё ідуць з захаду, таму пячурку зрабілі з усходняга боку дрэва. Для хатніх патрэб расклалі другое вогнішча каля свайго памяшкання.

Нарэшце ўсё было ўпарадкавана, і куток адразу набыў культурны выгляд. А будаўнікі на гэты час зусім забыліся, у якім становішчы яны знаходзяцца, і адчувалі сябе так добра, як ніколі.

Пад вечар шэрыя хмаркі ўсё ж такі сабраліся ў адну і затулілі ўсё неба. Пачаў пырскаць дробны дождждык, але цяпер ён быў няшкодным, нават адкрытае вогнішча ад гэтага не цярпела. Такое надвор'е не толькі не псавала настрою, але рабіла больш утульным памяшканне.

Уначы ў некаторых месцах зверху капала на хлопцаў.

— Бач ты,— бурчалі яны.— Здаецца, так шчыльна рабілі, а ўсё яшчэ працякае. Трэба будзе заўтра падправіць.

VII

Няўдалая спроба.— Да дзікуноў яшчэ не дараслі.— Рыбацтва кашуляй.— Уласнай гадоўлі рыба.

На другі дзень надвор'е выдалася зусім добрае. Вясна шпарка ішла наперад. Раніцою пайшлі падбіраць згубленыя ўчора арэхі і шукаць смаржоў. Арэхі падабралі, але добрых смаржоў не знайшлі: відаць, іх час зусім прайшоў.

— Давай зробім лук,— прапанаваў Віктар.— Можа, якога-небудзь дурнога зайца ўдасца аглушыць.

— А можа, мядзведзя хочаш? — засмяяўся Мірон.

Але на кожны выпадак узяліся за майстраванне. Выламалі па добраму арэхаваму дубцу, канцы іх абсмалілі на агні. Засечкі зрабілі Міронавай спражкай. Віктар напяў свае шнуркі, а Мірону не было чаго напінаць.

— Можна было б адрэзаць сваім нажом тонкі пасак ад рэменя,— сказаў ён,— але на гэта трэба патраціць некалькі дзён, ды і не спадзяюся я на гэтую зброю.

— А як жа дзікуны?

— Мы цяпер у горшым становішчы за дзікуноў. У іх лук быў вынікам шматвяковай культуры, сродкам здабывання спажывы, а для нас гэта цацка. Давай давядзём да ладу спачатку твой.

Найцяжэйшай справай аказалася зрабіць стралу. Выразаць сапраўдную стралу з сухога моцнага дрэва не было магчымасці. Прыйшлося ўзяць просты дубец ды абсмаліць яго. Падрыхтаваўся Віктар і стрэліў.

Пырснула страла ў паветра і звалілася за некалькі крокаў ад іх. Абодва пакаціліся ад смеху.

— Вось дык зброя! — крыкнуў Мірон.

— Ты не думай,— нібы сур'ёзна адказаў Віктар.— Каб там сядзеў заяц ды каб канцом страла трапіла яму ў вока, каб ад перапуду і неспадзеўкі ён кінуўся ў наш бок,— вось і была б здабыча. А такія выпадкі здараюцца. Мой бацька казаў, што яму аднаго разу без ніякай стралы заяц кінуўся пад ногі.

— Калі такім чынам, дык я згодзен,— смяяўся Мірон.

Яшчэ раз напяў Віктар лук, але на гэты раз выйшла яшчэ лепш: шнуркі разарваліся.

— Жарты ўбок,— сказаў Віктар сур'ёзна.— Я сам ведаю, што гэта глупства. Але няўжо ж мы не можам зрабіць лук сапраўдны, як у дзікуноў? У нас жа можа быць і скураная цеціва.

— Яно так,— адказаў Мірон,— але для гэтага і дрэва патрэбна больш адпаведнае, і трэба ведаць, як яго апрацаваць, умець рабіць стрэлы, ведаць усе іхнія капрызы і, нарэшце,

практыкавацца шмат часу. А самае галоўнае — мець нож. Можа, у далейшым нам і давядзецца ўзяцца за гэта. А цяпер лепш пойдзем паглядзім, ці нельга будзе дзе якую рыбіну злавіць.

— А чым будзеш лавіць?

— Паглядзім спачатку, што і як, а там убачым. Можа, і кашуляй ці штанамі можна будзе.

Пайшлі ўздоўж балота.

— Глянь, здаецца, вада пачынае спадаць,— заўважыў Віктар.

Яно і сапраўды так было. Вада крыху адсунулася. У розных месцах з-пад вады павытыркаліся новыя купінкі травы.

— Гэта добра,— сказаў Мірон,— але для рыбнай лоўлі застаецца менш магчымасцей, бо замест вады мы будзем мець балота.

Так ішлі яны цэлую гадзіну, шукалі даступнай вадзяной прасторы. Нарэшце падышлі да адной маленькай затокі. Вада клінам уразалася ў лагчынку між двума ўзгоркамі. Лагчынка была не балотная, пясчаная. Пасярэдзіне ўтварылася нібы возера, якое злучалася з сапраўдным возерам вузкай пратокай.

— А ў гэтым кутку павінна быць рыба,— сказаў Віктар.— Вада спакойная. Бачыш, як светла і ўтульна тут пад сонцам. А вунь і рыбкі мільгаюць.

І ён пачаў здымаць споднюю кашулю.

— Завяжам каўнер і рукавы, уставім абруч — вось і будзе сак, не горшы ад рыбацкага,— казаў ён, але праз некалькі хвілін крыкнуў: — Ах, каб на цябе кадук! Парваная! Здымі сваю.

Мірон зняў сваю кашулю. Завязаць яе ды ўставіць лазовы абруч было лёгкай і хуткай справай.

Праз некалькі хвілін нашы рыбакі ўжо ўлазілі ў ваду. Але хутка яны ўбачылі, што нічога ў іх не будзе, бо вада не выходзіла з кашулі і рыба нават пры добрым жаданні не магла трапіць у яе — вада не пускала.

— А ведаеш, твая падраная кашуля больш падышла б,— сказаў Мірон.

— Не, дзірка вялікая, ды яна адразу падралася б яшчэ болей. Як жа быць? Хіба вось што зробім: развяжам рукавы

і возьмем за канцы адной рукой, а другой будзем трымацца за абруч.

— А калі рыба палезе праз рукаў, дык яе — цап! — засмяяўся Мірон.— Давай гэтак.

Пачалі лавіць новым спосабам. Пайшло лягчэй, але нязручна было тое, што трэба было нахіляцца ў ваду па шыю, каб трымаць рукавы на належнай глыбіні.

Праз некаторы час Мірон закрычаў:

— Ёсць! Стой! Ах, вырвалася!..

— У-у, незграбайла! — раззлаваўся Віктар.

— Ды маленькая была,— апраўдваўся Мірон.

Праз хвіліну закрычаў Віктар:

— Ёсць! Трымай свой канец, каб не ўцякла! Да берага цягні, да берага! Падымай угору! Вялікая... Ой, кусаецца!

Цяжка было цягнуць на бераг кашулю, нібы бочку, поўную вады. Але ж, калі выцягнулі, дык знайшлі ў ёй дзесятак дробных рыбак, а ў Віктара ў руцэ быў двухфунтовы шчупак!

— Вось гэта дык здабыча! — цешыліся хлопцы.

Болей на гэты раз не хацелі лезці ў ваду, бо змерзлі.

— Куды яна дзенецца,— казаў Віктар.— Мы можам увесь час тут лавіць, нібы ва ўласнай сажалцы.

Але Мірон сумна паківаў галавой:

— Можа, ужо заўтра гэтай сажалкі не будзе. Не забывайся, што яна зрабілася толькі ў час паводкі.

— Вельмі шкада! — збянтэжана прамармытаў Віктар і ўтаропіў вочы ў ваду. А праз момант ён радасна крыкнуў:

— Дармо! Мы ж можам зрабіць перагародку вунь у тым вузкім месцы. Хай сабе вада сыходзіць, а рыба застанецца.

Зараз жа прыступілі да працы. Торкалі ў зямлю ўсё, што можна было ўторкнуць. Вельмі слабая была загарадка, але ж затое яны ўзялі колькасцю. Праз гадзіну грэбля каля метра шырыні аддзяляла затоку ад возера ці балота. Каб тут была бягучая вада, яна ў адзін міг разбурыла б іхняе збудаванне, але, на шчасце, гэтага можна было не баяцца.

— Вось рыба і ў палоне! — захапляўся Віктар.— Хай сабе гадуецца, а мы будзем браць колькі захочам і калі захочам.

Такая магчымасць значна ўзняла дух хлопцаў, бо з'явілася некаторая ўпэўненасць і ў заўтрашнім дні. Вечарам ля вогнішча Мірон разважаў:

— Пяці дзён яшчэ не прайшло, а якія змены адбыліся ў нашым становішчы! І агонь маем, і хату, і спажыву, нават сваю рыбную гаспадарку.

— Я больш быў бы задаволены, каб мы мелі сваю хлебапякарню,— сказаў Віктар, абгрызаючы выкачаную ў попеле касцістую рыбку.

Як кожны вечар, пасля дзённых турбот гутарка іх перайшла да хатніх спраў. Якімі далёкімі здаваліся цяпер гэтыя справы! Не верылася, што пры нармальных умовах за адзін дзень можна было б вярнуцца дадому. Пакуль не прайшлі дзесяць канікулярных дзён, вялікай трывогі там яшчэ не будзе. А калі яны пройдуць?..

VIII

Прасцейшая, але лепшая зброя.— Знаёмства з дзікам.— Журавіны.— Хоць змяю за здабычу.— Лясныя жыхары.— Царская жывёла.— Вожыкава булава.— Уперад на чарапаху!— Пешаход з Афрыкі.

— А што будзем сёння рабіць? — запытаўся на другі дзень Віктар.

— Я прапаную пайсці далей у лес на разведку,— адказаў Мірон.— Мы ж зусім не былі яшчэ ў глыбіні.

— Трэ было б якую-небудзь зброю мець,— заўважыў Віктар.

— Толькі не твой лук,— усміхнуўся Мірон.— Лепш зробім сабе добрыя дубіны.

Знайшлі адпаведныя дрэўцы, зламалі іх, абпалілі на агні, нават булдавешкі пакінулі на канцы. Зброя выйшла хоць куды!

— З гэткай зброяй я і на ваўкоў згодзен ісці! — казаў Віктар, размахваючы сваёй дубінай.

— І сапраўды, з дзвюма такімі штукамі не боязна,— згадзіўся Мірон і трэснуў па кусту так, што ад яго паляцелі шматкі.

Узялі з сабой арэхаў, падклалі галля ў агонь і пайшлі.

Чым глыбей уваходзілі ў лес, тым часцей сустракаліся сухія ўзгоркі. На вышэйшых пясчаных месцах рос хваёвы бор, на ніжэйшых — гушчар з ельніку, алешніку, бярозы, рознага хмызняку. Часам трапляліся прыгожыя лугавінкі з ліставымі дрэвамі: дуб, граб, ліпа.

— Ідзём да тых дубоў,— сказаў Мірон.— Можа, знойдзем леташніх жалудоў. Калі прыйдзе бяда, яны спатрэбяцца.

— Ды і без бяды кавы добра будзе папіць,— адказаў Віктар.— Трэба толькі мець начынне і цукар.

Калі падышлі да дубоў, то ўбачылі, што там нехта перад імі ўжо гаспадарыў. Зямля была перакапаная, віднелася шмат слядоў, а жолуда ніводнага. Але дзіўней за ўсё было тое, што сляды здаваліся свежымі.

— Хто б гэта мог быць? — задуменна сказаў Мірон.

— Дзікі! — упэўнена адказаў Віктар, разглядаючы сляды.

— Невядома, ці радавацца, ці шкадаваць, што знайшліся такія суседзі,— прамовіў Мірон.

Віктар чамусьці памахаў сваёй дубінай.

— Добра было б здабыць дзіка, але, кажуць, звер вельмі небяспечны. Калі раззлуецца, дык нават добрая зброя не паможа.

У гэты момант збоку нешта затрашчала. Хлопцы ўздрыганулiся і мацней сціснулі свае дубіны. З-за ламачча паказаўся дзік. Здавалася, увесь ён складаўся толькі з адной страшэннай галавы. Ні зада, ні кароткіх ног не было відаць, але ж бурая галава з шчаціністым хібам, натапыранымі вушамі, вялізнымі ікламі і маленькімі злоснымі вочкамі была жудаснай.

— Не рухайся! — прашаптаў Віктар.

Дзік спыніўся, задраў свой лыч, панюхаў паветра, глуха рохнуў і завярнуўся назад.

— Ну і страшыдла! — прамовіў Мірон.— Яго не толькі дубіна, але і гармата не возьме. Ліха з імі, з гэтымі суседзямі.

— Крыўдна ўсё ж! — пашкадаваў Віктар.— Гэткі выпадак, а ты стой ды глядзі, як дурань.

Пайшлі далей. У густым ельніку пачулі зусім блізка моцны лопат крылаў: здавалася, нейкая вялізная птушка заблыталася

ў галінах і не можа адтуль выбіцца. Зірнулі ў той бок і сапраўды заўважылі вялікага чорнага птаха. Ляцеў ён так нізка і так нязграбна махаў крыламі, што, здавалася, яго было зусім лёгка злавіць рукамі.

— Хапай яго! — кінуўся наперад Мірон.

Але Віктар не зварухнуўся.

— Дарэмна. Гэта табе так здаецца. Глушэц заўсёды так лятае ў ельніку, але ніхто яшчэ не лавіў яго рукамі.

— У такім разе хадзі сюды,— крыкнуў Мірон.— Я табе пакажу нешта другое.

Калі Віктар выбраўся на купчастую балоцістую палянку, дык убачыў, што Мірон схіліўся над журавінамі.

— Пакаштуй, якія яны смачныя, салодкія пасля зімы,— сказаў Мірон.— Шкада толькі, што гэтыя лясныя жыхары ўжо ласаваліся тут. І нам мала пакінулі.

З вялікай ахвотай падмацаваліся хлопцы ягадамі дыназбіралі яшчэ ў шапку.

— Нічога, жыць можна,— з задавальненнем сказаў Віктар.— Але ўсё ж такі мушу сказаць, што ўвесь час адчуваю сябе галодным, і ў роце і ў жываце неяк нядобра. Хоць бы кавалак хлеба ці якога-небудзь варыва — зусім іншая была б справа.

— Спачатку сырому зайцу быў рады, а цяпер ужо сапраўднага абеду захацеў,— засмяяўся Мірон.— У нашым становішчы трэба разважаць інакш: абы-чым, толькі б падтрымаць сябе. І галоўнае, каб разнастайная была страва. Вось чаму і журавіны вельмі карысныя. Гэта, брат, пладавіна, а ў ёй ёсць жалеза, вугляводы, вітаміны.

З поўнай шапкай журавін яны не хацелі ісці далей у лес, далі круг і накіраваліся назад. У адным месцы ўбачылі вялікую змяю. Яна ляжала, скруціўшыся, на пяньку і грэлася на сонейку. Галаву яна вытыркала ўверх і млява варушылася.

Віктар мігам падскочыў і забіў яе дубінаю.

— Ну і гадзіна! — сказаў ён і пакратаў змяю нагою.— Мусіць, з метр будзе.

Яны пасунуліся былі далей, але хутка Мірон прыпыніўся.

— Слухай,— сказаў ён,— у нашым становішчы шкада пакідаць здабычу, якая б яна ні была. Ці нельга будзе як-небудзь скарыстаць і гэтую?

— Ды што ж ты з яе зробіш? — засмяяўся Віктар.

— Не ведаю яшчэ. Але ў нашай бядняцкай гаспадарцы ўсё можа спатрэбіцца. Здымем з яе скуру.

— Хіба зрабіць з яе чучала для нашага тэхнікума, экземпляр добры,— згадзіўся Віктар.

Агідная была справа, але праз некалькі мінут скура была здзертая. На зямлі застаўся голы, брыдкі скрутак, а Віктар закінуў сабе на плечы скуру-кішку.

Ціха ішлі яны па лесе, пільна прыглядаючыся навокал. За гэты невялікі час, як яны апынуліся на востраве, прырода значна змянілася. Лісце на дрэвах загусцелася, трава паднялася. Здавалася, і птушак больш стала, мацней разлягаліся па лесе іх галасы. Вось пінькае лілавагрудая зябка, вось заліваецца чорны дрозд, свішча жоўтая івалга, стукаюць дзятлы. Заварушыліся розныя казюлькі, а ў цяньку пачуўся ўжо непрыемны звон камароў. Сям-там пераскакваюць з дрэва на дрэва вавёркі.

— Вось каб яшчэ арэхаў знайсці! — прамовіў Мірон.

— Разласаваўся,— усміхнуўся Віктар.— Не на кожным кроку гэта здараецца, брат ты мой. Нават каб і знайшлі такое самае дупло, дык гэта зусім не значыць, што там абавязкова будуць арэхі: маглі і вавёркі з'есці за зіму.

Тут па дрэве шмыгнула нейкая новая жывёліна, крыху падобная да вавёркі, толькі танчэйшая і даўжэйшая за яе. Колер скуры — руды, з белымі плямамі.

Мірон няўважліва зірнуў на яе і прамовіў:

— А гэта не вавёрка?

— Тсс! — шапнуў Віктар і прытрымаў рукою Мірона.— Гэта гарнастай!

— Няўжо ж ён такі нікчэмны? — здзівіўся Мірон.

— Зімою ён белы, а цяпер якраз змяняе зімовае адзенне на летняе. Самая галоўная яго адзнака — канец хваста, які заўсёды бывае чорным.

Гарнастай тым часам знік з вачэй.

Мірон зняважліва пацiснуў плячыма.

— А я думаў — гарнастай немаведама што такое. Раней жа ніхто не меў права насіць гарнастаевыя футры, апрача цароў ды князёў.

— Я думаю, каб цары прысвоілі сабе таксама выключнае права на лапці, тады і лапці лічыліся б найбагацейшай і самай моднай рэччу,— усміхнуўся Віктар.

Праз некаторы час натрапілі на вожыка. Убачыўшы небяспеку, небарака зараз жа скруціўся ў клубок. Хлопцы падышлі да яго і пачалі меркаваць, што з ім рабіць.

— Каб былі дома, то ўзялі б яго жывым на пацеху, а тут што з ім будзеш рабіць? Есці, мусіць, яго нельга,— разважаў Віктар.

— А трэ было б і яго як-небудзь скарыстаць,— напружана думаў Мірон.— Могуць, напрыклад, спатрэбіцца ягоныя іглы ў якой-небудзь справе.

— А ведаеш што? — схапіўся Віктар.— Калі ўзяць яго скуру ды абкруціць ёю канец нашай дубіны, дык будзе такая булава, што з ёю хоць на мядзведзя ідзі!

— Вось бачыш!

— Але ж як шкада забіваць гэтае мілае стварэнне! — уздыхнуў Віктар.

Аднак прыйшлося забіць. Да журавін і змяінай скуры далучыўся вожык. З гэтай здабычай яны і вярнуліся дадому. Было яшчэ рана, не пазней за поўдзень. Часу заставалася досыць для гаспадарскай працы. Паабедалі рыбай, арэхамі і журавінамі.

Скуру змяі павесілі сушыцца, а з вожыка пачалі рабіць булаву. Але ж і папакутавалі, пакуль знялі з яго скуру сваім «нажом»! Скрывавілі ўсе чатыры рукі. Затое булава выйшла на славу! Толькі Мірон усумніўся ў ёй.

— Супраць чалавека,— сказаў ён,— лепшай і не трэба. А што ты зробіш са зверам? Для яго гэтыя іглы — нішто.

— А ўсё ж такі лепш, як голая дубіна,— цешыўся Віктар.

Цяпер, калі непасрэдная пагроза голаду адсунулася, яны мацней адчулі недахоп адной дробязі — пасудзіны ці якога

чарапка для вады. Увесь час ім прыходзілася піць жменямі, а калі вада спала, то зусім дрэнна зрабілася: часам да чыстай вады нельга было даступіцца так, каб дастаць яе абедзвюма рукамі, і даводзілася піць брудную.

— Гэткае глупства ды так перашкаджае! — злаваў Віктар.— Пойдзем шукаць гліны, можа, злепім які чарапок.

— Хадзем па рыбу і па дарозе пашукаем,— згадзіўся Мірон.— Да захаду сонца застаецца яшчэ гадзін з пяць.

Але не так лёгка было знайсці гліну, як гэта здавалася. То пяскі, то балота,— а гліны ні знаку. Усё далей і далей зварочвалі яны ўбок. Падыходзячы да аднаго балотца, здалёк заўважылі, што на беразе яго нехта капошыцца. Хлопцы прыпыніліся і пачалі ціхенька красціся. Але чым больш набліжаліся, тым болей дзівіліся: гэты «нехта» не быў падобны ні на звера, ні на птушку. Проста штосьці круглае круцілася на месцы, станавілася рубам.

— Чарапаха! — прашаптаў Віктар.

Хлопцы спыніліся і пачалі наглядаць за ёй. Чарапаха была велічынёю з шапку. Яна неяк смешна і нязграбна прыстасоўвалася, каб хвастом выкапаць у зямлі ямку, і была так занята сваёю справай, што нічога не заўважала навакол. Хлопцы падпаўзлі зусім блізка.

— Што яна робіць? — прашаптаў Мірон.

— Ямку капае, каб пакласці туды яечкі,— шэптам адказаў Віктар.

— Ці не пачакаць, пакуль яна паложыць? Кажуць, яе яечкі вельмі смачныя.

— Можа, яны і сапраўды смачныя,— сказаў Віктар,— але і яна не дурная: яна ўмее зрабіць так, каб такія ласуны, як ты, іх не елі.

— Якім чынам?

— Вельмі проста: палажыўшы яйкі, яна мочыць іх нечым вельмі непрыемным.

— Не можа быць! Хто табе казаў?

— У кніжцы чытаў.

— Тады ўперад! На чарапаху! — крыкнуў Мірон.

Хлопцы выскачылі і мігам схапілі бездапаможную жывёліну. Бедная чарапаха схавалася ў свой панцыр.

— Як жа да яе даступіцца? — казаў Віктар, варочаючы яе ў руках.

— Прыйдзецца праз дзірку закалоць.

З жалем выканалі яны гэты непрыемны абавязак.

— Я думаю, не трэба нам цяпер далей ісці,— сказаў Мірон.— Адразу маем і вячэру, і пасудзіну.

Вярнуліся дадому. Нялёгка было выцягнуць чарапаху з яе панцыра, але вячэру на гэты раз хлопцы мелі выключную.

Пасудзіну таксама атрымалі добрую. Толькі крыху перашкаджаў ніжні, з чэрава, панцыр. Аднак Мірон лічыў, што гэта нават і лепш.

— Набіраць ваду і піць не перашкаджае, а разам з гэтым маем міску з накрыўкай.

— А ці нельга будзе ў ёй гатаваць ваду? — запытаўся Віктар.— Вельмі хочацца якога-небудзь чаю ці юшкі.

— Мусіць, нельга, бо яна рагавая і павінна смаліцца. Пачакай! — схамянуўся Мірон.— Мы ж можам мець чай, нават салодкі!

— Адкуль?

— Ды сок бярозавы!

— І як гэта нам раней у галаву не прыйшло! — пляснуў сябе па лобе Віктар.— Нават [illegible] бяросты можна было зрабіць пасудзіны для вады. Ах мы, дурныя!..

— Гэта ўжо такі закон чалавечага развіцця,— важна сказаў Мірон.— Спачатку ўся ўвага аддаецца на самыя галоўныя, першачарговыя патрэбы, а потым ужо чалавек можа падумаць пра іншае.

Сонца схілялася на захад.

— Пойдзем, паставім нанач нашу чарапаху, каб заўтра мець чай,— сказаў Мірон.

Пайшлі, выкалупалі ў бярозе дзірку. Але як падставіць сваю пасудзіну, калі яна з накрыўкай?

Мірон уціснуў у дзірку галінку, а другі канец прасунуў у чарапашыну.

— Хоць і марудна пойдзе і прападзе частка соку, але да раніцы набярэцца,— сказаў ён.

Над галавой іх нехта ціхенька праляцеў і ўчапіўся за суседнюю бярозу.

— Што гэта такое? — здзівіўся Мірон.— Ні птушка, ні кажан, ні вавёрка. Здаецца, поўсць нейкага шызага колеру. Ну, спец, растлумач.

Жывёла нязграбна поркалася ў вілаваціне бярозы. Віктар прыгледзеўся.

— Гэта ляцяга, або лятучая вавёрка,— сказаў ён нарэшце.— Хоць яна, як бачыш, і значна адрозніваецца ад вавёркі. Удзень яна звычайна сядзіць у сваім гняздзе.

— Колькі тут featureнага звяр'я, якога нават і не ведаеш,— пацісну плячыма Мірон.

— Каб гэты дзікі кут не быў добрым прытулкам для звяроў,— сказаў Віктар,— тады і нам не прыйшлося б тут сядзець.

— Чаму так?

— Вельмі проста. Калі тут многа звяроў, значыць, рэдка бываюць людзі, значыць, дабрацца сюды цяжка... А таксама і выбрацца,— дадаў Віктар.

«Крэк-крэк!» — пачуўся недзе голас драча.

— І ён тут! — здзівіўся Мірон.— Да гэтага часу я чуў яго толькі ў жыце.

— Гэта, мусіць, падарожны,— аўтарытэтна сказаў Віктар.— Відаць, толькі што прыйшоў з Афрыкі.

— Як гэта «прыйшоў»? — здзівіўся Мірон.

— Ды прыпёр пехатою і ўсё.

— З Афрыкі?

— Але.

Мірон зарагатаў.

— Ты не рагачы, я кажу сур'ёзна. Сам у кнізе чытаў. Яны дрэнна лятаюць і не любяць ляцець. Таму і лічаць за лепшае ісці і тады толькі падымаюцца, калі на дарозе вада ці іншая перашкода.

Мірон павінен быў паверыць, але доўга яшчэ смяяўся з гэтага дзіўнага пешахода.

— Усё было б нішто,— сказаў Віктар, калі яны палеглі ў сваёй будцы,— але накрыцца няма чым. Уначы халаднавата бывае.

— Затое гэта прымушае вылазіць і падтрымліваць агонь,— адказаў Мірон.— А іначай ён калі-небудзь можа і згаснуць.

IX

Салодкі чай.— Лекцыі Мірона.— Важная пані.— Драпежнік на рыбалцы.— Арэна для бойкі.— І змяя спатрэбілася.— Байцы ў палоне.

Раніцою пайшлі па «чай». Чарапашына была поўная, нават праз верх палілося. З якой прыемнасцю выпілі свежага салодкага соку!

— Адразу, здаецца, адчуў сябе мацней,— заўважыў Віктар.

— Яно так і павінна быць,— сказаў Мірон.— Тут ёсць цукар, які карыснейшы за мяса. Яго якраз і не хапала для нашых арганізмаў. Цукар падтрымлівае нервовую сістэму і асабліва карысны пры разумовай працы.

— Во! Гэта дарэчы! — перакруціўся на адной назе Віктар.— Я ўжо адчуваю сябе больш разумным і гатоў зараз жа распачаць культработу сярод тутэйшых жыхароў — зайцоў, вожыкаў, чарапах.

— Па тваёй балбатні не відаць, каб ты зрабіўся больш разумным,— упікнуў Мірон, але Віктар не пакрыўдзіўся.

Паставілі чарапашыну на месца і накіраваліся да сваёй рыбнай гаспадаркі. Дарога была знаёмая, ішла галоўным чынам уздоўж берага, звяроў тут хлопцы не чакалі, таму маглі больш увагі звярнуць на некаторыя цікавыя расліны, якіх да гэтага часу не заўважалі. Прыйшла чарга Мірону паказаць свае веды.

Ужо праз сотню крокаў Віктар зацікавіўся высокай хвояй з шараватаю гладкай карою і шызымі ігламі.

— Што гэта такое? — запытаўся ён.— Здаецца, ні сасна, ні елка.

— Ельніца,— адказаў Мірон.— Бачыш, іглы больш сціснутыя, а знізу во якія дзве сінявата-белыя палоскі. Шышкі падобныя да яловых, але больш тупыя.

— Дык яны ж растуць у Сібіры! — здзівіўся Віктар.

— А вось, бачыш, ёсць і ў нас. А сібірская ельніца і росту меншага, і іглы і шышкі напалову меншыя.

Мірон быў задаволены, што выявіў столькі ведаў, але праз некаторы час ён апынуўся ў досыць непрыемным становішчы. Яны натрапілі на невялікае дрэва з нейкім дзіўным лісцем: не то хваёвыя іглы, не то звычайныя вузкія лісцікі. Дзве паловы ліста складалі нібы жалабок, а каля ліставой пазухі былі прычэплены шурпатыя галачкі.

— А гэта якое дрэва, хваёвае ці ліставое? — запытаўся Віктар, упэўнены, што Мірон ведае.

Мірон пачаў яго разглядаць, але не мог прыпомніць.

— Гэта, гэта...— мармытаў ён і напружваў памяць.

— Эх ты, спец! — насмешліва сказаў Віктар.

— Ціс! — выпаліў Мірон.— Ведаю! Паўднёвая расліна, але належыць да хваёвых. Лісце атрутнае. Само дрэва вельмі моцнае. Вось з чаго нам трэба было б зрабіць лук! Не ведаю, як тут, а ў іншых месцах ціс можа жыць дзве тысячы гадоў.

— Ого! — крыкнуў Віктар.— І заўсёды такі маленькі?

— У іншых месцах вырастае нішто сабе, але наогул дрэва невялікае. Тут яно вельмі рэдка сустракаецца; бывае яшчэ ў Белавежскай пушчы. А далей на ўсход няма...

— Малайчына! Вытрымаў экзамен! — пляснуў яго Віктар па плячы.

Праз некаторы час звярнулі ўвагу яшчэ на адно невялікае хваёвае дрэва з маленькімі зялёненькімі іглямі, якія раслі паасобнымі мяцёлкамі. Віктар зацікавіўся ім.

— Глянь. Здаецца, нібы іглы ўсе маладыя, толькі што пачынаюць расці.

— Так яно і ёсць. Гэта — лістоўніца. Яна на зіму скідае свае іглы.

— Якая яна нікчэмная!

— Яна любіць горную камяністую глебу. Але ў некаторых месцах і ў нас добра расце. Яе часта ў нас штучна разводзяць.

Потым Мірон спыніўся каля травы з зубчастым, складаным лісцем. На верхавіне сцябла парасонам сабраліся пучкі, гатовыя распусціцца ў кветкі.

— Раю заўважыць гэтую расліну,— са смехам сказаў Мірон,— табе яна можа спатрэбіцца.

— Чаму ж так мне?

— А вось, калі пачнеш гарачыцца занадта, дык зробім адвар з кораня, каб супакоіць нервы. Гэта — валяр'ян.

— Глядзі, брат, каб табе не спатрэбілася, а я абыдуся,— адказаў Віктар.

— Каб назбіраць болей, то можна было б і скарыстаць. У аптэках ахвотна бяруць. Ды і наогул цяпер у нас усюды купляюць лекавыя расліны.

— У такім разе пачнём збіраць.

— Вось прыгледзімся спачатку, што яшчэ можна тут знайсці.

І ён больш пільна пачаў прыглядацца навакол. Але не на кожным кроку растуць лекавыя расліны. Да таго ж, было яшчэ рана, не ўсе расліны распусціліся як след, яшчэ менш цвілі.

Таму асабліва кінулася ў вочы, калі праз некаторы час яны заўважылі на спадзе, пад аховай дрэў, купку не то травы, не то кустоў з вялікімі прыгожымі залаціста-жоўтымі кветкамі. Падышоўшы бліжэй, хлопцы ўбачылі, што некаторыя сцяблы дасягаюць двух метраў вышыні. Лісце было прадаўгаватае, тоўстае, нібы тлустае. Ад кветак ішоў моцны пах. Усё гэта рабіла ўражанне, нібы расліна гэтая з'яўляецца тут нейкім госцем.

— А гэтая штука досыць цікавая! — прамовіў Віктар і пачаў кратаць кветкі і лісце.— Нібы нейкія там фікусы ці рададэндраны — ліха іх ведае,— што часам трымаюць у пакоях, у гаршках. Ды і пах такі, што можна адурэць.

Мірон жа, здавалася, глядзеў на расліну з нейкім хваляваннем.

— Так,— сказаў ён нарэшце.— Гэта — азалія, або, як кажуць у народзе, «божае» дрэўца. Чытаў пра яе і нават дзіўіўся, чаму гэта яе так паважаюць. Наш прафесар Адамаў

нават спецыяльна ездзіў у нейкі кут Беларусі, каб паглядзець на яе і даследаваць. Апісаў падрабязна: і якія суседзі каля яе растуць, і якое дрэва, і якім клінам яна размясцілася, і які каменьчык знаходзіцца пад ёй. А ўрэшце ўзняў хадайніцтва, каб агарадзіць і абараніць яе.

— Ай-яй-яй! — жартаўліва здзівіўся Віктар.— Не палохай ты мяне, а то я не ведаю, як трымаць сябе перад гэткай асобай. Хоць і досыць добрыя кветкі, але ж увагі ўжо занадта.

— Тлумачыцца гэта тым, што яна — рэдкі госць з цёплых краін і расце ў нас, як бачыш, сама ў грунце.

— Хай сабе сама і расце. Чаго ж з ёю так цацкацца? Ці, можа, якая асаблівая карысць ёсць ад яе?

— Кажуць, што надзвычайна памагае ад каросты.

— Вада і мыла яшчэ лепш дапамагаюць.

— Акрамя таго, у ёй ёсць нейкі наркатычны матэрыял. Калі пад'есці мёду, сабранага пчоламі з гэтых кветак, дык можна аглухнуць і ашалець.

— Дык вось чаму гэта — «божае» дрэўца! Завошта ж тады яго шанаваць? — абурыўся Віктар.— Трэба ж гэта нішчыць, а не шанаваць.

— Не бойся, яна ў нас вельмі рэдкая. Звычайна расце ў Крыме, вакол Чорнага мора ды ў Паўднёвай Еўропе і нікому там не перашкаджае. Яе нават спецыяльна садзяць у садзе, бо яна раней за ўсіх цвіце. Яна цвіце нават раней, як распусціць сваё лісце. Кажуць, што яе паўтараста год назад завезлі ў Еўропу з Кітая.

— Вось якая цаца,— засмяяўся Віктар.— Ну, хай сабе расце на здароўе. Хадзем, а то яшчэ ашалееш.

Нарэшце яны падышлі да сваёй сажалкі. Вада ў ёй значна спала, у некаторых месцах выступіла зямля. Пратока каля грэблі зрабілася зусім вузкай. Але ў розных месцах заставаліся яшчэ ямы з больш глыбокай вадой.

Падышоўшы да адной з такіх ямін, хлопцы заўважылі, як у вадзе шмыгнула нешта цёмнае. Не паспелі прыгледзецца, як каля берага паказалася бліскучая цёмна-бурая круглая галава з белай плямай на носе. У роце незнаёмы «злодзей» трымаў рыбіну.

— Выдра!..— крыкнуў Віктар, але галава схавалася раней, як ён скончыў гэтае слова.— Ах, паганая! Яна ўсю нашу рыбу зжарэ! Тым болей што яна часта адгрызае толькі спіну, а рэшту кідае.

— Будзем тады лавіць яе разам з рыбай,— прапанаваў Мірон.

— Ну не, брат, яна не такая дурная. Яе толькі ў пастку можна злавіць, ды і то трэба паставіць каля нары. А нара мае два выхады: адзін наверх, а другі пад ваду. Аднаго разу чатыры чалавекі па чарзе пільнавалі выдру шэсць тыдняў і не маглі злавіць. У кожным разе, трэба хоць прагнаць яе.

Хлопцы раздзеліся і падрыхтавалі сваю «сетку».

— А можа, укусіць яшчэ гэты драпежнік? — прамовіў Мірон.

— Калі загнаць яе ў кут, то яна можа і кінуцца, а так не адважыцца.

Калі хлопцы падышлі да сярэдзіны лужыны, дык убачылі, што на беразе, сярод травы, слізганула доўгае, на кароценькіх ножках цела выдры. Спіна была цёмна-бурая, а спод — святлейшы.

— Эх, дабро ўцякае! — з жалем сказаў Віктар.— Адна шкура чаго варта! Рублёў трыста можна атрымаць.

— Ого! А есці яе можна? — запытаўся Мірон.

— Можна, і нават мяса добрым лічыцца.

— Пашукаем тады яе нару.

— Нары, мусіць, тут і няма. Яна робіць яе каля вады. А гэтая вада выпадковая, часовая.

— Шкада,— уздыхнуў Мірон.— Давай тады лавіць сваю ўласную рыбу.

«Уласнай» рыбы налавілі лёгка, у дадатак яшчэ выцягнулі некалькі камякоў нейкага кісялю з чорнымі крупкамі.

— Гэтая жабіная ікра толькі кашулю запаскудзіць,— сказаў Мірон, з гідлівасцю адграбаючы гэты кісель.

Ідучы назад, яны зайшлі ў лес пашукаць яшчэ журавін і ў адным кутку, сярод густога ельніку, знайшлі прытульную пляцоўку, пасярод якой было нацярушана шмат свежага пер'я.

— Загінула ад драпежніка нейкая птушка,— прамовіў Мірон.

Віктар агледзеў мясціну, перагледзеў пер'е, то чорнае, то чорнае з белым, то стракатае, і нарэшце сказаў:

— Не, тут ніхто не загінуў. На гэтым месцы цецерукі збіраюцца такаваць, гуляюць, б'юцца. Гэтае пер'е і ёсць вынік іхняй бойкі. Каб паляўнічыя знайшлі такое месца, яны зараз жа зрабілі б тут засаду.

— А можа, і нам зрабіць?

— А што ты зробіш з голымі рукамі? Цецярук асцярожны. Паляўнічыя звечара робяць буданы і цярпліва чакаюць усю ноч. У іх стрэльбы. А мы што будзем рабіць? Рукамі іх не зловіш.

— А калі напэўна вядома, што яны на гэтым месцы будуць скакаць ды біцца, то можна ім петлі параскідаць.

— Гэта іншая справа. Варта падумаць.

Усю дарогу яны меркавалі: з чаго зрабіць петлі? І нічога не маглі прыдумаць, апрача таго, што прыйдзецца ахвяраваць Віктараву споднюю кашулю. Але і тут была небяспека, што ахвяра можа быць бескарыснай. Для такіх петляў трэба калі не конскі волас, то прынамсі тонкі і моцны шпагат. Тонкія вяровачкі з старых, трухлявых нітак будуць занадта слабыя, а з пасмаў кашулі — зусім нягодныя. Так падышлі да дому і нічога не вырашылі.

Тут Мірон зірнуў на змяіную скуру, якая сушылася на галіне, раптам спыніўся і крыкнуў:

— Вось хто нам дапаможа! Парэжам гэтую скуру на тоненькія паскі, і яны будуць не горшыя за валасінкі.

— Праўда! — падхапіў Віктар.— Цяпер я бачу, што ўсё на свеце можна абярнуць на карысць чалавеку.

Хутка згатавалі сабе абед і не марудзячы ўзяліся за змяіную скуру. Але зараз жа і апусцілі рукі... Ну як было парэзаць яе, ды яшчэ на тонкія пасачкі, без нажа?

Віктар ледзь не заплакаў.

— Гэта ж вечная пакута! — скардзіўся ён.— Усё ідзе добра, з кожнага становішча можна знайсці выхад, усё можна абярнуць на сваю карысць, і на кожным кроку адна пера-

шкода — нож! Які дурань трымае нож у торбе? Каб я ведаў гэта, дык сам палажыў бы сабе ў кішэню. Праз цябе ўся пакута!

— Чаго заскуголіў? — агрызнуўся Мірон.— Я сам заўсёды трымаю нож у кішэні. Але ж ці не звычайная справа, адрэзаўшы хлеба, палажыць разам з ім і нож? І я, каб ведаў, што праз цябе перакулімся, дык таксама ўзяў бы нож у кішэню. Ды і позна ўжо пра гэта казаць — нічога не паможа. Лепш набяромся цярплівасці ды пачнём калупаць чым можна. Часу хапае.

І пачалі «калупаць». І спражкай, і трэскай, і касцямі рыб, і вострым гузікам. А Віктар дадумаўся яшчэ распаліць сваю спражку на агні ды ёю смаліць. Усё разам,— а больш за ўсё цярплівасць,— пачало даваць вынікі. А першыя вынікі надалі бадзёрасці, упэўненасці і яшчэ раз цярплівасці. Спачатку яны разрэзалі змяіную скуру ўздоўж напалам, а тады ўжо кожны працаваў над сваёй паловай. Шэсць гадзін карпелі яны над гэтай працай і, нарэшце, зрабілі тое, што было ім патрэбна.

— Гэта ж самыя дасканалыя сілы ў свеце! — цешыўся Віктар з свае працы.

Зараз жа і панеслі іх на месца. Цікава было папільнаваць, як пойдзе справа, але раздумаліся, што не варта пакутаваць усю ноч.

— Дапамагчы справе мы нічым не можам,— казаў Віктар,— а спудзіць можам. Толькі каб устаць заўтра як мага раней.

Параскладалі сілы сярод палянкі, замацавалі канцы, вярнуліся назад і палеглі спаць.

Віктар прачнуўся апоўначы і чакаў раніцы каля вогнішча. Ледзь зашарэлася на ўсходзе, ён разбудзіў Мірона, і яны ціхенька накіраваліся ў лес.

Яшчэ здалёк пачуліся ў тым баку гоман, плясканне, балбатанне, нібы там сабраўся нейкі натоўп. Потым выразней пачуліся гукі — чуфф-фы, чушш! Чуфф-фы, чушш!

Хлопцы паўзлі наперад не дыхаючы, сэрцы іх калаціліся.

Падпаўзлі. Зірнулі. На палянцы білася некалькі пар цецерукоў, ды так, што толькі пер'е ляцела ва ўсе бакі. Асабліва

вызначаўся стары такавік, чорны, з белымі палоскамі на крылах. Навакол, па галінах, сядзелі рабыя цяцёркі і глядзелі на гэтае спаборніцтва, якое адбывалася выключна дзеля іх.

Яны крыкамі падбадзёрвалі байцоў, а тыя стараліся з усіх сіл, каб паказаць сябе перад красунямі.

Усё гэта хлопцы заўважылі адным зіркам, а калі прыгледзеліся пільней, то ўбачылі, што ў двух цецерукоў ужо заблыталіся ногі і яны бездапаможна бараніліся ад сваіх ворагаў. Вось зачапіўся і стары такавік, трывожна закрычаў, забіў крыламі і вырваўся.

— Бяжым! Каб і тыя не вырваліся! — шапнуў Віктар.

Лопат крылаў аглушыў хлопцаў. Спалоханыя птушкі мігам зніклі. А ў руках таварышаў засталіся два добрыя цецерукі, кіло па два вагою.

X

Гаспадарка.— «Гліняная паэма».— Старыя знаёмыя.— Воўк.— Палявалі на ліса, а забілі...— Павелічэнне статка.

Цяпер ужо спажывы было дні на чатыры. Але зноў бяда: як яе захаваць, каб не папсавалася?

— Давай склеп рабіць,— не то жартам, не то сур'ёзна сказаў Віктар.

— Галоўнае не ў склепе, а ў солі,— адказаў Мірон.

— Тады давай сушыць на сонцы ды вэндзіць мяса, як гэта робяць іншыя ў такіх выпадках.

— Гэта было б добра, але як разрэзаць яго на тонкія лустачкі?

— Ну, тады давай будаваць клетку,— сыпаў прапановы Віктар.

— А! — сцяміў Мірон.— Гэта ўжо іншая рэч.

І сапраўды: цецерукі былі жывыя, значыцца, лепш за ўсё было захоўваць іх жывымі.

— У такім разе, пакуль ёсць рыба, мы абодвух будзем гадаваць,— сказаў Мірон,— а дзеля гэтага зробім маленькі хлеўчык.

— Нават і не надта маленькі, бо, можа, і яшчэ завядзецца якая жывёліна, напрыклад, дзікае парася, заяц, медзведзяня.

— Карова, авечка! — перадражніў Мірон.

Як бы там ні было, а катушок будаваць трэба. Так парашылі хлопцы. І лепш за ўсё было прыбудаваць яго да будана. Тут яшчэ раслі кусты, з якіх можна было зрабіць «зруб». Форма будынка залежала не ад будаўнікоў, а ад таго парадку, у якім раслі кусты. Але гэта нічога не абыходзіла. У параўнанні з хатай пабудова катуха была ўжо лёгкай справай, і не болей, як праз гадзіну, ён быў гатовы.

Найбольш сур'ёзным было пытанне з дзвярыма. Рабіць і прыстасоўваць так, каб яны зачыняліся і адчыняліся, без нажа было цяжка і марудна.

— Дык і не трэба турбавацца! — сказаў нарэшце Мірон.— Пасадзім і запляцём іх зверху. Калі трэба будзе, расплящём і выцягнем.

— А што ты будзеш рабіць з большымі жывёламі? — сур'ёзна сказаў Віктар.

Мірон зірнуў на яго, не разумеючы, жартуе той ці не, і сказаў:

— Ну, калі трапіцца цяля ці авечка, тады пабудуем хлеў з бярвенняў, на завесах, з замком.

— А чым карміць гэтых цецерукоў?

— Ды почкамі, маладым лісцем.

Такім чынам у іх гаспадарцы завялася першая жывёла.

Цяпер самым балючым пытаннем пасля нажа застаўся гаршчок. Гэтулькі дзён яны не елі нічога гарачага, калі не лічыць рыбы і мяса.

— Не, трэба ісці шукаць гліны! — рашуча сказаў Віктар.— Гэта ж сорам не знайсці такога дабра!

— Ты не кажы пра яе з такой знявагай,— сказаў Мірон.— Мы прывыклі так на яе глядзець толькі таму, што яе ў нас шмат, ды мы яе не выкарыстоўваем як належыць. На ёй можна развіць вытворчасць цэглы, чарапіцы, падземных труб. Хай замест драўляных дамоў усюды будуць камяніцы; хай замест саламяных і нават іржавых жалезных дахаў усюды будуць

чарапічныя; хай усюды будуць пракладзены трубы для вады, каналізацыі, асушкі зямлі — і тады ўбачыш, што такое гліна.

Узялі на плечы свае дубіны і пайшлі. У Віктара аж рукі свярбелі, калі ён браў сваю «вожыкавую булаву».

— Эх, каб трапіць на якога добрага ворага! — казаў ён.

— Не надта рызыкуй,— стрымліваў Мірон.— Не думай, што твае калючкі небяспечныя для ўсіх.

Бліжэйшыя месцы былі ім ужо знаёмы, таму яны накіраваліся глыбей у лес. Пасля змрочнага бору, бадай-што аднолькавага ва ўсе поры года, яны выйшлі ў шырокую сонечную зялёную лагчыну. Трава тут ужо вырасла настолькі, што хоць касі яе. Бяроза, альха, арэшнік, крушына шамацелі сваімі лісцямі, як улетку. То тут, то там над імі ўзвышаліся дубы, ліпы або адзінокія сосны з шырокімі верхавінамі. Здавалася, і сонца тут грэе мацней, чым там, на беразе.

Хоць нашы хлопцы і не думалі любавацца прыродай, але мімаволі спыніліся перад такім харавством і моўчкі пачалі азірацца. А праз некалькі хвілін пачулі, што ў кустах нехта... папярхнуўся і закашляўся.

Сэрцы таварышаў моцна закалаціліся.

— Чалавек?!

Яны кінуліся ў той бок і... выгналі лёгкую прыгожую казулю.

— Няўжо гэта яна кашляла? — з крыўдай спытаў Мірон.

— А то хто ж? — панура адказаў Віктар, нібы ён быў вінаваты ў гэтай памылцы.

На некаторы час настрой хлопцаў быў сапсаваны...

Доўга яны блыталіся па лесе, заглядалі ў кожны куток, спуджвалі сваіх знаёмых суседзяў. Зноў бачылі дзіка і зноў пастараліся схавацца ад яго, хоць Віктар і гатоў быў уступіць з ім у бойку.

— Наогул я лічу,— разважаў ён,— што дарма кажуць і пішуць пра ўсялякія лясныя жахі. Вазьмі ты хоць гэтага дзіка: свіння і толькі, і нічога жудаснага няма, нават сам баіцца нас.

— Ты ж ведаеш, што і леў і тыгр ухіляюцца людзей, але ж ніхто не скажа, што яны не небяспечныя,— даводзіў Мірон.

Аднаго разу з кустоў выбегла і спынілася, задраўшы галаву, новая жывёла.

— Ці не сабака? — усцешыўся Мірон.

— Не, воўк! — адказаў Віктар і мацней сціснуў сваю булаву. Воўк ляснуў зубамі і знік.

— Вось з гэтым дык мы маглі б справіцца са сваімі дубінамі,— сказаў Віктар.— Шкада, што ён не напаў на нас. Яны нападаюць толькі тады, калі іх шмат.

Нарэшце хлопцы натрапілі на адзін абрыў, дзе з-пад пяску відаць была гліна. Накапалі яе і пайшлі назад.

Па дарозе зацікавіліся адной нарой.

— Мусіць, лісіная,— заўважыў Мірон.

— Мабыць, так,— сказаў Віктар, прыглядаючыся да нары і слядоў,— але штосьці яна крыху завялікая. Пашукаем навокал другіх выхадаў.

І сапраўды, у розных месцах знайшлі яшчэ тры выхады.

— Вернемся сюды і наспрабуем выкурыць яе дымам,— прапанаваў Віктар.— Адзін стане каля аднаго выхада і будзе пільнаваць, другі будзе выкурваць праз другі выхад, а рэшту завалім.

— Добра! — згадзіўся Мірон.

Аднеслі гліну і зараз жа вярнуліся да гэтага самага месца з агнём.

Каля ніжэйшай, шырокай дзіры падрыхтавалі вогнішча, для ліса пакінулі самы далёкі выхад, а рэшту засыпалі і запхалі ламаччам.

— Пачакай,— сказаў Віктар.— Трэба яшчэ добра пашукаць, бо могуць яшчэ быць выхады. Тады ўся наша праца будзе дарэмнай.

Пасля доўгага стараннага шукання сапраўды знайшоўся яшчэ адзін выхад.

— Ну, цяпер можна пачынаць,— сказаў Віктар.— Ты раскладай агонь, а я там буду пільнаваць.

Мірон разгроб нару шырэй, глыбей, так, каб агонь быў пад верхнім пластом зямлі, і падпаліў. Калі разгарэлася, Мірон пачаў кідаць вільготнае старое лісце, трухлявае галлё.

Густы дым распоўзся каля нары, але, здавалася, зусім не ішоў у сярэдзіну.

— Што рабіць? — крыкнуў ён Віктару.— Дым не ідзе ў нару.

— Нічога! — адгукнуўся той.— Частка яго трапляе! Дзьмухай!

Мірон пачаў дзьмухаць. Справа пайшла лепш: і лепш гарэла, і дым уганяўся ў сярэдзіну.

Віктар жа стаяў ля другога выхада і напружана чакаў. На ліса ён пашкадаваў сваёй булавы і ўзяў Міронаву дубіну. Доўга цягнуўся час. Усё здавалася, што вось ужо нешта там варушыцца, але нікога не было. Не так ужо шмат часу прайшло, а хлопцам пачало здавацца, што яны стаяць тут немаведама колькі. Мірон нецярпліва пазіраў у Віктараў бок. Той усё стаяў ■ паднятай дубінай, нібы скамянелы. Рукі яго здранцвелі.

Нарэшце сапраўды заварушылася.

Але Віктар ледзь не выпусціў дубіны з рук, калі ўбачыў замест лісінай галавы доўгую, белую морду з дзвюма чорнымі палосамі ўздоўж яе.

Тыркanулася морда раз-другі — і зараз жа назад. Але вось каля яе з'явіўся маленькі дымок... Бедная жывёліна вымушана была вылазіць... Праўда, яна не бачыла ворага, бо Віктар стаяў ззаду, але ўсё роўна адчувала бяду. Віктар ужо здагадаўся, што гэта за звер, і супакоіўся: нязграбная жывёліна не паспее ўцячы, як ліс!

Жывёліна зрабіла пару крокаў наперад; паказалася спіна з шараватаю грубай поўсцю.

Віктар апусціў дубіну раз... другі... Жаласна кугікнула жывёліна свінячым голасам...

— Гатова! — крыкнуў Віктар.

Мірон мігам падбег да яго.

— Што гэта такое?! — вылупіў ён вочы.

— Барсук! — урачыста адказаў Віктар.— Але ж стой! Яшчэ нешта варушыцца!

З нары вылазіла двое барсучанят, якія зусім здурнелі ад дыму.

Яны былі такія мілыя, пацешныя, што хлопцам і ў думку не прыйшло іх забіваць. Іх забралі жывымі.

— Вось табе і яшчэ жывёла для гаспадаркі! — сказаў Віктар.

— Я ж казаў, што трэба будаваць добры хлеў.

— А есці іх можна? — зараз жа запытаўся Мірон.

— Ніхто не забараняе, але звычайна іх не ядуць.

— А шкура каштоўная?

— Не вельмі. За дарослага рублёў пяць атрымаць можна.

— Тады іваждацца з імі не варта,— скрывіўся Мірон.

— Але ж яны цікавыя і хутка асвойваюцца. Апрача таго, тлушч барсука вельмі дапамагае ад прастуды і ідзе для шмаравання ботаў, асабліва паляўнічых.

Стары барсук меў каля паўметра даўжыні і важыў кілаграмаў з трыццаць. Цяжка было цягнуць яго, а яшчэ цяжэй зняць шкуру тымі прыладамі, якія былі ў хлопцаў. Але Мірон вельмі квапіўся на шкуру, якая была б дарэчы ў іхняй «хаце». Ён настояў, каб зараз жа паспрабаваць зняць шкуру. Праца была складаная. Доўга мучыліся яны і знялі не шкуру, а нейкія лахманы.

Забралі сваю здабычу і, змораныя, пацягнуліся дахаты. Барсучаняты вырываліся, нават кусаліся.

— Ці можна будзе іх садзіць разам з цецерукамі? — казаў Віктар.

— Для цецерукоў зробім жэрдкі, а барсукі будуць на зямлі,— размеркаваў Мірон.

— А гэтыя барсукі досыць цікавы народ,— расказваў дарогай Віктар.— Яны вельмі падобны да мядзведзяў, толькі меншыя і належаць да пароды куніц. Барсук зусім няшкодны: жывіцца карэннямі, ягадамі, чарвякамі. На ўловы выходзіць уначы. Узімку спіць у сваёй нары, як мядзведзь. Вельмі любіць чысціню. Гэта часам выкарыстоўвае ліс: забярэцца, калі няма гаспадара, у хату і напаскудзіць там. Вернецца барсук, пачуе гэтую брыдоту ды і выселіцца з сваёй хаты. Тады яе займае ліс.

Дома размясцілі сваю жывёлу, павячэралі і паляглі спаць з пачуццём гаспадарскага задавальнення. У параўнанні з першым днём справы іх значна палепшыліся.

— Для поўнага шчасця не хапае толькі нажа, гаршка, хлеба і солі,— казаў Мірон.

— І махоркі,— дадаў Віктар.

— А ты яшчэ не забыўся на гэтую брыдоту?

— Часам забываюся, але часам і цягне. Але нішто ўжо — цярпець можна. Напэўна, потым буду рады, што так здарылася.

XI

Барсукі падвялі.— Не святыя гаршкі лепяць (а спрактыкаваныя).— Носьяя сродкі жыцця.

На другі дзень, як толькі прачнуліся, зараз жа сунуліся ў хлеў паглядзець сваю жывёлу.

Глянуў Віктар праз шчыліну і — нічога не ўбачыў.

— Нешта не відаць,— прамармытаў ён.

Рассунуў галлё болей, зазірнуў ва ўсе куты — няма нікога! Глянуў Мірон — таксама нічога не ўбачыў.

Паглядзелі адзін на аднаго — і рукамі развялі.

— Куды ж яны падзеліся? Хлеўчык жа цэлы!

Агледзелі навокал усю будову і заўважылі каля зямлі досыць вялікую дзіру.

— Гэта ж барсукі зрабілі! — крыкнуў Мірон.— А за імі і цецерукі паўцякалі. Як мы маглі гэтага не прадугледзець? Нават і ты, спец па заалогіі, не прадбачыў.

Віктар стаяў, апусціўшы галаву, і сапраўды адчуваў сябе вінаватым.

— І то праўда,— прамовіў ён.— Калі яны рыюць сабе норы, значыцца, маглі і нават павінны былі і тут прарыць. Але ў такой справе ніякіх спецыяльных ведаў не трэба: ты сам мог гэта добра ведаць, але вось не падумаў.

— Я ж казаў, што не трэба было важдацца з імі,— злосна адказаў Мірон.— Ніякай карысці ад іх няма. Трымаць іх для

пацехі ў нашым становішчы зусім лішняе. А цяперака праз іх і цецерукі ўцяклі. Вось табе і жывёлагадоўля!

— А ўсё ж пра гэта ты і сам не думаў,— апраўдваўся Віктар.— Каб сказаў, зусім іншая была б справа. Няма чаго вінаваціць другога. Сам дапамагаў. Другі раз будзем разумнейшымі.

— Чакай цяпер другога разу!

Паахкалі, павохкалі, але дапамагчы справе нічым не маглі. А паколькі ў «сажалцы» хапала рыбы, то вялікай бяды пакуль што не было. Праз некалькі хвілін нават пачалі жартаваць.

— У другі раз для кожнай пароды жывёлы будзем рабіць асобныя, спецыяльна прыстасаваныя памяшканні,— суцяшаў Віктар.— А пакуль што давай ляпіць гаршчок.

— А ты ведаеш, як ляпіць? — запытаўся Мірон з трывогай.

— Хто з нас калісьці не ляпіў? — бесклапотна адказаў Віктар.— Нездарма кажуць: не святыя гаршкі лепяць.

— Тут не ляпіць, а круціць трэба,— пахмура адказаў Мірон.

— Давай круціць — усё роўна. Ты, мусіць, добра ведаеш гэтую справу?

— Чаму ж так я? — здзівіўся Мірон.

— Ды ты ж сам надоечы апяваў гліну, паэму дэкламаваў.

Мірон паскроб патыліцу.

— Паэма паэмай,— прамовіў ён,— а як робяцца гаршкі, я не бачыў. Неяк не траплялася. Справа лічыцца такой простай, што, я думаў, няварта спецыяльна наглядаць, вывучаць яе. Можа, ты часам бачыў?

— І я не бачыў! — з камічнай мінай адказаў Віктар.— Таксама не цікавіўся гэтай прымітыўнай прамысловасцю. Усе дзікуны ўмеюць гэта рабіць. Я нават недзе чытаў, што егіпцяне чатыры тысячы гадоў назад выдумалі нейкую прыладу для гэтай вытворчасці. Але, я думаю, зляпіць абы-які гаршчок можна і без усякай прылады.

— Паспрабуем,— панура адказаў Мірон.

Як ён цяпер шкадаваў, што не пацікавіўся гэтай справай!

Яму таксама даводзілася чытаць, ён меў нават некаторыя тэарэтычныя веды, але як узяцца за справу — не ўяўляў.

Намачылі, размясілі гліну. Пусцілі ў ход і чарапашыну для вады. І пачалі ляпіць, як гэта робяць маленькія дзеці. Маленькія, нязграбныя місачкі сяк-так яшчэ выходзілі, але ім не гэта трэба было, а гаршчок прынамсі хоць на літр. Такую адпасудзіну трэба было злепліваць з кавалкаў, а тады ўжо адразу было відаць, што ў злепленых месцах будзе шчарбіна.

Стараліся хлопцы так, што аж пот капаў. Шмат разоў нанава камячылі свае «гаршкі».

— Вось табе і «не святыя гаршкі лепяць»! — злаваў Віктар.— Выходзіць, наадварот: якраз святым трэба быць у гэтай справе.

— Або дзікуном,— дадаў Мірон.

Нарэшце кожны з іх зляпіў па невялічкаму «гаршку», але, глянуўшы на сваю працу, хлопцы толькі насамі паківалі.

— Яны адразу распаўзуцца, калі пачнуць сохнуць. А іх яшчэ трэба абпальваць, каб ужываць. Вось табе і прымітыўная вытворчасць! — прамовіў Віктар.

— Не, відаць, не абысціся без ганчарнага кола! — рашуча сказаў Мірон.

— Вось чаго захацеў: колы, машыны!

— Якую-небудзь круцёлку абавязкова трэба прыдумаць. Тады шчыльней зліпнуцца часткі гліны. Зараз я пашукаю што-небудзь.

Праз некалькі хвілін Мірон прынёс досыць тоўсты круглы кавалак дрэва, абсмаліў, абскроб яго.

— Цяпер,— сказаў ён,— паставім гэтую штуку старчма. Ты будзеш круціць яе, а я зверху палажу камяк гліны. У кожным разе павінна выйсці нешта, не горшае за гэтае чарап'ё.

Падышлі бліжэй да вады, прыладзіліся. Было б нішто сабе, але канец хістаўся ад рухаў Віктара. Тады зрабілі вілкі, каб «машына» не хісталася.

Нарэшце, пасля доўгай пакуты, нешта зрабілі. Але гэтае «нешта» вельмі мала нагадвала гаршчок.

— Што ён нязграбны — гэта не бяда,— казаў «майстар» Мірон.

— Але сценкі надта тоўстыя, а гэта нядобра: патрэскаюцца. Давай яшчэ паспрабуем.

У выніку ўсёй працы з'явіліся два сякія-такія гаршкі. З задавальненнем глядзелі хлопцы на свае вырабы, і яны пачалі ім здавацца нават нядрэннымі. Хоць на наш погляд гэтыя рэчы былі б зусім недарэчныя.

Але задавальненне значна зменшылася, калі яны падумалі, што да канца яшчэ вельмі далёка.

— Сушыць іх трэба некалькі дзён,— сказаў Мірон,— бо трэба пачынаць з цёмнага, вільготнага месца. А потым абпальваць некалькі дзён, таксама пачынаючы з лёгкага агню, нават дыму. Ды і то невядома, ці не патрэскаюцца, бо гліна не падрыхтаваная і не апрацаваная як трэба.

— Э-э! — працягнуў Віктар.— У такім разе і не дачакаемся. Мусіць, мы тады ўжо дома будзем. Вада бадай ужо спала.

— Я не буду шкадаваць, калі не дачакаемся. А калі спатрэбяцца, мы самі будзем рады, што зрабілі. Рыбы на сёння хопіць, пойдзем пашукаем да яе яшчэ чаго-небудзь.

Як звычайна, накіраваліся ў лес. Праз некаторы час знайшлі некалькі маладзенькіх грыбоў.

— Бач, якія прыгожыя сыраежкі! — усцешыўся Віктар, сарваў і адразу з'еў корань.

— Смачныя, салодкія! — цмокнуў ён.— Нездарма іх завуць сыраежкамі.

А яшчэ праз некалькі крокаў натрапілі на лісічкі.

— Цёплае надвор'е, пачынаюць грыбы лезці,— задаволена казаў Мірон.— Будзем мець падмацаванне замест цецерукоў.

Перасеклі лес наўскасяк і выйшлі да таго месца, дзе яны ў першы дзень бачылі клін, што вытыркаўся ў возера. Цяпер з гэтага боку ўжо возера не было.

— Суха ўжо! — крыкнуў Віктар і пабег наперад. Пабег за ім і Мірон. Але хутка пераканаліся, што да сухога месца яшчэ далёка. Тут была дрыгва, у якую і думаць нельга было совацца.

— А ўсё ж такі цяпер можна ўжо спадзявацца знайсці выхад,— суцяшалі сябе хлопцы.— Заўтра пойдзем шукаць.

Тут Мірон звярнуў увагу на малады аер у балоце.

— А вось і яшчэ страва! — сказаў ён, вырваў расліну, вылушчыў белы канец каля кораня і пачаў есці.

— Праўда! Ведаю. Не раз еў! — крыкнуў Віктар і далучыўся да Мірона.

— Здаецца, і сёе, і тое з'ясі,— разважалі хлопцы, калі ішлі назад,— а ўвесь час адчуваеш голад, усё чагосьці не хапае.

Пад вечар пачаўся дождж, вялікі, доўгі. Увесь час прыйшлося сядзець у будцы. Хоць і старанна яна была пабудавана і дагледжана, але ўсё роўна працякала.

— Абавязкова спалю яе, калі будзем адыходзіць дадому! — злаваў Віктар.

Зноў зрабілася нудна і сумна. Зноў нямілым стала ўсё навакол. Адна толькі ўцеха была: заўтра яны канчаткова выберуцца з гэтага дзікага кута, бо вада ўжо спала.

XII

Зноў няўдалая спроба.— Неспадзяваная сустрэча.— Вожык дапамог.— Апошняя рыба.— Новая спроба.— Нядоўгая радасць.— У пастцы.— Апошнія патугі.— Побач са смерцю.

Спалі дрэнна. Увесь час пільнавалі агонь, грэліся, сушыліся. Дождж перастаў на світанні, і хлопцы зараз жа пачалі рыхтавацца ў дарогу.

Вялікую надзею яны мелі, што цяпер ужо выберуцца. Не можа быць, каб нідзе аніякай магчымасці не было! Калі спатрэбіцца, яны нават папаўзуць, як тады паўзлі ад возера. Так або інačай трэба, нарэшце, вырвацца...

Перад адыходам Мірон кінуў у вогнішча ўсе назапашаныя дровы.

— Хай гараць. Можа, яшчэ прыйдзецца назад вярнуцца.

Ісці было вельмі непрыемна. Зямля мокрая, з дрэў капае вада. Закране першы якую галіну — другі крычыць, што яго абліло. Абутак прамок адразу, а далей паступова прамакала і адзенне.

Пайшлі тым самым шляхам, што і першы раз,— навакол. Але самаадчуванне было нават горшым, як тады. Тады, прынамсі, адразу было відаць, што далей — вада, значыць, і совацца няма чаго. А цяпер кожны раз прыходзілася лезці ў балота спрабаваць, ці нельга прайсці,— і кожны раз вяртацца назад.

Нават возера не было відаць; перад ім распасцёрлася вялікае балота, пакрытае рэдкім хмызняком і паасобнымі дрэвамі. Толькі часам блісне між зеляніны вада і зноў схаваецца.

Яны прайшлі толькі палову свайго вострава, а змарыліся куды болей, як тады за ўвесь шлях. Да таго ж голад пачаў мучыць. Спачатку іх падтрымлівала надзея, што вось зараз яны выберуцца, але хутка надзея знікла. Нават Мірон не вытрымаў:

— Гэтак можна швэндацца тут усё сваё жыццё!

— Толькі цяпер я адчуў, які прыемны, прыгожы, прытульны быў наш куток, будан, вогнішча! — сказаў Віктар.— Хадзем назад!

— Хадзем! — згадзіўся Мірон.— Усё роўна сёння не паспеем усяго абысці. Заўтра пачнём з гэтага месца.

Калі вярнуліся назад, было пад вечар ужо. Жар ад вогнішча захаваўся, але ў запасе не было ні ламачча, ні ежы. Хлопцы былі так стомлены, што ім не хацелася нават варушыцца. Трэба было ісці па галлё, па рыбу, але абодва згадзіліся лепш галадаць, абы толькі адпачыць, бо і папярэднюю ноч яны амаль не спалі.

Падсушыліся, выпілі «чаю» і зараз жа палеглі спаць.

Прачнуліся на світанні, праспаўшы гадзін адзінаццаць. Затое зноў адчувалі сябе бадзёрымі і вясёлымі. Толькі голад даваў сябе знаць.

Ускінулі на плечы свае дубіны і бягом памчаліся да сажалкі. Наперадзе шпарка бег Віктар, ззаду дыбаў Мірон. Беглі яны па дарозе, якую добра ведалі, таму нават не глядзелі вакол сябе. Вось кусты па беразе іх сажалкі; Віктар ужо абмінуў куст...

Але ў гэты момант адбылося нешта такое, чаго Мірон зусім уразумець не мог.

Пачуўся крык, роў, стук, і насустрач Мірону выскачыў бледны, бяззбройны Віктар.

— Уцякай! — паспеў ён толькі крыкнуць і паляцеў як страла. Мірон нават і сам не заўважыў, як ужо імчаўся следам за Віктарам.

Вецер свістаў у вушах, галіны сцёбалі па твары, а яны ўсё ляцелі ды ляцелі. Азірнуўся быў Мірон назад, нічога не заўважыў, але не адставаў ад Віктара. Толькі каля вогнішча спыніўся Віктар і пачаў углядацца назад.

— Што... такое? — задыхаўшыся, спытаўся Мірон.

— Мядзведзь! — коратка адказаў Віктар.

Але як яны абодва ні прыглядаліся, нікога не было відаць.

— А можа, табе толькі здалося? — насмешліва сказаў Мірон.

— Добра здалося, калі я сам стукнуў яго па галаве! — адказаў Віктар сур'ёзна. Потым, прыгінаючыся, пачаў красціся наперад. Рушыў за ім і Мірон. Крокаў пяцьдзесят пасунуліся яны і нічога не заўважылі. Тады толькі Віктар супакоіўся.

— Я быў упэўнены, што мядзведзь за намі гоніцца,— прамовіў ён з палёгкай.

— Ды раскажы ты толкам, у чым справа? — нецярпліва запытаў Мірон.

— А вось, калі я заскочыў за куст, дык трапіў акурат у лапы да мядзведзя. Сажалка высахла, засталося толькі балота, а ў ім бялела шмат рыбы. Вось мядзведзь і капашыўся там, падбіраў нашую рыбку. Мусіць, таму ён і не пачуў нас, што быў заняты гэтай справай. Я з разгону так і наляцеў на яго. Ён мігам выпрастаўся, стаў на заднія лапы і павярнуўся да мяне. У бяспамяцці я стукнуў сваёй булавой яму па мордзе. Ён зароў і ўхапіўся лапамі за вочы. Відаць, я трапіў яму ў вока. Булава вывалілася з рук, і я паляцеў назад. Вось і ўсё.

— Во як? — сказаў Мірон.— Дык гэта не жарты?

— Добрыя жарты,— трапіць мядзведзю ў лапы з адным толькі кіем.

— А ведаеш што? — засмяяўся Мірон.— Гэта ж вожык

нас выратаваў. Калючкі папсавалі мядзведзю вока, вось яму і не было як гнацца за намі. А простым кіем ты не мог бы выбіць яму вока.

— Я ж табе казаў: падавай на маю булаву ўсіх звяроў, нават сланоў і кракадзілаў! — сказаў Віктар і ўзяўся ў бокі.

— Ой, не хваліся, герой! — паківаў яму пальцам Мірон.— Прыпомні, як ты, збялелы, бяззбройны, ляцеў ад яго.

— А ты нават і не ведаў чаго, але таксама ляцеў! — І абодва героі весела засмяяліся.

Праз паўгадзіны пайшлі назад. Чым болей набліжаліся да сажалкі, тым болей напружваліся. Чатыры вокі пільна ўглядаліся ў кусты, чатыры вухі не прапускалі аніводнага гуку. Кожны момант хлопцы гатовы былі драпануць назад.

Такім чынам падкраліся да самага берага і ўбачылі балотца з невялікімі лужынкамі, здохлую, паўжывую і жывую рыбу, сляды мядзведзя, а побач булаву. Ніякіх адзнак, што быў паблізу і сам мядзведзь, не было.

Калі падышлі бліжэй ды паднялі дубіну, то заўважылі на ёй сляды зубоў.

— Відаць, ад злосці кінуўся на дубіну,— заўважыў Віктар.— Калі за намі не пагнаўся, дык пэўна застаўся без вока.

— Нажылі мы цяпер суседа-ворага,— сказаў Мірон.

— Дармо! Ён сам цяпер будзе баяцца нас. Наконт гэтага можна быць спакойным. Наогул мядзведзь сам не нападае на чалавека, а на двух — тым болей.

Набралі хлопцы рыбы колькі ўлезе і накіраваліся дадому.

— Апошняя рыба,— сумна сказаў Мірон.— Калі не выберамся заўтра, паслязаўтра, то дрэнная будзе справа.

— А мы зараз жа пасля снедання пойдзем,— адказаў Віктар.

Ён цяпер больш за ўсё цешыўся з сваёй булавы.

— Гістарычная зброя! — казаў ён.— Нават са слядамі мядзведжых зубоў. У музей аддам яе.

Дома не толькі добра паснедалі, але і назапасілі рыбы. Частку засмажылі, а частку падкурылі ды павесілі сушыцца.

Заставалася яшчэ больш гадзіны да паўдня, калі яны рушылі ў дарогу.

Хутка дайшлі да таго месца, дзе спыніліся ўчора, і зноў пачалі свой абход. І зноў пачалася тая самая пакута, зноў пасоўваліся наперад, у балота, і зноў вярталіся назад. Нарэшце падышлі да таго месца, дзе першы раз яны далёка падаліся ў балота.

— Апошняя надзея...— прамовіў Мірон.

Энергічна і ўпэўнена пайшлі хлопцы наперад. Вось ужо і тое месца, дзе яны прымушаны былі павярнуць назад. Далей, дзе раней была вада, цяпер засталося толькі балота.

— Смялей! Смялей! — падбадзёрвалі яны адзін аднаго.

Чапляліся за дрэўцы, пераскаквалі з купінкі на купінку, часам загразалі ў багавінні па пояс, памагалі адзін аднаму. Так яны ўсё пасоўваліся ды пасоўваліся наперад і, нарэшце, вылезлі на сухі бераг.

Уздых вырваўся з грудзей, нібы яны з духаты выйшлі на свежае паветра.

— Вылезлі з гэтага праклятага балота! Хутчэй да якой-небудзь вёскі! Хлеба, хлеба пакаштаваць бы!

Яны павярнулі налева, на поўдзень, і шпарка пайшлі наперад. Лес здаваўся такім самым, як і на іх востраве, мясцовасць нават была вышэйшай, што вельмі цешыла хлопцаў. Калі прайшлі кіламетры са два, то... зноў уткнуліся ў балота!

— Няўжо ж такое самае?! — з жахам сказаў Віктар.

— Наўрад, мясцовасць навокал іншая, вышэйшая,— абнадзеіў Мірон.

Смела рушылі наперад, але хутка павінны былі вярнуцца. Прайшлі з паўкіламетра ўдоўж, зноў паспрабавалі,— і зноў такая ж дрыгва.

Сэрцы сціснуліся ў хлопцаў. Няўжо ж пачнецца тое самае? Сцяўшы зубы, кідаліся яны ва ўсе бакі і кожны раз павінны былі адыходзіць. Яны забыліся на зморанасць, на голад, напружвалі апошнія сілы, але дрыгва няўмольна прымушала іх паварочваць усё направа ды направа, пакуль ужо цямком не апынуліся яны на тым самым месцы, дзе выйшлі з балота.

Віктар кінуўся на зямлю і прыціснуўся да яе тварам. Мірон стаяў, апусціўшы рукі, і нейкімі дурнымі вачыма глядзеў у адну кропку.

— Выйсця няма! У пастцы! — прашаптаў ён нарэшце.

— Відаць, загінуць прыйдзецца тут,— прастагнаў Віктар.

Цямнела. Вечар быў цёплы, ціхі. Пяшчотныя гукі прыроды цешылі вуха. Але нашыя хлопцы нічога гэтага не адчувалі, не заўважалі. Перш за ўсё ім вельмі хацелася адпачыць. Яны ж страцілі апошнія сілы ў гэтым змаганні за вызваленне. Яны хацелі б праляжаць тут усю ноч, каб назаўтра зноў паспрабаваць вырвацца. Але...

— Слухай, Віктар! — прамовіў Мірон нейкім глухім галасам.— Мы павінны зараз жа вярнуцца назад, бо інакш застанемся без агню.

Віктар прыпадняўся, правёў рукою па лбе, страсянуўся і ўскочыў на ногі.

— Але,— сказаў ён.— Трэба змагацца.

І яны моўчкі пайшлі назад у балота, уначы...

Не будзем апісваць гэтую жудасную дарогу. Скажам толькі, што вярнуліся яны назад, нібы пастарэўшы на некалькі гадоў. Кожны з іх бачыў смерць, загразаў у багавінні па шыю. Правялі ў балоце гадзіны чатыры і выратаваліся толькі таму, што адзін аднаму памагалі.

Дацягнуліся да стаянкі бадай-што непрытомнымі. Ледзь раздзьмухалі апошнія вугольчыкі, распалілі вялікі агонь і паснулі каля яго. Не залазілі нават у сваю будку.

Гэта была іхняя дзесятая ноч на востраве...

А ў сне яны бачылі кожны па-свойму свае хаты, сям'ю. Ім было так добра, утульна, цёпла, толькі з акна ці дзвярэй дзьмуў халодны вецер.

XIII

Прымусовае чаканне.— На пашы.— Жаба-птушка.— Хатні настрой.— Чалавек!

Спачатку іх грэў і сушыў агонь, а потым — сонца. У сне яны паварочваліся да цяпла то адным, то другім бокам, пакуль не высахлі з усёй сваёй гразёю. Спалі вельмі доўга, аднаўляючы сілы.

Першым прачнуўся Мірон і зараз жа кінуўся да вогнішча. Калі агонь зноў запалаў, Мірон сеў на зямлю, абхапіў рукамі свае худыя калені і задумаўся...

Праз некаторы час усхапіўся Віктар, паглядзеў на Мірона з такім выглядам, нібы зусім не чакаў яго тут сустрэць, і пачаў чухацца так, што пыл пайшоў ад яго, нібы дым ад вогнішча.

— А сёння я быў дома! — сказаў ён нарэшце.

— І я таксама,— задуменна адказаў Мірон.— Сёння пачаліся ў нас заняткі. Сёння нашы бацькі зусім ужо ўстрывожыліся. Сёння пачнуць нас усюды шукаць, толькі не тут...

— Можа, які сігнал здолееш даць? — сказаў Віктар.

— Каму ты дасі праз некалькі кіламетраў балот ды лясоў? — адказаў Мірон.— Я думаю, нам варта перасяліцца на той востраў, дзе мы ўчора былі. Усё ж такі бліжэй да людзей.

— Адкуль ты ведаеш, што бліжэй? Можа, зусім наадварот. А тут, на беразе...

— На якім беразе? — перапыніў Мірон.— Хіба ты не бачыш, што возера ў нас ужо няма? Вунь куды яно адсунулася. І адтуль, па балоце, напэўна, ніхто да нас не падыдзе.

— А з лесу таксама ніхто да нас праз балота не пройдзе.

— А мы нікога не будзем чакаць, мы самі пойдзем, як падсохне.

— Можа, у ліпені і падсохне, але як дажыць да гэтага часу? — пахмура казаў Віктар.

— Дагэтуль было горш, і то пражылі, а там пойдуць грыбы, ягады.

— Падохнеш ад гэткай ежы. Глянь, якія ўжо мы зрабіліся.— Віктар паглядзеў на свае кастлявыя рукі.— А ты, брат, зусім на Дон-Кіхота стаў падобны.

Мірон уважліва паглядзеў на свайго таварыша і толькі цяпер заўважыў, як той змяніўся за гэты час: не толькі шчокі, але і нос, і рот, і нават вочы здаваліся не тымі.

— А ты на Санча-Панса зусім не падобны,— сказаў Мірон, усміхнуўшыся.— Давай тады паснедаем. Ёсць печаная рыба, ды сушаная, можа, хопіць на два-тры дні. Ёсць яшчэ аер, бярозавы сок.

— А там зноў завядзём хатнюю жывёлу! — ужо весела падхапіў Віктар.

Пасля снедання настрой іх яшчэ больш палепшыўся.

— Хадзем на паляванне! — крыкнуў Віктар.— Ды памыемся дзе-небудзь. А перасяляцца на той востраў пачакаем — хай падсохне.

Узялі свае дубіны і павольна накіраваліся ў лес. Цяпер, калі выявілася, што ім так ці іначай прыйдзецца яшчэ сядзець тут некалькі дзён, хлопцы супакоіліся і маглі зноў накіраваць сваю ўвагу і энергію на «авалоданне» востравам.

У адным кутку, пад елкай, знайшлі яшчэ некалькі апошніх журавін, у другім месцы паскублі маладога шчаўя, а ў арэшніку знайшлі крыху леташніх арэхаў. Калі ўбачылі ліпу, Мірон спыніўся і сказаў:

— А мы забыліся яшчэ на гэтую спажыву. Маладзенькае лісце ліпы не горш за салату.

Пакаштаваў Віктар і застаўся вельмі задаволены.

— Гэта нават лепш за аер і шчаўе! Э-э, жыць можна! А ўлетку, мусіць, яшчэ больш усялякага дабра набярэцца.

Раптам ён спыніўся і ўтаропіўся на верхавіну дрэва. Зірнуў Мірон і яшчэ болей здзівіўся: там, высока над зямлёй, скакала жаба. Ярка-зялёная, з белым жыватом і дзвюма чорнымі і жоўтым палоскамі па баках, яна мела лёгкі і жвавы выгляд і спрытна пераскаквала з галіны на галіну.

— Як яна сюды забралася? — спытаўся Мірон.

— Ды яна жыве на дрэве, як птушка,— адказаў Віктар.— Наогул такіх жаб шмат на свеце. Ёсць у паўднёвай і сярэдняй Еўропе. Вось, як бачыш, сустрэлася і ў нас. Яна таксама жывіцца казюлькамі, як і птушка. А ікру адкладае на зямлі, у вадзе.

— Дык вось чаму людзі кажуць, што часам жабы нараджаюцца ў арэхах! А я лічыў гэта байкай,— сказаў Мірон.— Наогул, колькі цікавых рэчаў ёсць у нас у прыродзе, пра якія мы нічога не ведаем.

— Калі прыцісне бяда, можна будзе і жаб пакаштаваць, не гэтых, а тых, што на зямлі. Трэба думаць, што рэч няшкодная.

— Калі трэба будзе, пакаштуем і жаб,— з смешнай пакорлівасцю ўздыхнуў Мірон.

Нічога больш спажыўнага на гэты раз не здабылі.

— Добра, што хоць крыху папасвіліся,— казалі хлопцы, калі ішлі дадому.

Сонца ўжо заходзіла, калі яны вярнуліся на сваю стаянку. Папраўілі вогнішча. Агонь весела затрашчаў. Пасля ўчарашніх турбот іх «дом» здаваўся такім прытульным, родным, нібы яны тут і нарадзіліся.

— Няма чаго дурыцца, заўтра абавязкова пайду памыюся,— нездаволена бурчаў Мірон.— А ты як сабе хочаш.

— Заўтра і я пайду,— са смехам адказаў Віктар.— Але вось што: адной чарапахі для чаю мала, трэба яшчэ пасудзіну зрабіць з бяросты.

— Рэч добрая,— згадзіўся Мірон.

Віктар адышоўся да бярозы.

І раптам ён закрычаў так, што рэха пакацілася па ўсім лесе:

— Мірон! Што гэта такое?!

Мірон ускочыў, нібы яго хто тыцнуў пад бок. Падбег да Віктара і ўбачыў, што той падымае з зямлі недакурак.

— Што гэта такое?! — паўтарыў Віктар.

— Недакурак,— спакойна адказаў Мірон.

— Адкуль?! — зароў Віктар.

Тут ужо і Мірон сцяміў, што справа сур'ёзная.

— Пакажы,— прамовіў ён дрыжачым голасам.

Недакурак быў сухі, свежы...

— Хлопцы пазіралі адзін на аднаго, як ачмурэлыя.

— Можа, ты? — шэптам запытаўся Віктар.

— Ідзі ты к ліху! — раззлаваўся Мірон.— Хутчэй ты сам.

— І не я. Значыцца...

— ...тут нядаўна быў чалавек,— скончыў Мірон.— І быў ён не пазней учарашняга дня, бо ў перадапошнюю ноч быў дождж і недакурак пажаўцеў бы.

— А я думаю, што сёння,— упэўнена адказаў Віктар,— бо сёння я тут быў і ў кожным разе такую незвычайную рэч заўважыў бы.

— Відаць, ён быў тут, калі нас не было, і падумаў, што нікога няма. Можа, ён і недалёка паспеў адысціся.

— Гэй! Людзі! Сюды! — загукалі хлопцы што было сілы.

Прыслухаліся — ніхто не адгукаецца.

Зноў пачалі крычаць, зноў прыслухаліся. Потым пабеглі наперад, нібы шалёныя, кідаліся ва ўсе бакі і крычалі датуль, пакуль не страцілі галасы. Але ўсё было дарэмна...

— Няма! Пайшоў,— апусціў галаву Віктар.— А ён ведае дарогу.

— Добра ўжо і тое, што сюды можна прыйсці,— сказаў Мірон.— А калі можна прыйсці,— значыцца, можна і выйсці.

— Але як, калі не ведаеш, знайсці гэтую сцежку?

— Вядома, нялёгка. Затое мы пэўна ведаем, што яна ёсць. І гэта добра.

Доўга абмяркоўвалі яны гэтае здарэнне, нават заснуць не маглі. Вельмі шкадавалі, што чалавек не знайшоў іх. Але ж затое ў іх з'явілася надзея хутка выбрацца з гэтай пушчы.

І калі нарэшце, здавалася, яны паснулі, Віктар раптам усхапіўся і штурхнуў Мірона ў бок.

— Чаго ты? — нездаволена буркнуў той.

— Слухай! — трывожным шэптам пачаў Віктар.— А што, калі... ён... наўмысля не хацеў сустрэцца з намі?

— Ну, во яшчэ што выдумаў! Спі. Заўтра ўбачым.

— Не, ты толькі падумай: будка, вогнішча, чарапаха з сокам, розныя хатнія рэчы, а галоўнае, барсучыная шкура ў будцы. Хіба можна падумаць, што нікога няма? Га?

— А чаму ж не? — адказаў Мірон, але ўжо не так упэўнена.— Калі мы пойдзем, то пакінем жа і вогнішча, і будку.

— А чарапаху? А барсучыную шкуру?

— Ну, ён мог на гэта не звярнуць увагі.

— Але ж ён, здаецца, стаяў і курыў тут.

Довады Віктара пахіснулі і Мірона. Але як яны ні меркавалі, растлумачыць гэты незразумелы факт ніяк не маглі. Ну хто мог хавацца ад іх і навошта?..

Так і паснулі ў трывожным няведанні.

XIV

Дарэмныя патугі.— Паселішча баброў.— Яшчэ адна няўдалая спроба.— Недакурак варона на хвасце прынесла.— Сонны заяц.

Ледзь толькі ўзышло сонца, як хлопцы былі на нагах і спешна рушылі ў дарогу. Калі яны падышлі ўжо да балота, каб пераправіцца на другі востраў, Мірон прыпыніўся і сказаў:

— А чаму мы так упэўнены, што чалавек прыходзіў з таго вострава? Ён жа мог прыйсці і непасрэдна на наш.

Віктар і сам здзівіўся, адкуль узялася ў іх гэтая ўпэўненасць. Тым болей што чалавеку без ніякай патрэбы і карысці трэба было прабірацца і праз гэтае балота, у якім яны ледзь не загінулі.

— Усё роўна трэба абследаваць абодва,— нарэшце сказаў Віктар,— дык пачнём ужо з таго, які меней вядомы.

Яны пільна прыглядаліся да балота, ці не відаць слядоў незнаёмага чалавека. Але сярод сваіх слядоў новых нельга было заўважыць.

— А можа, ён у другім месцы перайшоў.

Прайшліся ў адзін, другі бок, але ніякіх слядоў не знайшлі.

Як жа не хацелася ім зноў лезці ў гэтае абрыдлае балота! Адно што ўдзень ісці было куды лепш, як уначы. Апрача таго, заўважылі, што за апошнія суткі балота крыху пасушэла.

— Відаць, паводка яшчэ не скончылася,— сказаў Мірон.— Вада ўсё падае. Гэта для нас добра.

Перайшлі на той бераг і пайшлі ў абход, як і раней.

Зноў пачалася цяжкая праца. Зноў у роспачы соваліся яны ва ўсе куткі і кожны раз без выніку адыходзілі назад. Вось абагнулі адзін бок, другі, а выйсця ніякага няма. Абышлі трэці бок і завярнуліся зноў назад.

— Значыцца, чалавек прыходзіў не на гэты востраў, а на наш,— упэўнена сказаў Віктар.

У кутку, адкуль хлопцы пачалі абследаванне апошняга, паўднёвага берага вострава, сярод дрэў і лазняку яны заўважылі ваду, нібы азярцо. Яны і раней бачылі яе, але палічылі,

што сюды няма чаго совацца, і пайшлі далей да месца сваёй пераправы.

Цяпер жа зацікавіліся і гэтым месцам. Калі праціснуліся праз лазняк, убачылі крынічку, якая, відаць, выцякала з балота ў возера. Крыху далей крыніца была перагароджана нібы грэбляй, перад якой вада крыху затрымлівалася і стварала тое азярцо, што хлопцы бачылі з берага. Цяжка было распазнаць, ці прыродная гэта грэбля, ці зроблена людскімі рукамі. Праўда, два зламаныя дрэвы з галінамі, кучы ламачча ляжалі так, як чалавек не рабіў бы. Але, з другога боку, цяжка было даць веры, што ўсё гэта навалілася тут выпадкова. Перад грэбляй з вады вытыркаліся тры стажкі, нібы копы сена. Зноў жа нельга было даць веры, каб такія стажкі стаялі выпадкова.

Раптам каля грэблі плюхнуліся ў ваду дзве-тры невялікія жывёліны, падобныя да выдры, якую хлопцы бачылі раней.

— Бабры! — крыкнуў Віктар.

Гэтае з'явішча так зацікавіла хлопцаў, што яны забыліся і на голад, і на зморанасць, і на таемнага чалавека, і на сваё становішча. Столькі разоў яны чулі і чыталі пра гэтых рэдкіх, каштоўных і цікавых жывёл, якія захаваліся ў рэчках лясных раёнаў РСФСР і ў БССР. Столькі чулі пра іх паселішчы, жыццё. І вось цяпер яны бачаць іх сваімі ўласнымі вачыма ды яшчэ ў першабытных, прыродных умовах.

— Дык вось як яны жывуць! — прамовіў Мірон.— Трэба будзе добра прыгледзецца да іх.

— Абавязкова! — згадзіўся Віктар.— Варта спецыяльна дзеля гэтага застацца на адзін лішні дзень.

Сёння было позна гэтым займацца. Надыходзіў вечар, хлопцы даўно ўжо выйшлі з «дому», і трэба было спяшацца, каб не пагас агонь. Зірнулі мімаходзь на бабровае паселішча і пайшлі далей.

Уся гэтая мясціна выдалася зусім не гразкая. Калі праціснуліся праз зараснік, то адразу выйшлі на ўзгорак, а за ім недалёка ўбачылі і сваю рыбную сажалку.

— Вось табе і на! — крыкнуў Віктар.— Навошта ж мы пакутавалі на балоце, калі тут ёсць такая добрая дарога!

У высахлай сажалцы відаць было шмат слядоў не толькі звяр'я, але і птушак.

— Відаць, усе паласаваліся нашай рыбай,— заўважыў Мірон.

Так скончыўся гэты дзень. Здавалася, ён быў такі самы цяжкі, няўдалы, безнадзейны, як і папярэдні, але хлопцы неяк менш непакоіліся і не пакутавалі, як тады: новыя падзеі адцягнулі іх увагу ад сумных думак.

А на другі дзень доўга не маглі вырашыць, за што ўзяцца: ці дарогу шукаць, ці ісці паглядзець баброў.

— Зразумей жа ты,— даводзіў Мірон,— што ад дарогі залежыць наша выратаванне. Нельга з-за цікавасці рызыкаваць жыццём. Калі будзем ведаць дарогу, тады заўсёды можам вярнуцца і спакойна заняцца наглядannем. Я не кажу, каб абавязкова ісці дадому. Хай мы знойдзем хоць след чалавечага жылля і адтуль вернемся.

Віктар жа даводзіў сваё:

— Ну як жа ісці далей, калі побач такая цікавая рэч? Калі яшчэ вернемся ды і ці вернемся наогул — невядома. Можа, гэты след за дваццаць кіламетраў. Ці захочаш тады ты сам вяртацца назад? Я не спадзяюся на гэта.

Доўга спрачаліся яны і, нарэшце, вырашылі кінуць жэрабя. Лёс вырашыў на карысць Віктара.

Праз некаторы час яны былі каля бабровага паселішча. Спачатку ўважліва агледзелі будоўлю. Адно з паваленых дрэў мела сантыметраў сорак таўшчыні, другое — крыху меней, а побач было шмат танчэйшых пнёў.

— Няўжо ўсё гэта яны самі звалілі? — дзівіўся Мірон.

— А то хто ж? Глядзі, як падпілавалі.

Усе пні былі завостраныя, нібы калы. Таксама былі завостраныя і канцы дрэў. Бабры пачыналі грызці навакол шырокай паласой, а потым усё вузей і вузей, пакуль дрэва не ламалася.

— Няўжо яны па свайму жаданню валяць гэткае дрэва ў той ці іншы бок? — пытаўся Мірон.

— Мусіць, так, бо, бачыш, няма ніводнага дрэва, паваленага ў другі бок.

Тут яны заўважылі вялікую асіну, якая была падгрызена так, што, здавалася, яе можна было б зваліць пальцам.

— Не! — крыкнуў Віктар.— Хоць сам загіну, а падпільную, як яны будуць валіць гэтае дрэва!

І сапраўды, справа была такая цікавая, што нават Мірон не хацеў ужо ісці адгэтуль.

Здалёк грэбля здавалася абы-як накіданай кучай, а зблізку выявілася, што ўнізе галлё шчыльна пераплецена, нават замазана зямлёй, і вада затрымлівалася як след.

Такія самыя былі і бабровыя хаткі. Ад зямлі (у вадзе) яны ўздымаліся не меней, як на рост чалавека. Верхнія пласты галля здаваліся паваленымі абы-як, але чым глыбей, тым лепей яны былі апрацаваны, пераплецены і замазаны.

— Бачыш, вунь пад вадой чарнеецца дзірка,— тлумачыў Віктар.— Гэта іхні ўваход. Такіх уваходаў некалькі. А самі яны жывуць на другім паверсе, куды вада не даходзіць.

— Значыцца, цяпер яны сядзяць у гэтых стажках? Цікава было б злавіць, каб паглядзець бліжэй.

— Не, брат! Гэта нялёгкая справа. На тое ў іх ёсць некалькі выхадаў.

— А можна іх есці?

— А ты ўсё з харчовага пункту погляду разглядаеш! — засмяяўся Віктар.— Не чуў, каб іх елі. Не гэтым цікавяцца, а іх футрам ды яшчэ нейкім «бабровым струменем». Кажуць,— лекі.

Яны ўважліва разглядалі будоўлю, абышлі ўвесь участак і каля другога берага, сярод зарасніку, убачылі чацвёртую хатку. Яна была пабудавана на карчы, і вада ледзь дакраналася да яе фундамента. Трэба было ступіць толькі крок з берага, каб апынуцца на версе гэтай хаткі. Хлопцы зараз жа і ўзлезлі на яе.

Яны зусім не чакалі, што пабудова будзе такой моцнай: яна лёгка вытрымала двух чалавек. Цікава было думаць, што пад іх нагамі сядзяць бабры. Але Віктар выказаў думку, што, мусіць, яна пакінутая, бо на ёй ляжыць старое галлё, у той час як на іншых ёсць свежае, нядаўна згрызенае.

— Яны кожны год рамантуюць свае хаты,— казаў Віктар.— Можа, цяпер зробім засаду, каб падпільнаваць іх?

Знайшлі адпаведнае месца, сушэйшае і гусцейшае, схаваліся і пачалі чакаць. Прайшло з паўгадзіны, гадзіна, а бабры не паказваліся.

— Мусіць, яны напалохаліся нашага шастання,— прашаптаў Віктар.— Наогул, удзень яны не любяць выходзіць, а цяпер тым больш.

— У такім разе не варта болей і сядзець,— падхапіўся Мірон.— Лепш за гэты час пойдзем па сваёй справе. А сюды прыйдзем заўтра, ціхенька, каб іх не спужаць.

Думка была слушная, і Віктар мусіў з ёю згадзіцца. Пайшлі далей вакол вострава. На гэты раз справа спрашчалася тым, што не трэба было абследаваць ні ўсходняга боку, ад возера, ні заходняга, ад другога вострава. Нават з паўночнага боку заставалася толькі палова, бо другую, як было вядома, таксама атачала возера. Заставаўся, такім чынам, толькі паўднёвы бок.

За яго і ўзяліся. Але як ні стараліся, як ні соваліся наперад,— нідзе не маглі выйсці.

— Якім жа чынам той чалавек прабраўся? — дзівіліся хлопцы.

— А можа, гэты недакурак якім-небудзь іншым спосабам трапіў сюды? — выказаў думку Мірон.

— Можа, варона на хвасце прынесла? — насмешліва сказаў Віктар.

— Чаго смяяцца? — сур'ёзна адказаў Мірон.— Калі ніякага іншага тлумачэння няма, дык можна падумаць, што якаянебудзь птушка несла ў сваё гняздо ды згубіла. І гэтае дапушчэнне зусім не горшае за тое, што вось нейкі чалавек чамусьці караскаўся праз балота, рызыкаваў жыццём, убачыў жыллё людзей, пастаяў, пакурыў і паваloкся назад.

Разважанні Мірона таксама мелі рацыю. Віктар зусім збянтэжыўся.

— Няўжо ж прыйдзецца ўсур'ёз згадзіцца, што гэты недакурак сапраўды варона на хвасце прынесла? — сказаў ён.

— Я гэтага не кажу. Я толькі зазначаю, што і такое тлумачэнне не горшае за іншыя. Так або інакш, а трэба рыхта-

ваццa да жыцця тут, прынамсі, на некалькі тыдняў. Улетку, безумоўна, дзе-небудзь падсохне настолькі, каб выбрацца.

— Тады лепш рабіць кладкі. За гэты час можна накідаць галля і дрэў гэтулькі, што па іх лёгка будзе прапаўзці.

— А гэта думка добрая! — ажывіўся Мірон.— Гэтак і пачнём рабіць. Нават можна ў баброў пазычаць дрэвы, бо самі мы не здолеем так іх ссячы.

План гэты спадабаўся абодвум і значна супакоіў іх. Гэткім чынам яны самі маглі дзейнічаць і набліжаць сваё выратаванне, а не сядзець, чакаючы, пакуль прырода зробіць ласку і падсушыць балота. Адной думкі аб такой магчымасці было досыць, каб энергія ў хлопцаў падвоілася. Віктар адразу ж загарэўся і пачаў марыць:

— Калі мы кожны дзень будзем падкідаць галля, то можна зрабіць такую грэблю, што па ёй нават ехаць можна будзе.

— Не надта захапляйся,— сказаў Мірон.— Як толькі станеш, то твая грэбля і праваліцца.

— А я стаяць не буду,— храбрыўся Віктар.— Абы толькі дакрануцца нагой. Не паспее галіна падацца, як нага мая пераскочыць далей.

Разважанні былі слушныя. Хлопцы прыгадалі, як ім даводзілася перабягаць раку па тонкім лёдзе, які трашчаў пад нагамі і, напэўна, не вытрымаў бы чалавека, каб той спыніўся на месцы. Гэтаксама можна перабягаць па вадзе па дошках, хоць стаяць на іх нельга.

Калі ўсё абгаварылі і цвёрда пастанавілі зараз жа прыняцца за работу, Мірон спыніўся, паківаў галавой і сказаў:

— Ну і наплялі мы з табой глупства.

— Якога?

— Каб хто накідаў нам галля зверху, то, можа, і сапраўды мы маглі б перабрацца па ім. А калі мы самі пачнём хадзіць туды і сюды ды насіць галлё, то ўсё і затопчам у балота пры першых кроках.

— Ясна! — сказаў Віктар.— Цяпер буду фантазіраваць толькі тады, калі добра абдумаю пытанне.

Яны ціха пайшлі напрасткі да сваёй хаты. Хоць думкі іх былі далёка адсюль, але па прывычцы яны пільна прыгляда-

ліся да кожнага куста, да кожнага кутка. І пад адным кустом заўважылі нешта светла-шэрае.

Угледзеліся — заяц! Сядзіць сабе і глядзіць на іх, вылупіўшы вочы. Праўда, ветрык дзьмуў акурат з яго боку, так што ён мог іх і не ўчуць. Але ж затое бачыць павінен быў.

— Мусіць, спіць,— сказаў Віктар.— Паспрабуем падкрасціся.

І яны пачалі красціся так ціха, што нават адзін аднаго не чулі. Толькі сэрцы калаціліся моцна-моцна. Крок за крокам пасоўваліся наперад. Вось ужо заяц відаць зусім выразна. Ляжыць на жываце, падкурчыў ногі, вушы натапырыў, а сам глядзіць хлопцам у вочы. Нават нейкі жах ахапіў тавапышаў.

Чым бліжэй, тым больш хваляваліся яны. Вядома, ён зараз ускочыць і ўцячэ! Але заяц не рухаўся...

Апошнія пяць крокаў для хлапцоў былі такімі пакутнымі, што нават бадзянне па балоце (як яны казалі потым) здавалася ім лягчэйшым. Невыказная напружанасць, надзея, жах, што вось-вось уцячэ, зноў надзея, боязь, што пад нагою ў каго-небудзь [illegible] іх хрусне галінка, усё гэта было надзвычайна цяжкім перажываннем.

Вось Мірон замахнуўся дубінай — і заяц забіты...

— Эх! — вырвалася ў абодвух хлопцаў, нібы яны перанеслі вялікі цяжар.

— Якім чынам гэта магло здарыцца? — не верыў сваім вачам Мірон.

— З імі гэта здараецца. Мая бабуля казала, што аднаго разу, калі збірала ягады, дык яна сама натрапіла на такога зайца. Але чамусьці яна пабаялася хапаць яго голымі рукамі і пачала адвязваць фартух. Заяц прачнуўся і ўцёк.

Вялікая была радасць хлапцоў, але не меншыя былі і скаргі на тое, што няма нажа, калі прыйшлося зайца разбіраць.

— Дзіўная рэч! — заўважыў з гэтага поваду Мірон.— Кожны раз мы скардзімся на гэта тады, калі трэба радавацца, калі ёсць што есці. А калі няма чаго есці, мы не скардзімся.

— А ты ўсё мудрагеліш ды філасофію разводзіш з кожнага глупства,— упікнуў Віктар.

XV

Бабровая гаспадарка.— Неспадзяваная небяспека.— Збаўцы-ворагі.— Чужыя гаспадары.— Рэшткі ад чужога стала.— Сур'ёзная памылка.

Такім чынам высветлілася, што ў бліжэйшыя дні няма чаго спадзявацца на вызваленне. Некалькі часу яны маглі пра гэта не думаць. А запас спажывы дазваляў ім дні са два адпачыць. Гэтае становішча скарыстаў Віктар і прапанаваў, не адкладваючы, на другі ж дзень, ісці наглядаць баброў.

— Толькі, брат, запасіся цярплівасцю! — папярэдзіў ён,— бо прыйдзецца сядзець і не варушыцца, можа, некалькі гадзін. Абяцаеш?

— Ды ўжо ж! — адказаў Мірон, бо ён і сам цікавіўся не менш за свайго таварыша.

Падышлі яны так ціха, што нават не спудзілі бабра, які нешта майстраваў на сваёй хаце. Аднак, калі хлопцы пачалі масціцца на сваім месцы, бабёр даў нырца і знік.

Хутка з вады зноў высунулася тупая, круглая галава. Праз хвіліну — другая, трэцяя. Двое падышлі да пачатага дрэва і ўзяліся за працу. Якія яны былі смешныя, нязграбныя! Хвост шырокі, нібы рыдлёўка, і пакрыты не поўсцю, а нейкай луской. Пальцы задніх ног злучаны плеўкай, як у гусей. На пярэдніх жа пальцах плеўкі няма, затое кіпцюры вострыя, а на другім пальцы нават падвойныя. Густая бураватая поўсць аж блішчыць на сонцы.

Двое «дрывасекаў» сталі з абодвух бакоў на заднія лапы, абапёрліся яшчэ на хвасты і ўзяліся за працу так, што толькі трэскі пасыпаліся. Трэці зноў палез на сваю хату, чацвёрты пачаў цягнуць з берага дрэўца таўшчынёю з руку чалавека. Цяжкая праца! Таргане крыху — і адпачывае. Яму на дапамогу прыйшоў новы таварыш.

З захапленнем наглядалі хлопцы гэты малюнак.

Тым часам дрэва хіснулася, храснула. «Дрывасекі» адскочылі ўбок, а рэшта баброў кінулася ў ваду.

— Слухай! Яны ж могуць прыстукнуць нас! — з жахам прашаптаў Мірон.

Віктар і сам гэтага баяўся. Ён пільна прыглядаўся, у які бок думае валіцца дрэва, але пакуль што пазнаць было нельга. Дрэва патрэсквала і хісталася. Бабры падскочаць, грызануць і зноў адскочаць. Але падгрызалі яны з боку вады, або, лепш сказаць, грэблі.

— Яно павінна туды паваліцца,— прашаптаў Віктар.

Аднак поўнай упэўненасці ў гэтым не магло быць. Хлопцы рызыкавалі. Толькі вострая цікавасць і запал утрымлівалі іх на месцы.

Вось ужо дрэва хіліцца на той бок. Храснула апошні раз і з страшэнным трэскам шаснула на грэблю. Ад гэтага шуму нават «дрывасекі» схаваліся ў ваду.

— Але ж малайцы! — з захапленнем прамовіў Мірон.— Такая драбната, а гэткае дрэва звалілі!

— Ціха! Паглядзім, што далей будзе,— прашаптаў Віктар.

А далей... далей адбылося нешта ўжо зусім нечаканае. У лесе пачуліся галасы і сярод дрэў мільганулі... два чалавекі!

— Людзі! — радасна крыкнуў Віктар і хацеў быў ускочыць.

Пазней Мірон зусім не мог прыпомніць і растлумачыць, што з ім тады здарылася. Памятаў толькі, што ў яго галаве, нібы маланка, мільганула слова «недакурак», і ён люта сцяў зубы, схапіў Віктара за плячо і прасіпеў:

— Не рухайся! Пачакай!

Віктар апусціўся і заціх. На іх шчасце, толькі што паваленае дрэва заглушыла голас Віктара. Людзі нічога не пачулі, падышлі і спыніліся каля таго стажка, на які ўчора ўзлазілі хлопцы.

Адзін з незнаёмцаў быў высокі, дужы, гадоў пад пяцьдзесят чалавек, з чорнай стрыжанай барадой і густымі чорнымі вусамі, якія апускаліся ўніз, як у маржа. Пад густымі бровамі глыбока сядзелі вузкія вочы, якія надавалі яму люты выгляд. На ім была кароткая шэрая, з грубага сукна, світка і высокія паляўнічыя боты, запэцканыя ў балоце да каленяў. За плячыма вісела стрэльба.

Яго таварыш быў маладзейшы і меў больш «гарадскі» выгляд. Высокі, тонкі, голены. На ім таксама былі высокія боты,

а замест світкі — парусінавая накідка. Стрэльбы ў яго не было.

Кідалася ў вочы, што абодва наогул былі вельмі запэцканыя.

— Вось якое дрэва звалілі,— заўважыў малодшы.

— Гэткім чынам яны маглі разбурыць нашу хатку,— сказаў чорны.— Вось нарабілі б бяды.

— А *яны* тут былі? — запытаўся першы.

— А ліха іх ведае! Пакуль што, як бачыш, слядоў не відаць.

— Дык усё ж, нарэшце, як вырашым гэтую справу? — звярнуўся малады да свайго спадарожніка.

— І сам не ведаю,— задумаўся старэйшы.— Можа, дай бог, яны самі загінулі.

— А калі не?

— Тады, мусіць, трэба ім дапамагчы,— крыва ўсміхнуўся чорны.

«Гэта ж, відаць, пра нас ідзе гутарка! — падумаў кожны з хлопцаў.— Але завошта? Што мы ім зрабілі?»

Яны зірнулі адзін на аднаго, але не паварушыліся. Справа была такая незразумелая і недарэчная, што хлопцы не хацелі верыць сваім вачам і вушам і чакалі, што зараз усё высветліцца.

— Кепска атрымліваецца,— казаў тым часам малодшы.— Калі яны выйдуць адсюль, дык усюды раструбяць аб гэтым кутку. Палезуць розныя вучоныя, возьмуць пад ахову гэтых баброў. Пачнуць пісаць у газетах. Да гэтага часу толькі ляснік адзін раз, узімку, наведваўся сюды, а тады кожны палезе. І нам прыйдзецца развітацца з надзейным прытулкам.

— Я ж і кажу,— буркнуў чорны.

— Але ж, з другога боку, яны нам зусім непатрэбныя.

— Чаго там шкадаваць савецкае насенне! — бліснуў вачыма чорны.— Нічога, акрамя карысці, не будзе, калі загінуць два бальшавіцкія гадаванцы.

— І то праўда,— уздыхнуў малады.— Наша справа важней за гэтых двух малакасосаў. А колькі нашага брата гіне ад іх! Хай не соваюць свой нос куды не трэба. Дзе яны цяпер?





— Там, каля возера.

— Значыцца, зробім такім чынам: яны, вядома, надзвычай будуць рады, калі ўбачаць нас; мы возьмемся іх вывесці, а там...

— Гэта зручна яшчэ і з другога боку: калі што якое, дык будуць думаць, што яны самі загінулі ў балоце,— дадаў чорны.— Можа, паглядзім цяпер, ці ўсё ў парадку?

— Потым паспеем, спачатку скончым гэтую справу,— адказаў малады.

Яны абмінулі грэблю і накіраваліся ў той бок, дзе была стаянка хлопцаў.

Крокі і шолах даўно ўжо сціхлі, а хлопцы ўсё яшчэ ляжалі ў сваёй засадзе і не дыхалі.

— Слухай! — дрыжачым шэптам сказаў Віктар.— Скубані мяне за бок: можа, я сплю.

— Абодва разам не могуць бачыць адзін сон,— сказаў Мірон.— Гэта дзікая праўда. Што будзем рабіць? Ці ўцякаць, ці сядзець тут?

Віктар падумаў і сказаў:

— Гэта, мусіць, усё роўна: ці тут хавацца, ці дзе-небудзь. Абы толькі не трапіць ім на вочы. Шукаць яны нас не будуць,— заўважыў Мірон.

— Чаму так? — здзівіўся Віктар.— Якраз і будуць шукаць.

— Ты чуў, што яны казалі? — разважліва сказаў Мірон.— Мы ж іх сустрэнем з радасцю. Так яно і павінна было б быць. А калі мы іх не сустрэнем?

— Тады яны будуць нас шукаць.

— Так, ды не гэтак. Будуць крычаць, клікаць нас, нават страляць, каб мы самі прыйшлі да іх. Не могуць жа яны падумаць, што мы наўмысля хаваемся ад іх. Яны ж нашы «збаўцы».

— Але,— усміхнуўся Віктар.

— Калі мы не адгукнемся, то яны падумаюць, што мы загінулі. А шукаць, як уцекачоў, яны не павінны, не маюць падставы.

Гэтае разважанне крыху супакоіла абодвух. Іх задачай бы-

ло толькі, як кажуць, сядзець і не рыпацца і такім чынам дачакацца, пакуль ворагі пойдуць з вострава.

Праз некаторы час сапраўды пачуўся стрэл.

— Клічуць нас! — засмяяліся хлопцы.

Пачуўся новы стрэл ужо ў другім месцы. Праз некаторы час данесліся крыкі. Крыкі то набліжаліся, то аддаляліся: відаць, бандыты хадзілі па ўсім лесе.

Нарэшце галасы пачалі набліжацца да хлопцаў, пачуўся хруст, і абодва чалавекі зноў выйшлі да грэблі.

— Мусіць, яны ў гэтым баку,— казаў адзін з іх.

— Усё ж такі дзіўна, што яны не адгукаюцца,— прамовіў другі.— Не можа быць, каб нашыя стрэлы і крыкі не былі чутны.

— Пагукаем яшчэ тут. Калі няма, значыцца, няма.

— Ці не маглі яны як-небудзь выйсці?

— Апрача таго месца, прайсці нідзе нельга, нават у самае сухое лета,— чуўся голас чорнага.— Куды б яны ні сунуліся, усюды загінуць.

— А можа, якім-небудзь чынам даведаліся пра наш шлях?

Чорны дзядзька гучна засмяяўся:

— А ты сам упэўнены, што пройдзеш цяпер адзін?

— Не вельмі. У такім разе, можа, нам і не трэба будзе турбавацца?

— Дай бог.

І яны на вачах у хлопцаў зноў пачалі страляць і гукаць:

— О-о-го-о! Сюды-ы!..

Хоць і не да смеху было нашым хлопцам, але яны не маглі не ўсміхнуцца.

— Вось дабрадзеі знайшліся, каб яны хутчэй самі ўтапіліся! — сказаў Мірон, калі людзі адышлі.

— Гэтага мала,— злосна прамовіў Віктар.— Хоць тры гады буду сачыць, але аддам іх пад расстрэл. Пойдзем дахаты, хай яны там блукаюць.

— Ох! — прастагнаў Мірон.— Усё цела здранцвела: мусіць, гадзін пяць ляжалі нерухома.

І яны пайшлі да стаянкі.

Ззаду чуліся крыкі і стрэлы іхніх «дабрадзеяў». Хоць

хлопцы і не баяліся, што ворагі зараз будуць іх шукаць, але ўвесь час адчувалі небяспеку.

— Горш за ўсё, што агню нельга раскладаць,— казаў Мірон.— Калі яны вернуцца ды ўбачаць, што вогнішча нехта падправіў, дык адразу здагадаюцца, што мы тут. А агонь тым часам можа згаснуць.

— Падсунем тоўстыя кавалкі пад попел, можа, не звернуць увагі,— параіў Віктар.

— А што, калі заўважаць? — непакоіўся Мірон.— Ад гэтага можа залежаць наша жыццё.

Падумалі-падумалі і парашылі лепш рызыкнуць агнём, чымся жыццём.

— Можа, небяспечна кратаць і нашу спажыву? — сказаў Віктар.— Таксама могуць заўважыць.

— І гэта праўда,— згадзіўся Мірон.— Вось дурное становішча: глядзець на сваю ўласную ежу, галадаць і не мець права крануць яе.

Усё гэта было б нават смешна, каб не было гэтак небяспечна.

Не сядзелася ім на месцы. Увесь час пазіралі ў той бок, дзе былі «дабрадзеі». Нарэшце Віктар не вытрымаў:

— Не! Не магу! Ідзём схаваемся побач.

Адышліся ў балота, у зараснік, і там заселі. Адтуль была відаць і іх стаянка, і дарога, па якой маглі прыйсці ворагі. Нарэшце паказаліся і яны. Падышлі да будана і селі каля вогнішча.

— Каб канчаткова ўпэўніцца, трэба пачакаць вечара,— сказаў малады,— калі яны яшчэ жывыя, то павінны прыйсці сюды начаваць.

— Але ў такім разе мы сёння не зможам вярнуцца назад,— заўважыў чорны.

— Ну дык пераначуем тут. Вось і будан ёсць. Нават барсучыная шкура ў ім. А вунь і палова зайца, і рыба вісіць. Заяц, відаць, яшчэ свежы. Значыцца, учора яны тут жылі. Калі загінулі, дык толькі сёння.

Бандыты падклалі ў агонь дроў. Чорны выняў з торбы хлеба, сала, солі.

Калі ўбачылі гэта хлопцы, дык у іх аж сліна пацякла.

— А можа, пакаштуем іхняга зайца? — сказаў малады.

— Не варта важдацца.

— Ну, дык я маленькі кавалачак сабе спяку.

Падышоў, узяў зайца і сказаў.

— Як ён скрэмзаны. Відаць, у іх і нажа не было.

— А вось неяк трымаліся, чортавы дзеці! — буркнуў чорны.— І якім чынам здолелі зайца злавіць?

— Мусіць, іх там навучаюць цяпер розным такім штукам,— казаў малады, адразаючы нажом тонкую лусту мяса. Потым палажыў яе ў попел.

Хвіліну памаўчалі, глядзелі, як скварыцца мяса. Надыходзіў вечар. Навокал было так спакойна і мірна, што цяжка было падумаць пра тую людскую жорсткасць, якая панавала тут у гэты час. Відаць, гэты настрой мімаволі ахапіў і малодшага.

— А можа, плюнуць на ўсю гэтую справу і пайсці дадому, пакуль не позна? — прамовіў ён.

Чорны сурова зірнуў на яго:

— Праз два тыдні нам спатрэбіцца гэтае месца. Калі мы страцім яго, нам самім прыйдзецца рызыкаваць жыццём. Няўжо ж з-за гэтых шчанят ты сам згодзен пацярпець?

— Ды я гэта кажу толькі таму, што ўпэўнен у іх смерці. Наўрад ці могуць яны столькі часу не прыходзіць.

— Каб цвёрда быць упэўненым, трэба перачакаць ноч,— сурова сказаў чорны.

Малады выняў мяса, пачысціў яго, пасыпаў соллю і са смакам пачаў есці.

— Нішто,— сказаў ён.— Раю і табе.

— Не хачу гэткага дабра,— махнуў рукой яго таварыш.

Бедныя хлопцы ледзь не плакалі, калі глядзелі, з якім смакам есць вораг іхняе мяса. Ды яшчэ з хлебам, з соллю! Хоць бы драбінку гэтага хлеба і солі пакаштаваць.

— Кладзёмся спаць,— прапанаваў стары.— Калі прыйдуць, не пакрыўдзяцца. Яны і спадзявацца не маглі ўбачыць тут людзей, якія могуць іх вывесці.

Віктар сціснуў кулакі, заскрыгатаў зубамі і ледзь не зароў ад злосці.

Стары ўлез у будку, палажыў пад сябе стрэльбу і разлёгся на шкуры.

— Паглядзі, там яны чарапаху паставілі на бярозавы сок,— сказаў ён з будана.— Піць хочацца.

Малады пайшоў, узяў чарапашыну, папіў і паднёс свайму таварышу.

— Добрая рэч, дай бог ім здароўя,— засмяяўся той.

Потым і другі ўлез у будан. Пра нешта яшчэ пагутарылі там, але хлопцы не маглі разабраць.

Стаяла цішыня. Толькі нейкія вячэрнія птушкі часам парушалі яе.

Надышла ноч. Хлопцы сядзелі ў сваёй засадзе, нібы скамянелыя. Ім здавалася, што ў гэткай цішыні чуваць не толькі кожны іх рух, але і дыханне, нават стук сэрцаў. Доўга не адважваліся яны паварушыцца. Вось ужо і храп пачуўся з будкі, і яны ўсё яшчэ баяліся крануцца з месца. Ад холаду і вільгаці пачалі дрыжаць.

— Ну, давай вылазіць,— прашаптаў Віктар.

Паварушыліся — і зараз жа храснуў леташні сухі чаротнік. Самлелі хлопцы, сталі дыханне, прыслухаліся — нічога. Палезлі далей.

І вось тут адбылося самае жудаснае ў іхняй гісторыі: Мірон заблытаўся нагамі ў лазняку і... ляснуўся на зямлю.

У будцы зараз жа заварушыліся, і адтуль вылез чорны бандыт са стрэльбай у руках. Зірнуў ва ўсе бакі, прыслухаўся, пачакаў некалькі хвілін і схаваўся назад.

— Што там такое? Можа, яны? — пачуўся сонны голас маладога.

— Не. Мусіць, звер які.

Хлопцы прыліплі да зямлі ў самых недарэчных позах. Мірон ляжаў тварам у балоце і задранай дагары нагою. Віктар перш сядзеў на кукішках, а пасля паваліўся на бок і абапёрся адною рукою аб зямлю. І ў гэткім становішчы яны павінны былі яшчэ доўга чакаць, пакуль можна будзе рухацца далей. Нарэшце дачакаліся гэтага часу і папаўзлі.

Калі яны адышліся далёка, Віктар аж з кулакамі накінуўся на Мірона.

— Ах ты, мядзведзь касалапы! — сіпеў ён.— Праз цябе ледзь не загінулі!

— Ну-ну,— вінавата казаў Мірон.— Нічога дрэннага не здарылася. Не магло ж ім прыйсці ў галаву, што гэта мы.

— Ну, а калі б палічылі цябе за звера ды ўсадзілі кулю, лепш было б?

— Ды кінь ты ўжо! Усё мінула. Давай лепш памяркуем, што рабіць далей.

Віктару рупіла падкрасціся да бандытаў і сцягнуць стрэльбу, але Мірон стрымліваў яго.

— Па-першае,— казаў ён,— стрэльбу выцягнуць з-пад яго нялёгка. Бачыш, як ён чула спіць? Па-другое, нават каб і ўдалося, ці здолеем мы з імі справіцца? У малодшага, а можа, і ў старэйшага, напэўна ёсць рэвальвер: не пойдзе бандыт на такую справу без рэвальвера. А тады ўжо будзе іншая рэч.

Думка аб рэвальверы не прыходзіла Віктару ў галаву і цяпер вельмі збянтэжыла яго.

— Нам толькі забіць гэтага старога чорта ў сне, а другому мы ўдвух далі б рады,— трымаўся яшчэ Віктар.

— Яно, можа, і так,— разважаў Мірон.— А як ты заб'еш яго адразу, калі з будкі толькі ногі яго тырчаць? А калі толькі параніш, то з рэвальверамі яны нас перамогуць.

— Ты, мусіць, баішся? — папікнуў Віктар.

— Што? — пакрыўдзіўся Мірон.— У такім разе, ты добра падумай і скажы: ці так я кажу, ці не? Калі ты шчыра скажаш, што не так, тады я пайду з табою на рызыку.

— Вось каб ведаць, што рэвальвераў няма,— нерашуча прамовіў Віктар.

— Зноў кажу: яны ішлі спецыяльна, каб загубіць нас. Няўжо ж не ўзялі з сабой рэвальвера?

Віктар павінен быў згадзіцца і з гэтым.

— Падыдзем бліжэй, паглядзім.

Падкраліся, прыслухаліся, зазірнулі ў сярэдзіну. У цемры нічога не было відаць, толькі ногі высоўваліся з будана. Тут

ужо і Віктар пераканаўся, што лезці ў цемры ў цесную будку нельга.

— Якая прыкрасць,— прашаптаў ён, калі адышліся.— Вораг спіць побач, і нічога нельга яму зрабіць!

— Пакуль што добра ўжо тое, што самі выратаваліся. А ўтвар іх мы не забудзем і абавязкова знойдзем з дапамогай тых, каму гэта належыць.

Гэтая думка канчаткова супакоіла Віктара.

— У такім разе пойдзем і мы спаць куды-небудзь далей,— сказаў ён.

Яны адышліся, прынамсі, на кіламетр і прытуліліся пад дрэвам.

А калі на світанні зноў падкраліся да будана, бандытаў ужо не было.

Не было і барсучынай шкуры.

— Затое глянь, што яны нам пакінулі,— сказаў Мірон.

На зямлі засталася паперка з соллю і некалькі агрызкаў хлеба. Як шалёныя, накінуліся хлопцы на гэтыя рэшткі і праглынулі не толькі агрызкі, але падабралі і ўсе малюсенькія драбкі. Віктар нават узяў сабе ў рот каліўца солі.

— Ах, якая смачная, салодкая! — цмокнуў ён.— Смачней за ўсе цукеркі і ласункі.

Пакаштаваў і Мірон. Аднак, калі Віктар яшчэ захацеў узяць, Мірон не даў.

— Гэтак ты ўсё з'ясі! — сказаў ён і дадаў: — Цяпер я не шкадую, што яны адрэзалі сабе нашага зайца. Я і добраахвотна б згадзіўся на такі тавараабмен.

Раптам Віктар крыкнуў і пляснуў сябе па галаве.

— Як жа мы не здагадаліся прасачыць, кудой яны выходзяць?!

— Вось гэта дык глупства з нашага боку! — сказаў Мірон.— І як мы маглі забыцца? Мусіць, непасрэдная небяспека ды соль зацямнілі наш розум.

— Пабяжым хоць цяпер! — крыкнуў Віктар і кінуўся наперад.

— Стой! Пачакай! — затрымаў яго Мірон.— Не забывайся, што небяспека не мінула. Можа, яны дзе па лесе ходзяць. Мо-

жа, мы ім трапім на вочы. Трэба красціся асцярожна, хавацца за кожным кустом, кожным дрэвам.

Хоць такім спосабам і мала было надзеі дагнаць бандытаў, якія ішлі вольна, але бегчы было немагчыма.

Доўга яны ішлі такім чынам, часам і перабягалі, але бандытаў не бачылі. Калі ўжо канчаткова пераканаліся, што іх на востраве няма, пачалі шукаць слядоў каля балота.

Між тым сабраліся хмары, загрукатаў гром, упалі першыя кроплі дажджу. Трэба было бегчы ратаваць агонь. І калі хлопцы непадалёк ад таго месца, дзе яны самі перабіраліся на суседні востраў, заўважылі свежыя сляды дзвюх пар ботаў, яны не адважыліся пайсці па іх. Рызыкаваць агнём было нельга.

— Цяпер мы напэўна ведаем, што шукаць пераходу на нашым востраве няма сэнсу,— сказаў Мірон, паварочваючы назад.— Гэта ўжо добра. А дагнаць мы іх наўрад ці дагонім...

— Значыць, прыйдзецца чакаць два тыдні. Яны абяцалі прыйсці па нейкай сваёй цёмнай справе. Тады падрыхтуемся ўжо і будзем разумнейшымі.

XVI

Цяжкія часы.— Спатканне са старым знаёмым.— Мядзведжая хвароба.— Каменныя прылады.— Дымарня.

Два тыдні чакаць смяротных ворагаў, каб з дапамогай іх вызваліцца! Хто б мог падумаць, што складзецца такое становішча?!

— Ну, як табе падабаюцца нашы прыгоды? — усміхнуўся Мірон.— Ці такія яны прыемныя, як пішацца ў кнігах?

— Цяпер, калі я пад'еў мяса з соллю і калі непасрэднай небяспекі няма, я адчуваю сябе досыць добра,— адказаў Віктар.

— А наогул?

— Наогул зусім нецікавая справа. Я ахвотна адмовіўся б ад гэткіх прыгодаў. А ты?

— І я таксама,— уздыхнуў Мірон.— Каб яшчэ ўся гэтая рызыка ды пакута мелі якую-небудзь мэту, як гэта бывае, на-

прыклад, на вайне ці ў якой навуковай экспедыцыі, то яшчэ сяк-так, а тут цярпі і рызыкуй немаведама дзеля чаго. Хавайся, нібы звер ад паляўнічага, без ніякай віны.

— Я проста зразумець не магу,— злосна сказаў Віктар,— як гэта чалавек можа дайсці да такога становішча. Вось кажуць: звер, звер! Дык нашы ж суседзі-звяры — нявінныя дзеці перад гэтымі людзьмі! Да гэтага часу мы і бяззбройныя не мелі ад іх аніякай крыўды.

— Наадварот яшчэ: мы самі скрыўдзілі беднага мішку,— засмяяўся Мірон.

Доўга дзяліліся яны ўражаннямі аб мінулых падзеях. У кожным разе, два тыдні сядзець і чакаць склаўшы рукі ў іх не было аніякай ахвоты. Таму пастанавілі ўзяцца за працу сістэматычна, планава: кожны дзень абследаваць невялікі ўчастак, але дасканала. Пры такой працы яны абавязкова павінны былі натрапіць на той праход, якім карыстаюцца бандыты.

Але праз дзень выявілася, што на гэта часу не хапае. Заяц і рыба скончыліся, а новай спажывы не было. Увесь дзень трэба было ламаць галаву, як пражыць. Грыбоў траплялася мала, бо яшчэ не час быў на іх. Набяруць крыху, прыйдуць дадому, спякуць, з'ядуць — і ўжо зноў галодныя, зноў трэба ісці. А гэтыя грыбы, калі іх спячэш, так зморшчацца, што ад іх бадай нічога не застаецца.

— Калі б яшчэ з хлебам, дык сяк-так! — уздыхалі хлопцы.

Адна толькі ўцеха была, што можна было на грыб палажыць драбінку солі, «паёк», як казаў Мірон.

Каб яшчэ да возера было як даступіцца, то, можа, прыдумалі б што-небудзь, каб рыбіну якую злавіць. Але возера нават відаць не было. Шырокае балота аддзяляла яго ад хлопцаў.

— Хоць бы яшчэ які заяц заснуў на дарозе! — казаў Віктар.

— Другога зайца, мусіць, прыйдзецца чакаць столькі гадоў, колькі мінула ад таго часу, як твая бабуля натрапіла на соннага зайца,— вылічыў Мірон.

Затое замест зайца яны аднаго разу сустрэлі свайго знаёмага мядзведзя. Той стаяў каля вялікага старога дрэва і, за-

драўшы галаву, да нечага прыглядаўся. Мусіць, ён стаяў да хлопцаў тым бокам, з якога было папсавана вока, бо не заўважыў іх, калі яны выйшлі на адкрытае месца. Таварышы зараз жа схаваліся і пачалі сачыць.

Цяпер яны зусім не спалохаліся. Мядзведзь здаваўся ім ужо нястрашным, невялікім, нядужым.

— Дай я падкрадуся і выб'ю яму другое вока,— прашаптаў Віктар, сціскаючы ў руках сваю булаву.

— Не думай, што зноў так будзе, як тады,— папярэдзіў Мірон. Але і яму самому справа здавалася простай.

Мядзведзь усё нюхаў паветра ды прыглядаўся да чагосьці на дрэве. Зірнулі туды і хлопцы і заўважылі дупло, а каля яго нібы мухі лятаюць.

— Пчолы! — сказаў Віктар.— Дык вось да каго ён прыглядаецца! Дзякуй яму за тое, што знайшоў, а выкарыстаць трэба ўжо нам.

Хлопцы пачалі красціся да мядзведзя. Той абапёрся пярэднімі лапамі аб дрэва і сабраўся лезці. Ён быў так заняты сваёю справай, што мог бы не заўважыць ворага нават з абодвума вачыма, а з адным — тым болей.

Толькі ён прыстасаваўся лезці, як — бац! — яму нешта па галаве ды як крыкне нехта над вухам! Зароў наш мядзведзь, шугануў убок, ледзь Мірона з ног не збіў і знік з вачэй. Напэўна можна сказаць, што мядзведзь нават і не бачыў, адкуль на яго звалілася бяда, але ён так спалохаўся, што... адразу ў яго сапсаваўся жывот.

— Вось бачыш, якая простая справа! — урачыста прамовіў Віктар.

Мірон адно плячыма пацiснуў.

— Мусіць, толькі ў нас гэтак здараецца,— сказаў ён,— бо інакш людзі зусім не баяліся б мядзведзяў... А каб дастаць мёд, відаць, трэба спачатку выкурыць пчол дымам. Прыйдзецца ісці па агонь.

— Але перш пашукаем мядзведзя. Можа, у яго і другое вока выбіта, тады мы зможам забіць яго дубінамі.

— Каб было так, ён не ўцёк бы гэтак шпарка. Мусіць, бачыў.

Яны пайшлі ў той бок, куды пабег мядзведзь. Яго няцяжка было знайсці, бо ён пакінуў след ад сваёй раптоўнай хваробы... Праз некаторы час яны пачулі ў гушчары хруст, енк, нібы тузаніну. Падкраліся, зірнулі — курчыцца, валяецца мядзведзь, нібы яму трапілі ў жывот куляй.

Калі ўбачылі гэта хлопцы, разам кінуліся да яго і пачалі малаціць дубінамі. Непрыемнае і цяжкое было гэтае «паляванне»... Нарэшце бездапаможны мядзведзь загінуў пад ударамі дубін. Хлопцы, засопшыся, паваліліся на траву.

— Мусіць, мы адзіныя ў свеце людзі, якім без ніякай зброі пашанцавала забіць мядзведзя,— прамовіў Мірон.— Такі выпадак варта запісаць у кнігу.

— Запісана ўжо,— адказаў Віктар.— У адной навуковай кніжцы я чытаў пра такое здарэнне: адзін паляўнічы заўважыў у аўсе мядзведзя. Той ляжаў на зямлі, нахіліўшы да сябе пук аўсяных каласоў, і спакойна ласаваўся імі. У паляўнічага стрэльба была набіта толькі шротам. Забіць мядзведзя шротам нельга, але паляўнічы захацеў хоць спудзіць яго, прагнаць з аўса і стрэліў проста ў паветра. Мядзведзь спалохаўся і «захварэў». Вось гэтак жа, як цяпер. А на другі дзень яго знайшлі за некалькі соцень крокаў мёртвым. Ён памёр ад перапуду. Я не думаю, каб і наш мядзведзь сканаў толькі ад перапуду. Але ў кожным разе гэта дапамагло нам справіцца з ім.

Як бы там ні было, а перад хлопцамі ляжала туша сапраўднага мядзведзя, здабыча, якой ганарыўся б кожны паляўнічы. Але як дастуціцца да гэтай здабычы? Калі столькі пакуты было з зайцом і барсуком, то што будзе з мядзведзем?

— Хоць ты плач, гледзячы на багатую здабычу! — уздыхнуў Мірон.— Трэба абавязкова дастаць каменняў.

— І зараз жа! — крыкнуў Віктар.

Але Мірон зрабіў «матэматычныя падлікі», па якіх выходзіла, што працу і час ім трэба размеркаваць інакш, чым яны думалі. Камені шукаць, мусіць, прыйдзецца не адну гадзіну, нямала часу пойдзе, каб апрацаваць іх. А яшчэ разабраць мядзведзя, перанесці і ўпарадкаваць мяса. Апрача таго, трэба ж будзе за ўвесь гэты час і падсілкавацца.

— Адным словам,— скончыў свае падлікі Мірон,— сёння

ўсё зрабіць мы не паспеем, не кажучы ўжо аб тым, што наш агонь за гэты час можа загінуць.

Праз некалькі хвілін два хлопцы валаклі па лесе мядзведзя. Адзін трымаў яго за правую пярэднюю лапу, другі — за левую, а мядзведзь ехаў па зямлі на спіне мордай наперад. Хоць і невялікі быў звер, але для галодных і аслабелых хлопцаў ён быў значным грузам.

— Колькі мы тут валачом непатрэбнага цяжару, які добрыя людзі пакінулі б на месцы! — скардзіліся хлопцы.

У гэты дзень яны паспелі толькі набраць каменняў ды наладзіць іх «апрацоўку». У лесе пачулася ляcканне, нібы хто брукаваў вуліцу. Праз некаторы час хлопцы ўжо мелі «нажы» і «сякеры» каменнага веку. Але ж якія гэта былі прылады! Хлопцы глядзелі на іх і казалі:

— Першабытны чалавек засмяяў бы нас, каб убачыў такія прылады.

— І ў музеі такіх не знойдзеш.

— Але мы не вінаваты, што крэменю няма.

— Мусіць, і з крэменю мы не здолелі б зрабіць так, як яны.

— А ўсё-такі ямчэй будзе, чым зубамі!

На другі дзень раненька ўзяліся за працу. Дапамагчы каменныя прылады дапамаглі, але толькі з удзелам сухога вострага кораня ды ўсялякіх іншых прыстасаванняў. У выніку атрымалі столькі мяса, што не ведалі, куды яго дзець.

— Што рабіць? — у роспачы казаў Мірон.— Без солі яно і тры дні не пратрымаецца.

— Тады трэба наесціся на запас,— не то сур'ёзна, не то жартам сказаў Віктар.

І сапраўды, яны так пад'елі, што ўвесь дзень і глядзець не хацелі на мяса.

— Зноў мы зрабілі памылку! — сказаў Мірон.— Нам трэба было напаследак гэтак наесціся. Тады і добра было б, што не хочацца есці. А цяпер свежае мяса дарма гіне.

— Давай тады акурым яго,— запрапанаваў Віктар.

— І то праўда! — суцешыўся Мірон.— Хоць без солі ўсё роўна доўга не будзе трымацца, але напэўна даўжэй, чымся так.

Змайстравалі з жэрдак козлы, скруцілі з лыка вяроўкі і павесілі шынкі.

— За адзін заход павесім і свае гаршкі,— сказаў Мірон,— мусіць, яны падсохлі ўжо.

Гаршкі ляжалі ў ямцы, выкапанай у пяску пад коранем дрэва. У цяньку яны падсохлі досыць добра і не мелі аніводнай шчарбіны. Прыладзілі і іх, але вышэй, чым мяса, каб да іх даходзіў толькі лёгкі дух.

— Рызыкоўная справа з гэтым чарап'ём,— мармытаў Мірон.— Трэсне — і ўсё прапала.

Стаянка прыняла зусім гаспадарчы выгляд. На дрэве вісела шкура мядзведзя, на жэрдках акурваліся шынкі, каля вогнішча і будана ўвіхаліся жыхары.

— Акурат як у людзей! — радасна казалі хлопцы.

Пад вечар усё ж такі яшчэ пад'елі мяса і паляглі спаць у самым добрым настроі.

XVII

Зноў дарэмная спроба.— Апрацоўка запасаў.— Па мёд.— Гібель гаспадаркі.— Змаганне з роспаччу.— Звярыныя недаедкі.

Цяпер ужо можна было пачынаць пошукі дарогі. Першы дзень яны бадай увесь і патрацілі на гэтую справу. След бандытаў паказаў, што праход быў недзе за суседнім вострававам. Значыцца, адразу адпадала патрэба шукаць за гэтым. За першы ж дзень яны добра агледзелі трэцюю частку ўсяго берага, які ім належала абследаваць. У адным месцы яны прасунуліся досыць далёка, аднак далей усё роўна была такая дрыгва, што прайсці праз яе і думаць нельга было.

Але хлопцы і не спадзяваліся на хуткі поспех і вярнуліся дадому, задаволеныя ўжо тым, што частка задачы выканана. У дарозе яны выкарыстоўвалі кожны выпадак, каб скубануць чаго-небудзь раслiннага: ці аеру, ці шчаўя, ці сыраежку, ці якую зялёненькую лісцінку.

— Дзіўная рэч,— казаў Віктар,— цяпер я ем кожную лісціну з большым смакам і ахвотай, як тады, калі два дні нічога не еў.

— Гэта таму,— растлумачыў Мірон,— што наш арганізм патрабуе змены стравы, патрабуе зеляніны ці наогул чаго-небудзь расліннага.

Паміж іншым, на галіне ліпы яны заўважылі нейкую цікавую расліну. Гэта быў нібы куст з доўгімі сцяблямі, дробным светленькім лісцем і дробненькімі жоўценькімі кветкамі. Прыладзіўся ён на галіне стажком і, здаецца, з зямлёй ніякай сувязі не меў. Калі ўбачыў яго Мірон, то крыкнуў:

— Гані вон гэтага драпежніка! Гэта амела, шкодная расліна, таксама паўднёвы госць. Яна жыве выключна на чужым карку. Птушкі ласуюцца яе ягадамі, а потым чысцяць свой нос на галіне другога дрэва. Ліпкі сок прыклейваецца, і гэтага досыць, каб расліна пачала расці.

Віктар ахвотна здзёр і скінуў драпежніка.

— Але ж і ўчапілася! — заўважыў ён.— Мусіць, зноў пачне расці.

— Пэўна, бо свае тонкія карэньчыкі яна запускае глыбока ў дрэва. Нават можна па глыбіні пазнаць, колькі часу яна тут жыве. Але ўсё-такі лягчэй будзе беднаму дрэву.

Дома ім сапсавала настрой дымарня. Ім здавалася, што шынкі пачнуць падсыхаць і набываць такі выгляд, у якім звычайна ўсе мы прывыклі іх бачыць, а тым часам адбывалася нібы наадварот: яны рабіліся больш мяккімі, разлезлымі і, здавалася, псаваліся хутчэй, як без акурвання.

— Відаць, нічога не выйдзе,— журыўся Мірон.— Іх трэба і саліць, і сушыць доўга, а потым ужо акурваць. Апрача таго, вецер адносіць дым. Выходзіць, што мы самі толькі псуём іх. Лепш ужо спячы — даўжэй захаваюцца.

— І высушыць,— дадаў Віктар.

Знялі мяса і ўзяліся за новую справу. Адразу выявілася, што сушыць нельга, бо не было чым парэзаць на тонкія лусты. Пачалі кавалкамі пячы. Да ночы ў будане было ўжо шмат печаных кавалкаў.

Мірон дадумаўся нават да рацыяналізацыі. Таму што солі, якая ў іх была, не хапала, каб пасаліць мяса, ён засаліў крыху вады і памачыў у ёй кавалкі мяса.

— Гэта пойдзе ў лік пайка,— звярнуўся ён да Віктара.—

Дадаваць да такога кавалка яшчэ солі ты не будзеш мець права.

— Я і не думаю, абы толькі захаваць на лішні дзень.

— Але ў адну кучу іх усе класці нельга, каб не загніліся,— прамовіў Мірон і азірнуўся навакол.

— Тады паложым іх у хлеў,— сказаў Віктар.— Пакуль што ён у нас пусты.

Там на сухіх галінках і расклалі кавалкі паасобку. Гаршкі пакінулі сушыцца над агнём.

— Мы ж забыліся пра нашых пчол,— сказаў Віктар, калі яны паляглі ўжо спаць.

— Туды пойдзем заўтра раніцою,— адказаў Мірон.

Назаўтра ўзялі з сабой адзін з гаршкоў, палажылі туды вугольчыкаў і пайшлі па мёд. Пад дрэвам расклалі агонь. Але як выкурыць пчол там, наверсе.

— Я палезу туды, а ты мне падасі тычку запаленага моху,— прапанаваў Віктар.

— Каб знайсці добрую жэрдку, дык лепш было б з зямлі прасунуць,— сказаў Мірон.— Спакайней, ды і табе не прыйшлося б цярпець.

Вышыня была такая, што адпаведную жэрдку можна было знайсці. Знайшлі добрую арэшыну, запалілі камяк моху і прасунулі ў дзірку. Як загуло там! Хлопцы зараз жа адбегліся, але зноў падысці не маглі: раз'юшаныя пчолы лёталі навакол і, відаць, зусім не думалі адлятаць. Нарэшце хлопцы вымушаны былі пакінуць іх, каб прыйсці ў другі раз. Перад адыходам Мірон яшчэ запхнуў камяк, хоць і пацярпеў за гэта: два гузакі ўсхапіліся на твары.

Пакінулі гаршчок каля дрэва, а самі пайшлі на сваё абследаванне. Зноў пачалася такая ж пакутная і бескарысная праца. Гадзіны чатыры яны бадзяліся каля балота і вярнуліся без нічога, як заўсёды. Па дарозе яшчэ раз наведалі пчол. На гэты раз там было ўжо ціха. Толькі дзе-нідзе жаласна звінела адзінокая пчала.

Насілу Віктар выцягнуў з дупла соты. Але здабыча была вельмі малая: усё чарва.

— Ды гэтага і чакаць трэба было,— сказаў Мірон.— Нова-

га мёду не маглі яшчэ назбіраць. Засталіся толькі леташнія рэшткі.

— Дзякуй і за гэта. Шклянка добрая набярэцца,— казаў Віктар, аблізваючы пальцы.

— Цяпер мы жывём! — разважаў Мірон, як ішлі назад.— Калі ўзяць, напрыклад, ды змяшаць з мёдам ліпавае лісце, дык будзе такая страва, ад якой ніхто і дома не адмовіўся б. Пасля мяса гэта будзе вельмі дарэчы.

— Пачакай цешыцца,— усміхнуўся Віктар.— Можа, звар'яцееш яшчэ.

— Чаму так? — прыпыніўся Мірон.

— Забыўся? А можа, гэта мёд з той цудоўнай азаліі?

— Ну, не. Столькі не набяруць.

— Калі не зусім, дык крыху ашалееш.

З гэткімі гутаркамі яны весела ішлі дадому і не думалі пра тое, што іх там магло чакаць.

А калі прыйшлі, то ўбачылі такую карціну, ад якой аж уваччу пацямнела: абгрызеныя косці, разбураны хлеў і сляды звяроў...

У Мірона ледзь гаршчок не валіўся з рук, а Віктар забегаў і закрычаў, нібы хто яго ўкусіў.

— Ах, праклятыя! Хто гэта? Як гэта здарылася?!

— Мы забыліся, што, апрача нас, у лесе яшчэ ёсць насельнікі: лісы, ваўкі, дзікі,— панура сказаў Мірон.— Вось хто-небудзь з іх і пакваліўся.

Віктар пачаў прыглядацца да слядоў.

— Ды тут іх шмат было! — сказаў ён.— Вось сляды нібы ваўка, вось — нібы кошкі. А тут вунь яшчэ нейкія. Адкуль яны ўсе разам сабраліся?

— А навошта было ім збірацца ўсім разам. Спачатку хто-небудзь адзін прыйшоў, разбурыў, наеўся, а там маглі пачуць і падысці іншыя. Але нам ад гэтага не лепш.

— Што ж мы цяпер будзем рабіць? — схапіўся за галаву Віктар.

— Тое, што і да гэтага часу,— спакойна адказаў Мірон.— Трэба думаць, што не загінем, як і дагэтуль.

Спакойны тон Мірона крыху суцешыў і Віктара. Выбух

роспачы сцішыўся, а там яны ўзялі сябе ў рукі і сталі глядзець на справу цвяроза. Усё роўна назад не вернеш. Калі забыліся, дзе знаходзяцца, зрабілі памылку, дык трэба прыняць же пад увагу і другі раз быць разумнейшымі.

— Вось ужо колькі памылак мы нарабілі,— разважаў Віктар,— кожны раз абяцаем быць разумнейшымі і ўсё аніяк не можам паразумнець.

Мірон нават засмяяўся.

— Ці ведаеш, што мы і так разумныя? — сказаў ён.

— Не відаць гэтага,— паківаў галавой Віктар.

— Добра відаць. Калі яшчэ не памерлі, значыцца, не дурныя. А калі пажывём у гэткіх умовах год, то я абяцаю табе, што памылак у нас амаль не будзе.

— А калі дзесяць год, дык аніводнай не будзе! — сказаў панура Віктар.

— Пэўна,— сур'ёзна адказаў Мірон.— На ўсё трэба практыка, а ты адразу хочаш зрабіцца чалавекам без хібаў.

— Але дзе ж мы цяпер другога такога мядзведзя знойдзем? — ужо жартам прамовіў Віктар.

— На наш век дурняў хопіць,— засмяяўся Мірон.— Пратрымаемся як-небудзь тыдзень, а там прыйдуць нашы «збаўцы».

— Ты іх лічыш дурнямі?

— Калі мы іх перахітрым,— так.

— А калі яны?

— Тады мы будзем дурнямі.

Пастунова вастрыня ўражання змяншалася. Забыцца на няшчасце, не шкадаваць яны, вядома, не маглі, але будучыня ўжо не здавалася ім безнадзейнай.

— Давай падбяром хоць агрызкі,— сказаў Мірон.

— А можа, яшчэ якую хваробу схопіш ад іх?

— Я думаю, тутэйшыя звяры адчуваюць сябе лепш, як мы.

Такіх недаедкаў навакол набралася столькі, што хлопцам магло хапіць на ўвесь заўтрашні дзень. А потым яны пачалі суцяшаць сябе тым, што, можа, паслязаўтра мяса і само сапсавалася б. А калі ўбачылі, што рэштка солі засталася некранутай, то яшчэ лягчэй зрабілася на сэрцы.

XVIII

Панская страва.— На баброў.— Вось дык бабёр! — Таемныя лісты.— Рамонт бабровай хаткі.— Ваенная падрыхтоўка.— Чаму людзі шануюць баброў.

Мінула яшчэ два дні. За гэты час хлопцы скончылі сваё абследаванне. Толькі ў адным месцы яны знайшлі нешта падазронае і, прасунуўшыся ў балота, адчулі пад нагамі нібы нейкія жэрдкі.

— Мусіць, тут! — узрадаваліся хлопцы.

Але праз некалькі крокаў жэрдкі скончыліся. Непадалёк ад іх, на купінцы, расло дрэўца. Віктар скокнуў да яго, але не даскочыў і заграз у балоце так, што Мірон ледзь выцягнуў яго з дапамогаю доўгага кала. Пры такіх умовах совацца далей ужо нельга было.

— Але ўсё ж такі недзе выхад ёсць! — ламаў галаву Віктар.

— Ну і што з таго, калі мы не ведаем,— пакорліва прамовіў Мірон.— Нічога не зробіш, прыйдзецца пачакаць. У кожным разе, мы свой абавязак выканалі, даследавалі ўсё, што можна было.

А выканаўшы абавязак, яны ўжо ўвесь час маглі аддаць на пошукі спажывы. Але «дурных» звяроў больш не траплялася. Зноў давялося перайсці «на пашу», як казаў Віктар. А адной пашай пратрымацца было цяжка.

Аднаго разу Віктар прынёс зялёную жабу.

— Давай пакаштуем панскай стравы,— сказаў ён.

— Ой, баюся! — скалануўся Мірон.

— А я думаю, калі паны ядуць, дык і нам можна.

— Можа, не такіх?

— Прыблізна такіх, зялёных. А калі крыху і не такой пароды, то бяды не павінна быць. Шкада толькі, што ядуць адны заднія лапкі. А гэткімі кумпякамі не наясіся.

Віктар каменем адрэзаў кумпякі і кінуў іх у агонь. Праз мінуту выняў, памачыў у соль і працягнуў адзін Мірону. Але той адвярнуўся.

— Ты думаеш, будзе гэта жа, як тады з зайцом? — засмяяўся Віктар.— Не, браток, нічога лепшага цяпер ужо не дачакаешся.

Смела паднёс да рота, адкусіў.

— Ну, як? — з хваляваннем спытаўся Мірон.

— Разоў у тысячу лепш за сырога зайца! — адказаў Віктар і зноў адкусіў.— Бяры, пакуль не позна, а то ўсё з'ем.

Узяў і Мірон, з агідай адкусіў.

— Ну як? — запытаў цяпер ужо Віктар.

— Не разабраўся пакуль што.

— Кусай яшчэ!

Адкусіў Мірон яшчэ, потым яшчэ і, нарэшце, усё з'еў.

— Праўду кажучы, нічога дрэннага няма,— прамовіў ён.

— Вось бачыш,— сказаў Віктар.— Нездарма, кажу, паны ядуць. Я чытаў, што ў Парыжы, у рэстаранах сытыя буржуі вялікія грошы плоцяць за гэтую страву. А нам плаціць не трэба.

— Затое нам, галодным, трэба, можа, па сотні такіх жаб. А дзе іх гэтулькі набярэш? Гэта старая, а маладыя яшчэ не выveліся.

— Тады будзем есці ўсю,— сказаў Віктар.— Якая розніца паміж заднімі, пярэднімі нагамі, спіной?

Ён узяў яе ў рукі, але кінуў:

— Не, яшчэ не магу, не настолькі прагаладаўся.

— А каб у кнізе было напісана, што ядуць усю, то з'еў бы? — спытаў Мірон.

— Напэўна,— засмяяўся Віктар.

Пасля таго яны нават спецыяльна хадзілі лавіць жаб, але зноў злавілі толькі адну. На гэты раз з'елі ўжо і пярэднія кумпякі, і спіну...

І нічога дрэннага не здарылася.

— Мусіць, усё залежыць ад погляду і прывычкі,— разважаў Мірон.— Мусульмане не ядуць свініны, у нас не ядуць каніны, некаторыя ядуць саранчу...

— Я ж тое самае і кажу! — падхапіў Віктар.— У кожным разе, праз тое, што гэта агідна, паміраць не варта. Але на адной жабе далёка не паедзеш. Хоць абы-якую жывёліну здабыць — усё з'еў бы.

— Ведаеш што? Паспрабуем злавіць бабра.

— Але ж іх нельга знішчаць!

— І я гэта ведаю. Аднак мы двое важней за аднаго бабра.

Супраць гэтага нічога нельга было сказаць, і хлопцы зараз жа накіраваліся да бабровага паселішча.

Там ішло сабе мірнае бабровае жыццё. Звычайна бабры не любяць паказвацца ўдзень, але ў гэтым кутку, дзе іх ніхто ніколі не трывожыў, яны не надта сцерагліся. Калі хлопцы падышлі бліжэй, усе бабры схаваліся ў ваду.

— Пойдзем да той вунь,— паказаў Мірон на чацвёртую хатку, што была каля берага.

— Наўрад ці ёсць там хто,— сказаў Віктар,— але паспрабаваць можна.

Яны падышлі да хаткі і зараз жа пачалі шукаць і завальваць выхады. Два выхады былі пад вадой, а трэці — крыху над яе паверхняй.

Мусіць, калісьці і ён быў пад вадой. Паспрабавалі прасунуць руку ў гэтую дзірку, але нічога не маглі дастаць.

— Лепш разбяром зверху,— сказаў Мірон.

Спачатку галлё лёгка было разбіраць, але далей яно так шчыльна перапляталася, так моцна было злеплена зямлёй, што справа пайшла вельмі марудна.

Невядома, колькі спатрэбілася б часу, каб Віктар не абмацаў збоку месца, дзе галлё, здавалася, не было склеена і лёгка паддавалася пад рукой. Праз хвіліну заўважылі дзірку, якая вяла ў сярэдзіну.

— Ну, цяпер пільнуй! Вось дзірка,— сказаў Віктар і прасунуў руку. Памацаўшы крыху ў сярэдзіне, ён крыкнуў: — Нібы пакунак нейкі! — і сапраўды выцягнуў пакунак, старанна загорнуты ў тоўстую паперу.

— Вось табе і бабёр!

Развязалі. Пакунак яшчэ быў абгорнуты ў васковую паперу і яшчэ раз завязан ніткай. Зноў развязалі і ўбачылі... жаночыя шаўковыя панчохі! Шмат панчох.

— Дык вось у чым сакрэт! — крыкнуў Віктар.— Кантрабандысты выбралі сабе тут прытулак! Вось чаму спыніліся тут нашы «збаўцы» і хацелі нешта паглядзець, ці ўсё ў парадку!

— Але чаму ж яны выбралі бабровую хатку, калі можна было закапаць у зямлю? — здзівіўся Мірон.

— У зямлі магло папсавацца ад вільгаці, а тут суха, бо бабры будуюць хату ў два паверхі, з якіх верхні заўсёды сухі і ніколі не заліваецца вадой. Акрамя таго, на зямлі кожны раз заставаўся б след, калі закопваць ды выкопваць. Гэта ж вялікае багацце!

— Якая карысць з гэтага? — сумна прамовіў Мірон.— Вось, каб гэтыя панчохі можна было есці!

— Пачакай, можа, там яшчэ што ёсць?

Зноў засунуў Віктар руку.

— Ёсць! — крыкнуў ён і выцягнуў новы скрутак.

У ім былі перламутравыя гузікі.

— Ану іх да д'ябла! — вылаяліся хлопцы.

Далей — скрутак тонкага дарагога сукна.

— Ды тут цэлы магазін! — крыкнуў Мірон.— Ану, цягні яшчэ! Можа, кілбасы выцягнеш.

— Пастараюся,— адказаў Віктар і выцягнуў ужо нешта цяжэйшае. Гэта была скрынка, а ў ёй... два рэвальверы!

Радасць ахапіла хлопцаў.

— Во, гэта ўжо іншая рэч!

— Толькі ці ёсць да іх патроны? — сказаў Мірон.

— Знойдуцца! — упэўнена адказаў Віктар і зноў запусціў руку. Але на гэты раз нічога не дастаў.

— Навошта ж тады нам рэвальверы? — сумна прамовіў Мірон.

— Пачакай яшчэ. Пакой бабра часам мае больш за метр ушыркі. Я ж не мог дастаць рукой ва ўсе куты. Трэба пашырыць уваход.

І хлопцы ўзяліся за гэтую працу.

Калі разабралі «столь», дык знайшлі яшчэ скрынку з двума рэвальверамі, некалькі бляшанак з патронамі, зноў скрутак з нейкай замежнай галантарэяй і, нарэшце, чатыры маленькія шасцісценныя каробачкі. Яны былі моцна зроблены з суцэльнага металу і толькі на канцы мелі шрубку.

— Фюі-і! — засвістаў Віктар.— Тут ужо пахне больш сур'ёзнай справай. Гэта ж піраксілінавыя шашкі!..

— Ого! Пакажы! Пакажы! — схіліўся Мірон.— У такім разе тут не проста кантрабанда, а нешта горшае.

— Так,— пацвердзіў Віктар.— Значыцца, нашы «збаўцы» не толькі кантрабандысты, але і дыверсанты. Нездарма мяжа адсюль за кіламетраў трыццаць. А вось яшчэ нейкія паперы.

Хлопцы пачалі разглядаць незразумелыя лісты, напісаныя лацінскімі літарамі, але ніводнага слова не маглі зразумець.

— Відаць, шыфраваныя,— здагадаліся яны.

І, нарэшце, карта Беларусі з рознымі, таксама незразумелымі, адзнакамі: крыжыкамі, рыскамі, кружочкамі.

— Тут сапраўдны штаб! — задуменна прамовіў Віктар.— Цяпер я добра разумею, чаму яны хацелі нас загубіць.

— У такім разе і мы арганізуем свой уласны штаб ды абмяркуем, што з усім гэтым багаццем рабіць,— сказаў Мірон.

Пытанне было складанае. Узяць усё сабе — немагчыма. Ці цягацца з гэтым дабром, калі невядома яшчэ, як яны самі выкруцяцца з бяды. Знішчыць? Шкада, усё ж такі рэчы каштоўныя. Апрача ўсяго, і тое і другое рызыкоўна: калі бандыты прыйдуць і заўважаць, што склад іх знойдзены, дык адразу здагадаюцца, у чым справа, і пачнецца такое паляванне, ад якога не схаваешся. А хлопцам трэба было ціхенька сачыць, каб выведаць дарогу. Значыцца, у першую чаргу трэба зрабіць так, каб не было відаць, што сховішча знойдзена. А хлопцы ўзялі ды разбурылі хатку.

— Што ж мы з табой нарабілі? — сумна сказаў Віктар.— Зноў памылка! Калі ж будзе канец ім? Цяпер зноў прыйдзецца будаваць хату!

— Відаць, прыйдзецца,— адказаў Мірон такім тонам, нібы ён адзін быў у гэтым вінаваты.— Але спачатку зробім вось што: возьмем два рэвальверы, насыплем у скрынкі пяску і паставім назад; гэтак жа зробім і з патронамі; барахло пакінем усё цалкам, а паперы возьмем з сабой, бо яны замінаць не будуць. Калі мы выратуемся, тады даставім каму належыць каштоўныя паперы. А хатку прыйдзецца аднаўляць. Кожны раз новыя здарэнні, таму і нельга ўсяго прадугледзець.

Віктар згадзіўся з гэтым планам, толькі ўнёс адну папраўку: узяць усе чатыры рэвальверы.

— Гэта ні ў якім разе не пашкодзіць, а можа, і спатрэбіцца,— дадаў ён.

Мірон не пярэчыў.

Пачалі ўпарадкаваць рэчы. Калі з адной бляшанкі выбралі патроны, Мірон сказаў:

— А бляшанку адну трэба ўзяць сабе. Яна можа служыць замест гаршка.

— Правільна! Тады не трэба будзе больш важдацца з гэтым праклятым чарап'ём.

У апошні момант, калі пачалі былі закладваць гняздо, заўважылі ў галлі новую рэч. Гэта быў кінжал у ножнах. Знаходка ўсцешыла хлопцаў больш, як усё папярэдняе.

— Гэты нож нібы спецыяльна пакладзены для нас! Яны, можа, так сабе, на кожны выпадак, сунулі яго, а для нас якое шчасце! — цешыўся Мірон.

— Дай бог ім здароўя на тым свеце! — прамовіў Віктар.

Калі ўпарадкавалі рэчы, пачалі рамантаваць хатку. Трэба было зрабіць акурат так, як было раней, а гэта аказалася вельмі нялёгкай справай. Сувязь між галлём была парушана; выходзіла звычайная куча ламачча, а не бабровая хатка.

— Ах, каб на цябе ліха! — злаваў Віктар.— Ніколі не думаў, што давядзецца будаваць бабру хату.

— Ды яшчэ акурат так, як яны,— дадаў Мірон.— Не, гэтак нікуды нявартаl Разбурай зноў. Няма чаго спяшацца. Рызыкоўна. Трэба прыгледзецца, як яны будуюць, і пачаць спачатку, па галінцы.

— Вось не было яшчэ бяды! — бурчаў Віктар.— Гэтак увесь дзень патрацім.

— Але ад гэтай працы залежыць нашае жыццё,— сурова сказаў Мірон.

— Эх, каб можна было папрасіць баброў, каб яны самі дабудавалі,— уздыхнуў Віктар.

І, набраўшыся цярплівасці, хлопцы ўзяліся за працу павольна, метадычна. Некалькі разоў пачыналі спачатку, адыходзілі, прыглядаліся, зноў папраўлялі. Адным словам, сапраўды патрацілі бадай увесь дзень, пакуль зрабілі так, як было спачатку.

«Дадому» вярталіся ўзброеныя да зубоў. З аднаго боку — рэвальвер, з другога — рэвальвер, ды яшчэ кінжал у дадатак.

— Вось калі дапамаглі нашы ваенныя занятні ў гуртку! — казаў Мірон.— Без гэтага не толькі не ведалі б ніякіх там піраксілінаў, але і рэвальвера не ўмелі б у руках трымаць.

— А цяпер толькі давай сюды бандытаў,— усіх перастраляю! — храбрыўся Віктар.— Хай бы цяпер трапіўся які звер.

— Ну-ну! З рэвальверам на паляванне не ходзяць. Ці пацэліш ты хоць вунь у тое дрэва.

— Ану, давай! — з запалам крыкнуў Віктар.

Стрэлілі яны па тры разы, а трапіў толькі адзін раз Мірон. Віктар аж пачырванеў ад сораму.

— Давай яшчэ! — гарачыўся ён.

— Калі ты гэтак будзеш гарачыцца, дык ніколі не патрапіш,— павучальна сказаў Мірон.— Гэта табе не стрэльба. Каб з рэвальвера навучыцца страляць на далёкай адлегласці, трэба доўга практыкавацца. А нам хопіць і гэтага. У бандыта зблізку трапім.

— Але ж трэба папрактыкавацца, патронаў хапае,— настойваў Віктар.

— Я баюся, што нашы стрэлы могуць пачуць гэтыя самыя бандыты. Хто іх ведае, дзе яны жывуць, дзе бадзяюцца! Можа, блізка.

Гэтая заўвага пераканала Віктара.

Хоць сённяшні дзень быў і зусім галодным, але хлопцы палеглі спаць у самым бадзёрым настроі. Ім здавалася, што з рэвальверамі ім галадаць болей ужо не прыйдзецца.

Калі паляглі, Віктар сказаў:

— Ведаеш што? Цяпер я ўжо разумею, чаму баброў гэтак шануюць, берагуць, бароняць. Яны ж надзвычай карысныя для чалавека! Гэта ж яны нас ратавалі тады ад смерці. Яны цяпер нам і зброю далі.

— Застаецца толькі папрасіць іх, каб вывелі нас адсюль,— адказаў Мірон пазяхаючы.

XIX

Голад са зброяй.— Сапраўднае паляванне.

Прачнуліся яны з такім пачуццём, нібы ліхія гадзіны ўжо скончыліся. Цяпер і зброя ў іх была, і дасканалы нож, і добрая пасудзіна. Можна было ўжо і сапраўдны абед згатаваць. А як жа яны знудзіліся па гатаванай страве! Усё было добра, толькі... не было чаго гатаваць. Другі дзень яны нічога не елі.

Але настрой быў бадзёры і вясёлы.

— Цяпер ужо малая бяда! — казаў Віктар.— Ідзём на паляванне!

З рэвальверамі ў руках яны пайшлі ў лес. Прабадзяліся гадзіну, другую, а страляць не было ў каго. Скакалі па дрэвах ваверкі, але не пра такую дзічыну думалі паляўнічыя, ды каб і падумалі,— з рэвальвера не застрэлілі б. Бачылі на дрэве яшчэ адну жывёлу, якую Мірон палічыў за гарнастая, але Віктар растлумачыў, што гэта куніца.

— Бачыш — яна куды большая, колер цямнейшы, на шыі жоўтая пляма, морда вастрэйшая,— адным словам, падабенства мала.

Каля балота спудзілі качак, але таксама страляць не было чаго і думаць. Недзе далёка мільгануў заяц. А нашы паляўнічыя толькі лыпалі вачыма, гледзячы на гэтую дзічыну.

— Вось табе і зброя! — злосна зірнуў Віктар на свой рэвальвер.

— А ты што думаў? — сказаў Мірон.— У такіх выпадках і з стрэльбы не надта трапіш.

— Пойдзем да дубоў, можа, зноў дзіка ўбачым, як тады. Калі пусціць у яго дождж куляў з абодвух рэвальвераў, дык можна і забіць.

— Рызыкоўная справа,— пакруціў галавою Мірон.

— Усё-такі лепш, як з голаду пухнуць.

Але не так лёгка ўбачыць дзіка, як хацелася. Хоць і меў гэты кут права называцца звярыным, але не на кожным кроку можна было стрэць звяроў. Тым болей што абодва астравы складалі разам вельмі значную прастору, на якой усім хапала

месца. Нават да гэтага часу заставалася яшчэ, прынамсі, палова плошчы, якой хлопцы не наведвалі.

Нарэшце нашы паляўнічыя павінны былі вярнуцца да сваёй «пашы». Са зброяй у руках яны сталі збіраць шчаўе, грыбы, аер і іншую спажыву. Злавілі яшчэ дзвюх жаб.

— Гэта ж сорам! — абураўся Віктар.— З рэвальверамі лавіць жаб.

— Ніякага сораму тут няма,— спакойна прамовіў Мірон,— калі нават адзін паэт пісаў:

> Выйшаў я на сенажаць
> Ды з нагана ў жабу — бац!

— Мусіць, ён таксама быў галодны, як і мы,— засмяяўся Віктар.

Прахадзілі ўвесь дзень, а прынеслі дадому толькі адны грыбы. Але затое згатавалі іх па-гаспадарску: у бляшанцы, з вадой, з соллю. А замест лыжак скарысталі тыя гліняныя чарапкі, што калісьці ляпілі.

Так пражылі яны яшчэ пяць дзён. Як на смех, гэтыя дні, калі таварышы былі добра ўзброены, былі для іх самымі цяжкімі за ўвесь час жыцця на востраве. Яны нават дайшлі да таго, што адважыліся пакаштаваць хрушчоў. Пасля жаб гэта было ўжо не так страшна...

Нарэшце хлопцы зноў парашылі забіць бабра і пайшлі да іх паселішча. Але проста забіць ці злавіць не было магчымасці, а разбураць другую хатку яны не адважыліся: добра, каб напэўна злавілі, дзеля гэтага яшчэ можна папрацаваць, а калі не?.. Тады давялося б дарэмна не толькі разбураць, але і зноў папраўляць хатку, бо пакідаць сляды па вядомай прычыне нельга было. У дадатак да ўсяго, хлопцы прыпомнілі, што і наогул нядобра было б крыўдзіць сваіх сапраўдных дабрадзеяў.

І яны зноў пайшлі бадзяцца.

З кожным днём хлопцы слабелі ўсё болей і болей. Разам з гэтым псаваўся і іх настрой. Часта ў іх наогул ніякага настрою не было — ні добрага, ні кепскага,— а так: нейкая абыякавасць.

Ім здавалася, што яны гэтак усё сваё жыццё бадзяюцца і будуць век бадзяцца; яны забываліся на свой дом, на тое, што павінны прыйсці бандыты і надыходзіць рашучы момант.

Нарэшце аднаго разу Віктар заўважыў, што ўвечары ён чамусьці пачаў дрэнна бачыць. Дзівіўся, цёр вочы — нічога не памагала.

— Што гэта такое можа быць? — ламаў ён галаву.

— Гэта, мусіць, курыная слепата,— сказаў Мірон.— Яна бывае тады, калі чалавек марнее ад дрэннага харчавання.

Яны ўжо і хадзіць не мелі ахвоты. Часам па некалькі гадзін ляжалі нерухома.

Аднаго разу яны гэтак ляжалі пад кустом на палянцы і мутнымі вачыма пазіралі навакол. А дзень быў ясны, прыгожы. Уверсе шчабяталі птушкі, унізе гулі розныя мухі, жукі, мільгалі матылі.

Раптам па-за кустамі ціхенька хруснула. Уздрыгануліся хлопцы, азірнуліся: у кустах стаіць казуля, зграбная, прыгожая. Задраўшы галаву з невялікімі рагамі, на якіх было па два атожылкі, яна скубла маладыя парасткі, і на шыі яе відаць была белая пляма. Кожны момант яна азіралася, уздрыгвала і была гатова знікнуць.

У момант ад млявасці ў хлопцаў і следу не засталося. Яны захваляваліся, напружыліся. Кожны з іх добра ведаў, што ад гэтага можа залежыць іхняе жыццё і што яны маглі страляць цяпер з падпоры, а гэта была ўжо зусім іншая справа.

— Асцярожней, асцярожней! — злосна шаптаў Віктар, бо памятаў, як Мірон у той раз зачапіўся і паляцеў. Але Мірон сам добра разумеў адказнасць моманту.

— Цаляй добра, не спяшайся! — даваў загады Віктар.— Страляць па камандзе.

Віктар даў досыць часу, каб прыцэліцца, і шапнуў:

— Плі!

Грымнулі стрэлы, падскочыла казуля і кінулася ў лес. Наткнулася на дрэва, захісталася.

Хлопцы ў бяспамяцці ўскочылі і кінуліся за ёю. Казуля хісталася і спатыкалася, але бегла наперад; хлопцы ледзь па-

спявалі за ёй. Звалілася яна, ускочыла, зноў пабегла. Зноў звалілася.

Хлопцы былі побач ужо і скончылі яе пакуты адзіным стрэлам. З якой радасцю глядзелі яны на першы вынік свайго «сапраўднага» палявання!

Казуля ляжала на баку, выцягнуўшы свае тонкія ногі.

— Самец! — сказаў Віктар.— Самкі не маюць рагоў.

Цяпер іх ужо не палохала далейшая праца: яны мелі даскналы нож. Мігам разабралі жывёліну і ўрачыста вярнуліся дадому з мясам і скурай.

Зажылі нашыя героі «па-людску». Нават страву маглі згатаваць у бляшанцы ад патронаў. Ажылі хлопцы, павесялелі. Прайшла ў Віктара і курыная слепата. І ўжо не абыякавымі вачыма глядзелі яны навакол і на сваю будучыню.

XX

Падрыхтоўка да сустрэчы.— З вуголлем у пушчу.— «Насарог».— Выратаванне каштоўнай жывёлы.— Запасны агонь.

Нарэшце надышоў час, калі трэба было распачынаць падрыхтоўку: надаць жыллю акурат такі выгляд, які яно мела раней, калі былі тут бандыты, агонь загасіць, а самім выбраць другое месца, дзе яны будуць сядзець і чакаць. Месца гэтае павінна быць не на відавоку і разам з тым такое, адкуль добра сачыць за ворагамі. Вядома, увесь гэты час раскладаць агонь ім будзе нельга. Значыцца, трэба назапасіць смажанага мяса.

Па іх меркаваннях, два тыдні павінны былі скончыцца паслязаўтра, але гэта не значыла, што бандыты акурат прыйдуць у гэты дзень. Яны маглі з'явіцца і раней, а больш магчыма, што пазней. Невядома, колькі часу прыйдзецца сядзець і пільнаваць. А як быць з агнём?

— Пойдзем спачатку знойдзем сабе месца для назірання, а там пабачым, што рабіць,— пастанавілі хлопцы і пайшлі на другі востраў.

Востраў быў вялікі. Калі спыніцца каля берага, то будзеш бачыць толькі гэтую частку, а бандыты могуць перабрацца зу-

сім у іншым месцы. Калі выбраць назіральны пункт у глыбіні вострава, дык наогул берага не будзеш бачыць.

— Нельга спадзявацца,— разважаў Мірон,— што мы акурат убачым, кудой яны прыходзяць, і ўцячом, пакінуўшы іх тут. Трэба меркаваць, што мы раней убачым іх тут, будзем сачыць, як яны пойдуць назад, і выберамся ўжо следам за імі. Таму я прапаную выбраць месца бліжэй да бабровых хатак, куды яны, безумоўна, павінны прыйсці.

— Я ўпэўнены,— казаў Віктар,— што яны пераходзяць у тым месцы, дзе мы заўважылі нібы кладку. Толькі мы не ведаем, як гэта яны робяць. Калі там пільнаваць, мы гэта ўбачым.

— Але яно рызыкоўна,— не згаджаўся Мірон.— А што, калі не там? Тады яны могуць прыйсці і нават пайсці, а мы нічога і ведаць не будзем. А бадзяцца па лесе небяспечна: яны могуць раней заўважыць нас, як мы іх.

Віктару ўсё здавалася, што праход павінен быць там. Але, з другога боку, і разважанні Мірона былі слушныя. І Віктар пакуль што згадзіўся з ім.

На тым беразе, каля якога стаяла бабровая хатка, пачыналася высокая сухая града. Спачатку яна была вузкая і ішла ўздоўж бабровай ручаіны, а потым пашыралася і гублялася ў глыбіні вострава. На ёй рос прыгожы бор з рэдкімі стройнымі соснамі, а па баках ішлі зараснікі алешыны, арэшніку.

— Калі схавацца ў гэтым арэшніку, вось за той купінкай,— казаў Мірон,— дык мы будзем бачыць усю гэтую граду. Яны абавязкова павінны прайсці па ёй, калі пойдуць да свайго склада.

— Месца добрае,— сказаў і Віктар.— Нам нават зручна будзе ісці па хмызняку за імі ўслед, бо па чыстым бары было б рызыкоўна.

Тут і вырашылі зрабіць назіральны пункт. Было крыху вільготна на зямлі, але хлопцы мелі дзве скуры.

— Давай зробім рэпетыцыю,— сказаў Віктар.— Я тут сяду, а ты прайдзіся па градзе і паглядзі, ці можна заўважыць.

Віктар сеў, а Мірон адышоўся крокаў на дваццаць убок. Арэхавыя сцяблы без галля дазвалялі досыць добра бачыць, што робіцца на градзе. А вось як адтуль?

— Ну, як? — нецярпліва запытаўся Віктар.

— Пачакай,— махнуў рукою Мірон і некалькі разоў прайшоўся ўзад і ўперад. Вярнуўшыся назад, ён сказаў: — Калі ведаць ці падазраваць, што там нехта ёсць, то заўважыць можна, а так, мне здаецца, не павінны звярнуць увагі, асабліва калі не рухацца.

— Ну і добра. А калі яны сунуцца, то ў нас жа ёсць чым сустрэць іх,— сказаў Віктар.

Калі скончылі з гэтай справай, пайшлі ўпарадкаваць свой лагер. Трэба было зрабіць усё так, як было раней.

— Раней тут рыба вісела, а цяпер — няма,— заўважыў Віктар.

— Гэта праўда,— задумаўся Мірон.— Дзе ж цяпер яе дастаць? Ты не памятаеш, колькі было?

— Рыбін з пяць. Але не можа быць, каб яны іх лічылі.

— Прыйдзецца тады павесіць некалькі рыбіных галоў і касцей. Можна ж падумаць, што іх птушкі падзяўблі, жукі, чарвякі з'елі.

І яны пачалі развешваць рыбу.

— Каб хто-небудзь убачыў, што мы робім,— смяяўся Віктар,— то, напэўна, падумаў бы: здурнелі хлопцы.

А калі павесілі рыбныя рэшткі, то прыпомнілі: у будцы ж была яшчэ і галова зайца. Але з ім справа вырашалася прасцей: зайца лёгка мог дакончыць кожны драпежнік.

— Трэба толькі крыху касцей параскідаць навакол.

— А таксама ўбраць лішнія мядзведжыя і казуліны косці,— дадаў Мірон.

Упарадкавалі косці. Потым прыпомнілі яшчэ, што чарапашына павінна валяцца каля будкі, як кінуў яе той бандыт.

Нарэшце ўзяліся за вогнішча.

— Здаецца, прыблізна было гэтак,— казаў Мірон, калі раскладаў галавешкі.

— А я ўсё-ткі пазнаў бы, што тут нехта гаспадарыў,— прамовіў Віктар.

— І кожны пазнаў бы, каб тады спецыяльна прыглядзеўся,— усміхнуўся Мірон.— Але дзеля гэтага трэба было ўжо тады ўсё ведаць і прадбачыць.

Цяжэй было вырашыць пытанне з агнём. Пагасіць вогнішча, безумоўна, трэба. Трымаць на сваім назіральным пункце агонь, безумоўна, нельга. Няўжо зусім адмовіцца ад яго?

— Гэта немагчыма! — ускрыкнуў Віктар.— Адмовіцца ад агню, потам і крывёю здабытага, сваімі рукамі выгадаванага, які захаваў наша жыццё! Я нават збіраўся ўзяць яго з сабой дадому, бо ў нас зусім не такі агонь, горшы.

— Таму, што лёгка здабыты запалкамі,— дадаў Мірон.

Пасля досыць доўгага абмеркавання вынеслі такую пастанову: знайсці такі дзікі куток, куды ніякаму бандыту не было б ахвоты соваць нос, і такі густы, каб і зблізку нельга было заўважыць у ім ні агню, ні дыму. Там і захоўваць агонь. І туды пасля дзённай варты прыходзіць спаць.

Узялі свой гаршчок, палажылі гарачага вугolля і пайшлі. Трымаліся бліжэй да возера, улічваючы, што ў гэты бок бандытам няма сэнсу ісці. Тут былі мясціны, куды і самі хлопцы ні разу не завітвалі. Калі яны зайшлі ў гушчар, Віктар узяў у руку рэвальвер і сказаў:

— У гэтых нетрах можна яшчэ напароцца на якога-небудзь насарога.

А праз хвіліну пачуўся такі тупат і грукат, нібы сапраўды імчаўся насарог. Не паспелі хлопцы апамятацца, як на іх наляцела вялікая рагатая жывёліна. Яна выгіналася, падскаквала і, здавалася, хацела растаптаць нашых герояў.

Мірон кінуўся ўбок, гаршчокываліўся з яго рук. Віктар падняў рэвальвер, але жывёліна зачапіла яго бокам, і ён паваліўся на зямлю, стрэліўшы ў паветра. А пасля гэтага стрэлу нешта мільганула над галавой і зашамацела з другога боку. Тупат жывёліны зрабіўся раўнамерным і паступова аддаляўся. А праз хвіліну зноў усё было ціха, як і раней.

Хлопцы асцярожна паднялі галовы.

— Што ты бачыў? — запытаўся Віктар.

— Вярблюда.

— Не, без жартаў.

— Мусіць, нейкі алень ці лось, але чамусьці з гарбом.

— А ці ведаеш ты, што мы цяпер зноў заслужылі падзяку ад дзяржавы?

— Завошта?

— За тое, што выратавалі ад смерці лася.

— Якім чынам?

— Гэта быў ніякі не горб, а рысь. Драпежніца ўскочыла ласю на карак і, напэўна, загрызла б яго, каб не мой стрэл.

— Адкуль ты ўсё гэта ведаеш? — недаверліва спытаў Мірон.

— Хіба доўга зірнуць? Круглая кашэчая галава, кутасікі на вушах ды куртаты хвост — адразу можна пазнаць.

— Але ж, здаецца, і цябе зачапілі?

— Крыху штурханулі, але дарма: не кожнаму трапляецца так блізка пазнаёміцца з ласём.

— Вось табе і насарог! — засмяяўся Мірон.

— Толькі крыху не хапіла! — зарагатаў і Віктар.— Я цяпер ужо не здзіўлюся, калі сустрэнем і слана.

— Але наш гаршчок разляцеўся на кавалкі,— сказаў Мірон, збіраючы вугольчыкі.

— Тады спынімся тут. Калі тут жывуць такія звяры, дык, мусіць, гэта і будзе самае глухое месца.

Пад аховай шыракалапых елак расклалі яны вогнішча і доўга палілі, пакуль не набралася поўная яма жару.

— Заўтра яшчэ дадамо, а сёння пойдзем паспім апошнюю ноч у нашым родным будане.

XXI

Бясконцае чаканне.— На кухні.— Сонныя вартаўнікі.

Рашучы момант набліжаўся. Хлопцы хоць і храбрыліся, хоць і жартавалі, але кожны адчуваў, як унутры нешта дрыжыць. Ці прыйдуць яны ў гэты дзень? А можа, яны так сабе сказалі? А можа, прыйдуць праз тыдзень, праз месяц?

— Бывае ж на свеце так, што злейшых ворагаў прыходзіцца чакаць, як родных бацькоў! — злаваў Віктар.

— А можа, іх тут аж занадта набярэцца? Можа, у іх тут які бандыцкі з'езд прызначаны? — разважаў Мірон.

Як бы там ні было, а нічога не заставалася, як толькі чакаць.

На світанні пабеглі ў пушчу, падклалі ў свой запасны агонь дроў і са скурамі на плячах пайшлі на новае месца.

Ззаду застаўся асірацелы будан і халоднае вогнішча.

Забраліся ў свой арэшнік, парассцілалі скуры, натыкалі яшчэ сям-там галін, каб больш надзейна схаваць свой прытулак, і пачалі чакаць.

Спачатку ў іх было адчуванне, што бандыты вось-вось павінны з'явіцца. Але міналі гадзіна за гадзінай, усё ціха і спакойна было навакол, і хлопцам пачало ўжо здавацца, што іх «збаўцы» ніколі не прыйдуць.

Каля паўдня Віктар не вытрымаў:

— Чаго нам гэтак сядзець? Тэрмін жа яшчэ заўтра.

Не спадзяваўся і Мірон, што сёння прыйдуць, але ўсё-такі мільгала думка: а што, калі ўжо ідуць?

— Пачакаем яшчэ гадзіны са дзве і тады пойдзем.

Выседзелі гэтыя гадзіны і вылезлі. І неяк несвядома абодва адчулі задавальненне, што бандыты не прыйшлі: усё-ткі далей адсунуўся непрыемны час спаткання. Рэшту дня скарысталі, каб «папасвіцца», хоць і ўвесь час адчувалі сябе трывожна.

Назбіралі крыху грыбоў і пайшлі «на кухню», як казаў Віктар. Там згатавалі свае грыбы, падвячэралі і засталіся нанач каля вогнішча.

Ледзь золак, яны былі ўжо на сваім назіральным пункце. Зноў пачалося нуднае і напружанае чаканне. Зноў ішлі гадзіна за гадзінай, а ніхто не з'яўляўся. Цяпер яны ўжо не адважыліся пакінуць сваё месца сярод дня і даседзелі да вечара.

— Ах, каб хутчэй перастралялі гэтых бандытаў! — сказаў Віктар, вылазячы з засады.

— Што ты гаворыш?! — з жартаўлівым жахам крыкнуў Мірон.— Калі іх цяпер расстраляюць, то мы павінны будзем сядзець да зімы!

— Выбачай, забыўся,— засмяяўся Віктар.— Хай тады крыху пачакаюць. Але ж гэткае сядзенне горш за самую цяж-

кую працу! Пойдзем хоць чаю пап'ём. Вось, кажуць, бруснічнік можна ўжываць замест чаю.

— Гэта будзе вельмі дарэчы,— згадзіўся Мірон, і яны пачалі збіраць бруснічнік.

Але праз некалькі хвілін Мірон прыпыніўся і пачаў уважліва разглядаць сабраныя ім расліны.

— Слухай! — прамовіў ён нарэшце.— Гэта ж не бруснічнік!

— Чаму?

— Бачыш, вось з ніжняга боку ліста выціснута сетка, не такая, як у бруснічніку, ды і сцябло святлейшае.

— Па гэткіх дробных адзнаках меркаваць нельга,— недаверліва сказаў Віктар.

— Шкада, што ён яшчэ не цвіце, тады можна было б знайсці маленькую розніцу ў кветках. А каб былі ягады, тады ўжо зусім нельга было б памыліцца. Ягады ўсярэдзіне маюць нібы муку, таму і завецца гэтая расліна мучніцай. Яна вельмі каштоўная і дае розныя лекі, чорную фарбу і дубільны матэрыял для апрацоўкі скур.

— Калі так, я цяпер гатоў шчыра шанаваць цябе і тваю батаніку. Вось каб напіліся гэткага чаю! Пэўна, здубянелі б. Давай лепш наломім малінніку. Гэта будзе карысней.

— Можна знайсці і сапраўднага бруснічніку.

— А няхай яго ліха возьме! Зноў натрапіш на якую мучніцу. Давай лепш простага малінніку.

Вярнуліся на сваю «кухню», выпілі чаю, згатаванага ў бляшанцы.

— Добры чай! — пахваліў Мірон.— Шкада толькі, што мёду болей няма.

— Гэта яшчэ паўбяды,— сказаў Віктар,— але вось мяса наша пачынае псавацца, хоць і печанае. Заўтра яшчэ сяк-так, а паслязаўтра будзе ўжо зусім дрэннае.

— А сушанае?

— Сушанае ў сярэдзіне не высахла.

— А ты не цягай заўсёды за сабой, а павесь тут.

Зноў правялі ноч каля вогнішча.

Трэці дзень прайшоў гэтак жа, як і папярэднія два, толькі

напружанасць так змарыла іх, што абодва паснулі як забітыя. Спалі смачна да самага вечара.

Першы прачнуўся Мірон. Схамянуўся, ускочыў, нават спачатку не пазнаў, дзе ён і што з ім. Віктар хроп так, што чуваць было па ўсім лесе.

— Гэй ты, вартаўнік! — штурхануў яго пад бок Мірон.

— Га? Што? — усхапіўся той.

— Ці ведаеш ты, што хроп на ўвесь лес? Нашы госці на тым баку балота пачулі.

— А ты?

— І я таксама спаў. Гэта ж вар'яцтва! Нас маглі зарэзаць, як куранят.

— Я баюся, што яны, праклятыя, ніколі не прыйдуць,— пазяхаючы, прамовіў Віктар.

— А ўсё-такі рызыкаваць нельга. Другі раз будзем спаць па чарзе.

І гэты дзень мінуў. І другі. І яшчэ адзін. І яшчэ...

Хлопцам было вельмі цяжка цярпець. Мяса псавалася ўсё болей і болей. А «пасвіцца» ўдзень не было як: трэба было сядзець і пільнаваць. Калі нават вылазілі да баброў па ваду, то ўсё здавалася, што вось зараз іх заўважаць. Адна ўцеха ды ратунак ад гнілога мяса — гарачы чай уночы.

З кожным днём напружанасць узмацнялася; ад кожнага трэску і шолаху хлопцы ўздрыгвалі, нібы ад электрычнай іскры. Гэтае безупыннае напружанне так знервавала хлопцаў, што яны зусім страцілі сон, зрабіліся панурымі і злоснымі. Усё гэта, разам з дрэнным харчаваннем і сядзеннем на месцы, аслабіла іх так, што ў іх часам кружылася галава, цямнела ў вачах, дрыжалі ногі. Папярэднія дні здаваліся ім ўжо шчаслівымі ў параўнанні з цяперашнімі.

Часам хлопцам пачынала здавацца, што бандыты ўжо блізка. Яны нават чулі тупат ног і галасы. А праз хвіліну выяўляўся падман і прыходзіла перакананне, што сядзяць яны тут дарэмна, што ніхто і не думае сюды ісці.

— А можа, іх ужо злавілі і пасадзілі ў турму? — сумна казаў Віктар.

— Усё можа быць,— уздыхаў Мірон.

Мусіць, сваякі бандытаў гэтак не баяліся за іхняе жыццё, як нашы хлопцы.

— Але ж павінен хто-небудзь прыйсці па тавар? — разважаў Мірон.— Не могуць жа яны пакінуць сваё дабро.

— Могуць прыйсці і ўзімку, і на другі год,— адказаў Віктар.— А калі іх злавілі ўсіх, дык могуць і ніколі не прыйсці.

Пачуўся хруст. Хлопцы зноў напружыліся, зноў з'явілася надзея. Але гэта працiскаўся праз зараснікі дзік. Цераз палянку было відаць, як ён спакойна і павольна капашыўся ў балоце.

— Вось добра было б стрэліць у яго! — заблішчаў вачыма Віктар.— Напэўна трапілі б. І мяса свежае было б.

Засвярбелі рукі і ў Мірона. Што будзе, калі кантрабандысты не прыйдуць? Тады давядзецца яшчэ горш галадаць, а між тым яны могуць зараз назапасіць мяса.

Але нарэшце ён пачаў даводзіць Віктару, што гэта будзе надта рызыкоўна:

— Ці можам мы напэўна сказаць, што яны не прыйдуць? Не. Ну, а калі прыйдуць, то мы загінем напэўна. І стрэл могуць пачуць, і сляды не паспеем знішчыць.

Дзік тым часам схаваўся за дрэвамі.

А ўначы, каля вогнішча, як яны шкадавалі, што не выкарысталі магчымасці. Яны паспелі б ужо разабраць і схаваць дзіка, былі б забяспечаны свежым мясам. А цяпер што будзе?

— Ох, ужо гэтая разумная асцярожнасць! — са злосцай насмешкаю сказаў Віктар.

Мірон засаромеўся. Ён адчуваў, што перамудрыў. Але, каб абараніць сябе, перайшоў у наступ:

— А скажы шчыра: ці мог ты паручыцца, што яны сёння ані ў якім разе не прыйдуць?

— Вядома, паручыцца ніхто не можа, але...

— Пачакай. Значыць, можна было думаць, што яны прыйдуць?

— Ну, можна.

— А ты ведаеш, чым пагражала гэтая магчымасць?

— Ну, ведаю.

— Дык вось што: маленькая магчымасць загінуць — сур'ёзней за вялікую магчымасць пад'есці.

— Але ж у нас ёсць рэвальверы! — не здаваўся Віктар.

— А можа, там будзе дзесяць стрэльбаў? Рэвальверы спатрэбяцца тады, калі не будзе чаго іншага рабіць.

Віктар замаўчаў.

XXII

«Слон».— Агіднае забойства.— Бандыты з палоннікам.— Падазрэнне бандытаў.— Допыт.— Ваенныя аперацыі.— Перамога.

Так яны правялі ў чаканні чатыры дні. І гэтыя дні здаліся ім самымі доўгімі і самымі пакутнымі за ўвесь час іх жыцця на востраве. Яны праходзілі ў бяздзейнасці, а гэта і ёсць самая горшая пакута для жывога чалавека. На працягу дня яны, вядома, выходзілі з сваёй засады, але асцярожна, туляючыся ды азіраючыся, каб іх не маглі ўбачыць здалёк.

Такі напружаны перапынак быў не лепш за сядзенне і чаканне.

Пад вечар ішлі начаваць у пушчу да свайго вогнішча, спалі зусім не так добра, як у будане, а раніцою вярталіся на сваю «службу». І ўсё часцей задавалі сабе пытанні: «А што, калі яны зусім не прыйдуць? Або прыйдуць праз многа тыдняў? Няўжо ўвесь гэты час так сядзець? Неўзабаве скончацца рэшткі сушанага мяса, а тады што?»

У такім настроі прыйшлі яны на варту і ў пяты дзень раніцою. А праз паўгадзіны пачулі нейкі тупат. Ішоў ён з таго боку, адкуль павінны былі з'явіцца «госці». У хлопцаў моцна-моцна закалаціліся сэрцы. Тупат набліжаўся, цяжкі, глухі; часам чуўся гучны трэск вялікай галіны. Але бачыць, хто ідзе, нельга было.

— Або атрад бандытаў, або слон! — прашаптаў Віктар.

Вось ужо нешта мільгае між дрэў, вялікае, чырвонае. Усё выразней, выразней...

— Зубр! — у адзін голас крыкнулі хлопцы.

Нейкі ўрачысты настрой ахапіў таварышаў. Яны бачылі жывога зубра, іх у межах Савецкай Беларусі ўжо няма [1]. Перад 1914 годам у Белавежскай пушчы было яшчэ 400 зуброў,

[1] Падзеі адбываюцца ў канцы 20-х гадоў.

але за час вайны з іх засталося ўсяго толькі каля 20, ды і тых немцы вывезлі да сябе.

— Якім жа чынам ён трапіў сюды? — дзівіўся Мірон.

— А ты не памятаеш, як некалькі часу назад пісалі ў нашых газетах, што ў нас бачылі аднаго зубра? Кажуць, што ён перабег да нас з Польшчы. Белавежскую пушчу польскія паны прадалі англічанам, і тыя сякуць і вывозяць лес. Трэба думаць, што немцы не паспелі вылавіць усіх зуброў да апошняга. Мусіць, хоць адзін застаўся. І цяпер, калі пачалі высякаць яго родную пушчу, ён і ўцёк да нас, дзе лес не нішчаць.

— Я гэта чытаў, але пасля таго больш нічога не было чуваць аб ім.

— І вось ён перад табою. Не дзіва, што яго тут ніхто не бачыў.

Магутны звер ішоў нейк трывожна. То спыніцца, то пачне нагамі рыць зямлю, то схіліць сваю галаву і пачне сапці. Плечы яго здаваліся нейкай скалой, за якой хавалася рэшта цела. Горб не толькі не шкодзіў, але, здавалася, упрыгожваў яго. Хлопцы ўявілі сабе, як павінен быў адчуваць сябе гэты зубр, адзін, без сям'і і таварышаў, далёка ад сваёй радзімы.

— Апошні зубр! — прашаптаў Мірон.

— Апошні! — адгукнуўся Віктар.

Раптам грымнуў стрэл!..

Зубр кінуўся ўбок, стаў на дыбы і зваліўся пярэднімі нагамі на калені. У гэты момант разлёгся другі стрэл...

Зубр паспрабаваў быў устаць, але захістаўся і ціха паваліўся на бок, нібы вялікі падсечаны дуб...

Хлопцы сядзелі, як скамянелыя. Яны не бачылі яшчэ людзей, але добра ведалі, хто гэта з'явіўся. Аднак ураджанне ад смерці зубра было такое моцнае, што на момант яны зусім забыліся пра становішча, у якім самі знаходзяцца. Яны перажывалі гэтае забойства, як забойства чалавека.

— Падлюгі! — хацеў быў ускочыць Віктар, але Мірон моцна ўхапіў таварыша за руку і прымусіў сесці.

Да зубра ўжо бег знаёмы чорны бандыт са стрэльбай у руках.

«Няўжо адзін?» — падумалі хлопцы.

Але чалавек паглядзеў на зубра, павярнуўся ў той бок, адкуль з'явіўся, і крыкнуў:

— Гатова!

Праз хвіліну падбег яшчэ адзін, незнаёмы, а потым падышлі яшчэ двое. З іх адзін быў той малодшы таварыш чорнага, а другі таксама незнаёмы, але... звязаны!

На ім былі звычайныя боты, запэцканыя ў балоце, як і ва ўсіх, чорнае паліто і кепка. Рукі былі моцна закручаны назад, а рот завязаны хусткай.

Яго адвялі крыху ўбок, штурханулі і сказалі:

— Сядай!

Палоннік нязграбна сеў на зямлю.

Бандыты абступілі зубра.

— Здаровая штука! — сказаў незнаёмы.

— Але як скарыстаць яго? — заўважыў малодшы.

— Перацягнем па кавалках,— адказаў чорны.

— А скуру?

— Таксама парэжам на кавалкі. Хвацкія будуць падэшвы.

Потым пачалі раскладаць агонь і разбіраць тушу. Чорны скінуў світку, закасаў рукавы і ўзяўся за справу. Яму дапамагалі таварышы.

Кожны шрам на целе зубра болем адбіваўся ў сэрцах хлопцаў. Чорны акрываўлены бандыт здаваўся катам. Цяжка было разбіраць гэтую магутную жывёліну, а ў іх, як відаць, былі толькі звычайныя паляўнічыя нажы.

— Паслухайце! — спыніўся чорны.— Там ёсць добры кінжал.

У хлопцаў заняло дух...

Чорны накіраваўся да бабровай хаткі.

Праз некалькі хвілін ён вярнуўся.

— Чорт яго ведае, няма! — сказаў ён.

— А рэчы? — устрывожыліся яго таварышы.

— Рэчы на месцы. Толькі чамусьці ў сярэдзіну насыпалася ламачча, нібы хто зверху праламаў.

— А можа, хто кратаў? — падазрона запытаўся незнаёмы.

— Можа, і ўзлазіла наверх якая жывёліна.

— Ты добра глядзеў? Усё ёсць? Можа, тыя лайдакі дабраліся? — перапытаў малодшы.

— Мы ж глядзелі тады, калі іх ужо не было. Каб яны знайшлі, дык напэўна ўзялі б. А я перамацаў усе рэчы, толькі кінжала не знайшоў. Мусіць, ён заваліўся дзе паміж галля. Доўга было б шукаць.

Але незнаёмы ўсё непакоіўся.

— Трэ было б добра перагледзець усе рэчы,— сказаў ён.— Можа, тыя хлопцы знайшлі, можа, яны яшчэ дзе-небудзь тут?

— Не думаю, каб яны пакваліліся толькі на адзін кінжал,— усміхнуўся чорны і прыняўся зноў за працу.

— А рэвальверы глядзеў? — не адставаў новы.

— Скрынкі на месцы, але я іх не адчыняў,— спакойна прамовіў чорны.

— Вось бачыш.

— Ды чаго ты непакоішся? — умяшаўся малодшы.— Мы ж абышлі ўвесь лес, стралялі, гукалі. Каб яны тут былі, дык адгукнуліся б, пачуўшы людзей. Усе рэчы тады былі цэлыя. Мы і рэвальверы глядзелі.

— А ўсё ж такі трэба пераканацца,— паківаў галавой новы.

— Добра,— супакоіў чорны.— Зараз скончым і паглядзім. Пойдзем нават паглядзець і іх «хату».

Хлопцы чулі ўсю гэтую размову і рыхтавалі сябе да апошніх рашучых падзей. Галоўнай іх перавагаю было тое, што іх лічылі загінуўшымі. А калі здагадаюцца, што яны жывыя, тады ім ужо не справіцца з трыма такімі бандытамі, у якіх яшчэ і стрэльба была. Хіба толькі ўдасца схавацца.

Тым часам бандыты знялі скуру і селі адпачыць.

— Трэ было б за гэтага ўзяцца,— кіўнуў малодшы на палонніка.— Чаго з ім доўга валаводзіцца?

— Але,— устаў чорны.

Палоннік сядзеў на зямлі, апусціўшы галаву. Час ад часу ён торгаў рукамі, але дзе там было вызваліцца!

— Хадзі сюды, сабака! — падышоў да яго чорны, узяў за плечы, падняў і падапхнуў да вогнішча. Потым развязаў хустку.

Хлопцы ўбачылі маладога чалавека гадоў дваццаці васьмі з прадаўгаватым, сухарлявым тварам. Тонкія сціснутыя вусны і зморшчкі на лбе сведчылі аб яго напружанні, але вочы безуважліва глядзелі некуды міма бандытаў.

— Цяпер ужо можаш крычаць колькі ўлезе,— засмяяўся незнаёмы.

Тады падышоў малодшы і звярнуўся да палонніка:

— Слухай! Ты можаш палепшыць сваё становішча, калі скажаш, якім чынам даведаўся пра нас, хто табе ў гэтым дапамог. Назаві чалавека, які выдаў нас.

Палоннік не адказваў. Бандыт памаўчаў. Пасля пачаў зноў:

— Геройства тваё ўжо непатрэбнае: ты ў поўнай нашай уладзе. Ніхто цябе не пачуе. Калі скажаш, то значна палегчыш свой лёс. А калі не... дык мы здолеем прымусіць цябе,— прасіпеў бандыт.

Палоннік усё маўчаў.

— Ну! — грозна крыкнуў чорны.— Адказвай!

— Канчайце хутчэй вашу справу, а я нічога не скажу! — нарэшце прамовіў палоннік.

— Канчаць хутчэй? — засмяяліся бандыты.— Не, брат, пачакай яшчэ. Гэта толькі пачатак.

І чорны выцяў палонніка кулаком па твары...

Небарака пахіснуўся і паваліўся на зямлю. З носа і рота паказалася кроў...

У хлопцаў аж заляскалі зубы ад хвалявання.

— Нельга сядзець!.. Не маем права!.. Трэба страляць! — прашаптаў Віктар.

— Пачакаем, пачакаем хоць крыху,— усхваляваным шэптам адказаў Мірон.— Досыць далёка... Не трапім... А тады канец і яму, і нам. Пакуль ён жывы, пачакаем... Можа, будзе лепшы момант.

Чорны ўзяў галаўню і паднёс яе да твару палонніка.

— Можа, агонь прымусіць цябе гаварыць? Апрача таго, у нас і яшчэ знойдуцца добрыя спосабы. Часу хапае. Кажы лепш!

Палоннік адхіснуўся і зноў нічога не адказаў.

— Слухайце,— умяшаўся незнаёмы.— Адкладзём допыт да таго часу, пакуль падыдуць нашы таварышы. Тады зробім гэта па ўсіх правілах мастацтва. А цяпер пойдзем паглядзім наш склад ды будку тых хлопцаў.

— Сапраўды гэтак будзе лепш,— падтрымаў малодшы.

— Добра,— згадзіўся чорны.— А ты тым часам падумай. І не чакай хуткай смерці. Разбяром цябе на кавалачкі, але прымусім сказаць! А цяпер звяжам цябе так, каб ты спакойна мог праляжаць да заўтрага.

Яны зрэзалі доўгую жардзіну, прасунулі яе палонніку між рукамі і каленямі і звязалі яго так, што ён і паварухнуцца не мог.

Хлопцы былі задаволены. Гэта азначала, што бандыты збіраюцца ісці ўсе трое.

І сапраўды яны ўсе накіраваліся да бабровай хаткі. З вялікім жалем убачылі хлопцы, што чорны ўзяў сваю стрэльбу. Бабровы ручай быў зусім блізка, але, здаецца, адтуль нельга было бачыць палонніка, бо ён сядзеў на зямлі і яго засланяў зараснік, што рос на беразе ручая.

Хлопцам не трэба было дамаўляцца, што рабіць. Абы толькі паспець, пакуль бандыты вернуцца, бо калі яны выявяць недахоп сваіх рэчаў, то ўстрывожацца і зараз жа прыйдуць назад.

Мігам папаўзлі яны да таго месца, дзе сядзеў палоннік. Яны так спяшаліся, што нават не звярталі ўвагі на шолах і хруст, які яны робяць.

Палоннік пачуў і азірнуўся.

— Тсс! — шапнулі хлопцы.

Нібы агонь бліснуў у вачах палонніка. Але болей ён не варухнуўся і застаўся сядзець, як сядзеў.

Мірон падпоўз збоку, зараз жа перарэзаў вяроўкі і сунуў палонніку рэвальвер.

— Уцякайце! — шапнуў ён.

Але, убачыўшы рэвальвер, палоннік застаўся сядзець нерухома.

— У вас ёсць рэвальверы? — спытаў ён, не паварочваючы галавы.

— Ёсць, нават чатыры.

— У такім разе хавайцеся ззаду і чакайце, а я буду сядзець, як сядзеў. Гэтак мы лягчэй справімся з імі. Я сам спраўлюся з двума, а на вашу долю застанецца адзін. Падсуньце пад мяне рэвальвер. Ці зараджаны ён?

— Зараджаны, іхні,— адказаў Мірон і адпоўз назад.

Палоннік паправіў сваю жардзіну, заблытаў на руках вяроўкі і застаўся сядзець.

Хлопцы схаваліся ззаду.

— Чаму ён не ідзе? — здзівіўся Віктар.

Мірон растлумачыў, у чым справа. Хлопцы адразу напоўніліся ўпэўненасцю і нават гонарам. Яны ж пад кіраўніцтвам аўтарытэтнага чалавека прымаюць удзел у ваеннай аперацыі! Сілы цяпер роўныя, ды яшчэ перавага ў тым, што вораг нічога не ведае.

Каля бабровай хаткі пачуліся трывожныя галасы. Потым адзін бандыт выйшаў з-за кустоў і зірнуў на свой лагер. Палоннік спакойна сядзеў з жардзінай. Бандыт зноў схаваўся.

Праз некалькі часу яны зноў выйшлі, пра нешта горача пагутарылі і разышліся. Малодшы з рэвальверам у руцэ накіраваўся да палонніка, а тыя два пайшлі далей, у бок стаянкі хлопцаў.

Цяпер ужо бандыт трымаў сябе іначай. Ён увесь час азіраўся навакол, прыслухоўваўся і, калі падышоў да палонніка, пачаў хадзіць узад і ўперад. Цяпер ён ужо спецыяльна вартаваў сваю ахвяру.

А тыя шукалі хлопцаў. Толькі на гэты раз ужо не гукалі, не стралялі...

Палоннік сядзеў з жардзінай, апусціўшы галаву, і, здавалася, думаў невясёлую думку.

Хлопцы напружана сачылі за ім і стараліся здагадацца, што́ ён думае рабіць, каб зараз жа дапамагчы.

Калі вартаўнік адышоўся ў другі бок, палоннік крыху павярнуў галаву назад. Хлопцы нават не бачылі яго твару, але сцямілі, што гэта знак да іх. Значыцца, зараз нешта будзе.

Вось вартаўнік набліжаецца зноў да палонніка. Правая рука з рэвальверам акурат з гэтага боку. Момант — і палоннік ухапіўся за руку з рэвальверам.

Бандыт быў так здзіўлены, што некалькі секунд не зварухнуўся, нібы не даваў веры сваім вачам.

А ў гэты момант абодва хлопцы былі ўжо каля яго. Мірон у першую чаргу абхапіў рукою рот бандыта акурат у той момант, калі той збіраўся крыкнуць.

— Малайчына! — пахваліў палоннік.

Пасля таго ўжо нядоўга было звязаць бандыта такім жа спосабам, як раней быў звязаны палоннік. Зразумела, рот быў запхнуты і завязаны.

— Дзякуй, сябры! — пацісную хлопцам рукі новы таварыш.— А цяпер трэба адцягнуць яго далей, а самім размясціцца гэтаксама, як і раней.

Адцягнулі бандыта за сотню крокаў. Замацавалі так, каб ён ні ў якім разе не мог развязацца, і пакінулі.

Вызвалены таварыш зноў прыладзіў сабе жардзіну, хлопцы зноў схаваліся ў кустах — і ўсё было ў парадку.

Цяпер ужо хлопцы чакалі наступнай сустрэчы без страху. Якая ўжо тут магла быць небяспека?

Але чакаць давялося доўга. Відаць, бандыты шнырылі па ўсім тым востраве.

Нарэшце з-за бабровага ручая пачуліся галасы, потым з'явіліся абодва бандыты.

— Незразумелая рэч! — пачулі хлопцы.— Няўжо гэта яны? Адкуль жа яны маглі ведаць, што ім трэба сцерагчыся?

Падышоўшы да стаянкі, яны агледзеліся, пакруціліся і спыталі ў палонніка:

— А дзе наш таварыш?

— Не ведаю,— буркнуў той.

Яны падазрона зірнулі на яго і падышлі бліжэй.

«Зараз!» — мільганула ў галовах у хлопцаў.

— А ў які бок ён пайшоў? — зноў пачулася пытанне.

— У той,— неахвотна кіўнуў галавой палоннік і паказаў наперад. Бандыты глянулі ў той бок.

Зараз жа грымнуў стрэл, і чорны дзядзька храснуўся на зямлю, ухапіўшыся рукамі за жывот. Стрэльба яго пакацілася па зямлі. Другі бандыт азірнуўся, і ў яго не толькі вочы, але і рот раскрыўся на ўсю шырыню ад здзіўлення і жаху. Перад ім ужо стаяў палоннік з нацэленым рэвальверам у руках, а з-за яго спіны выбягалі яшчэ двое хлопцаў, таксама з рэвальверамі.

— Рукі ўгору! — грозна загадаў Мірон.

— Рукі ўгору, калі хочаш жыць! — звонкім голасам крыкнуў Віктар.

Трэцяму бандыту нічога не заставалася, як здацца.

На зямлі хрыпеў і курчыўся ў перадсмяротных сутаргах ранены бандыт.

XXIII

План новых ваенных аперацый.— Расказ таварыша Саўчука.— Яшчэ бандыты.— Канец ваенных дзеянняў.— Адказнае даручэнне.

Хлопцы блізка падступілі да бандыта і бадай усутыч наставілі на яго свае рэвальверы. Убачыўшы гэта, іх новы таварыш сказаў:

— Даю вам параду: ніколі не падсоўвайце рэвальвера так блізка, каб яго можна было схапіць рукою. Ад гэтага могуць быць усялякія непрыемнасці.

Віктар і Мірон глянулі адзін на аднаго, нібы засаромеўшыся, і адступілі на пару крокаў назад.

Таварыш, трымаючы і свой рэвальвер напагатове, адышоў убок і падняў вяроўку, якой ён быў звязаны. Бандыты не пашкадавалі на яго вяроўкі: паловы яе хапіла, каб звязаць рукі палоннаму бандыту.

— Цяпер нам трэба...— звярнуўся таварыш да хлопцаў, але скончыць не паспеў.

— Хлеб! — закрычалі тыя і кінуліся да бандыцкай торбы з прадуктамі. Вынялі хлеб, сала, соль ды яшчэ кураціну і накінуліся на ўсё гэта, як звяры. Новы таварыш і сам хацеў есці, але ў такі момант нельга было гэтым займацца.

— Таварышы! — сказаў ён з дакорам.— Што вы робіце? Пачакайце крыху. Мы яшчэ не скончылі.

— Мы месяц не бачылі чалавечай яды! — азваўся Мірон з поўным ротам.

Таварыш здзіўлена паглядзеў на іх.

— Мы яшчэ ў часе паводкі ехалі сюды па возеры,— дадаў Віктар.— Лодка перакулілася, і мы апынуліся тут. Гэтак і жылі цэлы месяц. А вы як трапілі да іх? Вы ведаеце, як выйсці? Пойдзем зараз.

— Пачакайце, пачакайце! — перапыніў таварыш.— Аб гэтым пасля. А цяпер у нас ёсць справа важнейшая: трэба падрыхтавацца да сустрэчы новых гасцей.

— Такіх самых?

— Акурат такіх самых,— усміхнуўся таварыш.— Але спачатку трэба размясціць гэтых.

Другога бандыта адвялі туды, дзе быў першы. Старанна звязалі яго з дапамогай жардзіны, а таксама заткнулі і завязалі рот, каб палонны не мог крыкнуць. Праверылі і падправілі путы першага. Затым пайшлі да раненага. Той ужо быў мёртвы. Яго адцягнулі ў зараснік, дзе толькі што хаваліся хлопцы.

Падклалі галля ў агонь, раскладзены бандытамі ля забітага зубра, а самі схаваліся ў бліжэйшых да вогнішча кустах.

Тады незнаёмы таварыш сказаў:

— Зараз павінны прыйсці яшчэ некалькі чалавек з іхняй кампаніі. Трэба іх прыняць не горш, як гэтых. Вы, мае дарагія таварышы, паказалі сябе храбрымі і свядомымі савецкімі хлопцамі. Думаю, і цяпер вы прымеце ўдзел ў аперацыі.

— А як жа! — усклікнулі тыя з радасцю.

Пад кіраўніцтвам такога таварыша новая аперацыя здавалася ім нават прывабнай. Хоць і страшнавата, і сэрца сціскаецца ад хвалявання, але затое адчуваеш, што робіш важную справу.

— Я думаю, іх будзе не больш, як два-тры чалавекі,— казаў далей таварыш.— Мы неспадзявана выскачым на іх, і яны

напэўна здадуцца без бою. Тым больш што наўрад ці яны ўсе будуць мець зброю — для іхняга зборышча яна ім непатрэбная, а насіць так рызыкоўна.

— А калі іх будзе болей? — спытаў Віктар.

— Тады пабачым, што трэба будзе рабіць. А цяпер скажыце, як вас зваць.

Хлопцы адрэкамендаваліся і ў сваю чаргу спыталіся, як яго зваць і як ён трапіў у рукі бандытаў.

— Прозвішча маё Саўчук Андрэй Аляксандравіч,— пачаў ён свой расказ.— Служу я ў пагранатрадзе. Гэты чорны жыве на хутары кіламетраў за дзесяць адсюль. Той малады часта прыходзіць да яго з суседняга мястэчка. Аднаго разу мы атрымалі весткі, што гэты чорны (Станоўскім завецца) мае сувязь з кантрабандыстамі. Якраз учора трапіў мне на вочы гэты трэці, незнаёмы чалавек. Ён накіраваўся на хутар. А хутар гэты знаходзіцца ў глушы, наводшыбе. Я пайшоў за ім. Але, відаць, і гэты чорны дзядзька быў не дурны. Ён, відаць, чакаў гэтага госця і прадбачыў, што за ім могуць сачыць. Калі мы ўжо былі недалёка ад хутара, яны абодва накінуліся на мяне, звязалі і па глухіх сцежках прывялі сюды. Мусіць, вы чулі, як яны збіраліся мардаваць мяне, каб даведацца, якім чынам і ад каго мы пра іх даведаліся. Яны думалі забіць мяне, потым таго ці тых, хто сказаў, і гэткім чынам схаваць сляды. Каб не вы,— скончыў ён усхваляваным голасам,— я перацярпеў бы такія пакуты, перад якімі смерць — нішто. Дзякую вам!

— Завошта? — шчыра здзівіўся Віктар.— Хто ж гэтага не зрабіў бы на нашым месцы?!


— Усё ж такі вы рызыкавалі.

— Невялікая рызыка,— сказаў Мірон.— Вы для нас зрабілі болей, як мы для вас. А вось якім чынам вы прабраліся цераз балота? Мы аніяк не маглі знайсці выхада і збіраліся сядзець тут да зімы.

— З таго боку ёсць падрыхтаваныя кладкі, але яны ў балоце, зверху іх не відаць.

— Я ж казаў, што там пераход! — накінуўся Віктар на Мірона.— А ты ўсё мудрагеліў.

— Усё роўна вы не прайшлі б,— усміхнуўся Саўчук.— Там хітра зроблена. Вось такім чынам (ён начарціў на зямлі план):



Калі вы нават знойдзеце адну кладку, дык яна хутка канчаецца, і вы трапіце ў багавінне. Другая кладка зусім убаку. Каб трапіць на яе, трэба цягнуць з сабою доўгую дошку і перакінуць яе на тую другую кладку. А праз некалькі крокаў і тая канчаецца. Тады трэба зноў шукаць наступную і зноў перакідаць дошку. Пераход цяжкі, марудны і небяспечны. Ніхто б не здагадаўся, калі не ведаць. Толькі вопытныя кантрабандысты маглі ўзяцца за гэткае мерапрыемства. Мусіць, іхняя справа мае шырокі размах.

— Нават занадта шырокі,— прамовіў Віктар і выняў паперы.— Вось зірніце.

— А там яшчэ ёсць і піраксілінавыя шашкі,— дадаў Мірон.

— Што вы кажаце? — усхапіўся Саўчук і з напружанай цікавасцю пачаў разглядаць паперы.— Гэта ж не толькі кантрабандысты, але шпіёнская і шкодніцкая арганізацыя. Ды яшчэ з удзелам, як кажуць, нейкай суседняй дзяржавы. Добрую справу вы зрабілі, таварышы! Раскажыце цяпер, як вы тут жылі,— папрасіў Саўчук.

Мірон і Віктар, перабіваючы адзін аднаго, расказалі пра сваё падарожжа, крушэнне, пра пакуты і прыгоды, пра бандытаў і іхні склад. Саўчук выслухаў іх з надзвычайнай цікавасцю, а затым сказаў:

— Хоць і ў неабдуманае, недарэчнае падарожжа вы пусціліся, але вас можна пахваліць за тое, што вы добра змагаліся за сваё існаванне, не апусцілі рук і, як відаць, засталіся такімі ж бадзёрымі і вясёлымі. Пасля такой практыкі вам ужо ніякія нягоды не будуць страшнымі.

Так, у гутарцы, прайшло гадзіны са дзве. Сонца пачало ўжо схіляцца на захад.

— Калі не прыйдуць праз дзве гадзіны, то мы пойдзем дадому,— сказаў Саўчук.

Словы «пойдзем дадому» прагучалі для нашых хлопцаў, як нешта незвычайнае, казачнае. Няўжо сапраўды так бывае, што можна ўстаць і пайсці дадому?..

Уверсе, на дрэве, каркнула варона. Праз хвіліну каркнула на другім. Затым з'явілася варона на ніжняй галіне, потым яна спусцілася на зямлю і бокам-бокам пачала набліжацца да зубра.

— Эх, шкада гэтай цудоўнай жывёліны! — прамовіў Саўчук.

— Затое і забойца загінуў,— заўважыў Мірон.

— Ды хіба ён варты зубра? — горача ўсклікнуў Віктар.— Гэткіх бандытаў вунь колькі знайшлося, а зубр быў адзін і, можа, больш не будзе.

Каля зубра ўжо скакала некалькі варон. Іх збіралася ўсё больш і больш. Яшчэ хвіліна, другая — і яны абляпілі ўсяго зубра.

— І адкуль толькі яны ўзяліся? — дзівіўся Мірон.— Цэлы месяц мы іх тут бадай не бачылі, а цяпер, глядзі, колькі сабралася.

— Трэба іх разагнаць,— сказаў Саўчук,— а то ствараецца ўражанне, што тут і духу чалавечага няма, а гэта для нас нявыгадна: новапрыбыўшыя могуць занепакоіцца, куды падзеліся іх таварышы.

Віктар і Мірон стрэльнулі з рэвальвераў. Гул ад стрэлаў пакаціўся па лесе і закончыўся нібы новым, далёкім і глухім стрэлам.

— Што гэта — рэха ці нечы стрэл?

Саўчук упэўнена сказаў:

— Гэта яны стралялі ў адказ, бо гук пачуўся тады, калі рэха ўжо заціхла. Цяпер будзьце гатовы.

— Заўжды гатовы! — адказалі хлопцы весела, але ў іх галасах выразна адчувалася хваляванне, тое хваляванне, якое бывае не ад страху, а ад незвычайнасці моманту.

Далёка між дрэў замільгалі людзі. Адзін... два... тры... чатыры... Болей як быццам няма. Ну што ж — не страшна. Яны смела накіроўваюцца да вогнішча; яны добра ведаюць, што там свае. У аднаго ў руках рэвальвер, з якога ён толькі што страляў. У іншых, як відаць, зброі няма. Зусім добра!..

— Я гэтаму пераб'ю руку ці плячо,— прашаптаў таварыш Саўчук,— а тады ўсе выскачым.

І ён накіраваў на яго стрэльбу. Віктар узяў у рукі свае абодва рэвальверы.

Мірон, які раней аддаў свой другі рэвальвер Саўчуку, паглядзеў на Віктара з зайздрасцю.

Бандыты падышлі да вогнішча і спыніліся.

— Ці не на паляванне пайшлі? — пачуліся галасы.— Навошта? Вунь якую штуку забілі і яшчэ павалакліся.

Грымнуў стрэл... Чалавек з рэвальверам войкнуў і ўхапіўся левай рукой за правую; рэвальвер упаў на траву. Трое іншых не паспелі разабрацца, у чым справа, як убачылі, што да іх падбягаюць трое ўзброеных людзей.

— Рукі ўгору!

Бандыты, азіраючыся навакол, відаць, у чаканні сваіх, трошкі паднялі рукі. Нападаючыя мігам апынуліся каля іх. Рэвальвер бандыта ляжаў каля ног Саўчука.

Тады адбыўся нечаканы паварот.

Адзін з бандытаў, убачыўшы, што з трох нападаючых двое зусім яшчэ маладыя хлопцы, кінуўся пад ногі Саўчуку, зваліў яго і ўхапіўся за рэвальвер, што ляжаў на зямлі. Двое яго таварышаў апусцілі рукі і нарыхтаваліся кінуцца ў бойку. У гэты самы момант пачуліся тры стрэлы...

Два разы стрэліў Мірон у бандыта, што схапіў рэвальвер. Той выпусціў зброю. Віктар, не цэлячыся, стрэліў у «сваіх» бандытаў, і гэта затрымала іх на тую секунду, якая патрэбна была Саўчуку, каб падняцца на ногі. А тады ўжо бандыты «шчыра» паднялі рукі.

— Малайцы, хлопцы! — коратка сказаў Саўчук, і гэтыя словы з вуснаў камандзіра былі для іх самай лепшай пахвалой.

Двум здаровым бандытам было загадана перавязаць сваіх раненых таварышаў.

У аднаго з іх была перабіта правая рука, другому Мірон прастрэліў плячо і зачапіў бок. На бінты для іх прыйшлося рваць сарочкі.

— Вы іх тут пільнуйце,— ціха сказаў Саўчук,— а я прывяду тых двух.

Як толькі Саўчук адышоўся, хлопцы адразу адчулі трывожную напружанасць. Яны пачалі заўважаць, што бандыты, робячы перавязку, больш сачылі за хлопцамі, чым за сваёй работай. Яны паварочваліся і станавіліся не так, каб зручна было перавязваць, а так, каб зручна было кінуцца на вартавых.

Памятаючы параду Саўчука, хлопцы трымаліся на такой адлегласці, каб адным махам да іх нельга было даскочыць, а рэвальверы не апускалі ні на адну хвіліну. Апрача таго, трымаліся блізка адзін ля аднаго і ўвесь час мянялі свае пазіцыі, каб было зручна ім, а не бандытам. Ніводнага слова не сказалі хлопцы адзін аднаму, а дзейнічалі так дружна і ўзгоднена, нібы ўсё ў іх было дагаворана. Значыцца, абодва добра навучыліся разумець становішча.

Хлопцы ўздыхнулі вальней, калі падышоў Саўчук з двума ранейшымі палоннымі. Раты іх былі ўжо развязаны.

— І вы папаліся? — з папрокам сказаў адзін з іх сваім новым таварышам.

— Гэтак жа, як і вы! — злосна буркнуў нехта ў адказ.

Саўчук падышоў да іх і сказаў:

— Дазвольце ўжо і вам звязаць рукі. Мы вымушаны гэта зрабіць.

Бліснулі бандыты вачыма, сцялі зубы, сціснулі кулакі, але за спіною стаялі хлопцы з рэвальверамі,— і бандыты скарыліся.

Каб перавязаць усім рукі і ногі, Саўчук зняў з бандытаў усе паясы і рамяні, якімі яны былі падперазаны. Віктар штурхануў пад бок Мірона і шапнуў:

— Цяпер яны не ўцякуць, каб нават і ногі былі не звязаныя.

Тыя два, якіх звязалі яшчэ раніцай, пачалі прасіцца:

— Рукі здранцвелі, развяжыце хоць на некалькі хвілін.

— Выбачайце,— адказаў Саўчук,— цяпер аніяк нельга. Прыйдзецца яшчэ трошкі пацярпець. Я таксама цярпеў. Вы тым часам пасядзіце тут ля вогнішча, можаце нават распачаць свой сход. Шкада толькі, што старшыня ваш забіты.

— Сам вінаваты,— сказаў адзін з бандытаў.— Не знішчыў гэтых шчанят, калі была магчымасць, дык цяпер і сам загінуў і нас загубіў.

Хлопцы адчулі задавальненне, што бандыты так высока ацанілі іхнюю ролю ў гэтай справе.

Пасля таго Саўчук адвёў хлопцаў убок і сказаў:

— Баявыя аперацыі мы з вамі скончылі паспяхова. Ёсць і трафеі, і палонныя. А як нам з усім гэтым выбрацца адсюль? Правесці ўсіх са звязанымі рукамі па тых хітрых кладках немагчыма. Апрача таго, у нас ёсць яшчэ двое раненых, з якіх аднаго прыйдзецца несці. І забітага трэ было б пахаваць, а няма як. Адным словам, мы самі з усёй гэтай аперацыяй не справімся. Так?

Мірон і Віктар павінны былі згадзіцца, што яно так. Значыцца — трэба ісці па дапамогу. Ісці можа толькі адзін таварыш Саўчук. А хлопцам прыйдзецца заставацца тут і пільнаваць гэтую кампанію...

— Гэта вельмі сур'ёзная справа,— казаў Саўчук.— Для вас яна больш сур'ёзная, чым усе сённяшнія ваенныя дзеянні. На працягу ўсёй ночы вы будзеце рызыкаваць жыццём кожную хвіліну, бо яны будуць прыдумваць усялякія штукі. Будзьце пільнымі, не спускайце з іх вачэй усю ноч. Калі што якое, страляйце не задумваючыся. Як вам здаецца, справіцеся?

— Справімся! — упэўнена адказаў Віктар.

А Мірон трошкі падумаў і тады ўжо сказаў:

— Ды нам нічога іншага не застаецца, як справіцца.

— А цяпер пойдзем праверым усе вузлы і вяроўкі,— павярнуўся Саўчук.— Прыгледзьцеся добра, як яны звязаны.

Звязаныя злосна бурчалі:

— Зноў праверка! Ды вы толькі што звязвалі. Лепш есці далі б.

— Ціха, ціха,— лагодна казаў Саўчук.— Усё будзе ў свой час. А цяпер пацярпіце адну толькі ноч. Больш вас ніколі звязваць не будуць.

Затым Саўчук дапамог хлопцам назапасіць галля на ноч і пасля таго рушыў у дарогу.

XXIV

Апошняя ноч на востраве.— «Кармленне звяроў».— Хітрыкі палоннікаў.— Смалены бандыт.— Зварот дадому.

Хлопцы зноў засталіся ў лесе. Але цяпер перад імі сядзела пяць чалавек ды шосты ляжаў побач. І людзі гэтыя для іх былі больш небяспечныя, чым усе тутэйшыя звяры.

Калі бандыты ўбачылі, што старэйшы пайшоў, яны ажывіліся і пачалі перагаворвацца. Відаць, яны сцямілі, што той пайшоў па дапамогу і вернецца няхутка, а таму ў іх з'явілася надзея як-небудзь абдурыць гэтых хлопцаў. Калі хлопцы падышлі бліжэй да іх, палонныя змоўклі. Толькі скоса пазіралі на сваіх вартаўнікоў. А потым «стары знаёмы» бандыт спытаў:

— Скажыце, чаму вы не адгукаліся, калі мы тыдні два назад шукалі вас і нават стралялі? Ці вы не чулі?

— Чулі, ды не хацелі сустракацца з вамі,— адказалі хлопцы.

— Чаму? Мы ж маглі вам паказаць дарогу.

— Ведаем, якую дарогу вы хацелі нам паказаць.

— Адкуль жа вы маглі ведаць?

— Бабры сказалі! — засмяяўся Віктар.

— А! Дык вы падслухалі?

— Чуткі такія па лесе пайшлі.

Нарэшце хлопцы адчулі, што вельмі хочуць есці. У трафейнай торбе прадуктаў было нямнога, асабліва хлеба: раніцою

хлопцы і Саўчук добра пад'елі, не шкадуючы бандыцкіх запасаў.

Вочы палонных прагна накіраваліся на ежу.

— Як тут дзяліць? — казаў Мірон, круцячы ў руках хлеб.— А есці на іхніх вачах не магу. І схавацца ад іх няма як.

Тыя два, што былі ўзяты раніцой, нарэшце не вытрымалі і папрасілі:

— Дайце хоць хлеба кавалачак, мы ўвесь дзень нічога не елі.

— Хлеба? — усклікнуў Віктар.— Мы ж яго цэлы месяц не елі. Лепш мы засмажым вам цудоўнага зубровага мяса.

Сваім вострым кінжалам яны лёгка нарэзалі тонкіх лустаў мяса і паклалі ў агонь, а самі са спакойным сумленнем узяліся за хлеб і сала. Палонныя цярпліва чакалі сваёй чаргі, аб нечым перашэптваліся. Пакуль хлопцы павячэралі, мяса сасмажылася. Можна было вячэраць і палонным, але як?..

— Вы па чарзе. Развяжыце рукі аднаму, потым другому,— прапанаваў адзін з бандытаў, відаць, абмеркаваны ўжо імі план.

— Ну, не! — сказаў Віктар.— Лепш ужо вы пацярпіце да заўтрага без яды. Ніякай бяды з вамі не будзе. Мы тут галадалі больш — і нічога з намі не здарылася.

Палонныя паспрабавалі былі яшчэ даводзіць, што баяцца хлопцам няма чаго, што развязаны будзе толькі адзін, а супраць яго будуць двое ўзброеных, але хлопцы і слухаць не хацелі.

Тады самы галодны без ніякіх хітрыкаў папрасіў:

— Дайце мне ў рот хоць кавалак.

— Гэта іншая рэч! — згадзіліся хлопцы і далі яму ў рот кавалак мяса. Затым па просьбе далі другому, а іншыя адмовіліся. Цяжкараненаму давалі і хлеба і сала, але ён не ўзяў і папрасіў толькі піць.

Мірон узяў бляшанку і пабег да бабровага ручая па ваду. Калі напаіў хворага, папрасілі і здаровыя. Зноў пабег Мірон.

— Вы б узялі другую бляшанку і пабеглі абодва,— параіў адзін.

— Дзякуем за параду! — насмешліва адказаў яму Віктар.

Потым бегаў яшчэ Віктар два разы, пакуль напаілі ўсіх. Тады з'явілася новая просьба:

— Дайце пакурыць. Вазьміце ў нашых кішэнях папяросы і запалкі.

Віктар дастаў папяросы і пачаў соваць усім у рот. Потым паднёс ім агонь. Мірон занепакоіўся, каб Віктар і сам не закурыў, бо спакуса для яго была надта вялікая. Ён сквапна глядзеў на папяросы, што былі ў яго руках, узяў адну, пачаў круціць яе, разглядаць...

Мірон кінуўся ратаваць свайго прыяцеля. Ціхенька ўзяў з яго рук папяросы і сказаў:

— Паслухайся мяне, Віця, пацярпі! Столькі часу прайшло, ты ўжо адвык. Ці варта зноў пачынаць.

Тон Мірона быў такі сяброўскі, такі шчыры, што Віктар усміхнуўся і сказаў:

— Добра, не буду.

Цяжкараненыя вельмі часта прасіў піць, і хлопцы ахвотна насілі яму ваду. Не адмаўлялі яны і здаровым, толькі рабілі гэта неахвотна. Потым трэба было даць пакурыць. А там былі і яшчэ просьбы, у якіх нельга было адмовіць...

Адным словам, клопату было да самага цямна. А чым цямней станавілася, тым больш трывожыліся хлопцы. Хоць яны і не шкадавалі галля, але ўсё ж такі не кожны рух палоннікаў можна было заўважыць у змроку. Яны памяталі, як таварыш Саўчук сядзеў тады з жэрдкай і... зусім вольны.

«А што, калі і цяпер гэтак жа сядзіць хто-небудзь з гэтых бандытаў?» — мільгала думка ў абодвух. І яны раз-пораз правяралі палоннікаў.

— Чаго вы лезеце кожную хвіліну? — злавалі тыя.— Паспрабуйце самі вызваліцца з такіх путаў. Праўду кажуць: загадай дурню богу маліцца, дык ён і лоб разаб'е.

Непрыемна было слухаць такія словы, але хлопцы не крыўдзіліся: можа, яны і сапраўды занадта стараюцца? Але

праз некаторы час пераканаліся, што ў такой справе ніякая пільнасць не можа быць залішняй.

Самым спакойным палоннікам быў ранены ў руку. У яго замест рук былі звязаны ногі. Ён сядзеў, апусціўшы галаву, і ні на што не звяртаў увагі. Нават не прасіў ні есці, ні піць. Здаровая рука яго была засунута пад сагнутыя калені. Хлопцы нават не правяралі, ці добра звязаны ў яго ногі. Цяпер Віктар неяк звярнуў увагу, што здаровая рука палоннага ўвесь час уздрыгвае. Падышоў, паглядзеў і крыкнуў:

— Эге! Гэты нумар не пройдзе!

Аказалася, што за доўгі час ён пальцамі здаровай рукі і трэсачкамі развязаў сабе вяроўкі на нагах. Прыйшлося прыкруціць яму здаровую руку да нагі.

Хлопцы яшчэ раней дагаварыліся, што ноччу вартаваць будуць разам, а не па чарзе.

— Сярод гэткай кампаніі боязна заставацца аднаму нават і тады, калі ўсе звязаныя,— казалі яны.

І яны абодва заставаліся на варце пасля таго, як усе бандыты паснулі. Утыркнуўшыся галавамі адзін аднаму ў спіну, яны храплі на ўвесь лес.

— Піць! — пачуўся голас раненага.

Узялі бляшанку — вады няма. Няўжо дзеля гэтага бандыта ісці ў цемру па ваду? Але ранены цяжка дыхаў, стагнаў — і ў хлопцаў не хапіла духу адмовіць яму. Схапіўшы бляшанку, Віктар пабег па ваду.

Мірон застаўся адзін. Жудасна яму зрабілася. Усё навакол стала нібы інакшым. Бандыты ўсе нібы пачалі варушыцца, трэсціся, хоць у той жа час храплі так, што рэха па лесе ішло.

Калі Віктар вярнуўся, Мірон прашаптаў:

— Больш па ваду не хадзі. Можа, гэтай хопіць, а калі не,— хай крыху пацерпяць. Мне пачало здавацца, нібы яны ўсе ўзад і ўперад торгаюцца. А спяць яны нават занадта моцна. Ніхто з іх за ўвесь час не павярнуўся на другі бок. У гэтым няёмкім становішчы дзіва так праляжаць.

— Трэба паглядзець! — сказаў Віктар.

Падышлі да адной пары, дакрануліся.

— А? Што? Хто тутака? Пайшоў к чорту! — пачуўся сонны голас.

Памацалі вяроўкі — мокрыя, лахматыя!

— Ах, каб на іх ліха! — ускрыкнуў Віктар.— Гэта ж яны грызуць адзін аднаму вяроўкі. Зараз жа рассуньцеся! Ну! А то страляць будзем! Раз... два...

Палоннікі нездаволена пачалі адсоўвацца і бурчаць:

— Вось чортавы дзеці!

Прыйшлося праверыць усіх. У двух вяроўкі былі слюнявыя і пагрызеныя. Каб яшчэ гадзіна, другая, справа была б дрэнная. Замацавалі зноў і размясцілі іх паасобку.

Ноч цягнулася доўга, марудна. Усё здавалася, што бандыты зноў нешта надумалі. Цяпер яны ўжо так не храплі, не ляжалі спакойна, як раней. Часта варочаліся з боку на бок. Хлопцы пільна сачылі, каб яны не зблізкаліся, і ўвесь час пакрыквалі:

— Адсуньцеся!.. Далей!..

Праз якую гадзіну зноў усё сцішылася.

Было ўжо далёка за поўнач, калі хлопцы пачулі нейкі смурод, нібы ад смаленага адзення.

— Што гэта? Ці не падсмаліўся хто?

— Мусіць той, што бліжэй да вогнішча.

Падышлі да яго. Віктар схіліўся, а ў гэты момант адна рука абхапіла яго за шыю, а другая ўхапілася за рэвальвер.

— Мірон, страляй! — крыкнуў ён немым голасам.

Бандыты заварушыліся, загулі, пачалі куляцца бліжэй. Хлопцам здавалася, што яны ўсе ўжо развязаліся і зараз накінуцца на іх.

І вось Віктар адчуў, як жалезная рука адабрала ў яго рэвальвер...

— Страляй! Страляй! Хутчэй! — крыкнуў ён у роспачы.

Але ў гэты момант пачуўся спакойны голас Мірона:

— Палажы рэвальвер на зямлю і адсоўвай руку! Раз... два...

Пальцы бандыта расшчапіліся, і рэвальвер застаўся на зямлі. Віктар схапіў яго і выпрастаўся.

Мірон стаяў за спіной бандыта, засунуўшы рэвальвер за яго каўнер.

Халодная сталь прымусіла бандыта пакарыцца...

— Звязвай рукі! — сказаў Мірон.

Віктар зноў старанна звязаў іх. Рукі былі пасмаленыя, слізкія...

Зрабілі новую праверку. Размясцілі ўсіх вакол вогнішча за некалькі крокаў ад агню. Востры момант усхваляваў усіх, але было ціха, нібы нічога не здарылася. Толькі Віктар, адвёўшы Мірона ўбок, з абурэннем казаў:

— Чаму ж ты не страляў? З-за тваёй непатрэбнай літасці мы абодва ледзь не загінулі!

— Ніякай літасці тут не было, а разумнае меркаванне,— адказаў Мірон.— Каб я стрэліў адразу, то мог трапіць і ў цябе, бо вы былі сашчапіўшыся. Каб я прыставіў рэвальвер да яго галавы, ён мог бы адхіснуцца і нават выбіць у мяне рэвальвер. А калі я засунуў рэвальвер яму за каўнер, то бандыт ужо нічога не мог зрабіць, а я заўсёды паспеў бы стрэліць.

— Але ж і цярплівы, гад! — дзівіўся Віктар.— Смаліць руку разам з вяроўкай — і ні гу-гу!

Нарэшце прыйшоў канец і гэтай страшнай ночы. Сонца яшчэ не вылезла з-за лесу, як між дрэў паказаліся постаці чырвонаармейцаў. Было іх чалавек дванаццаць. Наперадзе ішоў, лепш сказаць, бег камандзір з трыма кубікамі ў пятліцах.

Гэта быў Саўчук. Ён увесь час хваляваўся больш, чым самі хлопцы. Ён лепш за іх разумеў, у якім сур'ёзным, адказным і небяспечным становішчы засталіся хлопцы ў гэтую ноч. Самая малая хіба — і яны маглі загінуць. А Саўчук адчуваў бы сябе вінаватым у іх гібелі.

Якая ж была яго радасць, калі ён здалёк убачыў іх жывымі на варце!

Хлопцы радасна махалі рукамі, шапкамі і так крычалі «ўра», што ўспудзілі зайца з-пад далёкага куста. А для бандытаў гэты радасны крык азначаў канец надзеі...

Саўчук абняў хлапцоў, нібы родных, якіх не бачыў шмат часу.

— Малайцы, хлопцы! — сказаў ён.— А цяпер давайце збірацца дадому.

...Праз дзве гадзіны ў лесе было ўжо зусім ціха. Сіратліва курэў пакінуты агонь. Каля яго валяліся непатрэбныя рэшткі разабранага зубра. Убаку бялеўся пагурачак свежага пяску — бясслаўная магіла чорнага бандыта.

Лясныя жыхары асмялелі. Залескатала ўверсе ваверка, аглядаючы пакінутую стаянку. Зноў закаркалі вароны і паступова авалодалі рэшткамі зубра. А да іх ужо накіроўваўся воўк...

У Палескай пушчы распачыналася нармальнае жыццё, парушанае было чалавекам.

1929 г.

ТВТ,

або апавяданне пра тое, як піянеры ўзбунтаваліся супроць уціску рэчаў і здзівілі ўвесь свет, як яны навучыліся бачыць тое, чаго іншыя не бачаць, і як Цыбук здабываў ачкі

Аповесць

РАЗДЗЕЛ ПЕРШЫ,

пра тое, як Ніна падрала панчоху, як бацька паляцеў дагары нагамі і як Толя круціўся па вуліцы.

Толя куляй ускочыў у хату, нібы за ім гналіся чатыры сабакі.

— Што з табою? — спалохалася маці.

— Аніводнай тройкі няма! — крыкнуў ён і хуценька пачаў поркацца ў сваіх кнігах.

Маці з жахам пляснула рукамі.

— Аніводнай?! Сораму ў цябе няма!..

— Во! — урачыста сказаў Толя і паказаў матцы паперку.

Маці сумна глянула ў яе, але хутка твар яе пасвятлеў, і яна радасна сказала:

— Ды тут, здаецца, усё добра, а ты палохаеш.

— Чаму палохаю? — здзівіўся Толя.— Паглядзі: ніводнай тройкі!

Сапраўды, у ведамасці вучня 5-га класа Анатоля Бяспалава ніводнай тройкі не было відаць, а ўсё чацвёркі і нават адна пяцёрка. Матцы зрабілася зусім лёгка на сэрцы.

— А я падумала: калі ўжо і тройкі няма, то справы, мусіць, зусім дрэнныя, ад цябе ўсяго можна чакаць,— сказала яна ласкавым голасам.

Толя з гонарам усміхаўся, нібы зрабіў які подзвіг.

— Пакуль што толькі адна пяцёрка,— сказаў ён,— а потым будзе болей.

Расчуленая маці хацела была абняць сына, але той крутнуўся і паскакаў да свайго акна.

— А тата як будзе рады! — казала маці.— Вось каб яшчэ і ў Ніны ўсё было добра! Не ведаеш, як у яе?

— Хоць і не так, як у мяне, але двоек няма.

— Ну, вось і добра! Усё добра,— радасна мітусілася маці.— А чаму ж яе няма?

— Ідзе недзе ззаду.

Толя схапіў кнігу і заняў сваю звычайную пазіцыю ля акна. Уласна кажучы, гэтую пазіцыю лепш было назваць незвычайнай, бо Толя сядзеў, задраўшы ногі на падаконнік, і пры гэтым карыстаўся не ўсімі чатырма ножкамі крэсла, а толькі дзвюма заднімі.

Ён увесь час гойдаўся на гэтых ножках, а часта нават стараўся ўтрымацца на іх, не дакранаючыся нагамі да падаконніка. Што і казаць, практыкаванне было досыць рызыкоўнае, бо ў кожны момант Толя мог бразнуцца патыліцай на падлогу так, што надоўга выйшаў бы са строю. Але ж затое яно было і вельмі цікавым для Толі. Ён вылічыў, што такім чынам ён мог ужо пратрымацца паўтары секунды, а ў далейшым спадзяваўся дасягнуць і якога-небудзь рэкорда.

Ды гэта яшчэ не ўсё. Была яшчэ спакуса пратрымацца на адной ножцы. Гэтая штука была куды больш складаная. Тут ужо не толькі нельга было здымаць сваіх ног з падаконніка, але трэба было яшчэ трымацца за яго рукамі. І ўсё ж Толя спадзяваўся, што калі-небудзь, хай сабе праз гадоў дзесяць ці сорак, ён здолее пратрымацца некалькі секунд не толькі без рук, але нават і без ног.

Аднак крэсла, як відаць, зусім не збіралася ўдзельнічаць у сусветных рэкордах. Яно жаласна рыпала, а сядзенне ўжо вельмі выразна імкнулася адлучыцца ад задніх ножак. Дзве шрубкі, што злучалі іх, зусім расхлябаліся: адна высунула сваю галаву з дзірачкі, а другая ўжо нарыхтавалася зусім выскачыць.

Але Толя на ўсё гэта не звяртаў увагі.

У калідоры стукнулі дзверы, і пачуліся павольныя, няроўныя крокі. У пакой увайшла сястра Ніна.

Падышла, кульгаючы, да канапы і апусцілася на яе са слязьмі на вачах.

— Што здарылася? — з трывогай спытала маці.

— Не магу болей! — прастагнала Ніна і пачала расшнуроўваць бацінак.

— Што такое? — падышла маці.

— Цвік усю нагу пакалоў. Учора яшчэ сяк-так цярпела, а сёння не магу...

Ніна зняла бацінак, потым панчоху.

Маці зірнула на нагу: падэшва збоку да крыві падрапана цвіком.

— Чаго ж ты маўчала?

— Гэта рабілася патрошку. А спачатку я не звяртала ўвагі.

— Памый, завяжы. І панчоха навюсенькая папсавалася,— уздыхнула маці.

Узяла бацінак, прасунула руку, доўга мацала.

— Нічога няма!

— Ён тут, збоку,— паказала Ніна.

Памацала маці ў тым месцы — і пацiснула плячыма:

— Не магу знайсці аніякага цвіка!

— Дай я,— сказала тады Ніна, упэўнена прасунула руку, памацала, пашукала — і са здзіўленнем паглядзела на маці. Няма цвіка, ды і годзе!

— Толік! — звярнулася маці да сына.— Паглядзі, што тут робіцца: цвік параніў усю нагу, а знайсці яго ніяк не можам.

— Вось дык задача! — з пагардай адказаў Толя, гойдаючыся на сваім крэсле.

— Ды ты падыдзі, паглядзі сам.

Толя неахвотна пакінуў сваё месца і, насмешліва ўхмыляючыся, падышоў да канапы. Узяў бацінак, засунуў руку, доўга поркаўся...

Насмешка ўжо знікла з яго твару.

— А што? — спыталася тады Ніна з насмешкай.

— Пачакай, тут нешта не тое,— збянтэжана буркнуў Толя.— Пакажы нагу.

Паглядзеў: нага сапраўды падрапана цвіком.

Тады Толя прылажыў падэшву бацінка да падэшвы нагі, каб дакладна вызначыць месца, дзе павінен быў быць цвік.

— Бач, які ён хітры! — заўважыла маці, задаволеная кемлівасцю сына.

Але Ніна раптам адсунула нагу і пакацілася са смеху.

— Ты чаго заходзішся? — сярдзіта крыкнуў Толя.— Трымай нагу!

— Ды гэтак жа выходзіць наадварот! — праз смех сказала Ніна.

— Сапраўды, наадварот выходзіць! — засмяялася і маці, на гэты раз задаволеная кемлівасцю дачкі.

— Нічога смешнага тут няма,— сурова сказаў Толя.— Я і сам гэта ведаю. Я толькі спачатку захацеў прымерадь так. А цяпер паспрабуем інакш.

І ён паставіў бацінак побач з нагой падэшвай уніз. Потым старанна пачаў ціскаць рукой у сярэдзіне і, нарэшце, пераможна крыкнуў:

— Ёсць!

— Дзе? Як? — зацікавіліся маці і Ніна.— Якім жа чынам ён мог нацерці да крыві, калі яго самога так цяжка намацаць?

Да Толі адразу вярнуўся ўвесь яго гонар. З важным і аўтарытэтным выглядам ён растлумачыў:

— Ускраек усцілкі адлупіўся і загнуўся, як спружына, і цвік высоўваецца толькі тады, калі моцна націснуць. А вы гэтага не здагадаліся зрабіць.

Паспрабавалі маці і Ніна — сапраўды, так яно і ёсць.

— Трэ было б неяк паправіць, загнуць цвік, ці што,— сказала маці.— Можа, ты, Толік, паправіў бы?

— Шавецкай справе я не вучыўся,— адказаў Толя.

— Няўжо ж такая хітрая штука — загнуць цвік?

— Гледзячы дзе і які. З малатком да гэтага цвіка не дабярэшся, не прыстукнеш яго. А ў шаўца ёсць рашпіль і ўсялякія там прылады.

Памеркавала маці і ўбачыла, што сапраўды з малатком гэтаму цвіку ніякай рады не дасі. Сядзіць ён недзе далёка і глыбока — як па ім стукнеш?

— Тады прыйдзецца аднесці да шаўца,— уздыхнула яна.— Вазьмі, Толя, ды занясі.

— А чаму ж не яна сама? — агрызнуўся той.— Усё я ды я.

— Ды ў яе ж, бачыш, якая справа!

— А хіба яна ляжа ў пасцелю і не будзе хадзіць? У яе ж ёсць старыя бацінкі.

— Ну добра, добра, я сама занясу! — умяшалася Ніна.— Не трэба яго ласкі!

— Тым лепей,— згадзілася маці.— Пакуль бацька прыйдзе абедаць, ты і вернешся.

Ніна сабралася і пайшла.

А Толя вярнуўся на сваё месца і зноў узяўся за чытанне, або, лепш сказаць, за практыкаванне на ножках крэсла.

...Ніна выйшла на вуліцу, прайшла адзін квартал і спынілася ля дзвярэй, над якімі была шыльда: «Майстэрня абутку саюза гарбароў».

Увайшла, сунулася са сваім бацінкам, але ёй сказалі:

— Мы толькі шыем новы абутак, а ў рамонт не бяром. Для гэтага ёсць асобныя рамонтныя майстэрні.

Выйшла Ніна — і не ведае, куды ісці. Хацела была вярнуцца назад, спытацца, ды не адважылася. Пастаяла, падумала і павольна пайшла па вуліцы, разглядаючы шыльды.

Прайшла адну вуліцу, другую — ніякай рамонтнай майстэрні не відаць. Пачала прыглядацца, да каго можна было б звярнуцца з запытаннем, і ніяк не магла адважыцца: той надта важны і сур'ёзны чалавек, той надта заклапочаны, у таго выгляд вельмі суровы. А калі, нарэшце, звярнулася да адной добрай жанчыны, дык тая лагодна адказала:

— Не ведаю, дзетка!

Доўга бадзялася Ніна, пакуль натрапіла, нарэшце, на другую майстэрню, рамонтную. З вялікай радасцю ўвайшла ў сярэдзіну.

Там працавала многа майстроў, але яшчэ больш было заказчыкаў. Ці то мала майстэрняў было ў горадзе, ці дзень такі трапіўся, але цэлая чарга іх сабралася да таго майстра, які прымаў заказы.

Вымушана была і Ніна стаць у чаргу. Стаіць і млее ад голаду. Ужо прыйшоўшы са школы, яна хацела есці і чакала абеду, а цяпер вунь колькі часу прайшло і невядома, колькі яшчэ пройдзе. А дома, мусіць, ужо абедаюць...

Але і дома справа з абедам ускладнілася.

Бацька, як заўсёды, прыйшоў дахаты спяшаючыся. У яго вечна нейкія там балансы, справаздачы, каштарысы.

Толя саскочыў з крэсла, паставіў яго ля стала, для абеду, і паказаў бацьку сваю ведамасць.

Не бачыў небарака, што тая зухаватая шрубка, якая збіралася выскачыць з крэсла, скарыстала гэты рух і вывалілася на падлогу. А другая ўжо вылезла напалову...

Бацька паглядзеў ведамасць, пагладзіў бараду і задаволена сказаў:

— Старайцеся, старайцеся, дзеткі! А дзе Ніна?

— Панесла бацінак у рамонт. Зараз прыйдзе.

— Ну, маці, давай хутчэй абедаць, я спяшаюся!

Бадзёры, задаволены, падышоў ён да стала і важка апусціўся на крэсла.

І вось тут адбылося нешта такое, чаго Толя не забудзецца ўсё сваё жыццё.

Крэсла рыпнула, пакрывілася — і бацька паляцеў на падлогу!

Тоўсты паважны бацька, з барадой і з вусамі, такі важны і сур'ёзны — паляцеў дагары нагамі, нібы хлапчук які, неяк смешна ўзмахнуў рукамі, а правую нагу задраў так высока, што зачапіў талерку і, нарэшце, грукнуўся на падлогу, як слон, страсянуўшы ўсю хату.

Маці закрычала немым голасам, а Толя збялеў і прырос да зямлі.

У вачах яго закружылася, бацька і стол нібы пачалі адсоўвацца ад яго і зрабіліся маленечкімі.

Бацька ціха ўстаў і ўтаропіўся на Толю грознымі вачыма. Толю пачало здавацца, што настала доўгая ціхая жудасная ноч.

— Гэта ты?! — пачуўся, нарэшце, злавесны шэпт, і бацькава рука сціснула спінку скрыўленага крэсла.

Толя ўціснуў галаву ў плечы. Маці хутка кінулася да бацькі.

Той усё глядзеў на Толю, цяжка дыхаючы. Потым, расцягваючы словы, прамовіў:

— Зараз жа занясі крэсла ў майстэрню і не вяртайся назад, пакуль яно не будзе папраўлена. Марш!

Толя з палёгкай уздыхнуў, радуючыся, што ўся гэтая гіс-

торыя скончылася для яго так шчасліва. У адзін момант накінуў куртку, падхапіў крэсла і выскачыў з пакоя з такой самай шпаркасцю, з якой нядаўна ўскочыў.

...А Ніна ў гэты час падышла ўжо да майстра і падала яму бацінак.

— Цвік трэба паправіць, колецца,— сказала яна.

Майстар узяў бацінак, зірнуў на яго адным вокам і пачаў пісаць квіток, сказаўшы:

— Прыйдзеш праз чатыры дні.

Ніна жаласна запрасілася:

— Тут толькі адзін цвік паправіць... Калі ласка, зрабіце зараз... Я ўсю нагу пакалечыла.

— Бачыш, колькі абутку нанеслі? — пахмура адказаў майстар.— Усім зараз не зробіш, трэба па чарзе.

— Мне няма ў чым хадзіць, а работы тут, відаць, мала... Я пачакаю,— прасілася Ніна.

— І невялікую работу ўсім разам не зробіш,— сказаў майстар і ўзяў абутак у наступнага заказчыка.

Ніна адышла ўбок і спынілася. Чакаць чатыры дні! Гэта ўжо занадта. Няўжо ж не згодзіцца паправіць цяпер? Не, лепш яна пачакае, пакуль усе людзі выйдуць, і тады яна зноў папросіць.

І яна засталася чакаць.

Паўгадзіны, што чакала яна, здаліся ёй за дзве гадзіны, але, нарэшце, яна дачакалася, калі ўсе разышліся, і зноў падышла да майстра.

— А ты яшчэ тут? — здзівіўся той.

— Дзядзечка, калі ласка, зрабіце цяпер. Ну што вам абыходзіць? — сказала яна, ледзь не плачучы.

Дзядзька зірнуў на яе лагадней і ўзяў бацінак. Агледзеў, абмацаў яго і сказаў:

— Ну добра!

Узяў нейкую жалязяку,— не то напільнік, не то вялікі цвік,— упёрся ім у востры канец цвіка ў сярэдзіне бацінка, стукнуў па другім канцы пару разоў малатком — і аддаў Ніне бацінак.

— Гатова!

А тая стаіць, вылупіўшы вочы, нібы ўбачыла нешта незвычайнае.

— Ну, бяры, гатова ўжо! — паўтарыў майстар.

— А... колькі каштуе? — прамовіла Ніна.

— Ды нічколькі,— адказаў дзядзька і ўзяўся за другую работу.

Ніна пастаяла, пакруціла ў руках бацінак, а потым нейк мімаволі прагаварыла:

— Але ж гэта я і сама магла б зрабіць!..

Майстар усміхнуўся.

— Вядома, магла б! Кожнае дзіцяня магло б. Толькі няма ў вас гэткай звычкі. Усё чакаеце, каб хто другі зрабіў.

— Дзякую! — сказала Ніна і выйшла засаромленая.

Усю дарогу яна думала пра гэты «рамонт». Колькі клопату і бяды было праз гэты няшчасны цвік! І нагу скрывавіла, і панчоху падрала, і па вуліцы доўга бадзялася, і ў чарзе стаяла, і без абеду галадавала, і пагражала небяспека чакаць яшчэ чатыры дні,— а ўвесь рамонт цягнуўся паўхвіліны, ды яшчэ такі рамонт, які і сама яна магла б зрабіць...

...Толя ішоў па вуліцы і праклінаў крэсла, якое ён сам папсаваў.

Ножкі крэсла, як наўмысля, чаплялі кожнага сустрэчнага, і кожны сустрэчны сварыўся:

— Ты чаго гэта з такой гаргарай на тратуары таўчэшся? Ідзі на сярэдзіну вуліцы!

Сышоў на сярэдзіну вуліцы, а там трамваі, машыны, коні. Кідаецца хлопец то ў адзін, то ў другі бок. Шарахнуўся ад аўтамабіля і зачапіў за хустку нейкую старую жанчыну. Тая закрычала, нібы трапіла пад аўтамабіль.

— Ты чаго тут хуліганіш? — крыкнуў на яго адзін суровы дзядзька.— Няма табе іншага месца?!

Крыўдна зрабілася Толю. Куды дзецца? Пабег на другі бок, а там міліцыянер:

— Ты чаго круцішся пасярод вуліцы? Пад машыну яшчэ трапіш. Ідзі на тратуар!

А на тратуары, як на тое ліха, народу процьма, і ўсе ку-

дысьці спяшаюцца і нават без ніякіх крэслаў штурхаюць адзін аднаго.

Але ім гэта нічога не абыходзіць: скажуць адзін аднаму «выбачайце» і ідуць далей. Праз некалькі крокаў зноў сутыкнуцца, зноў скажуць «выбачайце» — і нясуцца далей. І звычайна ў такіх выпадках просіць выбачэння не той, хто штурхаў, а той, каго штурхалі.

Затое калі сустрэнуцца двое зусім далікатных людзей, тады пачынаецца доўгая кадрыль: адзін пасунецца ўбок, каб даць дарогу, і другі ў той жа бок; тады адзін хуценька назад, а другі ўжо там; потым абодва скокнуць направа, потым налева... І чым больш далікатныя будуць людзі, тым даўжэй яны танцуюць.

І сярод усіх іх трэба было праціскацца нашаму хлопцу з крэслам...

У кожным разе Толя добра зразумеў, што каму-каму, а яму з крэслам трэба быць асабліва далікатным, калі ён не хоча напароцца на новыя непрыемнасці.

Ён прыстасаваў крэсла на спіне, сядзеннем назад, каб ножкі не вытыркаліся ў бакі, і рушыў далей.

Праз некаторы час ён усё ж такі зачапіў нейкага чалавека, але зараз жа далікатна схіліўся і сказаў:

— Выбачайце!

А ззаду ножка крэсла паднялася ўгору і... зачапіла капялюш у адной маладой жанчыны.

Пачуўся прарэзлівы крык. Толя спалохаўся, хуценька павярнуўся і... тыркануў кагосьці з другога боку.

Нарэшце ён сам не заўважыў, як зноў апынуўся пасярод вуліцы.

Тады ён сцяміў, што можна ісці і не па тратуары, і не па вуліцы, а па раўку, што цягнецца між тратуарам і вуліцай. Схіліўшы галаву, стараючыся не павярнуць крэсла ўбок, пайшоў ён, як конь у баразне, і быў вельмі рады, што нікога не чапае.

Калі ён прыйшоў у майстэрню, дык сустрэў непрыемнасць, ад якой адразу вылецела з галавы ўся гісторыя на вуліцы.

— З такім рамонтам нам няма сэнсу важдацца! — катэгарычна абвясціў майстар.

— Чаму? — са сціснутым сэрцам спытаўся Толя.

— Калі ўсе пойдуць да нас з такім глупствам, дык нам не будзе калі сапраўднай работы рабіць!

Жах ахапіў Толю. Як жа ж цяпер вярнуцца дахаты? Бацька ж сказаў, каб і дадому не прыходзіў, пакуль крэсла не будзе папраўлена.

— Калі ласка... папраўце,— пачаў прасіцца Толя.— Можа, гэта нядоўга... Мне бацька загадаў... Папраўце...

Майстар узяў шрубку, укруціў яе ў ножку, другую шрубку падкруціў, рэшту замацаваў і аддаў крэсла.

Увесь «рамонт» цягнуўся не болей, як хвіліны дзве. Толя стаяў, глядзеў, і ў галаве яго круцілася:

«Ды гэта ж я і сам мог бы зрабіць!..»

— А колькі... каштуе? — прамовіў ён нарэшце.

— Ну, заплаці за новую шрубку, ці што,— усміхнуўся майстар.

Ідучы назад, Толя, як і сястра яго, усё думаў пра гэты рамонт.

Не толькі ў іхняй сям'і, але і сярод усіх іхніх знаёмых спрадвеку захоўваўся погляд, што кожную такую работу павінен выконваць «спец», незалежна ад таго, ці складаная яна, ці простая.

Калі трэба паправіць крэсла ці стол, напрыклад, укруціць тую ж шрубку,— дык гэта павінен рабіць толькі сталяр. Калі ж трэба прымацаваць замок і пры гэтым укруціць такую самую шрубку,— тады трэба клікаць слесара. Шрубку ў бот павінен ужо ўкручваць шавец. Калі расхлябаецца шрубка ў насценным гадзінніку, яго павінен падкруціць майстар гадзіннікаў, а ў швейнай машыне — другі тэхнік. А каб хоць крыху пацікавіцца і прыгледзецца, то ўсе гэтыя шрубкі, пэўна, маглі б укруціць і Толя, і Ніна, і бацька, і маці.

Увечары Толя і Ніна доўга гаманілі ў кутку аб сённяшніх падзеях.

РАЗДЗЕЛ ДРУГІ,

дзе гаворыцца, як пацук ледзь не ўкусіў Андрэйку за нос, а парсючок сказаў «угу», ды яшчэ пра тое, як Андрэйка злавіў злодзея.

Аднаго разу таварышы спыталі Андрэйку, якая ў іх сям'я, і ён адказаў:

— Маці, я і парсючок.

— Гэта, значыць, твой брат? — насмешліва перапытаў Карачун.

— Дваюрадны,— сур'ёзна адказаў Андрэйка.

Усе пачалі смяяцца, а Карачун крыкнуў:

— Добрых сваякоў маеш!

— А што ж? — адказаў Андрэйка.— Ён зусім не горшы за цябе. Ён ніколі так не хуліганіць, як ты, і ніводнага разу я не чуў ад яго такіх брыдкіх слоў, як ад цябе. Ён ні ў каго не ўкраў алоўка, як ты, не пабіў ніводнай шыбы і ні з кім не біўся на вуліцы. Ніколі я не бачыў, каб ён чапляўся ззаду на трамваі, як ты...

Чым больш дадатных бакоў свайго «дваюраднага» пералічваў Андрэйка, тым большы рогат уздымаўся навокал і тым больш бянтэжыўся Карачун.

— Знайшлі з чаго смяяцца! — буркнуў ён і з пагардай адышоў прэч.

Андрэйка залічыў свайго парсюка ў сям'ю таму, што не было таго дня, каб хлопчык не прымаў удзелу ў доглядзе яго. Каму ж болей, як не яму, было дапамагчы матцы то травы нарваць, то катух пачысціць, то корму прынесці. Тым болей што маці служыла прыбіральшчыцай пры ўстанове і не заўсёды магла зрабіць гэта сама.

З гэтай прычыны часта здаралася карміць парсюка зусім позна, упоцемку. Тады ўжо абавязкова ішоў і Андрэйка, каб пасвяціць, адчыніць дзверы.

Такім чынам ён аднаго разу згубіў ключ ад вісячага замка. Справа дробная, звычайная, але ў дадзеным выпадку яна была вельмі сур'ёзнай: надыходзіла ноч, а як было пакінуць дзверы незамкнёнымі?

Можа, ключ валяўся, і дзе-небудзь блізка, ля ног, але ўпоцемку ніяк яго не маглі знайсці.

Сунуліся былі к суседзям пазычыць да заўтрага замок, але ў адных наогул не было лішняга замка, а другія суседзі ўжо спалі.

— Ну, што ж цяпер рабіць? — гаварыла маці.— Усё праз цябе, нягоднік! Навошта было вымаць ключ з замка?

Яшчэ і яшчэ пашукалі — няма ключа!

— Бяжы ў хату, там у шуфлядзе, здаецца, нейкі ключ ёсць. Можа, падыдзе.

Пабег Андрэйка і сапраўды знайшоў досыць падобны ключ.

Прынёс, пачалі прабаваць — і яшчэ больш прыкра зрабілася. Хоць бы ўжо зусім непадобны быў, а то вось-вось гатоў улезці, ды толькі нешта не пускае.

— Што рабіць, што рабіць? — паўтарала маці.— Не пакідаць жа так!

— Тады я застануся яго вартаваць,— сказаў Андрэйка.

— Якім чынам?

— Ды пераначую тут, на дровах.

— А баяцца не будзеш? — недаверліва спытала маці.

— Я? Баяцца? — адказаў Андрэйка такім тонам, што маці адчула да яго павагу.

— Ах ты, мой мужчына! — пяшчотна сказала яна.— Але ўсё ж такі лепш я папільную.

— Не, не, не! — горача запратэставаў Андрэйка.— Ці мала хлапцоў пільнуюць сады, агароды? Чым я горшы ад іх? Мне вельмі хочацца тут пераначаваць.

Маці разумела, што для хлапчука гэтая справа павінна быць вельмі цікавай. Ды і няхай ён, як мужчына, прывыкае да сякіх-такіх нягод.

— Хай будзе так,— сказала яна падумаўшы.— Я зараз зраблю табе пасцель.

І яна пайшла ў хату.

Застаўшыся адзін, Андрэйка адчуў сябе ніякавата. Хлевушок пры слабым святле газнічкі здаваўся зусім не такім, як звычайна. Аднекуль набралася шмат цёмных дзірак і кутткоў, якіх раней, здаецца, не было. Ды і павуціння шмат, якога раней ён таксама не заўважаў.

Вярнулася маці, зрабіла на дровах пасцель.

— Вось і добра,— суцяшала яна сына і сябе.— Баяцца няма чаго: ніякі злодзей не палезе, калі пачуе, што тут нехта спіць. Адну ноч правесці можна. Ды і не холадна. А заўтра занясеш слесару замок і ключ. Ну, кладзіся. Толькі не забудзься пагасіць газнічку, а то пажар можа быць.

І выйшла.

Зноў Андрэйку зрабілася страшнавата. Але цяпер ён нават раззлаваўся на сябе самога. Што за глупства, сапраўды! Колькі людзей вартуюць усюды: у садзе, у лесе, на полі, у розных будках — і нічога. А ён нібы баіцца. Гэта ж сорам!

— Ну, браток, будзем спаць! — звярнуўся ён голасна да парсюка і пачаў рыхтавацца да сну.

«Браток» стаў на заднія ногі, высунуў лыч з катуха і ветліва зарохкаў. Андрэйка не ўтрымаўся, каб не пачухаць яго за вухам.

Нарэшце Андрэйка пагасіў газнічку і лёг у сваю пасцель. Некаторы час ён чуў толькі, як рохкаў і шморгаўся яго сусед, а потым, калі той супакоіўся і засоп, Андрэйка пачаў прыслухоўвацца да іншых гукаў.

Звычайныя гукі — ці то шум аўтамабіля на вуліцы, ці крокі прахожых, ці стук дзвярэй у суседніх дамах,— усе тыя гукі, якія ён заўсёды і ўсюды чуў і на якія ніколі не звяртаў увагі, цяпер чамусьці здаваліся нейкімі асаблівымі, перашкаджалі спаць і нават крыху палохалі. Асабліва крокі людзей. Калі яны былі цвёрдыя, гучныя, дык яшчэ нішто, а калі ціхія, то ў Андрэйкі нешта такое напружвалася ў сярэдзіне...

І зноў пачаў ён злавацца на сябе самога. Ён жа добра ведае, што не баіцца, добра разумее, што ніякай небяспекі не можа быць. Нават каб сапраўды з'явіўся злодзей, дык варта толькі закрычаць — і ён уцячэ, бо іначай прыбягуць людзі. Усё гэта Андрэйка добра разумеў, але спаць спакойна не мог...

Каб паказаць, што ён нікога і нічога не баіцца, Андрэйка голасна заспяваў: «Бе-э-э-лая а-а-рмія, чо-орны баро-он...» — але голас яму самому здаўся нейкім чужым, а спеў прыдушаным; замест бадзёрасці Андрэйка адчуў яшчэ большую ніякаватасць.

Адгукнуўся парсюк, і Андрэйка сказаў яму:

— Дрэнна ў цябе спаць, браце.

— Угу,— адказаў той.

— Лепш ужо ты да нас перайшоў бы начаваць.

— Угу...

— Вось бачыш. Але я, дурны, не здагадаўся.

— Угу,— пацвердзіў парсюк.

У куце пачулася нейкая тузаніна, піск. Андрэйка ўздрыгануўся, але зараз жа супакоіўся, сцяміўшы, што гэта — пацукі.

Усё гэта адцягвала яго ўвагу ад знадворных гукаў.

Андрэйка пачаў думаць аб заўтрашнім дні, аб ключы, аб школьных справах і, нарэшце, заснуў.

Але сам ён нават не ведаў, што быў заснуў, бо праз некаторы час нешта пачуў і, не варухнуўшыся, пачаў прыслухоўвацца. Праўда, адным вухам ён ляжаў на падушцы, а другое было прыкрыта коўдрай, але ўсё ж такі ён адчуваў, што побач, каля галавы, нешта ці нехта ёсць.

І вось ён чуе, як нешта асцярожна папаўзло па ім...

Усхапіўся Андрэйка, не памятаючы сябе, крыкнуў дзікім голасам, махнуў рукамі, зачапіў за нешта мяккае і пачуў, як сярод дроў зашамацела...

— Пацукі! — крыкнуў ён.— Ах, праклятыя!..

— Угу,— азваўся парсюк.

Агіда страсянула ўсё цела. А што, калі яны зноў палезуць? Калі яны збяруцца ўсе разам, дык нічога з імі не зробіш...

Андрэйка ўспомніў, што недзе чытаў байку, як пацукі такім чынам загрызлі нейкага біскупа...

Але праз хвіліну Андрэйка ўжо адагнаў гэтыя недарэчныя думкі. У нашым жыцці такіх выпадкаў не бывае. Аднак у кожным разе справа непрыемная. Хоць ты не спі і пільнуй іх!

Хіба пайсці дахаты і сказаць матцы, што ён больш не можа тут спаць?

Але ж які ён будзе «мужчына», калі спалохаецца пацукоў? Засмяюць усе, нават парсюк...

І, адагнаўшы ад сябе палахлівыя думкі, Андрэйка зноў улёгся спаць. Але дзе тут было заснуць, калі ўвесь час здава-

лася, што пацукі зноў дабіраюцца да самага яго твару, носа. Тады ён парашыў схавацца пад коўдру з галавою. Душнавата, але нішто, цярпець можна. Зноў пачаў драмаць.

Раптам чуе, нехта скрабе па коўдры ў нагах. Прыслухаўся — пацук ідзе па ім! Зноў усхапіўся Андрэйка.

— Ш-ш-ш, каб цябе!..

І пачаў стукаць па дровах і калаціць па коўдры.

— Угу! — умяшаўся парсюк.

— Табе добра,— сказаў Андрэйка.— Цябе яны, відаць, не чапаюць.

— Угу,— згадзіўся той.

Андрэйка выбраў тонкае ёмкае палена і палажыў каля сябе, каб у наступны раз сустрэць госця як мае быць. Пацукі сціхлі. Усё менш і менш гукаў даходзіла знадворку. Але затое чым цішэй рабілася, тым выразнейшым быў кожны гук.

Вось, напрыклад, недзе побач пачуліся крокі. Андрэйка, можа, і не звярнуў бы на іх увагі, каб яны раптам не спыніліся. Хлапец адразу насцярожыўся.

Крокі аднавіліся, зноў сціхлі.

У Андрэйкі мацней закалацілася сэрца. Ці не падкрадваецца хто? Што тады рабіць, калі сапраўды з'явіцца злодзей?

Андрэйка нават сам здзівіўся, што загадзя не падумаў аб гэтым. Ён вартаваў наогул, а што і як рабіць, калі хто прыйдзе,— не ведаў. Цяпер ён пачаў абмяркоўваць план.

Ну, вось, скажам, уваходзіць злодзей. Што ж тады? Крычаць? Ну што абыходзіць такому злодзею прыстукнуць хлопчыка, каб ён і не пікнуў. Уцякаць? Але як уцячы, калі той будзе ў дзвярах? Вядома, калі падняць вялікі крык і шум, дык збягуцца людзі. Але да гэтага часу злодзей дзесяць разоў паспее прыдушыць яго. Якая тады будзе карысць Андрэйку? Хай ужо лепш прападзе парсюк. Але навошта ж тады ён вартуе?..

Не паспеў ён выпрацаваць план, як надышоў час дзеяння...

Дзверы ціхенька рыпнулі...

Нібы спуджаныя вераб'і, разам вылецелі з Андрэйкавай галавы ўсе планы. Ён сам не заўважыў, як прыціснуўся да пасцелі і накрыў галаву коўдрай.

Другі раз рыпнулі дзверы...

Андрэйка ўхапіўся за той адзіны план, які раптоўна прыйшоў яму ў галаву: ляжаць і не рыпацца, каб толькі злодзей яго не заўважыў. Ці добра гэта будзе, ці дрэнна,— ён не ведаў, бо іншых думак у галаве не было.

Аднак, калі прайшло некалькі хвілін і ніякіх змен не адбылося, ён адважыўся высунуць галаву.

Дзверы былі трошкі расчынены, але больш нічога не было ні відаць, ні чуваць...

Думкі паступова пачалі вяртацца на месца, і хутка ў галаве Андрэйкі іх набралася нават больш як трэба.

«Ці тут ён?.. Што ён робіць?.. А можа, нікога няма?.. Тады хто ж уваходзіў?.. Чаму ж тады не было чуваць, як ён пайшоў прэч?.. Значыцца, ён тут... А калі так, дык чаго ён чакае?.. Можа, крыкнуць?.. Але як тут крыкнеш, калі ён стаіць побач?..

Гэтыя думкі, як мяцеліца, кружыліся ў яго галаве. А час ішоў, і ніякіх змен не было. Ён зусім гатоў быў паверыць, што, мусіць, нікога няма, але варухнуцца не адважваўся, усё адкладваў надалей.

Нерухомасць яго абнадзеіла пацукоў, і яны зноў пачалі варушыцца побач. Адзін з іх забраўся на ногі і прабіраецца вышэй; адчуваюцца яго крокі ўжо на баку.

У гэты момант як бразнецца яму на спіну нешта цяжкае!..

— Мама!!! — вырвалася з грудзей Андрэйкі.

Зараз жа ён ускочыў, весела засмяяўся і крыкнуў:

— Кот!

— Угу,— адказаў, прачнуўшыся, парсюк.

Вядома, такому госцю Андрэйка быў вельмі рады. Цяпер ужо можна будзе спаць спакойна.

З лёгкім сэрцам устаў Андрэйка і прычыніў дзверы. На жаль, іх нельга было зашчапіць з сярэдзіны, а толькі знадворку можна было зачыніць на затычку.

Кот падышоў да Андрэйкі і ціха замуркаў. Гук гэты быў для Андрэйкі самым прыемным за ўвесь сённяшні вечар. Ён супакоіўся, але сон адляцеў ад яго.

Ён пачаў разважаць:

«Добра, што так здарылася. Ну, а што было б, каб сапраўды прыйшоў злодзей? Няўжо ж так ляжаць, чакаць, як я ляжаў? Гэта ж сорам!.. Які ж тады выйдзе з мяне мужчына?..»

Андрэйка адчуў, што паводзіны яго былі ганебныя, і парашыў рэшту ночы вартаваць добрасумленна. А на выпадак, калі прыйдзе злодзей, ён выпрацаваў план не толькі актыўны, але і геройскі: ён будзе сядзець у кутку каля дзвярэй і, калі толькі хто ўвойдзе, ціхенька выскачыць ззаду вон і зачыніць дзверы на затычку. Гэтым ён не толькі выратуе свайго парсюка, але прынясе карысць грамадству наогул — зловіць злодзея.

Апошняя думка найбольш цешыла яго. Ён цяпер нават прагна жадаў, каб злодзей прыйшоў. Не страшна, а весела было думаць, як увойдзе злодзей, як трапіць у пастку і гэтак далей...

Андрэйка выйшаў за дзверы, падрыхтаваў затычку, зрабіў рэпетыцыю і, задаволены, заняў свой пост каля дзвярэй. Ад кожнага шуму, гуку, асабліва крокаў, сэрца яго калацілася нават больш, як раней, але гэта быў не страх, а хваляванне героя перад рашучымі падзеямі. Эх, каб толькі прыйшоў хто!

Але, на вялікі жаль, ніхто не прыходзіў, і ўвесь запал і ўздым патрошку разыходзіліся дарэмна. Вось ужо Андрэйка, седзячы, пачаў дзюбаць носам, вось ужо некалькі разоў злавіў сябе на тым, што засынаў...

І ў адзін з такіх момантаў прыйшло тое рашучае, да чаго ён рыхтаваўся...

Схамянуўся ён толькі тады, калі цёмная фігура была ўжо ў сярэдзіне і нешта грабала не то каля яго пасцелі, не то каля парсюка.

Андрэйка ўвесь напружыўся, выслізнуў за дзверы — і на клямку іх. Злодзей апынуўся ў пастцы!..

У той жа момант Андрэйка пабег да суседа Данілы і пачаў стукаць у акно.

Калі паказаўся спалоханы дзядзька Даніла, Андрэйка прыдушаным, усхваляваным голасам загаварыў:

— Дзядзечка, ідзіце!.. У нашым хляве злодзей сядзіць!.. Я яго зачыніў...

І зараз жа пабег да другога суседа, трэцяга, а потым ужо ў сваю хату да маткі.

Злодзей тым часам на ўвесь квартал стукаў у зачыненыя дзверы. На гэты стук сабралася людзей нават больш, як разбудзіў Андрэйка.

Калі ўзброены народ адчыніў дзверы, адтуль выйшла... раззлаваная Андрэйкава маці!

— Звар'яцеў ён, ці што? — крычала яна.— Я выйшла паглядзець, як ён тут маецца, а ён во якую штуку выкінуў!..

...Назаўтра Андрэйка панёс замок і ключ да нейкага прыватнага слесара. Той пакруціў у руках замок, ключ і сказаў, што работа будзе каштаваць рубель і ўсё будзе гатова праз дзве гадзіны.

А калі Андрэйка прыйшоў праз дзве гадзіны, дык убачыў, што майстар нават і не браўся яшчэ за работу.

— Вы ж казалі, што праз дзве гадзіны будзе гатова! — з дакорам сказаў Андрэйка.

— Зараз, зараз будзе гатова! — адказаў майстар, узяў ключ, шмаргануў па ім пару разоў напільнікам, крутнуў у замку і аддаў Андрэйку.

Той аслупянеў.

— Ды гэта ж я і сам мог бы зрабіць! — прамармытаў ён.

— А калі мог, дык чаго нёс? — нездаволена адказаў майстар.

Андрэйка нікому не сказаў, які «рамонт» патрэбен быў для замка, але кожны раз чырванеў, калі ўспамінаў, колькі бяды было ад такой дробязі.

РАЗДЗЕЛ ТРЭЦІ,

дзе зноў гаворыцца зусім пра другое, напрыклад: як аблілі газай буханку хлеба, як Паўлік ехаў на «каўбасе» і як потым усе тры разы крыкнулі: «Паштальён!»

Сённяшні вечар у сям'і Паўліка выдаўся вельмі адказным.

Бацька, выкладчык лацінскай мовы ў медінстытуце, рыхтаваўся ў сваім пакоі да заўтрашняй лекцыі. Ён казаў, што яму сёння, можа, прыйдзецца сядзець усю ноч.

Маці прасавала бялізну.

Паўлік павінен быў рашыць на заўтра чатыры задачы.

Нават пяцігадовая сястрычка знайшла сабе важную работу: яна шыла сукенку для сваёй лялькі.

Чыста, ціха, утульна было ў кватэры. Электрычнасць ярка і ласкава асвятляла ўсе куткі. Кожны член сям'і адчуваў сябе шчаслівым, бо выконваў свае абавязкі.

І раптам усё гэтае мірнае жыццё перавярнулася дагары нагамі. І ўсяго толькі праз тое, што пагасла электрычнасць.

Спачатку думалі, што гэта так сабе, на хвілінку, як гэта нярэдка бывае. Зазяваецца там на станцыі які-небудзь тэхнік, крутане не той штэпсель ці іншую якую штуку,— і зараз жа выправіць памылку.

Але на гэты раз прайшло некалькі мінут, а святла не было.

— Паўлік, паглядзі, ці ёсць святло ў суседніх кватэрах? — сказаў бацька.

Як усім ім хацелася, каб там не было святла!

Паўлік зірнуў у акно і з прыкрасцю ўбачыў, што насупраць, праз вуліцу, гарыць. Заставалася яшчэ некаторая надзея, што, можа, у кватэрах іхняга дома няма святла. Выскачыў за дзверы і вярнуўся з апушчаным носам.

— Усюды гарыць!..

— Значыцца, у нас папсавалася,— сумна сказаў бацька.— Прыйдзецца запаліць лямпу мне, а вам усім трэба будзе ісці спаць.

— Дай жа хоць ім павячэраць! — сказала маці.— А дзе ж лямпа? Яна тут была.

Сямейная атмасфера адразу сапсавалася.

— Гэта ты браў яе?

— Ды не, я не бачыў!

— Хто апошні раз браў?

— Заўсёды ў нас так бывае, што калі трэба...

— Можа, тут?

— Бяда мне з вамі!

— Я бачыў тут.

— Ды няма!

— Хто ж, нарэшце, апошні раз яе браў?

І сярод гэтых невясёлых размоў пачуўся дзіцячы голас:

— Мама! Лямпа ў кладоўцы, на паліцы. Тата сам яе паставіў туды.

Нібы цёплы ветрык падзьмуў ад гэтых слоў. Усім адразу палягчэла на сэрцы.

Прынеслі лямпу, а ў ёй няма газы.

— Ці ёсць у нас газа? — устрывожыўся бацька.

— Ёсць, ёсць,— супакоіла маці.— Нават многа. Прынясі, Паўлік, бутлю.

Нават гэтую задачу цяпер выканаць было не так лёгка. Сяк-так знайшоў Паўлік бутлю і, рызыкуючы разбіць яе па дарозе, прынёс у пакой.

Цяпер заставалася толькі наліць у лямпу. Але кожны адчуваў, што справа гэтая — вялікая і складаная. Ніхто з іх адзін не мог бы выканаць яе. Нават удвух наўрад ці справіліся б. Тут патрэбен быў удзел усіх працаздольных членаў сям'і.

Перш за ўсё трэба было падтрымліваць святло і дапамогай запалак так, каб не было перапынку між адной запалкай і другой. Гэтая задача была самая важная, таму яе ўзяў на сябе бацька.

Паўлік павінен быў трымаць лямпу і сачыць, каб не пералілася газа. Маці ўзяла ў рукі бутлю.

— Пачынай! — скамандаваў бацька.

Старанна, асцярожна пачалася работа. Бацька чыркаў запалкі адну за другой, нічога больш не бачачы. Маці ціхенька нахіляла нязграбную бутлю. Паўлік, не дыхаючы, сачыў, як патрошку напаўняецца лямпа. Паклаўшы нос на стол, таксама напружана за ўсім сачыла Каця, прысутуліўшыся пад бутляй.

— Гатова! — крыкнуў Паўлік.

— Гатова! — паўтарыла Каця, радасна падскокнула і... стукнулася галавой у бутлю!

І тут адбылося самае страшнае: бутля выслізнула з матчыных рук, стукнулася аб край стала, разбілася, абліла буханку хлеба і ўсё, што было на стале, ды ў дадатак яшчэ і Кацю. Потым частка бутлі паляцела на падлогу, захапіўшы з сабой шкло ад лямпы...

І ў кватэры, дзе ўсяго толькі пятнаццаць-дваццаць мінут назад было так светла, утульна, дзе так спакойна, шчасліва ішло жыццё, дзе ўсе былі такія ласкавыя адзін да аднаго,— у гэтай самай кватэры цяпер панавала цемра, быў смурод ад разлітай газы.

У цемры пачуўся суровы голас бацькі:

— Паўлік! Заўтра раніцою, перад школай, збегаеш на электрастанцыю па манцёра. Абавязкова раніцою, бо калі пазней, то ён можа ў гэты дзень не прыйсці і тады зноў прыйдзецца пакутаваць суткі.

Паўлік хацеў быў сказаць, што ён можа спазніцца ў школу, што заўтра ў іх кантрольная пісьмовая работа, да таго ж ён яшчэ дзяжурны. Але зараз жа адчуў, што ў такі момант казаць гэтага не варта.

Запалілі лямпу без шкла. Маленькі чэзлы агеньчык бездапаможна спрабаваў асвятліць пакой, але ад гэтага святла пакой зрабіўся яшчэ больш непрытульным.

...Назаўтра Паўлік выбег з дому ў восем гадзін і пятнаццаць мінут. Да заняткаў заставалася сорак пяць мінут. Паўлік вылічыў, што дарога трамваем на электрастанцыю і ў школу зойме не больш за дваццаць мінут, а дваццаць пяць застанецца на ўсе іншыя справы.

Але, як на тую бяду, трамвай дзесьці доўга затрымаўся. А публікі тым часам збіралася ўсё больш і больш.

І калі, нарэшце, паказаўся трамвай, Паўлік з жахам убачыў, што ён паўнюткі народам, бо набліжалася дзевятая гадзіна, калі большасць служачых спяшаецца на работу.

Паспрабаваў быў Паўлік працiснуцца, але дзе там!

Тады яму прыйшла ў галаву рызыкоўная думка: прычапіцца ззаду, на «каўбасу».

Так ён і зрабіў.

Нельга сказаць, каб адчуваў ён сябе добра, але быў задаволены ўжо тым, што паспее выканаць сваю справу.

Лінія ішла каля школы, і Паўлік меў гонар пачуць прывітальныя крыкі сваіх таварышаў, якія ішлі ў школу.

— Глядзі, глядзі, Паўлік едзе на «каўбасе»! А-га-га! Ура!

Засопшыся, прыбег Паўлік у кантору, падышоў да акенца і папрасіў, каб прыслалі манцёра.

— А які нумар вашага абанемента? — спыталася канторшчыца.

— Не ведаю.

— Тады прынясіце абанементную кніжку.

— Дык я вам скажу адрас.

— Усё роўна без нумара абанемента мы заказаў не прымаем. Аб гэтым даўно ўжо абвешчана.

У хлапца і рукі апусціліся. Што рабіць? Або спазніцца ў школу, або застацца яшчэ на суткі без святла? Не! Бацькі будуць вельмі нездаволены, калі прыйдзецца зноў перажываць такі вечар, як учора.

І ён вымушаны быў вяртацца дадому. Толькі на гэты раз ехаў ужо як прыстойны пасажыр...

...Празвінеў званок у школе. У клас увайшоў настаўнік.

— Падрыхтуйцеся да пісьмовай работы.

— Чарніла няма,— адказалі вучні.

— А чаму ж не падрыхтавалі? — сурова спытаў настаўнік.

— Чарніла ў шафе, а ключ у дзяжурнага.

— Хто дзяжурны?

— Паўлік Рагатка.

— Дзе ж ён?

— Ды паехаў на «каўбасе»! — адказалі вучні са смехам.

— Што гэта значыць? — сурова спытаў настаўнік.

Яму растлумачылі, што бачылі Паўліка, як ён праехаў міма школы, прычапіўшыся ззаду да трамвая.

Настаўнік нават не хацеў верыць. Як гэта Паўлік Рагатка, вельмі добры вучань, замест таго каб ісці ў школу, мог паехаць катацца, прычапіўшыся да трамвая, ды яшчэ тады, калі ў класе пісьмовая работа, ды яшчэ калі ён сам дзяжурны?

— Не можа гэтага быць! — сказаў настаўнік.— Гэта ўжо занадта не толькі для яго, але і для самага недысцыплінаванага вучня з усёй школы.

— Але ж мы самі бачылі!

— Гэта мы потым разбяром, а цяпер дастаньце як-небудзь чарніла.

У суседнім класе ў гэты час ішла геаграфія.

Раптам адчыняюцца дзверы і сунецца вучань з іншага класа. Настаўнік здзіўлена зірнуў на яго.

— Дазвольце папрасіць у таварыша чарніла,— сказаў той.

— Трэба было раней гэта зрабіць,— нездаволена сказаў настаўнік.— Ну, хутчэй.

Вучань выйшаў.

— Дык вось мы казалі,— пачаў настаўнік,— што паўночныя моры...

Тут зноў адчыніліся дзверы.

— Дазвольце папрасіць чарніла...

— Што такое сёння робіцца? — гнеўна сказаў настаўнік.

— У нас пісьмовая работа, а дзяжурны...

— Гэта не наша справа! Не перашкаджайце!

У гэты час нехта ўжо даў чарніліцу, і вучань выйшаў.

— Дазвольце папрасіць чарніла.

Настаўнік зусім раззлаваўся.

— Што ж гэта такое, нарэшце?!

А ў гэты час у іншых класах адбывалася тое самае. З'явіўся дырэктар, пачаў наводзіць парадак.

А калі прыйшоў Паўлік, то меў столькі непрыемнасцей, колькі не было ў яго за цэлы год.

...Наўрад ці дзе яшчэ хто каго чакаў так, як чакалі манцёра ў доме Паўліка. Можна проста сказаць, што яго чакалі, як сонца, якое прыносіць святло. Кожны раз, калі рыпалі дзверы, усе кідаліся да іх з радаснай надзеяй і адыходзілі з сумам, калі прыходзіў не ён.

Калі з'явіўся, нарэшце, чалавек з сумкай, яго сустрэлі, як дарагога госця.

— Сюды, сюды! — завіхалася маці, скакаў Паўлік, круцілася Каця.

— Ды не варта, я так,— саромячыся, адказваў чалавек.

— Не, не, заходзьце, паглядзіце! Каб вы толькі ведалі, якое гора было! — казала маці, праводзячы чалавека ў пакой.

— А хіба вы ўжо ведаеце? — спытаўся чалавек.

Маці здзіўлена зірнула на яго.

— Як жа ж нам не ведаць, калі перажылі такое, што і сказаць нельга?

— А можа, гэта зусім другое,— усміхаючыся, сказаў чалавек і раскрыў сумку.— Можа, тут паведамленне пра якую радасць?..

І ён падаў пісьмо.

— Паштальён! — крыкнуў Паўлік.

— Паштальён! — прамовіла маці.

— Пастальён! — паўтарыла Каця.

— Але,— сказаў чалавек.— А вы думалі хто?

— Мы думалі — манцёр,— засаромеўшыся, адказала гаспадыня.

Калі прыйшоў бацька, дык у першую чаргу спытаўся, ці быў манцёр. А пачуўшы, што не быў яшчэ, вельмі замаркоціўся.

— А можа, сёння і наогул не прыйдзе?

Ад гэтай думкі ўсім зрабілася сумна.

Толькі а пятай гадзіне з'явіўся сапраўдны манцёр.

Паўлік не адыходзіў ад яго ні на крок, сачыў за кожным яго рухам.

Манцёр падышоў да лічыльніка, выкруціў пробку, паглядзеў: дроцік, што праходзіў праз яе, быў цэлы. Укруціў назад і выкруціў другую. Там дроцік быў перарваны.

— Я вам часова папраўлю гэтую пробку,— сказаў ён,— а там вы самі купіце новую і ўкруціце.

Ён узяў тоненькі дроцік, абкруціў адзін канец вакол меднай шыйкі, а другі вакол металічнага канца пробкі і ўкруціў назад.

Паўлік прагна сачыў за гэтай работай, усё заўважыў і, калі электрычнасць загарэлася, задумліва сказаў:

— Гэтак мы і самі маглі б зрабіць...

— Вядома, маглі б! Асабліва купіць новую пробку і ўкруціць яе,— усміхаючыся, прамовіў манцёр, а потым дадаў вельмі сур'ёзна: — Але майце на ўвазе, што карыстацца дроцікам трэба вельмі асцярожна і толькі ў крайнім выпадку. Калі па-

ставіш таўсцейшы дрот, дык можаш нарабіць бяды не толькі сабе, але і суседзям. Лепш за ўсё мець запасную пробку, а для гэтага ніякай тэхнікі не трэба.

Калі манцёр выйшаў, Паўліка ахапілі і крыўда, і злосць, і жаль, што праз такое глупства прыйшлося перацярпець столькі бяды.

РАЗДЗЕЛ ЧАЦВЕРТЫ,

дзе гаворыцца, як маці ваявала з патэльняй, як Клаве трэба было адкусіць цвік і як цётка Мар'я збілася з панталыку.

Калі Клава ўваходзіла ў дом, дык яшчэ ў сенцах пачула, як маці злуе:

— Вось няшчасце на маю галаву!

«Што такое здарылася?» — трывожна падумала Клава і хутка ўвайшла ў хату.

Спачатку яна пачула прыемны пах, а потым убачыла, што маці пячэ на прымусе аладкі — больш нічога, аніякіх няшчасцяў ні на матчынай галаве, ні наваакол не відаць.

Крыху дзіўным было толькі тое, што маці надта ўжо скакала вакол прымуса.

Заскакала і Клава, ды толькі ад радасці.

— Ах, мамачка, як добра, што аладкі пячэш!

— Ведаю, што есці табе добра. А вось каб паспрабавала сама пячы на гэтай непаслухмянай патэльні.

— Я табе памагу, мама.

— Мала карысці ад тваёй дапамогі. Лепш сядзела б дома ды вучылася. Добрыя людзі спаць ужо збіраюцца, а ты недзе ходзіш.

— Я ж казала, што ў нас сёння фізкультурны гурток,— сказала Клава і пайшла ў пакой распранацца.

Маці з лаянкай зноў пачала скакаць вакол прымуса. Уласна кажучы, яна скакала не вакол прымуса, а вакол патэльні, бо ў ёй, непаслухмянай, і быў корань зла.

А корань гэты быў у тым, што ручка патэльні трымалася толькі на адной, ды і то расхлябанай заклёпцы. Ад другой жа заклёпкі засталіся толькі дзве дзірачкі.

Для таго каб карыстацца гэтай патэльняй, трэба было мець кваліфікацыю цыркача-жанглёра, які можа круціць на палачцы талеркі, або трымаць іх на адным пальцы, ці паставіць рубам на носе, ці яшчэ што якое.

На жаль, маці такой кваліфікацыі не мела, таму патэльня зусім не слухалася яе і круцілася, як сама хацела. Хацела яна круціцца галоўным чынам улева. А калі гэта ёй не ўдавалася,— дык управа. А проста трымацца ўхілялася ўсялякімі спосабамі.

Калі Клава зноў увайшла ў кухню, маці сказала ёй:

— Ну, дык пячы ўжо ты, пакуль я вынесу вядро.

Клава згадзілася вельмі ахвотна. Узялася адной рукой за ручку, другой варушыць, пераварочвае аладкі. Усё ідзе добра.

Але як толькі зняла патэльню, дык яна — круць! — і аладкі паляцелі на падлогу. Падабрала Клава аладкі і стала класці новае цеста.

Тут пачалася яшчэ горшая бяда. Як толькі нацэлілася Клава палажыць першую лыжку — патэльня крутнулася ўлева, і цеста трапіла на табурэтку. А калі з наступнай лыжкай цеста Клава сунулася на левы бок, патэльня вільнула ўправа.

Цяпер ужо Клава добра зразумела, чаму маці была такая злосная. Сцяўшы зубы, ганялася яна за патэльняй і сяк-так здолела палажыць дзве лыжкі. Толькі трапілі яны абы-як, на розныя бакі патэльні. Але Клава на гэта не глядзела — абы толькі трапіць наогул.

Калі ж дайшла чарга да трэцяй лыжкі, дык яна трапіла акурат на першую аладку. Справа ўскладнілася. Клава гатова была ўжо клікаць на дапамогу маму, але пасаромелася, паставіла патэльню на зямлю і пачала дзяліць падвойную аладку на дзве часткі.

Тут толькі яна заўважыла, што патэльня, стоячы на зямлі, не круціцца. Узрадавалася дзяўчына і пачала насіць цеста з міскі на падлогу і размяшчаць так, як сама хацела, а не патэльня.

— Круціся цяпер колькі ўлезе! — злосна шаптала Клава, несучы патэльню на прымус і зусім не звяртаючы ўвагі на яе выкрунтасы.

Але патэльня на гэты раз выбрала новую тактыку і ўпарта пачала хіліцца ўніз. Ледзь толькі Клава паставіла яе на прымус, як ручка зусім аддзялілася ад патэльні.

У той жа час увайшла маці. Убачыла ў руках збянтэжанай Клавы адну толькі ручку і з дакорам паківала галавой:

— Вось табе і памочніца! Да гэтага часу хоць сяк-так можна было трымаць, а цяпер ніяк.

— Ды я ж нічога не рабіла! — пачала апраўдвацца Клава.— Яна ж і так ледзь трымалася.

— Яно так, але чамусьці гэта заўсёды здараецца ў вашых руках. Ну, пусці.

Пачалася новая стадыя работы. Тут ужо галоўную ролю адыгрывала анучка. Толькі з яе дапамогай можна было браць патэльню. Але справа ад гэтага ніколькі не палепшылася. Маці вымушана была скакаць яшчэ больш, бо кожную хвіліну апякала пальцы ды яшчэ анучка безупынна загаралася.

— Апошні раз пяку! — злавала маці.— Гэта ж пакута, а не работа!.. Ай, каб цябе!.. Заўтра абавязкова занясі майстру. Хай ён прыпаяе ці як там прымацуе ручку.

І калі спяклася апошняя аладка, маці са злосцю адштурхнула патэльню, а скамечаную анучку закінула ў кут.

Пасля ўсёй гэтай пакуты аладкі здаліся Клаве зусім не такімі смачнымі, як яна думала.

Назаўтра Клава панесла шкадлівую патэльню ў майстэрню. Праз некалькі хвілін насустрач ёй трапіўся хлапец у чорным шынялі з сінімі кантамі і пятліцамі, падперазаны шырокім рэменем з гладкай спражкай, на якой былі літары — «РУ». На галаве — шапка з такімі самымі кантамі і значком з малатка і ключа. Клава яшчэ здалёк залюбавалася гэтым хлопчыкам: такі ён быў акуратны, стройны, прыгожы ў сваёй форме.

Хлапец нібы і сам адчуваў гэта, бо трымаў сябе з гонарам, зусім не так, як многія звычайныя хлапчукі, што носяцца па вуліцы, задраўшы галовы, крычаць, штурхаюцца.

Калі яны сышліся бліжэй, Клава са здзіўленнем ускрыкнула:

— Лёня!

Яна пазнала Лёню Ладуцьку, які вучыўся ў іхняй школе на клас вышэй за яе, а сёлета, як яна чула, перайшоў у рамеснае вучылішча. Але да гэтага часу яна яго не бачыла.

— Здарова, Клава! — адказаў Лёня.— Што нясеш?

— Дык вось патэльню трэба паправіць. Ці не ведаеш, куды занесці?

— Пакажы.

Ён сур'ёзна агледзеў патэльню, ручку і сказаў:

— Хадзем са мной: я табе зараз папраўлю.

— Ты?! — здзівілася Клава.— Хіба ты ўжо ўмееш?

— А што тут умець? — усміхнуўся Лёня.— Гэта кожны можа зрабіць.

— Кожны? — недаверліва сказала Клава.

— Пойдзем, сама ўбачыш. Я цяпер іду ў майстэрню. Раніцою ў нас былі заняткі ў класе, а цяпер — у майстэрні.

Яны падышлі да чырвонага цаглянага дома. На двары Лёня ўбачыў хлапца ў камбінезоне і спытаў:

— Пачалі?

— Не яшчэ,— адказаў той.

— Вельмі добра,— сказаў Лёня Клаве.— Значыцца, паспеем.

Яны ўвайшлі ў прыхожую.

— Пачакай крыху, я пераапрануся,— сказаў Лёня.

Ён зняў з вешалкі камбінезон і павесіў на яго месца свой шынель. Надзеўшы камбінезон, Лёня павёў Клаву ў майстэрню. Гэта быў вялікі пакой, дзе стаяла некалькі доўгіх сталоў-варштатаў; з абодвух бакоў, на пэўнай адлегласці, да іх былі прымацаваны ціскі. Каля кожных ціскоў з правага боку ў стале была шуфляда. Кожны вучань меў свае ціскі і сваю шуфляду. Некалькі вучняў поркаліся ля сваіх месц, некаторыя бегалі вакол сталоў, іншыя размаўлялі ў гуртку. Адзін хлапец завіхаўся каля свідравальнага станка.

Клава глядзела на ўсё гэта з вялікай цікавасцю і нават з нейкай пашанай. Здаецца, такія самыя хлопчыкі, як і ў іхняй школе, і смяюцца і бегаюць гэтаксама, але займаюцца яны тут зусім не дзіцячымі справамі, а робяць тое самае, што і дарослыя.

Аднекуль з'явіўся дзядзька з сівымі вусамі і суровым выглядам.

— Інструктар! — шапнуў Лёня.

Клава спалохалася: можа, крычаць пачне, што яна, чужая, сюды прыйшла? Сапраўды, дзядзька паглядзеў на яе са здзіўленнем. Тады Лёня, узяўшы з рук Клавы патэльню, падышоў да інструктара і сказаў:

— Мікалай Іванавіч, дазвольце прыкляпаць ручку да гэтай патэльні.

— Ты што: заказы ўжо бярэш? — сказаў інструктар сурова.

Клава яшчэ больш спалохалася. Але Лёня, відаць, ведаў свайго настаўніка, бачыў, што ў таго пад густымі сівымі бровамі паблісквае зусім лагодная ўсмешка.

— Трэба памагчы таварышу па школе,— адказаў Лёня.

— Памагчы? — перапытаў майстар.— Ну, калі памагчы, то нічога супраць не маю. Хай яна сама робіць, а ты толькі камандуй. Згодны?

Клава зусім збянтэжылася.

— Я... я ж зусім не ўмею,— прамармытала яна.

— Нічога, нічога, справімся! — весела падмаргнуў ёй Лёня.

— Ну, глядзіце,— сказаў майстар і адышоў, хаваючы ўсмешку ў вусах.

Лёня пачаў камандаваць:

— Бачыш, у гэтай дзірцы засталася адламаная заклёпка? Спачатку трэба выбіць яе адтуль.

— Выбіць? — паўтарыла Клава.

— Абавязкова. Бо трэба ж новую заклёпку ўставіць. Трохі адкруці ціскі, вось у гэты бок.

Клава баязліва крутнула ручку ў левы бок. Ціскі трошкі рассунуліся.

— Зрабі такую шчыліну,— казаў далей Лёня,— каб у ёй акурат змясціўся канец гэтай заклёпкі. Не, не, замнога будзе — назад. Так. Цяпер палажы ручку на ціскі так, каб заклёпка была над самай шчылінай. Так. А цяпер застаецца толькі стукнуць па ёй чым-небудзь — і яна выскачыць.

— Вось гэтым! — падскочыў другі хлопчык і падаў Клаве круглы кавалак жалеза з тонкім канцом.

Клава ўзяла яго ў правую руку і стала меркаваць, як гэта стукнуць ім па заклёпцы. Заўважыўшы гэта, Лёня і яго таварыш так зарагаталі, што да іх кінуліся ўсе хлопцы. Інструктар крыкнуў:

— Чаго вы? Адыдзіце, не перашкаджайце ім!

Хлопцы неахвотна адышлі. І Клава ледзь не заплакала. Лёню зрабілася няёмка, і ён ласкава сказаў:

— Нічога, нічога, мы так. Ты вазьмі гэта ў левую руку, пастаў канцом на заклёпку і прыстукні малатком.

Цяпер ужо і сама Клава сцяміла, што іначай і нельга рабіць. Яна стукнула некалькі разоў па жалезу — і заклёпка выскачыла.

— Вось і ўсё,— сказаў Лёня.— А цяпер вазьмі адкусі гэты цвік, вось тут, каля галоўкі.

— Адкусіць? — здзівілася Клава.

— Ну, мы так гаворым,— засмяяўся Лёня.— Вазьмі гэтыя кусачы і вось так сцісні ў гэтым месцы цвік.

Клава ўставіла цвік, як паказаў Лёня, сціснула абедзвюма рукамі кусачы і сама не заўважыла, як цвік быў перарэзаны.

— Зусім лёгка! — радасна сказала яна.

— Лёгка і проста,— пацвердзіў Лёня.— А цяпер зробім апошнюю аперацыю. Прылажы ручку да патэльні і прасунь гэты кавалак цвіка праз абедзве дзіркі. Палажы на ціскі плешкай уніз. Я табе памагу патрымаць. Цяпер бяры малаток і бі па цвіку, каб яго распляскаць.

Асцярожна, нязграбна пачала яна стукаць па цвіку.

— Смялей, мацней! — пакрыкваў Лёня.— Трэба расплюшчыць яго зусім.

А калі яна паспрабавала стукнуць мацней, то не патрапіла па цвіку.

— Нічога, нічога! — суцяшаў Лёня.— Лупі колькі ўлезе.

Клава пачала «лупіць колькі ўлезе», прычым больш за палову ўдараў трапляла ў бакі. Але канец цвіка паступова плюшчыўся і, нарэшце, ператварыўся ў такую самую плешку, як з другога боку, толькі крывую.

— Добра будзе,— сказаў Лёня.

Клава агледзела сваю работу, паторгала ручку — трымаецца моцна, хоць яшчэ ёсць дзірка для другой заклёпкі. Клава адчула вялікае задавальненне, якое заўсёды бывае ў чалавека, які сваімі рукамі зробіць якую-небудзь карысную работу. За другую заклёпку яна ўзялася ўжо самастойна, упэўнена і зрабіла яе трохі лепш і хутчэй, як першую. Падышоў інструктар, узяў у рукі патэльню, агледзеў яе і спытаў:

— Сама зрабіла?

— Сама! — адказалі Лёня і Клава разам.

— Вельмі добра. І заўсёды старайся, што можна, рабіць сама. Вазьмі яшчэ вось гэты напільнік і пашморгай ім, каб было гладка.

І стары майстар адышоў, таксама задаволены, як чалавек, які зрабіў карысную справу. Ён больш за ўсё любіў працу і хацеў, каб усе гэтак жа любілі яе. Ён шкадаваў тых людзей, якія не могуць ці не хочуць самі сабе дапамагчы ў якой-небудзь дробязнай справе. Хоць ён вучыў сваіх выхаванцаў слясарству, але патрабаваў, каб яны самі сабе і боты папраўлялі, і гузік прышылі. Таму ён прымусіў і гэтую невядомую яму дзяўчынку самой сабе дапамагчы.

Клава вярнулася дадому з такім ззяючым тварам, нібы да яе прыйшло немаведама якое шчасце.

Маці паглядзела на яе са здзіўленнем:

— Што ў цябе такое?

— Во! — урачыста сказала Клава, падаючы патэльню.

— Папраўлена? Так хутка? — сказала маці, беручы яе.— І як моцна трымаецца!

— Бо я сама зрабіла,— з гонарам сказала Клава.

— Як гэта сама?

— Ды так — сваімі рукамі.

— Сваімі?! — усклікнула маці.

— Ды вось гэтымі самымі,— паказала свае брудныя рукі Клава.

— Сама?!

— Сама.

— Не можа быць!

— А яно так і ёсць.

— Няўжо сама?

— Сама.

— Сваімі рукамі?

— Ды кажу, што сваімі.

— Ах, дачушка! Глядзі ты, што яна зрабіла!

Маці аглядала патэльню з усіх бакоў, круціла ў руках і так і гэтак і не магла нацешыцца.

Увайшла суседка цётка Мар'я. Маці да яе:

— Глядзі, як паправіла патэльню Клава! Сама, сваімі рукамі.

— Няўжо сама?

— Сама, сама! — сказала Клава ўжо нездаволена.— Што ж тут такога?

— А хіба ты вучылася гэтай справе? — спытала тады суседка.

— Паказалі — я і зрабіла.

— Так адразу і зрабіла? — недаверліва сказала цётка Мар'я.— Каб хлопчык, то яшчэ сяк-так, а то дзяўчынка... Ніколі такога не было.

— А цяпер ёсць.

У той жа дзень многія суседзі ведалі ўжо, што Клава Макейчыкава за адзін раз, без ніякай навукі, зрабіла такую работу, якую выконваюць толькі майстры-слесары.

РАЗДЗЕЛ ПЯТЫ,

у якім дзеці нібы ўпершыню ўбачылі, што дзеецца вакол іх, а чытач нарэшце (таксама ўпершыню) убачыць, што такое ТВТ.

Аднаго разу пасля заняткаў у пятым класе затрымалася піянерскае звяно. Тут былі нашы знаёмыя Толя і Ніна Бяспалавы, Андрэй Гуліс, Паўлік Рагатка і Клава Макейчык ды яшчэ Яша Кантаровіч, Стась Кавальскі, Соня Данілава, Лёня Саковіч і Цыбук Бора.

Затрымаліся яны таму, што Паўлік стаў падрабязна расказваць аб сваіх прыгодах і пакутах, якія ён перацярпеў тады, калі спазніўся ў школу.

— Да чаго ж крыўдна робіцца,— казаў ён,— як успомню, што ўсё гэта здарылася праз такую дробязь, якую мы самі маглі выправіць.

— Ды і ў мяне падобная гісторыя была! — крыкнуў Яша.— У нас сапсаваўся электрычны прас. Спачатку ён доўга бунтаваў: то грэецца, то не, то грэецца, то не. А потым зусім перастаў награвацца. Агледзелі мы шнур — здаецца, цэлы. Прыйшлося мне несці прас да майстра. Той разабраў яго, паглядзеў і кажа: «Па-мойму, спраўны. Мусіць, шнур перарваўся. Трэба было прынесці і яго». Я пабег дахаты і прынёс шнур. Майстар разглядзеў яго — і таксама нічога не знайшоў. А потым памацаў вілку і кажа: «Глядзі, вось гэтая ножка адкруцілася». Узяў пальцамі і падкруціў яе. І больш нічога!

— А ведаеце што? — сказаў тады Андрэйка.— Мне таксама прыйшлося шмат перацярпець за тое, што я не здагадаўся разы са два шмаргануць напільнікам па ключы.

І пад агульны смех ён расказаў, як начаваў з парсючком і што ▪ гэтага выйшла.

Тады Стась расказаў, як у яго паляцелі ў лужыну ўсе кнігі і сшыткі разам ▪ партфелем, у якога адарвалася ручка.

— А прымацаваць ручку я мог бы і сам, не чакаючы, пакуль яна адарвецца,— прызнаўся Стась.

Адным словам, падобных выпадкаў знайшлося досыць у кожнага, і калі іх сабралі разам, то выйшла карціна, над якой дзеці сур'ёзна задумаліся. Яны нібы ўпершыню ўбачылі, што дзеецца вакол іх. Убачылі і самі здзівіліся.

— Выходзіць, што мы жывём у палоне ў рэчаў,— разважліва сказала Клава.— Выходзіць, што не мы імі кіруем, а яны намі. Якая-небудзь патэльня што захоча, тое і робіць, а ты толькі глядзі на яе ці кліч на дапамогу людзей.

— Яно сапраўды выходзіць, што мы нібы залежым ад розных хатніх рэчаў,— дадаў Паўлік.— Яны нас падводзяць на кожным кроку, а мы толькі церпім ды чакаем ад кагосьці дапамогі. А каб захацелі, то самі маглі б справіцца з імі.

— Тады трэба абвясціць ім вайну,— са смехам сказаў Бора Цыбук.

— А што ты думаеш? — сур'ёзна адказаў яму Паўлік.—

Зусім нядрэнна было б. Як толькі хто з іх пачне шкодзіць — зараз жа і паставіць яго на месца.

— Давайце тады складзём гурток,— прапанавала Клава,— і паабяцаем, што ўсе такія дробныя папраўкі будзем рабіць самі.

— Правільна! — падтрымаў яе Стась.— Гэта будзе зусім новы і цікавы гурток. Можна назваць яго гуртком «Хатніх тэхнікаў».

— Не, не! — пачуліся галасы.— Назва нецікавая!

— Калі ўжо мы збіраемся ваяваць,— сказаў Толя,— то лепш назваць гурток «Ваяўнічымі тэхнікамі».

— І не гурток,— крыкнуў Яша,— а таварыства. «Таварыства ваяўнічых тэхнікаў», або скарочана — «ТэВэТэ».

Гэтая назва спадабалася ўсім.

Нарэшце Толя ўнёс яшчэ адну прапанову:

— Кожнае таварыства мае правілы.

— Гэта называецца статутам,— паправіў Паўлік.

— Хай будзе статут,— згадзіўся Толя.— Трэба і нам скласці статут нашага таварыства.

Праз паўгадзіны на свет з'явіўся наступны дакумент:

СТАТУТ

Таварыства ваяўнічых тэхнікаў

Таварыства ваяўнічых тэхнікаў абвяшчае барацьбу за незалежнасць ад хатніх рэчаў.

Дзеля гэтага члены ТВТ абавязваюцца:

1. Сачыць і выконваць усе дробныя хатнія рамонты сваімі ўласнымі рукамі.

2. Калі хто з членаў чаго-небудзь сам зрабіць не зможа, то звяртаецца за дапамогай да сваіх таварышаў.

3. І толькі тады, калі і таварышы не змогуць дапамагчы,— член таварыства мае права звяртацца да платных майстроў.

Толя ўзлез на парту і зачытаў статут.

— Будзем галасаваць. Хто...


mbm
mbm
mbm
mbm
mbm
TBT
TBT
TBT
TBT
mbm



Але тут дошка пад яго нагамі асунулася (завеска не трымала), Толя пахіснуўся і ледзь паспеў саскочыць на падлогу.

— Ах, чорт! — вылаяўся ён, але зараз жа зноў звярнуўся да сваіх таварышаў: — Ну, дык хто за, прашу падняць рукі.

— Я! Я! Ды ўсе, няма чаго галасаваць! — адказалі рабяты, падняўшы рукі.

Адна толькі Клава не падняла рукі і неяк дзіўна пазірала на ўсіх.

— Ну, а ты што? — звярнуліся да яе.

— Слухайце, таварышы! Што ж гэта мы робім? — сказала яна нейкім строгім голасам.

— Не ведаеш, ці што? — засмяяліся таварышы.— Адкуль ты звалілася?

— А вось ці бачылі вы, як зваліўся Толя? — спыталася Клава.

— Вядома, бачылі. Але што з таго?

— А чаму ён зваліўся?

— Таму, што зямля прыцягнула,— пажартаваў Яша.

— Не, вы адкажыце сур'ёзна, чаму ён зваліўся? — настойвала Клава.

— Ну, дошка пасунулася,— адказаў Толя.

— А чаму яна пасунулася? — вяла сваю лінію Клава.

— Ды завеска адламалася,— сказала Ніна, якая стаяла ля гэтай парты.

— А мы самі маглі б яе прымацаваць? — насядала Клава.

— Дзіўная рэч,— прамовіў Андрэй.— Колькі часу я сам на гэтай парце сяджу, і ніколі ў галаву не прыходзіла ўзяць ды замацаваць гэтую завеску. Бо не я зламаў.

— А я вось цяпер ледзь не паляцеў, ды і то не здагадаўся, у чым справа,— прамовіў Толя, чухаючы патыліцу.— Вось да чаго не прывыклі мы думаць пра такія рэчы.

Паўлік некаторы час задумліва глядзеў на зламаную завеску, а потым павольна, нібы сам да сябе, сказаў:

— Цікавыя справы робяцца на свеце! Каб хто даў нам заданне прыбіць гэтую завеску, мы, пэўна, зрабілі б гэта ахвотна. А самім у галаву не прыходзіць, нават не бачым. І не толькі тут, але і дома мы не ўмеем бачыць. Я цяпер толькі

прыпомніў, што ў нас у чамадане таксама адарвалася адна палова завескі. Мы яго адчыняем, зачыняем і нібы чакаем, пакуль адарвецца другая палавінка. Сёння, як толькі прыйду дахаты, зараз жа прымацую гэтую завеску.

А ў выніку ўсёй гэтай гісторыі з завескай у статуце з'явіўся новы і вельмі важны пункт:

4. Дзейнасць ТВТ пашыраецца таксама і на школу.

Ну, а завеску паправіць ім было зусім лёгка. У той час ішоў яшчэ міма дырэктар і, пачуўшы стук, зайшоў у клас. Убачыўшы, што робяць вучні, ён так узрадаваўся, нібы яму пабудавалі новую школу.

— Вось дзе сапраўдныя савецкія вучні! — сказаў ён.— Каб усе ды заўсёды гэтак рабілі!

Вучням нават сорамна зрабілася: за такую дробязь ды гэтак хваляць. А дырэктар пасля таго стаў хваліць іх і перад іншымі вучнямі. Папракаючы за нешта шосты клас, ён казаў:

— У пятым класе вучні па сваёй ініцыятыве паправілі парту, а вы толькі псаваць умееце.

Першы крок Таварыства ваяўнічых тэхнікаў выйшаў вельмі ўдалым, і арганізатары мелі ўсе падставы ганарыцца сваёй выдумкай. Але расказаць аб гэтым у школе яны не адважыліся. Калі яны зробяць добрую справу, кожны скажа, што гэта добра. А калі даведаюцца, што для такой простай справы яны выдумалі нейкае Таварыства, статут, параграфы, то пэўна смяяцца будуць з іх. Лепш аб гэтым не казаць. Яно нават цікавей будзе.

РАЗДЗЕЛ ШОСТЫ,

дзе гаворыцца, як усе бацькі ахнулі і як Толя высунуў прапанову зрабіць «аптэчку» з малатка, напільніка, абцугоў і іншых «лякарстваў».

Соня адчула, што пасля дажджу ў яе робіцца мокрая панчоха на левай назе пад вялікім пальцам. Калі яна зняла дома чаравік і агледзела яго, то ўбачыла ледзь значную пратаптаную дзірачку.

Убачыла гэта і маці і, вядомая рэч, зараз жа сказала:

— Занясі ў рамонт.

Але Соня нерухома сядзела з чаравікам у руках і думала глыбокую думу. Вось і прыйшоў час, калі трэба выканаць абавязак члена ТВТ! І зусім яно не так цікава, як здавалася тады, калі складалі статут. Важдайся цяпер, калі можна занесці ў майстэрню і нічога не думаць.

— Чаго чакаеш? Нясі зараз жа,— паўтарыла маці.

— Я... не маю права,— прашаптала Соня.

— Што?! — перапытала маці, не ведаючы, як разумець гэтыя недарэчныя словы.

— Мы... я... павінна сама паправіць...

— Павінна?! Хто ж цябе прымушае?

— Мы далі абяцанне, што самі будзем рабіць падобныя рэчы,— з вінаватым выглядам сказала Соня.

— Хто ж гэта пастанавіў? — дапытвалася здзіўленая маці.

— Мы самі склалі такі гурток.

Маці ўсміхнулася:

— Ці не гурток будзе ладзіць табе бацінак? Ты ж сама не ўмееш.

— Ці сама, ці з дапамогай таварышаў, а зрабіць павінна,— сарамліва адказала Соня.

— Глупства нейкае прыдумалі! Відаць, няма чаго вам рабіць,— паціснула плячыма маці.— Ну, а хто будзе адказваць, калі вы яшчэ больш папсуеце?

— Калі мы не здолеем,— занясу ў майстэрню.

— Ну, рабі, як хочаш, толькі глядзі, каб усё было ў парадку,— сказала маці і адышла.

Соня з сумным выглядам засталася сядзець. Ну, як да яго прыступіцца? Ясна толькі, што трэба прыбіць латку. Але як гэта зрабіць, калі няма ні прыладаў, ні матэрыялаў, ні ўмельства?

Першым крокам на практычным шляху было пайсці параіцца з Нінай, якая ўжо мела вопыт у гэтай справе.

Ніна з вялікай ахвотай прыняла ўдзел, але зараз жа сама крыху збянтэжылася.

— Каб цвік загнуць, дык гэтая справа мне знаёмая. А тут іншая, новая работа. Але нішто, давай абмяркуем.

Пачалі абмяркоўваць. Перш за ўсё трэба было знайсці латку. Але дзе і як яе купіць, такую маленькую?

Ход думак прывёў да старога рванага чаравіка, падэшву якога можна скарыстаць. На гэтым і парашылі.

Другі пункт — малаток — вырашыўся вельмі проста: яго можна было дастаць і ў хаце Соні, і ў хаце Ніны.

Больш складанае было пытанне аб драўляных цвіках. Ці можна купіць некалькі дзесяткаў? А купляць дзеля такой дробязі цэлую пачку — не варта. Нарэшце ўсё ж такі вырашана было купіць пачку, бо спатрэбяцца ж цвікі і іншым членам ТВТ.

Далей стала на ўвесь рост пытанне пра шыла. Гэта ж найважнейшая шавецкая прылада! У каго яго пазычыш? Відаць, трэба і яго купіць.

— Я баюся,— сказала Соня,— што пры такіх умовах наш рамонт абыдзецца надта дорага і бацькі стануць супраць.

У гэты час прыйшоў Толя і зараз жа далучыўся да нарады.

— Як відаць,— сказаў ён,— нам прыйдзецца стварыць спецыяльную агульную «аптэчку», куды б уваходзілі важнейшыя інструменты: малаток, напільнік, шыла і гэтак далей. Паставім гэтае пытанне на нашай агульнай нарадзе.

— А вось яшчэ капылы патрэбны ў такой справе,— сказала Соня.

Толя задумаўся.

— Такога дабра можа набрацца цэлы воз,— прамовіў ён, нарэшце.— Тады ўжо не «аптэчка» будзе, а цэлая «аптэка». Не, без гэтага трэба абысціся, а ў дадзеным выпадку капылы і зусім непатрэбныя: маленькую латку і так прыбіць можна.

У той жа дзень Соня, схаваўшыся ад маткі, узялася за работу. Настрой яе зусім змяніўся: яна адчувала сябе ўпэўненай, вясёлай і ўзялася за справу з вялікай ахвотай і зацікаўленасцю.

Але праз некалькі хвілін увесь гэты ўздым згас. І галоўнай прычынай былі драўляныя цвікі, каб на іх ліха. Як ні стук-

неш па ім, ён абавязкова звернецца ці ў той, ці ў гэты бок. А калі трапіш яму акурат у галаву і яму няма куды падзецца,— тады ён возьме ды зломіцца.

Тады Соня надумалася спачатку папрактыкавацца. Узяла палена ды давай садзіць у яго цвікі. Знішчыўшы іх некалькі дзесяткаў, яна перайшла ўжо да сапраўднай работы. Справа пайшла крыху лепей, і нарэшце латка сяк-так была прылялана.

Падышла Ніна даведацца, як ідзе справа.

— Ну што ж,— сказала яна, агледзеўшы работу з выглядам знаўцы.— Для пачатку нішто. Але каб надзейней было, я параіла б увагнаць яшчэ некалькі жалезных цвікоў. А загнуць іх мы ўжо ўмеем.

І калі падмацавалі латку яшчэ жалезнымі цвікамі, тады рамонт выйшаў хоць куды. А абедзве дзяўчынкі адчулі такое задавальненне, якога шавец не адчувае, пашыўшы нават новыя боты.

Калі Соня паказала сваю работу матцы, дык тая вачам сваім не хацела верыць.

— Няўжо ж сама зрабіла? — паўтарала яна.

— Сама! — з сарамлівым гонарам адказвала Соня.

Калі прыйшоў бацька, маці прымусіла Соню падняць нагу, каб паказаць латку.

— Сама? — здзівіўся бацька.— Добра, вельмі добра!

Для цёткі Ганны таксама трэба было падняць нагу.

— Сама? — перапытала цётка.— Глядзі ты, якая!

Калі прыйшла суседка Кастусіха, Соня і перад ёй павінна была падняць нагу.

— Няўжо ж сама?! — здзівілася Кастусіха.— А-я-яй!..

Праз некаторы час ужо загаманілі аб гэтым у суседніх кватэрах.

— Здольная ў Данілавых дзяўчынка. Сама сабе абутак папраўляе. Не трэба насіць шаўцу.

— Сама?

— Сама...

Знайшлася катэгорыя грамадзян, якія нават пацярпелі ад гэтай справы. То былі суседскія дзеці вучнёўскага ўзросту.

— Глядзі, якая Соня! — папікалі ў адным доме.— Яна сама сабе чаравікі ладзіць, а ты нават гузіка не хочаш прышыць.

— Ах ты гультай! — крычалі ў другім доме.— У людзей дзяўчынка і то сама сабе чаравікі правіць, а ты, лодар, толькі драць умееш...

На другі дзень звяно ТВТ засталося ў школе, каб пагутарыць аб сваіх справах. Бо кожны ўжо меў пэўныя дасягненні і спяшаўся расказаць аб іх. Пачаўся шум, беспарадак.

— Чакай, братва! — крыкнуў Яша.— Нічога так не выйдзе. Трэба абраць старшыню і выслухаць даклады па парадку.

— Ну дык будзь старшынёй! — крыкнуў Андрэй.— Згодны?

— Згодны! Згодны! — закрычалі дзеці, і Яша прыступіў да выканання сваіх абавязкаў.

Выявілася, што за гэты час усе паспелі ўжо што-небудзь зрабіць. Самым жа цікавым было тое, што ўсе гэтыя дробныя факты зрабілі вялікае ўражанне на бацькоў і суседзяў.

У Стася Кавальскага даўно ўжо была адарвана вешалка ад паліто. Маці кожны дзень усё збіралася прышыць яе, ды так і не сабралася. І вось сёння сам Стась узяў ды і прышыў яе.

Убачыла маці — і ахнула. Сам! Сам прышыў! Хлопчык, ды сам прышыў! Вось малайчына!

І за тое, што Стась сам сабе прышыў вешалку, ён атрымаў яшчэ піроЖнае.

Лёня Саковіч загнаў клінок у стол, каб ён не рыпаў. І зноў жа колькі радасці было ў сям'і. Стол гэты даўно ўжо псаваў усім нервы. Ледзь дакранешся да яго, а ён — рып, рып... І вось Лёня сам узяў ды і направіў яго. Хіба не малайчына ён? І дзе ж вы знойдзеце яшчэ другога такога добрага і здольнага хлапца?

Падобную ж рэч зрабіла і Клава Макейчык, толькі іншым спосабам. У іх рыпалі дзверы, ды так прарэзліва, так жалобна, што аж за сэрца шчыпала. Так яны атручвалі жыццё шмат месяцаў, а цяпер Клава ўзяла ды змазала іх. І адразу ў іх до-

ме зрабілася так ціха, лагодна, нібы яны перасяліліся на другую кватэру.

Яша Кантаровіч ашчасліviў сям'ю тым, што замацаваў палову дзвярэй, якая не павінна адчыняцца. У дзірачку, што знаходзіцца ў парозе, набілася пяску, і засаўка туды не ўваходзіла. Ад гэтага было шмат непрыемнасцей: дзверы шчыльна не зачыняліся, ляпалі, час ад часу расчыняліся абедзве паловы. Калі Яша вычысціў дзірку і засунуў глыбока засаўку,— пайшла зусім іншая справа. І калі даведаліся, што гэта зрабіў сам Яша ды яшчэ па сваёй уласнай ініцыятыве, то хвалілі яго так, нібы ён немаведама што зрабіў.

Вельмі ўсцешыў і здзівіў бацькоў Толя Бяспалаў. У шуфлядах камоды даўно ўжо былі адарваны ручкі, і, каб адчыніць іх, патрабаваліся складанейшыя аперацыі. Спачатку карысталіся ключом, але праз некаторы час дзіркі ў камодзе так былі разварочаны, што ключу не было за што зачапіцца. Часта і ключы не трапляліся пад руку, тады пускалі ў ход усё, што толькі можна: нажы, відэльцы, нават качаргу.

Нарэшце ўмовіліся пакідаць самую ніжнюю шуфляду незасунутай. Тады, калі трэба было, напрыклад, адчыніць верхнюю шуфляду, ужывалася наступная сістэма: адчыніўшы ніжнюю шуфляду, высоўвалі з-пад споду наступную верхнюю, праз гэтую, таксама з-пад споду, высоўвалі наступную — і так да самай верхняй.

Можна цяпер уявіць сабе радасць сям'і, калі раптам у камоды з'явіліся ручкі, ды яшчэ якія: Паўлік узяў ды прымацаваў звычайныя электратэхнічныя ролікі.

Бацькі не ведалі, чым больш цешыцца: ці тым, што Толя наогул здагадаўся сам паправіць камоду, ці тым, што зрабіў гэта геніяльным спосабам.

Расхвалілі немаведама як і Паўліка за тое, што ён сам здагадаўся паправіць завеску ў чамадане.

Але, мусіць, самы геройскі ўчынак зрабіў Бора Цыбук.

Ён за пяць хвілін паправіў дах!

Ні больш, ні менш!

Той дах, з-за якога бацька некалькі разоў хадзіў у жакт, а там усё адкладвалі гэтую работу.

А Бора ўзяў ды і адрамантаваў яго за пяць хвілін...

Справа была такая. Над іхняй кватэрай дах быў жалезны. І вось калі дождж ці адліга — праз столь пачынала прасочвацца вада. Нельга сказаць, каб ужо вельмі, але мокрая пляма на столі заўсёды была. Потым пачала адвальвацца тынкоўка, а там пачало ўжо і капаць.

Вось Бора і пацікавіўся, ці не можа ён, як член ТВТ, штонебудзь сам зрабіць у гэтай справе?

Палез на дах, бачыць: у тым месцы, дзе лісты бляхі злучаюцца,— невялікая вузкая шчыліна. Пасядзеў над ёю, паглядзеў, падумаў, потым злез і вярнуўся... з кавалкам хлеба!

Калі пайшоў дождж, бацька зацікавіўся:

— Што гэта сёння не працякае?

— Ды Бора там нешта лазіў. Кажа, паправіў,— сказала маці.

— Няўжо? — звярнуўся бацька да Боры.

— Але,— адказаў той безуважна.

— Якім чынам?

— Хлебам,— спакойна адказаў Бора.

Бацька недаўменна пазіраў то на Бору, то на столь, то на маці.

— Там была шчыліна,— растлумачыў Бора,— дык я ўзяў ды і заляпіў яе мякішам хлеба.

— Ці надоўга хопіць твайго мякішу? — засмяяўся бацька.

— А калі трэба будзе, я зноў заляплю,— адказаў Бора.

Вось якія былі «даклады» на першым агульным сходзе Таварыства ваяўнічых тэхнікаў. Колькі было смеху! Колькі зацікаўленасці і ахвоты да далейшых «подзвігаў»!

— Калі сур'ёзней паглядзець на гэтую справу,— сказаў Толя,— то нават сорамна робіцца. Жартуючы, мы зрабілі некалькі драбнюткіх спраў, а ўсе навокала глядзяць на нас, як на герояў. А чаму? Таму толькі, што да гэтага часу ніхто ў гэты бок не глядзеў.

Пасля таго Толя прапанаваў зрабіць «аптэчку», як ён казаў. Тут доўга гаварыць не даводзілася, бо кожны адчуваў, што яна патрэбна да зарэзу.

Нарэшце Яша паставіў пытанне, каб наладзіць улік працы.

— Усім нам цікава будзе ведаць,— сказаў ён,— колькі чаго зрабіў кожны з нас і ўсе мы разам. Будзе таксама відаць, хто больш актыўны, хто менш. Можна будзе наладзіць спаборніцтва.

Супраць гэтага ніхто не пярэчыў. Запіс весці даручылі Клаве і Яшу.

Разыходзіліся рабяты з такім пачуццём, з якім, мусіць, паляўнікі ідуць на паляванне.

Не паспелі яшчэ выйсці з класа, як Цыбук кінуўся ў кут і крыкнуў:

— Ёсць!

У куце стаялі геаграфічныя карты. На адной з іх была парваная вяроўка, што звязвае канцы палкі для таго, каб вешаць карту.

Цыбук звязаў вяроўку і сказаў Клаве:

— Запішы!

— Не, гэта не лічыцца! — запярэчыў Лёня.— Гэта не работа, а дробязь.

Яго падтрымаў і Андрэй. Яша выступіў супраць — і пачалася гарачая дыскусія.

— У статуце,— казаў Яша,— у пункце першым, гаворыцца пра ўсе дробныя работы, абы толькі яны былі карысныя. Вешалку Стасю мы залічылі, ніхто не пярэчыў. А тут таксама вешалка.

— А калі гэта такая ўжо дробязь, дык чаму ж ты сам не зрабіў? — насядаў Цыбук на Лёню.

— Я не заўважыў,— адказаў той.

— Ну вось бачыш! — сказала яму Клава.— А ў нашай справе самае галоўнае — умець заўважаць. Звязаць вяроўку кожны здолее, а заўважыць не кожны.

Лёня зірнуў туды, сюды, а потым падбег да акна і стаў яго адчыняць.

Пачуўся страшэнны скрогат: гэта скрыгатала за акном задраная ўверх бляха. Лёня стаў адгінаць гэтую бляху ўніз. Потым ціха зачыніў акно.

— У такім разе залічыце мне гэтую работу,— сказаў ён насмешліва.

Усё гэта адбылося так раптоўна і неспадзявана, што некаторы час усе маўчалі. Потым Толя сказаў:

— І трэба залічыць, бо работа карысная. І рама псавалася, і бляха адламвалася, і вада падцякала.

— У такім разе я вам кожны дзень мільён такіх работ зраблю! — весела крыкнуў Лёня.— Паспявайце толькі запісваць.

— Пастараемся,— адказала Клава.

Хоць яна толькі што навучала Лёню: «самае галоўнае — умець заўважаць», але цяпер шчыра прызналася, што яна, мусіць, ніколі не заўважыла б гэтае бляхі.

Быў яшчэ адзін чалавек, на якога сённяшні дзень зрабіў вялікае ўражанне. Гэта Бора Цыбук. Маленькі круглы хлопчык, з вострым носікам і вочкамі, як у вожыка, лічыўся ў піянератрадзе пасіўным грамадзянінам. Калі якая гульня, то ён быў вельмі актыўны, а калі трэба было выканаць якое-небудзь заданне атрада, то стараўся ўхіліцца ад яго. У ТВТ ён увайшоў без ніякай цікавасці, за кампанію, і мала думаў аб гэтай справе.

А цяпер яго захапіла. Тут была гульня зусім новая, незвычайная. Глядзі ты, як Лёня заўважыў бляху! Мусіць, такіх спраў навокала ёсць многа, ды ніхто не бачыць. А калі цяпер запісваюць ды вядуць улік, то ён, Бора, набярэ столькі ачкоў, што ўсіх перакрые. Ён ужо цяпер бачыць, што фортка таго акна, якое адчыняў Лёня, не мае прабойчыка і не зашчэплена на кручок; але аб гэтым ён нікому не скажа, пакуль не зробіць з цвіка прабойчык. Цікавая гульня!

РАЗДЗЕЛ СЁМЫ,

пра тое, як Паўлік выкручваў усё, што выкручваецца, Ніна пускала бурбалкі, а ўвесь свет падзяліўся на дзве часткі.

Прайшло, мусіць, тыдні са тры з таго часу, як у хаце Паўліка згасла электрычнасць і адбыліся вядомыя нам жудасныя падзеі.

І вось аднаго разу, у цьмяны дзень, маці захацела запаліць лямпку ў сталовай,— і яна не запалілася.

— Зноў гэта самае няшчасце! — з жахам усклікнула маці.

— Нічога! — з важнасцю супакоіў Паўлік.— Цяпер ужо мы і самі наладзім.

— Няўжо? — узрадавалася маці, але зараз жа безнадзейна дадала: — Дзе табе справіцца...

— А вось паглядзім! — упэўнена сказаў Паўлік і падышоў да лічыльніка.

Выкруціў адну пробку — цэлая. Выкруціў другую — таксама цэлая!

— Мусіць, лямпачка перагарэла,— сказаў Паўлік і выкруціў лямпачку.

Агледзеў яе,— здаецца, усё ў парадку.

— Току з электрастанцыі няма! — аўтарытэтна заключыў ён нарэшце.— Прыйдзецца пачакаць.

— А можа, гэтая гарыць? — сказала маці і ўключыла лямпку ў другім пакоі.

Лямпачка загарэлася!..

Паўлік збіўся з панталыку. Што за дзіва такое? Лямпка цэлая, а не гарыць! Ану, калі паспрабаваць, ці будзе яна гарэць у другім патроне?

Выкруціў другую лямпку і ўкруціў на яе месца гэтую. Лямпка засвяцілася.

Значыцца, не яна папсавалася. І не пробкі. А што ж тады? Паўлік напружана стаў думаць.

— Нічога не зробіш,— уздыхнула маці.— Прыйдзецца зноў выклікаць манцёра.

— Не! — катэгарычна сказаў Паўлік.— Я сам папраўлю.

Сказаў і спалохаўся: ці выканае абяцанне? Як распазнаць, дзе папсавалася? Пэўна хіба ў патроне.

І пачаў адкручваць у патроне ўсё тое, што можна адкруціць. Спачатку адкруцілася фарфоравае кальцо. Потым падалася медная шыйка. Застаўся фарфоравы кружочак; у ім дзірачкі, пласцінкі, трубкі і яшчэ адна медная шыйка з вінтавым нарэзам.

Ну і што цяпер з імі рабіць?

— Ой, намайструеш ты так, што яшчэ горай будзе! — казала маці.— Усё роўна прыйдзецца клікаць манцёра.

— Не, паправім самі! — упарта паўтараў Паўлік, а ў самога аж сэрца сціснулася ад сумнення. Што ж цяпер рабіць? Як пазнаць, ці ў парадку патрон, ці не?

«Ну, калі на тое пайшло, дык буду разбіраць усё, што разбіраецца! — падумаў ён у адчаі.— Можа, натраплю на штонебудзь».

І сапраўды натрапіў, ды так, што кулём паляцеў уніз.

— Ай-ай! Асцярожна! Што з табою? — крыкнула маці.

— Паслізнуўся трохі,— адказаў Паўлік.

А ён зусім не паслізнуўся, а трапіў пад ток. Толькі яму сорамна было казаць гэта матцы, ды яшчэ ён баяўся, што маці забароніць яму наогул займацца гэтай справай і давесці яе да канца.

А да якога канца — ён і сам ужо не ведаў.

Адно толькі ён здагадаўся зрабіць — выкруціць пробкі, каб зусім выключыць ток. А тады пачаў разбіраць патрон далей.

Тут ён адчуў, што апошняя надзея яго пакідае. Каб яшчэ спакойна гэта рабіць, без спеху і без адказнасці, тады, можа, ён і разабраўся б у гэтай тэхніцы. А так, мусіць, нічога не выйдзе.

Ён кінуў работу і пабег да Андрэя.

— Ты ведаеш, як зроблены патрон для электрычнай лямпкі і як яго праверыць? — спытаўся Паўлік, засопшыся.

— Не,— адказаў Андрэй.

— Усё роўна, бяжым да мяне, памажы! Па дарозе возьмем яшчэ Яшу.

Яша сказаў, што разбіраць патрон яму здаралася, але так сабе, дзеля забавы, а як праверыць і паправіць яго — ён не ведае.

— Але ўсё роўна мы абавязаны гэта зрабіць! — сказаў ён рашуча.

А тым часам вярнуўся дадому Паўлікаў бацька. Надыходзіў змрок. Бацька хацеў быў запаліць лямпку ў сваім пакоі, але... цяпер і яна ўжо не загарэлася.

— Што гэта? — устрывожыўся бацька.— Ці не папсавалася зноў?

— Папсавалася, ды толькі адна лямпка ў сталовай,— адказала маці.— Але Паўлік захацеў сам паправіць яе і вось, як відаць, усё папсаваў.

— Я яму дам! — раззлаваўся бацька.— Ах, шкоднік паганы!

— І я казала яму: не лезь, трэба паклікаць манцёра. А ён, бач, што нарабіў.

Калі Паўлік [redacted] таварышамі падыходзіў да дома, там чакала яго вялікая бура. Але ад першага ўдару грому яго выратавалі два громаадводы, Яша і Андрэй: бацька не захацеў у іх прысутнасці ваяваць.

А за гэты час Паўлік паспеў успомніць, што пробкі выкручаныя, і ўкруціў іх зноў.

Праменні святла адразу сцішылі гнеў бацькоў, і навальніца скончылася ўсяго толькі катэгарычным загадам:

— Заўтра паклічаш манцёра, а сам і не думай чапаць электрычнасць, а то...

Гэтае «а то» было сказана так грозна і выразна, што нават громаадводы спалохаліся. Хлопцы засталіся ў цёмнай сталовай і пачалі раіцца.

Становішча стварылася вельмі крытычнае. Па-першае, у цемры немагчыма было нічога рабіць, па-другое, гэта было і забаронена, па-трэцяе, заўтра пагражаў прыйсці манцёр і сарваць усю справу.

— Гэта будзе вялікім прарывам на нашым фронце,— сумна сказаў Яша.

— Гэтага нельга дапусціць ні ў якім разе! — крыкнуў Андрэй.

— Застаецца толькі адно,— сказаў Паўлік,— рызыкнуць і зрабіць нелегальна. Бацька прыходзіць а пятай гадзіне, а мы вольныя ад паловы другой.

— А як маці?

— Маму мы сяк-так улагодзім. Ды і яна будзе занятая сваімі справамі.

— А што калі не ўдасца? — прамовіў Яша.

— Ну, тады мне прыйдзецца пацярпець,— усміхнуўся Паўлік.

— Справа наша важней, за яе варта і пацярпець,— суцешыў Андрэй.

— Слухайце! — усхапіўся Яша.— У мяне ёсць лішні патрон. Пойдзем да мяне і вывучым яго дасканала. Тады заўтра мігам справімся.

— Правільна! Бяжым зараз! — узрадаваліся хлопцы.

Назаўтра таварышы прыйшлі да Паўліка з кнігамі, нібы займацца, і размясціліся за сталом над разабраным патронам.

— Ці прыйдзе манцёр? — спыталася маці.

— Не ведаю... Можа, сёння не будзе... Я...— пачаў мармытаць Паўлік, але, на яго шчасце, у кухні «пабег» гаршчок, і маці кінулася ратаваць яго.

Цяпер ужо хлопцам хапіла і пяці мінут, каб пераканацца, што патрон у спраўнасці, і за гэты час сабраць яго.

Але справа ад гэтага ніколькі не палепшылася: лямпачка ўсё роўна не гарэла.

Трывога ахапіла хлапцоў. Гэта ж скандал, калі яны правалянцца!

Гэта ж ганьба для ўсяго ТВТ!

— Трэба прасачыць усю лінію ад лічыльніка да лямпкі,— гарачыўся Андрэй.— Недзе нешта ды павінна быць!

І калі яны пайшлі па лініі, дык недзе ў калідоры сапраўды напаткалі нешта: гэта была размеркавальная каробка, адкуль разыходзіліся два правады.

— Больш нідзе не можа быць, як тут,— парашылі хлопцы.

Маці ўбачыла, што яны шныраць каля электрычнасці, і незадаволена забурчала:

— Зноў хочаце папсаваць, майстры? Не, лепш ужо не чапайце.

— Ды не, мы так сабе,— пачаў угаворваць Паўлік.— Мы толькі хочам паглядзець, а чапаць не будзем.

І, скарыстаўшы момант, яны дабраліся да каробкі. Там яны ўбачылі, што кончык аднаго провада на валасінку высунуўся з гнязда.

Яны ўсунулі канец провада — лямпка загарэлася.

— О! — крыкнулі ўсе тры хлопцы разам, як у падобных выпадках выкрыкваюць усе людзі на свеце.

Паўлік паклікаў маці, цырымонна раскланяўся, развёў рукамі і сказаў:

— Калі ласка, мадам,— рамонт зроблены!

Маці паглядзела, і лагодная ўсмешка асвятліла яе твар.

— Вось вы якія! — сказала яна.— Ніколі не думала. Каб ды заўсёды гэтак было...

— Цяпер ужо заўсёды так будзе! — адказаў Яша.— На тое ёсць ТВТ.

— Што? — перапытала маці.

— Таварыства ваяўнічых тэхнікаў,— растлумачыў Андрэй.

— Усё ваяўнічыя ды ваяўнічыя,— прамовіла маці.— Але хай сабе і так, абы добра было.

Калі яны засталіся адны, Яша спытаў Паўліка:

— А якім чынам ты трапіў пад ток, калі лямпка не гарэла? Току ж не было.

Паўлік паглядзеў на яго і задумаўся.

— Праўда! — прамовіў ён нарэшце.— Якім чынам?

— А можа, табе здалося? — звярнуўся да яго Андрэй.

— Дзе там здалося! — адказаў Паўлік.— Так тузанула, аж паляцеў.

Вось загадка! Меркавалі, меркавалі і здагадаліся толькі тады, калі Паўлік выпадкова ўспомніў, што гэтая лямпка і раней некалькі разоў гасла і сама запальвалася. Значыцца, той кончык провада, мусіць, ад страсення сам то дакранаўся, то адсоўваўся ад другога провада. І Паўлік трапіў акурат пад той момант, калі кончык злучыўся. Хлапцам аж палягчэла, калі яны разгадалі гэтую загадку.

Назаўтра наша тройка доўга расказвала сваім таварышам, у якім пераплёце яны апынуліся і як выратавалі гонар ТВТ.

— Запішыце мне восем ачкоў! — падышоў да Яшы Бора Цыбук.

— Восем?! — здзівіліся ўсе.

— Але, восем. Першае — я склеіў пабіты кубак. Другое — паправіў спражку ў поясе. Трэцяе — прыбіў у плоце дошчачку. Чацвёртае — паправіў табурэтку. Пятае — паправіў вешалку для адзення. Шостае — забіў цвік у сценку. Сёмае — падклеіў да «Прыродазнаўства» цвёрдую вокладку. Восьмае — зрабіў прабойчык вунь у гэтай фортачцы. Ну, што? — з выглядам пераможцы зірнуў на ўсіх Бора.

— Ну, браток,— сказаў Яша,— ты столькі драбязы набярэш, што на аднаго цябе сшытка не хопіць.

— Драбязы? — абурыўся Цыбук.— А ты ж сам казаў, што па закону кожная драбяза лічыцца!

— Ціха, ціха, супакойся! — засмяяўся Яша.— Гані, колькі хочаш. Калі будзе надта многа, будзем адзначаць крыжыкамі.

Рэшта сяброў мела таксама нямала «ачкоў». Стась набраў чатыры, Клава — два, Лёня — шэсць, Соня — тры і гэтак далей. Толькі Ніна мела адно ачко, але яно было найбольш цікавае.

У іх сапсаваўся прымус. Нічога ▪ ім не здарылася, нішто не паламалася, але з яго ўвесь час «выходзіў дух». І выходзіў так павольна, што ніяк нельга было распазнаць — адкуль.

Нарэшце, калі Толі дома не было, маці выліла з прымуса газу і загадала Ніне аднесці яго да майстра. Узяла Ніна ў рукі прымус, тупае на месцы.

— Ну, чаго ты? — кажа маці.— Нясі!

— Я... мы... самі паправім,— прамовіла Ніна.

Маці паглядзела на яе, як на дурную, а потым шчыра рассмяялася:

— Ты сама паправіш прымус?! Ну-ну, паспрабуй! Але сёння ўсё ж такі занясі да майстра.

Ніна сама нават і не думала папраўляць прымус. Дзе там было брацца ёй за такую справу? Яна павінна была толькі выканаць «закон ТВТ». Пачакае брата, пораіцца з ім. Потым яны параяцца з іншымі таварышамі, а тады ўжо аднясуць майстру.

Але Толя ўсё не ідзе. Зараз маці пагоніць, каб яна несла. Цікава было б усё ж такі ведаць, адкуль гэта ідзе дух? На-

качала паветра, прыслухалася — нічога не чуваць. Якім жа чынам майстар распазнае, адкуль выходзіць паветра?

Маці выйшла з кухні. Побач стаіць таз з вадою. Ці не апусціць прымус у ваду? Тады будуць відаць бурбалкі.

Апусціла — і сапраўды ўбачыла, што маленькія бурбалкі павольна ідуць з таго месца, куды ўліваецца газа. Але што з таго? Усё роўна паправіць Ніна не можа.

Выняла прымус з вады, адкруціла кружочак-накрыўку, глядзіць — пад ёй круглы кавалак скуры, але зусім пацёрты, падраны.— Гэта ж ён не прыціскаецца шчыльна і прапускае паветра!

Мігам выразала кавалачак скуры ад старога бацінка, зрабіла кружочак, уставіла, зноў паспрабавала ў вадзе — бурбалак няма!

Ніна аж закрычала ад радасці.

Калі прыйшла маці, Ніна з гонарам падала папраўлены ёю самою прымус.

Тут пачаліся такія ўрачыстасці, што хоць ты з дому ўцякай.

Дзяўчынка ды прымус паправіла! Сама! Якое шчасце для бацькоў мець такую геніяльную дачку! Дзе гэта відана, каб дзяўчынкі прымусы папраўлялі?

А калі прыйшоў Толя, дык яму жыцця не давалі, папікаючы сястрой.

Тады ён раззлаваўся, узяў ды зацыраваў сам сабе панчошку.

Эфект выйшаў надзвычайны. Бацькі зусім збіліся з панталыку. Што ж гэта робіцца ў іх доме? Дачка прымусы папраўляе, а сын панчохі цыруе! Увесь свет прайдзі, такога не ўбачыш.

Загаманіў і свет, у які ўваходзілі тры суседнія двары, і падзяліўся на дзве часткі.

— Вось гэта я разумею! — казалі ў адной частцы свету.— Цяперашняя моладзь не будзе такой бездапаможнай, як мы. Усё сама зробіць.

А ў другой частцы свету чуліся інакшыя галасы:

— Ну, калі мужчыны пачнуць панчохі цыраваць ды кашулі латаць, а жанчыны прымусы ды боты папраўляць,—

тады парадку не будзе. Спрадвеку кожны займаўся сваёю справай.

Трэба толькі адзначыць, што ў гэтай другой частцы свету налічвалася вельмі мала народу.

РАЗДЗЕЛ ВОСЬМЫ,

у якім гаворыцца, як з Соняй здарылася бяда, Цыбук зацікавіў настаўніка, а бацінак разявіў рот.

Прайшло дзён дзесяць — і ў сакратарыяце ТВТ запоўніўся ачкамі ўвесь сшытак.

— Дзейнасць ТВТ разгортваецца паспяхова,— казалі адказныя сакратары Клава і Яша, пачынаючы новы сшытак.

Па колькасці ачкоў наперадзе ішоў Бора Цыбук, ён выгнаў трыццаць восем ачкоў. Але па якасці ачкі Толі і Паўліка былі значнейшымі, хоць у іх абодвух разам не было трыццаці васьмі. А ўсе члены ТВТ агулам мелі за гэты перыяд сто дваццаць дзевяць ачкоў. З іх адзінаццаць прыпадала на школу, а рэшта на свае хаты.

Сярод хатніх ачкоў досыць цікавым было здарэнне са Стасем Кавальскім. Ён узяўся пачысціць гадзіннік-ходзікі, якія зусім спыніліся, відаць, ад пылу.

Бацькі членаў ТВТ за гэты час ужо прызвычаіліся, што іхнія дзеці ўсё могуць самі зрабіць. Таму Стасю не перашкаджалі.

Разабраў Стась гадзіннік, пачысціў, змазаў, а калі пачаў складаць яго, дык заблытаўся і не мог скончыць.

І нацярпеўся ж страху бедны хлапец! Але на тое і існавала ТВТ, каб выратоўваць сваіх сяброў з такіх становішчаў.

Андрэйка зараз жа зняў са сцяны свае ходзікі і панёс іх да Стася. Тут ужо, гледзячы на складзены гадзіннік, скончыць работу было няцяжка.

Больш за ўсё было пацехі, калі хлопчык рабіў «дзявоцкую» работу, а дзяўчынка «хлапецкую». Тут ужо сапраўды адбывалася «культурная рэвалюцыя», як казалі нашы рабяты. І калі Лёня ішоў па двары, дык суседзі паказвалі на яго пальцамі і казалі сваім дзецям:

— Бачыце гэтага хлапца? Ён сам сабе латае штаны, не турбуючы маткі. Добры, здольны хлапчук!

А на Клаву казалі:

— Гэтая дзяўчынка ўсё можа зрабіць. Яна і нажы вострыць, і табурэтку паправіць. Залатая дзяўчынка!

А бацькі, дык тыя проста нацешыцца не маглі з сваіх дзяцей.

— І адкуль усё гэта ўзялося? — казалі яны.— Часам сам нічога не ведаеш і не заўважаеш, а яно зірне, адразу знойдзе якую хібу і тут жа паправіць.

Нашы героі толькі ўсміхаліся, слухаючы ўсе гэтыя пахвалы. Вядома, кожнаму прыемна, калі яго хваляць, прыемна ведаць, што ты прыносіш карысць. Але тут, апрача ўсяго гэтага, вельмі цікава было здабываць «ачкі», або, як яны казалі, «паляваць» на іх. А колькі сёння ўдасца «злавіць»? А што прынясе «ў залік» яго таварыш? А колькі набярэцца за тыдзень, за месяц, за год? Дзе ні павернецца такі «паляўнік», ён ужо глядзіць на ўсё зусім іншым вокам.

Колькі часу, скажам, жыла Ніна ў сваёй кватэры і ніколі не ведала, што ў яе пад нагамі з падлогі трошкі высунулася плешка цвіка. Не ведаў гэтага і ніхто ў хаце, нават маці, якая, мыючы падлогу, не раз псавала аб гэты цвік шчотку ці анучку. А цяпер Ніна ўбачыла яго, прыстукнула — і падлога зрабілася гладкай.

Зірне такі «тэвэтэтавец» на шафу, а ў ёй дзверцы ўсё хочуць самі расчыніцца. Прымацуе якую скурку — і ўжо ўсё ў парадку.

Але трапілася і такое «ачко», якога нават уся арганізацыя ТВТ не магла ўзяць.

Убачыўшы, што дзеці так добра спраўляюцца з рознымі рамонтамі, Толева маці падсунула ім і дзіравы чайнік.

— Дзірачка зусім маленечкая,— казала маці.— Можа, вы здолееце запаяць?

— Наўрад,— адказаў Толя.— І паяльніка не маем, і як гэта робіцца, не ведаем.

— А вы паспрабуйце ўсёй сваёй кампаніяй.

Але і «ўся кампанія» не магла дапамагчы.

— Гэта работа падлягае § 3 статута ТВТ,— пастанавілі таварышы.— Але бліжэйшай нашай задачай будзем лічыць набыццё паяльніка і авалоданне тэхнікай паяння.

Калі ў дадзеным выпадку ТВТ павінна было толькі адступіць, дык у наступным яно пацярпела страшнае паражэнне.

Соня захацела памыць сабе бялізну. Што можна сказаць супраць гэтага? Палегчыць працу бацькоў — найважнейшы абавязак члена ТВТ.

Каб работа была дабраякаснай, Соня ўзяла хлоркі і распусціла ў вадзе. Зноў жа нічога асаблівага: маці заўсёды карыстаецца хлоркай, дзеля гэтага і прадаецца яна ў аптэках.

Памыла, павесіла сушыцца і тады толькі пахвалілася перад маткай сваёй работай.

— Добра, дачушка, вельмі добра! — расчулілася маці.

А калі бялізна высахла, то разлезлася на кавалкі!

Тады толькі выявілася, што гэта зрабіла хлорка.

— Яе ж трэба спачатку варыць,— крычала маці,— пакуль вада не зробіцца ружовай! Потым працадзіць і тады толькі ўліваць у ваду, ды і то калі паласкаць ужо трэба. Чаму ж ты не спыталася? Усё сама ды сама!

Гэтае здарэнне зрабіла моцнае ўражанне на ўсю арганізацыю ТВТ.

— І я гэтага не ведала, і я магла гэтаксама зрабіць! — сказала Ніна.

Ды і ўсе астатнія, апрача Клавы, не ведалі гэтага сакрэту.

— Хто б мог падумаць,— разважаў Яша,— што на самым другарадным участку мы пацерпім такое паражэнне? Але на памылках мы павінны вучыцца.

Пасля такога выпадку члены ТВТ зрабіліся больш асцярожнымі. Але, на шчасце, у іхняй практыцы больш няўдач не было.

Праз некаторы час нашы «паляўнікі» пачалі заўважаць, што ў хаце не хапае «здабычы».

Тады ўжо ўвага іх больш накіравалася на школу. А тут здабычы было колькі хочаш, бо заўсёды знаходзіцца больш ахвотнікаў пладзіць яе, як знішчаць.

Кіраўнікі школы яшчэ раней звярнулі ўвагу, што некаторыя вучні — Цыбук, Рагатка, Макейчык, Кантаровіч і яшчэ некалькі чалавек — неяк больш уважліва і свядома, чым іншыя, ставяцца да школьнай маёмасці. Яны не толькі нічога не псавалі, але дзе толькі заўважалі што якое, дык зараз жа самі і папраўлялі.

Калі не ў парадку якая-небудзь навучальная прылада, то ці Кавальскі, ці Бяспалаў, ці Саковіч навыперадкі біруцца паправіць яе.

Калі каму-небудзь з іх трапіць бібліятэчная кніга з адарваным лістком, дык яны абавязкова яго ўклеяць.

Калі ў раздзявальні вываліцца калок ад вешалкі, то хто-небудзь з памянёных вучняў абавязкова ўсадзіць яго на месца.

На школьным двары, каля дзвярэй, пасля дажджу доўга заставалася лужына. Усім трэба было і так і гэтак перабірацца цераз яе, не раз траплялі нагой у ваду. А трошкі далей ляжала цэгла. Палажыць у лужыну цагліну здагадаўся толькі Кавальскі.

Вялікае ўражанне не толькі на кіраўнікоў, але і на ўсіх вучняў зрабіў учынак Андрэя Гуліса. Нейкім чынам у сцяне класа выкрышыўся кавалак тынку. Дзірка была невялікая, і ніхто не звяртаў на яе ўвагі. Але пры кожным страсенні вапна асыпалася і дзірка ўсё павялічвалася. І вось Андрэй захапіў недзе ў паперку разведзенай вапны, прынёс у клас і заляпіў гэтую дзірку.

Гэта было дасканалае ачко! Усе тэвэтэтаўцы зайздросцілі Андрэйку. Ды і ўсе іншыя вучні глядзелі на гэта са здзіўленнем і пашанай.

— Свядомыя вучні! — цешыліся настаўнікі.

Мы ўжо казалі, што нашы героі не гаварылі ў школе аб сваім таварыстве. Што ні кажы, а ёсць такі «недахоп» у дзяцей — любяць яны мець сваю «тайну». Хіба не цікава, калі на цябе глядзяць, дзівяцца тваім учынкам і не ведаюць, што ты не абы-які чалавек, а «тэвэтэтавец»? Але праз некаторы час здарыўся выпадак, які прывёў да выкрыцця тайны і да такіх змен, аб якіх ніхто з тэвэтэтаўцаў нават не думаў. І ўсё гэта праз Цыбука.

Буян Карачун, дурэючы, адарваў палку, да якой была прымацавана табліца метрычных мер. Аб гэтым зараз жа даведаўся дзяжурны настаўнік і загадаў Карачуну паправіць табліцу.

— Ды гэта зусім не я! — пачаў адмаўляцца Карачун.— Я яе і не чапаў. Усе бачылі.

— Ён! Ён! — пачуліся галасы.

— Нічога падобнага! Гэта яны са злосці на мяне!..

Пачаўся шум.

Настаўнік, нарэшце, зноў катэгарычна загадаў Карачуну паправіць табліцу.

Тады падышоў Цыбук і кажа:

— Дайце я папраўлю!

Карачун скарыстаў гэта і крыкнуў:

— Я ж казаў, што не я! Гэта ён!

Цыбук вылупіў вочы ад здзіўлення.

— Зусім не я! — сказаў ён.

— А чаму ж ты бярэшся правіць? — крыкнуў яму Ярошка, прыяцель Карачуна.

— Гэта Цыбук! — настойваў Карачун.— Усе бачылі!

— Не, гэта Карачун! — закрычалі навокала.— Цыбука нават тут не было!

Настаўнік паглядзеў з дакорам на Карачуна і паківаў галавой:

— Няўжо ты канчаткова страціў сорам?

— Сапраўды не я! — плаксівым голасам залямантаваў Карачун.— Ён жа сам і паправіць хоча.

Настаўнік не ведаў, што і думаць. Паглядзеў на Цыбука і сказаў:

— А можа, і сапраўды ты? Тады кажы.

— Ды не! — з абурэннем адказаў Цыбук.

— Чаму ж тады бярэшся правіць?

— Ці не ўсё роўна, хто паправіць? — сказаў Цыбук.— Пакуль ідзе гэты разбор, можна было і паправіць.

Настаўнік пацiснуў плячыма і выйшаў.

У настаўніцкай ён расказаў аб гэтым здарэнні, і ўсе настаўнікі доўга ламалі галаву, што б гэта магло значыць? Па ўсяму было відаць, што зрабіў гэта не Цыбук. А чаму ж тады ён узяў-

ся правіць? Ды яшчэ замест Карачуна, які на яго ж хацеў узвесці паклёп.

Пакуль што справа засталася нявысветленай. Але ненадоўга.

...Андрэй Гуліс і Бора Цыбук вярталіся дахаты. Па дарозе ім трэба было ісці каля вялікай новабудоўлі, абгароджанай высокім плотам. Каля плота быў зроблены часовы драўляны тратуар, або, лепш сказаць, масткі. На калодках былі прыбіты дошкі, і калі па іх ішлі, то яны выгіналіся і калыхаліся. Ад гэтага выгінання ў дошках адбыліся некаторыя змены, што прывяло да незвычайных падзей, у якіх давялося прыняць удзел і Барысу з Андрэем.

Пачалося з таго, што насустрач бег хлапчук, зачапіўся за нешта і бразнуўся на дошкі. Хлопцы засмяяліся. Хлапчук падняўся на ногі, злосна зірнуў на іх і, крыкнуўшы: «Чаго рагочаце?», пабег далей. Тады нашы хлопцы заўважылі, што з дошкі вытыркаецца вялікі цвік. У гэты момант адзін дзядзька так садануў яго наском бацінка, што заскакаў на адной назе і ледзь-ледзь не зваліўся. Падняў нагу, паглядзеў — і злосна вылаяўся:

— Чорт ведае што такое!

Пры чым тут быў чорт — невядома, але факт быў прыкры: падэшва адарвалася і бацінак разявіў рот.

Прыпыніліся некалькі прахожых і пашкадавалі бацінак.

— Трэ было б забіць гэты цвік,— сказаў Андрэй.

— Пачакаем крыху,— стрымаў яго Цыбук.— Цікава!

І хлопцы засталіся глядзець далей.

Вядома, не кожны чалавек трапляў на цвік.

Калі ж на мастках засталася толькі адна бабулька з кошыкам у руках, то хлопцы зусім страцілі цікавасць і пачалі шукаць каменя, каб убіць ім цвік.

Тым часам з другога боку набліжаўся чалавек. Гэта быў хлапец гадоў дваццаці, і крочыў ён з такой хуткасцю, якой хапіла б не толькі, каб адарваць падэшву, але нават і нагу.

Не паспелі Андрэйка з Борам знайсці камень, як хлапец ужо трапіў на цвік і рынуўся носам наперад так, што збіў з ног жанчыну з кошыкам, а пад ногі Андрэя пасыпаліся яйкі.

Хлопчыкі падрыхтаваліся былі смяяцца, але ўбачылі, што справа выйшла не смешная, а прыкрая.

Бабулька загаласіла на ўсю вуліцу; нейкі чалавек затрымаў хлапца, патрабуючы плату за яйкі; той даказваў, што ён не вінаваты; вакол іх сабраліся разявакі, потым падышоў міліцыянер...

— Вось што нарабіў пракляты цвік! — злосна сказаў Цыбук.

— І мы самі вінаватыя,— адказаў яму Андрэй.— Каб мы не чакалі ды адразу ўвагналі яго, то нічога гэтага не было б.

І хлопчыкі сапраўды адчулі сябе вінаватымі. Сапраўды, не было б гэтай бяды, каб яны адразу прыбілі ці загнулі цвік. І, не чакаючы, чым скончыцца ўся справа, яны закалацілі яго каменем.

Сярод мітусні ніхто не заўважыў, што нейкія два хлапчукі зрабілі вялікую справу. І самі яны не ведалі, што зрабілі вялікі крок наперад у гісторыі развіцця Таварыства ваяўнічых тэхнікаў. Яны зрабілі не хатнюю справу, як сказана ў § 1 статута ТВТ, і не школьную, як сказана ў § 4, а справу агульна-грамадскую, пра якую ў статуце пакуль яшчэ нічога не было сказана.

РАЗДЗЕЛ ДЗЕВЯТЫ,

самы сур'ёзны, бо ў ім падрабязна апісваецца пырскаўка, гаворыцца аб рэарганізацыі ТВТ, аб тым, як важаты хацеў нешта сказаць, ды не сказаў, і нарэшце — як сам дырэктар зарабіў ачко.

Незразумелыя паводзіны Цыбука ў справе з Карачуном асабліва зацікавілі важатага. Ён захацеў высветліць гэтае пытанне і на другі ж дзень паклікаў Цыбука.

— Скажы шчыра, ты папсаваў учора табліцу, ці не?

— Ды ўсе ведаюць, што гэта Карачун!

— Праўда?

— Чэснае піянерскае?

— Добра. А ты сябруеш з Карачуном?

— З такім я сябраваць не жадаю!

— Чаму ж тады ты захацеў паправіць табліцу замест яго?

Цыбук крыху замяўся.

— Кажы чаму? — паўтарыў важаты.

— Ды так,— адказаў Цыбук, гледзячы некуды ўбок.

— Ты нешта ўтойваеш. Кажы праўду.

— А хіба нельга гэтага рабіць? — усміхнуўся Цыбук.

— Ты не выкручвайся. Мы ж усе ведаем, што справа гэта вельмі добрая, за гэта толькі хваліць цябе трэба. Але яна незразумелая для нас. Ну, скажы шчыра. Няўжо ж хацеў выручыць Карачуна, які на цябе хлусіў?

— Ды не! — хуценька адказаў Цыбук.

— Ну, дык чаму?

Цыбук памаўчаў, потым сарамліва ўсміхнуўся і ціха сказаў:

— Я хацеў зарабіць ачко.

— Ачко? Якое ачко? Што гэта такое? — здзівіўся важаты.

Тады Цыбук расказаў яму ўсю гісторыю арганізацыі і дзейнасці ТВТ, уключаючы і ўчарашняе здарэнне на вуліцы.

Важаты і дзівіўся, і смяяўся, і хваліў, і нарэшце крыкнуў:

— Ды гэта ж вельмі цікавая і карысная рэч! Чаму ж вы хаваліся? Мы, брат, гэтую справу паставім яшчэ шырэй. Мы арганізуем некалькі дасканалых «аптэчак» і нават «аптэк». Мы выйдзем на паляванне за межы нашай хаты і школы. Праз пару дзён мы збяромся і абмяркуем усю гэтую справу.

...Пасля абеду быў дождж, і на тратуары каля дзвярэй школы пачала дзейнічаць «пырскаўка». Прылада гэтая раней была вельмі пашырана ў многіх гарадах. На кожнай вуліцы, у кожным квартале абавязкова была такая штука. Але цяпер яна сустракаецца значна радзей, бо ўсюды пайшлі асфальтавыя тратуары, а ў іх пырскаўкі звычайна не робяцца. Яны захаваліся на пліточных і драўляных тратуарах.

А пакуль каля школы асфальтавага тратуара яшчэ не было, пырскаўка захавалася і дзейнічала спраўна, асабліва ўвосень.

Зроблена гэтая прылада вельмі проста: заўсёды бывае, што якая-небудзь плітка ў тратуары расхлябаецца, разбоўтаецца і апускаецца адным бокам, калі на яе ступіш нагой. А калі пад

пліткай будзе вада, то яна вельмі цікава пырсне. Вось і ўся механіка.

Новыя пырскаўкі дзейнічаюць вельмі слаба, б'юць невысока. Але з кожным струменем вады з-пад пліткі выкідаецца зямля, ямка робіцца ўсё глыбейшай, плітка набывае большы размах — і тады ўжо спорныя струмені вады б'юць не горш за ісландскія гейзеры.

Самымі лепшымі пырскаўкамі лічацца тыя, якія маюць нахіл у сорак градусаў. Калі вугал нахілу будзе большы, чалавек рызыкуе вывіхнуць нагу. Калі ж такі выпадак здараецца, плітку звычайна замацоўваюць — пырскаўка перастае існаваць.

Школьная пырскаўка мела нахіл у трыццаць восем з паловай градусаў, гэта значыць, вугал яе набліжаўся да найлепшай, або, як кажуць вучоныя, аптымальнай велічыні.

Таму яна працавала з поўнай нагрузкай.

Вынікі залежалі ад таго, якой нагой на яе ступіць. Калі трапіць левай нагой (ідучы з цэнтра горада), тады вада пырсне на сцяну школы. А калі правай — то вада апырскае тваю ж левую нагу.

Тады чалавек скажа «чорт» і пабяжыць сабе далей.

Зусім іншая рэч, калі ўвесь струмень трапіць на другога чалавека. Тады паміж імі пачынаецца прыблізна такая размова:

— Прашу асцярожней, грамадзянін.

— Гэта ад мяне не залежыць, паважаны таварыш.

— Трэба мець вочы.

— Трэба мець розум.

У залежнасці ад характару прахожых словы маглі быць і больш і менш далікатныя, але ўвогуле непрыемныя.

У часе дажджу такія гутаркі ішлі тут досыць часта, і вучні слухалі іх з цікавасцю. А яшчэ больш падабалася ім наўмысля пырскаць адзін на аднаго. Тады ўжо справа даходзіла да боек.

Каб тратуар быў наогул дрэнны, разбураны, тады той, каму гэта належыць, пэўна заўважыў бы і паправіў яго. А тут, як на тое ліха, тратуар быў зусім добры, цэлы, а расхлябалася

ўсяго толькі адна плітка, ды і тая мела вельмі прыстойны выгляд. Дзе тут было заўважыць яе?

Толькі пільнае вока члена ТВТ магло заўважыць, ды і то толькі сёння, калі пайшоў дождж. І нават не адно вока, а цэлых восем адразу.

З іх два належалі Цыбуку. Рабяты заўважылі плітку, калі ішлі на сход, скліканы важатым.

Апрача нашых тэвэтэтаўцаў, ён запрасіў яшчэ чалавек дваццаць з піянерскага актыву. Зацікавіліся і настаўнікі, не кажучы ўжо пра дырэктара.

Калі прыйшоў дырэктар, то ўсе звярнулі ўвагу, што паліто на ім аж да пояса было запэцкана гразёю.

— Дзе гэта вы так выкупаліся, Антон Іванавіч? — спытаў яго настаўнік геаграфіі.

Антон Іванавіч агледзеў сябе і буркнуў:

— Гэта нехта апырскаў мяне на тратуары.

Цыбук насцярожыўся. А што, калі дырэктар скажа, каб направілі плітку? Тады прапала цікавае ачко. Трэба спяшацца, пакуль не позна.

І Цыбук ціхенька выйшаў з класа.

Ён ведаў, што недзе ў кутку пад сходамі ёсць сухі пясок. Набраў яго ў крысо і выйшаў на вуліцу. Дождж толькі пыліў, ды са стрэх капала. Апошні раз націснула пырскаўку прахожая жанчына...

Цыбук адкінуў плітку, насыпаў пад яе пяску, палажыў плітку назад — і пырскаўка спыніла сваё існаванне. Памыў рукі пад вадасцёкавай трубой, выцер аб штаны і вярнуўся ў памяшканне.

— Запішы мне ачко! — шапнуў ён Андрэю.

— Якое?

— На тратуары плітку паправіў, каб не пырскала.

— Дзе? — адчуваючы нядобрае, спытаўся Андрэй.

— Ды на вуліцы, каля дзвярэй.

— Калі ж ты паправіў? — ужо голасна крыкнуў Андрэй.

— Ды толькі што.

— Не можа быць! — ускочыў Андрэй.

— Паглядзі сам,— спакойна сказаў Цыбук.

— Ах, каб цябе качкі затапталі! — з вясёлым смехам сказаў Андрэй.— Я ж сам гэта думаў зрабіць!

Далучыліся іхнія таварышы, і тут высветлілася, што і Паўлік, і Клава таксама цалялі ў гэтую пырскаўку, але не хацелі пэцкацца цяпер, пакуль ідзе дождж.

Кожны меркаваў зрабіць гэта заўтра, а Цыбук узяў ды і перахітрыў іх усіх.

Старэйшыя заўважылі рух сярод вучняў.

— Што такое ў вас здарылася? — спытаў дырэктар.

— Мы паправілі на тратуары плітку, якая пырскала,— адказаў Цыбук.

Тэвэтэтаўцы зірнулі адзін на аднаго з задавальненнем: малайчына Цыбук! Сам гэта зрабіў, сам ганяецца за ачкамі, каб сабе самому больш набраць, а цяпер гаворыць «мы», выступае ад імя ўсяго ТВТ, падтрымлівае гонар усёй арганізацыі. Глядзі, які ён!

— Калі ж гэта вы паспелі зрабіць? — спытаў важаты.

— Ды толькі што Цыбук выходзіў і паправіў,— адказаў Андрэй.

— Гэта тую самую плітку, што апырскала Антона Іванавіча? — хітра ўсміхаючыся, перапытаў важаты.

— Тую самую! — адказалі яму.

Дырэктар шчыра засмяяўся і звярнуўся да настаўніка геаграфіі:

— Ну, што вы скажаце, Сяргей Паўлавіч? Відаць, прыйдзецца і нам з вамі запісацца ў ТВТ. А то, як бачыце, мы адсталі ад іх.

— Ды ўжо прыйдзецца,— адказаў Сяргей Паўлавіч.— Толькі ці прымуць яны нас?

— Прымем! — адказалі тэвэтэтаўцы, адчуваючы гордасць, што іх выдумка заслужыла такую ўвагу.

— А пакуль што,— сказаў Антон Іванавіч,— мы абмяркуем гэтую справу ў больш шырокім маштабе і, калі згодзіцеся, прапануем некаторыя змены ў вашым статуце.

Старшынёй сходу быў важаты. Ён пачаў расказваць усю гісторыю ТВТ. Казаў ён так дакладна, з такім захапленнем, што прысутныя гатовы былі падумаць, нібы ён сам дадумаўся і

арганізаваў усю гэтую справу і быў самым заядлым тэвэтэтаўцам.

А калі ён вызначыў далейшы шлях ТВТ, то дзесяць заснавальнікаў гэтай арганізацыі толькі здзіўлена пазіралі адзін на аднаго і думалі: «Бач, якая штука выходзіць!»

Потым важаты ўнёс папраўкі і дапаўненні да статута. Першы пункт ён прапанаваў такі:

«Кожны член Таварыства ваяўнічых тэхнікаў глядзіць гаспадарчым вокам на ўсё, што бачыць вакол сябе, і кожную шкоду і непаладкі, якія ён можа выправіць сам,— зараз жа выпраўляе. Калі сам зрабіць не можа, то звяртаецца за дапамогай да таварышаў або паведамляе, каму належыць».

— Гэта будзе тое самае, што і ў вас,— растлумачыў важаты,— толькі трошкі шырэй. Тут не гаворыцца асобна пра хату і пра школу, а сказана наогул, значыцца, і пра нашы хаты. Не гаворыцца тут і пра рамонт, бо ёсць такія шкодныя дробязі і непаладкі, пра якія нельга сказаць, што яны патрабуюць рамонту. Напрыклад, нядаўна ў нашай школе быў такі выпадак: нехта не закруціў водаправодны кран, вада цякла сабе і цякла, а за гэты час міма прабегла чалавек пяць, і ніхто з іх не спыніў ваду. Я не думаю, каб хто свядома не хацеў закруціць кран. Яны проста не ўмелі бачыць, як гэта ўмеюць тэвэтэтаўцы.

— А такое ачко будзе лічыцца? — спытаў Цыбук.

— Якое? — не зразумеў важаты.

— За кран,— адказаў Цыбук.

Нібы гром пракаціўся па класе. Смяяліся ўсе — і вучні, і настаўнікі, і дырэктар. Цыбук засаромеўся. Калі смех сціхшыўся, важаты сказаў Цыбуку:

— А табе ўсё рупяць ачкі? Ну што ж, справа нядрэнная. Адкажам мы табе, калі прымем яшчэ адзін пункт, вось гэты:

«Кожны член ТВТ павінен памятаць, што ў яго дзейнасці няма дробных, няважных спраў. Кожная карысная дробязь у агульнай масе складае вялікую вартасць».

— Вось цяпер і меркуйце, ці залічваць Цыбуку ачко за кран, ці не,— звярнуўся важаты да сходу.

Піянеры ўсміхаліся і маўчалі: хто яго ведае, як тут быць?

— Ну, што скажаце? — зноў спытаў важаты.

Тады ўстаў Толя і сказаў:

— Хоць у нас такога пункта запісана не было, але мы меркавалі таксама: калі справа карысная, то ўсё роўна, дробная яна ці не.

— Правільна! — сказаў дырэктар.

Цыбук павесялеў, задраў нос і пазіраў на таварышаў так, нібы хацеў сказаць: «А што?»

— Я не запісвала б, што закруціла кран,— прамовіла Клава з месца.

— Гэта ўжо твая асабістая справа,— сказаў важаты.— А калі хто захоча, навошта яму адмаўляць. Ачкоў у нас хопіць, грошы за іх плаціць не трэба.

— Тады адзін набярэ многа ачкоў за дробязі, а другі адно ачко за важную работу,— сказаў Паўлік.

— Во як вы ставіце пытанне! — здзіўлена прамовіў важаты.— Тады, калі хочаце, за больш важную работу налічыце больш ачкоў. А наогул я павінен сказаць, што справа тут не ў ачках і, калі хочаце ведаць, нават не ў той маленькай карысці, якую вы зробіце цяпер, а...

Ён глянуў на дырэктара і спыніўся.

— А ў чым? — спытаўся Яша.

— Пасля скажу,— адказаў важаты.

— Чаму?

— Потым цікавей будзе.

— Калі?

— Праз некаторы час.

— Цяпер скажы, цяпер,— пачаліся просьбы.

— Пацярпіце крыху, скажу, як прыйдзе час,— адказаў важаты, відаць, шкадуючы, што закрануў гэтае пытанне.

Шкадуем і мы, што не ведаем, якое гэта пытанне.

Выручыў Сяргей Паўлавіч,— ён папрасіў слова. Вучні адразу сцішыліся. Сяргей Паўлавіч устаў і сказаў:

— Вось тут некаторыя з вас выказаліся зняважліва аб дробязях. Дарэмна так думаеце. Калі адна мыш — не бяда, то сто мышэй — няшчасце. Ды што там сто! — часам і адна дробязь бывае горш за сто. Я ведаю выпадак, калі чалавек загінуў ад маленькага кавалачка яблыка, які быў кінуты на падлогу. Чалавек ступіў на яго, паслізнуўся ды так стукнуўся аб рог стала ці печкі, што праз гэта і памёр. Вось табе і дробязь. Многія з нас не звяртаюць увагі на дробязі, бо ў кожнага ёсць больш важныя справы, пра якія яму прыходзіцца думаць. У гэтым наша бяда. А яшчэ горшая бяда, калі чалавек думае: гэта мяне не датычыцца. Рэшткі гэтай страшнай хваробы яшчэ захаваліся ў нас ад старых часоў, калі кожны думаў толькі пра сваё. Калі ў вас у раздзявальні абарвецца і зваліцца на зямлю чыё-небудзь «чужое» паліто, то некалькі чалавек пройдуць міма, пакуль хто падыме. Калі хлапчук на вуліцы псуе дрэва, то часам пройдуць міма чалавек дзесяць і не спыняць хлапчука, бо гэта «не іх справа». Тысячы такіх дробязей усім нам псуюць жыццё. Гонар вам і слава, што вы першыя падняліся на вайну супраць дробязей. Жадаю вам навучыцца бачыць іх, а яшчэ важней — ніколі не думаць: «Гэта не мая справа».

Цёплая і шчырая прамова зрабіла на дзяцей моцнае ўражанне, а тэвэтэтаўцы ў поўнай меры адчулі «гонар і славу».

Важаты ўнёс яшчэ адзін пункт у статут:

«Член Таварыства ваяўнічых тэхнікаў не павінен глядзець на сваю дзейнасць, як на працу, нагрузку. Ён робіць толькі тое, што можна зрабіць лёгка і з ахвотай».

По гэтаму пункту выступіў Антон Іванавіч.

— Я,— сказаў ён,— звяртаю асаблівую ўвагу на гэты пункт. Вы распачалі гэтую справу, як гульню, і няхай яна застанецца гульнёй. Вы не можаце браць на сябе абавязак сачыць за парадкам усюды, усюды выпраўляць непаладкі, траціць на гэта час. У вас ёсць свая асноўная работа — вучоба, ёсць і іншыя абавязкі. Хай новая работа будзе для вас толькі цікавай гульнёй, замест якой-небудзь іншай бескарыснай гульні. А потым мы ўбачым, што з гэтага выйдзе.

Калі пасля сходу ўсе накіраваліся да дзвярэй, дырэктар раптам падышоў да класнай дошкі, схіліўся і... падняў з падлогі кавалак крэйды.

— Запішыце мне ачко,— весела сказаў ён.— Я лічу гэту работу карыснай, бо крэйду вы маглі растаптаць, раскрышыць, у класе было б больш пылу, падлога запэцкалася б, прыбіральшчыца мела б лішнюю працу і прапаў бы патрэбны кавалак крэйды.

— Вось вам і дробязь! — сказаў Сяргей Паўлавіч.

Вучні ў захапленні запляскалі рукамі.

РАЗДЗЕЛ ДЗЕСЯТЫ,

зусім незвычайны, бо тут дзеці соваюць нос не ў свае справы, людзі думаюць наадварот, а пра адну гісторыю нават у газеце было надрукавана.

Праз некаторы час жыхары горада сталі заўважаць, што ў розных месцах пачалі з'яўляцца нейкія дзеці, якія соваюць свой нос куды ім не трэба. А калі ўмешваўся дарослы, то выходзіла зусім наадварот.

Ідзе, скажам, паважны дзядзька па вуліцы і бачыць — двое хлопчыкаў поркаюцца ля паштовай скрынкі, засоўваюць туды пальцы, нават трэсачкі.

— Вы што тут робіце? — крычыць ён.— Лісты цягаеце?

— Ды не,— адказваюць хлопчыкі,— наадварот: скрынка паўнюткая і лісты вывальваюцца адтуль. Мы іх засоўваем далей.

— Ведаем, як вы засоўваеце,— бурчыць дзядзька.— Ідзіце прэч, не чапайце!

— Ды гляньце, во адзін канверт зусім вываліцца хоча.

І хлопчык засунуў яго назад. Глядзіць дзядзька на хлопчыкаў і не ведае, што думаць. Калісьці ён сам быў маладым і, дурэючы, засоўваў у скрынкі непатрэбныя рэчы. А тут выходзіць — наадварот. Дзіўна!

Або бачыць міліцыянер — малы хлапчук варочае перакуленую урну па тратуары. Міліцыянер крычыць:

— Ты навошта паваліў урну? Пастаў на месца!

— Я ж яе і стаўляю,— спакойна адказвае хлопчык.— Яна была перакуленая.

— Сам стаўляеш? — дзівіцца міліцыянер.

І было чаго яму дзівіцца: не адзін год ён сочыць за парадкам, не адзін раз даводзілася яму крычаць вось на такіх самых хлапчукоў, якія знарок паваляць урну ці яшчэ якую штуку зробяць, а каб хто з іх сам здагадаўся што-небудзь паправіць,— такога выпадку міліцыянеру бачыць яшчэ не здаралася.

Ішлі раз два тэвэтэтаўцы па невялікай ціхай вуліцы, абсаджанай дрэвамі. Моцны вецер шумеў у гэтых дрэвах і разгойдваў галіны. Раптам над галавой пачуўся трэск. Спыніліся хлопцы, задралі галовы — нічога не відаць. Ступілі крок далей — зноў трэск. Азірнуліся — таксама нічога няма. Але тут наляцеў вецер, і тады хлопцы не толькі пачулі, дзе трэск, але і ўбачылі сярод галін страшэнныя электрычныя іскры.

— Гэта провад дакранаецца да галіны,— сцямілі хлопцы.— Трэба адламаць яе. Добрае будзе ачко.

Адзін з іх палез на дрэва, другі застаўся ўнізе. Калі да ветру далучыўся яшчэ рух хлопца, то затрашчала і заблішчала так, што не толькі хлопцу на дрэве, але і таму, што быў унізе, зрабілася страшна. У гэты час з дому выйшаў стары дворнік. Ён адразу ўбачыў іскры і двух хлопцаў.

— Што вы робіце, хуліганы?! — закрычаў ён, падбег да дрэва, ухапіў хлопца за плячо і крыкнуў уверх: — Ану, злазь, я табе пакажу!

Абодва хлопцы пачалі тлумачыць, у чым справа, але стары і слухаць не хацеў. Ці мала чаго нагавораць гэтыя свавольнікі? Ён сваімі вачыма бачыў, што яны робяць, ведае ён такіх.

Выйшлі з дому яшчэ людзі, прыпыніліся некалькі прахожых, хлопчык злез з дрэва — і пачаўся разбор справы...

Дворнік і слухаць не хацеў ніякіх тлумачэнняў, іншыя людзі таксама глядзелі на хлопцаў скоса. Становішча небаракаў рабілася вельмі непрыемным.

Нечакана яны пачулі пытанне:

— Ці не тэвэтэтаўцы вы?

пытаўся пажылы чалавек, які толькі што падышоў.

— Але, але,— адказалі хлопцы.

Чалавек лагодна ўсміхнуўся і сказаў дворніку:

— У такім разе адпусціце іх і падзякуйце.

— А што гэта за тэтаўцы? — здзіўлена спытаў дворнік.

— Гэта лепшыя нашы дзеці, якія на кожным кроку робяць карысць,— адказаў чалавек.— Яны не маняць. Яны вось адламалі галіну, якую даўно ўжо трэба было адламаць вам самім.

Хлопцы пайшлі далей, радуючыся, што знайшоўся чалавек, які ведаў, што такое тэвэтэтаўцы.

— Гэта, пэўна, настаўнік,— парашылі яны.

І яны не памыліліся: гэта сапраўды быў настаўнік, хоць і не іхняй школы. Зусім зразумела, што настаўнікі іншых школ пра гэтую справу ведалі. Але асноўная маса жыхароў яшчэ не ведала, таму «незвычайныя» ўчынкі нашых тэвэтэтаўцаў на кожным кроку дзівілі народ.

...Летні дзень. У гарадскім скверы сядзяць на лаўках людзі. Многа жанчын з малымі дзецьмі. Кожная сочыць, каб яе дзіця не адышлося далёка, не палезла на клумбу з кветкамі. Калі часам малое падпаўзе і вырве кветку ці зробіць на клумбе ямку, то маці сама выпраўляе шкоду.

З адным мужчынам быў сямігадовы хлопчык, які вывернуў два белыя камяні, якімі была абкладзена клумба. Бацька строга крыкнуў на сына і прымусіў яго сваімі рукамі паставіць камяні на месца.

Раптам аднекуль выскачыў дванаццацігадовы хлапец, з разгону ўзбіўся на клумбу і вывернуў нагамі пук кветак. Некалькі чалавек з публікі крыкнула:

— Куды лезеш? Клумбу псуеш!

Хлапец пабег сабе далей, публіка засталася сядзець сабе на лавах, а вывернутыя кветкі засталіся ляжаць сабе на зямлі. Тады да клумбы падыходзіць адна дзяўчынка і старанна садзіць кветкі назад. Людзі пачалі хваліць дзяўчынку так, нібы яна зрабіла нешта зусім незвычайнае. А для дзяўчынкі справа гэтая была зусім звычайная, бо гэта была Клава Макейчык, член ТВТ.

Чаму ж так здзівіліся людзі? Толькі што жанчына таксама пасадзіла назад кветку, а хлопчык паставіў на месца камяні — і ніхто не звярнуў на гэта ўвагі. Кожны лічыў, што так і павінна быць.

А калі тое самае зрабіла Клава, то ўсе вельмі здзівіліся і пачалі аж занадта хваліць.

Чытач, мусіць, ужо здагадаўся, у чым тут сакрэт: жанчына выправіла тое, што зрабіла ЯЕ дзіця, хлопчык выправіў тое, што зрабіў ЁН САМ, а Клава выправіла тое, што зрабіў НЕХТА ДРУГІ. А самае галоўнае — зрабіла сама, па сваёй ініцыятыве. Вось гэта і было тое новае, «незвычайнае», да чаго яшчэ людзі не прывыклі. Вось чаму людзі звярталі на такія факты асаблівую ўвагу і часта аб іх расказвалі. І цяпер, на скверы, адна жанчына расказала другой пра падобны выпадак.

— Гэта было зімой,— казала яна,— у халодны сухі дзень. Дзьмуў моцны вецер. Я стаяла на вуліцы, чакаючы трамвая. Міма праходзіла дзяўчынка гадоў адзінаццаці, вучаніца, з кнігамі. Сумка яе вісела на локці, а рукі былі схаваны ў муфце. Недалёка ад мяне яна спынілася і пачала прыглядацца да чагосьці на зямлі. Там ляжала нейкая жалезная рагуліна. Дзяўчынка некаторы час стаяла над ёй і нібы нешта абдумвала. Здавалася, яна хоча падняць гэтую рагулю, ды баіцца вымаць рукі з муфты і брацца за халоднае жалеза. Крыху пастаяўшы, яна нарэшце нахілілася і ўзяла яго. Я з цікавасцю сачыла за ёю: навошта ёй гэтая нязграбная жалязяка? Халоднае жалеза, відаць, апякло ёй руку, але дзяўчынка, сцяўшы зубы, падняла яго, аднесла ўбок і... кінула. Мяне гэта так зацікавіла, што я падышла да яе і спыталася:

— Навошта ты падымала гэтую жалязяку?

— Яна надта шкодная,— адказала дзяўчынка: — Калі на яе трапіць машына, то праколе шыну.

Прыгледзелася я да рагуліны і ўбачыла, што яна сапраўды шкодная: моцная, калючая. Шыну яна, безумоўна, пракалола б. Прызнаюся, мне зрабілася нават сорамна. Мне не толькі не прыйшло б у галаву адкінуць гэтую жалязяку, але я і не заўважыла б яе, каб не гэтая дзяўчынка. Якая свядо-

масць, якое руплівае вока ў такой малой! Эх, каб усе былі такімі!

— Усе дзеці? — перапытала другая жанчына.

— А чаму ж не? — адказала першая.

— Я думаю, і нам з вамі не пашкодзіла б,— усміхнулася другая.

— І як яшчэ! — усклікнула першая.— Ды толькі не маем мы гэтай прывычкі: ніхто нам у свой час не падказаў.

Недалёка сядзела яшчэ адна жанчына і з цікавасцю прыслухоўвалася да гутаркі. Нарэшце яна сказала:

— Вы, як відаць, зацікавіліся дзецьмі, якія дзівяць людзей сваімі ўчынкамі. Магу вам сказаць, што і мой сын належыць да іх.

Абедзве жанчыны жвава павярнуліся да яе і сказалі:

— Гэта робіць вам гонар. Нядужа такіх бацькоў, якія выхоўваюць дзяцей у гэтым кірунку. Звычайна нікому з нас не прыходзіць у галаву такая рэч.

Жанчына засмяялася:

— Павінна вам сказаць, што і нам гэта не прыходзіла ў галаву. Гэта яны самі ў школе і піянерскім атрадзе выдумалі такую штуку. Арганізавалі нейкае Таварыства ваяўнічых тэхнікаў, або скарочана ТВТ, і завуць сябе тэвэтэтаўцамі. З таго часу ў нашым доме дзе толькі трэба што-небудзь дробнае зрабіць ці паправіць — сын наш зараз жа зробіць сам. Ды яшчэ [redacted] гвалтам дамагаецца, каб ніхто іншы, апрача яго, не зрабіў. Тое самае яны робяць і ўсюды, дзе можна, гуляючы...

У гэты час каля іх па дарожцы з крыкам і смехам прабегла трое хлопцаў. Першы з іх падбег да адной вольнай лаўкі, ля якой на траве ляжала хустачка, падняў яе і крыкнуў:

— Ёсць ачко!

Таварышы яго пачалі смяяцца:

— Якое ж гэта ачко? Ты сам сабе набыў хустачку. Не панясеш жа яе ў міліцыю. І ніхто не пойдзе туды пытацца яе.

Першы хлопчык, відаць, збянтэжыўся.

— А можа, хто знойдзецца? — прамовіў ён, а потым падняў хустачку ўгору і крыкнуў на ўвесь сквер: — Гэй, чыя хустачка?

Адна дзяўчынка, якая выходзіла ўжо са сквера, азірнулася і прызнала сваю хустачку. Аддаўшы ёй знаходку, хлапец павярнуўся да таварышаў і сказаў:

— Ага! Запішыце ачко.

Тры нашы жанчыны з цікавасцю сачылі за гэтай сцэнай. Дзве з іх нічога не разумелі, а трэцяя сказала:

— Вось вам і тэвэтэтаўцы.

— А пры чым тут нейкае ачко?

— Гэта яны налічваюць сабе ачко за кожную карысную справу. Вядома, дзеці.

Так паступова тэвэтэтаўцы рабіліся вядомымі за межамі сваёй сям'і і школы.

Але гэта быў толькі пачатак, і большасць людзей усё яшчэ не ведала іх і на кожным кроку дзівілася незвычайным учынкам нейкіх незвычайных дзяцей.

Нарэшце раскажам яшчэ адну цікавую гісторыю, якая трапіла нават у газету. Але, на жаль, галоўны герой яе застаўся невядомым, нават ніхто не ведаў, што гэта быў тэвэтэтавец. А справа была такая.

Ля ўвахода ў гарадскі парк культуры і адпачынку ёсць невялікі драўляны мост. Нядаўна гэты мост рамантавалі. І адзін з майстроў па нядбайнасці не загнуў востры канец цвіка, які вытыркаўся са слупка акурат у тым месцы, дзе праходзяць людзі. Каб ведаў майстар, што з гэтага выйдзе, ён бы ночы не спаў ад пакутаў сумлення. Можа, ён пазней і даведаўся, можа, сапраўды ночы не спаў, але мы гэтага не ведаем, таму нічога сказаць не можам.

На гэтым месцы на працягу гадзіны адбылося шмат жудасных падзей.

Адзін заклапочаны, сур'ёзны чалавек зачапіў за цвік рукой і падрапаў яе да крыві. Спыніўся, паглядзеў на руку, на цвік, буркнуў: «Ну і работа!» — і пайшоў, выціраючы кроў хусцінкай. Усё абышлося ціха.

Зусім інакш было, калі за цвік зачапілася дзяўчына і падрала сваю святочную шаўковую сукенку. Ішла яна ў парк з маладым чалавекам на гулянне — і вось якое няшчасце! Спачатку яна войкнула, потым засаромелася і нарэшце заплакала.

Малады чалавек падышоў да цвіка, памацаў яго і крыкнуў з абурэннем:

— Гэта ж шкодніцтва! Пакідаць такі цвік у публічным месцы!

Прыпынілася некалькі прахожых. Яны спачувальна пазіралі на дзяўчыну і таксама абураліся:

— За такую нядбайнасць трэба пад суд аддаваць тых, хто гэтак робіць!

— Не толькі іх, але і тых, хто павінен сачыць за парадкам!

— Чаго начальства глядзіць?

— Нехта ж павінен адказваць!

— У газету трэба напісаць!

Адным словам, абурэнне было агульнае. І спачуванне дзяўчыне было агульнае. Але дзяўчына замест гуляння павінна была ісці дахаты...

Людзі разышліся. Некаторы час усё было спакойна, калі не лічыць двух смешных выпадкаў. Так, адна жанчына зачапілася за цвік вялікай хусткай. Калі яе тарганула ззаду, яна павярнулася і крыкнула хлапцу, што ішоў следам за ёй:

— Асцярожней, малады чалавек! Што за жарты?

Той здзівіўся:

— Чаго вы, грамадзянка? Я вас не чапаю.

Тут высветлілася, што пажартаваў не хлопец, а цвік, і грамадзянка папрасіла прабачэння.

Потым адзін чалавек, які трымаў у руцэ капялюш, зачапіў ім за цвік — і капялюш паляцеў у раку. Публіка не магла не засмяяцца, бачачы, як капялюш плыве па рацэ, а чалавек гоніцца за ім. Толькі самому чалавеку было не да смеху.

А тым часам набліжаўся момант, калі на мосце павінна была адбыцца самая важная падзея сённяшняга дня.

Да моста падыходзіў высокі прыгожы франт у цудоўным шэрым паліто. Ішоў ён так шпарка, што крыссе расшпіленага паліто развявалася, як крылы. І вось адным крылом ён зачапіў за цвік... Відаць, паліто было добрае, бо трэск пачула многа людзей. Але малады чалавек не заплакаў, як тая дзяўчына, ён паставіў пытанне зусім інакш, па-дзелавому.

— Грамадзяне! — звярнуўся ён да бліжэйшых асоб.— Прашу вас, будзьце сведкамі, што я падраў свой новы макінтош аб гэты цвік. Я падам у суд на гарсавет: ён павінен адказваць за шкоду ў публічных месцах.

Ён пабег да таго месца, дзе стаяў міліцыянер.

— Таварыш міліцыянер! — сказаў ён.— Прашу скласці акт, што я падраў новы макінтош аб цвік, пакінуты вось тут, на мосце, дзе праходзяць тысячы людзей. Я лічу, што за гэта павінен несці адказнасць гаспадар горада — гарсавет.

Калі яны падыходзілі да злашчаснага месца, нейкі хлапчук апошнім ударам каменя зусім загнуў і абясшкодзіў віноўніка няшчасцяў. Убачыў гэта пацярпеўшы ды як накінецца на хлапчука:

— Ты што тут робіш, хуліган? Хто цябе прасіў соваць нос не ў сваю справу? Таварыш міліцыянер! Вось тут быў цвік, ды гэты нягоднік яго знішчыў. Але гэта ўсё роўна, факт застаецца фактам. Вось сведкі, якія бачылі...

Але сведкі, стрымліваючы смех, разышліся.

Гэтае здарэнне, як мы ўжо казалі, трапіла ў газету. Там пісалі аб розных недаробках і нядбайнасцях, якія часам дапускаюцца будаўнічымі трэстамі. Сярод прыкладаў быў і няшчасны цвік ля парку культуры і адпачынку.

«Вядома,— пісала газета,— за такую неахайнасць павінны адказваць тыя, хто дапусціў яе. Працоўныя горада маюць права патрабаваць, каб у публічных месцах ім не пагражала небяспека ад якіх-небудзь цвікоў. Але ў здарэнні на мосце ля парку культуры і адпачынку ёсць адна характэрная рыса, якая датычыцца і ўсіх грамадзян. Тут нейкі хлопчык узяў ды загнуў каменем цвік. А ці не мог бы тое самае зрабіць кожны, хто першы заўважыў гэты цвік? Над гэтым варта задумацца нам усім».

Мы можам толькі дадаць: сярод людзей, што праходзілі тады па мосце, не адна сотня была такіх, якія самі маглі б загнуць цвік. Але ніхто гэтага не зрабіў, апрача невядомага хлопчыка.

РАЗДЗЕЛ АДЗІНАЦЦАТЫ,

дзе адбываецца «нешта ў тысячу разоў важнейшае» і яшчэ гаворыцца, як тэвэтэтаўцы заразілі ачкамі настаўнікаў, бацькоў, суседзяў і нават «прафесараў».

Паглядзім цяпер, што адбывалася ў адзінаццатай школе пасля таго, як дырэктар запісаўся ў члены ТВТ. Праўда, ён, як зарабіў тады адно ачко, дык з ім адным і застаўся. Больш ён так і не звяртаўся, каб яму запісалі новае ачко. Але ўсе бачылі, што ён кожны дзень зарабляў шмат ачкоў.

— Вядома,— казалі тэвэтэтаўцы,— дырэктару не выпадае з намі гуляць. Будзем лічыць яго ганаровым членам.

Затое сярод вучняў лік тэвэтэтаўцаў у хуткім часе вырас да чатырохсот чалавек. Яны былі аб'яднаны ў піянерскіх звеннях. Першае звяно складалі «ветэраны», заснавальнікі ТВТ — Клава, Толя, Паўлік, Андрэй і іншыя.

Праз некаторы час даведаліся, што і ў іншых школах горада з'явіліся тэвэтэтаўцы. Тады адзінаццатая школа пачала ганарыцца, што яна была першай у гэтай справе.

Побач з адзінаццатай школай быў дзіцячы сад. Выявілася, што і там знайшліся тэвэтэтаўцы. Падыме шасцігадовы чалавечак паперку з падлогі і нясе да выхавальніцы:

— Цётка, запішы ачко!

За кожнай дробкай, кожнай саломінкай, запалкай пачалі ганяцца. Пазбіралі з двара кожную трэсачку, кожны лішні каменьчык.

Зусім зразумела, што адзінаццатая школа зрабілася самай лепшай. Восемсот вачэй пільна сачылі за кожнай хібай і зараз жа выпраўлялі яе. Некаторыя заўзятыя тэвэтэтаўцы нават шкадавалі, што ў школе цяжка зарабіць ачко.

Ярошка, лётаючы па класе, разліў чарніла. Калі яму прапанавалі выцерці, ён, як заўсёды, пачаў даводзіць, што гэта не ён разліў. Але зараз жа знайшліся ахвотнікі зарабіць ачко — і чарніла выцерлі без Ярошкі.

Другі раз ён адарваў палку ад геаграфічнай карты — і паўтарылася такая самая гісторыя.

Але на трэці раз яму ўжо сорамна зрабілася, і ён без ніякіх спрэчак сабраў чужыя кнігі, якія параскідаў па класе.

Аднаго разу пасля заняткаў важаты ўбачыў, што Карачун у калідоры поркаецца каля аконнай шыбы.

— Ты што тут робіш?

— Ды вось шкло бразгае, можа валіцца. Дык я яго цвіком прымацоўваю.

— Ты член ТВТ?

— Не, не прымаюць. Кажуць: з цябе не будзе карысці. А я ім дакажу. Колькі тэвэтэтаўцаў у школе, а ніхто не заўважыў, што шкло бразгае.

— Абяцаю табе, што будзеш прыняты,— усміхнуўся важаты.

Парадак у школе быў не толькі таму, што тэвэтэтаўцы выпраўлялі непаладкі. Тут адбывалася нешта ў тысячу разоў важнейшае: тэвэтэтаўцы не маглі ўжо свядома ці па неахайнасці самі зрабіць што-небудзь шкоднае.

Ці мог, напрыклад, той вучань, які сваімі рукамі замацаваў завесу на парце, ламаць яе на другой парце? Ці мог ён неахайна абыходзіцца з бібліятэчнай кнігай, калі нядаўна сваімі рукамі падклейваў такую самую кнігу, парваную кімсьці другім? Ці мог ён скінуць на зямлю і не падняць чужое паліто, калі ён падымаў ужо паліто, скінутае другімі? Ці будзе ён неасцярожна стукаць нагамі ў сцяну, калі ён раз ужо замазваў яе? Калі раней Карачун неасцярожна штурхаўся ля акна, не думаючы, што можа разбіць шыбу, то цяпер ён, штурхаючыся, мімаволі ўспомніць, што сам папраўляў яе. Наўрад ці знойдзецца вучань, які, выцершы на сцяне словы, напісаныя кімсьці другім, сам пачне пісаць на сцяне. Калі раней які-небудзь вучань выразаў на парце літары, то звычайна таварышы яго не звярталі на гэта ўвагі, а цяпер ніхто не мог сцярпець такой шкоды, бо кожны прывык глядзець на школьныя рэчы зусім іншым вокам. Вось чаму адзінаццатая школа прыняла цяпер непазнавальны выгляд.

Тое самае заўважалася і ў сем'ях, дзе былі тэвэтэтаўцы. Звычайныя дзеці, калі раздурэюцца, то ні на што не глядзяць, а тэвэтэтаўцы ўжо сталі больш уважлівымі і асцярожнымі, бо прывыклі сачыць за рэчамі.

Той, хто сам сабе паправіў партфель, пашкадуе сваёй пра-

цы і не будзе яго кідаць, як раней. Пашкадуе ён і свае бацінкі, кнігі.

Ці многія з дзяцей, кідаючы шкло на дарогу ці ў раку, думаюць, што нехта можа наступіць на яго? А тэвэтэтавец, які «зарабіў ачко», дастаўшы шкло з дна купальні, сам яго ўжо ніколі не кіне. Колькі галін паламалі дзеці на дрэвах, асабліва пладовых! А калі хто з іх зрабіўся тэвэтэтаўцам ды адзін раз навыратаваў дрэва, падвязаўшы зламаную галіну, то сам ён, напэўна, галіны ўжо не зламае.

Вось якія змены адбываліся ў тэвэтэтаўскім племені! Але самі яны аб гэтым не думалі і не ведалі, што робяцца новымі людзьмі. Яны думалі толькі, што займаюцца цікавай і карыснай гульнёй. Мала таго, яны «заразілі» гэтай гульнёй і дарослых.

Першым з іх, калі не лічыць важатага, быў дырэктар школы Антон Іванавіч, а разам з ім і настаўнік геаграфіі Сяргей Паўлавіч. Хоць ачкоў яны, вядома, не збіралі і не запісвалі, але пры кожным выпадку жартавалі гэтым словам.

Так, Сяргей Паўлавіч прыйшоў адзін раз з новай палачкай і сказаў вучням:

— Вось я сам зрабіў указку, запішыце мне ачко.

Матэматык аднаго разу схіліўся каля парты, падняў чыюсьці ручку і, паклаўшы на парту, са смехам сказаў:

— Запішыце мне ачко.

У настаўніцкай часта чуліся жарты:

— Антон Іванавіч! — казаў фізік.— Запішыце мне ачко: я ўчора адрамантаваў паветраную помпу.

— А я зарабіла два ачкі,— сказала выкладчыца літаратуры: — Пашыла дачцэ шапачку і пазычыла суседзям ночвы.

— Не, Алена Андрэеўна,— засмяяўся прыродазнаўца: — Пазыка не лічыцца.

— Чаму ж не? — адказала Алена Андрэеўна.— Давайце спытаемся ў нашых тэвэтэтаўцаў.

Гутарку гэтую чула Клава. Яна ведала, што гэта жарты, ведала, што ніхто ў іх пытацца не будзе, але прыемна было ўжо тое, што такое пайшло ад іх.

Тое самае назіралася і сярод вучняў старэйшых класаў — дзесятых, дзевятых, восьмых. Гуляць з малышамі ў ачкі ім, вядома, было не да твару. Але ўжываць яны сталі гэтыя ачкі на кожным кроку. Вісіць, скажам, у класе на сцяне табліца, скрывіўшыся набок; падыдзе хлапец, паправіць і смяецца:

— Запішыце мне ачко!

Кожны ведаў, што гэта самы звычайны жарт, але не кожны ведаў, што, каб не тэвэтэтаўцы, то наўрад ці хто звярнуў бы ўвагу на гэтую табліцу і паправіў яе. Не ведалі гэтага і самі арганізатары ТВТ.

Або ідзе група дзесяцікласнікаў па вуліцы. На дарозе ўсім вядомы водаправодны калодзеж, накрыты тоўстай круглай чыгуннай накрыўкай. Накрыўка ссунута набок, відаць, нейкай цяжкой машынай.

— Стой, хлопцы! — крычыць адзін з іх.— Ёсць магчымасць зарабіць ачко. Карыстайцеся выпадкам.

І яны пасоўваюць накрыўку на месца. Зноў звычайны жарт, і зноў можна сказаць, што без уплыву тэвэтэтаўцаў яны прайшлі б міма, як праходзілі да гэтага не адзін раз.

У доме тэвэтэтаўца бацька, зрабіўшы якую-небудзь справу, звычайна жартуе:

— Ну, вось і зарабіў ачко.

Маці, пашыўшы каму-небудзь з дзяцей трусікі, таксама смяецца:

— Запішыце мне ачко!

А то прыходзіць суседка і кажа матцы:

— Ганна Сцяпанаўна, запішыце мне ачко: я на двары падняла з зямлі і павесіла вашу прасціну.

Найбольшае ўражанне на тэвэтэтаўцаў зрабіў наступны выпадак. Наглядаў яго Паўлік. Ён ішоў па вуліцы, а перад ім ішлі два паважныя старыя чалавекі.

«Прафесары»,— чамусьці падумаў Паўлік.

Па дарозе трэба было пераходзіць месца, дзе нядаўна пракладвалі трубу і засталася яшчэ не забрукаваная гразкая паласа. Маладыя мужчыны праз яе скакалі, ды і то не заўсёды ўдала, а жанчынам і старым зусім было дрэнна.

І вось Паўлік чуе, як адзін «прафесар» кажа другому са смехам:

— Трэба зарабіць свайму ўнуку ачко. Палажу я сюды вунь тую цагліну.

Ён зараз жа гэтак і зрабіў. А Паўлік быў першым прахожым, які скарыстаў «прафесарскую» цагліну.

Такім чынам тэвэтэтаўцы ўбачылі, што і некаторыя дарослыя пераналі іхнюю гульню. Праўда, дарослыя толькі жартавалі і ніякіх ачкоў не збіралі, але ўсё роўна відаць было, што яны «заразіліся» ад тэвэтэтаўцаў. А гэта, што ні кажы, для ТВТ вельмі прыемная рэч.

— Хутка ў нас будуць дарослыя члены Таварыства ваяўнічых тэхнікаў! — смяяліся піянеры.

Але Цыбук сур'ёзна сказаў:

— Нічога з іх не выйдзе, бо яны глядзяць на гэтую справу несур'ёзна, яны толькі жартуюць. Яны нават ачкоў не запісваюць, а без ачкоў — толькі адна гульня. Хто захоча нешта дарма рабіць?

РАЗДЗЕЛ ДВАНАЦЦАТЫ,

дзе гаворыцца, як Стась аніяк не мог адчапіцца ад трубы, а Цыбук ад бясплатных ачкоў і, апрача таго, як перакуліўся воз з сенам.

Скончыліся заняткі ў школе, прыйшлі летнія канікулы. Школьнікі разышліся і раз'ехаліся па розных кутках. Рассыпалася і армія ТВТ. Толькі адзін атрад захаваўся як баявая адзінка — гэта з тых, хто паехаў у піянерскі лагер.

Некаторыя члены ТВТ захавалі сувязь і склалі групы ў два-тры чалавекі, астатнія на працягу двух месяцаў ніякай сувязі між сабой не мелі і заставаліся адны.

Стась, напрыклад, ужо не хадзіў кожны дзень з таварышамі ў школу, яму ўжо не было перад кім ганяцца за ачкамі, і ён нават не думаў аб іх. Больш за ўсё цяпер ён думаў пра рэчку. Вядома, каму не ахвота ўлетку пакупацца ў рэчцы!

Па дарозе яму трэба было праходзіць каля завода. А там ля дарогі звозілі і складалі чыгунныя трубы. Канец адной тру-

бы адсунуўся і дайшоў да каляіны, па якой ездзяць. І кожны раз, як толькі хто едзе, дык і зачэпіць колам за трубу.

Як звычайна, на гэта ніхто не звяртаў увагі. Не думаў і Стась звяртаць увагі. Але што ты зробіш, калі вока члена ТВТ і без ведама яго самога адразу заўважыла непарадак.

Стась прыпыніўся, але зараз жа махнуў рукой і пайшоў далей.

«Ану яго, у такую гарачыню важдацца! Абыдзецца і без мяне».

Адышоў некалькі крокаў, глядзіць — насустрач едзе воз. Цікава паглядзець, ці зачэпіць ён, ці не? Стась спыніўся, азірнуўся.

Воз зачапіў не толькі адным, але і другім колам. Скрогат чыгуннай трубы непрыемна разануў вуха. Здаецца, нават кавалачак трубы адкрышыўся.

«Не, так пакідаць нельга!»

Стась вярнуўся назад. Дакрануўся нагой да трубы. Відаць, цяжкая, як яе пасунеш?

Ідзе рабочы. Стась да яго:

— Дзядзечка! Чаму гэтая труба так ляжыць? Усе, хто едзе, за яе чапляюцца.

Рабочы некаторы час глядзеў на яго, як на дзіва якое, а потым рассмяяўся.

— А табе што да таго? — спытаў ён.

— Ды непарадак...— адказаў Стась.

Тады рабочы чамусьці раззлаваўся:

— Ты што — вучыць нас хочаш? Рана яшчэ, браток! — і пайшоў прэч.

Стась таксама раззлаваўся, плюнуў і пайшоў сабе далей.

«Ды і сапраўды,— думаў ён,— на якое ліха мне гэта здалося? Калі не хочуць, дык і не трэба! Я ніякага дачынення да гэтай справы не маю. Нават ачко ніхто мне не залічыць».

І замест гэтага ён стаў думаць пра тое, як будзе купацца. Але сустрэчная машына вярнула яго думкі да трубы.

«А што калі зачэпіць? Будзе тады бяды... І якая тут работа? Узяў, адсунуў на паўметра — і ўсё. Нават і я мог

бы гэта зрабіць, падсунуўшы кій. Але — хай сабе, як хочуць».

Вось ён ужо выйшаў на поле. Рэчка відаць. Сонца пячэ, жаваранкі заходзяцца над галавой, у траве цвыркатня. А якая прывабная вада ў такі час!..

Толькі адна бяда: нешта карціць у галаве, рупіць, нібы забыўся што або дома якая непрыемнасць чакае; чагосьці не хапае, нешта перашкаджае, нібы кастрыцы за карак насыпалася...

І нарэшце Стась зразумеў, у чым справа: гэта ж труба перашкаджае!

Завярнуўся, пабег назад, схапіў па дарозе палку, падбег да трубы, падлажыў палку, адсунуў.

І тады адразу зрабілася спакойна, весела, і ніякай кастрыцы за каркам ужо не адчувалася, і ўвесь дзень быў самы найлепшы настрой.

...Цыбук гэтае лета жыў у МТС, дзе яго брат быў трактарыстам.

Бора Цыбук, як мы ведаем, набраў на сваім вяку ачкоў больш за ўсіх. Ён не адмовіўся б і яшчэ крыху падзарабіць, але тут ён быў адзін і ніхто не мог весці ўлік яго ачкам, апрача яго самога. Ну, а хто дасць веры, што ён назбіраў, скажам, семдзесят дзевяць ачкоў? Як даказаць гэта? Дома, калі што якое, дык можна праверыць. Калі ён аднаго разу прынёс адразу дзевятнаццаць ачкоў, дык ніхто не хацеў даваць веры, нават смяяцца пачалі. Ну, а калі праверылі, дык усе засталіся з носам.

А тут як праверыць?

Праўда, на які дзесятак ачкоў ён мог бы набраць дакументаў. А на семдзесят дзевяць не набярэшся, і ачкі прападуць дарма. А хто ж будзе дарма працаваць? А гнацца за дзесяткам не варта, калі ён за дзень дзевятнаццаць выганяў. А тут дык можна было б і сто выгнаць. Бо канкурэнтаў няма. Там на якінебудзь няшчасны акурак сто чалавек цаляе, а тут і здохлае кацяня ад цябе не ўцячэ.

Праўда, гэтае здохлае кацяня Цыбук закапаў, але так сабе, без ніякай карысці, каб толькі пад нагамі не валялася. Але,

апрача здохлых кацянят, ёсць яшчэ другія рэчы. Няўжо ж усё гэта дарма рабіць?

І так ужо ў яго дарма прапала чатыры ачкі: ён выкінуў вялізны камень з баразны на агародзе, звязаў два калы ў плоце, потым вырваў вялізны куст крапівы, які рос на самай дарозе, дзе праходзілі босыя людзі, і, нарэшце, прывязаў да кала маленькую яблыньку, якая надта ўжо гнулася ад ветру. Усё гэта ён зрабіў так сабе, бо трапілася на вочы і само прасілася, каб гэта зрабіць. Хай ужо чатыры ачкі прападаюць. Але гэта не значыць, што ўвесь час трэба дарма рабіць.

Ён сабе хадзіў, глядзеў, цікавіўся, як працуюць машыны, як іх рамантуюць, часам нават дапамагаў, але рабіў гэта, як звычайны грамадзянін, а не тэвэтэтавец, і нічога такога не вышукваў, не «страляў». Уласна кажучы, і тут сустракаліся рэчы, якія фактычна з'яўляюцца ачкамі і якія па справядлівасці трэ было б залічыць. Але што ты зробіш, калі ўліку няма. Няўжо ж патрабаваць дакумент, што вось «Барыс Цыбук заўважыў, як малое дзіця сыпанула ў маслёнку пяску, а з гэтай маслёнкі хацелі ўжо змазаць машыну, а ён, Барыс Цыбук, папярэдзіў»? Нават сорамна прасіць такі дакумент, а тым часам ачко і прапала.

Ды ці мала такіх ачкоў? Вось, скажам, нядаўна ён заўважыў дзірку ў масце. Дзірка невялікая, круглая і зусім не перашкаджае машынам хадзіць. А вось конь аднаго разу ледзь не зламаў нагу. Вылаяўся калгаснік і паехаў далей. Не чакаць жа, пакуль другі конь зусім зламае нагу. Ну, Цыбук узяў ды і забіў гэтую дзірку. Добрае ачко было! Але зноў жа прапала дарма. Нават ніхто не ведаў пра гэта.

І гэтак на кожным кроку. Нават крыўдна робіцца. Здаецца, і не глядзіш, і не думаеш, а яно нібы наўмысля, само так і лезе ў вочы. Можна, вядома, і прайсці міма, не рабіць. Але як ты будзеш спакойна глядзець, калі ў пуні ў страсе дзірка свеціцца над самым сенам? Праўда, дзірачка маленькая, і ніхто яе не бачыць, але ўвосень, напрыклад, нямала вады праз яе можа трапіць на сена. Калі прапала шэсцьдзесят шэсць ачкоў, хай ужо прападае і шэсцьдзесят сёмае!

Або ўзяць ураджай. Пільнуюць жыта сярод поля (ды і піль-

нуюць, мусіць, нядбала!), а не бачаць, што дзеецца каля ракі. Кожны член ТВТ адразу заўважыў бы, што нацярушана каля берага. Значыцца, нехта ціхенька пад'язджае на лодцы і цягне з берага. Кожны тэвэтэтавец здагадаўся б агледзець усе лодкі, ці няма там зярнят. А тут ніхто не здагадаўся, пакуль сам Цыбук не знайшоў. Ну, адсюль ужо і дабраліся да лодара Кухальскага.

Аб гэтым факце так загаварылі навокал, так хвалілі Цыбука, што ён на гэты раз адважыўся папрасіць:

— А дасцё мне паперку, што гэтае ачко я зарабіў?

— Якое ачко? Пры чым тут ачко? Што за ачко?

Цыбук вымушаны быў растлумачыць, у чым справа. Ну і смяяліся ж людзі! Але такім смехам, які кожны быў бы рады пачуць.

А ў выніку ўсяго гэтага выйшла такое, чаго Цыбук і сасніць не мог бы. Выступіў камсамолец Карнейчык і сказаў:

— Ад імя камсамольскай ячэйкі абяцаем табе выдаць пасведчанне не толькі на гэтае «ачко», але на ўсе, якія ў цябе будуць. Валяй, браток, далей! І яшчэ зарабі адно вялізнае «ачко» — арганізуй ТВТ сярод нашых дзяцей.

Пасля канікул Цыбук прадставіў у галоўны штаб Таварыства ваяўнічых тэхнікаў велізарнейшы «рэестр» з афіцыйнымі подпісамі і пячаткай. У гэтым рэестры былі пералічаны сто дзевяноста сем ачкоў, сярод якіх і той куст крапівы...

Зусім іншы характар мела дзейнасць тэвэтэтаўцаў у піянерскім лагеры. Тут захавалася арганізаванае баявое ядро ТВТ.

Першыя ж выступленні тэвэтэтаўцаў зацікавілі і захапілі ўвесь лагер. Праз некалькі дзён лагер ужо складаў адзінае Таварыства ваяўнічых тэхнікаў.

У першую чаргу пачалося паляванне ў сваім лагеры. І, дзіўная рэч, адкуль толькі ўзялося гэтулькі «здабычы»? Здавалася, учора яшчэ ўсё навокал было ў парадку, піянеры жылі тут, хадзілі і нічога такога не бачылі. А сёння раптам нібы з-пад зямлі вырасла столькі недахопаў, што на кожнага хапіла досыць «ачкоў».

Вось ужо, здаецца, усё выяўлена і папраўлена, ні да чаго

нельга прычапіцца. А тым часам, глядзіш — старыя тэвэтэтаўцы ўсё знаходзяць ды знаходзяць, яшчэ ды яшчэ. Якім сачынам? Адкуль? Напружыліся новыя, прыгледзеліся — сапраўды ёсць, толькі яны не ўмелі бачыць так, як бачаць старыя.

Не прайшло і тыдня, як увесь лагер нібы змяніў сабе вочы. І перад гэтымі вачыма адкрыўся нібы новы свет.

Узяць хоць бы такую рэч, як драўляныя прыступкі на ганку. Адна дошка тут даўно ўжо адарвалася і падскаквала, калі на яе ступіць нагой. Кожны рызыкаваў зламаць нагу. А калі нага трапляла на канец дошкі, дык рызыкаваў яшчэ і лоб ні ў чым не вінаватага суседа.

І калі Клава пачала прыбіваць гэтую дошку, дык шмат дзяцей (яшчэ не тэвэтэтаўцаў) акружылі яе і дзівіліся:

— Гэта ж і кожны з нас даўно мог бы зрабіць!

Або колькі разоў яны бегалі да ракі купацца, колькі разоў той ці іншы піянер чапляўся за востры корань ссечанага куста каля самай сцежкі, не адзін з іх нават плакаў,— і толькі цяпер яны заўважылі, што гэта вельмі добрае «ачко».

Ды дзе там пералічыць усе «ачкі», якія раптам з'явіліся перад новымі вачыма!

Андрэй нават у лесе ўхітрыўся знайсці ачко: узяў ды вызваліў хвойку ад паваленага на яе сухога зламанага дрэва.

Але ўсё гэта было дробяззю ў параўнанні з паляваннем у суседнім калгасе. Вось тут дык была багатая здабыча! І атрады ТВТ безупынна рабілі налёты на калгас. Паміж атрадамі пачалося заўзятае спаборніцтва. Наперадзе, вядома, заўсёды быў атрад «ветэранаў» ТВТ, у які ўваходзілі старыя, заслужаныя ваякі — Андрэй, Паўлік, Клава, Яша, Соня, Толя, Ніна.

— Эх, каб яшчэ ды Цыбук быў тут! — часта шкадавалі яны.

Але трэба праўду сказаць, што яны і без Цыбука досыць паказалі сябе.

Аднаго разу, бадзяючыся па лесе, выйшлі яны на глухую лясную дарожку. Глядзяць — на ёй глыбокая калдобіна. Аб-

мінуць яе воз не можа, бо збоку дрэвы. Як ні круціся, а адно кола абавязкова павінна трапіць у гэтую калдобіну. І сляды паказвалі, што такім чынам цераз яе і пераязджалі. Але ж які нахіл павінен быў быць пры гэтым!

Раптам пачулася рыпенне колаў і між дрэў паказаўся воз з сенам.

— Ану, як ён праедзе? — пацікавіліся піянеры.

Але чалавек, відаць, і сам ведаў гэтую калдобіну. Ён загадзя нарыхтаваўся, нават упёрся плячом у воз і асцярожна накіраваў каня.

Заскрыгаталі колы, нахіліўся воз, вось-вось перакуліцца, напружыліся жылы на лобе чалавека, кінуліся і дзеці падтрымліваць воз, а конь, здавалася, зараз разарвецца ад натугі...

Воз выехаў, а чалавек, падзякаваўшы дзецям, спакойна пайшоў сабе далей, нібы нічога з ім і не было.

— Давайце возьмем гэтае ачко,— сказаў Паўлік таварышам.

— Каб дастаць лапату, дык можна было б,— адказалі яму.

Пакуль дзеці раіліся, пад'ехаў другі воз. Зноў пачалася такая самая працэдура, з той толькі розніцай, што дзядзька трапіўся гарачы і ўвесь час лаяў і калдобіну, і каня, і сена, і ўвесь свет.

Можа, таму пераправа выйшла няўдалай — воз перакуліўся. Лаянка яшчэ больш узмацнілася. Але, нягледзячы на гэта, воз застаўся ляжаць на баку.

Чалавек хадзіў вакол воза і не ведаў, як да яго прыступіцца. Круціліся навакол і піянеры.

Раптам Андрэй крыкнуў:

— Ёсць прапанова! Калі прывязаць вяроўку да воза, а другі канец абкруціць вакол дрэва і цягнуць, тады і нашых сіл хапіла б, каб падняць. Абы толькі вяроўка вытрымала.

Чалавек паглядзеў на яго, усміхнуўся і сказаў:

— Але, праўду кажаш, каб табе вялікім вырасці.

На вялікі жаль для Андрэя, вынаходства яго не спатрэбілася. Насустрач пад'ехала двое пустых драбін, і гэтага падмацавання хапіла, каб падняць воз.

Людзі паехалі кожны ў свой бок. На дарозе засталіся толькі сляды расцярушанага сена.

— Давайце зараз завалім яе ламаччам і каменнем, — прапанаваў Яша.

Закіпела работа. Хутка над калдобінай была ўжо куча галля. Тады дзеці весела пачалі скакаць па ёй, каб прытаптаць. Потым пачалі збіраць і кідаць каменні. Пасля таго зноў навалілі ламачча, зноў накідалі каменняў, нават рукамі зямлі падсыпалі. А нарэшце пакрылі ўсё гэта яловымі лапкамі.

Так яны працавалі, мусіць, гадзіны паўтары, змарыліся вельмі, але задавальненне было мацней за стому.

І калі яны ўжо збіраліся ісці дадому, вярнуліся з вазамі сена тыя самыя дзядзькі, што памагалі падымаць воз. Яны ўжо здалёк нарыхтаваліся да небяспечнай пераправы. Задні воз спынілі і абодва падпёрлі пярэдні. Калі ж пад'ехалі да калдобіны, то здзіўлена пачалі азірацца навокал.

— Няўжо гэта вы? — спыталіся яны.

— А то хто ж? — з гонарам адказалі тэвэтэтаўцы.

— Ай-яй-яй! Вось якія малайцы. А колькі ж пакуты было!.. Вельмі дзякуем.

РАЗДЗЕЛ ТРЫНАЦЦАТЫ,

апошні, таму ў ім гаворыцца, як Цыбук трапіў у «мёртвыя душы», як быў пакараны адзін дзёрзкі камень і як, нарэшце, важаты сказаў тое, што хацеў сказаць, але не сказаў у раздзеле дзевятым.

Калі ўвосень зноў сабралася ў школе ўсё Таварыства ваяўнічых тэхнікаў ды падлічыла ачкі, то выйшла нешта незвычайнае: семнаццаць тысяч восемсот восемдзесят дзевяць!

Наперадзе, вядома, ішоў Цыбук: ад заснавання ТВТ ён набраў шэсцьсот трыццаць сем ачкоў.

Лік членаў ТВТ усё павялічваўся ды павялічваўся.

Самымі актыўнымі былі навічкі. Яны заядла ганяліся за ачкамі, як той Цыбук. Але праз некаторы час то адзін, то другі трацілі цікавасць і адставалі. Затое на месца іх прыходзілі новыя,— і так увесь час у арганізацыі быў прыліў і адліў.

Але ўсё ж такі праз паўгода было заўважана, што актыў ТВТ не расце, а змяншаецца.

На савеце атрада ўзнялі трывогу:

— На паперы лічыцца вельмі многа членаў ТВТ, а фактычна, можа, і паловы іх няма. Пагуляюць, пагуляюць, а потым і кідаюць. А мы так і не ведаем, колькі ў нас сапраўдных членаў. Нават такія ветэраны, як Цыбук, адышлі ад гэтай справы; ён ужо даўно не даваў нам ніякіх ачкоў. А такія, як Карачун, пагулялі з тыдзень і зусім кінулі. Трэба што-небудзь такое зрабіць, каб ажывіць дзейнасць ТВТ. Калі работа яшчэ ідзе, дык толькі ў навічкоў, а старыя, за невялікім выключэннем, адпадаюць. Ці можам мы ўсіх іх лічыць членамі ТВТ?

Трывога тэвэтэтаўскага актыву, вядома, была слушная, але мы пад сакрэтам скажам, што сярод дзяцей такая справа — рэч самая звычайная. Усе мы ведаем, што большасць дзяцей вельмі ахвотна хапаецца за новую для іх справу і досыць хутка кідае яе, каб захапіцца яшчэ якой-небудзь іншай. Можна наглядаць, як у якім-небудзь раёне горада шмат дзяцей бегаюць па дварах і тратуарах і коцяць перад сабой абручы ці калёсікі. Тыдні, месяцы чуецца тут дзынканне гэтых абручоў, а потым усё сціхае. Абручы цяпер катаюць недзе ў другім канцы горада, а тут дзеці захапіліся пусканнем «галубоў» з паперы. Цяпер ужо заўсёды бачыш тут толькі галубоў. Самім дзецям здаецца, што яны ніколі не пакінуць гэтай гульні. Але хутка яны забываюцца на галубоў і пачынаюць майстраваць нейкія драўляныя штуковіны на шарыкападшыпніках. Трымаючыся за «руль», яны шпараць на адной назе па тратуарах, і вы безупынна чуеце з розных бакоў гэтае тарахценне. А потым і гэты перыяд праходзіць. Надыходзіць перыяд, скажам, збірання паштовых марак або так званых «пераводных карцінак».

Так бывае ўсюды, так робіць большасць дзяцей. Але ёсць і меншасць, якая не кідаецца ў розныя бакі, а доўга займаецца адной справай. Такія дзеці звычайна больш сталыя, свядомыя, энергічныя і дысцыплінаваныя. З іх пазней выходзяць выдатныя спецыялісты па якой-небудзь справе.

Зусім зразумела, што і ў дзейнасці ТВТ адбываліся такія самыя працэсы. Зацікавіцца, загарыцца чалавек, нават калі кладзецца спаць, то ўжо думае, дзе заўтра знайсці ачко,— а потым і астыне. Праз некаторы час, калі арганізацыя добра працуе, ён можа і зноў захапіцца гэтай самай справай. Толькі найбольш свядомыя і настойлівыя не пакідалі работы доўгі час. А такіх, вядома, было менш. Яны не хацелі мірыцваца з такім становішчам і паднялі пытанне на сходзе. Але важаты слухаў іх выступленне спакойна і нават чагосьці ўсміхаўся.

— Я нічога не маю супраць таго, каб якім-небудзь чынам яшчэ больш ажывіць дзейнасць ТВТ,— сказаў ён нарэшце,— але што датычыцца росту колькасці членаў ТВТ, то я гляджу зусім інакш. Я лічу, што Таварыства ваяўнічых тэхнікаў — гэта такая арганізацыя, у якой колькасць членаў толькі можа расці, а змяншацца ніколі не можа.

— Ну? Так ужо і ніколі? — пачуўся недаверлівы голас.

З усіх бакоў пасыпаліся недаўменныя пытанні і заўвагі:

— Мы ж сваімі вачыма бачым, як у нас многа членаў адсейваецца!

— У кожнай арганізацыі бывае адсеў!

— Не лічыць жа сапраўднымі членамі і ўсе «мёртвыя душы»!

— А вось наша арганізацыя тым і вызначаецца,— падхапіў важаты,— што ў ёй усе, як вы кажаце, «мёртвыя душы» ўсё роўна застаюцца членамі яе.

Дружны смех перапыніў яго словы.

— Куды ж варта такая арганізацыя?

— Вось дык арганізацыя!

Піянеры аж гарэлі ад цікавасці. Вось ужо другі раз гэты важаты гаворыць нейкія незразумелыя рэчы. У чым тут сакрэт? Бязглуздзіца, дый годзе!

А важаты, усміхаючыся, казаў:

— Таму я і называю ТВТ адзінай арганізацыяй, якая і пры гэтых умовах захоўвае ўсю сваю вартасць. Каб пераканацца, я прапаную зрабіць вопыт. Возьмем камень і паложым пасярод тратуара, дзе павінны прайсці Цыбук ці Карачун. Апрача

іх, пэўна і яшчэ хто з «мёртвых душ» пройдзе. Вось тады і паглядзім, з'яўляюцца «мёртвыя душы» сапраўднымі членамі ТВТ ці не?

Была ўжо вясна. Дзень выбралі добры. Вызначылі месца. Гэта была вуліца, так сказаць, сярэдняя: не ў цэнтры горада і не зусім ужо на ўскраіне. Адпаведна гэтаму і публікі праходзіла не вельмі многа, а гэта давала магчымасць палажыць камень, не звяртаючы на сябе ўвагі людзей.

Важаты, Клава, Яша, Паўлік і Андрэй выбралі добрую пазіцыю, схаваліся і пачалі наглядаць.

Але з першага ж разу справу сапсаваў нейкі стары чыгуначнік. Ішоў ён ціха, павольна, убачыў камень пасярэдзіне тратуара, прыпыніўся, а потым узяў яго абедзвюма рукамі ды адкінуў убок.

— Лепш ужо ён на сённяшні дзень быў бы менш акуратным! — прабурчаў важаты.— Але нічога не зробіш. Бяжы, Андрэй, палажы назад.

Андрэй пабег, падпільнаваў зручны момант і зноў палажыў камень.

Прайшло некалькі чалавек, якія старанна абмінулі камень.

Пасля гэтага паказалася пяць вучняў з малодшых класаў адзінаццатай школы.

— Ну, гэтыя пэўна возьмуць! — засмяяўся Паўлік.— Яны ж новыя тэвэтэтаўцы.

А тыя ўжо навыперадкі беглі да каменя з крыкамі «ачко»! Ды яшчэ засунулі камень так, што беднаму Андрэйку прыйшлося з цяжкасцю яго здабываць.

Пасля іх паказалася некалькі вучняў з іншых школ. Адзін пераскочыў цераз камень, другі штурхануў яго нагой, а трэці зусім не звярнуў увагі.

— Вось бачыце, што значыць не члены ТВТ! — сказаў важаты сваім піянерам.

Але ўслед за імі беглі яшчэ два вучні, таксама з чужой школы, і беглі, здаецца, спецыяльна да каменя. Так яно і выйшла.

— Ёсць ачко! — крыкнулі яны і ўбралі камень.

— Чужыя тэвэтэтаўцы! — радасна зашапталі нашы піяне-

ры, а «ветэраны» адчулі прыемнае хваляванне: што ні кажы, а гэта ўсё ад іх пачалося. І вось цяпер яны бачаць, як зусім незнаёмыя, «чужыя» вучні робяць тое ж самае. Не менш задаволены быў і важаты.

— Дзеля такога выпадку я гатоў лішні раз патурбавацца! — сказаў Андрэй і пабег да каменя.

Тым часам каля каменя сустрэлася больш людзей. Нехта зачапіўся, штосьці сказаў. Калі разышліся,— камень ляжаў на месцы.

Потым знайшоўся чалавек, які старанна нагою адкаціў камень убок. Андрэю прыйшлося адсоўваць яго назад.

Ледзь ён вярнуўся на месца, як таварышы зашапталі:

— Цыбук! Цыбук!

Усе напружыліся. А важаты адчуў, што ў яго нават сэрца застукала крыху мацней, як трэба. Гэта ж быў экзамен не толькі для Цыбука, але і для важатага, і для ўсёй справы ТВТ.

Цыбук ішоў сабе спакойна, глядзеў на аўтамабілі, пазіраў і на тратуар, але нішто не сведчыла, каб ён зацікавіўся каменем, хоць той павінен быў ужо трапіць яму на вочы.

Важаты скамянеў.

«Возьме ці не возьме?»

Ад гэтага для важатага залежала вельмі многа. Ён жа так смела і ўпэўнена сцвярджаў, што члены ТВТ не могуць быць «мёртвымі душамі», што яны заўсёды выканаюць свой абавязак. Нават узяўся даказаць гэта сваім піянерам. І калі цяпер Цыбук падвядзе, дык будзе сорам не толькі перад дзецьмі, але і перад самім сабой.

«Возьме ці не?»

Цыбук зусім падышоў да каменя. Спыніўся. Але замест таго, каб паглядзець на камень, загледзеўся на трактар, які шпарка каціўся на гумавых колах і цягнуў за сабой платформу.

Прыкра зрабілася важатаму. Піянеры пераміргнуліся.

Цыбук жа, не зводзячы вачэй з трактара, патроху пачаў нагінацца, узяў у рукі камень і аднёс яго ўбок.

— А што?! — ускрыкнуў важаты.— Ці не казаў я, што «мёртвых» членаў ТВТ няма? Калі ён навучыўся бачыць і ра-

зумець, то ўжо не можа не зрабіць гэтага, хоць бы нават не думаў і не хацеў!

— Ну, што датычыцца Цыбука, дык гэта рэч зразумелая! — адказалі піянеры.— Ён жа быў самы заслужаны член ТВТ.

— І такім застаецца цяпер! — цвёрда сказаў важаты.

— Хай будзе так. Але колькі ёсць такіх, якія і раней нічым сябе не праяўлялі. А вось ідзе адзін з такіх, Антось Аскерка!

Андрэйка да гэтага часу паспеў ужо зноў палажыць на месца камень. Зноў сталіся хлопцы ў засадзе.

Антось падышоў да каменя ў той момант, калі нехта спатыкнуўся аб яго і злосна сказаў:

— Кідаюць камяні на самай дарозе!

Антось прыпыніўся, засмяяўся, а потым убраў камень.

— Ну, вось вам і гэты! — з вялікім задавальненнем усклікнуў важаты.

Але і супраць гэтага быў высунуты довад: Антось звярнуў на камень увагу толькі таму, што перад яго носам другі чалавек спатыкнуўся. А каб гэтага не было, можа, ён і прайшоў бы міма.

— Але ж ён не толькі звярнуў увагу, але і сам убраў камень! — даводзіў важаты.— Пачакаем яшчэ Карачуна.

А пакуль Карачуна не было, здарыўся яшчэ адзін вельмі цікавы выпадак.

Па тратуары ішла жанчына і вяла за руку двухгадовае дзіця. Дзіця спатыкнулася аб камень і заплакала. Маці пачала суцяшаць яго:

— Ціха, ціха! Супакойся! Гэты камень цябе пакрыўдзіў? Вось мы зараз яго паб'ём! Во, во яму! Вось так! Во! Будзе ён ведаць, як крыўдзіць маленькую Томачку! Ну, ціха, ціха! Мы яму за гэта далі!

І «пабіты» камень сумна застаўся ляжаць на тым жа самым месцы.

Нарэшце з'явіўся жаданы Карачун.

Ішоў ён няроўна, то прыпыняўся, то бег, то адыходзіў убок. Убачыў сабаку і запусціў у яго каменем.

Важаты мала на яго спадзяваўся, але суцяшаў сябе тым, што папярэднія два выпадкі ўсё ж такі апраўдалі яго думкі.

Карачун адразу ўбачыў камень і штурхануў яго нагой. Цяжкі камень ледзь крануўся. Тады ён штурхануў яго другі раз. Потым ступіў два крокі наперад і спыніўся. Паглядзеў на камень, нешта падумаў, а потым... завярнуўся назад, узяў камень і адкінуў яго ўбок!

...На другі дзень важаты, сустрэўшы Цыбука, спытаўся:

— Ну што, здабыў сёння ці ўчора якое-небудзь ачко?

— Ат, хопіць мне і тых, што я набраў! — усміхаючыся, адказаў Цыбук.

— А мы бачылі, як ты ўчора ўбраў камень з дарогі,— сказаў важаты.

— Ну дык што [redacted] таго? — адказаў Цыбук.— Няўжо ж пакідаць яго, каб ён перашкаджаў.

Праз некалькі дзён важаты склікаў актывістаў ТВТ, расказаў пра «экзамен для мёртвых душ» і сказаў далей:

— Памятаеце, калі мы абмяркоўвалі статут Таварыства ваяўнічых тэхнікаў, я не скончыў адной думкі і вы тады вельмі зацікавіліся? Я тады і меў на ўвазе прыблізна тое, што цяпер мы ўбачылі. Гэта значыць, што ў дзейнасці Таварыства ваяўнічых тэхнікаў не толькі ачкі не маюць ніякага значэння, але нават і самая іх работа не з'яўляецца сама па сабе галоўнай задачай. Тады я гэтага вам не сказаў, каб вы не страцілі цікавасці да вашай справы як гульні. А цяпер вам, як загартаваным тэвэтэтаўцам, я ўжо магу сказаць, што ніякай бяды няма, калі многія вашы члены ўжо не цікавяцца ачкамі. Важна, каб яны хоць некаторы час пабылі тэвэтэтаўцамі, а потым яны ўжо назаўсёды застануцца імі, хоць да старасці. Самая галоўная карысць ад Таварыства ваяўнічых тэхнікаў не ў тым, што яны цяпер зробяць, а ў тым, што яны і надалей застануцца руплівымі гаспадарамі ў нашай вялізнай агульнай гаспадарцы. Вось што крыецца за вашай «гульнёй».

Магу яшчэ сказаць вам, што хутка для Таварыства ваяўнічых тэхнікаў будзе створана добрая база — спецыяльная майстэрня ТВТ, дзе будзе ўсё, што патрэбна для ўсялякіх работ.

Кожны з вас зможа пайсці туды і з дапамогай інструктара зрабіць сабе ўсё, што захоча, незалежна ад таго, па якой гэта будзе спецыяльнасці — слясарнай, сталярнай, абутковай ці іншай якой. Трэба толькі адно: каб мог зрабіць сам. А мы ўжо ведаем, што кожны, калі захоча, многае можа зрабіць сам. Пэўная спецыяльнасць патрэбна для больш важных і складаных работ, а прасцейшыя можа зрабіць кожны. Вы самі гэта ўжо даказалі.

Для Таварыства ваяўнічых тэхнікаў адкрывалася шырокая дарога ў будучае.

1934 г.

РАЗДЗЕЛ ДАДАТКОВЫ,

напісаны праз пятнаццаць гадоў, дзе гаворыцца аб сустрэчы аўтара з тэхнікам Барысам Іванавічам.

У 1948 годзе газета камандзіравала мяне на будаўніцтва аднаго з дамоў у Мінску. Я павінен быў азнаёміцца з ходам будаўніцтва, з людзьмі яго і напісаць у газету артыкул.

Сустрэлі мяне ахвотна, дапамагалі мне, давалі тлумачэнні. Усе будаўнікі ведалі мяне як «карэспандэнта» і прозвішчам маім не цікавіліся.

З першага разу мяне зацікавіў нехта Барыс Іванавіч, якога я яшчэ не бачыў.

— Барыс Іванавіч сказаў,— гаварылі рабочыя такім тонам, нібы гэты Барыс Іванавіч немаведама хто такі.

А між тым мне вядома было, што галоўны інжынер, напрыклад, зусім не Барыс Іванавіч. Я чуў,— нават і ён бадай-што такім самым тонам, як рабочыя, казаў:

— Трэба пагаварыць з Барысам Іванавічам...

Калі я спытаўся, хто такі Барыс Іванавіч, мне сказалі:

— Наш старшы тэхнік. Залаты чалавек.

«Гэта, мусіць, самы стары і вопытны тэхнік»,— падумаў я і адразу ўявіў сабе суровага дзядзьку з сівымі вусамі, сур'ёзнага, пільнага, усё ведаючага. Пагаварыць з ім было б вельмі цікава і карысна. Але сустрэцца мне з ім давялося толькі праз

пару дзён, бо трапляў я сюды ў такія мінуты, калі яго не было.

Нарэшце мне рабочыя сказалі:

— Вунь ідзе Барыс Іванавіч!

Я зірнуў і ўбачыў... зусім не сівога дзядзьку, а маладога хлапца, як здавалася, гадоў дваццаці, маленькага, з круглым тварам, вострым носікам і рухавымі вочкамі.

Мяне прадставілі яму:

— Гэта — карэспандэнт, якога прыслалі на будаўніцтва.

— Вельмі прыемна,— сказаў ён, але зараз жа, убачыўшы машыну, якая згружала жалезныя трубы, кінуўся да яе.

— Хто вам сказаў згружаць тут? — пачуў я яго голас.— Глядзіце, колькі прыйдзецца цягаць іх узад і ўперад, калі возьмуцца за работу. Колькі пойдзе лішняй працы і часу! Згружайце вось тут. І канцамі ў гэты бок, каб лепей было браць.

«Ого! — падумаў я.— Хлопчык адразу ўсё бачыць!»

У гэты час да яго падышоў брыгадзір, і тэхнік пайшоў з ім далей. Узышоўшы на рыштаванне, ён у адным месцы раптам стаў падскакваць. Мне зрабілася смешна: адразу відаць, што вясёлы хлопчык... А ён пасля таго апусціўся на калені і да чагосьці стаў прыглядацца. Потым я зноў пачуў яго голас:

— Эге! Ды тут дошкі калі-небудзь могуць адарвацца. Тут можа хто-небудзь загінуць. Як гэта ніхто не заўважыў?..

Дык вось чаму ён скакаў! Вось табе і «хлопчык»!

Я падаўся ў той бок, дзе былі яны. Тэхнік заўважыў і крыкнуў зверху:

— Выбачайце, я зараз!

Але мне зусім непатрэбна было яго выбачэнне; мне хацелася спачатку панаглядаць за ім збоку.

— Нічога. Я пачакаю,— адказаў я.

Чым больш я за ім наглядаў, тым больш здзіўляўся яго пільнасці, кемлівасці, спрактыкаванасці. У адным месцы ён растлумачыў каменшчыку, як лепей размясціцца, каб работа ішла спарней, у другім заўважыў нейкую калодку пад нагамі рабочых, якая перашкаджала ім хадзіць. Адным словам, ён усё ведаў, усё бачыў. Значыцца, нездарма ўсе яго так шанавалі. Абавязкова трэба з ім пагаварыць у вольны час.

Калі нарэшце ён падышоў да мяне, я спытаў:

— Выбачайце, колькі вам год?

Ён засмяяўся і сказаў:

— Дваццаць сёмы ідзе.

— Няўжо? — здзівіўся я.— Я думаў, не больш за дваццаць.

— Гэта, мусіць, таму, што я нежанаты,— весела пажартаваў ён.

— Мне вельмі хацелася б з вамі пагаварыць у вольны час,— сказаў я.— Калі дазволіце, я зайшоў бы да вас.

— Што ж, можна,— адказаў ён.— Я буду дома ў восем гадзін. Жыву я недалёка (ён зірнуў на гадзіннік). Цяпер іду ў сталоўку на абед. Калі хочаце, пакажу сваю хату.

Мы выйшлі на вуліцу.

— Мне здаецца, я вас недзе бачыў,— сказаў Барыс Іванавіч, зірнуўшы на мяне.— Ці не былі вы ў Мазыры?

— Не даводзілася,— адказаў я.

— А на фронце?

— Таксама не быў.

— Значыцца, мне здалося,— сказаў ён.

Мы завярнулі ў меншую вуліцу. Па раўчуку ля тратуара аднекуль цякла вада. У адным месцы зрабілася нібы грэбля, і вада стварыла вялікую лужыну. Нейкае малое дзіця збіралася ў яе лезці...

Раптам мой спадарожнік падняў з зямлі трэсачку і рассунуў гэтую грэблю.

Вада мігам сцякла.

— Ёсць ачко! — сказаў ён, кінуўшы трэсачку.

— Што, што вы сказалі? — спыніўся я ад здзіўлення.

— Гэта мы калісьці ў дзяцінстве так гулялі,— сказаў ён.— Зробім што-небудзь такое і...

— Значыцца, вы былі тэвэтэтаўцам? — перапыніў я.

Цяпер ужо ён прыпыніўся ад здзіўлення.

— А вы адкуль ведаеце?

— Чытаў такую кніжку,— адказаў я.

Тым часам мы падышлі да невялікага аднаўленага дома, і Барыс Іванавіч сказаў:

— Вось тут мая зямлянка. У гэтыя дзверы, направа. У дваццаць нуль-нуль буду чакаць вас.

Гэтая ваенная тэрміналогія сведчыла, што Барыс Іванавіч быў на вайне.

Я завярнуў налева, ён пайшоў прама.

У вызначаны час я ўваходзіў у яго «зямлянку». Гэта быў досыць вялікі светлы пакой з «халасцяцкім» абсталяваннем, але не з халасцяцкім парадкам. Усё тут было на сваім месцы, усё дапасавана адно да другога. Кожная рэч мела сваё пэўнае месца і з такім разлікам, каб у кожную хвіліну, не турбуючыся, можна было дастаць яе і паставіць на месца.

— Адразу відаць, што тут жыве былы тэвэтэтавец,— заўважыў я.

— Чаму былы? — нібы пакрыўдзіўся Барыс Іванавіч.— Наш важаты казаў, што тэвэтэтаўцы ніколі не могуць быць былымі, што яны да самай смерці застануцца сапраўднымі членамі Таварыства ваяўнічых тэхнікаў.

— І вы цяпер лічыце сябе такім?

Барыс Іванавіч жартоўна развёў рукамі і паківаў галавой:

— Нічога не зробіш. Нават каб і хацеў, то не мог бы пакінуць гэтай прывычкі. З тою толькі розніцай, што ачкі цяпер не запісваю.

Потым дадаў сур'ёзна:

— Я разважаю так: у сацыялістычным грамадстве ўсе людзі паступова становяцца такімі самымі «тэвэтэтаўцамі». Ну, а калі да таго яшчэ папрактыкаваўся ў дзяцінстве, то, вядома, назад не пойдзеш. У мяне і цяпер яшчэ захавалася кніжка «ТВТ».

— Няўжо?! — аж падскочыў я.

Справа ў тым, што я даўно ўжо шукаў гэтую кніжку, каб зноў выдаць яе, але ніяк не мог знайсці, бо фашысты ў часе акупацыі знішчылі нашы бібліятэкі. І вось шчаслівы выпадак дапамагае. Барыс Іванавіч крыху здзівіўся, што я так зацікавіўся гэтай кнігай, дастаў яе і падаў мне. Кніжка была такая патрапаная, што і захоўваць яе было нявярта. Я сказаў гэта Барысу Іванавічу.

— Як жа мне не захоўваць яе,— сказаў ён,— калі тут пра мяне самога напісана? Глядзіце, нават у загалоўку: «...як Цыбук здабываў ачкі».

— Дык вы... вы... Цыбук? — прашаптаў я, ледзь-ледзь дыхаючы.

— Як бачыце,— адказаў ён, відаць, задаволены, што яго імя зрабіла такое моцнае ўражанне, а потым спытаў: — Няўжо вы так добра ведаеце і памятаеце гэтую кніжку?

— Ведаю... памятаю...— казаў я, перагортваючы старонкі, а сам думаў: ці сказаць зараз жа, чаму я памятаю, ці пачакаць яшчэ? Калі скажу, то яго адносіны да мяне зараз жа зменяцца. Лепш я параспытаю яго, пакуль ён не ведае, хто я такі.

Што я яго не пазнаў, нічога дзіўнага няма: паміж дванаццацігадовым і дваццацісямігадовым чалавекам вельмі вялікая розніца.

Ды і яму, вядома, нялёгка было пазнаць чалавека, якога бачыў калісьці ў дзяцінстве раз ці два. Размаўляў я з ім, здаецца, толькі адзін раз, а ўсе звесткі сабраў ад іншых.

— Як вы лічыце,— сказаў я нарэшце,— ці правільна напісаў аўтар пра вас?

Ён усміхнуўся.

— Як вам сказаць? Увогуле правільна, а паасобку — многа няправільнага. Вось, напрыклад, ён піша, што я быў нейкі пасіўны, безуважны, нічым не цікавіўся. Гэта аўтар выдумаў ці яму хто няправільна сказаў. Мне здаецца, я заўсёды быў такім, як цяпер. Потым аўтар навыдумляў мне многа ачкоў, якіх я не зарабляў, і многа слоў, якіх я не казаў.

— А наконт вашага заўзятага палявання на ачкі, наконт «рэестра»?

Цыбук шчыра засмяяўся.

— Што тычыцца ачкоў, то я сапраўды ганяўся толькі за імі і калі што рабіў, то толькі дзеля іх. І «рэестр» таксама мне выдалі. Я тады не ведаў, што яны з мяне жартуюць. Але аўтар дадаў у гэтым рэестры добрую сотню ачкоў.

— Скажыце, а вы не крыўдзіцеся на яго, што ён сёе-тое выдумаў?

— Не. Усё ж такі, калі чытаеш кнігу, то гэты Цыбук здаецца сімпатычным хлопчыкам. Чаго мне крыўдзіцца? Наадварот, я вельмі ўдзячны яму.

— А вы сустракаліся з аўтарам, гаварылі з ім?

— Размаўляў з ім адзін раз. Ён, здаецца, трохі нагадваў...— тут ён уважліва паглядзеў на мяне, а потым устаў.— Выбачайце, а можа... гэта вы?

— Так, гэта я...

Далейшае ўжо нецікава для чытачоў. Скажу толькі, што Цыбук выручыў мяне і даў сваю кнігу. Значыцца, я не дарма турбаваўся, аддаючы яму столькі ўвагі ў сваёй кнізе.

Яму ж за гэта я абяцаў некалькі экземпляраў новага выдання.

1949 г.

ПАДАРОЖЖА Ў ПЕКЛА

Казка

Гістарычная даведка

Усе мы ведаем, якое значнае месца ў жыцці народа займаюць чэрці, пекла і розныя падобныя рэчы. Вы не пражывяце ніводнага дня без чорта, а калі часам і забудзецеся на яго, то хто-небудзь з суседзяў абавязкова напомніць.

Калі хто моліцца богу, дык робіцца гэта толькі праз чорта. Каб яго, праклятага, не было, то не трэ было б і маліцца. Дзеля чаго тады маліцца? Толькі страх перад чортам прымушае. Выходзіць, такім чынам, што сам чорт працуе на карысць богу. А кажуць яшчэ, што чорт ідзе супраць бога!

Вылічана, што адзін толькі наш народ у першыя гады пасля рэвалюцыі выдаткоўваў на гэтую справу столькі грошай, колькі выдаткоўвалася на ўсе школы. Апрача таго, за год марнавалася больш 1 500 000 000 рабочых дзён.

Во колькі могуць з'есці чэрці!

А тым часам кажуць, што ніякіх чарцей няма, што ўсё гэта выдумана, што ніхто ніколі не бачыў іх і г. д. Ці можа так быць? Хіба можна, каб мільёны людзей верылі ў тое, чаго зусім няма на свеце?

Таму мы захацелі вывучыць гэтае пытанне дасканала.

І што ж вы думаеце? Мы павінны былі паверыць, што і чэрці, і пекла існуюць.

Мы знайшлі шмат друкаваных кніжак, дзе гаворыцца пра чарцей і пекла. А як жа не верыць друкаваным кніжкам?! Гэтак, бараны божа, можна не даць веры і нашай кніжцы.

Галоўная літаратура наконт пякельных спраў — біблія, евангелле, талмуд, каран і тысячы іншых рэлігійных кніг. Але ўсе яны нейкія блытаныя, незразумелыя, нібы пісаў іх п'яны ці непрытомны чалавек. Тлумачыцца гэта тым, што пісаны яны надта даўно, дзве-тры тысячы гадоў назад.

Ёсць яшчэ славутая кніга вядомага італьянскага паэта Дантэ — «Боская камедыя». Ён так дасканала апісаў той свет,

што яго кнігу і цяпер вывучаюць у розных універсітэтах. Але і ў гэтай кнізе пекла апісана такім, якім яно было шэсцьсот год назад.

Знайшлі мы і некалькі пазнейшых кніжак, але вельмі ненадзейны народ пісаў іх: усё нейкія цёмныя манахі ды манашкі. Самая апошняя з іх — манашка Тэкля, якая была ў пекле 5 студзеня 1905 года [1]. Гэтая Тэкля нават зусім была непісьменная, і, нам здаецца, яна Дантэ і ў падноскі не гадзіцца.

Наконт апошняй кнігі нават і нас узяло сумненне: ці не наблытала крыху паважаная Тэкля? У 1905 годзе яна апісвае пекла акурат гэтак жа, як апісвалася яно тысячы год назад. Хіба можа так быць? Ці можна дапусціць, што на працягу тысяч год у пекле не адбылося ніякіх змен?

Калі заснавалася пекла, на зямлі, паводле біблії, было два чалавекі: Адам і Ева. Потым людзей станавілася ўсё болей і болей, а цяпер мы маем ужо каля трох мільярдаў! Можна сабе ўявіць, якая павінна быць розніца паміж колькасцю жыхароў у пекле тады і цяпер!

А калі прымем яшчэ пад увагу, што цяпер народ наогул сапсаваўся і не надта імкнецца ў рай, што за адны толькі суткі на зямлі памірае каля 120 000 чалавек, тады мы з дапамогай вышэйшай матэматыкі можам бадай дакладна вылічыць, што ў першыя стагоддзі ў пекле магло быць усяго некалькі тысяч грэшных душ, а цяпер каля 25 689 000 000 000.

Між тым колькасць чарцей, якія павінны абслугоўваць пекла, засталася тая самая, што і спачатку. Згодна з падлікамі духоўных спецыялістаў, чарцей у пекле 1 405 928 галоў — ні больш ні менш. Ды, апрача таго, 72 тысячы чартоўскіх князёў, графоў, баронаў ды іншых арыстакратаў [2].

Гэта значыць, што калі раней аднаму чорту прыходзілася мардаваць, скажам, 10 грэшнікаў, то цяпер ужо на яго долю прыпадае 17 300 000!

Ды з такой нагрузкай сам чорт шыю сабе зломіць!

---

[1] Кніга надрукавана ў Пецярбурзе ў 1911 г. і прагледжана прафесарам акадэміі А. Глаголевым.

[2] Гэтыя лічбы ўзяты з кніжкі І. М. Верына «Аб інквізіцыі».

Возьмем для прыкладу апрацоўку душ віламі. Што ні кажы, а каб адзін раз усадзіць вілы ў бок, потым іх вырваць, павярнуцца, пацэліць у другога,— патрэбна не менш мінуты часу. Не кажучы ўжо аб тым, што толькі дурань будзе спакойна стаяць і чакаць, пакуль яго пырнуць; мусіць, кожны будзе ўхіляцца і выкручвацца як мага.

І вось, калі раней чорт на свае дзесяць душ траціў дзесяць мінут, то цяпер на ўсю падначаленую яму грэшную армію патрэбна ўжо 17 300 000 мінут, іначай кажучы,— 33 гады! Пры ўмове, што ён не будзе адпачываць ніводнай хвіліначкі.

У біблії, на першай жа старонцы, сказана, што бог, папрацаваўшы шэсць дзён над стварэннем свету, сёмы дзень адпачываў. Сам усемагутны бог стаміўся праз шэсць дзён працы, а што ж тады казаць пра няшчаснага чорта?

Не, тут нешта не тое! Не можа быць такога становішча ў пекле, каб грэшнік мог чакаць 33 гады, пакуль адзін раз атрымае віламі ў бок. Гэта ж не пякельныя пакуты, а гульня нейкая. Навошта тады і пекла?

Або возьмем смаляны цэх, дзе грэшнікі кіпяць у катлах са смалой.

Калі пасадзіць у кацёл хоць дзесяць чалавек (а ў першабытных катлах столькі і не змесціцца), то на аднаго чорта прыпадзе 1 700 000 катлоў. Зойме такі цэх 170 гектараў. Вось і бегай па ім, задраўшы хвост!

Каб дагледзець адзін кацёл, падліць смалы, падправіць агонь, памяшаць варыва з грэшнікамі, праверыць колькасць іх, стукнуць каго-небудзь з іх па галаве, вылаяцца хоць трошкі,— напэўна патрэбна не менш як 15 мінут. Памножце іх на 1 700 000 катлоў і вы атрымаеце... 50 гадоў! Гэта значыць, што чорт вернецца да першага катла толькі праз паўвека. Які ж дурань будзе сядзець усе гэтыя гады ў кіпячай смале і чакаць чорта лысага? Вядома, усе павылазяць, калі ён адыдзе.

Адным словам, з якога боку ні паглядзець,— усё бязглуздзіца выходзіць, калі паверыць свяшчэнным кнігам і сведкам накшталт паважанай Тэклі.

І вось, нарэшце, нам пашанцавала знайсці сведак, якія

далі нам апошнія, самыя дакладныя звесткі пра пекла. Гэта піянеры 219-га атрада, 3-га звяна Янка Гуж і Юрка Пыж, якія самі былі ў пекле 13 чэрвеня 1926 года.

Іх звесткі, безумоўна, заслугоўваюць веры, бо адначасова адпавядаюць і рэлігійным кнігам, і сучаснасці, і наогул розуму.

І. Як піянеры шукалі дарогу ў пекла

Янка Гуж прыйшоў дадому вельмі позна.

— Ты дзе гэта цягаўся? — забурчала маці.— Добрыя людзі ў царкву ідуць, а ты па сваіх клубах бадзяешся, бязбожнік ты гэткі! Пачакай, трапіш ты за гэта ў пекла! Будзеш тады ведаць! Многа вас такіх там пакутуе!

Янка нічога не адказаў і пайшоў спаць. Але заснуў ён не скора.

«Вось,— думаў ён,— на кожным кроку мы ўсё чуем: пекла ды пекла. А што гэта за пекла, дзе яно — ніхто не ведае. Здаецца, няма аніводнага чалавека, які б ведаў дарогу туды. Аднак усе старыя разумныя людзі так упэўнена гавораць пра пекла, нібы самі там былі. І мая добрая разумная мама не першы раз ужо кажа, што там збіраюцца піянеры і чамусьці пакутуюць. Не! Трэба сваімі вачыма паглядзець гэтае пекла і памагчы, калі што, таварышам».

Гэтая думка цалкам захапіла яго. Прачнуўшыся раніцою, ён зараз жа пабег да свайго сябра Юркі і расказаў яму пра ўсё, аб чым думаў уначы

Юрка быў зухаваты хлапец. Нядоўга думаючы, схапіў шапку і пайшоў да дзвярэй.

— Куды ты?

— У пекла! — рашуча адказаў Юрка.

— Пачакай! Трэба ж сабрацца як мае быць. Узяць штонебудзь з сабой. Ліха яго ведае, якое будзе падарожжа!

Узялі хлеба, сала, зламаны ножык. Не забыліся і пра мыла, бо каля тых чарцей можна добра ўпэцкацца. Паклалі ўсё гэта ў торбу і выйшлі з дому.

Але куды ісці? Вось задача!

Каб на неба, то іншая справа: сеў на самалёт і валяй проста ў рай. А вось як пад зямлю пралезці?

Пачалі пытацца разумных людзей:

— Дзядуля! Ці не ведаеце, кудой прайсці да пекла? — спыталіся яны старэнькага дзеда.

— Га? Што?

— Да пекла як прайсці?

— Да пекла? Ну, туды ўсе дарогі вядуць,— адказаў стары і пайшоў далей. Здзівіліся хлопцы такім мудрым словам, але нічога не зразумелі.

Прыйшлі ў вёску. Ля царквы стаіць поп.

— Вось хто пакажа нам дарогу! — узрадаваліся хлопцы.— Ён усе хады і выхады ведае!

Падышлі, прывіталіся і далікатна пытаюцца:

— Бацюшка! Будзьце ласкавы, пакажыце нам дарогу да пекла.

У папа аж вочы палезлі на лоб ад здзіўлення.

— Бачыце,— казалі далей хлопцы,— нам трэба туды па справе, але ніхто не можа паказаць дарогу. Апрача вас, бацюшка, нам ужо няма да каго звярнуцца. Вы ж маеце ўсе кнігі і планы па гэтай справе.

Поп усё не мог апамятацца. Нарэшце ён перахрысціўся і ціха запытаўся:

— Хто вы такія будзеце і адкуль?

— Мы — піянеры дзвесце дзевятнаццатага атрада, трэцяга звяна Янка Гуж і Юрка Пыж.

Цяпер толькі заўважыў поп іхнія чырвоныя гальштукі і злосна крыкнуў:

— А! Вось вы хто такія! Ну, будзьце спакойны — у пекла вы напэўна трапіце. Вас там даўно ўжо чакаюць, і нават месца падрыхтавана.

— Мы так і думалі, што ўсё гэта вам вядома! — узрадаваліся хлопцы.— Таму і звярнуліся да вас. Калі ласка, скажыце.

— Ды праваліцеся вы скрозь зямлю! — крыкнуў поп, махнуўшы рукой.

— Во-во, мы і шукаем такога месца, дзе можна было б прабрацца скрозь зямлю! — лагодна сказаў Янка.

— Ідзіце вы ка ўсім чарцям са сваімі дзёрзкімі пытаннямі! — яшчэ раз крыкнуў поп і пайшоў у свой дом.

Хлопцы паскраблі патыліцы.

— Чаго ён так злуе? — сказаў Янка.— Нібы мы гаворым нешта бязглуздае...

— Сам ён бязглузды! — злосна кінуў Юрка.— Адсылае да чорта, а дарогі паказаць не хоча!..

Запыталіся яшчэ ў некалькіх разумных людзей, але ўсё роўна толку не дабіліся.

Адзін параіў са смехам:

— Спытайцеся ў бацюшкі!

— Ды мы пыталіся ўжо,— адказалі піянеры.

— Тады — у матушкі.

Маладая жанчына адказала запытаннем:

— Гэта ў вас гульня такая? Цікава!

Дэмабілізаваны салдат сказаў са смехам:

— Эх, каб ведаць! Я і сам пайшоў бы туды і навёў бы там парадак.

Адным словам, разумныя людзі прымалі пытанне хлопцаў за жарт і адпаведна адказвалі:

— Ды ў вас ніякай зброі няма!

— Самая лепшая зброя — гэта малітвы. А вы іх ведаеце?

— Папрасіце ў папа святой вады; ад яе ўсе чэрці пабягуць.

— Лепш ладану, больш за ўсё чэрці баяцца ладану.

Як ні стараліся Янка Гуж і Юрка Пыж запэўніць разумных людзей, што гавораць аб гэтай справе сур'ёзна, тыя яшчэ больш смяяліся.

Тады Юрка сказаў:

— Вось што, Янка. Калі разумныя не ведаюць дарогі ў пекла, то, напэўна, ведаюць дурні. Пойдзем шукаць дурняў.

Зайшлі да аднаго гаспадара.

— Дзядзечка! Скажыце, хто ў вас тут самы дурны?

Дзядзька падумаў крыху і кажа:

— Няма цяпер дурняў, дзеткі. Хіба зайдзіце да Сідара, на тым канцы жыве.

Прыйшлі да Сідара, зноў пытаюцца:

— Хто ў вас самы дурны?

— У нашай вёсцы бадай-што няма такіх. Хіба наведайцеся да Сцяпана.

Сцяпан, пачухаўшы патыліцу, сказаў:

— Мусіць, гэта будзе Кандрат. Вунь яго хата.

Нарэшце хлапцоў прыслалі ў тую самую хату, з якой яны пачалі.

— Ну як? Ці знайшлі? — запытаўся гаспадар.

— Дзе там! Кожны шле да другога.

— Я ж казаў, што няма цяпер дурняў на свеце.

Надыходзіў ужо вечар, і гасцінныя гаспадары прапанавалі хлапцам пераначаваць у іх. Далі бульбы з кіслым малаком, паслалі на лаве. Хлопцы падзякавалі і зараз жа палеглі спаць.

Вось чуюць яны, што гаспадар енчыць, нібы ў яго зубы баляць. Потым сціх, войкнуў...

Зірнулі — стаіць гаспадар каля печы і трымае ў руцэ свой вырваны зуб. Потым пачаў круціць гэтым зубам вакол галавы і мармытаць:

— Мышка, мышка, на́ табе касцяны зуб, дай мне жалезны,— і кінуў свой зуб на печку.

— Слухай! Слухай! — штурхануў Юрка Янку.— Гэта ж ён!

— Хто ён? — не зразумеў Янка.

— Ды той, што ведае дарогу. Павінен ведаць,— хваляваўся Юрка. Затым звярнуўся да гаспадара: — Дзядзечка! Можа, скажаце нам, як знайсці дарогу да пекла?

— Чаму ж не? — спакойна адказаў дзядзька.— Трэба ўначы пайсці проста ў лес, потым завярнуць направа, потым налева, далей зноў направа, тады зноў налева і яшчэ раз налева. Там сярод вялікіх каменняў стаіць стары дуб з шырокім дуплом. Трэба дачакацца поўначы і тады можна лезці ў дупло — вось вам і дарога. У даўнейшыя часы адтуль заўсёды чэрці вылазілі; толькі цяпер іх чамусьці не чуваць.

Не паспеў ён скончыць сваіх слоў, як хлопцы ўжо былі ля дзвярэй.

— Дзякуем вам! Бывайце здаровы! — сказалі яны.

— Куды вы?

— У пекла! — разам адказалі хлопцы.

— Ах, дзеткі мае! А што ж вы надумаліся! Загубіце вы свае душы! — загаласіла, прачнуўшыся, добрая гаспадыня, але хлопцы былі ўжо на вуліцы.

Пайшлі яны ў лес. Заварочваюць направа-налева, як казаў дзядзька. Цёмна, жудасна навакол, совы крычаць. Урэшце ўгледзелі каменне і дуб з дуплом.

— Як жа цяпер даведацца, якая гадзіна? Трэба, каб было дванаццаць,— сказаў Юрка.

— Залезем у дупло і будзем сабе спаць, пакуль адчыняцца дзверы ў пекла,— прапанаваў Янка.

Так і зрабілі. Суха, цёпла там было, і яны пачалі ўжо драмаць. Раптам зямля пад імі заварушылася і... правалілася! Яшчэ міг — і яны паляцелі ўніз...

Хоць не хочацца сароміць нашых герояў, аднак, мусім прызнацца, што хлопцы ад перапуду разам закрычалі: «Мама!»

Але нічога дрэннага не здарылася. Праваліліся яны неглыбока. Глядзяць — звычайная яма, толькі з аднаго боку адтуліна некуды вядзе. Прапаўзлі некалькі крокаў і вылезлі ў вялікую залу. Пасярэдзіне булькала крыніца, зверху капала вада.

Але самае прыгожае было — гэта вапнавыя нацёкі, што звешваліся зверху, як лёд са страхі. Такія самыя нацёкі вельмі часта бываюць у падземных пячорах. А на сподзе тырчалі нака́пкі — такія самыя нацёкі, толькі канцамі ўгору.

— Можа, гэта і ёсць пекла? — спытаў Юрка.

— Не,— важна адказаў Янка.— Па-першае, гэта вельмі блізка ад зямлі, і ўсе душы маглі б уцячы. А па-другое, тут няма ніякага пякельнага абсталявання. Пойдзем уздоўж ручая, ён напэўна куды-небудзь ды прывядзе.

Пайшлі далей. Раптам ручай нырнуў у тунель, а над вадой засталася толькі невялікая шчыліна.

— Вось дык няўдача! Што ж будзем рабіць? — прамовіў Юрка.

— Ды пойдзем далей, пакуль можна,— адказаў Янка.— Некуды ж цячэ вада. Некуды трапім і мы.

Увайшлі ў ваду і ледзь не закрычалі ад холаду. Добра яшчэ, што яны, як сапраўдныя піянеры, заўсёды мыліся халоднай вадой і прызвычаіліся да холаду.

Брысці прыйшлося так, што толькі галава была над вадой, ды і то чаплялася за столь. Потым зноў выйшлі ў шырокую залу.

Тут Юрку ўзяло сумненне:

— Пачакай! — сказаў ён.— А ты ведаеш, колькі можа быць кіламетраў да пекла? Перш чым ісці, трэба хоць прыблізна ведаць.

Збянтэжыўся і Янка.

— А чорт яго ведае! — буркнуў ён.— Я ведаю толькі, што да цэнтра зямлі шэсць тысяч кіламетраў. А на якой адлегласці пекла знаходзіцца, нідзе не напісана.

— Калі яно ў цэнтры, то нам прыйдзецца паўзці шэсць тысяч кіламетраў. Так выходзіць?

— А хто табе сказаў, што яно збоку? — у тон яму адказаў Юрка.— А калі збоку, то, можа, не з нашага, а процілеглага. І нам прыйдзецца паўзлі не шэсць тысяч, а якіх дзесяць. Ды што там казаць! І дзве тысячы, і адну тысячу, і нават сто кіламетраў мы не здолеем прапаўзці.

Янка задумаўся.

— Гэта праўда,— сказаў ён.— Але не вяртацца ж нам назад. Пакуль можна, трэба ісці. Павінен жа недзе быць галоўны шлях, кудой усе ідуць. А там паглядзім.

Зноў рушылі ўперад.

Пячора рабілася ўсё вузейшай, вузейшай, і ўрэшце перад імі засталася толькі невялічкая шчыліна, праз якую яны ледзь маглі б пралезці.

Зірнулі туды — і ахнулі.

Перад імі цалілася шырокая рака. Па беразе яе ішла дасканалая шаша, скрозь выбрукаваная «добрымі пажаданнямі». Па гэтай дарозе з абодвух бакоў валіў народ. Усе яны ішлі да перавозу, дзе клапаціўся ў лодцы нейкі цыбаты дзед.

Мігам праціснуліся хлопцы праз шчыліну і далучыліся да людзей.

II. Ля перавозу

Ля перавозу стаяў шум, гам, лаянка. Усе ціскаліся, штурхаліся, скакалі, каб толькі хутчэй трапіць у лодку.

Пакуль хлопцы падышлі, лодка ўжо адплыла, і ім прыйшлося чакаць на беразе.

Тут яны заўважылі аднаго паважнага дзядзьку ў акулярах. Прыгледзеліся — і пазналі вядомага вучонага, партрэт якога нядаўна бачылі ў «Беларускім піянеры».

— І вы тут? — здзівіліся хлопцы.— Што ж вы такое дрэннае зрабілі?

— Я вынайшаў лекі ад страшэннай хваробы,— усміхнуўшыся, адказаў прафесар.

— Дык за гэта вас у пекла гоняць?

— Не за гэта, а за тое, што я сам знайшоў, без бога. За тое, што я ў яго не верыў і не маліўся. А вы як сюды трапілі? Вы, здаецца, жывыя?

— Жывыя. Мы — піянеры дзвесце дзевятнаццатага атрада, трэцяга звяна Янка Гуж і Юрка Пыж. Прыйшлі паглядзець, што тут робіцца, і дапамагчы сваім таварышам.

— Малайцы! — сказаў прафесар.— Вы, напэўна, здолееце ўсім дапамагчы. Бо вы жывыя, а чэрці з жывымі нічога не могуць зрабіць, бо яны маюць уладу толькі над мёртвымі душамі.

— А што гэта за рака?

— Гэта Стыкс[1] — граніца паміж тым і гэтым светам,— адказаў прафесар.—На тым беразе ўжо царства чарцей, хаця да самога пекла яшчэ 5 460 кіламетраў.

— Ага! — ускрыкнуў Юрка, звяртаючыся да свайго таварыша.— Я казаў, што нам прыйдзецца паўзці тысячы кіламетраў.

— Не бойцеся,— супакоіў прафесар,— не прыйдзецца вам нікуды паўзці, вы праедзеце па чыгунцы нават хутчэй, як па зямлі.

---

[1] Рака Стыкс, перавозчык Харон, Ахілес і іншыя імёны ўзяты са старажытнай гісторыі Грэцыі. Наогул трэба мець на ўвазе, што ўсе факты тут поўнасцю адпавядаюць вучэнню старажытных і сучасных рэлігій.

— Па чыгунцы?! — здзівіліся піянеры.

— Але, па сапраўднай чыгунцы. Праўда, яна ўжо адстала ад людскіх чыгунак, але хуткасць засталася чартоўская. Пабудавалі яе толькі праз сто гадоў пасля людзей, бо вельмі доўга цягнулася валакіта. А многія людзі на зямлі і да гэтага часу думаюць, што чэрці жывуць гэтаксама, як пры Адаме і Еве. Я чуў, што чэрці вельмі крыўдзяцца, калі іх лічаць такімі дурнымі.

Народ тым часам усё падыходзіў ды падыходзіў. Многія сустрэлі знаёмых, пачаліся гутаркі, плач.

— Сяргей! Якім чынам ты тут апынуўся? — запытаў свайго таварыша дваццацігадовы камсамолец Мікола.

— Забілі мяне,— адказаў Сяргей.

— Хто? За што?

— Быў я селькорам, выявіў аднаго падлюгу, ён падпільнаваў мяне і падстрэліў з абрэза. А ты як сюды трапіў?

— Бандыт забіў,— адказаў Мікола.

Пачуўшы такую размову, хлопцы вельмі здзівіліся.

— Чаму ж гэта вас у пекла на пакуту, калі вы нічога дрэннага не зрабілі? Ды яшчэ вас забілі.

— Эх, хлапчукі! — адказаў Сяргей.— Адразу відаць, што вы закону божага ў сваіх школах не вучылі. Мы ж не маліліся, на споведзі не былі. А вось той, хто мяне забіў, той проста ў рай трапіў.

— Як гэта так?!

— Вельмі проста. Яго арыштавалі, прысудзілі да расстрэлу. А ён паклікаў папа, пакаяўся, прычасціўся — і цяпер у раі са святымі гуляе.

— Мой бандыт гэтаксама зрабіў,— дадае Мікола.

Піянеры толькі рукамі развялі.

— Што гэта такое? Значыцца, такім чынам усе жулікі, зладзеі, разбойнікі пойдуць у рай, а добрыя людзі — у пекла?

— Выходзіць, так,— засмяяўся Сяргей.

— Ну, а я лепш згодзен з добрымі хлопцамі быць у пекле, чым з тою хеўрай у раі,— сказаў Мікола.

— Праўда! Правільна! — закрычалі з розных бакоў.

Раптам пачуўся дзіцячы голас:

Жура-жура-жура-журавель,
Журавушка мала-ды...

Усе азірнуліся — і бачаць: ідзе сабе па беразе шасцігадовы пацан, трымае на плячы кій і пяе на ўсё горла, быццам яму сам чорт не брат.

— Хлопчык, хто ты? Адкуль? Як трапіў сюды?

— Я — акцябронак, з атрада «Верабей»,— з гонарам адказаў карапуз.— Захварэў на шкарлятыну, потым паправіўся і прыйшоў сюды.— І малы хоць бы што рушыў сабе далей.

— Гаротны, ён нават не ведае, што памёр,— спачувалі жанчыны.

Тут падышоў адзін малады яўрэй. Зараз жа яго абкружылі і пачалі распытваць.

— А ты чаго сюды? Якога закону ты не выканаў? Хіба вы ў гэтае самае пекла ідзяце, што і мы?

— А што ж вы думаеце, для кожнага асобнае пекла стануць будаваць? — адказаў яўрэй.— Дорага каштаваць будзе...

Усе навокал зарагаталі.

— Якога ж ты закону не выканаў? — зноў запытаўся Сяргей.

— Ці мала ў нас гэтых законаў. Ну, напрыклад, я без шапкі ў сінагозе стаяў перад богам.

— А мяне сюды паслалі за тое, што я ў шапцы ў царкве стаяў! — крыкнуў адзін чалавек.

Зноў зарагаталі.

Хлопцы зусім збіліся з панталыку.

— Дзядзечкі! Як жа ж гэта так? Мы нічога не разумеем...

— Ды тут і сам чорт нічога не зразумее! — адказаў яўрэй.

У гэты момант падышоў адзін татарын. Плача, енчыць, ломіць рукі.

Усе да яго:

— Чаго ты? Ці ты адзін сюды трапіў? Не бядуй, добра будзе: тут сабраліся слаўныя хлопцы.

Але татарын усё лямантаваў:

— Ой-ой-ой! Ашукалі, праклятыя!

— Хто ашукаў? Як ашукалі?

— Ды яны ўсе, мулы ды ўсялякія там чэрці! Казалі, што наша вера найлепшая, найпраўдзівейшая. Што наш алах — найлепшы бог, што другія багі — ні чорта не вартыя. Што і рай, і пекла ў нас зусім асобныя, лепшыя. А цяпер, выходзіць, што і ваш, і наш бог — адзін чорт, усіх садзіць у адно пекла.

— Позна адумаўся,— засмяяліся навакол.— Захацеў асобнага, лепшага пекла! Пасядзі з намі.

Таксама неспадзявана былі здзіўлены і іншыя «чужаземцы»: кітайцы, індусы, манголы і г. д. Усім ім казалі, што і бог, і вера, і рай, і пекла — усё ў іх асобнае, лепшае.

Але былі і такія, як, напрыклад, негры, папуасы, індзейцы, якім казалі, што пекла — нейкая яма з жабамі і змеямі, і тое, што яны цяпер убачылі, ім нават спадабалася. Так цікава, весела, столькі рознага народу са ўсяго свету — і аніводнай жабы!

Тым часам вярнуўся перавозчык. Гэта быў высокі худы дзед, толькі скура ды косці, з доўгай белай барадой і такімі ж белымі валасамі.

— Гэта Харон,— растлумачыў прафесар,— паходжаннем з Грэцыі. Ён ужо 4000 гадоў перавозіць мёртвыя душы.

Стары быў пануры, сярдзіты і ўвесь час лаяўся:

— Ну, сядайце хутчэй, ды не штурхайцеся, каб вас усіх чэрці забралі! Аніводнай хвіліны адпачыць няможна праз вас, паганых! Пруць і пруць, з кожным днём усё болей і болей! І адкуль толькі бярэцца гэтулькі народу? Чаму раней гэтага не было? І чаму гэта ў рай ніхто не хоча ісці? Дык не, усе лезуць у пекла, кожны хоча сюды трапіць, бы на мёд! Куды ты прэш, каб цябе чэрці! Пачакай, паспееш! — крыкнуў ён на адну жанчыну і замахнуўся вяслом.

Народ ціскаўся, душыўся, лодка хісталася і, здавалася, вось-вось перакуліцца.

Харон малаціў вяслом направа і налева.

— Куды? Каб табе на тым свеце прыпякло!

— Дзядзечка! Мяне пусці, мой тэрмін прайшоў! — насядала тая жанчына.

— А дзе ты бадзялася да гэтага часу? Га? Вось цяпер і чакай. А ты зноў! Ах, каб цябе Цэрбер разадраў!

Можа, хто з чытачоў не ведае закону божага? Тады трэба сказаць, што душа пасля смерці чалавека мае сорак дзён ільготных, калі яна можа заставацца на зямлі. Звычайна гэтыя дні яна круціцца вакол свайго цела, дома, блізкіх людзей, а потым ужо ідзе на той свет. А хто замарудзіў, прапусціў свой тэрмін, той цяпер і спяшаўся, ціскаўся на перавозе.

Праціснуліся і хлопцы. Лодка кранулася.

Цяжка было старому Харону везці паўнюсенькую лодку па хуткай рацэ. Ён кашляў, задыхаўся, пот ліўся з яго струменем, і ён увесь час пакрыкваў:

— Сядзіце спакойна, чэрці паласатыя! Не перавешвайцеся на адзін бок! Лодку перавернеце, каб вам перавярнула кішкі! Вось кара боская! Што ж гэта далей будзе? І адкуль толькі яны бяруцца на маю галаву! Заганяюць яны не толькі мяне, але і ўсіх чарцей у пекле!

Глянулі хлопцы на ваду, а яна чорная, халодная і нават нібы густая.

— Цікава было б пакупацца, мы ні разу не купаліся у такой рацэ.

— Ах, добра, што ўспомнілі! — сказаў прафесар.— Магу вам даць вельмі карысную параду. Вы абавязкова пакупайцеся ў гэтай рацэ. Тады вам ніхто не зможа пашкодзіць. Тры тысячы гадоў назад тут адна матка выкупала свайго сына, Ахілеса. Але, як яна, купаючы, трымала яго за пятку, то гэтая «Ахілесава пята» і засталася ў яго адзіным месцам, якое можна параніць. Потым яго забілі толькі таму, што трапілі стралой якраз у гэтую пятку. Затое вы ўжо пастарайцеся выкупацца цалкам.

— Вельмі вам дзякуем, прафесар! — узрадаваліся хлопцы.— Вось гэта нам будзе якраз дарэчы!

Як толькі лодка прыстала да берага, яны зараз жа пабеглі купацца.

Харон аж аслупянеў.

— Што гэта вы надумаліся, га? Хто вам дазволіў? Нельга тут купацца. Надоечы нейкая шалёная баба прыходзіла купаць сваё дзіцяня, а тут вось яшчэ знайшліся хуліганы. Прэч, а то я вас!..— І ён замахнуўся вяслом.

Але хлопцы ўжо далі нырца.

Калі яны паказаліся з вады, Харон перацяў-такі кожнага з іх вяслом па галаве. Але дарма ўжо! Яны нават не пачулі ўдараў.

— Ур-р-а-а! — зараўлі абодва.— Хай жывуць непераможныя піянеры! Цяпер мы задамо чарцям такога перцу, што млосна будзе!

— Ах вы, чарцяняты! — бурчаў Харон.— Паспелі ўжо! Вось і рабі з імі, што хочаш!

Тады хлопцы падышлі да яго бліжэй.

— Дзядуля!..— ласкава пачаў Юрка.

— Чаго вам яшчэ? — буркнуў Харон.

— Вы адпачынкам калі-небудзь карысталіся?

— Які тут адпачынак! — махнуў рукой Харон.— Чатыры тысячы гадоў важу дзень і ноч без ніякага перапынку. А народу прэ ўсё больш і больш.

— Тады вы кіньце працу — і ўсё!

— Як гэта кінуць? — здзівіўся Харон.— А перавозіць хто будзе?

— Ды ніхто. Вы патрабуйце, каб мост пабудавалі. Бачыце, сабе яны дык чыгунку правялі, а вам і моста не хочуць зрабіць. Кіньце працу, і тады ўбачыце, што яны павінны будуць вам мост пабудаваць.

Хлопцы сабе пайшлі, а Харон пачаў разважаць:

«Але, праўду кажуць гэтыя чарцяняты! Што я ім мільён гадоў павінен без перапынку працаваць, ці што? Хай будуюць мост! Не буду больш вазіць!»

Кінуў вясло і расцягнуўся на зямлі.

Так прыемна было старому першы раз адпачыць пасля чатырох тысяч гадоў безупыннай працы!

III. У вагоне

Станцыя была звычайная, як і ў нас. Бо будавалі яе тыя самыя рабочыя і інжынеры, якія былі прысланы сюды на пакуту. Нават і цяпер ніжэйшыя пасады займалі тыя з нашых

чыгуначнікаў, якія на зямлі п'янствавалі, ленаваліся працаваць і па чыёй віне здараліся катастрофы.

Вядома, пасажыраў было шмат, толькі без клункаў. Цягніка яшчэ не было.

Па платформе хадзіў начальнік станцыі, тоўсты чорт з казлінай бародкай і казлінымі капытамі. Рогі яго былі закрыты форменнай шапкай. Доўгі хвост — засунуты за пояс [1]. Далей стаялі два чорты-ахоўнікі з віламі на плячах і пакурвалі чортава зелле.

— Дык вось яны якія, гэтыя чэрці! — сказаў Юрка.— Зусім не страшныя. Пойдзем запытаемся, ці хутка цягнік прыйдзе.

Падышлі. Усё ж такі страшнавата было першы раз у жыцці загаварыць з самым сапраўдным чортам. А ліха яго ведае, як да яго звярнуцца! Яшчэ раззлаваць можна.

— Та... таварышы чэ-чэ-рці! Ці хутка будзе цягнік? — прагаварыў Янка.

— Праз паўгадзіны,— спакойна адказаў чорт.

— Праўду кажуць, што не такі страшны чорт, як яго малююць,— разважалі піянеры, адыходзячы.

Тым часам нейкі селянін прычапіўся да начальніка станцыі:

— Пане начальнік! Я, далібог, невінаваты. І не думаў нават, але чорт заблытаў. Выпілі мы, значыцца, з Кузьмой самагону...

— Ды кажу табе, што гэта не мая справа! Там разбяруць. Мяне гэта зусім не датычыцца,— нецярпліва сказаў чорт.

— Як гэта так? — не адыходзіў чалавек.— Я ж зусім невінаваты. Выпілі гэта мы, значыцца, з Кузьмой самагону, а ён чагосьці пачаў лаяцца: «Ты, кажа, чортава твая душа, думаеш, што я цябе баюся?» Ды плясь мне ў морду. Я не стрымаўся. Ах, кажу, сляпы ты чорт!..

Начальнік зусім раззлаваўся:

— Пайшоў прэч! — крыкнуў ён, тупнуўшы капытом.—

---

[1] Пры выкананні службовых абавязкаў чэрці заўсёды павінны так трымаць свой хвост.

Чаго прыстаў, як зараза! А то загадаю, каб пасадзілі цябе ў паравозную печку!

— Пане чорт! — узмаліўся чалавек.— Вось вам крыж, я невінаваты. Клянуся хрыстом-богам...

І дзядзька пачаў хрысціцца...

У гэты момант адзін з ахоўнікаў падбег ззаду (ззаду чэрці крыжа не баяцца) і ўсадзіў чалавеку вілы ў бок. Потым падняў яго, закінуў з віламі на плячо і панёс.

А небарака, матляючыся на вілах, усё яшчэ апраўдваўся:

— Таварышы чэрці! Завошта? Я ж невінаваты. Выпілі мы, значыцца, з Кузьмой...

Трэба сказаць, што ў вялізным натоўпе, сярод шуму і гаму, гэтае здарэнне такога ўражання не зрабіла, як на нас з вамі. А праз хвіліну і следу ад яго не засталося.

Насустрач піянерам трапіўся поп. Хлопцы зараз жа звярнуліся да яго, каб высветліць адно пытанне:

— Скажыце, калі ласка, бацюшка, чаму гэта людзі так спяшаюцца ў пекла? Ніхто іх не цягне і не гоніць, ніхто не стаіць над каркам, а яны нават гвалтам пруць у пекла.

— Бачыце,— адказаў поп,— пасля смерці душа траціць волю; нягледзячы на сваё жаданне ці нежаданне, яна павінна ісці туды, куды прызначана. Хоць чэрці як быццам іх і не цягнуць, але ўсё роўна душы знаходзяцца ў іхняй уладзе.

— І вы таксама, бацюшка? — запытаўся Юрка.

Але поп прыкінуўся, быццам не пачуў, і адышоў далей.

Тут праціснулася паміж людзей бабуля, падышла да папа і — цмок яго ў руку.

— Памаліцеся за мяне, святы айцец! — зашчабятала яна.— Саграшыла я перад госпадам богам: у вялікі пост з'ела сала. Праўда, смярдзючага, але ўсё ж такі сала. Ох, грахі нашы цяжкія!

Поп пачырванеў, адвярнуўся і пастараўся ад яе схавацца.

Пачуўся грукат, потым гудок. Усе замітусіліся. Некуды пабег стрэлачнік (з людзей).

— Ты чаго не на месцы? — крыкнуў чорт-ахоўнік ды віламі яго ў бок.

З тунеля, бы вецер, вылецеў цягнік і спыніўся перад стан-

цыяй. З вагонаў выйшлі кандуктары-чэрці. З паравознай будкі выглянуў машыніст, увесь чорны, як чорт. Публіка кінулася ў вагоны.

Штурхатня, крыкі, лаянка. Дужэйшы адпіхвае слабейшага. Умяшалася ахова і давай садзіць свае вілы ва ўсе бакі.

Вось па платформе бегае двухгадовае дзіцяня, плача, крычыць: «Мама!»

Чорт-ахоўнік падчапіў яго на вілы і ўкінуў у акно вагона.

— За што ж такіх яшчэ мардуюць? — вырвалася з грудзей піянераў.

Старэнькі дабрадушны чорт-кандуктар растлумачыў, што гэта нехрышчонае дзіцяня, што бацькі яго акцябрылі і нават імя далі нялюдскае — Чыжык.

— Ну, тады няхай бацькі і адказваюць! — запратэставалі піянеры.— Чым жа вінавата такое дзіцяня?

— Нічога не зробіш,— уздыхнуў стары чорт.— Такі ўжо боскі закон.

Тым часам далі званок, а піянеры ніяк не маглі ўціснуцца ў вагон. Палезлі на буфер, але там стаяў вялікі тлусты манах і не пускаў.

— Ага, праклятыя піянеры! — крычаў ён.— Вось і вы трапілі, куды вам належыць па заслугах! Будзеце цяпер ведаць, як смяяцца з бога і рэлігіі! Будзеце ведаць, як дурыць добрых людзей!

— Айцец святы! — засмяяліся хлопцы.— А самі вы як сюды трапілі?

— Не ваша справа, малакасосы! — агрызнуўся манах.

Бомкнуў новы званок. Піянеры раптам ухапілі манаха за абедзве нагі. Той і войкнуць не паспеў, як апынуўся пад вагонам. Хлопцы ўскочылі на яго месца — і цягнік пайшоў.

— Малайцы, хлопцы! — крыкнуў камсамолец Сяргей, які бачыў усю гэтую сцэну.

Цягнік нырнуў у тунель і паляцеў з д'ябальскай хуткасцю. Хлопцы праціснуліся ў сярэдзіну вагона і знайшлі там сваіх знаёмых: прафесара, селькора і іншых.

— Ну што, падабаецца вам падарожжа? — запытаўся прафесар.

— Вельмі цікава,— адказаў Юрка.— Асабліва мы ўдзячны вам за вашу параду. Мы паспрабавалі ўжо чартоўскіх вілаў — і нічога.

Народ у вагоне тым часам размясціўся, сціснуўся і прыціх. Відаць было, што кожны думаў аб сваім будучым. Некаторыя нават пачалі плакаць. Толькі дзеці дурэлі, як і на зямлі. Паміж іншым, хлопцы звярнулі ўвагу, што сярод пасажыраў не відаць паноў — усё працоўны народ. Яны запыталіся прафесара, чым гэта тлумачыцца.

— Праўда,— адказаў прафесар,— багатых тут знойдзецца, можа, адзін на тысячу. І справа вельмі простая: калі бядняк памрэ, хто будзе за яго маліцца? Ён нават часцей за ўсё і паспавядацца не паспее. А багаты, калі дасць грошы царквам, папам, манастырам, жабракам, дык за яго дзень і ноч маленне ідзе. Ёсць нават такія — і іх большасць,— што самі і маліцца не ўмеюць, і ў бога не вераць, а ідуць у рай, бо яны могуць наняць не толькі шмат папоў, але нават архірэяў. А калі ён яшчэ пабудуе якую-небудзь царкву, дык ужо лічыцца амаль што святым. Вядома, яны ўсе ідуць у рай, хоць грашаць больш за беднякоў.

— Вось бачыце! — стукнуў кулаком адзін дзед.— А чаму ж нам казалі, што на тым свеце будзе наадварот: што багатыя пойдуць у пекла, а бедныя — у рай!

— А што б ты рабіў, каб табе сказалі праўду? — запытаўся з верхняй паліцы чырвонаармеец.

— Ды я тады б аніводнага дня не цярпеў! — крыкнуў стары.

— Ну дык вось, для таго каб ты цярпеў, табе так і казалі,— засмяяўся чырвонаармеец.

— Гляньце, якая там цікавая кампанія! — сказаў адзін пасажыр.

Усе паглядзелі ў той бок, куды ён паказваў, і ўбачылі сапраўды цікавую кампанію: ксёндз, поп і рабін сядзелі ў кутку, нібы браты, і ціхенька гутарылі. Перад агульным няшчасцем яны нават забыліся, што жылі, як кот с сабакам.

— Вы да канца едзеце? — запытаўся рабін ксяндза.

— Да канца,— уздыхнуў той.

— Чаму ж так? — здзівіўся поп.

— Такі ўжо лёс,— зноў уздыхнуў ксёндз.

— Каб мець такое права,— сказаў рабін,— ды не выкарыстаць яго — гэта ж сорам! Я на вашым месцы абавязкова паспрабаваў бы вылезці ў чыстцы́. Усё роўна горш не будзе.

— Праўду кажаце,— павесялеў ксёндз.— Трэба будзе паспрабаваць.

Увайшоў нейкі жоўты чалавек, прыбраны нібы для смеху. Чаго толькі не начапляў ён на сябе! Клыкі звяроў, пер'е птушак, чарапашкі, каменьчыкі, нейкія балванчыкі, нават бляшанка ад кансерваў.

Ён падышоў да святых айцоў і пачаў размаўляць з імі, нібы з добрымі знаёмымі.

— Што гэта за пудзіла такое? — здзівіліся пасажыры.

— Таварыш іхні, шаман,— смеючыся, сказаў прафесар.

— Ну і кампанія! — гыгыкнуў чырвонаармеец.

Па вагоне прайшоўся кандуктар.

— Католікі, рыхтуйцеся! — крыкнуў ён.— Зараз вылазіць: станцыя Чысцец!

— Што гэта азначае? — звесіў галаву чырвонаармеец.

— Ты хто такі? — запытаўся кандуктар.

— А чорт яго ведае!

— Ну дык сядзі і не рыпайся! Гэта датычыцца толькі католікаў,— абрэзаў кандуктар і пайшоў далей.

Зноў дапамог прафесар.

— Бачыце,— сказаў ён,— зараз будзе станцыя Чысцец. Заснавана яна ў 1439 годзе згодна пастановы з'езда каталіцкага духавенства ў Фларэнцыі. Выклікана гэта тым, што ёсць шмат людзей, якія не настолькі дрэнныя, каб іх пасылаць у пекла, і не настолькі добрыя, каб садзіць у рай.

— Як кажуць, ні рыба ні мяса! — падказаў чырвонаармеец.

— Во-во, праўда! — засмяяўся прафесар.— Дык вось, для іх зроблены гэты «чысцец», дзе яны ачышчаюцца, а потым ужо трапляюць у рай.

— Вось якія яны хітрыя! — злосна сказаў чырвонаармеец.— А нашы, праваслаўныя, дык не паклапаціліся аб нас.

— Ну, ведаеце,— сказаў прафесар,— і тут думалі не аб народзе, а аб сабе. Справа вось у чым: калі душа пападае ў пекла, дык усё скончана, ніколі яна адтуль не вызваліцца. Значыцца, і маліцца за яе бескарысна. А калі душа ў чыстцы, дык усё залежыць ад таго, ці дужа будзе маліцца царква,— заўважце, царква, а не прыватны чалавек. Ну, вось і плоцяць царкве за гэта на працягу многіх гадоў.

— Ого! Выгаднае прадпрыемства! — адгукнуўся чырвонаармеец.

У суседнім купэ сядзела некалькі чалавек, якія вельмі горача аб чымсьці гаварылі. Нашы піянеры звярнулі ўвагу на тое, што ў групе было пяць жанчын, а мужчын толькі два.

Хлопцы прыслухаліся да іх размовы.

— Ды што ж такое робіцца на свеце, людцы мае? — казала досыць маладая, поўная жанчына.— Ашуканства ўсюды, куды ні павярніся. Вось, скажам, ты хто такі?

Яна тыцнула пальцам у высокага худога мужчыну.

— Хлыст,— адказаў той.

— А ты? — паказала яна на другога.

— Беспаповец.

— А ты, сястра?

— Баптыстка.

— А вы?

— Скакуха.

— Сапуха.

— А я — малаканка,— казала далей маладзіца.— І ўсе мы едзем у пекла. Значыцца, нас усіх ашукалі...

У куце сядзеў яшчэ адзін чалавек, стары, хваравіты. Ён не прымаў удзелу ў гутарцы і, здаецца, не слухаў яе, але тут не вытрымаў і ўмяшаўся:

— Хто вас ашукваў, родныя мае? Будзьце вы кім хочаце — скакухамі, сапухамі ці хлыстамі,— ні бог, ні чорт за адно гэта ў пекла вас не пагоніць, калі вы былі сумленнымі людзьмі. А едзеце вы туды таму, што былі подлымі паразітамі.

Сапуха і скакуха аж падскочылі ад абурэння:

— А ты хто такі? Бачце, які сумленны грэшнік знайшоўся! Калі ты такі святы, то чаму едзеш у пекла, а не ў рай?

Але чалавек нібы не чуў гэтых слоў. Ён зноў аддаўся сваім невясёлым думам.

А каб чытач не сумняваўся, што ёсць на свеце скакухі і сапухі, мы даём няпоўны спіс рэлігійных сект, якія вядомы толькі ў адным СССР. Вось яны: баптысты, евангелісты, абнаўленцы, ціханаўцы, духаборы, малаканы, хлысты, суботнікі, васкрэснікі, скапцы, духаносцы, сапуны, скакуны, лазараўцы, відзенцы, штундысты, талстоўцы, стараверы, піліпаўцы, федасееўцы, аранаўцы, іяніты, паморцы, нетаўцы, папоўцы, беспапоўцы, беглапапоўцы, аўстрыйцы, уздыханцы, страннікі, самахрышчэнцы, пашкоўцы, спасаўцы, дзірнікі, немалякі, шалапуты, стрыгольнікі, людзі божыя, данцы, штунда-баптысты, младаштундысты, маляванцы, нова-хлыстоўцы, сютаўцы...

IV. Чысцец

Тым часам цягнік спыніўся.

— А ці не вылезці і нам? — сказаў Янка Юрку.

— Вядома, варта! — падтрымаў прафесар. — Трэба азнаёміцца з усімі ўстановамі, каб расказаць людзям усю праўду.

Хлопцы развіталіся і вылезлі з вагона.

...Невялікая станцыя сярод роўнага поля. Нідзе ні ўзгорка, ні дрэва! Шэрае цьмянае святло вылучаецца немаведама адкуль і стварае туманны змрок, як у нас вечарам ці досвіткам. І нідзе ніводнай каляровай плямы.

Сярод гэтага поля невысокай сцяной агароджана вялікая плошча. У сцяне відаць брама. Туды і накіраваліся.

Там, за сталом, пакрытым шэрым сукном, сядзела камісія, у якую ўваходзілі тры анёлы і тры чорты. Камісія праглядала дакументы.

Народ сюды ішоў ціхі, смірны, ніякіх спрэчак, ніякай штурханіны. Але камісія чамусьці здавалася вельмі змаранай. Анёлы сядзелі, як мокрыя куры, апусціўшы свае крылы. Чэрці, старыя, аблезлыя, сядзелі пахмура, павесіўшы хвасты.

Моўчкі аднаго за адным прапускалі прыезджых у браму.

Падышла адна жанчына. Анёл паглядзеў яе дакумент, потым паказаў чорту.

— Ты не туды трапіла! Табе ў рай трэба! — звярнуўся анёл да жанчыны.

— Усё роўна,— адказала яна абыякавым тонам.

Паглядзеў анёл на чорта.

— Што ж з ёю рабіць?

— Тады мы з першай партыяй адправім яе ў рай,— параіў другі анёл.

— Усё роўна,— зноў прамовіла жанчына і ўвайшла ў браму.

Падышоў рабочы.

— Чаму ты злез тут? Табе трэба было да канца ехаць.

— Ды не, гэта памылка!..— пачаў быў ён тлумачыць.

— Не-не, ідзі назад на станцыю! — рашуча сказалі чэрці.

— Эге,— падмаргнуў Янка Юрку.— Хоць яны і выглядаюць соннымі, але сочаць пільна. Мусіць, нам не ўдасца прабрацца туды.

— Паглядзім,— спакойна прамовіў Юрка.

Падышоў нейкі тоўсты пан. Анёл хацеў быў яго прапусціць, але чорт стаў пярэчыць:

— Чаму так? Тут напісана: «забойства», значыцца, без перасадкі.

— Але прачытайце далей,— паказаў анёл,— там сказана, што не сам ён забіў, а даручыў камусьці.

— Ну, гэта тое самае! — умяшаўся другі чорт.

— Тое, ды не тое,— сказаў другі анёл.

— Дазвольце вам сказаць,— пачаў тады пан,— што за мяне ўжо заказана сорак мес [1].

— Пра гэта ў дакуменце нічога не сказана,— не згаджаліся чэрці.— Запытайцеся ў свайго начальства.

Анёл узяў трубку тэлефона:

— Алё! Гаворыць чысцец. Хто ля тэлефона? Пётра? Дык вось тут у нас непаразуменне. Пан Зарэмба кажа, што за яго заказана сорак мес, але ў дакуменце аб гэтым нічога не гаворыцца. Што? Спазніліся. А як цяпер? Лічыць? Добра.

[1] Меса — каталіцкае набажэнства.

— Ну, дык вось,— звярнуўся ён да чорта,— сказана залічыць месы.

— Мала што ў вас там кажуць! — не згаджаўся чорт.— Павінна быць усё па закону. У дакуменце не сказана — і канец! Зараз мы запытаемся ў свайго начальства.

Ён падышоў да другога тэлефона:

— Алё! Гаворыць чысцец. Што? Смаляны аддзел? Не, дайце канцылярыю Люцыпара. Канцылярыя? Гаворыць чысцец. Пан Люцыпар? Вось тут у нас непаразуменне: ці можна залічваць месы, аб якіх у дакуменце не сказана. Пан Зарэмба. Што? К чорту? Так... так... Добра.

— Ну што? — запыталіся анёлы.

— Сказалі, хоць гэта і не па закону, але можна ўступіць, бо гэтага дабра і ў іх завоз.

І шчаслівы пан Зарэмба ўвайшоў у браму.

Падышоў той самы ксёндз, якога піянеры бачылі ў вагоне.

Анёл глянуў у дакумент і сарамліва зачырванеўся. Паглядзеў чорт і рашуча сказаў:

— Ну, гэтага ўжо не прапусцім!

І анёлы на гэты раз не спрачаліся.

— Ведаеш што? — сказаў тады Юрка Янку.— Пойдзем мы лепш убок ды перабяромся цераз плот. Ніхто там не пільнуе; гэтыя целяпні не сцямяць.

Адышлі, агледзеліся. Мігам Юрка скочыў Янку на плечы, узлез на плот, працягнуў сябру руку.

Толькі нарыхтаваліся саскочыць, глядзяць — бяжыць да іх ксёндз.

— Браточкі! Памажыце! Век за вас буду бога маліць!

Весела стала хлапцам.

— Давай паможам! Шкада нам, ці што?

Абодва працягнулі рукі і ўсцягнулі ксяндза. Той на радасцях нават падзякаваць забыўся.

Унутры чысцец меў выгляд вялікай шахматнай дошкі. Увесь ён быў перасечаны роўнымі, простымі дарожкамі, а па баках стаялі домікі, зробленыя на адзін капыл.

Па дарожках бадзялася шмат народу ў шэрым, доўгім адзенні, але ўсе тут былі, нібы сонныя мухі: ні смеху, ні жва-

вых рухаў, ні гучнай размовы. Ціш была такая, быццам нікога навакол няма.

Вось на лаўцы сядзяць некалькі чалавек і пазяхаюць так, што нават нашы піянеры не вытрымалі і разявілі раты.

— Што, таварышы, робіце тут? — запыталіся хлопцы.

— Сядзім,— сказаў адзін і пазяхнуў так, што аж сківіцы хруснулі.

— Заўсёды так і седзіцё-о-о? — пазяхнуў Юрка.

— Не... Часам хо-о-о-дзім.

— О-ох...— пачаў пазяхаць Янка.— А болей што ро-о-обіце?

— Нічо-о-о-о-га!

— Бяжым адсюль,— закрычаў Юрка,— бо прападзём!

Шмат людзей было побач, але ніхто не пацікавіўся не толькі спытаць незвычайных гасцей пра што-небудзь, але нават зірнуць на іх.

Піянеры падышлі яшчэ да аднаго чалавека, больш маладога... Але гутарка пайшла такая самая.

— За што вы сюды трапілі? — спыталі яго.

— Не ведаю.

— Што рабілі ў жыцці?

— Нічо-о-о-га! — пачаў пазяхаць чалавек.

— За тое і трапілі сюды?

— Не-э-э...

— Вы тут пакутуеце?

— Не-э-э...

— О-ох... Вам тут добра жывецца?

— Не-э-э...

— Значыцца, нядо-о-бра?

— Не-э-э...

— До-о-о-ўга вам тут трэба быць?

— Не веда-а-а-ю...

Не дабіўшыся ад яго толку, пайшлі далей, увесь час пазяхаючы.

Заглянулі ў адзін домік. Некалькі чалавек сядзяць і дрэмлюць, некалькі ляжаць, два ходзяць з кута ў кут, адзін насустрач другому.

Калі піянеры ўвайшлі, ніхто нават не звярнуў на іх увагі.

— Добры дзень! — прывіталіся хлопцы.

— До-о-о-бры дзень!

— Што вы тут робіце?

— Ча-а-а-каем.

— Чаго чакаеце?

— Пакуль там, на зямлі, за нас адмо-о-о-ляцца.

— А вы самі не мо-о-о-жаце маліцца?

— О-ох... Гэта ад нас не залежыць.

— Хто ж тады павінен маліцца?

— Ксяндзы... О-хо...

— Вам тут вельмі нудна-а-а?

— О-хо... не ведаем.

Раптам адчыніліся дзверы, і ў пакой увайшлі анёл з чортам. Перапалохаліся нашы піянеры: зараз даведаюцца, што яны незаконна пралезлі!..

Але тыя глядзелі ў спісы, што трымалі ў сваіх руках, і на іншае не звярталі ўвагі.

Пачалі выклікаць па спісе:

— Алонзо Фанфані!

— Я!

— Юзэф Шпунт!

— Я.

Такім чынам выклікалі з дзесятак душ і сказалі ім:

— За вас ужо адмаліліся. Збірайцеся, зараз паедзеце ў рай.

Шчасліўцы пачалі збірацца, але па тварах іх было відаць, што і цяпер ім усё роўна.

— А нас няма ў спісе? — неспадзявана запытаўся Янка, а Юрка ледзь не самлеў ад страху.

— Каго? — спытаў анёл.

— Янкі Гужа і Юркі Пыжа,— адказаў Янка.

Анёл і чорт зноў пераглядзелі спіс.

— Не яшчэ. Прыйдзецца пачакаць.

— Нічога не зробіш,— пакорна адказаў Янка.— Нам і тут добра.

Сказаў і пашкадаваў, бо чорт падазрона зірнуў на такія бадзёрыя душы.

Выскачыўшы з хаты, піянеры так зарагаталі, што нават усміхнуўся адзін чалавек, які стаяў ля парога. Убачыўшы першы раз усмешку, хлопцы ўзрадаваліся і хутчэй пачалі з ім размову:

— Вы даўно тут знаходзіцеся?

— А чорт яго ведае! — адказаў ён ахвотна.— Можа, гадоў сто, а можа, і ўсе дзвесце.

— І за гэткі час да вас не дайшла чарга?

— Калі ў першыя гады пасля маёй смерці не было каму наладзіць богамаленне за мяне, то цяпер ужо ніхто мяне і не памятае. Прыйдзецца тут сядзець вечна. Я ўжо думаў пагаварыць з чарцямі, каб мяне перавялі ў пекла. Можа, знойдзецца там для мяне работа без пакутаў. А ў крайнім выпадку я згадзіўся б і на якую-небудзь малую пакуту, напрыклад, лізнуць раз ці два ў дзень гарачую патэльню.

— А многа тут такіх вечных, як вы? — спытаў Юрка.

— Ой, і не кажыце! Мусіць, набярэцца ўжо шмат мільярдаў. Царква думала на нас зарабіць, а цяпер выходзіць адна страта. Чэрці патрабуюць ліквідаваць гэтае прадпрыемства і нават згаджаюцца на тое, каб перавесці ўсіх вечных у рай. А то ў раі вельмі многа застаецца лішняй плошчы.

— У такім разе жадаем вам хутчэй трапіць у рай,— сказалі хлопцы на развітанне.

V. На парозе пекла

Цяпер ужо, вярнуўшыся на знаёмую станцыю, хлопцы адчувалі сябе ўпэўнена, не баяліся, як раней.

Пасажыраў было няшмат, бо рух на станцыі Чысцец наогул невялікі; большасць пасажыраў едзе ў пекла без перасадкі, а больш нікуды дарогі няма.

— Ліха яго ведае, калі прыйдзе гэты цягнік! — трывожыліся Янка і Юрка.

На перон выйшаў начальнік станцыі, малады, франтаваты чорт з маленькімі рожкамі і тонкім доўгім хвастом. Таму хвост ён трымаў па-амерыканску, банцікам.

Ён пачуў апошнія словы піянераў і супакоіў іх:

— Не бойцеся, хлопчыкі, куды-куды, а ў пекла вы заўсёды паспееце.— Потым пільна прыгледзеўся да іх і ўсклікнуў: — Пачакайце, пачакайце! Ці не жывыя вы, чаго добрага?

— Так, жывыя,— горда адказалі піянеры.

— Вельмі цікава,— задуменна прамовіў чорт.— Даўно я не бачыў жывога чалавека. Мусіць, тысячу гадоў, а можа, і дзве.

Янка і Юрка здзіўлена паглядзелі на чорта, а потым адзін на аднаго: такі малады чорцік і гэтулькі год мае!

— У такім разе, колькі ж вам гадоў? — спыталіся яны ў чорта.

— Роўна столькі, колькі мае ўвесь свет! — з гонарам адказаў чорт.

— Гэта значыць, некалькі мільёнаў?! — ускліінуў Юрка.

А Янка ўнёс папраўку:

— Гэта, калі гаварыць пра нашу Зямлю. А калі пра ўвесь свет, то ён вечны.

Чорт слухаў і насмешліва ўсміхаўся. Нарэшце сказаў:

— Эх, вы! Хто вас навучыў такім глупствам! Свет і мяне бог стварыў 5700 гадоў назад. А вы — мільёны, мільярды!..

Хлопцы паглядзелі адзін на аднаго, паціснулі плячыма, і Юрка сказаў:

— Вось дык дзіва! Ніколі не думаў, што чэрці вераць у свяшчэнныя кнігі.

— Каб я не верыў у іх,— сур'ёзна сказаў чорт,— то павінен быў бы не верыць і ў тое, што я існую. Як жа ж мне не быць веруючым?

— А ваша маці таксама жыве яшчэ? — спытаў Янка.

Пры гэтых словах чорт засмуціўся і выцер слязіну на сваіх вачах.

— Няма ў мяне мамы,— уздыхнуў ён,— і ніколі не было. Ва ўсіх ёсць маткі — у жывёлы і птушкі, у рыбы і мухі, у

клапа і чарвяка, толькі ў чарцей мам не было. Адзін толькі татка — бог, ды і той пакінуў нас.

— А аліменты ён вам плоціць? — дзелавіта спытаў Янка.

— Дзе там! — безнадзейна матнуў хвастом чорт.

— А вы ў суд падайце! — шчыра параіў Юрка.

Чорт нават усміхнуўся праз слёзы:

— Эх, мілыя мае хлопчыкі! Вы думаеце, што ўсюды такія законы, як у вас? Дык ведайце, што ў законе божым няма такога пункта, каб бацька плаціў грошы пакінутым дзецям.

У далёкім тунелі, як у бочцы, пачуўся гудок паравоза. Начальнік станцыі схамянуўся, паправіў рэмень, падцягнуў хвост і з усмешкай пакутніка сказаў:

— Нават шкадую, што цягнік прыйшоў. Так цікава было з вамі пагутарыць. А то няма з кім словам перакінуцца, апрача абрыдлых чарцей. Анёлы задаюцца, а людзі баяцца мяне.

Падзякавалі яму і нашы піянеры за цікавыя звесткі, пабеглі да вагонаў, а там паўнюсенька народу. У чыстцы высадзілася толькі трынаццаць чалавек, а рэшта ехала прама ў пекла. Улезці ў вагон і думаць не было чаго. Усе вагоны былі перапоўнены, ды яшчэ такімі бандытамі, якія без дай-прычыны маглі забіць жывога, а мёртвага і другі раз забілі б.

Піянеры сталі азірацца, шукаючы свайго сімпатычнага чорта. А той ужо і сам спяшаўся ім на дапамогу.

Паклікаўшы двух ахоўнікаў з віламі-аўтаматамі, начальнік станцыі прарваўся ў адзін з вагонаў і гучна крыкнуў:

— Ціха вы, чортавы душы! А то зараз вілы ў глотку ўсаджу. Вызваліць месца для гэтых двух хлапцоў! А калі, барані Люцыпар, вы іх пакрыўдзіце, то мала не будзе: тады і пекла вам здасца раем.

— Дзякуем, таварыш чорт! — загулі навакол.— Зрабіце, калі ласка, каб пекла нам здавалася раем! Век будзем бога маліць!

Наперад праціснуўся адзін малойчык з чубам, пачаў кланяцца чорту і прасіць:

— Зрабі, браток, ласку. Я нават цяпер магу памаліцца за цябе, вось так: «Госпадзі Ісусе, матка боска, у імя айца і сына і святога духа...»

І ён пачаў хрысціцца сам і хрысціць чорта...

Як заверашчыць паважаны начальнік станцыі, а з ім і два яго ахоўнікі, як усе трое закруцяцца — ды ў акно!.. А калі людзі апамяталіся, то ўбачылі, што няма і малайца з чубам.

— Ну, вось і забралі чэрці,— сказаў адзін стары пасажыр.— Туды яму і дарога, хулігану! Цяпер яму будзе ўжо горш, як у пекле.

Пачуліся званкі, затым гудок паравоза — і цягнік нырнуў у нетры Зямлі.

— Памажы, божа! — зашаптаў стары і, адвярнуўшыся ў куток, ціхенька пачаў хрысціцца.

Раптам каля яго апынуўся праваднік ды як вызверыцца:

— Ты што тут хуліганіш, стары чорт?! Тут табе не царква! Як табе не сорамна: здавалася б, стары чалавек, а хуліганіць, як той блазнюк з чубам. Будзе і табе так, як яму.

— Выбачайце, паночку, больш не буду! — запрасіўся спалоханы дзядок.— Да таго, ведаеце, прывык да гэтых праклятых модлаў, што самі рукі хрысцяцца і сам язык вымаўляе паскудныя святыя словы.— Шчуплы дзядок нават натапырыўся, як певень, і грозна крыкнуў: — Хай на іх ліха, на ўсе гэтыя модлы! Хай чорт забярэ і бога, і ўсіх яго святых, калі яны не заступаюцца за добрых людзей!

— Правільна, дзядуля! — зарагаталі бандыты.— Не заступаюцца, каб іх чэрці задушылі!

Праваднік убачыў, што дзядок гэты падае надзеі быць добрым грэшнікам, і дараваў яму «хуліганства».

Праз некалькі гадзін пасажыры, у тым ліку і нашы піянеры, паснулі. Але было так цесна і бандыты так гучна храплі, што Янка з Юркам хутка прачнуліся.

Бачаць — дзядок не спіць, увесь час азіраецца і ўсё капошыцца ў сваім кутку.

— Глядзі, глядзі! — шапнуў Янка.— Ці не моліцца ён зноў?

— Папільнуем! — прапанаваў Юрка.

Яны асцярожна павярнуліся да дзядка, наставілі вушы і праз некалькі хвілін пачулі шэпт, шчыры, праз слёзы:

— Божачка, даруй мне гэты грэх! Сам ведаеш, трапіў я ў лапы чарцей і вымушаны скакаць пад іх дудку. А ў душы я цябе люблю, толькі табе аднаму пакланяюся і малюся. Госпадзі памілуй... госпадзі памілуй...

Юрка штурхануў Янку пад бок:

— Як завуцца такія тыпы?

— Двурушнікі! — адказаў Янка.— Усюды іх поўна: і на зямлі, і пад зямлёй...

— І на небе! — дадаў Юрка.— А гэты дзядок, відаць, не адну душу загубіў, калі бог не паслухаў яго малітваў.

І хлопцы зноў заснулі.

Іх разбудзілі гоман і шум, якія звычайна бываюць, калі цягнік пад'язджае да вялікага горада.

А які ж павінен быць горад, што завецца Пеклам?

Падзяліўшы вядомую ўжо нам лічбу магчымага насельніцтва пекла на колькасць жыхароў, скажам Нью-Йорка, мы атрымаем лічбу 2 500 000.

Гэта значыць, што па колькасці насельніцтва пекла большае за Нью-Йорк у 2,5 мільёна разоў!

А каб мы захацелі гэтыя два з паловай мільёна Нью-Йоркаў размясціць па ўсёй зямлі (без акіянаў), то яны занялі б усутыч усю сушу ды яшчэ адзін на адным дваццаць разоў. Іначай кажучы, небаскробы прыйшлося б падняць да 2 000 паверхаў.

А цяпер няхай чытач сам мяркуе, якой велічыні павінна быць пекла.

Доўга ішоў цягнік ціхім ходам паміж станцыйнымі будынкамі-пячорамі. Фактычна гэта былі самастойныя вялікія станцыі з надпісамі: «Азія», «Амерыка», «Афрыка», «Аўстралія». Да іх падыходзілі цягнікі з другога боку зямлі.

Цягнік, у якім ехалі нашы піянеры, спыніўся на станцыі «Еўропа».

Пачалася высадка — шум, крыкі, слёзы. А на платформе адбывалася нешта такое, чаго не ўбачыш нідзе, апрача пекла.

Дзесяць тысяч чарцей з віламі наводзілі парадак, але што яны маглі зрабіць з людзьмі, якія крычалі ім:

— Правалівай к чорту! Мне ўжо няма чаго баяцца, горш нічога не можа быць.

Многія панапіваліся ад гора, бо і тут, як ва ўсім белым і чорным свеце, на станцыі быў буфет. Бутлі з дэнатуратам займалі ўсю сцяну, самагон-«пяршак», настоены на махорцы з клапамі, стаяў цэлымі бочкамі.

Галоўнай закускай былі жабы — гатаваныя, смажаныя, марынаваныя, а для заграні́чных паноў-аматараў нават жывыя, у банках. Змеі, яшчаркі, кракадзілы розных парод і гавыя, у банках. Змеі, яшчаркі, кракадзілы розных парод і тунка́ў. Абмакнуўшы такі прысмак у чортаву перачніцу, аматары казалі, што да самагону гэта найлепшая закуска. Замест цукерак былі гарачыя вугольчыкі, якімі асабліва любілі ласавацца чэрці.

За станцыяй ішла вялізная плошча, якую лепш было б назваць пячорай, бо навакол стаялі суцэльныя сцены, скалы. Усё было чорнае; электрычныя лямпы толькі праразалі гэтую цемру, а не разганялі яе.

Насупраць чарнелася вялізная, глыбокая брама, па-над якой ззялі злавесныя, нібы крывавыя, цёмна-чырвоныя літары:

«Пакінь надзею назаўсёды, сюды ўвайшоўшы».

Нават у піянераў ёкнула сэрца, калі яны прачыталі гэтыя жудасныя словы, а некаторыя з публікі дык зусім самлелі.

Зразумела, ля брамы сядзела камісія, але ўжо з адных чарцей, ды не аблезлых, а па-сапраўднаму страшных. Прaглядаючы дакументы грэшнікаў і свае спісы, яны прызначалі кожнага ў адпаведнае аддзяленне, а другія чэрці зараз жа насаджвалі іх на вілы і цягнулі ў сярэдзіну.

Вось падыходзіць рабін.

— Імя? — запытаўся старшыня камісіі.

— Нохім, паночку, Нохім Зібіцкер, з Смалявіч,— адказаў рабін.

Чорт паглядзеў у спіс і пакруціў галавой:

— Няма такога. Можа, Нохім-Хаім?

— Не, паночку, Нохім.

Паглядзеў другі чорт, пузаты, з пяром за вухам.

— Няма такога. Ёсць толькі Нохім-Хаім Зібіцкер і якраз з Смалявіч.

— Вось ад гэтага Хаіма і ўся бяда! — хваляваўся рабін.— Яго прыпісалі да мяне пазней. Ён, нягоднік, нарабіў бяды, а я за яго павінен адказваць. Вось гляньце: спачатку было толькі Нохім, а потым нехта прыпісаў мне Хаіма.

— Праўда,— згадзіліся чэрці.— Ну, ідзі назад, у галоўную канцылярыю, там разбяруцца.— І яны паставілі на дакуменце пячатку, каб яго прапусцілі назад.

Зазваніў тэлефон. Чорт узяў трубку.

— Адкуль? Стыкс? Ну-ну! Што? Харон? Забаставаў? Што за глупства! Ну-ну? Так, добра. Званіце да пана Люцыпара.

— Вось дык гісторыя! — звярнуўся ён да сваіх таварышаў.— Стары Харон забаставаў! Кажа, што ён мае права адпачываць 654 гады. Дзівата! Але, між намі кажучы, я нічога не меў бы супраць. Прынамсі, і мы тады крыху адпачылі б.

І яны зноў прыняліся за сваю работу.

Падбег адзін дзяцюк і крыкнуў:

— Прапусціце і мяне!

— Ты хто будзеш?

— Цыбульскі Вацлаў. Парабак з-пад Слуцка.

— Няма такога,— адказалі чэрці, глянуўшы ў спіс.

— Вось мае дакументы.

Зірнулі ў дакумент і зарагаталі:

— Ты ж павінен быць у чыстцы!

— Я быў там, ды ўцёк. Прыміце, калі ласка, у пекла!

Зноў усе зарагаталі.

— Чаму? Тут жа пакута!

— Ну, а там яшчэ горшая пакута! Туляйся, сядзі ды пазяхай увесь век. Ніякай табе працы, ніякага інтарэсу.

— Малайчына, хлапец! — сказаў крывы чорт.— Але ці маем мы права прымаць такіх? Ніколі не было такога выпадку.

Пазванілі ў чысцец, і адтуль адказалі:

— Рабіце, як хочаце. Нам усё роўна.

Пазванілі на неба. Святы Пётра адказаў:

— Можаце браць сабе гэтага дурня, у нас і сваіх досыць. Баба з воза — возу лягчэй.

— Ну, ідзі,— сказаў чорт.— Як добраахвотніку, мы табе дамо самую лёгкую працу: вартаўніка пры школе.

Дайшла чарга да нашых піянераў. Падышлі, хвалюючыся, назвалі сябе.

— Няма яшчэ такіх. Прыйдзецца пачакаць,— адказалі ім.

— Ды мы жывыя!

— Што?! Жывыя?! — падскочылі чэрці.— А як жа вы сюды трапілі?!

— Прыйшлі пазнаёміцца з вамі, паглядзець, што тут у вас робіцца, наведаць нашых.

— Вось дык штука! — паскроб патыліцу лысы чорт.— Што ж цяпер нам з імі рабіць? Дакументы ёсць?

— Якія там дакументы? Вось! — паказаў Юрка на свой піянерскі гальштук.

Пацiснулі чэрці плячыма, а потым пузаты і кажа:

— Але ж чым чорт не жартуе! Давайце прапусцім іх. Хлапцы слаўныя, вясёлыя, да таго ж бязбожнікі. Хай паглядзяць.

— Ну добра,— згадзіўся лысы чорт і працягнуў піянерам па картцы, на якіх было напісана: «Дазваляецца вольны ўваход і выхад ва ўсіх аддзяленнях».

— Глядзіце толькі не трапляйцеся на вочы Люцыпару,— папярэдзіў ён.

Ледзь піянеры ўвайшлі ў браму, як на іх кінуўся страшэнны жоўты сабака. Ён меў ажно тры галавы, а замест хваста ў яго была жывая змяя! Перад такім страшыдлам нават піянеры здрэйфілі.

— Цэрбер! Прэч! Нельга! — крыкнуў лысы чорт.

Сабака забурчаў сваімі трыма галовамі і неахвотна адышоўся.

— Ну, а цяпер можаце ісці спакойна,— сказаў лысы чорт.— Бачыце, пасля таго як яго злавіў быў грэцкі герой

Геркулес ды вынес на зямлю, Цэрбер асабліва не любіць жывых людзей.

Піянеры падзякавалі і ў насцярожаным маўчанні пераступілі парог пекла.

А ззаду ззялі злавесныя словы: «Пакінь надзею назаўсёды...»

VI. Экскурсія па пекле

Першай установай, куды трапілі піянеры, была школа. У ёй навучаліся закону божаму ўсе тыя, хто на зямлі не хацеў ці не мог вывучаць яго. Праўду кажучы, гэта была не школа, а цэлы універсітэт, у якім налічвалася сем мільёнаў студэнтаў.

Настаўнік, прылізаны чорт у акулярах, стаяў на кафедры і выкладаў:

— У першы дзень бог стварыў свет, у другі — неба, у трэці — ваду і зямлю, у чацвёрты — сонца, месяц і зоркі, у пяты — рыб і птушак, у шосты — жывёл і чалавека. Ну, дык калі бог стварыў казла? — звярнуўся ён да аднаго дзядзькі з пукатымі вачыма.

Той ускочыў і пралепятаў:

— У пя...пяты!

— Няпраўда! — загрымеў настаўнік.— Давай лапу!

Вучань працягнуў руку.

— Лінейку! — закамандаваў чорт.

Падбег нейкі чалавек і падаў настаўніку гарачую жалезную лінейку.

— Цыбульскі! — ускрыкнулі піянеры.

Сапраўды, гэта быў Вацлаў Цыбульскі, той, што ўцёк з чыстца і быў прызначаны вартаўніком пры школе.

Чорт узяў лінейку і адлічыў дзесяць удараў.

— Калі бог стварыў чорта? — спытаў ён у другога.

— У шосты дзень! — упэўнена адказаў той.

— Давай лапу!

Потым ён звярнуўся да аднаго паважнага чалавека з пытаннем:

— На каго падобны чорт?

Чалавек устаў, і піянеры пазналі ў ім... прафесара! Таго самага прафесара, які так дужа ім дапамог. Піянеры гатовы былі б нават падказаць яму, каб самі ведалі закон божы.

— На бога! — адказаў прафесар.

Чорт задаволена ўсміхнуўся.

— Чаму? — пытаўся ён далей.

— Таму, што бог стварыў яго па свайму падабенству, разам з анёламі.

— Правільна! А калі бог стварыў сонца?

— У першы дзень.

— Няпраўда! Стаць на калені! Цыбульскі!.. Гароху!

Прыбег Цыбульскі і прынёс «гароху» — распаленых дабяла каменьчыкаў. І прафесар стаў каленямі на гэты «гарох» у кутку ля сцяны...

У піянераў зашчымела сэрца, і яны са слязьмі ў вачах пайшлі да другога аддзялення.

Тут на сцяне былі паразвешваны абразы, і настаўнік-чорт па адным выклікаў вучняў.

— Пакажы святога Пуда! Няпраўда! Лапу!

— Калі нарадзіўся святы Мікола? Няпраўда! Стань на калені на рабро лаўкі!

Далей ішлі кабінеты, дзе вучні знаёміліся з царкоўнымі рэчамі, лабараторыі па вывучэнні мошчаў...

Урэшце піянеры звярнуліся да аднаго настаўніка з запытаннем:

— Скажыце, калі ласка, ці даўно вы так займаецеся?

— Заўсёды!

— Як так?

— Ды так. Вось ужо 1929 год я не адыходжу ні на хвіліну ад гэтай кафедры. Раней яшчэ выпадалі вольныя хвіліны, перапынак, а цяпер усё горш ды горш. Нават вучням мы вымушаны даваць перапынак, а сабе не, бо прыходзіцца аднаму працаваць у некалькіх аўдыторыях з мільёнамі народу.

— А ці не прыходзіла вам у галаву думка,— сур'ёзна сказаў Янка,— што вы не менш ад іх пакутуеце?

— Нават больш,— уздыхнуў чорт.— Але нічога не зробіш, кожны павінен выконваць свой абавязак. Раней яшчэ траплялiся выпадкі выйсці на свет, пашвэндацца, пажартаваць з людзьмі, а цяпер няма часу, і мы нічога не ведаем, што там робіцца.

— А вы кіньце працу на хвілінку, збярыцеся ўсе разам — мы вам і раскажам.

— З вялікай ахвотай,— сказаў чорт і зноў прыняўся за сваю працу.

Далей трапілі яны ў бібліятэку, дзе павінны былі чытаць святыя кнігі тыя людзі, якія ў жыцці імі не цікавіліся. Некалькі мільёнаў чалавек моўчкі сядзелі за кнігамі, а бібліятэкары з бізунамі наглядалі, каб яны чыталі.

— Ваша пакута яшчэ нішто сабе,— заўважыў Юрка аднаму чытачу.

— А праваліся яна ка ўсім чарцям! — злосна адказаў той.— Вы не ведаеце яшчэ, што гэта за няшчасце! Некаторыя з нас нават прасіліся, каб іх перавялі на агонь, ды не пускаюць. О, гэта ж самая страшная пакута!

Далей яны ўвайшлі нібы ў царкву. З кафедры сапраўдны поп гаварыў казанне. Побач стаяў бясхвосты чорт (ажно ёсць і такія!).

— А гэта што такое? — здзівіліся піянеры.

— Гэта тыя, што не любілі хадзіць у царкву,— лагодна растлумачыў бясхвосты.— Дык вось мы адразу двух зайцоў забіваем: і поп пакутуе, і яны.

— Мусіць, і тут не лепш, чымся ў чытальні,— разважалі піянеры, выходзячы з царквы.

Праз некалькі крокаў яны ўбачылі браму, над якой у камені былі высечаны вілы. Ля брамы стаяў вартавы чорт, таксама з віламі.

— Пропуск! — грозна крыкнуў ён, наставіўшы вілы на хлопцаў.

Аднак, зірнуўшы на пропуск, ён адразу зрабіўся ласкавым, свойскім.

— Калі ласка, прашу! — сказаў ён па-джэнтльменску.

— Вы даўно тут стаіце? — зараз жа спытаў яго Юрка.

— Ды ўсе пяць тысяч семсот гадоў. Наша аддзяленне самае даўнейшае.

— А адпачынак калі-небудзь мелі?

— Які там адпачынак? Мы ж працуем, як чэрці.

— Дык навошта вы тут стаіце тысячагоддзі без карысці? — вельмі сур'ёзна запытаў Янка.

— А куды ж я дзенуся?

— Уцякайце да нас. У нас хопіць работы на ўсіх. Работы цікавай, карыснай і не больш сямі-васьмі гадзін у суткі,— агітаваў Янка.

— Няўжо? — летуценна заўсміхаўся чорт і нават выпусціў з рук свае вілы.

Тады паддаў яму ахвоты Юрка:

— Мы вас завядзём у паліклініку. Там самы выдатны прафесар адрэжа вам хвост...

— Не адрэжа, а зробіць ампутацыю,— паправіў Янка,— па ўсіх правілах навукі, без болю, так што і не пачуеце, як усё будзе ў парадку.

— І рогі таксама адпіляць,— працягваў Юрка,— а з капытоў зробяць пальцы і наогул ператвораць у такога прыгажуна, што ўсе будуць табе зайздросціць,— скончыў Юрка, не заўважыўшы, што перайшоў на сяброўскае «ты».

Чорт не вытрымаў спакусы і сказаў:

— Добра, іду з вамі! І зараз жа, нават вілы з сабою вазьму. Усе будуць думаць, што мяне нехта з начальства прыставіў да вас ахоўнікам.

Хлопцы не ведалі, што думаць і што рабіць. Так нечакана набылі сабе ўласнага чорта! Добра гэта будзе ці дрэнна?

Яны адышлі ўбок і пачалі раіцца ды меркаваць.

Чорт як быццам нішто сабе: не страшны, рахманы, паддаецца разумнаму ўплыву, не ганарлівы. І цяпер вось глядзіць на іх так жаласна, пакорліва, відаць, баіцца, што яго не возьмуць.

— Я думаю,— сказаў нарэшце Янка,— калі над ім добра папрацаваць, навучыць ды абыходзіцца з ім па-чалавечаму, калі ён будзе мець адпачынак, як усе мы,— то з яго выйдзе такі каштоўны працаўнік, якога і свет не бачыў. Падумай

толькі: ён не хварэе, не можа памерці, у агні не гарыць, у вадзе не тоне, не стамляецца. Ды гэта ж бясцэнны клад! І гэткая армія рабочых займаецца зусім непатрэбнай справай, дарэмна гібее пад зямлёй. Ну, дык бяром яго з сабой?

— Бяром! — адказаў Юрка.

Калі чорту сказалі, як вырашыўся яго лёс, ён ад радасці аж заскакаў, ляскаючы капытамі.

— А як цябе завуць? — спытаў Янка.

— Агабук, мае панічы, Агабук! — адказаў чорт.

Юрка скрывіўся.

— Мы просім нікога з нас не называць панамі! Паноў у нашай краіне даўно няма.

У першую чаргу Агабук павёў хлопцаў у сваё аддзяленне.

У неабсяжным памяшканні круціліся дзесяткі тысяч каруселяў. Да іх стаяком былі прывязаны грэшнікі. Калі яны набліжаліся да пэўнага месца, з падлогі аўтаматычна вытыркаліся вілы і калолі грэшніка ў бок.

Бандыцкага выгляду чорт, які абслугоўваў гэты цэх, з захапленнем сачыў за работай каруселяў і цешыўся:

— Эх, здорава ідзе! Трыста чалавек за адну мінуту! А раней... Сорамна нават успамінаць.

Янка і Юрка пераглянуліся і ўсміхнуліся. Абодва падумалі адно і тое ж: «Ну і тэхніка, жабам на смех!»

Але яны, вядома, нічога не сказалі. Не даваць жа парады, як катаваць сваіх братоў.

Прайшлі ў другое аддзяленне, якое мела выгляд вялізнай кухні. Наколькі магло ахапіць вока, цягнуліся шэрагі пліт, а на іх стаялі патэльні. Вакол іх тоўпіліся людзі, галоўным чынам жанчыны. Яны ўвесь час перакрыкваліся і раз-пораз чамусьці нахіляліся да патэльняў.

Нашы хлопцы спачатку нічога не маглі зразумець, потым прыгледзеліся і заўважылі, што людзі нахіляюцца... каб лізнуць гарачую патэльню!

Тады яны зразумелі, у чым справа, бо часта чулі аб гэтым дома.

— А ты ў Сідарыхі яйка з-пад курыцы ўкрала! — крык-

нула адна жанчына сваёй суседцы і зараз жа схілілася, каб лізнуць патэльню.

— Чыя б карова мычала, а твая маўчала! — адказала тая і таксама лізнула патэльню.

Быў тут і адзін хлопчык гадоў дзесяці.

— А ты за што? — спыталіся яго піянеры.

— Я пляваўся,— адказаў той скрозь слёзы і лізнуў патэльню.

Піянеры заўважылі, што пад плітамі зусім няма агню, і запыталіся аб гэтым свайго Агабука.

— Пліты электрычныя,— адказаў той, усміхаючыся.— Вы думаеце, мы маглі б справіцца звычайным спосабам? Тады б на адно гэтае аддзяленне не хапіла ўсіх чарцей, а цяпер адзін чорт спраўляецца з дваццаццю мільёнамі.

Далей сядзелі за сталом людзі — галодныя, [redacted] прагавітымі вачыма. У іх перад носам стаялі розныя смачныя стравы, але, як толькі яны нахіляліся, зараз жа аўтаматычна падымаўся абух і — бац па лбе.

— Гэта абжоры,— растлумачыў чорт-кухар.— Палюбуйцеся абсталяваннем! Як у Форда! Дзякуючы гэтаму пяць тысяч чарцей можна было перакінуць на іншую працу!

— Значыцца, вы цяпер маеце больш вольнага часу? — спыталі хлопцы.

— Дзе там! — сумна адказаў чорт.— Усё роўна рабочых не хапае, а работы ўсё больш і больш. Дзве тысячы семсот пяцьдзесят год не выходжу я з гэтага памяшкання.

— Дзіўная рэч,— сказаў Юрка Янку, калі яны адышліся далей.— Я пачынаю шкадаваць больш гэтых няшчасных чарцей, чымся пакутнікаў. Тыя, прынамсі, заслужылі сваю пакуту, а гэтыя завошта працуюць без перапынку?

— І я так думаю,— уздыхнуў Янка.

Далей ішлі тыя, што ў пост елі скаромнае. За гэта тут ім гвалтоўна пхаюць у рот сабачае, жабінае, змяінае, пацуковае мяса і розную падлу.

— Раней на аднаго такога грэшніка,— тлумачыў Агабук,— трэба было двое чарцей: адзін трымаў за галаву, а другі пхаў. А цяпер гляньце, якая любата!

І сапраўды любата: грэшнікі ляжалі на сталах, моцна прывязаныя, а машыны аўтаматычна і безупынна пхалі ім у рот мяса.

— Гэта мы запазычылі з Чыкага, з вядомых чыкагскіх бойняў,— сказаў чорт-майстар.

Далей былі начэплены языкамі на крукі ашуканцы, манюкі, а машыны іх аўтаматычна трэслі.

— Скажыце, калі ласка,— звярнуліся піянеры да аднаго ціхага чорта,— ці маеце вы самі на іх злосць?

— Якая там злосць! — шчыра сказаў чорт.— Што нам да іх? Нам яны нічога дрэннага не зрабілі. Але прыходзіцца працаваць, бо прымушаюць.

— Хто?

— Вядома, начальства! Усё ад Люцыпара ідзе.

— А вы кіньце гэтую працу.

— Ну не! Тады так пападзе, што сваіх не пазнаеш!

— А вы ўсе разам!

— Дык мы ж ніколі адзін аднаго не бачым! Мы ж па тысячы гадоў з месца сысці не можам! — безнадзейна сказаў чорт.

Калі хлопцы адышліся, іх «ахоўнік» Агабук прыпыніўся ля гэтага чорта і горача пачаў яму нешта казаць. Чорт вельмі здзівіўся, выслухаў, разявіўшы рот, потым засмяяўся, і па ўсяму было відаць, што хлопцы набылі яшчэ аднаго прыхільніка.

— Што ты яму сказаў? — спыталіся хлопцы.

— Тое самае, што і вы, толькі па-чартоўску,— адказаў ён з задаволеным выглядам.

— У такім разе агітуй, браток, дзе толькі можаш.

— Пастараюся! — адказаў Агабук і ляснуў капытамі.

Чым далей, тым усё болей і болей пекла прымала выгляд велізарнага завода. Грукацелі машыны, сіпелі пасы, круціліся колы.

У адным з наступных аддзяленняў хлопцы ўбачылі шмат вялізных казаноў, бакаў. У іх кіпела вада, зверху ішоў жолаб, а па ім сыпаліся ў ваду... маленькія дзеткі! Магутныя рычагі перамешвалі іх у вадзе.

— А іх жа завошта вы мучыце?! — з жахам сказалі піянеры да старэнькага сумнага чорта, які кіраваў працай.

— Нехрышчоныя яны, дык вось хрысцім,— хмура адказаў той.

— Хіба ж яны вінаватыя?

Чорт горка ўсміхнуўся:

— А хіба вы не ведаеце, што гэта закон боскі, а не наш? Наша справа маленькая: стой тут увесь век ды перамешвай гэтых няшчасных нявінных дзетак.

І ён адвярнуўся, каб выцерці слязіну.

— Паверыце,— казаў далей старэнькі чорт,— паўтары тысячы год прашуся, каб мяне прыставілі да якіх-небудзь, але ўсё кажуць, што нельга, рабочых не хапае. Чаладзеяў сам згадзіўся б лепш сам ускочыць у вар, чымся бачыць усё гэта, але, на жаль, нас аніякі чорт не бярэ. Эх, каб якое-небудзь вызваленне прыйшло нарэшце!

Разжаленыя піянеры пацiснулі чорту лапу і сказалі:

— Пачакайце, дзядзька, прыйдзе канец і вашай няволі.

— У добры час! — адказаў ён весялей.— Калі што якое, дык я першы чорту на рогі палезу.

— Хочаце, я вам пакажу цэхі, дзе грэшнікаў катуюць па-хрысціянску? — прапанаваў Агабук.

— Як гэта па-хрысціянску? — здзівіліся хлопцы.

— Ды так, як калісьці катавалі духоўныя айцы ў Іспаніі.

І ён правёў іх у аддзяленне, дзе на лавах ляжалі прывязаныя манахі, ксяндзы, біскупы, а над імі круціліся колы з зубцамі і жыўцом вырывалі з іх кавалкі мяса. Замест вырванага зараз жа вырастала новае.

Па суседству такіх самых святых айцоў пілавалі, габлявалі, сціскалі ў калодках, падсмажвалі, капалі ваду на галаву ці ў вуха і гэтак далей...

— Чаму ж тут толькі адно духавенства, а іншых няма? — запыталіся піянеры.

Чорт-даглядчык адказаў:

— Тыя, каго яны мардавалі, усе ў рай пайшлі, а цяпер яны самі на сваім абсталяванні апрацоўваюцца.

Асабліва ўразіў нашых хлопцаў вогненны цэх, дзе былі

раскладзены тысячы вогнішчаў. Пасярод кожнага вогнішча стаяў слуп, да якога былі прывязаны такія самыя духоўныя айцы.

Бліжэйшым вісеў падобны да д'ябла біскуп. Ён курчыўся на агні і злосна крычаў:

— Можаце рабіць, што хочаце, чэрці праклятыя, а я вас не баюся! Таксама, як не баюся і вашага бога, праклядцце на яго разам з вамі!

— Гэта славуты вялікі інквізітар Тарквемада, які хваліўся, што на сваім вяку спаліў 40 000 чалавек,— растлумачыў даглядчык.— Але гэтыя ўсе ў нас з даўнейшых часоў, калі яшчэ бог з панам Люцыпарам не ладзілі. Цяпер святыя айцы рэдка калі трапляюцца...

Далей ішоў самы галоўны аддзел, смаляны. Там кіпяць у смале самыя горшыя грэшнікі: забойцы, бандыты, гвалтаўнікі... Туды часамі, як на зямлі ў карцар, саджаюць грэшнікаў і з другіх аддзяленняў. Там жа адбываюць пакаранне за розныя правіннасці і чэрці-рабочыя.

У свяшчэнных кнігах і карцінах паказваюць, як кіпяць там катлы кіпучыя, як тысячы чарцей мітусяцца вакол іх, падкладваюць дровы, падліваюць смалу, перамешваюць грэшнікаў віламі. Гарачыня там пякельная, смурод чартоўскі.

А калі піянеры ўвайшлі ў гэты цэх, то ахнулі...

На неабсяжнай плошчы раскінуўся горад з роўнымі вуліцамі, якія цягнуліся немаведама на колькі кіламетраў. Па баках вуліц стаялі аднолькавыя аўтаклавы (цыліндрычныя чаны, бакі), з якіх высоўваліся галовы грэшнікаў. Шыі іх былі шчыльна ахоплены «ашыйнікамі», так што пара з аўтаклаваў каля шыі не выходзіла напаверх.

Шэрагі такіх аўтаклаваў для эканоміі месца стаялі адзін над адным у некалькі паверхаў.

Да кожнага аўтаклава прымацоўваліся тэрмометр, манометр, паказчык колькасці смалы і яшчэ нейкія прылады. Вядома, усе аўтаклавы працавалі на электрычнасці.

Чысты, бліскучы выгляд меў гэты велічэзны хімічны завод. Пад шкляным дахам разносіліся стогны і праклёны пакутнікаў. Аднак, паколькі іх былі мільёны, паасобныя крыкі

не вылучаліся, а стварауся агульны, раўнамерны шум, да якога лёгка было прывыкнуць. Так бывае на ўсіх заводах.

На скрыжаваннях кварталаў стаялі кіраўнікі працэсу — чэрці-інжынеры. У белых халатах, з белымі шапачкамі на галовах, яны былі нават сімпатычнымі. Перад кожным быў пульт. На ім то там, то там запальваліся лямпачкі — белыя, чырвоныя, сінія, жоўтыя. Чорт націскаў кнопку,— і ў адпаведных аўтаклавах то павялічвалася тэмпература, то перамешвалася ці падлівалася смала.

На пытанне, ці даўно так дасканала абсталяваны гэты цэх, адзін з інжынераў адказаў:

— Ды гадоў дваццаць. А раней так цяжка было працаваць, што і ўспомніць страшна. Мы пакутавалі не менш за грэшнікаў. З адной толькі смалой колькі бяды было! Народ усё ідзе ды ідзе, а смалы не хапае. Пайшлі прастоі, непрыемнасці. А цяпер мы перайшлі на нафту. Вы там зверху цягнеце, а мы знізу. Бог запярэчыў быў, што ў нафце пакуты не тыя, лягчэйшыя. Але мы даказалі, што пры належнай тэмпературы і ціску пакуты могуць быць не толькі такія, як у смале, а нават яшчэ большыя.

— А вы доўга працавалі пры старым абсталяванні?

— Як і ўсе — больш за пяць з паловаю тысяч гадоў... Так усе гэтыя тысячы гадоў і прастаяў на гэтым месцы,— дадаў чорт з горкай усмешкай.

У гэты момант да яго падбег другі такі «інжынер» з суседняга пункта. Зірнуўшы на яго, Янка штурхануў свайго таварыша пад бок і ціха сказаў:

— Глядзі, глядзі! Ды гэта ж, здаецца, чалавек, а не чорт!

Прыгледзеліся і так і гэтак — чалавек, ды і годзе! Ні хваста, ні рог, ні капытоў. Што за дзіва такое?

Адказаў Агабук:

— Так, гэта — чалавек. Але горшы за любога чорта, бо ён — здраднік. Ён так падхалімнічаў перад нашым начальствам, так лізаў усім капыты, што яму даверылі катаванні яго братоў, людзей. І ён робіць гэта з большай ахвотай, чым хто.

А той, наблізіўшыся да першага інжынера, з якім размаўлялі нашы хлопцы, усхвалявана стаў казаць:

— Што ты язык чэшаш з гэтымі шкоднікамі? — Ён паказаў на піянераў.— Няўжо не чуў, што робіцца ў нас ад гэтых размоў? Усе чэрці нібы звар'яцелі. Толькі і гаворкі пра гэтых хлапчукоў, пра адпачынак для рабочых, пра нейкія новыя парадкі, і нават — страшна сказаць! — супраць Люцыпара чуюцца галасы. Трэба папярэдзіць наша кіраўніцтва, а гэтых агітатараў зараз жа пасадзіць у смалу.

— Ах ты, поскудзь паганая! — не вытрымаў Агабук.— Ды цябе першага трэба пасадзіць туды, прыхвасцень чартоўскі!

У той жа міг Агабук начапіў яго на свае вілы, і праз колькі хвілін здраднік сядзеў ужо ў аўтаклаве...

Яго таварыш інжынер толькі ўсміхаўся.

VII. Пераварот у пекле

Тым часам недзе далёка пачуўся глухі шум, нібы гром ці прыбой марскіх хваляў. Шум гэты паступова набліжаўся, і неўзабаве з яго пачалі вылучацца паасобныя галасы, крыкі.

А яшчэ праз колькі часу на процілеглых канцах вуліц паказаліся групы чарцей, якія памалу зліваліся ў натоўп.

— Сюды ідуць,— сказаў Агабук.— Даведаліся, што вы тут.

Вось ужо над натоўпам відаць плакаты з надпісамі:

«Патрабуем адпачынку за ўсе папярэднія тысячагоддзі!»
«Далоў Люцыпара і яго паслугачоў!»

Праца ў пекле была спынена, усе машыны выключаны. Многія з вызваленых пакутнікаў далучыліся да натоўпу.

Адзін спрытны чорт узлязеў на аўтаклаў і пачаў прамову:

— Дарагія сябры! Ніхто на свеце так не працуе, як мы. Нездарма людзі кажуць: «Працуе, як чорт». А хто з вас ведае, як цяпер працуюць людзі? Я апошні раз вылазіў на зямлю паўтары тысячы гадоў назад.

З натоўпу пачуліся крыкі:

— А я дзве с паловай тысячы!

— А я чатыры з гакам!

— Вось гэта я і кажу,— працягваў далей прамоўца.— А ці ўсе з нас так прымацаваны да свайго месца?

— Не, не! — загулі чэрці.— Тыя, што не працуюць, могуць вылазіць хоць кожны дзень.

— Гэта Люцыпар са сваёй бандай! — грозна крыкнуў вялізны пахмуры чорт.

— Правільна, таварышы! — згадзіўся прамоўца.— Тыя, што нічога не робяць, а сядзяць за спіной у Люцыпара, тыя могуць. А мы не. Мы сядзім тут і нічога не ведаем. Дык вось, таварышы, давайце скарыстаем прысутных рэдкіх у нас жывых гасцей і папросім іх расказаць, што цяпер робіцца там, на зямлі, дзе мы даўно ўжо не былі. Прашу,— звярнуўся ён да гасцей.

Чэрці далікатненька падхапілі хлапцоў і мігам узнеслі на аўтаклаў.

— Грамадзяне чэрці! — пачаў Янка на ўвесь свой голас.— Прыйшлі мы з зямлі, каб паглядзець, як пакутуюць нашы браты, каб пашукаць якога-небудзь спосабу дапамагчы ім. Прыйшлі да чарцей, пра якіх нам кажуць, што гэта самыя лютыя стварэнні, якія толькі і думаюць, каб больш памардаваць нашых людзей.

— Няпраўда! — запярэчылі чэрці.— Нам усё роўна. Нам яны нічога дрэннага не зрабілі. Але нас прымушаюць працаваць па загаду бога і Люцыпара.

— Мы і самі ўсё гэта заўважылі,— казаў далей Янка.— Мы ўбачылі, што вы з'яўляецеся бадай-што такімі самымі пакутнікамі, як вашы грэшнікі.

— Правільна! Нам нават горш! — загулі чэрці.

— А ці падумалі вы хоць раз: чаму і дзеля чаго вы працуеце? — крыкнуў Янка.

Чэрці здзіўлена паглядзелі адзін на аднаго, не ведаючы, што адказаць. Толькі хтосьці прамармытаў:

— Ды, мусіць, так трэба.

— А каму гэта трэба? — гучна спытаў Янка.

Чэрці маўчалі.

— Вы ж лічыцеся праціўнікамі, ворагамі бога. Так ці не? — запытаўся Янка.

— Вядома, так,— адказалі чэрці.

— Ну, дык чаго ж вы мардуеце тых людзей, якія разам з вамі таксама пайшлі супраць бога? Вы павінны былі б любіць, шанаваць іх, а не мардаваць. А вы, выбачайце, як дурні, мардуеце сваіх саюзнікаў.

— Дык жа гэтак спрадвеку было! — пачуліся няпэўныя галасы.

— Мала што спрадвеку. Спрадвеку вы працавалі рукамі, а цяпер перайшлі на машыны. Кожны робіць так, каб было лепей, а не горш.

— Ды і сам Люцыпар загадвае нам працаваць.

— А сам ён што робіць?

— Ды нічога,— адказаў доўгі худы чорт.— Сядзіць сабе ў залатым палацы ды гуляе ў карты. Нават ні разу сюды не заглянуў.

— Вось бачыце! Лічыцца, што ён з богам змагаецца. А ці спрабаваў ён памагчы тым людзям, якія на зямлі з богам змагаліся і за гэта трапілі сюды на пакуты? Каб ён быў сумленным чортам, ён павінен быў бы ўсяляк дапамагаць такім грэшнікам, а ён з богам грае ў адну дудку.

— Так,— сказалі чэрці,— з богам яны дружна жывуць, ніякіх канфліктаў за апошнія стагоддзі і не было.

— А па-мойму, дык абодва яны — адно ліха! — крыкнуў доўгі чорт.

— Праўда, таварышы! — падхапіў Янка.— Абодва яны нічога не робяць, абодва сядзяць у пышных палацах, абодва прымушаюць вас вечна працаваць, абараняць іх ад людзей. Вось на каго вы працуеце!

— Правільна! Далоў іх! — грозна загула чартаўня.

— І ў нас гэтак жа было,— казаў Янка.— Быў у нас цар, наш Люцыпар, і таксама нібы змагаўся з другім царом, а сапраўды абодва яны былі ў змове і думалі толькі аб тым, каб працоўных у сваіх руках трымаць. Ну, мы ўзялі ды і прагналі свайго Люцыпара ка ўсім чарцям, самі зрабіліся гаспадарамі. Вось чаму цяпер у нас працаваць лягчэй, працуем ужо

самі для сябе, а не для другога. Але нідзе ў нас, нават пры царах, не было такога пекла для рабочых, як у вас тут. А вы церпіце ды яшчэ называецеся чарцямі.

Загуло пекла, забушавала. Уся тысячагадовая крыўда ўсплыла напаверх. Крыўдна стала за сваё беспрасветнае чартоўскае жыццё.

Выскачыў чорт паласаты і закрычаў:

— Браточкі! Ды яны ж праўду кажуць! Дзеля якога чорта мы нясём такую д'ябальскую працу? На чорта гэта нам здалося? Каму ад гэтага карысць? Толькі богу, Люцыпару ды іх паслугачам. І дзеля іх мы мардуем столькі людзей, з якіх прынамсі палову мы можам лічыць сваімі братамі, такімі самымі рабочымі, як мы. Ці не лепш было б аб'яднацца з імі ды прагнаць к чорту ўсіх нашых паноў...

Далейшых слоў ужо нельга было пачуць, бо падняўся незвычайны шум.

— Годзе ўжо! Папілі нашай крыві! Тысячы год здзекаваліся з нас! — чулася сярод гэтага гулу.

Нават грэшнікі далучыліся і крычалі, як чэрці.

Тады выступіў адзін з грэшнікаў, былы рабочы-ліцейшчык.

— Таварышы чэрці! Зірніце навакол, прыгледзьцеся да тых, каго вы да гэтага часу мардавалі. Ці дужа знойдзеце вы тут паноў, памешчыкаў, капіталістаў? Усё такая ж працоўная бедната, як і вы. А багатыя жывуць у раі, бо маюць грошы, каб наняць папоў, ксяндзоў, рабінаў і г. д. А тут адны працоўныя мардуюць другіх. Акурат як яшчэ сям-там на зямлі: адны працоўныя стаяць ля варштатаў, а другія, такія самыя, толькі ўзброеныя, аберагаюць багатых. Бачыце, як хітра ўсё гэта пабудавана!

— Так, так! Правільна! Цяпер не ашукаюць! Зразумелі ўжо! — гулі чэрці.

Потым пачалося братанне чарцей з грэшнікамі. Абдымаліся, цалаваліся, нават плакалі ад радасці.

Стары чорт прывёў цэлыя атрады акцябрат і піянераў, якіх ён нядаўна «хрысціў». Адзін акцябронак ужо ўзабраўся на трыбуну і звінеў:

— Дзядзечкі чэрці! Дзякуем вам, што вы нас аслабанілі. Цяпер ужо мы будзем добрымі, паслухмянымі, не будзем біцца, пэцкацца.

Ад гэтых слоў памякчэлі нават самыя заядлыя чэрці.

— Бедныя дзеткі! Яны думаць, што іх за гэтае каралі. Яны нават не ведаюць, што іх каралі толькі за тое, што яны нехрышчоныя! — казалі «дзядзечкі», выціраючы слёзы.

Выскачыў яшчэ адзін з грэшнікаў:

— Таварышы! Усе за аднаго, адзін за ўсіх! Мы ўсе павінны аб'яднацца!..

— З табой? — перапыніў яго смалены чорт.— Ах ты бандыт! А ты пры чым? Таварышы! Гэты бандыт зарэзаў трох дзяцей і двух дарослых, а цяпер прапануе з ім аб'яднацца. Ці можам мы...

— Далоў яго! Назад, у смалу! — закрычалі чэрці, мігам падхапілі яго на вілы і пасадзілі ў чан.

Нарэшце зноў выступіў Янка:

— Таварышы! Нам трэба дзейнічаць у парадку, арганізавана, бо інячай нічога не выйдзе з нашай работы. Дзеля гэтага я прапаную:

1) абраць камітэт з сваіх рабочых ад варштатаў і слухацца яго, як сваёй вышэйшай улады;

2) зараз жа ліквідаваць Люцыпара і яго прыхільнікаў;

3) выпрацаваць законы, па якіх вы пажадаеце ў далейшым жыць.

«Ахоўнік» Агабук прапанаваў яшчэ, каб у камітэт былі выбраны і прадстаўнікі ад грэшнікаў.

— Добра! Згодны! — закрычалі чэрці.

Абралі камітэт, у які ўвайшло па адным прадстаўніку ад кожнага цэха (аддзялення) і сем прадстаўнікоў ад грэшнікаў. Старшынёю абралі смаленага чорта, сакратаром — чорта лазатага з машыннага аддзялення.

Узброіліся, разбіліся на атрады і з песняй «Что вы, черти, приуныли» рушылі да палаца Люцыпара.

— Трэба выключыць тэлефоны,— прапанавалі піянеры,— каб спыніць між імі сувязь.

а песня рука

— Малайцы хлопцы! Хоць маленькія, а якія здагадлівыя! — пахваліў чорт лазаты і нават папляскаў іх па плячы.

Палац Люцыпара, пабудаваны з суцэльнага золата, знаходзіўся на высокай скале. Вакол скалы быў вогненны роў, а ў ім песціўся змей даўжынёй у некалькі кіламетраў.

— Глянь, глянь! — зацікавіўся Янка.— Той самы змей, якога малююць у цэрквах на абразах!

Люцыпар сядзеў у сваім залатым палацы і гуляў з вядзьмаркамі ў карты, калі прыбеглі спалоханыя міністры і сказалі, што чэрці-рабочыя ўзбунтаваліся.

Люцыпар спачатку не зразумеў, што тыя кажуць.

— Здурнелі вы, ці што? — прамовіў ён.— Супраць каго ім бунтаваць? Супраць бога мы ж даўно бунтуем.

Прыбеглі новыя міністры і крыкнулі:

— Ваша вялікасць! Чэрці падняліся супраць вас! Пагражаюць знішчыць.

— А! Вось што! — зароў Люцыпар.— Сабрацца ўсім! Страляць у іх з гарматаў!

Зараз жа вакол Люцыпара сабралася армія ў 72 000 чарцей. Пачалі страляць з гарматаў.

Але што гэта за гарматы! Адзін смех.

Аднак хлопцы вельмі здзівіліся, пачуўшы стрэлы.

— Адкуль у іх гарматы?

— Гэта, бачыце, тыя гарматы,— растлумачыў чорт лысы,— якія засталіся яшчэ з часу вайны з богам, калі нас выганялі з раю. Дрэнныя, самыя першабытныя гарматы.

— А ў вас ёсць?

— Няма,— збянтэжана адказаў чорт смалены. — Адкуль жа нам іх узяць? Гэтым кіруе сам Люцыпар.


— А ці хутка вы маглі б зрабіць?

— Калі ведаць, што і як, то можна хутка. І нават лепшыя за гэтыя, бо ў нас цяпер ёсць самыя дасканалыя машыны.

— Дык у вас жа сярод пакутнікаў знаходзяцца самыя найлепшыя інжынеры ў свеце. Яны мігам наладзяць гэтую справу.

Праз некалькі гадзін дзесяць найлепшых сусветных спецыялістаў выпрацавалі чарцяжы, а яшчэ праз колькі гадзін





тысяча дасканалых гармат ужо граміла крэпасць Люцыпара. Што ні кажы, а ўсё-такі маштабы чартоўскія.

Люцыпар толькі дзіву даваўся.

— Вось чэрці! — скрыгатаў ён зубамі.— Адкуль гэта ў іх узялося?

Але фактычна такая вайна была проста гульнёй. Бо ўсім вядома, што чарцей бог стварыў такімі ж несмяротнымі, як ён сам і яго анёлы. Як жа іх забіць?

Палац Люцыпара і крэпасць былі зруйнаваны, а войска як было семдзесят дзве тысячы ад стварэння свету, так і засталося. Праўда, і яны не маглі перабіць паўстанцаў, але якая ад гэтага карысць?

Сам пан бог, вядома, даў бы рады паўстанцам. Але на чый бок ён стаў бы, каб даведаўся пра гэтае паўстанне?

— Вядома, на бок Люцыпара! — быў адзін адказ.

І тут чэрці зноў і зноў дзякавалі сваім кансультантам за тое, што яны параілі перарваць тэлефонную сувязь. А па вачах паўстанцаў было відаць, што яны і цяпер чакаюць ад піянераў парады, як перамагчы несмяротную ахову Люцыпара.

Задумаліся нашы хлопцы. Думалі, думалі — і нарэшце знайшлі выхад!

На зямлі, як вядома, з чарцямі змагаюцца не з гарматамі, а з малітвамі, крыжам, свянцонай вадой, набажэнствамі. І змагаюцца паспяхова. Дык чаму ж і тут не скарыстаць гэтую зброю? Хіба мала сярод тутэйшых грэшнікаў знойдзецца святых айцоў розных рангаў?

Праз паўгадзіны чэрці-добраахвотнікі прывалаклі з розных канцоў пекла чатырнаццаць тысяч семдзесят восем духоўных айцоў.

Убачыўшы такую армію, чорт лазаты аж за рогі ўхапіўся:

— Што вы робіце, бязмозглыя! Чаго вы ўсіх духоўных цягнеце? Патрэбны толькі хрысціянскія, а вы панацягалі і шаманаў, і жрацоў, і мулаў, і рабінаў, і будыстаў, якія крыжа не ўжываюць, у Хрыста не вераць.

Прыйшлося зрабіць адбор і ўзяць толькі 777 галоў.

Затое ж якая магутная антычартоўская сіла стварылася!

Апрача папоў і ксяндзоў, былі тут архірэі, біскупы, архімандрыты, пратапопы, адзін мітрапаліт, два кардыналы, у тым ліку славуты Тарквемада. І нарэшце — вядомы распуснік і злачынца рымскі папа Аляксандр VI.

Перад імі была пастаўлена задача: памаліцца над зброяй, галоўным чынам над снарадамі, благаславіць іх, асвяціць свянцонай вадой, а для большай сілы паставіць на іх як мага больш крыжыкаў. Супраць такой сілы ўжо ніякі чорт не ўстоіць.

Чэрці мабілізавалі ўсе магчымасці, каб дастаць для свайго духавенства адпаведнае параднае адзенне, залатыя і сярэбраныя рызы, абразы, харугвы, кадзілы з ладанам, якога так баяцца чэрці, і іншыя патрэбныя прылады. Такога ўрачыстага калектыўнага набажэнства ніколі яшчэ не было на зямлі.

Гісторыкі могуць сказаць нам, што малітвы над зброяй і асвячэнне яе задоўга да гэтага часу практыкаваліся і цяпер практыкуюцца ў рэлігійных краінах, што не чэрці выдумалі тое набажэнства, аб якім тут гаворыцца.

Але ж мы і не гаворым, што яны самі выдумалі гэты спосаб. Мы толькі падкрэсліваем, што яны творча перанялі вопыт людзей і арганізавалі справу так шырока і дасканала, як могуць зрабіць толькі чэрці.

Але аблезлы чорт увесь час непакоіўся:

— Што вы робіце? Што вы робіце? Пабойцеся бога! А што будзе з намі самімі? Ды гэтыя прычындалы і набажэнствы ў першую чаргу нас загубяць.

Пытанне было вырашана такім чынам: перад набажэнствам чэрці схаваліся, дзе хто мог, а некаторыя адвярнуліся і заткнулі вушы. З гарматамі і снарадамі важдаліся рэлігійныя грэшнікі-добраахвотнікі.

Цяпер ужо нам лёгка ўявіць сабе тое, што адбылося ў пекле, калі на Люцыпараву рэзідэнцыю з усіх бакоў пасыпаліся благаславёныя снарады.

Перш за ўсё разарвала на шматкі таго змея, які сваім шматкіламетровым целам акружаў замак. А калі святыя снарады пачалі калашмаціць несмяротных прыхільнікаў Люцы-

пара, тыя так зараўлі, што ўсім чарцям млосна зрабілася. Кроплі свянцонай вады, пах ладану, крыжыкі, дух малітваў — усё гэта дзейнічала на чарцей горш за кіпячую смалу. Яны круціліся, як вужакі, не знаходзячы выйсця з гэтага пекла.

Становішча іх было сапраўды безвыходнае. Куды ні сунься, усюды тоўшча зямлі ў тысячы кіламетраў. Толькі над галавой было трохі бліжэй да паверхні зямлі. Туды яны ўсе разам і рынуліся...

І тады людзі наверсе перажылі страшнае землетрасенне. Выбухнуў вулкан, а з яго вылецела столькі камення, попелу, лавы, дыму, пары, што дзень адразу ператварыўся ў ноч. Таму людзі не бачылі і не ведалі, што разам з усім тым з-пад зямлі вылецела 72 000 чарцей на чале з Люцыпарам...

Вылецелі і паляцелі ў космас шукаць сабе прыстанішча на якой-небудзь іншай планеце, дзе навукі і культуры яшчэ няма. Такія ўмовы для чарцей лічацца самымі найлепшымі.

«Ну і чорт з вамі! — скажам ім услед.— Пражывём і без вас».

Паглядзім цяпер, што сталася з рэшткаю чарцей у пекле і нашымі героямі Янкам Гужам і Юркам Пыжам.

Як жа ж дзякавалі ім чэрці-пераможцы за дапамогу! Як не хацелася ім разлучацца са сваімі юнымі сябрамі! Нават плакаць пачалі. Спачатку ціхенька адзін, потым другі мацней, потым трэці яшчэ горш, а там ужо зараўлі ўсе чэрці, як падсмаленыя.

Асабліва расчуліўся Агабук:

— Я збіраўся быў перасяліцца да вас на вечнае жыццё, а цяпер...

А цяпер, бачыце, яму прапанавалі тут пасаду дзяржаўнага сакратара. Зусім зразумела, што ён не ведаў, куды падацца.

Хлопцы параілі яму лепш застацца дзяржаўным сакратаром у пекле, чым чортам на зямлі.

На вакзале піянерам далі салон-вагон самога Люцыпара і ахову з сямі чарцей.

Калі развітваліся, зноў былі слёзы.

— Не забывайце нас, прыязджайце ў госці,— прасілі чэрці.

Калі, нарэшце, нашы падарожнікі засталіся адны ў сваім купэ, то адчулі сябе такімі зморанымі, што зараз жа і паснулі.

А прачнуліся... у тым самым дупле, з якога пачыналі сваё падарожжа! Каля іх сядзела сем чарцей, што пяшчотна перанеслі сюды сваіх дарагіх гасцей і ахоўвалі іх сон. У ліку гэтых сямі быў і Агабук.

Сардэчна развіталіся апошні раз і разышліся.

Паміж тым у пекле жыццё ўжо ішло па-новаму. Перш за ўсё пераможцы вызвалілі працэнтаў дзевяноста грэшнікаў, пакінуўшы толькі зладзеяў, забойцаў, бандытаў і наогул самых лютых злачынцаў. Але і ім пакуты былі не вечныя, а ў залежнасці ад віны — ад 1000 да 1 000 000 гадоў.

Рэшту цэхаў перабудавалі на карысную вытворчасць, на вырабы з жалеза, медзі, золата, наогул з усіх тых матэрыялаў, што здабываюцца ў нетрах зямлі.

Вызваленыя грэшнікі сталі рабочымі, раўнапраўнымі з чарцямі. А паколькі праца ўсё ж такі была пякельная, бо адбывалася ў пекле, то рабочы дзень быў вызначаны ў чатыры гадзіны.

Вось тыя змены, якія адбыліся яшчэ да ад'езду Янкі Гужа і Юркі Пыжа.

Што было далей, яны не ведаюць.

Хачу яшчэ зазначыць, што хлопцы мае нікому не казалі аб сваім падарожжы: баяліся, што ім ніхто не дасць веры, а толькі падымуць на смех. А як даказаць праўду? Ніякіх паперак чэрці не далі, бо ўсё роўна ніхто не паверыў бы, сказалі б:

— Дакажыце, што гэтыя дакументы сапраўдныя!

Прыйшлося б зноў ехаць у пекла і прасіць пасведчанне, што дакументы сапраўдныя. Тады зноў сказалі б:

— Дакажыце, што пасведчанне аб тым, што дакументы сапраўдныя, сапраўднае!

Тады прыйшлося б зноў ехаць у пекла і прасіць, каб вы-

далі новае пасведчанне ў тым, што першае пасведчанне сапраўднае.

І так да сканчэння свету...

Мне яны таксама не хацелі расказваць. А згадзіліся толькі тады, калі я пакляўся д'яблам, што нікому ніколі нічога не скажу.

І я сумленна выконваю клятву: нікому нічога і не падумаў казаць, а толькі напісаў на паперы. А што тычыцца сапраўдных прозвішчаў Янкі і Юркі, то іх я нават і не пісаў, а выдумаў зусім іншыя, непадобныя прозвішчы, каб ніхто не пазнаў.

Такім чынам і з'явілася на свет гэтая праўдзівая казка.

А калі хто не паверыць, то няхай сам на месцы пераканаецца. Дарога цяпер ужо вядомая: спачатку проста на поўнач, потым — направа, далей — налева, затым — зноў направа, тады — зноў налева і ўрэшце яшчэ раз налева.

І праз семдзесят сем крокаў вы акурат натрапіце на той дуб, адкуль пачынаецца дарога ў пекла.

1928 г.

АПАВЯДАННІ, НАРЫСЫ, АДНААКТОВАЯ П'ЕСА «ХАТА З КРАЮ»

АПАВЯДАННІ

ЧУЖАЗЕМЕЦ

Кіру здавалася, што лета ў гэтым годзе ніколі не скончыцца і восень ніколі не прыйдзе. Ды і як жа ж было яму не чакаць восені, калі ён сёлета павінен быў паступіць у сапраўдную школу.

Да гэтага часу ён хадзіў у дзіцячы сад, а цяпер павінен быў хадзіць у нулявую групу пры школе. Школа вялікая-вялікая, и вучняў там сотні, а можа, і тысячы. А можа, і мільёны? Хто іх ведае, якая лічба больш падыходзіць.

А сярод вучняў ёсць вялікія, дарослыя, нібы дзядзькі якія ці цёткі. Разам з імі, у тую самую школу, будзе хадзіць ён, Кіра. Як жа было не чакаць гэтага часу?

Калі ж час прыйшоў і Кіра паступіў у школу, дык застаўся крыху нездаволены: нулявая група была вельмі падобная да дзіцячага сада. Тыя самыя маленькія крэслы, столікі, а не парты, як у іншых групах. І заняткі не такія, як у старэйшых групах.

Ну, ды гэта нішто. Затое Кіра бачыў той сапраўдны клас, дзе ён будзе вучыцца ў наступным годзе, калі пяройдзе. А перайсці ён павінен абавязкова, бо ўжо цяпер ён умее лепш чытаць і пісаць, як яго таварышы.

Толькі вось крыўдна, што ў хуткім часе ўсе пачалі зваць яго — «чужаземец».

Аднаго разу сама настаўніца назвала яго «чужаземцам». Назвала ласкава, нават з пашанай — і Кіру зусім не было крыўдна. А вось гэты нягодны Пузік дык гыркае, нібы сабака:

— Чужаземец! Чужаземец!

Ды яшчэ тыцкае пальцам. А часам нават і язык яшчэ пакажа.

Паскардзіўся раз Кіра бацьку, што яго ў школе дражняць «чужаземцам». Але бацька толькі засмяяўся і сказаў:

— Ну і добра. Нічога крыўднага тут няма.

Кіра і сам лічыў, што слова гэтае не крыўднае. Але што ты зробіш, калі паганы Пузік дражніцца:

— Чужаземец! Чужаземец! Немец, француз, кітаец! Чаго ты да нас прыехаў?

Пачула аднаго разу такія словы настаўніца, раззлавалася і цэлую гадзіну гаварыла ў класе:

— Што гэта такое, дзеці? Я чула, што некаторыя з вас словы «чужаземец», «немец», «кітаец» ператварылі ў нейкую лаянку! Ніколі не думала, што сярод вас знойдуцца несвядомыя, нядобрыя дзеці. Даўно ў нас мінулі праклятыя часы, калі буржуі цкавалі адзін народ на другі, а самі панавалі над тымі і над гэтымі. Здараецца, што мы можам назваць чалавека манюкай, злодзеем, гультаём, калі той робіць дрэнна. Але як жа ж ператвараць у лаянку словы «немец», «кітаец», «беларус», «паляк», калі сярод іх ёсць нашы браты-рабочыя?

Доўга яшчэ казала настаўніца, а дзеці выкрыквалі:

— Гэта не я! Не я!..

Нават Пузік засаромеўся і сядзеў чырвоны як рак.

Але чаму ж гэта Кіру назвалі «чужаземцам»?

А таму, што ён часта прыносіў чужаземныя кніжкі, часопісы, малюнкі.

Сёння ў яго нямецкі часопіс з вялікімі малюнкамі. Заўтра бачаць у яго руках англійскую кніжку, бліскучую, на тоўстай паперы. Праз некаторы час Кіра разглядае французскую кніжку з цікавымі малюнкамі.

Аднаго разу ён прыцягнуў японскую ці кітайскую газету з такімі дзіўнымі знакамі, што не разбярэш, ці літара гэта, ці малюнак.

Цікавіліся кніжкамі не толькі Кіравы таварышы, але і сама настаўніца, старэйшыя вучні, настаўнікі з іншых класаў. Яны ўсе нават больш цікавіліся, як Кіравы сябры...

— Адкуль ты бярэш такія кнігі? — пыталіся яны.

— У бацькі.

— А дзе ён працуе?

— На фабрыцы «Штурм».

— Інжынерам?

— Не, рабочым.

— Няўжо ён можа чытаць усе гэтыя кнігі?

— Не ведаю,— адказвае Кіра.

— Адкуль ён іх бярэ?

— Прысылаюць па пошце.

Усе настаўнікі вельмі зацікавіліся гэтай справай і самі назвалі Кіру «чужаземцам». Яны часта прасілі Кіру пазычыць тую ці іншую кнігу на некалькі дзён, і Кіра ганарыўся.

Калі Кіра ўбачыў, што ўсе цікавяцца гэтай справай, ён і сам пацікавіўся запытацца ў бацькі:

— Хто табе прысылае гэтыя кнігі?

— Таварышы рабочыя.

— Адкуль?

— З розных краін. З усяго свету.

— Адкуль ты іх ведаеш?

— Пазнаёміўся праз газеты.

— А ці ты ўмееш чытаць усе гэтыя газеты і кнігі?

— Не. Але мы ўсе ведаем адну агульную мову — эсперанта. На ёй і перапісваемся. Вось падрасцеш — і ты вывучыш яе. Бонэ? — усміхнуўся бацька і пляснуў Кіру па плячы.

Кіра хацеў ужо спытацца, што гэта за слова такое «бонэ», але бацька зараз жа дадаў:

— «Бонэ» — па-нашаму «добра». Старайся ўжо цяпер вывучыць некаторыя словы, спатрэбяцца.

Але нельга сказаць, каб Кіра цікавіўся чужаземнымі словамі, ён толькі цікавіўся малюнкамі.

Вось аднаго разу прыйшла такая кніжка, дзе былі толькі адны малюнкі. У кніжцы кавалкі празрыстай чырвонай і сіняй паперы. І калі паглядзіш праз гэтую паперу на малюнак, дык убачыш зусім не тое, што на ім намалявана,— убачыш зусім іншы, новы малюнак.

— Як цікава! — захапіўся Кіра.

— Гэта табе прыслаў твой таварыш,— сказаў бацька.

— Які таварыш? — здзівіўся Кіра.

— Маленькі Морыц з Гамбурга. Вось ён,— і бацька паказаў фатаграфію хлопчыка такога ж узросту, як і Кіра.

Апрануты ён быў, як дарослы: пінжак з кішэнямі, белы каўнер з гальштукам: толькі штонікі кароткія.

— Адкуль жа ж ён мяне ведае? — дзівіўся Кіра.

— Ды мы з яго бацькам пісалі адзін аднаму, што ў нас ёсць аднолькавыя хлапцы. Вось ён і пазнаёміў вас. Цяпер, брат, і табе прыйдзецца зняцца ды паслаць у Германію сваю картку ды яшчэ які-небудзь падарунак.

Кіра саскочыў з крэсла:

— Хадзем, тата, здымацца. Я хачу паслаць картку зараз жа.

— Пачакай, пачакай, паспееш! — стрымаў бацька.— Падумай яшчэ, які падарунак ты можаш паслаць. Вось ён тут табе і напісаў нешта...

Пачаў быў чытаць Кіра, але нічога не разабраў.

— Не магу прачытаць,— сумна сказаў Кіра.— Неяк не так напісана.

— Напісана яно так, толькі па-эсперанску: «Дарагому таварышу Кіру ад Морыца».

— А як жа я яму напішу? — сказаў Кіра.— Я не ўмею так пісаць.

— Ды, мусіць, і ён не ўмее. Пэўна, бацька напісаў на паперцы, а ён спісаў. І мы пакуль што так сама зробім. А пазней вы і самі навучыцеся.

— А хто ён такі, хто яго бацька?

— Бацька — рабочы на заводзе, дзе будуюцца караблі. Але ў гэтым лісце якраз піша, што застаўся без работы. Усюды за мяжой зачыняюцца фабрыкі, і рабочыя застаюцца без працы.

— Чаму так? — зацікавіўся Кіра.

— Таму, што фабрыкі і заводы належаць паасобным капіталістам. А кожны з іх не думае аб агульнай карысці, а дбае толькі аб сабе. А калі кожны дбае толькі аб сабе, дык ніколі дабра не будзе.

Некалькі дзён Кіра быў вельмі заклапочаны, што паслаць далёкаму незнаёмаму таварышу? Так хацелася пацешыць яго, зрабіць што-небудзь прыемнае.

З фатаграфіяй Кіра не разлучаўся, часта глядзеў на яе — яму пачало здавацца, што ён гэтага хлопчыка ведае даўно і любіць, як брата.

Вядома, паказваў кніжку і фатаграфію ў школе. У класе ўсе зайздросцілі, што Кіра завёў сяброўства з замежным хлопчыкам. Нават Пузік сказаў:

— Эх, каб і мне мець замежнага таварыша!

Усім класам пачалі абмяркоўваць і раіць Кіру, які падарунак паслаць Морыцу. Колькі ж прапаноў было! І мадэль трактара, і розныя свае малюнкі, і кніжкі, і чырвоны сцяг, і вершы. Але найлепшай прапановай было паслаць акцябрацкую зорку і партрэт маленькага Леніна.

Нарэшце прыйшоў дзень, калі Кіра ўжо мог паслаць сваю пасылку — фатаграфію, зорку і партрэт Леніна...

— Напішы яму, тата, каб хутчэй адказаў,— папрасіў Кіра.— Хай запішацца ў акцябраты і носіць зорку.

— Нешта не чуў я, каб там былі акцябраты,— сказаў бацька.

— А калі можна чакаць адказу? — запытаўся Кіра.

— Можа, тыдні праз тры, можа, і праз два, калі зараз жа адкажуць.

Дзень за днём лічыў Кіра, калі пройдуць два тыдні. Яшчэ з большай нецярплівасцю чакаў трэці тыдзень.

— Можа, ліст загінуў? Спытайся, татка, напішы,— прасіўся Кіра.

— Пачакай, пацярпі,— сказаў бацька.

Мінуў месяц, другі, а адказу ўсё няма. Нарэшце бацька напісаў другі ліст, але і на яго не было адказу.

— Мусіць, выехалі куды з Гамбурга шукаць працы,— сказаў бацька.— Відаць, няма калі ім думаць аб перапісцы.

Як жа шкадаваў Кіра! Гэтак цікава было весці сяброўства з замежным таварышам, і нічога з гэтага не выйшла.

Калі ж мінула паўгода, Кіра бадай-што забыўся пра ўсю гэтую гісторыю.


І вось аднаго разу прыйшоў з Германіі запэцканы ліст, а ў ім пісулька.

Паглядзеў бацька на ліст і паківаў галавою:

— Што гэта такое? Нібы табе, Кіра, нібы ад твайго таварыша Морыца, але палавіна слоў эсперанскіх, а палавіна нямецкіх, якіх я не разумею. «Бацька... маці... адзін...» Ві-



Янка Маўр з сынам Фёдарам
у Батумі. 1924 г.



Якуб Колас і Янка Маўр
з агульным унукам Сяргеем. 1950 г.

даць, нешта здарылася. Пайду да суседа, студэнта, хай ён разбярэ нямецкія словы.

Студэнт сказаў, што і нямецкія словы напісаны з памылкамі, а эсперанскіх ён не ведае. Але ўдвух яны нарэшце разабраліся, і атрымаўся наступны ліст:

«Дарагі таварыш Кіра.

Бацька забіты фашыстамі. Маці памерла. Я адзін. Вельмі, вельмі дрэнна.

Морыц Кольман.»

Калі бацька прачытаў Кіру гэтыя словы, дык хлопчык расплакаўся:

— Бедны Морыц... Шкада яго... Трэба дапамагчы. Тата, вазьмі яго да нас. Ён адзін.

Бацька панурыўся.

— Вядома, шкада,— прамовіў ён.— Але як дапамагчы? Як яго возьмеш?

— Пашлі грошы. Хай прыязджае.

Бацька толькі ўсміхнуўся.

— Не так гэта проста, як табе здаецца. Але ў кожным разе трэба падумаць.

Аднак думаць доўга не прыйшлося.

Яшчэ тыдзень назад на завод, дзе працаваў Кіраў бацька, была прыслана прапанова вылучыць лепшага ўдарніка для паездкі за мяжу.

Кіраў бацька якраз быў адзін з лепшых ударнікаў і вельмі спадзяваўся, што выберуць яго.

Так яно і здарылася. Ах, як хацеў Кіра ехаць разам з бацькам!

Але бацька казаў:

— Нельга табе. Нас з усіх заводаў СССР едзе трыста чалавек. Калі кожны захоча ўзяць яшчэ сваіх дзяцей, што ж тады будзе? Пацярпі, сам прывязу. А вырасцеш, будзеш добрым ударнікам, тады і сам паедзеш за мяжу...

Калі настаўніца ўвайшла ў клас, дык заўважыла, што вучні неяк хітра пераміргваюцца і пазіраюць то на яе, то на той кут, дзе сядзеў Кіра.

— Чаго вы? — запыталася настаўніца.

— А ў нас госць ёсць! — закрычалі дзеці.

— Які госць? Дзе?

— А вунь там.

Толькі цяпер настаўніца разгледзела, што каля Кіры сядзіць нейкі хлопчык і ўсміхаецца. На грудзях яго была прышпілена акцябрацкая зорачка.

— Адкуль ты? — спыталася настаўніца.

Той нібы і не чуў. Сядзіць, усміхаецца і пазірае на дзяцей.

— Адкуль ты? Як цябе завуць? — спыталася настаўніца зноў.

Хлопчык так сама сядзіць, пазірае на дзяцей і ўсміхаецца. Дзеці ў рогат.

— Што гэта за жарты? — узлавалася настаўніца і падышла да хлопчыка.

— Як ты сюды трапіў? Як цябе завуць?

Хлопчык устаў і весела пазіраў то на настаўніцу, то на дзяцей.

— Што ён, нямы, ці што? — здзівілася настаўніца.

Дзеці яшчэ больш зарагаталі.

— Ну, як цябе завуць? — зноў спыталася настаўніца.

— Морыц! — крыкнуў нехта з вучняў.

— Кольман! — дадаў другі...

— Што ён, немец? — здзівілася настаўніца.— Адкуль? Якім чынам?

— З Гамбурга, прыехаў да мяне,— сказаў Кіра з гонарам...

Уся школа зацікавілася госцем. Увесь дзень толькі і гутаркі было, што аб ім. Кіра сотню разоў павінен быў расказваць гісторыю свайго замежнага сябра.

Затое ў гэты дзень ён адчуваў сябе самай важнай асобай пасля Морыца.

Морыц пагасцяваў у Кіры месяц, а пасля паехаў у Маскву, у дзіцячы дом, дзе выхоўваецца яшчэ шмат такіх дзяцей замежных рабочых, забітых фашыстамі.

Цяпер Морыц піянер і перапісваецца з Кірам увесь час.

1932 г.

ПАДАРОЖЖА АД ШКОЛЫ ДА ДОМУ

Спрадвеку людзі прывыклі лічыць, што ўсякае падарожжа перш за ўсё залежыць ад надвор'я. Кожны ведае, што і конь і чалавек у добрае надвор'е куды больш і шпарчэй пройдуць, як у дождж ці завіруху. Нават поезд у дрэннае надвор'е затрымліваецца, а самалёт дык той часта і зусім лядзець не можа.

А вось Сцёпка — наадварот: у самае дрэннае надвор'е прабяжыць ад школы да сваёй хаты за трынаццаць з паловай мінут, а потым, чым больш паляпшаецца надвор'е, тым больш часу займае дарога. Напрыклад, у добры зімовы дзень, калі няма марозу і снег такі мяккі і ліпучы,— падарожжа дахаты займае ўжо гадзіну і больш. А ў цёплы веснавы дзень, калі сонейка свеціць так ласкава і вераб'і заўзята крычаць з кожнага дрэва, з кожнага даху,— адлегласць ад школы да Сцёпкавай хаты значна павялічваецца, і, каб прайсці яе, трэба патраціць, прынамсі, гадзіны дзве-тры. Аб адным такім Сцёпкавым падарожжы нават варта і расказаць.

Толькі ён выйшаў са школы і рушыў у дарогу, як здарылася катастрофа: машына наляцела на каменны слуп і павалілася на бок. Каб хто не падумаў, што гэта была машына, у якой ехаў Сцёпка,— мы павінны адразу сказаць, што гэта была зусім другая машына, якая дачынення да Сцёпкі не мела. Але ж затое Сцёпка меў да яе вялікае дачыненне. Па-першае, яна пацярпела аварыю. А хіба можа якая аварыя абысціся без Сцёпкі? Ды каб яго ўначы хто разбудзіў і сказаў, што за сем кіламетраў адбылася якаясьці аварыя,— ён і тады пабег бы глядзець на яе. А тут без ніякіх табе турбот аварыя адбываецца, можна сказаць, пад самым носам. Не кожны дзень трапляецца такая выгода. І ён павінен скарыстаць яе поўнасцю. Ён павінен бачыць, як будуць вылазіць з машыны людзі, пераканацца, ці не паранены яны, даведац-

ца, з якой прычыны адбылася аварыя, разгледзець, што паламалася і папсавалася, пакратаць гэтыя мясціны рукамі, прасачыць, як будуць падымаць машыну, якім чынам і куды яе павязуць, дазнацца, чыя гэта была машына. Адным словам, работы для Сцёпкі знаходзілася нямала, і работы нялёгкай, бо трэба было гвалтам праціскацца наперад, цярпець штуршкі дарослых, змагацца ■ другімі такімі самымі хлапчукамі за першае месца і ўвесь час ухіляцца міліцыянера, які ўпарта адганяў публіку ад машыны, нібы шкада было, што добрыя людзі хочуць паглядзець на яе.

Прайшло, можа, больш за паўгадзіны, пакуль справа была ўпарадкавана і Сцёпка мог спакойна ісці дадому. Ідучы праз сквер, ён убачыў малога хлопчыка з кнігамі, відаць, першакласніка, які нізенька схіліўся да зямлі і калупаў там нешта трэсачкай. Быстрае Сцёпкава вока адразу заўважыла здабычу: калі гэтага хлопчыка крыху штурхануць ззаду, ён адразу ўтыркнецца носам у зямлю — і будзе вельмі смешна. Сцёпка ціханька падкраўся да хлопчыка, штурхануў яго — і той сапраўды ўтыркнуўся носам у зямлю і заплакаў. Сцёпка засмяяўся. Ён нават думаў, што і ўсім, хто бачыць гэта, будзе таксама смешна. Але выйшла наадварот.

— Ты чаго крыўдзіш хлопчыка, хуліган? — узлавалася адна старая жанчына.

— Зараз я цябе самога так штурхану! — крыкнуў нейкі вялікі хлапец.

Сцёпка пастараўся хутчэй знікнуць у натоўпе.

«Не разумеюць жартаў, чапляюцца! — крыўдзіўся ён на людзей.— Пабіў я яго, ці што?..»

Але разважаць не было калі: перад ім была вітрына з усялякімі прыладамі, у тым ліку са шмат разнастайнымі даскаНалымі ножыкамі. Гэтую вітрыну Сцёпка добра ведаў: не адну гадзіну ён прастояў тут і ножыкі ўсе вывучыў. Але і на гэты раз ён таксама спыніўся перад ёй. Хіба можна прайсці міма такога багацця? Узяць, напрыклад, гэты моцны крывы ножык. Каб Сцёпка яго меў, ён нікога не баяўся б: ён бы і ад ваўка абараніўся, і ад мядзведзя, і ад тыгра, а можа, нават і ад ільва; і слану можна было б вока выкалаць. А вунь той

тоўсты ножык — гэта ж цэлая майстэрня, а не ножык! Усе інструменты ў ім ёсць. Каб яго мець, можна было б вырабляць усё, што захочаш. Сцёпка тады гадзіннік паспрабаваў бы сабе змайстраваць. А яшчэ лепш — стрэльбу. Але каштуе гэты ножык-майстэрня вельмі дарага. У такім разе Сцёпка быў бы рады і гэтаму зграбнаму ножычку, які каштуе значна менш. Тады б ён зусім выкінуў тую ламаку-жалязяку, што ляжыць у яго кішэні. Але і такіх грошай Сцёпка дастаць не можа...

Невядома колькі часу ён прастояў бы перад вітрынай, каб не пачулася ваенная музыка. А калі ўжо музыка на вуліцы, то, пэўна, там нехта ідзе. А калі ідзе, то як жа ж можа Сцёпка стаяць? І самі ногі панеслі Сцёпку да музыкі.

Ажно гэта было трохі не тое, што ён думаў. Везлі нябожчыка. А нябожчыкаў, як вядома, вязуць чамусьці вельмі марудна. І ісці ціха за імі не зусім прыемна. Таму Сцёпка правёў нябожчыка ўсяго толькі два кварталы. І зусім у процілеглы бок ад свайго дома.

Але затое ён апынуўся каля гарадскога саду. А там у кутку некалькі хлопцаў заўзята гулялі ў ямкі. Ды яшчэ на грошы. А ў Сцёпкі ў кішэні было трыццаць восем капеек уласных грошай ды яшчэ рубель, які яму дома далі, каб купіў соды. Ну, рубель гэты, вядома, лічыць нельга было, але на трыццаць восем капеек рызыкнуць было б варта. А можа, яшчэ якіх трыццаць капеек наляціць? І ён далучыўся да хлапцоў.

Іх было двое. Аднаго з іх Сцёпка нават добра ведаў. Прынамсі, яму так здавалася. А калі падумаць добра, то ведаў ён толькі яго прозвішча, ды і то, відаць, не сапраўднае, а вулічнае — Скок. А хто ён такі, як жыве, ці вучыцца ў школе — пра гэта так і не давялося спытацца: не было часу. Бо справы ў іх заўсёды былі падобныя да сённяшняй, а ў такія мінуты не будзеш распытвацца пра розныя там дробязі.

— Будзеш гуляць? — дзелавіта спытаў Скок.

— Буду,— адказаў Сцёпка, скоса пазіраючы на другога хлапца. Нешта не падабаўся ён Сцёпку. Перш за ўсё, ён быў даўгі, чорны, гады на тры старэйшы за іх. Потым, у яго губы

былі тоўстыя і нос кірпаты. І нарэшце — вочы сядзелі над-та глыбока і выглядалі з-пад ілба, як з-пад страхі. Так і здавалася, што ён нешта такое сабе думае. Сцёпка ж быў, наадварот, малы, рыжы, увесь у рабацінні, вочы светлыя, адкрытыя — і пра яго ніхто не сказаў бы, што ён думае. Ну, а Скок быў так сабе, сярэдні.

Пачалася гульня. Сцёпка са Скокам мітусіліся, хвалявалі-ся, крычалі, спрачаліся, а той хлапец тым часам ціха, спакойна трапляе ды трапляе ў ямку. Не прайшло і гадзіны, як усе грошы перайшлі ў кішэню гэтага хлапца. Перайшоў і Сцёпкаў рубель, палавіну якога ён сам прайграў, а палавіну пазычыў Скоку, які таксама прайграў.

— Гэта таму, што ён доўгі! — абурaўся Сцёпка.— Яму з вышыні добра ямку відаць, а калі нагнецца, то і бліжэй да яе становіцца, як мы.

— Ну і добра! — сказаў даўгі хлапец і пайшоў сабе прэч, пасвістваючы.

— Гэта ўсё праз цябе! — папракнуў Сцёпка свайго прыяцеля.— Што цяпер будзе з гэтым рублём?

— А ты скажы, што ў цябе ўкралі яго ў школе — вось і ўсё,— параіў Скок.— Падумаеш, якая важная рэч — рубель! Я нядаўна пяць рублёў прайграў — і то нічога. На, закуры — лягчэй на сэрцы будзе.

Сцёпка адчуў павагу да Скока. Гэткая сталасць і мужнасць! А ён, Сцёпка, нібы дзіця малое перад ім. Не, трэба трымаць сябе з гонарам. Сцёпка з важным выглядам узяў папяросу і закурыў. Але зараз жа ў горле запякло, зашчыпала, пачаўся кашаль, слёзы на вачах паказаліся. Трэба было ратаваць свой гонар.

— Гэта якія папяросы? — спытаўся ён праз кашаль.

— «Ракета».

— Не падабаюцца яны мне,— ужо не хаваючыся, скрывіўся Сцёпка.— Я больш куру «Спорт».

Цяпер ужо Скок адчуў павагу да такога сталага курыльшчыка.

А сапраўды Сцёпка яшчэ не курыў, а толькі хацеў навучыцца курыць. Ды навука была не такая лёгкая, як, можа,

каму здаецца. Гарката пячэ, вочы на лоб вылазяць, а прыемнасці і следу няма. Але ж людзі кураць. І не толькі дарослыя, а і такія, як Скок. Проста зайздрасць бярэ, як гэты Скок пушчае дым праз нос! Ды за адно гэта варта перацярпець пакуту! І Сцёпка са слязамі на вачах цярпеў.

Яны выйшлі на вуліцу. Ад прыпынку толькі што адышоў трамвай.

— Паедзем? — спытаў Скок.

— Паедзем.

Яны пагналіся за трамваем, ускочылі на падножку і павярнуліся спіною да ўвахода. Ніхто не звярнуў на іх увагі, бо ўсе ўжо прывыклі да такіх пасажыраў.

Але хутка пачуўся голас жанчыны-кандуктара:

— Эй, хлопцы! Заходзьце ў вагон і бярыце білеты. Нельга на падножках ездзіць!

Але хлопцы, здавалася, нічога не чулі, разглядаючы вуліцу.

Зноў той жа голас:

— Чуеце вы? Заходзьце ў вагон!

Хлопцы яшчэ больш уважліва сталі прыглядацца да вулічнага руху.

Працягнулася рука кандуктара і ўзялася за плячо Скока. Той пачаў упірацца, вырывацца. Але раптам ён адчуў, як за каўнер узялася другая рука, вялікая, дужая, падняла яго як саломінку і паставіла на пляцоўку. Такім жа чынам побач з ім быў пастаўлены і Сцёпка.

А затым аднекуль зверху пачуўся грозны голас:

— Вы чаго гэта не слухаецеся? Чаго парушаеце парадак?

Хлопцы нават не адважыліся глянуць на гэтага высокага і дужага дзядзьку. Не чакаючы, пакуль трамвай зусім спыніцца на прыпынку, яны рванукіся і выскачылі на вуліцу.

— Навошта лез сюды? Яна заўсёды чапляецца,— сказаў Сцёпка.

— Ды я не заўважыў, што тут яна. Нічога не зробіш, трэба рабіць перасадку. Ты куды хочаш?

— Дахаты.

— А я яшчэ з'езджу на Камароўку.

І хлопцы разышліся. Сцёпка дачакаўся другога трамвая, стаў ля выхада з вагона і пачаў прасіць у тых, хто выходзіў, білет. Некалькі чалавек буркнулі: «Ідзі прэч!», але знайшоўся і такі, які аддаў свой білет. Тады ўжо Сцёпка важна, павольна ўвайшоў у задні вагон і пачаў шукаць месца, каб сесці. Але вольнага месца не было.

Прыйшлося чакаць.

Нарэшце ён убачыў, што наперадзе з аднаго месца ўстае чалавек. Але блізка ад таго месца стаяла старэнькая бабуля, якая таксама мерылася сесці. Доўга не думаючы, Сцёпка рынуўся наперад і выперадзіў бабулю, хоць яна была ўжо зусім блізка. Гэтая перамога дала яму вялікае задавальненне. Але настрой сапсаваў нейкі дзядзька, які сядзеў насупроць. Ён быў у плашчы, у кепцы, з сівавата́й падстрыжанай барадой. Па выгляду ён мог быць і старым майстрам, і доктарам, і настаўнікам. Убачыўшы Сцёпкаву «перамогу», ён пачаў сароміць яго:

— Сорамна, малады чалавек, так рабіць! А яшчэ вучань. Ай-яй-яй, як нядобра!

— У мяне білет, і я таксама маю права,— буркнуў са злосцю Сцёпка і падумаў:

«Сам сядзіць, як пан, а другі павінен стаяць. Усе тут роўныя. Хай бы сам пастаяў, калі хочацца».

І ў гэтую самую мінуту чалавек падняўся, уступіў сваё месца бабулі, а сам стаў ля Сцёпкі, трымаючыся за спінку яго сядзення.

Трэба сказаць праўду, Сцёпка адчуў сябе вельмі няёмка: ён шкадаваў, што ўвязаўся ў гэту гісторыю: ён ужо ахвотна згадзіўся б і сам пастаяць. Але яго ахапіла злосць, і ён упарта сядзеў на сваім месцы, і нецярпліва чакаючы, каб хутчэй скончылася гэта непрыемная дарога. Задоўга да прыпынку ён устаў са свайго месца і бачыў, як той дзядзька заняў яго.

Дома ён сказаў, што ў школе пасля заняткаў была сустрэча з адным вядомым прафесарам-даследчыкам, ардэнаносцам, які тры гады правёў на Камчатцы і вельмі цікава расказваў вучням аб сваім падарожжы. Таму ён, Сцёпка, і позна

прыйшоў дадому. Ды яшчэ ў часе гэтай лекцыі (якая адбывалася ў зале) у яго з парты ўкралі рубель.

Відаць, так ужо вядзецца, што калі чалавек пачне хлусіць, то адна хлусня вядзе за сабой другую.

Але хлусня аб прафесару мела некаторае дачыненне і да сапраўднасці. У школе сапраўды вісела аб'ява, што заўтра адбудзецца такая сустрэча. А Сцёпка ўзяў ды сёння скарыстаў яе.

А заўтра ў школе ён пастараўся загадзя заняць месца ў першым радзе, каб бліжэй убачыць славутага даследчыка. І сапраўды ўбачыў блізка... Калі прафесар праходзіў на сцэну, то раптам прыпыніўся каля Сцёпкі, прыгледзеўся да яго і сказаў з усмешкай:

— Здароў, прыяцель! Ты тут?

Сцёпка пачырванеў як рак: ён пазнаў дзядзьку, з якім ехаў у трамваі! Вучні і настаўнікі здзівіліся надзвычайна.

— Вы яго ведаеце?! — усклікнуў дырэктар.

— Так, мы з ім разам ехалі,— адказаў прафесар і пайшоў далей.

Вучні пачалі шаптацца і жартаваць, што Сцёпка Сідорык разам з прафесарам ездзіў на Камчатку. Многія зайздросцілі яму. А Сцёпка сядзеў засаромлены і чакаў непрыемнасці.

Пасля лекцыі не толькі вучні, але і настаўнікі абступілі Сцёпку і пачалі распытваць, якім чынам ён пазнаёміўся з прафесарам. Сцёпка не ведаў, што казаць. Ён усё чакаў, што настаўнікі самі пачнуць гаварыць аб яго паводзінах у трамваі. Але ніхто нічога аб гэтым не гаварыў.

Сцёпка пасвятлеў: значыцца, прафесар не сказаў аб гэтым! Больш ні аб чым падумаць не было часу: трэба было зараз жа адказваць на пытанне, якім чынам ён пазнаёміўся з прафесарам. Настаўнікі чакалі.

Маўчаць больш нельга. Але што сказаць?..

І ён сказаў ціхім-ціхім голасам:

— Мы з ім учора ехалі ў трамваі, і я ўступіў яму сваё месца...

1939 г.

БАГІРА

Вы, вядома, чулі гэтае імя. Пэўна, ведаеце чорную пантэру, прыяцельку Маўглі.

Але цяпер гутарка будзе ісці хоць і пра дальнюю сваячку, але ўсё ж такі не пра пантэру, а пра кошку. Звычайную кошку, толькі, вядома, чорную і, мусіць, не менш разумную, як тая Багіра.

Трапіла яна да нас самым незвычайным чынам. Раз у марозны веснавы вечар, досыць позна, вярталіся мы з дачкой дахаты. Жылі тады на ўскраіне горада. Людзей хадзіла мала. Свяціў месяц, хрумсталі падмерзлыя лужыны.

І вось тут прычапілася да нас чорная кошка, жаласна мяўкае, трэцца каля ног. А як толькі мы спынімся, яна, азіраючыся, ідзе назад. Пойдзем мы далей — яна зноў даганяе нас, крычыць, блытаецца між ног, забягае наперад, нібы не пускае ісці ў той бок. Справа ясная: яна хоча, каб мы пайшлі за ёю кудысьці назад. Нічога не зробіш: калі яна так выразна і настойліва патрабуе — трэба ісці.

Як толькі мы зрабілі пару крокаў назад, яна ўзрадавалася, шпарка паскакала ў той бок і знікла. Што яна: жартуе з намі? Мы сталі. Тады кошка зноў з'явілася і зноў пачала мяўкаць і церціся. Мы зноў пайшлі за ёю — і зноў яна пабегла наперад, мяўкаючы здалёк.

Тым часам на бліжэйшым двары забрахаў сабака і кінуўся ў наш бок. Але тут раздаўся такі сык, так люта накінулася на яго кошка, што бедны сабака з жаласным скавытаннем паляцеў як мага далей. А кошка выбегла на тратуар і хуценька скруцілася на зямлі.

Калі мы падышлі бліжэй, то ўбачылі, што яна абкруцілася вакол кацяняці. Адкуль яно ўзялося? Мы толькі што ішлі па гэтым самым месцы — і нічога на тратуары не мелася. Зна-

чыцца, кацянё спачатку было недзе схаванае, мусіць, за плотам. Калі кошка ўбачыла нас, то паранышыла звярнуцца за дапамогай, спыніла нас, прымусіла павярнуць назад, а сама тым часам вынесла на дарогу сваё дзіця ды яшчэ паспела прагнаць сабаку. Разам з тым яна не забывалася, што кацянятка толькі што нарадзілася і не павінна было мерзнуць на холадзе... І вось кошка нават на тую хвілінку, пакуль мы падыходзілі, абкруцілася вакол свайго дзіцяці і саграваліа яго. Можна было б пажадаць і кожнаму добраму чалавеку столькі спрыту і энергіі.

— Ну што ж,— сказаў я,— нічога не зробіш, хадзем ужо да нас.

— Не хочацца толькі браць у рукі гэтае мокрае кацянё,— сказала дачка.

Але кошка і не збіралася прасіць нас аб гэтым. Яна сама ўзяла сваё дзіця зубамі за карак і пайшла побач з намі. Так мы прыстойнай сямейкай і прыйшлі ў сваю хату.

У кухні пліта была яшчэ цёплая, і тут жа быў чалеснік рускай печкі. Кошка адразу знайшла сабе месца, дзе ёй будзе лепей за ўсё — у печцы, ля цёпленькай пліты.

— Ну і добра,— сказалі мы,— жыві сабе тут. Толькі, мусіць, павячэраць табе трэба даць.

Але не паспелі мы падрыхтаваць ёй вячэру, як яна выскачыла з печкі і пачала прасіцца за дзверы. Мы сталі ўгаворваць яе:

— Ды пачакай трохі. Куды ты?

Але яна і слухаць не хацела — усё крычала і драпала дзверы.

Тады мы сцямілі, што перашкаджаць ёй не трэба: яна, відаць, з прыстойнай сям'і, добра выхавана і хоча выйсці на двор на хвілінку.

Выпусцілі яе. Прайшло колькі хвілін, чуем — скрабецца яна ў дзверы. Адчынілі — і бачым: яна прынесла другое кацянё. І зараз жа з ім у тую самую печку.

Не скажу, каб мы былі надта ўжо рады, што сям'я наша так хутка павялічваецца, але кошку ўсё ж такі пахвалілі:

— Добрая маці.

А дачка дадала:

— Маладзец, Багіра.

Тут мы ўсе заўважылі, што яна сапраўды нагадвае Багіру і аднагалосна зацвердзілі гэтае імя.

Дачка зноў хацела даць ёй вячэраць — і зноў Багіра стала прасіцца за дзверы. Ці не хоча яна яшчэ прынесці нам дзіця? Дзякуем за ласку.

Але што з ёю рабіць? Не пускаць за дзверы, ці што? Прыйшлося зноў выпусціць. А праз некалькі мінут яна сапраўды прынесла трэцяе кацянё...

Такім чынам праз якія паўгадзіны сям'я наша адразу павялічылася на чатыры адзінкі. Сказаць, што мы былі рады,— ніяк нельга. Але да кошкі-маткі адчулі вялікую павагу. Якая яна была сур'ёзная, руплівая. Як ні павернецца, што ні зробіць — усё правільна, разумна, таксама як зрабіў бы кожны з нас. За ўвесь гэты час яна ніводнай мінуты не патраціла дарэмна і не зрабіла нічога лішняга, не сунула свой нос, куды ёй не трэба, не пацікавілася нічым, апрача сваёй справы.

Мы гаворым, што ў жывёл не розум, як мы яго разумеем, а інстынкт, гэта значыць, прывычныя, але несвядомыя рухі і дзеянні, патрэбныя ім для жыцця. Пчала робіць сваю ячэйку, зусім не думаючы, што, як і дзеля чаго яна робіць. Мурашка цягне ў свой бок галінку, а яе зямляк падбяжыць дапамагаць і пачне цягнуць у другі бок — і яны абодва так і будуць тузацца, не ведаючы, што яны робяць. Мы самі, калі дакранаемся рукой да агню, то зараз жа інстынктыўна тургаем руку назад, а потым ужо сваім розумам цямім, у чым тут справа. Усё гэта — праявы інстынкту. Няўжо ж і наша кошка затрымлівала на вуліцы людзей, прасіла іх вярнуцца і памагчы яе дзіцяці, сачыла, каб дзіця не замерзла, памятала пра іншых сваіх дзяцей і прыносіла іх у хату, адным словам, развіла шырокую дзейнасць, зусім не разумеючы, што і дзеля чаго яна робіць. Не, хай сабе вучоныя людзі гавораць, што хочуць, а мы не згодны з гэтым. Наша кошка, відаць, зусім разумная асоба, і з ёю жыць можна будзе. Нездарма яна нагадвае Багіру, а тая, калі верыць Кіплінгу,

магла разважаць лепш за якога-небудзь не надта разумнага чалавека.

Але на другі ж дзень выявілася, што наша Багіра, можа, і вельмі разумная, у арыфметыцы ўсё ж крыху адстала. Дзеці, гуляючы на суседнім двары, знайшлі там мёртвае маленькае кацяня. Відаць, яно замерзла ў гэтую ноч. Не было ніякага сумнення, што гэтае кацянятка — родны брат трох нашых. Кошка, прынёсшы да нас першага, ведала, што там у яе яшчэ ёсць дзеці. Ведала яна гэта і пасля другога. А пасля трэцяга ўжо не ведала. Выходзіць, што яна ўмела лічыць толькі да трох. Але няхай сабе і так. Усё роўна не ў кожным доме знойдзеш кошку, якая ўмее табе лічыць да трох.

Такім чынам зажылі мы ўсе разам дружнай сям'ёй. Наша Багіра карміла і песціла сваіх дзяцей, як лепей і быць не можа. І ў якой чысціні яна іх трымала! Лізала іх безупынна і ўсюды, не спыняючыся ні перад якім брудам. Затое ж і блішчалі яны ў яе, як цацкі. Ды яны для нас і сапраўды былі цацкамі.

Хто не ведае, якімі мілымі і пацешнымі бываюць малыя кацяняты! Асабліва калі разгуляюцца. Колькі смеху было нам, калі аднаго разу двое з іх пацалаваліся як мае быць: абнялі лапкамі адзін аднаго за шыю і тыцнуліся насамі. Не было такога чалавека, які мог бы прайсці міма іх, калі яны дурэюць. Затое іх маці трымала сябе аж занадта сур'ёзна: ні разу не скокнула, не пажартавала, нават ні разу не ўсміхнулася. Вельмі важная і разумная была Багіра. Як жа было яе не шанаваць!

А праз некаторы час яна паказала яшчэ, што мае і высакароднае сэрца. На наш двор аднекуль прыблудзіла чужое чорнае кацянё. Узросту яно было прыблізна такога, як і нашы, толькі надта брыдкае і няшчаснае: худое, аблезлае, пузатае, з хворымі вачыма і абарваным вухам. Дзеці яго гналі, штурхалі, а яно ледзь рухалася. Ішла раз міма яго Багіра: кацянё пасунулася было да яе, але кошка грэбліва ўхілілася ад яго. А праз дзень бачым — вядзе яго да нас у хату, корміць, ліжа.

Гэтага толькі не хапала. Поўная хата катоў, а тут яшчэ нейкага бруднага прымай. Але як было нам, добрым і разумным людзям, праганяць няшчаснае кацянё, калі нават жывёліна пашкадавала яго? Няўжо мы будзем горшымі за жывёлу? Тады нам сорамна будзе глянуць у вочы паважанай Багіры. Тады і яна і суседскія куры засмяюць нас. Ды і не мы будзем яго гадаваць. Хай сама Багіра і ставіць яго на ногі. Так яна і зрабіла.

Калі кацяняткі падраслі, мы сталі аддаваць іх у людзі. Цэлая чарга стварылася з нашых суседзяў па доме. Калі аддалі першую шэранькую кошачку ў кватэру сёмую, Багіра нібы не заўважыла яе адсутнасці. А вось калі аддалі другое кацянё, у кватэру чацвёртую, і ў нас засталося ўсяго два, тады маці адразу заўважыла, бо лічыць жа да трох умела. Крычыць, шукае па ўсіх кутках, не дае есці тым, што засталіся з ёю, імкнецца за дзверы. Так, галосячы, і з хаты пайшла.

Вярнулася спакойная. Глянула гаспадарскім вокам у адзін куток, у другі, пакарміла дзяцей, памыла іх — і зноў пайшла. Ніякага гора, ніякага крыку. Мала таго — нават начаваць не прыйшла дадому. Што гэта з ёю? Можа, так пакрыўдзілася, што зусім пакіне нас?

Але на другі дзень яна прыйшла. І нават мышку прынесла. Пагасцявала трохі, дагледзела дзяцей — і зноў пайшла гуляць. Вось табе і паважаная Багіра. Трымае сябе, як немаведама хто... А калі праз колькі дзён мы аддалі яшчэ адно кацянё, у кватэру шостую, і ў нас засталося ўсяго адно, то наша Багіра аднеслася да гэтага так, нібы такая справа яе зусім і не датычылася. Толькі яшчэ радзей стала наведваць нас. Што такое з ёю здарылася?

Але трэба сказаць праўду: дзіця яе ад гэтага ані трохі не цярпела. Усё ж такі некалькі разоў на дзень маці прыйдзе, накорміць, памые, нават паляжыць трохі з ім,— а потым зноў пойдзе.

Глядзім мы раз праз акно — нясе Багіра мышку свайму дзіцяці. Мы пайшлі адчыняць ёй дзверы, але яна... прайшла міма нас і панесла мышку ў кватэру шостую...

Дык вось у чым справа. Вось чаму наша Багіра не гаравала. Вось чаму яна дома не сядзела.

Яна даглядала сваіх дзяцей ва ўсіх кватэрах разам...

У кожнай кватэры лічылі, што кошка толькі і ведае, што іхняе кацянё: прыходзіць, корміць, мые, прыносіць мышэй, гуляе з дзіцем — нібы ў яе іншага клопату няма. А яна гэткім чынам працавала аж на чатыры кватэры. Вось чаму яна была такая заклапочаная, не траціла дарэмна часу, доўга не бавілася ў нашай хаце.

Цікава было яшчэ тое, што мышэй і пацукоў яна насіла па чарзе ва ўсе кватэры, нікога не крыўдзіла. Аднаго разу было так: скрабецца яна ў нашы дзверы, просіцца; яе сынок пачуў і падбег ужо да дзвярэй. Адчынілі мы, глядзім — прынесла Багіра мышку, якую наш каток зараз жа і схапіў. Маці тады завярнулася і пайшла сабе назад: прынесла, аддала — навошта ёй і ў хату ісці? І без таго работы многа: і ў чацвёртай кватэры чакаюць, і ў сёмай, і ў шостай — хоць ты разарвіся.

Можа, хто захоча спытацца: якім чынам Багіра магла абслугоўваць чатыры кватэры, калі сама ўмела лічыць толькі да трох? Нялёгка, вядома, адказаць на такое запытанне замест Багіры, але думаем, што яна сваю хату не лічыла — вось тады і застанецца тры.

Як бы там ні было на самой справе, а мы лішні раз пераканаліся, што наша Багіра — найлепшая кошка ў свеце. Мы нават гатовы былі прасіць у яе выбачэння за тое, што падумалі, нібы яна сапсавалася і загуляла.

Нарэшце прыйшоў час, калі Багіра зусім пакінула ўсіх сваіх дзяцей і забылася на іх. Мы ахвотна аддалі людзям і апошняга катка, каб жыць толькі з адной іхняй маткай. Ды і хто не хацеў бы жыць з такой разумнай асобай!

Але хутка ў нас з ёю пачаліся непаразуменні. Калі яна пазбавілася клопату аб дзецях і ёй больш не было чаго рабіць, яна пачала ўмешвацца ў нашы гаспадарчыя справы, ды так нахабна, што ніякай рады нельга было даць. Калі хоць трохі адвернешся, не дагледзіш — яна зараз жа нашкодзіць. Нічога ад яе не схаваеш — усюды дабярэцца. Калі збан мала-

ка накрыты сподкам — яна сподак скіне, калі завязаны — яна перакуліць. Калі буфет зачынены не зусім шчыльна — яна сама яго адчыніць. А раз ухітрылася выцягнуць з закрытай каструлі мяса — і каструля засталася закрытай. А ноччу часам адбываліся такія выбухі ад скінутых рэчаў, што, здавалася, самалёты робяць бамбёжку.

Ужо ж як мы яе ўгаварвалі, саромілі, выхоўвалі, дрэсіравалі — нічога не выйшла, ніяк не маглі з ёю дагаварыцца. Нічога яна не магла ці не хацела зразумець, хоць і ўмела лічыць да трох.

І цяпер мы шкадуем, што так яе расхвалілі на ўвесь свет.

1945 г.



Міхась Клімковіч, Янка Маўр і Якуб Колас
у Каралішчавічах — Доме творчасці пісьменнікаў. 1950 г.



Янка Маўр. 1963 г.



Янка Маўр. 1968 г.



Янка Маўр са сваёй сям'ёй. 1968 г.

СПАРТАК

Гэта было дзве тысячы гадоў таму назад.

Самай магутнай дзяржавай тады была Рымская рэспубліка. Бадай усе вядомыя ў той час народы залежалі ад Рыма. Ад усіх іх Рым збіраў золата, тавары, хлеб. Багацці з усяго свету цяклі ў Рым.

Але ўсе гэтыя багацці траплялі ў рукі невялікай групы паноў, так званых патрыцыяў. Бедныя людзі — плебеі — нічога не мелі, хоць, будучы рымлянамі, таксама лічыліся «ўладарамі свету».

Плебеі ваявалі ва ўсіх краях, яны здабывалі багацце для патрыцыяў, а калі вярталіся на радзіму, то часам не знаходзілі і сваёй хаты: яе забіраў за даўгі патрыцый. Плебею заставаўся толькі гонар, што ён рымлянін, «уладар свету».

Але былі ў Рыме і такія людзі, якім жылося яшчэ горш, як плебеям. Гэта — нявольнікі, рабы. У час войнаў рымляне забіралі ў палон як мага больш народу, не толькі салдат, але і жанчын, дзяцей.

Гэтых людзей адпраўлялі ў Рым і прадавалі, як скаціну. Патрыцыі панакуплялі сабе сотні і тысячы нявольнікаў, якія дарма працавалі на гаспадара.

Рабы не лічыліся за людзей. Яны нават называліся «гаспадарчай прыладай, якая ўмее гаварыць». Толькі гэтым яны адрозніваліся, скажам, ад сахі, якая гаварыць не ўмее. Такім чынам, гаспадар мог рабіць з нявольнікам што толькі хацеў: ці прадаць, ці спаліць, ці прымусіць спаўняць якую хочаш работу, ці зняць з яго скуру, адным словам, усё, што можна рабіць са сваёй прыладай або жывёлай.

Нарэшце дадумаліся скарыстаць рабоў для жудаснай, крывавай забавы: прымушалі іх біцца адзін з адным насмерць у цырку, на пацеху публіцы. Такія байцы называліся гладыятарамі. Былі нават спецыяльныя школы, дзе гэтых

гладыятараў навучалі біцца і паміраць так, каб гэта падабалася гледачам.

...У адной з такіх школ, у горадзе Капуі, толькі што скончыліся заняткі. Сам гаспадар, Лентул, наглядаў, як біліся паміж сабой гладыятары драўлянымі мячамі. Часамі ён аб нечым гаварыў з інструктарамі, а потым нешта запісваў на сваёй васковай дошчачцы.

Пасля заняткаў гладыятары разышліся па сваіх камерах, і іх зачынілі на ключ.

У адной такой камеры было чалавек шэсць. Яны ляжалі ці сядзелі на сваіх нарах і ціха гаварылі.

— У нас у Галіі цяпер усе лугі цвітуць,— нібы сам сабе казаў малады гладыятар з вялікімі задуменнымі вачыма.— Ніколі ўжо не давядзецца ўбачыць іх.

Яго сусед, высокі, вельмі дужы мужчына гадоў трыццаці палажыў яму руку на плячо і сказаў:

— Не сумуй, брат Гор. Ад нас саміх залежыць убачыць родныя месцы.

— Якім чынам?

— Ды замест таго каб забіваць нам адзін аднаго, мы маглі б усе разам пабіць нашых гаспадароў і вызваліцца.

— Во, каб ды ўсе! — уздыхнуў Гор.— Ды толькі гэтага ніколі не можа быць. Не дагаворышся з усімі.

— З усімі і не трэба. Хай пачне хоць сотня, а там далучацца тысячы.

— Спартак праўду кажа,— умяшаўся трэці гладыятар.— Усё роўна мы мусім загінуць. Навошта ж тады...

Тут ён павінен быў спыніцца, бо ў дзвярах забразгаў ключ, і праз момант увайшоў інструктар.

— Заўтра будзе гладыятарскі бой,— сказаў ён.— Падрыхтавацца Спартаку і Гору. Яны будуць выступаць у пары.

Спартак ускочыў. Грудзі ў яго закалыхаліся.

— Я прасіў бы, каб мне вызначылі каго-небудзь іншага, незнаёмага, а то [illegible] сваім прыяцелем біцца вельмі цяжка...

— Мусіць, таму гаспадар і прызначыў вас,— усміхнуўся інструктар.— З ворагам біцца кожны ўмее, а вось цікава паглядзець, як будуць біцца прыяцелі.

І ён выйшаў за дзверы.

Ціха стала ў камеры. Толькі чуваць было, як цяжка дыхае Спартак. Гор утаропіў вочы некуды ў кут.

— Ну што ж,— сказаў ён нарэшце.— Прыйдзецца памерці. Толькі ты, Спартак, пастарайся, каб адразу...

— Не, Гор, я не магу. Лепш ужо я памру. Ды, нарэшце, яшчэ невядома, хто каго пераможа.

— Ну, гэта добра вядома.

— У такім разе я адмоўлюся біцца з табой,— ускрыкнуў Спартак.

— Тады мне загадаюць забіць цябе. Я адмоўлюся, і мы абодва загінем. Не, ці так, ці гэтак, мне ўсё роўна загінуць трэба. Лепш ужо аставайся ты і паспрабуй выканаць справу, аб якой толькі што казаў...

Назаўтра ў цырку, перад тысячамі гледачоў, было забіта дзвесце чалавек. У тым ліку і Гор.

Тысячы людзей віталі самага выдатнага пераможцу:

— Хай жыве храбры Спартак!

А Спартак глядзеў на іх з нянавісцю і думаў: «Але, я павінен жыць, каб адпомсціць вам за гэтых забітых таварышаў».

Праз два месяцы ў Рыме былі атрыманы весткі, што з Капуі ўцяклі семдзесят гладыятараў, разрабавалі некалькі маёнткаў, вызвалілі сотні рабоў, якія далучыліся да паўстанцаў. Камандуе імі выдатны гладыятар Спартак. Знаходзяцца яны цяпер на гары Везувій.

Зараз жа паслалі да Везувія тры тысячы салдат пад камандай Глабра.

Выявілася, што на гару вядзе толькі адна сцежка, а з іншых бакоў стромкія сцены, па якіх ні спусціцца, ні падняцца нельга.

Глабр загарадзіў гэтую сцежку і пачаў чакаць, калі голад прымусіць Спартака здацца.

А Спартак загадаў скруціць з зялёнага вецця вяроўкі, спусціў па іх свой атрад і напаў на рымлян ззаду.

Рымляне былі разбіты ўшчэнт і ўцяклі, пакінуўшы для Спартака багатую здабычу.

Тады супроць Спартака было выслана войска ў дзесяць тысяч чалавек. І яно таксама было разбіта.

Потым паслалі трыццаць тысяч чалавек. І іх Спартак разбіў.

Пасля таго выслалі армію ў шэсцьдзесят тысяч чалавек. І зноў яна была разбіта.

Тры гады Спартак наводзіў жах на ганарыстых рымлян. Тры гады разбіваў іх арміі.

Аднаго разу ён сабраў трыста палонных патрыцыяў і загадаў ім біцца паміж сабой так, як калісьці біўся сам і яго таварышы ў цырку. Гарачае жалеза прымусіла патрыцыяў пачаць «гладыятарскі бой».

А тысячы рабоў стаялі навокал і з захапленнем глядзелі, як іхнія паны забіваюць адзін аднаго на пацеху гладыятарам.

«Я выканаў сваё абяцанне, дарагі Гор»,— думаў Спартак, гледзячы на гэтую бойку.

Але ўсё ж такі Рымская дзяржава была больш магутнай, як армія Спартака. Рымскія легіёны былі навучаныя і дысцыплінаваныя, а ў Спартака армія была не падрыхтаваная да вайны.

І калі Рым выставіў апошнюю стотысячную армію пад камандай Краса, то паўстанню прыйшоў канец. Спартак рынуўся ў апошні бой і загінуў разам з дзесяткамі тысяч сваіх таварышаў.

А тыя шэсць тысяч чалавек, што трапілі ў палон, былі распяты на крыжах па дарозе ў Рым.

Так расправіліся патрыцыі з нявольнікамі, якія адважыліся дамагацца права быць людзьмі.

1936 г.

НА ПАРОЗЕ БУДУЧЫНІ

Цягнік ішоў з усходу, на Маскву. Ішоў па землях, якія не бачылі ворага з часоў Батыя. Але подых новага Батыя, з захаду, адчуваўся і тут. Адчуваўся на палях, якія і радзілі не так, па аратых, што не смяяліся; у вёсках, прыціхлых і суровых, якія думалі сваю думу; на станцыях, беднаватых і няўтульных; відаць быў у вачах вось гэтай маладзіцы, у руках старых рабочых. І надвор'е нейкае няпэўнае — не то вясна, не то восень.

Як светлыя праменні, хадзілі па краіне радасныя словы: «Немцаў абкружылі... разграмілі... узялі...» Але да ўсяго можна прызвычаіцца — прызвычаіліся і да гэтых слоў. Столькі часу б'ём ворагаў, а яны ўсё яшчэ дыхаюць, усё яшчэ шкодзяць...

Адно толькі ясна: за лёс радзімы трывожыцца ўжо не прыходзіцца, застаецца толькі ў кожнага свая асабістая трывога — за сына, за бацьку.

І асабліва балюча думаць, што яны могуць загінуць перад самым канцом вайны.

Спакойна, але цяжка дыхала руская зямля, як той падарожны, што прайшоў вялікі і небяспечны шлях і набліжаецца да свайго дому. Ён рады, што дарога канчаецца, але стаміўся і весяліцца зусім не мае ахвоты.

І цягнік ішоў, як той самы падарожны, цяжка, упарта, глуха пастукваючы сваімі коламі і сурова пакрыкваючы па ваколіцах.

У купэ мяккага вагона — маўклівы падпалкоўнік, заклапочаны маёр з рэдакцыі франтавой газеты, маладзенькі артылерыйскі лейтэнант і таксама малады худы капітан.

Ці яны ўжо ўсё перагаварылі, ці кампанія такая негаваркая падабралася, але гутаркі ў купэ было мала. А калі перакідваліся якімі словамі, дык меней за ўсё пра вайну. Ды

вядома ўжо, што ў такіх выпадках больш за ўсё любіць гаварыць пра вайну народ цывільны.

Толькі артылерыйскі лейтэнант стараўся павярнуць гаворку на ваенную тэму, бо першы раз ехаў на фронт. Падпалкоўнік і маёр вярталіся на фронт са шпіталя, а капітан зусім ехаў дадому. Гледзячы на яго акуратную падцягнутую фігуру, ніхто не сказаў бы, што гэта інвалід першай групы: левая рука ў яго была не свая.

Лейтэнант светлымі, пукатымі дзіцячымі вачыма ўсё дапытваўся аб некаторых, як ён казаў, «неафіцыйных» умовах франтавога жыцця, але яму часцей за ўсё з усмешкай адказвалі:

— Убачыце самі.

— Баюся, што не паспею,— сказаў ён з наіўным сумам.— Берлін ужо ўзялі.

Маёр пастараўся яго суцешыць:

— Войск у ворага яшчэ нямала. Пакіне супроць саюзнікаў якую тысячу салдат, а з рэштай можа ваяваць з намі хоць тыдзень, а за гэты час вы і даедзеце.

— Так, вайна канчаецца,— задумліва сказаў капітан,— але ўявіць сабе гэты канец аніяк не магу.

У гэты момант з суседняга купэ пачуўся зычны голас:

— Усё магу сабе ўявіць, хоць вайну з марсіянамі, а канца гэтай вайны ўявіць не магу. Як мы будзем жыць без паведамленняў ад Савецкага Інфармбюро? Як мы будзем адчуваць сябе, калі зваліцца з плеч цяжар? Які выгляд будзе мець Еўропа і якія складуцца міжнародныя адносіны?

— Чуеце? — усміхнуўся падпалкоўнік.— Відаць, усе мы думаем аднолькава.

З другога купэ, нібы выбухі мін, даносіўся стук даміно: там лічылі, што лепш за ўсё не думаць пра такія высокія матэрыі.

...Капітан Віктар Смолін ніяк не мог заснуць. Чым бліжэй пад'язджаў ён да роднага дому, тым цяжэй рабілася яму на сэрцы. Яму ж толькі дваццаць шэсць гадоў, а ён поўны інвалід — фактычна застаўся толькі з адной рукой. А калісьці ён быў найлепшым кіперам у сваёй заводскай камандзе. І як

яго сустрэне Рына?.. Яна, пэўна, вырасла, пасталела... Цяпер яна на яго і глядзець не захоча. Каму ён патрэбны такі?.. І сваім старым бацькам прывязе адно толькі гора. Не ён іх падтрымае на старасці, а ім трэба яго падтрымліваць. Вось усе чакаюць канца вайны, а што гэты канец дасць яму?..

На верхніх лаўках спалі маёр і лейтэнант. У калідоры нехта ціха казаў:

— Гэта ж цуд нейкі: чым бліжэй да канца вайны, тым магутней робіцца наша армія. Такіх катастрафічных удараў, як нашы, яшчэ ніхто, нідзе, нікому і ніколі не наносіў.

Заварушыўся падпалкоўнік, сеў, запаліў папяросу. Відаць, і ў гэтага спакойнага чалавека ёсць свае згрызоты.

— Не спіцца, таварыш падпалкоўнік? — спытаў Смолін.

— Нешта не клеіцца,— адказаў той.

Раптам недзе далёка, у другім канцы вагона, пачуліся словы:

— Германія капітулявала!

Падпалкоўнік і капітан усхапіліся, прыслухаліся.

Па вагоне, нібы навальніца, каціўся гул:

— Канец вайне! Германія капітулявала!

Адкуль узяліся гэтыя весткі? З поля ці з лесу, што прабягалі міма акон? Як бы там ні было, а хутка ўвесь вагон гудзеў, бы патрывожаны вулей. Цягнік у гэты час праходзіў не спыняючыся ля нейкага заняпалага раз'езда — і раптам з цемры некалькі галасоў так шчыра закрычалі «ўра», што ў капітана аж мароз прабег па целе.

У вагоне ўжо ніхто не спаў. Усе твары свяціліся, кожны спяшаўся выказацца, не слухаючы суседа.

Галовы самі падымаліся, грудзі самі выпрасталіся. Дзе ты цяпер, вораг подлы і люты? Вылізвай кроў сваю!

Артылерыйскі лейтэнант збянтэжана паўтараў:

— Вось і канец! Вось і канец! — і ніяк нельга было распазнаць, ці ён радуецца, ці шкадуе, што абышлося без яго.

У другім месцы ішла гарачая дыскусія на тэму: ці будзе гэтая вайна апошняй?

Некаторыя спакойна і ўпэўнена казалі:

— Пакуль існуе імперыялізм і капіталізм...

Другія супярэчылі:

— Хіба вы не бачыце, што ўвесь свет не жадае вайны? Яшчэ некалькі хвілін назад падобныя і розныя іншыя пытанні стаялі, як вада перад плацінай, і толькі ціха варушыліся, а цяпер плаціна прарвалася... Усе бытавыя і сямейныя справы павярнуліся другім бокам. Увесь свет павярнуўся другім бокам. І павярнулі яго мы!..

...Цягнік ішоў з усходу, па тых землях, дзе не ступала нага ворага з часоў Батыя і ніколі не ступіць. Паравоз ляцеў лёгкай птушкай, колы мілагучна выстуквалі рытм. Палі смяяліся, лясы спявалі. У паветры — музыка і радасць. Старая бабулька на сцежцы, з клункам на спіне, не адставала ад цягніка: самі ногі неслі яе да дзеда, каб паведаміць, што хутка прыйдуць іх сыны. Старыя рабочыя весела гушкалі ля моста вялізнае бервяно, нібы гуляючы з ім. Дзяўчаты махалі цягніку хусткамі і крычалі «ўра», пастухі таксама крычалі «ўра». Апрача таго, і ў лагчыне, нават не бачачы цягніка, нехта сам сабе крычаў «ура».

На станцыях не то кірмаш, не то ўрачыстая сустрэча.

Выйшаў падпалкоўнік з вагона — і імгненна ўзляцеў у паветра. Маёра абхапіла за шыю прыгожая дзяўчына і стала цалаваць.

— Дзеля аднаго гэтага варта было ваяваць чатыры гады,— сказаў маёр.

А на другой станцыі публіка абкружыла артылерыйскага лейтэнанта і давай гушкаць яго з крыкамі:

— Дзякуем вам, нашы родненькія!

Бедны лейтэнант, вярнуўшыся ў вагон, не мог глядзець у вочы сваім таварышам. Яму здавалася, што ўсе смяюцца з яго. Каб ведаў, што так будзе, нікому не сказаў бы, што яшчэ не быў на фронце.

І ў купэ былі ўжо не тыя пасажыры: маладыя, гаваркі падпалкоўнік, вясёлы маёр, жыццярадасны капітан.

За гэтыя гадзіны ўсё мінулае адышло ў гісторыю, і наша краіна пераступіла парог будучыні.

І ўбачыў капітан Смолін, што для яго гэтая будучыня зусім не такая, як здавалася ўчора. З чаго ён узяў, што яму

і жыцця ўжо не будзе? З правай рукой, з добрай галавой ды з натхненнем, якое цяпер пануе навакол, можна зрабіць такое, чаго ў іншых умовах ніяк не зробіш. З чаго ён узяў, што ён фізічна слабы, калі яму так і карціць ісці, рухацца, працаваць? А якое цяпер будзе цікавае жыццё наогул! Як хораша жыць і працаваць, працаваць і жыць!..

...Масква ззяла. Блакітныя вогненныя слупы шнырылі па небе. Жмені рознакаляровых зор узляталі ў паветра і дажджом падалі ўніз. Грымелі гарматы. Разлівалася музыка. Гулі галасы мільёнаў людзей — увесь народ быў на вуліцах, і ўсе смяяліся.

Ніводнага чужога не было сярод гэтых мільёнаў — усе звярталіся адзін да аднаго, як да блізкіх знаёмых. Ніводнага непаразумення, ніводнага грубага слова. Вышэйшае шчасце, шчасце народнае аб'яднала і зблізіла ўсіх.

У гэты дзень Масква, як і ўся краіна, пераступіла парог будучыні.

Смолін з насільшчыкам стаяў перад вакзалам, як на беразе мора. Як пераправіцца цераз яго? Але доўга стаяць не давялося — падпаўзла машына, і адтуль пачуўся голас:

— Таварыш, вам куды? Сядайце!

У машыне была сям'я нейкага незнаёмага чалавека. Смолін адразу адчуў сябе ў гэтай незнаёмай сям'і, як у сваёй. Машына паехала «шагам». На радыятар узабраліся два хлапчукі — і ніхто ім не пярэчыў.

І калі Смолін сядзеў ужо ў сваёй роднай сям'і, то ні яму, ні яго бацькам, ні Рыне зусім не прыходзіла ў галаву, што ён інвалід. Бо яны пераступілі парог будучыні.

1946 г.

НАРЫСЫ

РАСКАЖЫ ПРА СВАІХ СЯБРОЎ

Чытаючы выказванні дзяцей, я прыйшоў да вываду, што многія не разумеюць па-сапраўднаму слоў «сябар» і «сяброўства», не разумеюць таго вялікага сэнсу, які закладзен у гэтых словах.

Сяброўства — вялікая справа. Па-першае, яно не церпіць несумленных, баязлівых людзей. Не церпіць сяброўства зазнаек, якія паважаюць толькі сябе. Не церпіць таму, што сяброўства — вялікі абавязак, які ўскладзены на чалавека. Сяброўства абавязвае кожнага рабіць штосьці добрае для свайго сябра.

Калі чалавек культурны, смелы, калі ў яго цвёрды характар, вялікая воля, калі ён не кідае слоў на вецер, то ён з гонарам зможа выканаць гэтыя абавязкі. Ён заўсёды будзе тваім сябрам. Чаму? Таму, што ён зможа ў любы момант выручыць цябе з бяды, дапамагчы табе ў цяжкіх умовах, утрымаць ад дрэннага ўчынку. Сяброўства — гэта гатоўнасць пайсці на ахвяру дзеля таварыша.

Вялікі паэт Аляксандр Сяргеевіч Пушкін, знаходзячыся ў ссылцы ў сяле Міхайлаўскім, вельмі пакутаваў. Пакутаваў таму, што быў адарваны ад вялікага жыцця, якое кіпела ў Пецярбурзе і Маскве і якое ён так любіў, пакутаваў таму, што быў адарваны ад сяброў, з якімі любіў спрачацца...

Царскі ўрад забараніў каму б то ні было бываць у паэта.

Можна ўявіць, якія гэта былі пакуты для вясёлага, жыццярадаснага паэта. Ад нуды ён не мог працаваць, не мог пісаць. А яго ж вершаў чакала Расія, чакаў народ, які вучыўся многаму ў паэта.

І вось да апальнага паэта аднойчы прыехаў у госці яго лiцэйскі сябар Іван Пушчын. Ён правёў з Пушкіным усяго толькі суткі. Але пасля таго як ён паехаў, Пушкін перамяніўся. Да яго вярнулася ранейшая весялосць, ён зноў пачаў пісаць.

Ён ведаў, што і ў ссылцы ён не адзінокі, што аб ім памятаюць і клапоцяцца яго сябры. І гэта надавала сілы Пушкіну.

Як бачыце, дзеля добрага сябра Пушчын не пабаяўся гневу цара і яго ўрада. Пушчын быў сапраўдным сябрам.

Вось гэткім сябрам трэба імкнуцца быць кожнаму з вас.

Я ведаю, што табе не падабаецца, калі сябар, які даў слова, паабяцаў штосьці зрабіць, не стрымаў яго, не зрабіў нічога. Ён салгаў. Таму імкніся сам быць сумленным, умей трымаць сваё слова.

Не падабаецца табе і тое, што ў выпадку небяспекі сябар, на дапамогу якога ты разлічваў, збег, кінуў цябе аднаго. Таму будзь сам смелы, каб не падводзіць свайго сябра ў падобным выпадку. Рабі так, каб апраўдаць перад іншымі званне сябра.

Ніколі нельга парываць сяброўства з-за дробязяў. Часта з засмучэннем даводзіцца бачыць, як два вучні сварацца з-за зламанага алоўка. Да гэтага яны сябравалі так, што, здаецца, і вадой не разліць. Але зламаны аловак ламае і сяброўства. Калі сяброўства гэтых хлопчыкаў выявіла сябе менш важным, чым аловак, то гэта было не сяброўства. У сапраўдных сяброў бывае так: яны, не спрачаючыся, не сварачыся, разбяруцца, хто правы, хто вінаваты, і вінаваты прызнае, што зрабіў дрэнна, і пастараецца выправіць сваю памылку. Ад гэтага сяброўства толькі мацнее.

Толькі той мае права на сяброўства, хто імкнецца заўсёды ўсюды рабіць добрае для таварыша. Таму так цэняць у нашай краіне сапраўднае сяброўства людзей. Сябры ж змогуць заўсёды больш зрабіць, бо будуць дапамагаць адзін аднаму. Яны змогуць добра вучыцца, забаўляцца, рыхтавацца да экзаменаў. Яны змогуць зрабіць усё, што задумаюць, бо сяброўства — вялікая сіла.

1947 г.

ЯК Я ПАЗНАЁМІЎСЯ З ЯКУБАМ КОЛАСАМ

Гэта было ў 1905—1906 гадах. Я быў вясковым настаўнікам і на канікулы часам прыязджаў да сваіх знаёмых у сяло Верхмен, каля Смалявіч. Там мне расказвалі пра іхняга настаўніка Канстанціна Міцкевіча.

— Цікавы чалавек. Малады, а такі сур'ёзны, усё бачыць і заўважае. А калі што скажа, дык так трапна, што толькі дзіву даешся.— Потым расказчык азіраўся і казаў ужо ціханька: — Ён — рэвалюцыянер. Па начах доўга сядзіць, чытае і піша. Відаць, мае сувязь з сацыялістамі, атрымлівае пракламацыі, у бога не верыць. У царкву не ходзіць. А таварыш добры, усе яго любяць.

Усё гэта мяне вельмі зацікавіла, бо і сам я быў «бязбожнікам» і лічыўся «неблаганадзейным» (так называлі тады ўсіх тых, каго начальства падазравала ў рэвалюцыйнасці).

Яшчэ больш зацікавіў мяне верхменскі настаўнік, калі я пачуў, што ён паэт.

— Вершы піша,— казалі мне знаёмыя,— ды на беларускай, народнай мове. Падпісваецца: «Якуб Колас».

У той час на беларускай мове мала хто пісаў: царская ўлада друкаваць на роднай мове кнігі і газеты забараняла. Друкаваных вершаў Якуба Коласа тады яшчэ не было. Яны хадзілі па руках перапісаныя. А многія ўрыўкі, найбольш трапныя радкі, маленькія вершы-эпіграмы перадаваліся адзін аднаму на памяць.

Але ж і калючыя былі гэтыя вершы! Даставалася ў іх і памешчыку, і ўрадніку, і прыставу, і валасному старшыні ці пісару, і самому цару з яго міністрамі. І такой сакавітай мовай былі напісаны яны, што не толькі сяляне, але і тыя служачыя, якія не цікавіліся «мужыцкай» мовай, захапляліся яе хараством.

Можна сабе ўявіць, як мне хацелася пабачыць гэтага «та-

емнага» настаўніка, пазнаёміцца з ім. Але выпадку такога ні-
як не траплялася, хоць я некалькі разоў прыязджаў у Верх-
мен і жыў там многа дзён. Справа ў тым, што мы абодва, як
настаўнікі, мелі аднолькавы вольны час. І вось калі я пасля
заняткаў прыязджаў у Верхмен на канікулы, Якуб Колас
выязджаў на сваю радзіму, у Мікалаеўшчыну. А калі ён вяр-
таўся ў Верхмен, то я выязджаў з Верхмена ў сваю школу.
Але праз нашых агульных знаёмых мы адзін аднаго ведалі
і былі «завочнымі знаёмымі».

Летам 1906 года група маладых настаўнікаў у Мікалаеў-
шчыне на чале з Якубам Коласам пастанавіла склікаць
з'езд рэвалюцыйных вясковых настаўнікаў Міншчыны.

Гэта быў час, калі рэвалюцыя 1905 года была задушана,
калі царскі міністр Сталыпін залівай рэшткі пажару крывёю
рабочых. У такі час склікаць людзей на нелегальны з'езд бы-
ло нялёгка. Запрашалі толькі знаёмых, надзейных тавары-
шаў. Вось тут і выявілася наша завочнае знаёмства з Якубам
Коласам: праз верных людзей ён перадаў мне запрашэнне
на з'езд у Мікалаеўшчыне 9 ліпеня 1906 года.

Ад станцыі Стоўбцы я ехаў на веласіпедзе, па дарозе спы-
няўся, адпачываў і зусім не думаў, што за мной і за іншымі,
што ідуць і едуць гэтыя дні ў Мікалаеўшчыну, нехта ўжо со-
чыць.

У Мікалаеўшчынскай школе я знайшоў многа таварышаў,
незнаёмых і блізкіх. Сярод іх быў і Якуб Колас.

— Вось ты які! — сказалі мы адзін аднаму, калі нарэш-
це пабачыліся і пазнаёміліся.

Сярэдняга росту, сухарлявы, моцны, з высокім ілбом, чор-
нымі густымі валасамі, чорнымі вусікамі і чорнай лапінкай
барады пад губой — такім ён быў на працягу многіх дзесят-
каў год. Глядзеў ён на чалавека так, што кожнаму здавалася,
нібы ён яго наскрозь бачыць. Заўсёды быў спакойны, развaж-
лівы, не крычаў, не рагатаў і не балбатаў, як мы ўсе. Нездар-
ма таварышы называлі яго «дзедам». Але гэты дваццацітрох-
гадовы «дзед» ні ў чым не адставаў ад усіх іншых
таварышаў. А яго гарачыя, гнеўныя вершы сведчылі, што ён
і не такі ўжо спакойны, як здаецца.

Наш сход мы перанеслі на бераг Нёмана. Па дарозе з маладым запалам спявалі рэвалюцыйныя песні, і сярод іх былі песні нашага «ўласнага» песняра Якуба Коласа. Тут, на радзіме, яго творчасць ведалі больш, чым у Верхмене.

Размясціліся мы на цудоўным беразе Нёмана. Прэзідыум сядзеў на дубовай калодзе, сакратар са сваімі паперамі прыладзіўся на пні, а дэлегаты паселі на траву...

Хвалюючае было паседжанне. Мы пастанавілі аб'яднацца ў настаўніцкім саюзе і прыцягнуць у саюз усіх настаўнікаў, з якімі нам прыйдзецца сустракацца: мы паставілі сваёй задачай вакол кожнай школы стварыць рэвалюцыйны актыў з народа. Але бяда наша была ў тым, што мы не мелі сувязі з партыяй рабочага класа, без чаго на поспех было мала надзеі...

Калі пасля паседжання мы вярнуліся ў школу, то праз некаторы час нас акружылі сорак стражнікаў пад камандай пристава. Пакуль што нас толькі перапісалі і адабралі пашпарты. А калі мы вярнуліся на свае месцы, то атрымалі загады аб звальненні і аддачы пад суд.

Следства цягнулася гады два, бо мы ўсяляк стараліся заблытаць справу. Тут вельмі дапамог Якуб Колас. Так да суда наша справа і не дайшла. Толькі нідзе нас не прымалі на работу...

А сам Якуб Колас усё-такі трапіў пад суд і ў турму. Яго абвінавацілі ў тым, што ён пісаў і рассылаў пракламацыі. Знайшліся «эксперты», якія прызналі яго почырк. А ў сапраўднасці пісаў не ён. Якуб Колас ведаў, хто пісаў, але не сказаў гэтага ні на следстве, ні на судзе.

Так ён і пайшоў у турму за другога. І адседзеў тры гады.

1952 г.

НЕКАЛЬКІ СЛОЎ ПРА МАРАЛЬ

Што ёсць дабро і што ёсць зло? Якія агульныя крытэрыі выпрацавала чалавецтва? Якія ідэалы з'яўляюцца агульнымі для людзей нашага часу? Якія вечныя ісціны прызнаны ўсімі? Просім не палохацца — зараз мы скажам працей: ці можа быць на свеце такое злачынства, такі подлы ўчынак, які ўсе культурныя людзі прызналі б злачынствам? Пры гэтым маюцца на ўвазе не асобныя індывідумы — ці мала на свеце знойдзецца вылюдкаў? — а катэгорыі нармальных і адукаваных людзей.

Калі хто скажа, што забойства нявінных людзей для ўсіх вякоў і народаў лічылася справай ганебнай, то сёння найкультурныя атамшчыкі вам адкажуць, што гэтая мараль ужо састарэла, што цяпер пытанне ставіцца зусім наадварот: трэба знайсці такую бомбу, якая «не знішчала б матэрыяльных каштоўнасцей, а толькі адных людзей».

Можа, здрада належыць да той катэгорыі з'яў, якія ўсюды лічацца ганебнымі? Зноў не. Колькі ёсць краін, дзе здраднікі ганарацца сваёй дзейнасцю і займаюць высокія пасады!

Калі возьмем ашуканства, хлусню, адмаўленне ад свайго слова, то гэтай справай на нашых вачах займаюцца самыя паважаныя і багатыя джэнтльмены, ніколькі не лічачы такую дзейнасць ганебнай.

Што ж тады застаецца бясспрэчным у маральным кодэксе цывілізаванага чалавека? Можа, маральна-бытавое разлажэнне, распуста ўсімі прызнана ганебнай з'явай? Ні ў якім разе. Наадварот, за апошні час на Захадзе прапаганда распусты прымае ўсё большы размах. У Амерыцы «кароль парнаграфічных раманаў» Мілер з'яўляецца самым модным пісьменнікам. У Францыі розныя «сексуалісты» адкрыта прапаведуюць прымат самых нізкіх інстынктаў чалавека. Пахабныя «філосафы», кнігі, п'есы, малюнкі, трактаты, дэкларацыі

вядуць рашучае наступленне на «старую мараль». І ўлада ім не перашкаджае. Чаго добрага, маральную чысціню ў нашым разуменні хутка аб'явяць «ганебнай з'явай».

Нас усё гэта здзівіць не можа, бо мы даўно ведаем, што абсалютнай маралі няма, што яна залежыць ад сацыяльных умоў. Тое, што для нас з'яўляецца ганебным, у «іх» можа лічыцца дадатным і наадварот.

Аднак паколькі ў жыцці сучаснага чалавецтва ёсць і агульныя рысы, то можна знайсці і некаторыя агульныя погляды. Возьмем, напрыклад, пытанне аб «продажы жывога тавару». Няма ніводнай цывілізаванай краіны, дзе б гэты продаж быў дазволены. Нават там, дзе легалізавана прастытуцыя і парнаграфія, продаж жанчын забаронены. Ёсць і міжнародныя канвенцыі, якія забараняюць такі гандаль. І ніхто яшчэ не адважваўся адкрыта выступаць у абарону яго. Нават у камітэце Асамблеі па сацыяльных і гуманітарных пытаннях не знайшлося ніводнага чалавека, які выступіў бы за скасаванне такой канвенцыі. (Мусіць, таму, што Злучаныя Штаты яшчэ не паставілі гэтага пытання).

Але ў канвенцыях захаваўся архаічны пункт, паводле якога ў каланіяльных краінах продаж жанчын не забараняецца. Само сабой зразумела, што савецкая дэлегацыя ўнесла прапанову выключыць гэты ганебны пункт.

Хто мог адважыцца выступіць супроць такой прапановы? Хто мог адкрыта заявіць, што ён стаіць за продаж жанчын? Хто мог бы публічна прызнаць, што ён не лічыць такую справу ганебнай? Нават загартаваныя мужы, звыклыя выступаць супроць кожнай савецкай прапановы, не адважыліся на гэта.

Адважылася толькі... жанчына! Прадстаўніца Англіі Патон. Праўда, яна не сказала, што абараняе прастытуцыю і парнаграфію, яна зыходзіла з нейкіх юрыдычных меркаванняў, але факт застаецца фактам: іменна яна выступіла супроць савецкіх паправак аб забароне продажу жанчын. Вядома, ёй і кнігі ў рукі. Хто, калі не жанчына, лепш разумее гэтае пытанне?

Закулісныя заправілы, пэўна, лічылі, што супраць такога

аўтарытэтнага выступлення ніхто не ўстоіць. Але мужчыны ўстоялі. Магчыма, яны пачырванелі, але не згадзіліся з жанчынай і большасцю галасоў прынялі савецкія прапановы. Можа, тады пачырванела і місіс Патон, але што ёй было рабіць? Яна ж была прадстаўніцай англа-амерыканскага блоку і абавязана была выступаць супраць, не гледзячы на сваю жаночую годнасць.

Не пачырванеюць толькі тыя, хто кіруе ўсёй механікай. Бо гэтай здольнасці прырода ім не дала.

1947 г.

КАЛЯРОВЫЯ ДУШЫ

Вось дзе сапраўды «чорная» няўдзячнасць! Вось і вучы пасля гэтага чорны народ! Вось і нясі яму культуру!

Як вядома, кожная імперыялістычная дзяржава спаць спакойна не можа, калі ў якой-небудзь Афрыцы народ некультурны. І таму ў першую чаргу пасылае туды місіянераў.

Тыя бяруць з сабой люстэркі, цацкі, каляровыя анучкі, біблію і крыж і нясуць усю гэтую «культуру» да дзікуноў. Разам з імі едуць гандляры і вязуць цэлыя караблі такой самай «культуры». На кожны выпадак далучаюцца яшчэ салдаты са стрэльбамі, кулямётамі, газамі.

За ўсю гэтую цывілізацыю дзікуны павінны аддаваць усяго толькі золата, слановую косць, скуры і іншыя «дзікія» рэчы. Ды часам яшчэ папрацаваць гадзін з дванаццаць у дзень на еўрапейскіх плантацыях.

Самая адказная праца кладзецца на плечы місіянераў. Яны павінны асвятліць дзікуноў хрысціянскім вучэннем і падрыхтаваць глебу для шчаслівага жыцця... цывілізатараў.

І трэба сказаць праўду пра гэтых чорных дзікуноў: здольны народ, уцямлівы, дасканала можа вывучыць хрысціянства.

«У абсягах Уганды і Руанды,— піша бельгійскі місіянер Ру,— тубыльцы чакаюць месію-хрыста, які прагоніць белых, і тады толькі пачнецца ў Афрыцы царства хрысціянскай справядлівасці».

«Нейкі нікчэмны негр Кібангу,— даносіць губернатар Конга,— распаўсюдзіў вучэнне, што прыйдзе чарнаскуры месія-збаўца, прагоніць белых, і тады будзе ў іх краіне сапраўднае хрысціянскае жыццё».

У ангельскай Радэзіі негр Том Налендва вучыць, што добры хрысціянскі бог выдзьме ўсіх белых уладароў.

Французскія місіянеры з вострава Мадагаскара скардзяцца на тое самае.

Адным словам, місіянеры так добра навучылі дзікуноў, што яны сапраўды ўверавалі ў добрага хрысціянскага бога. Усё гэта грунтуецца на шчырым хрысціянстве. Чорныя апосталы ходзяць па ўсёй краіне і цытатамі з бібліі даводзяць, што набліжаецца царства Хрыста, што ён прагоніць белых прыгнятальнікаў. Хрысціянскі народ прагна слухае гэтыя словы і шчыра моліцца па спосабу, якому навучылі яго добрыя місіянеры.

Спалохаліся місіянеры, кінуліся пераконваць вучняў:

— Пачакайце! Вы ж не так зразумелі, наблыталі! Хрысціянства трэба разумець вось гэтак...

Але дзе там! Том Налендва з бібліяй у руках адразу разбіў іх довады, нават і абвінаваціў місіянераў у тым, што яны адхіляюцца ад хрысціянства.

Місіянерам нічога не засталося, як пусціць свой апошні довад.

Том Налендва быў арыштаваны, закатаваны і павешаны...

Пачалося паляванне на чорных апосталаў. А разам з гэтым спалена шмат вёсак, парасстраляна шмат народу...

Але дзікуны цвёрда стаяць за хрысціянства, хоць ты з імі што хочаш рабі.

Далейшага развіцця падзей мы пакуль што не ведаем, але магчыма дапусціць наступнае.

Адзін святы езуіт прапанаваў:

— Святыя браты! Давайце вучыць наадварот: ніякага бога няма, усё хрысціянства — хлусня. Ніякай дапамогі з неба не дачакаецеся, таму павінны слухацца нашых зямных загадаў, бо іначай...

Паслухаліся айца, пачалі вучыць наадварот. Не спадзеючыся на дапамогу, негры прыціхлі і пачалі слухацца сваіх гаспадароў.

Але... праз пэўны час пачаліся новыя скаргі.

Негры Бакінгу і Мот распаўсюджваюць вучэнне, што ніякага бога няма, што чакаць дапамогі з неба не выпадае, таму негры павінны самі...

Тады не заставалася нічога іншага...

Але вернемся да фактаў.

Працу ангельскіх, французскіх і бельгійскіх місіянераў мы яшчэ можам зразумець. Іхнія гаспадары маюць вялікія калоніі, маюць ад іх вялікія прыбыткі. Дзеля гэтага варта і папрацаваць.

Але што тады сказаць пра такую дзяржаву, як... Фінляндыя! Ніякай калоніі яна не мае; здавалася б, ёй зусім няма чаго дбаць аб чорных ды іншых каляровых душах.

Аднак і Фінляндыя разгарнула значную дзейнасць у гэтай галіне.

У Фінляндыі таксама ёсць спецыяльная арганізацыя — «Фінскае Місіянерскае Таварыства». Гэта багатая арганізацыя: маёмасць яе складае 12 мільёнаў фінскіх марак.

Не так даўно гэтае таварыства легкадумна абвясціла сваю справаздачу. З яе відаць, што свае фінляндскія душы ёй каштавалі 1 200 000 марак, чорныя афрыканскія — 2 300 000 марак і жоўтыя (кітайскія) — 1 162 000 марак.

Самымі дарагімі душамі выявілі сябе жоўтыя. За вышэйпаказаную суму апрацавана ўсяго толькі 38 душ. Гэта значыць, кожная душа каштавала 30 578,95 маркі! Ды яшчэ каб пэўныя былі гэтыя жоўтыя душы, тады яшчэ сяк-так. А то, як скардзіцца сама арганізацыя, некаторыя з іх памерлі, нават не дачакаўшыся канца справаздачнага года, а некаторыя дык і зусім здрадзілі.

На жаль, у газеце не паведамляецца пра сабекошт белых, асабліва ж чорных душ. Трэба думаць, што, калі арганізацыя не скардзіцца, яны каштавалі больш танна.

Але ў кожным разе мы можам толькі дзівіцца такой шчырай адданасці хрысціянству з боку фінаў. Калі ангельцы, французы атрымліваюць за гэта слановую косць, золата, каучук і іншыя такія рэальныя рэчы, дык фіны гэтага не маюць. А мільёны кідаюць. Мусіць, яны працуюць толькі дзеля сваіх уласных душ, якія... і карыстаюцца гэтымі мільёнамі.

1930 г.

УРАЛА-КУЗБАС

На Урале шмат жалеза. Ёсць нават жалезная гара — Магнітная. Але яна не распрацоўвалася. Бо вугалю няма. І шляхоў няма. І вады малавата. Наогул мясцовасць голая, пустэльная. Клімат суровы. Гарадоў, людзей няма. Хто мог адважыцца пачаць тут будаўніцтва? І летась было таксама, як сотні гадоў назад.

А сёлета — тут горад Магнітагорск, у якім жыве 150 тысяч чалавек.

А за 200 кіламетраў, у Сібіры каля горада Кузнецка,— вялікія запасы каменнага вугалю. У 5 разоў большыя, як у Данбасе. Дзесятая частка запасу ўсяго свету. Але як яго скарыстаць, калі фабрык і заводаў у Сібіры мала, калі так далёка закінуты гэты Кузбас, калі ўвесь гэты край дзікі? Жалеза няма. Шляхоў няма. Клімат суровы. У старых шахтах летась працавала некалькі соцень рабочых.

А сёлета жыве 100 тысяч народу.

Ляжала без карысці жалеза на Урале. Ляжаў без карысці вугаль у Кузбасе. Хто мог адважыцца перарабляць прыроду, адразу забраць багацці? І ў Англіі, і ў Германіі, і ў Амерыцы, у сярэдзіне краіны, сярод густога насельніцтва, паступова, на працягу 20—40—60 гадоў крок за крокам заваёўвалі вугаль і жалеза. Сёлета правядуць дарогу, на другі год выкапаюць новую шахту, на трэці пабудуюць завод, на чацвёрты яго дабудуюць! А ў нас прыйшлі бальшавікі-рабочыя і за адзін год ауладалі прыродай.

Гэта таму, што нам чакаць нельга, мы адсталі, нам трэба даганяць і пераганяць капіталістычныя краіны. Таму, што мы працуем не на капіталістаў, а на сябе. Таму, што мы ведаем, куды ідзём, чаго дамагаемся, за што змагаемся. І таму, што арганізаваны шматмільённы пралетарыят пад кіраўніцтвам Ленінскай партыі можа ўсё зрабіць, што захоча.

Што мы будзем мець ад гэтага?

Мы злучым самыя вялікія запасы жалеза з самымі вялікімі запасамі вугалю. Мы знішчым гэтыя 200 кіламетраў. Безупынна цячэ вугаль з Кузбаса на Урал, а з Урала ў Кузбас — жалезная руда. Будзе нібы адзін завод УКК — Урала-Кузнецкі камбінат. Ён адзін дасць нам столькі жалеза, колькі раней давалі ўсе заводы вялізнай Расійскай імперыі. Ёсць толькі адзін завод у свеце (у Амерыцы), які яшчэ застаецца большым за Магнітагорскі. А кузнецкі вугаль, апрача апалу электрастанцыі і коксу для вырабу жалеза, дасць яшчэ асфальт, усялякія фарбы, газы, нафталін, карболку, аспірын, нашатырны спірт, сахарын і яшчэ сотню падобных рэчаў.

Каб нагрузіць вагоны цэглай, патрэбнай для УКК, дык расклаўся б цягнік, даўжынёю ад Мінска да Масквы. Пры пабудове Кузнецкага завода выкапана столькі зямлі, што падводы з ёю занялі б 5000 кіламетраў. Кожны дзень патрабуецца 2000 вагонаў жалеза, дрэва і іншых матэрыялаў. На пабудовах працуе 80 000 рабочых. Кузнецкая (Кемераўская) электрастанцыя будзе такая самая, як Днепрабуд.

Такога будаўніцтва свет яшчэ не бачыў.

Прыемна нам усё гэта падлічваць і нецярпліва чакаць, калі ўсё будаўніцтва будзе скончана. Пакуль надрукуюцца гэтыя радкі, мы ўжо будзем чытаць у газетах: электрастанцыя скончана... першыя домны пачалі працаваць... уступіла ў строй яшчэ адна домна... яшчэ... яшчэ адзін завод... другі...

А ці кожны з нас добра ўяўляе, як гэта робіцца, як дасягаюцца поспехі?

Каб пабудаваць такія прадпрыемствы за паўтара года, трэба працаваць і ўлетку і ўзімку, і дзень і ноч.

Зараз там 40 градусаў марозу. Вятры дзьмуць сухія, халодныя. Выйсці на двор нельга, а тут трэба лезці высока, муроваць... Цэгла пячэ рукі... Бетон, гліна, вапна замярзаюць. Не лепш і тым, хто капае мёрзлую зямлю, хто капае жалеза, хто возіць, носіць, падае́.

Вось адзін, другі, кажа: «А ну яго! Гэтак немагчыма вытрымаць!» Вось адзін, другі кідае працу, збіраецца ўцякаць дадому, у цёплую хату.

Але сотні, тысячы ўдарнікаў працуюць упарта, аддана. Не глядзяць на гадзіны, на выхадныя дні. Здараецца, што двое, трое сутак рабочыя самі не адыходзяць ад рабочага месца.

Бо яны ведаюць, што вось гэтую іхнюю работу абавязкова трэба скончыць цяпер, бо інакай на суседнім участку будзе прастой. І ўсю пабудову трэба скончыць у вызначаны час, бо інакай суседняя пабудова затрымаецца.

Нават замежныя рабочыя і інжынеры захапляюцца такой працай. І сорамна робіцца тым, хто збіраўся ўцякаць. І ўсё менш і менш знаходзіцца дэзерціраў.

А ў гэты самы час на іншых заводах СССР рыхтуюць матэрыялы, машыны для тых, хто там, як на фронце. Працуюць інтаксама ўдарна, бо інакай там затрымаецца пабудова. Усе іншыя працоўныя дапамагаюць гэтым заводам выканаць заданне. Нават калі мы шлём бульбу ленінградскім заводам, што выконваюць заказы для Магнітагорска, то таксама прымаем удзел у гэтай справе. І калі дзеці дапамагаюць бацькам у агульна-карыснай працы, яны таксама з'яўляюцца ўдзельнікамі будаўніцтва.

Вось чаму ў Савецкім Саюзе магчымы такія «цуды», як пабудова УКК за паўтара года.

А ўслед за гэтым у Новасібірску будзе пабудаваны другі завод, падобны да Магнітагорскага. На сібірскай рацэ Ангары ўжо прыступаюць да пабудовы электрастанцыі, якая будзе раўняцца васьмі Днепрабудам. Кузбас будзе ўвесь час пашырацца і праз пяць гадоў дасць вугалю ў два разы больш, як цяпер увесь Саюз. А на Урале пабудуецца электразавод, на якім адных толькі інжынераў і тэхнікаў будзе 12 500 чалавек. Там жа будуецца завод, які *кожны дзень* будзе выпускаць столькі вагонаў, якія, калі паставіць іх адзін за другім, зоймуць 2,5 кіламетра.

Хутка, вельмі хутка мы ўбачым такія «цуды», якія нікому нават не сніліся.

Але ўвесь час будзем памятаць, што само яно не зробіцца, што прымаць удзел у гэтым павінны ўсе, ад старых да малых.

1931 г.

ПАДАРОЖЖА ПА МАЛОЙ БЕЛАРУСКАЙ ЧЫГУНЦЫ

На карце вы яе не знойдзеце. Можа, таму, што пабудавана яна ўсяго толькі два гады назад і яшчэ не ўключана ў агульную сетку чыгунак СССР, а можа, таму, што яна ўсё ж такі завецца Малой чыгункай.

Ва ўсякім разе на пасажырскім руху гэта не адбіваецца, і кожны грамадзянін можа без перашкоды зрабіць па ёй падарожжа ад станцыі Радаснай да станцыі Шчаслівай ці наадварот. Білет трэба браць да станцыі Гомель, а там ужо будзе перасадка на станцыю Радасную Малой Беларускай чыгункі. У 1938 годзе па ёй перавезена пяцьдзесят тысяч пасажыраў, і праехалі ўсе яны разам — дваццаць тысяч кіламетраў. Вылічвайце самі, якую даўжыню мае магістраль.

Але сярод чыгуначнікаў Малой Беларускай у гэтым сэнсе наглядаецца адна нездаровая рыса: усе хочуць быць або машыністамі, або дзяжурнымі па станцыі.

Адзін стрэлачнік, паважаны такі чалавек, у форме, са сцяжкамі і дудой, нават расплакаўся, нібы дзіця якое:

— Не хачу быць стрэлачнікам! Хачу быць дзяжурным па станцыі! Я ўжо цэлы месяц прабыў стрэлачнікам.

Усёй адміністрацыі на чале з начальнікам дарогі давялося ўгаварваць яго.

— Які ты будзеш дзяжурны па станцыі, калі яшчэ не ведаеш, як стрэлку перавесці? Трэба спачатку азнаёміцца з працай стрэлачніка, кандуктара, кантралёра, а потым ужо быць дзяжурным.

— А чаму Лізу адразу прызначылі дзяжурнай па станцыі? — хмура адказаў стрэлачнік.

Начальства зачмыхала носам.

— Мгм... Э-э... Бачыш, гэта было зроблена раней. А цяпер ужо кожны павінен пачынаць службу з прасцейшых пасад. Пачакай трошкі, перавядзём і цябе.

Хоць паравоз яшчэ больш прывабны, як чырвоная шапка дзяжурнага, але адразу прэтэндаваць на машыніста ніхто не адважваецца. Гэтай кваліфікацыі дабіваюцца паступова, і маладзей за васьмікласніка машыністы звычайна не бываюць. Двое з іх сёлета нават ездзяць практыкантамі па вялікай чыгунцы.

Мне пашанцавала: чарга ля касы невялікая — дзве дзяўчынкі па сем-восем гадоў ды прыезджы «турыст». Гэты хлапчук за сённяшні дзень ужо восьмы раз купляе білет, які каштуе дзесяць капеек, а для дарослага — дваццаць.

У білетнай касе — сталая касірка гадоў трынаццаці ды маленькая палахлівая практыкантка. Штохвіліны азіраючыся на старэйшую, практыкантка закампасціравала і выдала мне білет. Я з ім адразу ж падаўся на перон. Але дванаццацігадовы кантралёр сурова спыніў мяне:

— Нельга. Поезд яшчэ не прыйшоў.

Я паспрабаваў быў спрачацца, а потым, каб улагодзіць яго, пачаў жартаваць, але кантралёр сур'ёзна зірнуў на мяне, як на малога недысцыплінаванага хлапчука, паўтарыў «нельга» і адвярнуўся. У гэты момант я сапраўды адчуў сябе хлапчуком перад ім.

Пачуўся далёкі грукат поезда, гудок паравоза, адказ стрэлачніка. Зазвінеў службовы тэлефон. На перон выбег дзяжурны па станцыі — дзяўчынка гадоў пятнаццаці, у форме, у чырвонай шапцы. Паравоз і два вагоны спыніліся каля платформы.

З паравознай будкі выглянула замурзаная фізіяномія шаснаццацігадовага машыніста. (Тут недзе ёсць і дарослы машыніст — інструктар, які кіруе ўсёй справай, ды публіка яго не заўважае.)

Я зноў сунуўся на перон і зноў мяне не пусціў непахісны перонны кантралёр:

— Пачакайце, дзядзька. Пасадкі яшчэ няма.

— Ах, каб табе вырасці здаровым! Вось дык бюракрат!

Прайшло яшчэ некалькі мінут, пакуль паравоз перагналі на другі канец поезда, перанеслі ліхтары, аформіліся ў дзяжурнага па станцыі — і тады толькі пусцілі нас у вагон.

Вагоны мне не спадабаліся: яны маглі б быць крыху большымі, ды і па выгляду яны не падобныя на сапраўдныя пасажырскія вагоны. Але пасажыры адчувалі сябе лепей, як ва ўсіх найсапраўднейшых вагонах.

Поезд крануўся. З кабінета начальніка станцыі выразна чуецца голас:

— Выклікаю станцыю Шчаслівую. Адпраўляю поезд № 12. 14 гадзін 17 мінут...

Палатно чыгункі ва ўзорным парадку. Па баках — нітачкі з белых каменьчыкаў. Гэта заслуга брыгадзіра і яго таварышаў. Ён самы малы па росце і самы вялікі энтузіяст сваёй справы. Аднаго разу ён са сваёй брыгадай прабіўся да начальніка Вялікай Беларускай чыгункі і прывёз цэлы грузавік карысных для сваёй гаспадаркі рэчаў.

Пасля таго начальнік папракнуў кіраўніка Малой чыгункі:

— Нашто вы пасылаеце ка мне дзяцей па такіх справах, якія можна зрабіць без мяне?

Начальнік Малой дарогі здзівіўся: ён зусім і не ведаў аб гэтым паходзе бравага брыгадзіра. Прыйшлося зрабіць яму афіцыйную вымову за анархічны ўчынак. Ну, а неафіцыйна, можа, было і інакш...

Чыгуначная паласа цяпер не толькі адгароджана, але і заслонена густымі дрэвамі і хмызняком. А раней не было рады ад парушальнікаў чыгуначнай тэрыторыі. Ахова часта лавіла іх, складала пратаколы і штрафавала парушальнікаў на 5 капеек.

Вось круты паварот. Раней тут паравоз сыходзіў з рэек, пакуль не перамянілі іх на больш цяжкія. Далей — віядук цераз дарогу, які замяніў ранейшы пераезд; тут стаіць будка і застаўся яшчэ замацаваны шлагбаум. Паказалася станцыя Шчаслівая.

Падняўся семафор.

Да нас падышлі праваднік і кантралёр. У кантралёра ў руках бліскучая машынка для прабівання білетаў, сапраўдная, якая ўжываецца і на вялікіх чыгунках.

У гэты момант у мяне неяк вылецеў з рук білет.

— Што рабіць? — кажу кантралёру.— Білет вываліўся праз акно.

Кантралёр і праваднік былі збянтэжаны больш за мяне. Пазіралі адзін на аднаго, паціскалі плячыма.

— Хіба ў вас ніколі такога выпадку не было? — пытаюся я.

— Ніколі!

— Ну, а што вы зрабілі б, каб вам трапіўся заяц?

— Гэтага не было і быць не можа.

— Што ж усё-такі будзеце рабіць са мною?

Але ў тым і бяда была, што яны зусім не ведалі, што са мною рабіць.

— Можа, штрафаваць будзеце? — падказаў я.

— Ды трэ было б узяць штраф,— адказаў кантралёр.

— Колькі?

— Мусіць... рублёў шэсць,— прамовіў праваднік.

— А чаму шэсць?

Кантралёры і самі гэтага не ведалі.

Поезд тым часам падышоў да станцыі Шчаслівай. Я выйшаў з вагона і стаў чакаць вырашэння свайго лёсу.

Скоса пазіраючы на мяне, хлопцы пачалі ціхенька раіцца паміж сабою. Пасля адзін з іх махнуў на мяне рукой і сказаў:

— Ну, ідзіце сабе.

— А як жа ж са штрафам?

— Ідзіце, ідзіце. У вас білет быў.

Значыць, мае суддзі паглядзелі на справу з фактычнага боку, па сутнасці, і махнулі рукой на фармальнасць. А на Вялікай чыгунцы мне не раз даводзілася бачыць, як падыходзілі да справы зусім наадварот...

Падарожжа па Малой Беларускай чыгунцы скончылася. Я пайшоў да выхада.

Каля пад'езда нікога не было. Толькі недзе пад ганкам поркаўся ў пяску хлапчук у сініх трусіках. Убачыўшы дзядзьку з партфелем, ён палічыў мяне за начальства, вылез з-пад ганка і папрасіўся:

— Я хачу паступіць на чыгунку. Можна?

— На якую работу?

— Машыністам.

— Ну, не. Машыністам рана яшчэ.

— Тады куды-небудзь.

— Зайдзі пагавары,— параіў я яму і шчыра пашкадаваў гэтага адзінага ў СССР беспрацоўнага чалавека.

1938 г.

НАШЫ ДЗЕЦІ

Вялікая Айчынная вайна паказала ўсю веліч савецкага народа і яго арміі. Многія пакаленні будуць дзівіцца і захапляцца подзвігамі нашага народа. І сярод гэтых незлічоных подзвігаў асобнае месца будуць займаць подзвігі нашых дзяцей і іх матак.

Асабліва моцнае ўражанне робяць гэтыя факты, калі аб іх расказваюць самі дзеці, удзельнікі падзей. Няхітрыя, непасрэдныя дзіцячыя словы часта больш гавораць, як самыя красамоўныя апісанні.

Галоўная асаблівасць гэтых расказаў тая, што ў іх гаворыцца аб людзях, якія рабілі сваю справу, нават не ведаючы, што яны робяць подзвіг.

* * *

Два хлопчыкі на Гомельшчыне — Чэчанкоў і Сабернікаў — былі ўзяты немцамі на работы. Праз некаторы час яны ўцяклі. Здавалася б, што, паспытаўшы такой катаргі, яны павінны былі б сядзець цяпер ціхенька, як мышы, каб зноў не трапіць у рукі ворага. Але яны былі савецкія дзеці і зрабілі іначай. Знайшлі недзе «кусачы» і пайшлі ўдвух самастойна, па сваёй ініцыятыве, рэзаць правады. «За адзін дзень мы перарэзалі шэсць правадоў, а потым больш і больш». А пазней адзін з іх загінуў смерцю героя.

Дзесяцігадовая Зоя Васілеўская з Сенненскага раёна пасля смерці бацькоў жыла ў чужой вёсцы ў нейкай цёткі. Дзяўчынка звязалася з партызанамі і выконвала іх даручэнні. Нават паступіла на работу ў нямецкі штаб, дастала там чатыры рэвальверы, хавала іх дома — і цётка не ведала, што яе дзяўчынка вядзе такую небяспечную работу. Не маглі падумаць гэтага і немцы, хоць старанна шукалі таго, хто ўзяў.

Яшчэ большае ўражанне робяць факты, калі ў паасобных выпадках самі маткі накіроўваюць сваіх дзяцей на подзвіг. У савецкай маці любоў да сваёй Айчыны цесна спалучаецца з любоўю да свайго дзіцяці.

У Бабруйску маці Захарэнка даручыла свайму дзевяцігадоваму сыну... узарваць танк! Танк стаяў на вуліцы, нямецкія танкісты гулялі ў доме. Маці дастала магнітную міну і навучыла хлопчыка, як яе ўжываць. Потым павяла яго да танка. Там група дзяцей гуляла ў вайну: адны «наступалі», другія «адступалі». Хлопчык далучыўся да тых, што адступалі, і схаваўся пад танк. Там ён падлажыў міну, а затым з крыкам «ура» выскачыў з-пад танка, кінуўся на тых, што наступалі, і ўцёк. Праз шэсць гадзін танк узарваўся.

Вось некалькі фактаў з дзейнасці маткі і дачкі Зажарскіх у Брэсце, апісаных дачкой Лерай (Калерыяй). Лера мела дзесяць гадоў, калі пачалася вайна. Маці яе звязалася з падпольнай арганізацыяй і вяла адказную работу. Праз кароткі час яна ўключыла ў работу і малую сваю дачку.

Дзяўчынка насіла па ўказаных адрасах нелегальную літаратуру, газеты, лістоўкі, радыёзводкі. Але часцей за ўсё маці пасылала яе ў горад глядзець, дзе, на якой вуліцы, у якім доме змяшчалася тая ці іншая вайсковая часць.

Паступова заданні рабіліся ўсё больш і больш адказнымі.

«Аднойчы я панесла ўзрыўчатку на вуліцу Сянкевіча ў дом, дзе былі нямецкія лётчыкі і наша сувязная. Тол быў на дне кошыка, затым была насыпана мякіна, а ў ёй яйкі, якія я мяняла на хлеб. На кухні мяне спаткала наша дзяўчына Насця Паршына, [redacted] з ёй быў немец. Звычайна немец ішоў па хлеб, а я перадавала Насці ўзрыўчатку. На гэты раз немец сам стаў памагаць мне выбіраць [redacted] кошыка яйкі і капацца ў мякіне. Я з жахам думала, што зараз ён дабярэцца да дна і намацае тол. Тады Насця за яго спіной бразнула на падлогу каштоўнае блюда. Немец стаў лаяць Насцю, а я тым часам выложыла з кошыка ўсе яйкі. А потым, як немец выйшаў, аддала Насці тол.

Калі дома я расказала аб гэтым маме, яна збялела, абняла мяне і сказала:

— Дачушка мая! А каб цябе выкрылі, пасадзілі ў турму, ты б сказала, чыя ты і хто ты?

— Ніколі!

— А цябе білі б і катавалі, як Галю.

— Я тады думала б пра Галю, Веру і Барыса Апашкіна, а я — піянерка, іх змена.

— А ты не пакрыўдзілася б на нас з татам, што мы цябе пасылалі на гэтую справу?

— Я ганаруся вамі і гэтай справай!»

У вёсцы Навасёлкі Слаўгарадскага раёна маці паслала свайго адзінаццацігадовага сына, Ваню Сіманава, дастаць зброю з нямецкага склада. Склад быў у адной хаце, якая стаяла наводшыбе. Хлопчык удзень з агарода прабраўся ў склад і выцягнуў дзве вінтоўкі з патронамі. Гэтак ён зрабіў яшчэ і яшчэ раз, а на чацвёрты папаўся.

Пачаўся допыт, катаванне. Хлопчык маўчаў. І вось прыйшла маці і заявіла, што ён не вінаваты, што яна сама паслала яго... Маці забілі. Сына жывым кінулі ў калодзеж. Ён выратаваўся і цяпер знаходзіцца ў Магілёўскім дзіцячым доме.

Месца не дазваляе прывесці яшчэ больш падобных фактаў. Усе яны ўздымаюць перад намі велічны вобраз савецкай маці і дзіцяці. Гэтыя прыклады заўсёды будуць натхняць наш народ не толькі ў часе выпрабаванняў, але і ў часе мірнага будаўніцтва.

1946 г.

Аднаактовая п'еса

«ХАТА З КРАЮ»

ДЗЕЮЧЫЯ АСОБЫ

Сяргей — хлопчык гадоў 13-ці
Маці
Бацька
Дыверсант
Ніна — 12 гадоў } суседскія дзеці
Андрэй — 8—10 гадоў } суседскія дзеці
Першы калгаснік
Другі калгаснік
Першы пагранічнік
Другі пагранічнік

Дзея адбываецца ў прыгранічным калгасе.
Хата. Бацька і маці выпраўляюцца ў дарогу. Дома застаецца Сяргей.

Бацька. Глядзі, Сяргейка, нікуды не выходзь да нашага прыезду. Наша хата з краю: ці мала хто можа сунуць свой нос.

Сяргей. Няўжо ж увесь дзень сядзець у хаце?

Бацька. Калі не ў хаце, дык каля хаты, а далёка адыходзіць не трэба.

Маці. Начысціш на вячэру бульбы. Вось гэты чыгунчык. Намый добра, прынясі трэсак і падрыхтуй усё так, каб адразу можна было варыць, як мы прыедзем.

Сяргей. Добра, зраблю. А вы да ночы вернецеся?

Бацька. Пастараемся вярнуцца.

Маці. А калі спознімся, ты свінню накармі, курэй зачыні і папрасі цётку Марылю, каб карову падаіла.

Сяргей. А вы не пазніцеся. А то я буду ноччу баяцца.

Бацька. Ай-яй-яй! Які сорам! А яшчэ піянер, ды прыгранічны, ды герой, які шпіёна злавіў! Што людзі скажуць, калі даведаюцца, што ты такі баязлівец?

Сяргей. Не ведаю. Але адзін уначы буду баяцца.

Маці. Прыедзем, прыедзем, не бойся. *(Ідуць да дзвярэй.)* Глядзі толькі, каб усё тут у парадку было.

Бацькі выходзяць. Сяргей выйшаў за імі, але зараз жа вярнуўся з кошыкам бульбы. Прыстасаваўся, пачаў чысціць бульбу ды спяваць на ўсё горла. Праз некаторы час ціханька адчыняюцца дзверы, і паказваецца чалавек з барадой, у надта ўбогай сялянскай вопратцы, у лапцях. Чалавек аглядае хату. Сяргей не бачыць яго.

Чалавек. Эй, хлопец! Дзе бацька?

Сяргей. Няма. Паехаў.

Чалавек. А маці?

Сяргей. Таксама няма. Разам з бацькам паехала.

Чалавек. А хутка вернуцца?

Сяргей. Абяцалі к вечару. А можа, і спозняцца.

Чалавек. Шкада. А хто яшчэ ёсць у хаце?

Сяргей. Нікога. Я адзін застаўся.

Чалавек *(уваходзіць)*. Вельмі шкада. Надта мне патрэбен твой бацька. Справа да яго ёсць, і даволі важная. Я ўсё ж такі думаю пачакаць. Можна будзе?

Сяргей. Калі ласка, толькі ці захочаце столькі часу сядзець? Яны ж вернуцца позна.

Чалавек. Нічога, пасяджу, адпачну. Вельмі стаміўся. *(Садзіцца.)*

Сяргей. А вы здалёк прыехалі?

Чалавек. Дзе там ехаць? Прыйшоў. З Папоўшчыны.

Сяргей. А гэта далёка?

Чалавек. Ды вёрст трыццаць будзе. За Кудрычамі.

Сяргей. А колькі гэта будзе на кіламетры? У нас вёрсты не ўжываюцца.

Чалавек. Ды і ў нас таксама. Але я па-старому сказаў. На кіламетры будзе трохі болей. Я, браток, крыху прылягу: змарыўся. *(Лажыцца на лаўцы.)*

Сяргей. Гэта ваш калгас завецца Папоўшчынай?

Чалавек. Але.

Сяргей. А ў нас такіх назваў няма. Калгас не згадзіўся б насіць такое імя.

Чалавек. І наш калгас носіць назву «Чырвоны... э-э...

певень». А Папоўшчына — ранейшая назва вёскі, дзе я жыву. Твой бацька добра ведае яе. Колькі разоў бываў у мяне! Мы ж з ім старыя сябры. Разам ваявалі яшчэ.

Сяргей. З кім?

Чалавек. Ды з палякамі. Многа пагаравалі, але затое заваявалі шчаслівае жыццё.

Сяргей. А чаму ж вы ў лапцях? У нас лапцей не відаць.

Чалавек *(жвава ўзняўся).* Не відаць, кажаш? Не носяць? Ну, а я пашкадаваў свае новыя боты ў такую дарогу. Навошта дарма іх трапаць? Праўда, нічога не значыць купіць другія, але ўсё ж такі лапці танней, ды і лягчэй у іх ісці. Вы, шчаслівыя савецкія дзеці, не ведаеце, што такое лапці, а мы з тваім бацькам нават на Варшаву ішлі ў лапцях. *(Пазяхае.)* Але ж затое і злуюць буржуі на нас! Так і пруць, так і лезуць праз кожную шчыліну. У нас у Папоўшчыне кожны дзень ловяць шпіёнаў. А ў вас?

Сяргей. Здараецца часам і ў нас.

Чалавек. У нас не толькі пагранічнікі, але і ўсе сяляне, нават дзеці ловяць шпіёнаў. А табе здаралася злавіць?

Сяргей. Я ў такія справы баюся лезці. На гэта ёсць пагранічнікі, яны дарослыя, з вінтоўкамі. А мне куды соваща на старэйшых? Яны ж дужэйшыя за мяне.

Чалавек. Правільна! Ты, відаць, разумны хлопец. Я свайму сыну таксама кажу: навошта табе лезці ў справы дарослых? Цябе ж адным пальцам могуць раздушыць, як камара якога. Ніколі не было, каб дзеці ўмешваліся ў дзяржаўныя справы: абыдзецца і без іх. Хопіць для гэтага і салдатаў.

Сяргей. У нас чырвонаармейцы, а не салдаты.

Чалавек. Чаму ж гэта ў вас? У нас у Папоўшчыне таксама чырвонаармейцы, але я часам кажу — салдаты, бо сам калісьці быў салдатам. А ў вас чырвонаармейцы ў вёсцы жывуць?

Сяргей. Жывуць патроху...

Чалавек. А застава дзе?

Сяргей. Ды недзе там... Я нават добра не ведаю. Не траплялася бываць. Ды туды і не пускаюць.

Паўза. Чалавек зноў лёг.

Чалавек. Усё ж такі непрыемна жыць ля самай граніцы. Увесь час адчуваеш сябе нібы звязаным. Калі, скажам, цяпер з вашай хаты ды пайсці ў лес, то, напэўна, таксама за табой хто-небудзь пойдзе сачыць? А?

Сяргей. Не ведаю. Мы гэтага не заўважаем.

Чалавек. А адсюль праз лес можна прайсці ў Муравічы?

Сяргей. Не ведаю.

Чалавек павярнуў галаву і падазрона паглядзеў на Сяргея.

Чалавек. Вельмі дзіўна, што ты не ведаеш свайго бліжэйшага лесу.

Сяргей. Лес я ведаю, але ў Муравічы не хадзіў: там балота.

Паўза. Затым чалавек устаў і сеў на лаве.

Чалавек. Слухай, хлопчык!.. Я ўжо забыўся, як цябе завуць...

Сяргей. Сяргей.

Чалавек. Ах, так — Сяргей. Прыпомніў цяпер: калі табе было тры ці чатыры гады, ты прыязджаў да нас з бацькам і з маткай. Дык вось, Сяргейка, пашукай мне якога малака, а то не дачакаюся я твайго бацькі і памру ад голаду. Знойдзецца?

Сяргей *(устае і ідзе да дзвярэй)*. Зараз.

Чалавек. Ты куды?

Сяргей. У склеп. Там малако.

Чалавек. Тады не варта турбавацца. Я пачакаю.

Сяргей. Гэта няцяжка. Я зараз прынясу.

Чалавек. Не, не! Не трэба. Я ўжо не хачу. Лепш ужо дай, калі знойдзецца пад рукой, якую цыбуліну ці кавалак сала.

Сяргей. Пашукаю. *(Дастае цыбулю, сала, хлеб.)* А то я мігам прынёс бы малака.

Чалавек. Дзякую. Не трэба ўжо. Я трошкі падзакушу, а там і бацька прыедзе. А тады ўжо такую вечарынку наладзім... У цябе, здаецца, яшчэ ёсць браты і сёстры?

Прымаецца за яду. Паўза. Сяргей зноў садзіцца чысціць бульбу.

Сяргей. Ёсць старэйшая сястра.

Чалавек. Так, Волька, здаецца?

Сяргей. Не, Лена.

Чалавек. Выбачай, я хацеў сказаць — Лена. Дзе яна цяпер?

Сяргей. Вучыцца ў Мінску, ва універсітэце.

Чалавек. Глядзі ты, як пайшла! А, здаецца, так нядаўна бачыў яе такой нікчэмнай дзяўчынкай. Мой старэйшы сын таксама вучыцца ў мінскім універсітэце. Пэўна, яны там сустракаюцца. Ці думалі мы з тваім бацькам, што нашы дзеці некалі будуць вучыцца ва універсітэце?.. *(Паўза, есць і пазірае ў акно.)* Да вас суседзі часта заходзяць?

Сяргей. Ды не! Зусім рэдка. Мы ж жывём наводшыбе.

Чалавек. А ты не баішся, што які шпіён можа зайсці?

Сяргей. А што ён мне зробіць, калі я яго не чапаю?

Сяргей схапіў вядро і пасунуўся да дзвярэй.

Чалавек. Разумны, відаць, з цябе выйдзе чалавек. Куды ты?

Сяргей. Вады трэба прынесці, бульбу памыць.

Чалавек. А навошта табе спяшацца? Ты б пачакаў, пакуль маці прыйдзе. А то мне не хацелася б аднаму ў чужой хаце аставацца. Яшчэ ўбачыць хто ды падумае...

Сяргей. Ды студня тут, пад акном.

Сяргей выбег за дзверы. Чалавек памкнуўся быў за ім, потым кінуўся да акна і пачаў сачыць. На твары з'явілася трывога, потым злосць. «У-у, гадзюка!» — прасіпеў ён і нарыхтаваўся ўцякаць. Але, відаць, яму прыйшоў у галаву нейкі план, і ён спыніўся. Увайшоў Сяргей. Чалавек (будзем ужо называць яго дыверсантам) кінуўся да яго, схапіў за плечы.

Дыверсант. Ты што казаў той дзяўчынцы?

Сяргей. Каб яна прынесла мне мой ножык.

Дыверсант. Ах ты, шчанё! Ты думаеш, я нічога не бачу і не разумею? Ты думаў мяне ашукаць? Не, браток,— наскрозь цябе бачу. Задушыць цябе зараз трэба, як жабу. Але рук паскудзіць не хачу. А каб ты мне не пашкодзіў, я зараз цябе скручу.

Дыверсант завязаў Сяргею рот, скруціў рукі і ногі, а потым загарнуў яго ў коўдру. Сяргей не мог нічога чуць і бачыць. Нібы вялікі клунак, ляжаў ён сярод хаты. Дыверсант адчыніў дзверы, а сам схаваўся пад кажух і іншае адзенне, што вісела на сцяне над лавай. Сяргей варушыўся сярод хаты. За акном пачуліся галасы: «Ля вокнаў станавіцеся!» «З таго боку глядзіце!» Потым у дзверы глянуў калгаснік са стрэльбай, за ім другі — з віламі. А ззаду пазіралі Ніна і Андрэйка з вялізнай пугай у руцэ.

Першы калгаснік. Нікога няма! Спазніліся!

Другі калгаснік. Хлопчыка няма! Можа, з ім што здарылася?

Цюк заварушыўся. З крыкам: «Гэта ён!»— калгаснікі развязалі Сяргея.

Сяргей. Ён уцёк!.. Звязаў мяне, а сам уцёк... Даганяйце... Ён з барадой, на ім убогая вопратка і лапці...

Калгаснікі. А ты цэлы? Здаровы? Можа, што табе трэба?

Сяргей. Не, не! Мне нічога не трэба. Мне нідзе не баліць... Лавіце яго... Ён павінен быць блізка.

Калгаснікі. Бежымо!

Яны пабеглі, а Ніна і Андрэйка засталіся з Сяргеем.

Ніна. А я так бегла, так спяшалася — і не паспела...

Сяргей. Ён, праклятьі, здагадаўся, што я табе сказаў, і ледзь не задушыў мяне.

Андрэйка. А каб ён да мяне, то я яго пугай — жжах! жжах! *(І ён некалькі разоў «жахнуў» сваёй пугай, зачапіўшы кажух, пад які схаваўся дыверсант.)*

Сяргей. Эх ты! Так ён і пабаяўся тваёй пугі. Гэтыя бандыты нічога не баяцца. На тое яны і бандыты. *(Смяецца.)* Але ж і пацеха была з нашай гутаркі! Ён гаворыць мне пра

дружбу з маім бацькам, пра тое, як яны разам ваявалі, а я слухаю сабе і думаю: «Пляці, пляці — няма дурняў, каб верыць».

Н і н а. І ты не баяўся адзін з ім гаварыць?

С я р г е й. Чаго баяцца? Мы ж з ім па-прыяцельску балакалі. Я, напрыклад, казаў, што баюся звяртаць увагу на шпіёнаў, а ён мяне за гэта хваліў: «Разумны, кажа, хлопчык». *(Смяюцца.)*

А н д р э й к а. А які ў яго выгляд? Страшны?

С я р г е й. Не такі ўжо страшны, але смешны — нейкая дзіўная світка, лапці. У кнізе на малюнках я бачыў такіх, жабракамі называліся. Ён не ведаў, што ў нас такіх няма, і ўбраўся па-іхняму. Дурань! *(Смех.)*

Н і н а. Ой, каб толькі ён не ўцёк! Ці зловяць яго?

С я р г е й. Зловяць! Нікуды не дзенецца. Не такіх лавілі.

А н д р э й к а. А я тады яго пугай. *(І ён «жахнуў» па кажуху.)*

С я р г е й. Храбры ты па кажуху біць. А каб убачыў яго самога, то, пэўна, закрычаў бы ад страху і пабег.

А н д р э й к а. А вось і не! Я злавіў бы яго і перадаў пагранічнікам.

С я р г е й і Н і н а *(смяюцца з яго)*. Сам? Сваімі рукамі? О-о, які ты герой!

Знадворку крык: «Ніна! Андрэйка! Дзе вы? Ідзіце есці!»

Н і н а. Мама кліча. Хадзем!

А н д р э й к а і Н і н а выбеглі з хаты. Сяргей зноў прыступіў да сваёй бульбы. Зноў напявае ды пасвіствае. І не бачыць, як з-пад кажуха выглядае дыверсант, паціху вылазіць, крадзецца ззаду. Схапіў адной рукой Сяргея за шыю, а другой прыкрыў яму рот, каб не закрычаў. Але Сяргею было не да крыку: ад жаху ён самлеў і абмяк, як мяшок.

Д ы в е р с а н т. Самлеў, герой? Нічога, зараз асвяжу, і ачуняеш. *(І ён сунуў галаву Сяргея ў вядро з вадой. Сяргей ачуняў і пачаў дрыжаць.)* Ну, што, прыяцель? Убачыліся яшчэ.

На гэты раз ты ўжо не выкруцішся! Чаго дрыжыш, герой? Што? І плакаць пачынаеш? Позна, браток. Трэба было раней падумаць, чым рызыкуеш. У такіх справах няма жартаў... Аднак павінен табе сказаць, што ты маеш вялікае шчасце: ты і цяпер можаш застацца жывым, калі захочаш. Сядай вось тут *(садзіць Сяргея на лаву)* і слухай мае апошнія словы. Ты павінен вывесці мяне патаемнымі сцежкамі на Муравічы. Калі выведзеш шчасліва, застанешся жыць, калі не — загінеш. Разумееш?

Сяргей. Не... ведаю...

Дыверсант. Тады прыйдзецца табе загінуць.

Сяргей. Ве...ве...даю.

Дыверсант. Тады рыхтуйся ў дарогу. Хоць ты і шкоднае стварэнне, але адну заўвагу зрабіў вельмі карысную для мяне: маё адзенне сапраўды не падыходзіць для вас. Я зараз пераапрануся. Давай сюды бацькава адзенне і боты! Хутчэй!

Сяргей. Няма... Бацька сам адзеў.

Дыверсант. Што? Адзеў усё адзенне, якое толькі меў? *(Убачыў пінжак.)* А гэта што? *(Тупнуў нагой.)* Зараз жа падаць сюды боты!

Сяргей. Боты бацька абуў.

Дыверсант. Тады давай бацінкі якія, ці што. Ну, жыва! Няма часу мне з табой валаводзіцца.

Сяргей марудна пачаў шукаць. Разам з ім шукаў і дыверсант. Нарэшце ён убачыў нешта ў кутку пад ложкам.

Хадзі сюды! Глянь! Што гэта такое? Дастань іх.

Сяргей дастаў яму боты.

Ты ўсё яшчэ хітруеш, хлопец? Ты ўсё яшчэ спадзяешся ашукаць мяне! Дарэмна, браток. Гэта табе не ўдасца.

Здымае лапці, абувае боты, а Сяргей тым часам падышоў да стала, пачаў есці і нешта такое рабіць пад шапкай; заняты дыверсант нічога не бачыў.

Лепш падумай аб тым, як выратаваць сваё жыццё. А то калі ўвядзеш мяне ў злосць, то не пагляджу, што ты мне патрэбен, і раздушу цябе, як чарвяка. Маеш шчасце, што я добры і цярплівы. *(Абуўся.)* Ну, хадзем! А каб ты не думаў, што я жартую, каб ты зусім пакінуў надзею ашукаць мяне,— мы зробім табе нашыйнік, вось такі *(ён завязаў на шыю Сяргею вяровачку).* Цяпер я прасоўваю ззаду руку і пяшчотна трымаю цябе за шыю, як бацька любімага сына. А калі хоць крыху варухну рукой вось так, о...

Ён трохі напяў руку, і Сяргей захрыпеў, высунуў язык.

Бачыш, як добра выходзіць? І не ўцячэш, і крыкнуць не паспееш, і людзі будуць думаць, што гэта бацька і сын. А калі напаткаем каго з вашай вёскі, ты скажаш, што вядзеш свайго дзядзьку, які захварэў на вочы і дрэнна бачыць. Разумееш?

Сяргей. Разумею...

Дыверсант. Будзеш памятаць?

Сяргей. Буду...

Дыверсант. Павядзеш чэсна ці думаеш яшчэ хітраваць?

Сяргей. Павяду...

Дыверсант. Тады ідзём хутчэй. А ў Муравічах мірна развітаемся, і ты шчасліва выратуешся ад смерці, якую заслужыў сваімі паводзінамі. А шапку чаму не ўзяў?

Сяргей. Мне яна непатрэбна.

Выйшлі. Некаторы час нікога няма. Затым паказаліся Андрэйка са сваёй пугай і Ніна.

Андрэйка. Няма! Я ж табе сказаў, што гэта ён!

Ніна. Ды з кім жа ж і навошта ён мог пайсці ў лес? Бацька, бачыш, не прыехаў яшчэ.

Андрэйка. Ну, тады гэта не бацька.

Ніна. А хто? Каму з нашых мужчын трэба было ісці, абняўшыся з Сяргеем, у лес?

Андрэйка *(думае).* Не ведаю. Але я пазнаў — то быў Сяргейка.

Н і н а. З кім жа?

А н д р э й к а. Ну, а можа, гэта быў... шпіён?

Н і н а. Ха-ха-ха! Шпіён? Той, што далёка ўжо ўцёк? Ха-ха-ха! І Сяргей, з ім абняўшыся, пайшоў гуляць? Ха-ха-ха! Ну і дурны ж ты, Андрэйка!

А н д р э й к а. А калі больш няма на каго падумаць?

Н і н а. Ну, значыць, то быў другі хлопчык са сваім бацькам — вось і ўсё. Пойдзем цяпер пашукаем Сяргея.

Выйшлі. Зноў некалькі часу сцэна пустая. Потым уваходзяць С я р г е е в ы б а ц ь к і.

М а ц і. А людцы мае! Што ж тут такое робіцца? Нібы пагром які. Сяргей! Куды ж ён дзеўся, прайдзісвет гэты?

Б а ц ь к а. Я ж яму пакажу! Казаў, каб нікуды не адыходзіў, пакуль мы не вернемся.

М а ц і *(прыбірае хату)*. І што ён тут вытвараў, ніяк не зразумець! У вайну якую гуляў, ці што? Але чаму не прыбраў? Чаму паляцеў немаведама куды? Сяргей! Во! — лапці нейкія прывалок. Адкуль і навошта? Сяргей!

Б а ц ь к а. А тут яшчэ нейкая жабрацкая світка? Ах, каб яго!.. Перавярнуў увесь дом дагары нагамі і сам знік. Уся адзежа параскідана. А дзе мой пінжак? Ён тут вісеў. Ты не бачыла?

М а ц і. Ды ён тут вісеў, я яго не чапала. А матачкі мае, куды ж ён дзеўся? Ці не ўкраў хто? Слухай, Рыгор, а можа, гэта злодзей тут пагаспадарыў?

Бацька хуценька сунуўся туды, дзе павінны былі ляжаць боты.

Б а ц ь к а. Боты мае новыя! Няма! Укралі! Вось што ён нарабіў! Пакінуў хату, а тут пачысцілі яе. Вось да чаго даводзіць непаслухмянства!..

Уваходзяць к а м а н д з і р і ч ы р в о н а а р м е е ц. За імі — а д з і н з к а л г а с н і к а ў, што былі раней. Каля іх А н д р э й к а з пугай круціцца, а таксама Н і н а.

М а ц і. Таварышы даражэнькія, дапамажыце! Абакралі нас.

К а м а н д з і р. Абакралі?

Б а ц ь к а. Але. Боты новыя і пінжак укралі.

К а м а н д з і р. А болей нічога?

Б а ц ь к а. Здаецца, нічога. Ды вось на абмен пакінулі світку падраную і лапці.

К а м а н д з і р. Ага! Так. Вазьміце гэта, таварыш Краўчанка. А хлопчык дзе?

М а ц і. Няма яго. Збег некуды. А тым часам і абакралі.

К а м а н д з і р *(да Ніны і Андрэйкі)*. А вы не ведаеце, дзе ён?

Н і н а. Не ведаем.

А н д р э й к а *(штурхае Ніну ў бок, ціханька)*. Я табе кажу, што гэта быў ён.

К а л г а с н і к. Калі мы пагналіся за шпіёнам, то хлопчык заставаўся тут, у хаце.

К а м а н д з і р *(задумаўся, потым заўважыў на стале шапку)*. А гэта яго шапка?

М а ц і. Ягоная.

Камандзір узяў шапку і знайшоў у ёй запіску. Разгарнуў, прачытаў: «Я вымушан весці яго ў Муравічы. Павяду праз імшанік, яловы бор і балота, да зламанага дуба. Асцярожней. Калі ён вас убачыць, то мяне задушыць».

К а м а н д з і р. Малайчына, хлапец! Зараз мы яго вызвалім. *(Выходзіць.)*

А н д р э й к а *(да Ніны)*. Ага! Я табе казаў, што гэта Сяргейка! Ага! Я казаў, што гэта быў шпіён. Ага! А ты смяялася. Ага! Мая праўда выйшла. Ага!..

Н і н а. Адчапіся! Нічога ты не ведаў, а сказаў так сабе, па дурасці... *(Абое выйшлі з хаты.)*

М а ц і. А мой жа ж Сярожанька! У якую бяду ты трапіў! Цябе задушыць хочуць, каб іх усіх пазадушвала!..

К а л г а с н і к. Ды кінь ты галасіць, старая! Ніякай бяды з тваім сынам не будзе, калі ўзяліся за гэтую справу пагранічнікі.

Б а ц ь к а. Але я ўсё ж такі зусім не разумею, што такое рабілася ў маёй хаце. Можа, ты ведаеш, Антон?

Калгаснік. Ды шпіён забраўся ў тваю хату.

Бацька. І ўкраў боты разам з хлопцам? Зноў нейкае дзіва. Да гэтага часу мой хлапец сам лавіў шпіёнаў разам з іхнімі ботамі.

Калгаснік. А тут нейкім чынам яго злавілі. Як усё гэта выйшла, уцяміць не магу. Гэты дыверсант звязаў твайго сына і сам уцёк. Мы развязалі хлопца, пакінулі яго тут у хаце і пагналіся за шпіёнам. А цяпер бачым, што ён зноў тут быў і во што нарабіў.

Бацька. Выходзіць, што ён уцякаў ад вас назад у хату?

Калгаснік *(паціскае плячамі).* Выходзіць, нібы так.

Бацька. І ніхто гэтага не бачыў, хоць увесь народ быў на нагах?

Калгаснік. А ліха яго ведае, як гэта адбылося! Пачакаем крыху, зараз усё высветліцца.

Маці. Хоць бы ўсё добра выйшла! А то ў мяне сэрца рвецца на кавалкі. Во і бульбачку пачысціў, мой любенькі, ды не паспеў памыць. Вораг праклятый наляцеў як каршун.

Калгаснікі. Хай сабе лезуць. Усё роўна пераловім.

Маці. А тым часам колькі бяды ад іх, каб яны падохлі. *(Прыслухоўваецца, глядзіць у акно.)* Машына пад'ехала.

Бяжыць да дзвярэй. Уваходзяць **Сяргей** і **камандзір**. Сяргей у бацькавым пінжаку, а ў руках боты.

Камандзір. Вось вам сын, цэлы і здаровы. І з ботамі. Малайчына, хлопец! Мы яшчэ будзем аб гэтым гаварыць. А пакуль — бывайце! *(Выйшаў.)*

Маці кінулася абдымаць сына, прыгаварваючы: «Сынок мой! Любенькі! Нацярпеўся, гаротны!» Бацька бярэ боты, недаверліва аглядае іх.

Бацька. Во як запэцкаў, пракляты! Кажы ж, сынок, хутчэй, што з табою было?

Сяргей. Ой, як здорава яго схапілі! Ідзём мы сабе па лесе, ён усё трымае мяне вось так за шыю. Ціха навакол, нідзе

нічагусенькі: раптам — цап! — і ён у руках пагранічнікаў. Нават сціснуць мне шыю не паспеў.

М а ц і. Ай-яй-яй! Вось гад кусачы!..

Б а ц ь к а. Ты раскажы нам усю гісторыю па парадку.

С я р г е й. Зараз, зараз. Піць толькі хочацца.

М а ц і. Пачакай трошкі, я малачка прынясу!..

ЗАСЛОНА

1938 г

КАМЕНТАРЫІ

У чацвёрты том чатырохтомнага Збору твораў Янкі Маўра ўключаны вядомыя аповесці «Палескія рабінзоны» і «ТВТ», антырэлігійная казка «Падарожжа ў пекла», а таксама тыя творы (апавяданні, нарысы, аднаактовая п'еса «Хата з краю»), якія пасля першай публікацыі ў перыядычных выданнях не ўвайшлі ні ў адну з кніг пісьменніка.

Прыгодніцкая аповесць **«Палескія рабінзоны»** — адзін з самых папулярных твораў Янкі Маўра. У ім па-наватарску распрацаваны сюжэт рабінзанады, які вядзе свой пачатак ад рамана Даніэля Дэфо «Рабінзон Круза». Гэты твор англійскага пісьменніка заўсёды захапляў Янку Маўра веліччу тэмы барацьбы чалавека са стыхіяй, аптымізмам, паэтызацыяй працы. Аднак, нягледзячы на тэматычную і жанравую блізкасць, «Палескія рабінзоны» істотна адрозніваюцца ад рамана Даніэля Дэфо. Гэтае адрозненне абумоўлена перш за ўсё рознымі пазіцыямі аўтараў: Янка Маўр не прымае ўвасобленых у «Рабінзоне Круза» буржуазных ідэалаў і ў сваёй аповесці тактоўна, але рашуча палемізуе з Даніэлем Дэфо. Героі «Палескіх рабінзонаў» Віктар і Мірон не ведаюць прагі нажывы, гэта тыповыя прадстаўнікі падрастаючага пакалення савецкай краіны. Ім уласцівы пачуцці патрыятызму, калектывізму, таварыскасці, узаемадапамогі.

У аповесці паэтызуецца непаўторнае хараство беларускага Палесся, велічнага краю балот і лясоў. На багатым фактычным матэрыяле Янка Маўр лёгка пераконвае тых чытачоў, якія мараць аб далёкіх джунглях, што ў нас на Беларусі «шмат куткоў, не горшых ад заморскіх. Ёсць пушчы, не менш цікавыя, чымся далёкія трапічныя лясы. Ёсць азёры і балоты, якія ўвесну робяцца марамі. Ёсць звяры, якія радзей сустракаюцца на свеце, чым сланы і тыгры».

Знаёмства з Палессем адбываецца ў аповесці праз апісанне падарожжа Віктара і Мірона. На бязлюдным востраве хлопцы апынуліся ва ўмовах, значна больш складаных, чым Рабінзон. Негасцінна сустрэла іх ледзь сагрэтае першым вясновым цяплом суровае Палессе. Віктар і Мірон не мелі самых неабходных рэчаў; скарынка чорнага хлеба, насавая хустачка, аловак з жалезным наканечнікам, чатыры адсырэлыя запалкі ў расплясканым карабку ды восем рублёў семдзесят чатыры капейкі — вось і ўся іх бядняцкая гаспадарка. Тое, што героі Янкі Маўра не дарослыя, а неспрактыкаваныя падлеткі, робіць іх барацьбу са стыхіяй асабліва цяжкай.

У складаных жыццёвых сітуацыях раскрываюцца характары палескіх рабінзонаў, асаблівасці іх узаемаадносін і паводзін.

Гаворачы пра смеласць, рашучасць, настойлівасць сваіх герояў, Янка Маўр не збіваецца на схематызм, не баіцца расказаць пра іх асобныя пралікі і няўдачы, пра тыя рэдкія хвіліны разгубленасці, калі хлопцы былі блізкія да адчаю. Гэта не зніжае вобразаў, а, наадварот, робіць іх

больш жыццёвымі і верагоднымі. Псіхалагічна тонка раскрыты ў аповесці ўзаемаадносіны падлеткаў. Знешне сябры як бы ўвесь час кпяць адзін з аднаго, але за кпінамі і жартамі хаваюцца цёплыя адносіны да таварыша, жаданне дапамагчы яму, падтрымаць у цяжкую хвіліну.

Аповесць «Палескія рабінзоны» раскрывае сілу і веліч сапраўднай дружбы, значэнне ведаў у жыцці чалавека. Дарэчы, хлопцы не толькі шмат ведаюць, але і ўмеюць прымяніць свае веды на практыцы. Гэта асабліва падкрэсліваецца Янкам Маўрам. Кіруючыся законам Архімеда, Віктар і Мірон выбіраюцца з багны, яны здабываюць агонь так, як рабілі гэта першабытныя людзі, лепяць гаршкі, знаходзяць спажыўныя расліны і г. д.

Звесткі аб раслінным і жывёльным свеце Палесся падаюцца ў аповесці праз запамінальныя дыялогі сяброў-падарожнікаў. Неабходныя тлумачэнні ў галіне батанікі дае Мірон (ён больш цікавіўся батанікай), пра жывёл і птушак расказвае Віктар, які захапляўся заалогіяй.

У аповесці «Палескія рабінзоны» шмат хвалюючых эпізодаў і прыгод, сюжэт яе дынамічны. У творы з майстэрствам выкарыстаны прыёмы таямнічасці, загадкавасці, нечаканага абрыву або ўскладнення дзеяння. Янка Маўр змог захапіць фантазію і ўяўленне юных чытачоў без пашыраных у буржуазнай прыгодніцкай літаратуры апісанняў жудасных забойстваў і зданяў. Цікавасць да кнігі заснавана на шчырым хваляванні за лёс яе герояў.

«Калі я дома чытаў аповесць «Палескія рабінзоны»,— пісаў Саша Купрэйчык,— дык ад мяне ніхто слова не мог дабіцца. Я падарожнічаў разам з палескімі рабінзонамі, непакоіўся за іх. Разам з Віктарам і Міронам думаў я, як выбрацца з вострава, лавіў кантрабандыстаў».

Юныя чытачы вераць у рэальнае існаванне герояў аповесці «Палескія рабінзоны». Яшчэ пры жыцці пісьменніка ў шматлікіх пісьмах да яго дзеці прасілі расказаць пра далейшы лёс хлопцаў. «Дзе жывуць цяпер Віктар і Мірон?», «Чым яны займаюцца?», «Ці сябруюць, як раней?», «Ці падарожнічаюць?» — пыталіся яны.

Каб адказаць на гэтыя пытанні, беларускае радыё арганізавала спецыяльную радыёперадачу. У яе праграму былі ўключаны інсцэніраваныя ўрыўкі з «Палескіх рабінзонаў», а таксама выступленне Янкі Маўра.

Папулярнасць «Палескіх рабінзонаў» і сёння незвычайная. Аповесць узбагачае фантазію дзяцей, абуджае ў іх прагу да ведаў, любоў і ашчадныя адносіны да прыроды, цікавасць да вывучэння роднага краю. Гэты твор выхоўвае ў юных чытачоў патрыятычныя пачуцці, вучыць смеласці, настойлівасці, уменню супрацьстаяць цяжкасцям, не падаць духам пры часовых няўдачах.

Аповесць «Палескія рабінзоны» вытрымала наступныя выданні:

Палескія рабінзоны. Прыгоды двух хлапцоў у Палескіх балотах. (Аповесць). Мінск, Белдзяржвыд, 1930.

Палескія рабінзоны. Прыгоды двух хлапцоў у Палескіх балотах. (Аповесць). Выд. 2-е. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1934.

Палескія рабінзоны. Прыгоды двух хлапцоў у Палескіх балотах. (Аповесць). Выд. 3-е. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1935.

Палескія рабінзоны. Прыгоды двух хлапцоў у Палескіх балотах. (Аповесць). Выд. 4-е. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1939.

Палескія рабінзоны. (Аповесць). Выд. 5-е. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1946.

Палескія рабінзоны. (Аповесць). Выд. 6-е. Мінск, Вучпедвыд БССР, 1951.

Выбраныя творы. (Аповесці, апавяданні). Мінск, Дзяржвыд БССР, 1952.

Збор твораў у двух тамах. Том другі. Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1960.

Палескія рабінзоны. (Аповесць). Мінск, «Народная асвета», 1968.

На рускай мове:

Повести и рассказы. Госиздат БССР, 1955.

Избранное. Повести и рассказы. М., «Советский писатель», 1958.

Полесские робинзоны. Повесть. Мн., «Беларусь», 1966.

Полесские робинзоны. ТВТ. Мн., «Беларусь», 1971.

На літоўскай мове:

«Палескія рабінзоны». Вільнюс, «Вага», 1973.

На румынскай мове:

Палескія рабінзоны. Аповесць. Бухарэст, 1961.

На кітайскай мове:

Палескія рабінзоны. Аповесць. Шанхай, «Шаонянь эртун чубаньшэ», 1956.

Янка Маўр гаварыў, што змест аповесці «ТВТ» цяжка вызначыць некалькімі словамі. Прышыць гузік, загнуць канец цвіка, за які чапляюцца людзі, прыбраць з тратуара камень, зацыраваць панчоху, замяніць пробку ў лічыльніку і г. д.— аб такіх дробязях ідзе размова ў творы.

Але мы ведаем, што з гэтых «дробязяў» складаецца важнае і велічнае паняцце — Праца! Яшчэ ў 1921 годзе А. М. Горкі пісаў, што савецкая дзіцячая літаратура павінна абудзіць у дзяцей дух актыўнасці, павагі да творчасці, любоў да працы. Менавіта гэтыя праблемы вырашаюцца ў аповесці «ТВТ». У ёй расказваецца пра жыццё і справы цэлага калек-

тыву дружных, цікаўных і вынаходлівых дзяцей, аб'яднаных у Таварыства ваяўнічых тэхнікаў — ТВТ.

Першыя чатыры раздзелы аповесці з'яўляюцца як бы ўступнымі: у іх расказваецца аб непрыемнасцях, якія здарыліся ў розных сем'ях з-за таго, што не былі своечасова заўважаны і выпраўлены непаладкі.

Праз шэраг камедыйных і адначасова па-свойму драматычных сітуацый пісьменнік непрыкметна пераконвае чытачоў, як важна ўмець самому ўсё рабіць. Ён паказвае на канкрэтных прыкладах, што не трэба быць вялікім майстрам, каб адрамантаваць крэсла, падбіць абцасы ці памыць бялізну. Да гэтага ж вываду прыходзяць і героі аповесці, якія на піянерскім сходзе прымаюць рашэнне аб утварэнні ТВТ і аб'яўляюць вайну рэчам.

Дзейнасць тэвэтэтаўцаў авеяна таямнічасцю, бо піянеры вырашылі нікому не гаварыць аб таварыстве. Бацькі не разумеюць, што здарылася з дзецьмі, якія адмаўляюцца ад паслуг майстроў і самі з вялікім энтузіязмам бяруцца за дробны хатні рамонт!

Неўзабаве дзейнасць таварыства выходзіць за межы хатняй тэрыторыі. Па прапанове піянерважатага ў статут тэвэтэтаўцаў унесена дапаўненне: кожны член таварыства павінен заўважаць і выпраўляць усе дробязі не толькі дома, у школе, але і ўсюды, дзе іх заўважыць.

У аповесці «ТВТ» шырока пастаўлена праблема фарміравання асобы ў калектыве. Пісьменнік пераканаўча даводзіць, што агульныя клопаты збліжаюць дзяцей, выхоўваюць у іх пачуцці ўзаемнай падтрымкі і сапраўднай дружбы. Калектыў, аб якім ідзе гаворка ў аповесці, адносіцца да ліку тых, што А. С. Макаранка назваў шчаслівым, члены яго з'яднаны агульнымі мэтамі, адзінымі імкненнямі, ім уласціва шчырае хваляванне за агульную справу. І поспех і няўдачы сяброў тэвэтэтаўцы ўспрымаюць, як свае ўласныя. У такім калектыве набываюцца карысныя звычкі, гартуюцца характары, выпраўляюцца вучні накшталт Карачуна.

Аповесць прасякнута аптымізмам, у ёй шмат гумару, вясёлых, а часам і не зусім вясёлых гісторый і прыгод.

У аповесці «ТВТ» няма павучальных разважанняў, але гэты твор ад першай і да апошняй старонкі павучальны, бо ён вучыць юных чытачоў любіць працу, актыўна спрыяе выхаванню руплівых і разумных гаспадароў нашай вялікай Айчыны.

Нельга не ўспомніць, што аповесць «ТВТ» выклікала да жыцця масавы рух тэвэтэтаўцаў. У пасляваенныя гады на Брэстчыне і ў іншых раёнах Беларусі стваралiся атрады, якія дзейнічалі па ўзору маўраўскага Таварыства ваяўнічых тэхнікаў.

У сувязі з гэтым прыгадваецца кніга А. Гайдара «Цімур і яго каманда», пад уплывам якой сярод піянераў і школьнікаў нашай краіны і за межамі яе ўзнік цімураўскі рух.

Аповесць «Цімур і яго каманда» выйшла ў свет на шэсць гадоў пазней, чым «ТВТ»; знамянальна, што А. Гайдара зацікавілі тыя ж праблемы,

што і Янку Маўра. Гэты факт сведчыць аб важнасці тэмы, якой прысвяцілі свае лепшыя творы два выдатныя дзіцячыя пісьменнікі.

Напісаная больш як сорак гадоў таму назад аповесць «ТВТ» па-ранейшаму актуальная, бо і сёння надзённай застаецца задача выхавання «ўсебакова развітых і ўсебакова падрыхтаваных людзей, людзей, якія ўмеюць усё рабіць». (У. І. Ленін).

Аповесць вытрымала наступныя выданні:

ТВТ. Або апавяданне пра тое, як маладыя героі ўзбунтаваліся супраць уціску рэчаў і збілі з панталыку дзядзьку Данілу, цётку Мар'ю, нават міліцыянера і, нарэшце, увесь свет; як яны навучыліся бачыць тое, чаго другія не бачаць, і як Цыбук здабываў ачкі. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1934.

ТВТ. Аповесць. (Выд. 2-е). Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі. Мінск, 1938.

ТВТ. Або апавяданне пра тое, як піянеры ўзбунтаваліся супраць уціску рэчаў і здзівілі ўвесь свет, як яны навучыліся бачыць тое, чаго іншыя не бачаць, і як Цыбук здабываў ачкі. (Выд. 3-е). Мінск, Дзяржвыд БССР, 1949.

Выбраныя творы. (Аповесці, апавяданні). Мінск, Дзяржвыд БССР, 1952.

Збор твораў у двух тамах. Том другі. Дзяржаўнае выдавецтва БССР. Мінск, 1960.

На рускай мове:

ТВТ, или повесть о том, как пионеры возмутились против гнета вещей и удивили весь мир, как они научились видеть то, чего другие не видят, и как Цыбук добывал очки. Л., Детгиз, 1956.

ТВТ, или повесть о том, как пионеры возмутились против гнета вещей и удивили весь мир, как они научились видеть то, чего другие не видят, и как Цыбук добывал очки. Л., Детгиз, 1959.

Я. Мавр. ТВТ. Повесть.— Ю. Сотник. Невиданная птица. Рассказы.— Р. Погодин. Рассказы о весёлых людях и хорошей погоде. Москва, Детская литература. 1964.

Полесские робинзоны.— ТВТ. Повести. Мн. «Беларусь», 1971.

Повести. (Издание для таджикских школ. С русско-таджикским словарем). Душанбе, изд-во «Ирфон», 1967.

На літоўскай мове:

ТВТ. Або апавяданне пра тое, як маладыя героі ўзбунтаваліся супраць уціску рэчаў і збілі з панталыку дзядзьку Данілу, цётку Мар'ю, нават міліцыянера і, нарэшце, увесь свет; як яны навучыліся бачыць тое, чаго другія не бачаць, і як Цыбук здабываў ачкі. Мінск, Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, 1936.

Н а л а т ы ш с к а й м о в е:

ТВТ, або аповесць пра тое, як піянеры ўзбунтаваліся супраць уціску рэчаў і здзівілі ўвесь свет, як яны навучыліся бачыць тое, чаго іншыя не бачаць, і як Цыбук здабываў ачкі. Рыга, Латдзяржвыд, 1957.

Н а м а л д а ў с к а й м о в е:

ТВТ, або апавяданне пра тое, як маладыя героі ўзбунтаваліся супраць уціску рэчаў і здзівілі ўвесь свет, як яны навучыліся бачыць тое, чаго другія не бачаць, і як Цыбук здабываў ачкі. Кішынёў, «Карця молдовеняскэ», 1961.

Н а а р м я н с к а й м о в е:

ТВТ, або апавяданне пра тое, як маладыя героі ўзбунтаваліся супраць уціску рэчаў і здзівілі нават міліцыянера і, нарэшце, увесь свет, як яны навучыліся бачыць, чаго другія не бачаць, і як Цыбук здабываў ачкі. Ерэван, Айпетрат, 1961.

Як вядома з біяграфіі Янкі Маўра,— ён быў заўзятым атэістам. У першай сваёй аповесці «Чалавек ідзе» пісьменнік разбіў ідэю боскага паходжання чалавека. Хлуслівую сутнасць рэлігіі, якая заўсёды служыць інтарэсам пануючых класаў, ён трапна высмяяў у творах аб іншых краінах, у аўтабіяграфічнай аповесці «Шлях з цемры». Гэтая тэма шырока пастаўлена і ў антырэлігійнай казцы **«Падарожжа ў пекла»**.

«Падарожжа ў пекла» — новы варыянт байкі «Пекла», што выйшла асобным выданнем яшчэ ў 1929 годзе. Янка Маўр даражыў гэтым творам. «Ведаеце,— гаварыў ён аўтару каментарыяў,— байка «Пекла» хітрая. У ёй амаль без змен выкарыстана рэлігійная легенда аб замагільным жыцці чалавека. Але ў легендзе гэтай шмат недарэчнасцей, на выкрыцці іх у асноўным і пабудаваны сюжэт твора».

У байцы «Пекла» выявілася найбагацейшая фантазія пісьменніка, яго тонкі гумар, добрае валоданне прыгодніцкім жанрам. Рыхтуючы байку да ўключэння ў двухтомнае выданне Збору твораў (1960), Янка Маўр значна дапрацаваў яе: выкінуў малавыразныя эпізоды, дапоўніў твор запамінальнымі гумарыстычнымі дыялогамі і сітуацыямі, паглыбіў казачны элемент, зрабіў казку больш блізкай сённяшняму чытачу. Былі ўнесены змены і ў кампазіцыю твора, замест ранейшых васьмі раздзелаў у новым выданні іх стала сем. Некаторыя атрымалі новыя назвы: шосты раздзел «Пекла» цяпер называецца «Экскурсія па пекле», сёмы — «Гармідар у пекле» мае назву «Пераварот у пекле» і г. д.

У падзагалоўку да новай назвы твора — «Падарожжа ў пекла» — больш акрэслена вызначаны яго жанр — казка.

Значна скарочаны і перапрацаваны ўступная частка («Гістарычная даведка»), а таксама першы, другі, трэці, асабліва чацвёрты, пяты, шосты і сёмы раздзелы.

У тэксце новага варыянта антырэлігійнай казкі «Падарожжа ў пекла» ўдакладнены і зменены шматлікія лічбы і вылічэнні. І зроблена ўсё гэта з бліскучым гумарам, з трапнымі саркастычнымі заўвагамі, з удумлівай назіральнасцю разумнага і мудрага мастака-палітыка, грамадзяніна. Чытачы сапраўды бачаць, што рэлігійныя кнігі і вучэнні блытаныя, незразумелыя, «нібы пісаў іх п'яны ці непрытомны чалавек». Парадкі ж у пекле заснаваны на несправядлівых, антычалавечых прынцыпах. З гэтым не могуць пагадзіцца піянеры Янка Гуж (ранейшае прозвішча Пук) і Юрка Пыж (ранейшае прозвішча Шыш), якія па сваёй волі з мэтай пазнання падарожнічаюць па пекле. Юныя піянеры, носьбіты справядлівасці і актыўнага гуманізму, наводзяць парадак на тым свеце. У выніку ў пекле пачынаецца новае жыццё...

Янка Маўр прапануе чытачам праверыць верагоднасць прыведзенага апавядання і дае дакладны адрас пекла. Трэба ісці «спачатку проста на поўнач, потым — направа, далей — налева, затым — зноў направа, тады — зноў налева і ўрэшце яшчэ раз налева.

І праз семдзесят сем крокаў вы акурат натрапіце на той дуб, адкуль пачынаецца дарога ў пекла».

Жартаўліва-іранічная інтанацыя прыведзеных радкоў характэрна для ўсяго гэтага твора, які і сёння актуальны, бо ўсё яшчэ стаіць на парадку дня праблема антырэлігійнага выхавання. Разумеючы важнасць яе, Янка Маўр пастараўся, каб у новым выданні яго казка была больш вострай, дзейснай, баявітай.

Бібліяграфія выданняў байкі «Пекла» і казкі «Падарожжа ў пекла»:

Пекла. Байка. Мінск. Белдзяржвыд, 1929.

Падарожжа ў пекла. Казка. Збор твораў у двух тамах. Том другі. Дзяржаўнае выдавецтва БССР. Мінск, 1960.

Апавяданні, змешчаныя ў чацвёртым томе, друкаваліся ў розных перыядычных выданнях. Некаторыя з іх — «Спартак», «Падарожжа ад школы да дому», «Чужаземец», напісаны яшчэ да вайны, іншыя — «Багіра», «На парозе будучыні» — у пасляваенны час. Усе яны прадстаўляюць несумненную цікавасць, бо пашыраюць наша ўяўленне аб таленце Янкі Маўра, дапамагаюць зразумець эстэтычную праграму пісьменніка, яго патрабаванні да дзіцячай кнігі. Сярод гэтых патрабаванняў адно з важнейшых — актуальнасць тэматыкі. Янка Маўр умеў знайсці такія тэмы, большасць з якіх і зараз застаюцца надзённымі. Пісьменнік спалучае ў апавяданнях змястоўнасць з майстэрскай падачай матэрыялу, імкнецца ўплываць на ўяўленне чытачоў, на ход іх думак, на фарміраванне іх светапогляду.

Тэме інтэрнацыянальнай дружбы, выкрыццю фашызму прысвечана апавяданне **«Чужаземец»** (друкавалася ў часопісе «Іскры Ільіча», 1932 год, № 18).

Дзеянне яго адбываецца ў Савецкім Саюзе, але з пісьмаў, якія прыходзяць з Гамбурга, чытачы даведваюцца і пра жыццё працоўных у Германіі, дзе ўладу захапілі фашысты. Яны забілі бацьку Морыца Кольмана, маці хлопчыка памерла. Сапраўдную сваю бацькаўшчыну Морыц знайшоў на нашай зямлі. Не як чужаземца, а як роднага чалавека сустрэлі нямецкага хлопчыка-сірату савецкія школьнікі, бо «даўно ў нас мінулі праклятыя часы, калі буржуі цкавалі адзін народ на другі, а самі панавалі над тымі і над гэтымі».

У апавяданні паказаны гуманізм савецкіх людзей, услаўлена вялікая Савецкая дзяржава, на якую з сімпатыяй і надзеяй глядзяць працоўныя свету.

Апавяданне **«Падарожжа ад школы да дому»** было надрукавана ў сёмым нумары часопіса «Полымя рэвалюцыі» за 1939 год. Падзея, што ляжыць у аснове сюжэта, блізкая школьнікам: кожны вучань штодзень робіць падарожжа ад школы да дому. Расказваючы пра прыгоды свайго героя на гэтым шляху, Янка Маўр у апавяданні нібы пытаецца ў сваіх чытачоў: «А як вы ідзяце са школы?», «Як паводзіце сябе?», «Ці ўмееце паважаць старэйшых, быць ветлівымі, праўдзівымі?»

Апавяданне прымушае дзяцей крытычна ставіцца да сваіх учынкаў, суадносіць іх са Сцёпкавымі, рабіць неабходныя вывады. Гэтага, як звычайна, Янка Маўр дасягае без надакучлівых павучанняў. Знешне пісьменнік ні адным словам не выказвае сваіх адносін да прыгод Сцёпкі, да сітуацый, у якія ён трапляе, а між тым, гэтыя адносіны ўвесь час выразна адчуваюцца, бо пісьменнік не ўмее быць раўнадушным апавядальнікам.

Як і ў многіх іншых творах, у апавяданні «Падарожжа ад школы да дому» аўтарскія ацэнкі вынесены ў падтэкст, выказаны ў асноўным праз адпаведныя інтанацыі. У гэтым творы пераважаюць інтанацыі гумарыстычныя. Добразычліва, з патрабавальнасцю ўмудронага жыццёвым вопытам дарослага чалавека асуджае Янка Маўр Сцёпку, які не ўмее як належыць выкарыстаць вольны час, не выпрацоўвае характар, волю, лёгка паддаецца дрэннаму ўплыву, здольны на грубасць і нават падман.

Чытачам, безумоўна, запомніцца, як Сцёпка без патрэбы больш чым паўгадзіны прастаяў каля машыны, як ён неразумна «пажартаваў» з першакласніка, разглядаў вітрыну, гуляў у ямкі, спрабаваў курыць, ехаў без білета ў трамваі, заняў месца старэнькай бабулі. Хлусня бацькам лагічна завяршыла серыю прыгод Сцёпкі ў часе падарожжа ад школы да дому. І пры ўсім гэтым Сцёпка не быў хуліганам. Гэта звычайны хлопчык, які не кантралюе сваіх паводзін, не абмяжоўвае сваіх жаданняў, жыве, амаль не задумваючыся над тым, што такое добра і што такое дрэнна.

Сустрэча з прафесарам, які так цікава расказваў школьнікам пра Камчатку, на якой пражыў тры гады, хочацца верыць, будзе для Сцёпкі

знамянальнай. Тактоўнасць, выхаванасць прафесара, які ў трамваі ўступіў бабулі сваё месца, а ў школе нікому не расказаў пра Сцёпкава нахабства, здзівілі і ўразілі хлопчыка. Па тым, як ён «ціхім-ціхім голасам» адказаў сваім таварышам на пытанне, дзе пазнаёміўся з прафесарам, можна меркаваць, што Сцёпка ўпершыню задумаўся над сваімі паводзінамі, над пытаннем — у чым вартасць чалавека.

Багіра. З дасціпным гумарам, з тонкай назіральнасцю напісана апавяданне пра чорную кошку, якую за падабенства з пантэрай з кнігі Кіплінга «Маўглі» назвалі Багірай.

Апавяданне гэтае здольна захапіць дзіцячае ўяўленне, бо ў ім нямала вясёлых прыгод, яно асветлена промнямі шчодрай чалавечай дабраты.

Апавяданне «Багіра» не проста цікавае — яно і разумнае, бо вучыць назіральнасці, выхоўвае чуласць і спагадлівасць.

Апавяданне было змешчана ў часопісе «Бярозка» за 1945 год, № 6—7.

Янка Маўр расказваў, што жыццё гладыятараў, вобраз дужага і высакароднага Спартака заўсёды хвалявалі яго.

Пісьменнік працаваў над вялікім творам пра мужнага рымскага гладыятара, да вайны была напісана значная яго частка, але рукапіс згарэў у часе вайны.

У апавяданні **«Спартак»** эскізна, відаць, прадстаўлена сюжэтная канва будучага твора.

Апавяданне надрукавана ў часопісе «Іскры Ільіча», № 1 за 1936 год.

Апавяданне **«На парозе будучыні»** напісана да святкавання гадавіны перамогі савецкага народа над фашысцкай Германіяй. Яно аб тым часе, калі, «як светлыя праменні, хадзілі па краіне радасныя словы: «Немцаў акружылі... разграмілі... узялі...», калі па ўсім адчувалася, што блізка канец вайны.

Краіна стаяла на парозе будучыні, на парозе свайго заўтрашняга мірнага і шчаслівага дня.

Апавяданне «На парозе будучыні» надрукавана ў газеце «Літаратура і мастацтва» 9 мая 1946 года.

Янка Маўр першы ў беларускай савецкай дзіцячай літаратуры асвоіў жанр **мастацкага нарыса.** У 30-я гады ў часопісе «Іскры Ільіча» з'явілася некалькі нарысаў пісьменніка, у якіх ён імкнуўся пазнаёміць дзяцей з поспехамі сацыялістычнага будаўніцтва, з новабудоўлямі. Сярод іх — «Чорная кроў», «Драўлянае апавяданне», «Урала-Кузбас».

Тэматыка нарысаў Янкі Маўра досыць шырокая: пісьменнік расказвае пра сваю першую сустрэчу з Якубам Коласам («Як я пазнаёміўся з Якубам Коласам»), пра Малую Беларускую чыгунку («Падарожжа па Малой Беларускай чыгунцы»), узнімае праблему сяброўства («Раскажы пра сваіх сяброў»), гаворыць аб подзвігу нашага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны («Нашы дзеці»).

Янка Маўр — таксама аўтар палітычных фельетонаў — «Сальвадорцы», «Беласнежка ляціць за мора», «Некалькі слоў пра мараль», «Каляровыя душы».

Нарысы і фельетоны пісьменніка сведчаць аб шматграннасці яго інтарэсаў, разнастайнасці творчых шуканняў, аб яго багатай эрудыцыі і высокай палітычнай свядомасці.

Цяжка вызначыць агульныя для ўсіх гэтых твораў праблемы, бо ў кожным з іх яна новая. У нарысе «Расказы пра сваіх сяброў» Янка Маўр разам з чытачамі задумваецца над сапраўдным сэнсам слоў «сябар», «сяброўства». Ён спачатку як бы тэарэтычна тлумачыць іх, падкрэсліваючы, што сяброўства не церпіць людзей несумленных, баязлівых, самазадаволеных выхваляк, якія паважаюць толькі сябе. «Сяброўства — гэта гатоўнасць пайсці на ахвяру дзеля таварыша»,— піша Янка Маўр і прыводзіць запамінальны прыклад. Ён гаворыць, што сяброўствам трэба даражыць, яно робіць людзей дужэйшымі: разам можна здзейсніць усё, што задумаеш.

Нарыс быў надрукаваны ў газеце «Зорька» 20.3 1947.

У аснову нарыса «Як я пазнаёміўся з Якубам Коласам» пакладзены ўспаміны Янкі Маўра аб сустрэчы з вялікім беларускім пісьменнікам на з'ездзе рэвалюцыйна настроеных настаўнікаў у 1906 годзе. Пра гэты з'езд у нарысе сказана нямала новага, Янка Маўр вызначае яго задачы і значэнне, гаворыць аб рэвалюцыйных настроях перадавых беларускіх настаўнікаў, аб іх настойлівым жаданні змагацца супраць самадзяржаўя.

З павагай і сімпатыяй ставіцца Я. Маўр да выдатнага беларускага паэта, правільна асэнсоўвае месца гэтага таленавітага мастака ў развіцці нацыянальнай літаратуры Беларусі, у фарміраванні рэвалюцыйнай свядомасці народа.

Успаміны Янкі Маўра «Як я пазнаёміўся з Якубам Коласам» друкаваліся ў часопісе «Бярозка», 1952 год, № 1.

Разважаннямі пра дабро і зло пачынаецца палітычны фельетон «Некалькі слоў пра мараль». Ці ёсць агульныя, выпрацаваныя чалавецтвам крытэрыі гэтых паняццяў? — пытаецца пісьменнік і адказвае: — Безумоўна, ёсць! Так, забойства нявінных людзей для ўсіх вякоў і народаў лічылася справай ганебнай. Але сёння,— з асуджэннем зазначае Янка Маўр,— некаторыя найкультурныя атамшчыкі лічаць, што гэта маральная ісціна састарэла. Яны непакояцца аб тым, каб удасканаліць спосабы забойства, ім карціць прыдумаць бомбу, якая знішчыла б толькі людзей і не знішчала б матэрыяльныя каштоўнасці.

Абсалютнай маралі няма,— сцвярджае Янка Маўр.— Усё залежыць ад сацыяльных умоў, капіталістычная мараль дазваляе ўсё, што дае грошы. Таму ў капіталістычным свеце ашуканства, крывадушша, жорсткасць, хлусня, распуста — з'явы звычайныя.

Прапануючы самім чытачам зрабіць адпаведныя вывады, Янка Маўр умела супрацьстаўляе дзве маралі — капіталістычную, якая прыгнятае ча-

лавека, служыць справе нажывы, і нашу, савецкую, што абараняе інтарэсы чалавека, спрыяе росквіту яго асобы.

Фельетон «Некалькі слоў пра мараль» і зараз актуальны, бо і сёння існуюць праблемы, якія ў свой час прымусілі пісьменніка ўзяцца за пяро.

Палітычны фельетон «Некалькі слоў пра мараль» надрукаваны ў газеце «Літаратура і мастацтва» 25 кастрычніка 1947 года.

Фельетон-памфлет Янкі Маўра **«Каляровыя душы»** друкаваўся ў 1930 годзе, у другім нумары часопіса «Чырвоная Беларусь». Напісаны ён востра, ярка. Распрацаваная ў ім тэма барацьбы супраць каланіяльнага рэжыму была для таго часу вельмі актуальнай. У 30-я гады шмат краін стагнала пад прыгнётам каланізатараў. Каланіяльны рэжым панаваў на тэрыторыі ўсёй Афрыкі.

Пісьменнік-гуманіст у фельетоне «Каляровыя душы» выкрыў каланіяльную палітыку імперыялістычных дзяржаў, якія ўсімі сродкамі — зброяй і падманам — імкнуліся замацаваць сваё ўладаранне над народамі Афрыкі.

Са з'едлівай іроніяй гаворыць Янка Маўр пра так званую культуру, што экспартуецца капіталістамі на чорны кантынент. «Культура» гэтая (люстэркі, цацкі, каляровыя анучкі, крыжы, біблії) вывозіцца на караблях,— саркастычна заўважае пісьменнік, а на ўсякі выпадак пры караблях «салдаты са стрэльбамі, кулямётамі, газамі».

Своеасаблівай формай культуры з'яўляецца таксама рэлігія, з дапамогай яе каланізатары сеюць у каляровых душах зерні цярпення і пакорлівасці. Толькі ніякія хітрыкі прыгнятальнікаў не дапамаглі: каляровыя душы зразумелі, што чакаць дапамогі з неба не выпадае...

Мы ведаем, што зараз амаль увесь афрыканскі кантынент вызвалены ад каланізатараў.

Нарыс **«Урала-Кузбас»** змешчаны ў 12-м нумары часопіса «Іскры Ільіча» за 1931 год.

У ім, абапіраючыся на канкрэтныя лічбы і факты, Янка Маўр гаворыць пра грандыёзны размах будаўніцтва Урала-Кузнецкага вугальна-металургічнага камбіната, асэнсоўвае значэнне гэтага гіганта ў развіцці індустрыяльнай магутнасці СССР.

Лаканічна, уражліва расказвае Янка Маўр пра цяжкасці, пераадоленыя савецкімі людзьмі: не было шляхоў зносін, вады, мясцовасць голая, пустэльная. Хто мог адважыцца пачынаць будаўніцтва? «А сёлета — тут горад Магнітагорск... Такога будаўніцтва свет яшчэ не бачыў»,— з захапленнем адзначае пісьменнік. Ён гаворыць, што такія цуды магчымы толькі ў нас, дзе гаспадаром сваёй краіны з'яўляецца народ.

Нарыс Янкі Маўра **«Падарожжа па Малой Беларускай чыгунцы»** і сёння чытаецца з цікавасцю. З яго мы даведваемся шмат новага пра беларускую дзіцячую чыгунку, якая пачала дзейнічаць яшчэ ў 1936 годзе.

Пісьменнік прыводзіць канкрэтныя даты, лічбы, але гэты «сухі» матэрыял ў яго майстэрскай падачы поўніцца сапраўднай паэзіяй.

У нарыс уключаны поўныя руху і дзеяння дыялогі, жарты, эпізоды. Адчуваецца, што аўтар неаднойчы пабываў на Малой Беларускай чыгунцы, зрабіў не адзін рэйс ад станцыі Радаснай да станцыі Шчаслівай. Усё ўбачанае тут узрушыла яго, таму так лёгка чытаецца гэты твор.

Аднак нарыс пра Малую Беларускую чыгунку (якая, дарэчы, цяпер носіць імя легендарнага народнага героя Канстанціна Заслонава), пэўна, не рабіў бы такога ўражання, калі б Янка Маўр не расказаў пра яе юных гаспадароў. Вобразы іх, пададзеныя пісьменнікам буйным планам, азораны сонцам савецкай явы. Нарыс «Падарожжа па Малой Беларускай чыгунцы» ўваходзіць у цыкл твораў Янкі Маўра аб шчаслівым маленстве савецкіх дзяцей. Друкаваўся ён у газеце «Літаратура і мастацтва» 11 верасня 1938 года.

«Няхітрыя, непасрэдныя дзіцячыя словы часта больш гавораць, як самыя красамоўныя апісанні»,— зазначае Янка Маўр у нарысе «Нашы дзеці», які друкаваўся ў 1946 годзе ў кастрычніцкім нумары часопіса «Работніца і сялянка». Гэтыя словы і змест самога нарыса звязаны з адным вельмі важным фактам творчай біяграфіі пісьменніка. Трэцяга красавіка 1946 года ў газеце «Піянер Беларусі» быў надрукаваны ліст піянераў 37-й мінскай школы, у якім яны звярнуліся да ўсіх школьнікаў рэспублікі з прапановай напісаць калектыўную кнігу пра ўдзел беларускіх дзяцей у Вялікай Айчыннай вайне. Неўзабаве з усіх канцоў Беларусі пачалі прыходзіць пісьмы дзяцей, удзельнікаў і сведак падзей Айчыннай вайны. Гэтыя пісьмы потым увайшлі ў зборнік «Ніколі не забудзем» — хвалюючую кнігу аб мужнасці савецкага народа, аб чорных злачынствах фашысцкіх акупантаў. Зборнік «Ніколі не забудзем» выйшаў з друку ў 1948 годзе пад рэдакцыяй Янкі Маўра. «Работа гэта была нялёгкай,— успамінаў пісьменнік,— трэба было з асобных пісьмаў скласці кнігу. У дзіцячых карэспандэнцыях неабходна было многае выправіць, замяніць часам не толькі асобныя словы, але і цэлыя сказы. Робячы гэтыя праўкі, я вельмі баяўся сапсаваць натуральнасць і шчырасць гучання дзіцячага голасу. Працаваць над зборнікам было цяжка і таму, што літаральна кожнае пісьмо, з якім я знаёміўся, апякала болем маё сэрца».

Нарыс «Нашы дзеці» быў напісаны Янкам Маўрам пад уражаннем першых пісьмаў, якія былі перададзены яму для рэдагавання ў 1946 годзе. Тут не проста апісаны здзейсненыя дзецьмі подзвігі, а раскрыты вытокі масавага гераізму дарослых і дзяцей, асэнсавана само паняцце — патрыятызм.

Нарыс «Нашы дзеці» надрукаваны ў 7-ым (кастрычніцкім) нумары часопіса «Работніца і сялянка» ў 1946 годзе.

Аднаактовая п'еса Янкі Маўра **«Хата з краю»** прэміравана на Усебеларускім конкурсе на лепшую дзіцячую песню і п'есу, які быў праведзены ў 1939—1940 гг. Надрукавана яна ў 1941 годзе ў зборніку «П'есы» (Мінск, Дзяржвыд БССР, 1941). Гэта твор аб пільнасці савецкіх людзей, аб

мужнасці і вынаходлівасці піянераў, якія дапамагаюць пагранічнікам ахоўваць граніцы Радзімы.

У творчай біяграфіі пісьменніка аднаактовая п'еса «Хата з краю» прыкметнага следу не пакінула. Цікавая яна ў асноўным як проба сіл у жанры драматургіі.

Янка Маўр — аўтар яшчэ дзвюх п'ес: драмы ў 4-х актах «Памылка» (1938) і аднаактовай камедыі «Балбатун» (часопіс «Беларусь», № 1, 1946 год).

Можна з упэўненасцю сказаць, што беларуская савецкая дзіцячая літаратура пачынаецца з твораў Янкі Маўра. Зыходзячы з патрабаванняў часу, улічваючы інтарэсы дзяцей, выдатны мастак узняў шэраг зусім новых для беларускай дзіцячай літаратуры тэм і праблем: расказаў аб паходжанні чалавека, аб супярэчнасцях капіталістычнага свету, аб шчаслівым маленстве савецкіх дзяцей, аб адметнай красе роднага краю, аб незабыўных падзеях Вялікай Айчыннай вайны.

Шукаючы найбольш дзейсныя формы ўплыву на фантазію і ўяўленне дзяцей, пісьменнік асвоіў не вядомыя раней беларускай дзіцячай літаратуры жанры навукова-папулярнай, прыгодніцкай, краязнаўчай, фантастычнай, аўтабіяграфічнай аповесцяў, жанр мастацкага нарыса.

У яго стылі адметнае, маўраўскае, арганічна злілося з традыцыямі нацыянальнага фальклору, перадавой рускай, савецкай і сусветнай дзіцячай літаратур. Кожны твор Янкі Маўра клаўся неабходнай цаглінай у будынак беларускай савецкай літаратуры для дзяцей. Яго імя ўвайшло ў гісторыю ўсесаюзнай дзіцячай літаратуры, вядома яно ў братніх рэспубліках і за мяжой.

Захапляючыя, шчырыя, палітычна вострыя творы гэтага выдатнага дзіцячага пісьменніка з гадамі не губляюць сваёй актуальнасці, вялікай сілы ўздзеяння. Яны актыўна ўплываюць на фарміраванне гарманічнай, усебакова развітай асобы. Вось чаму сёння, калі мы ўпэўнена крочым у камунізм, кнігі гэтага таленавітага мастака і самаадданага патрыёта паранейшаму ў баявым страі.

М. Б. Яфімава,
кандыдат філалагічных навук

ЗМЕСТ

ПАЛЕСКІЯ РАБІНЗОНЫ

I. Адважныя падарожнікі.— У моры.— Крушэнне карабля.— Падарожжа ў вадзе.— Невядомы бераг.— Падлік маёмасці. — 6

II. Першая ноч.— Начная дужанка.— Заяц, які дзюбаецца.— Апошнія запалкі.— Дадому. — — — — — — — — — — — — — — 19

III. «Па-а марам!» — Усё направа ды направа.— Зайцаў абед.— Зноў на тым самым месцы. — — — — — — — — — — — — — 23

IV. Вось табе і няхітрая навука! — Прыйшлося пакаштаваць сырога зайца.— Дынама-машына.— Агонь! — Крыўда Віктара.— Навуковая дыскусія. — — — — — — — — — — — — 29

V. Таемны звер.— Навальніца.— Змаганне за агонь. — — — — 39

VI. Мяса знікла.— На паляванне з голымі рукамі.— Здзекі ад зайцоў.— Ваверка выратавала.— Дарэмны перапуд.— Абед з трох страў без другой.— Будаўніцтва з дапамогай дваццаці пальцаў. — — — — — — — — — — — — — — — — — 41

VII. Няўдалая спроба.— Да дзікуноў яшчэ не дараслі.— Рыбацтва кашуляй.— Уласнай гадоўлі рыба. — — — — — — — — — 47

VIII. Прасцейшая, але лепшая зброя.— Знаёмства з дзікам.— Журавіны.— Хоць змяю за здабычу.— Лясныя жыхары.— Царская жывёла.— Вожыкава булава.— Уперад на чарапаху! — Пешаход з Афрыкі. — — — — — — — — — — — — — — 51

IX. Салодкі чай.— Лекцыі Мірона.— Важная пані.— Драпежнік на рыбалцы.— Арэна для бойкі.— І змяя спатрэбілася.— Байцы ў палоне. — — — — — — — — — — — — — — — — — 59

X. Гаспадарка.— «Гліняная паэма».— Старыя знаёмыя.— Воўк.— Палявалі на ліса, а забілі...— Павелічэнне статка. — — — — — — — — — — — — — — — — — — — 66

XI. Барсукі падвялі.— Не святыя гаршкі лепяць (а спрактыкаваныя).— Новыя сродкі жыцця. — — — — — — — — — — — 72
XII. Зноў няўдалая спроба.— Неспадзяваная сустрэча.— Вожык дапамог.— Апошняя рыба.— Новая спроба.— Нядоўгая радасць.— У пастцы.— Апошнія патугі.— Побач са смерцю. — — — — — — — — — — — — — — — — — — 76
XIII. Прымусовае чаканне.— На пашы.— Жаба-птушка.— Хатні настрой.— Чалавек! — — — — — — — — — — — — — — 81
XIV. Дарэмныя патугі.— Паселішча баброў.— Яшчэ адна няўдалая спроба.— Недакурак варона на хвасце прынесла.— Сонны заяц. — — — — — — — — — — — — — — — — — — — 86
XV. Бабровая гаспадарка.— Неспадзяваная небяспека.— Збаўцы-ворагі.— Чужыя гаспадары.— Рэшткі ад чужога стала.— Сур'ёзная памылка. — — — — — — — — — — — — 93
XVI. Цяжкія часы.— Спатканне са старым знаёмым.— Мядзведжая хвароба.— Каменныя прылады.— Дымарня. — — — — — — — 105
XVII. Зноў дарэмная спроба.— Апрацоўка запасаў.— Па мёд.— Гібель гаспадаркі.— Змаганне ■ роспаччу.— Звярыныя недаедкі. — — — — — — — — — — — — — — — — — — — 110
XVIII. Панская страва.— На баброў.— Вось дык бабёр! — Таемныя лісты.— Рамонт бабровай хаткі.— Ваенная падрыхтоўка.— Чаму людзі шануюць баброў. — — — — — — — — — — — 115
XIX. Голад са зброяй.— Сапраўднае паляванне. — — — — — — — 122
XX. Падрыхтоўка да сустрэчы.— З вуголлем у пушчу.— «Насарог».— Ратаванне каштоўнай жывёлы.— Запасны агонь. — 125
XXI. Бясконцае чаканне.— На кухні.— Сонныя вартаўнікі. — — 129
XXII. «Слон».— Агіднае забойства.— Бандыты з палоннікам.— Падазрэнне бандытаў.— Допыт.— Ваенныя аперацыі.— Перамога. — 134
XXIII. План новых ваенных аперацый.— Расказ таварыша Саўчука.— Яшчэ бандыты.— Канец ваенных дзеянняў.— Адказнае даручэнне. — — — — — — — — — — — — — — — — — — 142
XXIV. Апошняя ноч на востраве.— «Кармленне звяроў».— Хітрыкі палоннікаў.— Смалены бандыт.— Зварот дадому. — — — — 150

ТВТ,

або апавяданне пра тое, як піянеры ўзбунтаваліся супраць уціску рэчаў і здзівілі ўвесь свет, як яны навучыліся бачыць тое, чаго іншыя не бачаць, і як Цыбук здабываў ачкі

Раздзел першы,
пра тое, як Ніна падрала панчоху, як бацька паляцеў дагары нагамі і як Толя круціўся па вуліцы. — — — — — — — — 158

Раздзел другі,
дзе гаворыцца, як пацук ледзь не ўкусіў Андрэйку за нос, а парсючок сказаў «угу», ды яшчэ пра тое, як Андрэйка злавіў злодзея. — — — — — — — — — — — — — — — — — 168

Раздзел трэці,
дзе зноў гаворыцца зусім пра другое, напрыклад: як аблілі газай буханку хлеба, як Паўлік ехаў на «каўбасе» і як потым усе тры разы крыкнулі: «Паштальён!» — — — — — — — 175

Раздзел чацвёрты,
дзе гаворыцца, як маці ваявала з патэльняй, як Клаве трэба было адкусіць цвік і як цётка Мар'я збілася з панталыку.— 182

Раздзел пяты,
у якім дзеці нібы ўпершыню ўбачылі, што дзеецца вакол іх, а чытач нарэшце (таксама ўпершыню) ўбачыць, што такое ТВТ. — — — — — — — — — — — — — — — — — — 189

Раздзел шосты,
дзе гаворыцца, як усе бацькі ахнулі і як Толя высунуў прапанову зрабіць «аптэчку» з малатка, напільніка, абцугоў і іншых «лякарстваў». — — — — — — — — — — — — — — — — — 195

Раздзел сёмы,
пра тое, як Паўлік выкручваў усё, што выкручваецца, Ніна пускала бурбалкі, а ўвесь свет падзяліўся на дзве часткі. — 203

Раздзел восьмы,
у якім гаворыцца, як з Соняй здарылася бяда, Цыбук зацікавіў настаўніка, а бацінак разявіў рот. — — — — — — — — — — — 211

Раздзел дзевяты,
самы сур'ёзны, бо ў ім падрабязна апісваецца пырскаўка, гаворыцца аб рэарганізацыі ТВТ, аб тым, як важаты хацеў нешта сказаць, ды не сказаў, і нарэшце — як сам дырэктар зарабіў ачко. — — — — — — — — — — — — — — — — — — — 217

Раздзел дзесяты,
зусім незвычайны, бо тут дзеці соваюць нос не ў свае справы, людзі думаюць наадварот, а пра адну гісторыю нават у газеце было надрукавана. — — — — — — — — — — — — — — 225

Раздзел адзінаццаты,
дзе адбываецца «нешта ў тысячу разоў важнейшае» і яшчэ гаворыцца, як тэвэтэтаўцы заразілі ачкамі настаўнікаў, бацькоў, суседзяў і нават «прафесараў». — — — — — — — — — — 233

Раздзел дванаццаты,

дзе гаворыцца, як Стась аніяк не мог адчапіцца ад трубы, а Цыбук ад бясплатных ачкоў і, апрача таго, як перакуліўся воз з сенам. — 237

Раздзел трынаццаты,

апошні, таму ў ім гаворыцца, як Цыбук трапіў у «мёртвыя душы», як быў пакараны адзін дзёрзкі камень і як, нарэшце, важаты сказаў тое, што хацеў сказаць, але не сказаў у раздзеле дзевятым. — — — — — — — — — — — — — — — 244

Раздзел дадатковы,

напісаны праз пятнаццаць гадоў, дзе гаворыцца аб сустрэчы аўтара з тэхнікам Барысам Іванавічам. — — — — — — — — — — — 251

ПАДАРОЖЖА У ПЕКЛА

Гістарычная даведка — — — — — — — — — — — — — — — — — — 258
I. Як піянеры шукалі дарогу ў пекла. — — — — — — — — — — — 261
II. Ля перавозу. — — — — — — — — — — — — — — — — — — 267
III. У вагоне. — — — — — — — — — — — — — — — — — — 272
IV. Чысцец. — — — — — — — — — — — — — — — — — — — 279
V. На парозе пекла. — — — — — — — — — — — — — — — — 284
VI. Экскурсія па пекле. — — — — — — — — — — — — — — — 292
VII. Пераварот у пекле. — — — — — — — — — — — — — — — 302

АПАВЯДАННІ

Чужаземец. — 316
Падарожжа ад школы да дому. — — — — — — — — — — — — 323
Багіра — 330
Спартак. — 337
На парозе будучыні. — — — — — — — — — — — — — — — — 341

НАРЫСЫ

Раскажы пра сваіх сяброў. — — — — — — — — — — — — — — 346
Як я пазнаёміўся з Якубам Коласам. — — — — — — — — — — 348
Некалькі слоў пра мараль — — — — — — — — — — — — — — 351
Каляровыя душы. — — — — — — — — — — — — — — — — — 354
Урала-Кузбас — — — — — — — — — — — — — — — — — — 357
Падарожжа па Малой Беларускай чыгунцы. — — — — — — — — 360
Нашы дзеці. — — — — — — — — — — — — — — — — — — — 365
Аднаактовая п'еса «Хата з краю». — — — — — — — — — — — 368
КАМЕНТАРЫІ — — — — — — — — — — — — — — — — — — — 381

На белорусском языке

ЯНКА МАВР
(Иван Михайлович Федоров)

СОБРАНИЕ СОЧИНЕНИЙ
В ЧЕТЫРЕХ ТОМАХ

Том четвертый

Для детей среднего и старшего школьного возраста

Рэдактар В. Д. Рудава. Мастак М. М. Рыжыкаў. Мастацкі рэдактар В. І. Кліменка. Тэхнічны рэдактар Л. М. Шлапо. Карэктар Н. І. Лебедзева

АТ 10525. Здадзена ў набор 12/VI 1975 г. Падп. да друку 22/I 1976 г. Тыраж 17 000 экз. Фармат 60×84¹/₁₆. Папера друк. № 1. Ум. друк. арк. 23,71. Ул.-выд. арк. 21,58. Зак. 2393.
Цана 94 кап.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Мінск, Савецкая, 19.

Паліграфічны камбінат імя Я. Коласа Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Мінск, Чырвоная, 23.

Маўр Я.
М 35 Збор твораў у чатырох тамах. Том чацвёрты. Мн., «Маст. літ.», 1976.
408 с. з іл.

Чацвёрты том чатырохтомнага Збору твораў вядомага дзіцячага пісьменніка Янкі Маўра склалі аповесці «Палескія рабінзоны», «ТВТ», антырэлігійная казка «Падарожжа ў пекла», а таксама апавяданні, нарысы і аднаактовая п'еса «Хата з краю», якія друкаваліся ў перыядычных выданнях 30—40—50-х гадоў.

М $\frac{70803\text{-}057}{М\ 302(05)\text{-}76}$ 149-76 Бел 2